Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка”

Гістарычны факультэт

Кафедра гісторыі Беларусі

рэг. № УМ 27-01/27-2013 ад 14.04.2013

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
_____А.М. Люты
20.03.2013 пр.№10 2013 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан гістарычнага факультэта
_____М.М. Забаўскі
26.03.2013 пр.№6 2013 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ”

для спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнайчыя дысцыпліны

Складальнікі: кандыдат гістарычных навук, дацэнт Сакалоў М.М..
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Шкуцько Л.Л.,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Пракаповіч Л.Э.,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Вялікі А.Ф.,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Канапацкая З.І.

Разгледжана і зацверджана на
пасяджэнні савета БДПУ 28 марта 2013 г., пратакол № 7

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тысячагадовая гісторыя Беларусі ўяўляе важную складовую частку славянскай, еўрапейскай і сусветнай цывілізацый і займае вядучае месца ў сістэме гуманітарнай падрыхтоўкі студэнцкай моладзі нашай краіны. Сваёй непаўторнай, гераічнай і трагічнай гісторыяй беларускі народ можа ганарыцца. Менавіта на гістарычных ведах фарміруецца нацыянальная свядомасць. Без ведаў сваёй гісторыі немагчыма будаваць сучаснае краіны і прагназаваць яе развіццё на будучае.

Гісторыя Беларусі вывучаецца сінхронна з гісторыяй славянскіх народаў, краязнаўствам, этнаграфіяй, крыніцазнаўствам, асновамі археалогіі, дысцыплінамі па ўсеагульнай гісторыі, што дае магчымасць акцэнтаваць увагу студэнтаў на міждысцыплінарных сувязях, выявіць ролю і месца нашага народа ў шырокім прасторавым і часовым дыяпазоне.

Мэтай вывучэння дысцыпліны з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў фундаментальных ведаў па Беларусі ад першабытных часоў да станаўлення сувярэннай беларускай дзяржавы, і выхаванне на гэтай аснове пачуцця прыналежнасці да лёсу краіны і яе гісторыі.

Для рэалізацыі вызначанай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных **задач**:

- высветленне прычынна-выніковых сувязей і заканамернасцей гістарычнага развіцця беларускага народа ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі;
- усведамленне студэнтамі сістэмы матэрыяльных, культурных і духоўных каштоўнасцей беларускага народа, якія служаць рэтраспектывай для аналізу сучаснасці і вызначэння перспектыў будучай жыццядзейнасці;
- атрыманне тэарэтычных і практычных ведаў, якія дазволяюць студэнтам правільна аналізаваць падзеі і факты гісторыі, рабіць неабходныя высновы і абагульненні;
- фарміраванне гатоўнасці выпускніка вышэйшай школы як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь спрыяць далейшаму развіццю сваёй краіны.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені па цыклу спецыяльных дысцыплін студэнт павінен:

ведаць:

- асноўныя падзеі і факты ў гісторыі Беларусі;
- асаблівасці эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі ў канкрэтна-гістарычны перыяд;
- этапы фарміравання беларускай народнасці і нацыі, станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці;

умець:

- выкарыстоўваць метадалогію гістарычнай навукі для аналіза гістарычнага развіцця беларускага народа;
- выяўляць асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця беларускай нацыі ў канкрэтна-гістарычныя перыяды;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- выкарыстоўваць гістарычны вопыт для аналіза і ацэнкі сучасных праблем ў развіцці Беларусі.

Пры вывучэнні кожнай тэмы студэнты павінны навучыцца карыстацца як канкрэтна-гістарычнымі метадамі (гісторыка-генетычным, гісторыка-параўнальным, гісторыка-тыпалагічным, гісторыка-сістэмным і інш.), так і агульнанавуковымі (мадэліравання, індукцыі і дэдукцыі, сінтэзу і аналізу, узыходжання ад канкрэтнага да абстрактнага і наадварот, аналогіі і інш.), метадамі гістарычнага пазнання.

Вывучэнне гісторыя Беларусі перыяда ад старажытных часоў да сярэдзіны XVII ст. накіравана на вызначэнне паходжання беларусаў, вызначэнне крыніц фарміравання беларускай народнасці. Неабходна ў'явіць уплыў прыродна-кліматычных і геаграфічных фактараў на працэс засялення тэрыторыі сучаснай Беларусі старажытнымі людзьмі, развіццё вытворчых сіл і змен у сацыяльных адносінах. Гэта быў перыяд фарміравання першых дзяржаў – княстваў на тэрыторыі Беларусі, узнікнення гарадоў, развіцця рамёстваў, зараджэння пісьменства, істотных дасягенняў у культурным жыцці. Складаны шлях прайшла беларуская народнасць падчас існавання Вялікага княства Літоўскага. Беларускія землі апынуліся у цэнтры барацьбы з крыжацкай і татара-мангольскай агрэсіяй, у супрацьстаянні з Маскоўскай дзяржаваю. Геапалітычнае становішча Беларусі паміж Усходам і Захадам аказвана ўплыў на развіццё рамёстваў, гандлю, пранікненне на яе тэрыторыю заходнееўрапейскіх формаў гарадскога самакіравання. Складаныя працэсы адбываліся ў межканфесійных стасунках, што вылівалася у супрацьстаянне каталіцкай і праваслаўнай цэркваў, спробу іх прымірэння у выглядзу вуніі. Гістарычнае багацце складаюць дасягненні беларусаў ў шмат якіх сферах духоўнага і культурнага жыцця таго часу, што звязана з імёнамі Е. полацкай, Ф. Скарыны, М. Гусоўскага і інш. Культурна-асветных дзеячоў.

Дапамагчы студэнтам разабрацца ў названых апраблемах, свядома засвоіць гістарычную спадчыну беларусаў у перыяд ад старажытных часоў да сярэдзіны XVII ст. прызваны увесь комплекс вучэбных, метадычных, навуковых, кантралючых сродкаў падчас заняткаў па гісторыі Беларусі з дапамогай самастойнай работы студэнтаў над гістарычным матэрыялам.

Вучэбна-метадычны комплекс па гісторыі Беларусі – гэта адкрытая сістэма дыдактычных сродкаў для эфектыўнага кіравання і самакіравання, стымулявання і падтрымкі, кантроля розных відаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў. Лекцыйны курс у адпаведнасці з вучэбнай праграмай прадуглежвае знаёмства студэнтаў з сучаснымі навуковымі поглядамі на азначаныя праблемы. На практычных занятках на падставе вывучэння гістарычных крыніц, навковай і вучэбнай літаратуры самімі студэнтамі разгядаюцца і абмяркоўваюцца найбольш складаныя пытанні грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця беларускай нацыі.Засваенне ведаў правяраецца з дапамогай тэстаў і кантрольных работ. Кіруемая самастойная работа ўключае ў сябе напісанне рэферата, выкананне курсавой і дыпломнай работ. Агульны кантроль засваення дысцыпліны ажыццяўляецца ў час экзамена.

ПРАГРАМНЫ БЛОК

У адпаведнасці з вучэбнай праграмай гісторыя Беларусі ад старажытных часоў да сярэдзіны XVII ст. вывучаецца па наступным тэмам:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Раздзел 1. УВОДЗІНЫ Ў ДЫСЦЫПЛІНУ “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ”

Гісторыя Беларусі – арганічная і неад’емная частка еўрапейскай і сусветнай гісторыі. Метадалагічныя асновы і прынцыпы вывучэння гісторыі, яе перыядызацыя. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі. Прадмет вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце цывілізацыйнага развіцця як складовай часткі ўсходнеславянскай і агульнаеўрапейскай гісторыі. Айчынныя гістарыяграфічныя школы. Агульная характарыстыка асноўных крыніц і гістарыяграфіі.

Раздзел 2. ПЕРШАБЫТНАЕ ГРАМАДСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (100 тысяч гадоў да н.э. – V ст. н.э.).

Тэма 2.1. Старажытны чалавек на тэрыторыі Беларусі

Гістарыяграфія пытання. Пачатак засялення чалавекам тэрыторыі сучаснай Беларусі. Аблічча, умовы жыцця, прылады працы і заняткі.Асноўныя археалагічныя культуры эпохі каменнага і бронзавага вякоў. Шлюбна-сямейныя адносіны і грамадскі лад. Распад радавой абшчыны і станаўленне суседскай. Насельніцтва Беларусі ў жалезным веку. Распад індаеўрапейцаў. Асноўныя раёны пражывання балтаў, славян, германцаў і іншых народаў. Сацыяльна-эканамічнае развіццё плямёнаў эпохі жалеза. Змены ў гаспадарцы, матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Тэма 2.2. Культура, быт і звычаі старажытных людзей на тэрыторыі Беларусі

Гістарыяграфія пытання. Сувязь творчай дзейнасці з працай чалавека, кліматычнымі і геаграфічнымі ўмовамі, спосабамі гаспадарання, сацыяльным асяроддзем, філасофскімі і рэлігійнымі ўяўленнямі. Сінкрэтызм першабытнай культуры. Узнікненне веры старажытных людзей у звышнатуральныя ўласцівасці неадушаўлённых прадметаў. Фантастычныя ўяўленні аб роднасці груп людзей з татэмамі – пэўным відам жывёл, раслін і прыродных з’яў. Разнастайнасць і разгалінаванасць паганства. Вера балтаў і ранніх славян у існаванне шматлікіх багоў. Сонечны культ і культ агню. Персанажы народнай дэманалогіі. Вербальная і невербальная магія, замовы, праклёны. Ушанаванне продкаў, пахавальныя рытуалы, памінкі. Музычныя інструменты, мастацкія вырабы і ўпрыгожванні. Арнаментнае аздабленне глінянага посуду і прылад працы. Старажытная скульптура Беларусі. Керамічныя рэльефныя ўзоры. Характар і традыцыі выяўленчага мастацтва Беларусі ў старажытнасці.

Раздзел 3. БЕЛАРУСЬ У VI – СЯРЭДЗІНЕ XIII ст.

Тэрмін “сярэднявечча”, яго сэнс. Храналагічныя рамкі. Нераўнамернасць развіцця сярэднявяковых цывілізацый. Гістарыяграфія і аналіз крыніц.

Тэма 3.1. Балты і славяне ў VI – VIII стст.

“Вялікае перасяленне” народаў у Еўропе і насельніцтва Беларусі. Банцараўская, калочынская, пражская і іншая археалагічныя культуры. Змешанае пражыванне славян з балтамі. Канчатковы распад патрыярхальнага роду. Заняткі насельніцтва, рэлігійныя вераванні, пахавальныя абрады. Ваенная дэмакратыя і зародкі дзяржаўнасці ў славян.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма 3.2. Узнікненне класавага шматукладнага грамадства ў IX – першай палове XIII ст.

Аб'яднанні крывічаў-палачан, дрыгавічоў, радзімічаў. Плямёны яцвягаў, літоўцаў у Верхнім Панямонні. Славянізацыя мясцовага балцкага насельніцтва. Асноўныя канцэпцыі аб паходжанні беларусаў, вялікаросаў, украінцаў. Трансфармацыя радавой абшчыны ў суседскую. Шматукладнае грамадства. Зараджэнне феадалізму. Сінтэзны і бяссінтэзны шляхі развіцця феадалізму. Сельская гаспадарка. Рамяство. Гандаль. Узнінкненне гарадоў. Сацыяльная дыферэнцыяцыя насельніцтва. Сяляне-земляробы. Знаць і дружына. Княжацкая ўлада.

Тэма 3.3. Полацкае княства ў X – першай палове XIII ст.

Першыя пісьмовыя звесткі аб Полацку. Кіеўская Русь. Узаемаадносіны Полацка з Кіевам і Ноўгарадам. Полацкая дынастыя князёў. Рагвалод. Рагнеда. Захоп Уладзімірам Святаслававічам Полацкай зямлі. Аднаўленне незалежнасці. Полацкі князь Ізяслаў. Узмацненне Полацкага княства ў XI ст. Брачыслаў, Усяслаў Чарадзей. Бітва на Нямізе. Паўстанне ў Кіеве 1068 г. і абранне Усяслава Полацкага вялікім князем кіеўскім. Вяртанне Усяслава ў Полацк. Апошнія спробы кіеўскіх князёў падпарадкаваць Полацк і Менск. Барацьба паміж Полацкам і Менскам у другой палове XII ст. Грамадска-палітычны лад у Полацкай зямлі-княстве. Рысы сярэднявечнай рэспублікі ў Полацку. Гарады Полацкай зямлі. Феадальная раздробленасць. Распад Полацкай зямлі на ўдзельныя княствы (гарады-дзяржавы): Полацкае, Віцебскае, Менскае, Друцкае, Ізяслаўскае, Лагожскае.

Тэма 3.4. Княствы і гарады на тэрыторыі паўднёвай Беларусі, Пасожжа і Верхняга Панямоння

Тураўскае княства. Бярэсце – гістарычны цэнтр Сярэдняга Пабужжа. Выдзяленне Драгічына пад Бугам у якасці ўдзельнага княства. Смаленскія крывічы. Узнікненне і развіццё Слаўгарада і Крычава. Мсціслаў і Мсціслаўскае ўдзельнае княства. Узнікненне Гомеля як племяннога цэнтра радзімічаў. Развіццё горада ў X—XIII стст. Чачэрск і Рэчыца. Мазыр і Брагін – дрыгавіцкія гарады ў складзе Кіеўскага княства. Беларускія княствы і гарады ў Верхнім Панямонні. Гарады Гародня, Ваўкавыск, Слонім, Наваградак і Наваградская зямля. Пачатак барацьбы з рыцарамі-крыжакамі. Кукенойскае і Герцыкскае княствы - фарпосты Полацкай зямлі ў ніжнім цячэнні Заходняй Дзвіны. Князь Вячка, Уладзімір Полацкі, Якаў Палачанін, Давыд Гарадзенскі. Перадумовы ўтварэння беларуска-літоўскай дзяржавы. Міндоўг і яго барацьба з галіцка-валынскім княствам за валоданне Верхнім Панямоннем. Узаемаадносіны Міндоўга з Ордэнам і Полацкам. Каранацыя Міндоўга ў Наваградку. Узвышэнне Наваградскага княства. Інтэграцыя насельніцтва Беларусі з суседнімі народамі ў межах адзінай дзяржавы. Дыскусія пра летапісную назву "Літва" і яе этнічнае паходжанне.

Тэма 3.5. Рэлігія і культура беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.

Язычаскія вераванні. Прыняццё і распаўсюджванне хрысціянства. Двоеверства. Значэнне прыняцця хрысціянства. Пісьменства. Летапісы і рукапісныя кнігі. Літаратура. Пісьменства па археалагічных помніках. Вусная народная творчасць. Паданні пра Рагнеду і Усяслава Чарадзея. Звычаі і абрады. Народны каляндар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Рэлігійна-асветніцкія дзеячы Беларусі: Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч, Аўраамій Смаленскі. Манументальнае дойлідства Полацкай зямлі і Панямоння. Абарончае дойлідства XIII ст. Архітэктурныя школы. Манументальны жывапіс. Кніжная графіка. Дэкаратыўна-прыкладнае мастацтва. Развіццё перадумоў фарміравання беларускай народнасці.

Раздзел 4. ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ, РУСКАЕ І ЖАМОЙЦКАЕ Ў XIII – XV стст.

Айчынная і замежная гістарыяграфія, аналіз крыніц па гісторыі Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

Тэма 4.1 Унутрыпалітычнае становішча ў другой палове XIII – XV ст.

Вялікае княства Літоўскае – цэнтр збірання беларускіх і іншых усходнеславянскіх зямель. Барацьба за вялікае княжанне пасля смерці Міндоўга. Палітыка вялікіх князёў Віценя, Гедыміна, Альгерда. Шляхі ўключэння беларускіх зямель у склад Вялікага княства Літоўскага. Дынастычная барацьба ў 70—90-я гады XIV ст. (Кейстут, Ягайла, Андрэй Полацкі, Вітаўт). Крэўская унія. Ліквідацыя ўдзельных княстваў. Стварэнне ваяводстваў. Гарадзельскі прывілей 1413г. Унутрыпалітычная барацьба пасля смерці Вітаўта. Раскол дзяржавы на Вялікае княства Літоўскае і Вялікае княства Рускае. Вялікакняжацкія прывілеі 1432, 1434гг. Аб’яднанне дзяржавы Жыгімонтам Кейстутавічам. Абмежаванне вялікакняжацкай улады ў другой палове XV ст. Судзебнік Казіміра 1466г. – першы збор законаў беларуска-літоўскай дзяржавы. Змова супраць Казіміра (1481г.) і яе вынікі. Вялікакняжацкі прывілей.

Тэма 4.2 Знешняя палітыка Вялікага княства Літоўскага

Адносіны Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай, Польшчай, Крымам і Ордэнам. Вільня – адзін з цэнтраў аб’яднання ўсходнеславянскіх зямель. Пашырэнне тэрыторыі Вялікага Княства. Паходы Альгерда на Маскву. Бітва на Сініх Водах (1362г.) і далучэнне да княства Валыні, Падолля і Кіеўшчыны. Уніі Вялікага княства Літоўскага з Польшчай. Грунвальдская бітва і яе значэнне.

Тэма 4.3 Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі

Сельская гаспадарка і асаблівасці яе развіцця. Становішча сялян. Удасканаленне прылад працы і сістэмы апрацоўкі зямлі. Формы землеўладання. Прывелеі феадалаў. Землекарыстанне і павіннасці сялян. Формы феадальнай залежднасці. Запрыгоньванне сялян. Гарады і мястэчкі. Склад і становішча гарадскога насельніцтва. Магдэбургскае права. Асноўныя заняткі гараджан. Унутраны гандаль і знешнеэканамічныя сувязі. Фарміраванне асноўных класаў – саслоўяў феадальнага грамадства ў ВКЛ – шляхты, сялянства, мяшчанства.

Тэма 4.4 Фарміраванне беларускай народнасці. Культура Беларусі другой паловы XIII – XV ст.

Складванне этнічнай тэрыторыі беларусаў. Утварэнне сацыяльна-эканамічнай супольнасці. Народная самасвядомасць. Народнасць і рэлігія. Узнікненне і станаўленне беларускай мовы і яе дзяржаўны статус у Вялікім княстве Літоўскім. Паходжанне назваў “Белая Русь”, “ліцвіны-беларусы”. Мінталітэт беларускага народа.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ

Народная творчасць. Літаратура. Рукапісныя кнігі. Кніжная графіка. Беларускія летапісы. Творчасць Рыгора Цамбалака. Выяўленчае мастацтва. Архітэктура. Этнічныя меншасці. Татарскае і яўрэйскае насельніцтва Беларусі – рассяленне, заняткі, культура. Іншыя народы ў этнічных працэсах на беларускіх землях.

Раздзел 5. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў XVI – першай палове XVII ст.

Тэма 5.1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Афармленне фальварка-паншчынай сістэмы.

Стан сельская гаспадаркі. Станаўленне фальварка-паншчыннай сістэмы гаспадарання. Аграрная рэформа1557г. і яе сутнасць. Пачатак юрыдычнага афармлення прыгоннага права. Стан гарадоў і эвалюцыя гарадскога жыцця. Унутраны і знешні гандаль. Развіццё рыначных адносін. Гандлёва-эканамічныя сувязі беларускіх зямель з еўрапейскімі краінамі. Узмацненне антыфеадальнай барацьбы. Казацкі рух пад кіраўніцтвам С. Налівайкі. Гарадскія паўстанні.

Тэма 5.2 Знешняя палітыка Вялікага княства Літоўскага

Абвастрэнне адносін паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай. Войны Вялікага княства Літоўскага і Вялікага княства Маскоўскага, іх прычыны і вынікі. Набегі крымскіх татар. Адносіны Вялікага княства Літоўскага з Ордэнам і Польшчаю. Лівонская вайна і яе вынікі. Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Маскоўску дзяржаву. Барацьба за Смаленск у 30-я гг. XVII ст.

Тэма 5.3 Унутрыпалітычнае становішча. Усталяванне шляхецкай дэмакратыі

Унутрыпалітычная барацьба ў Вялікім княстве Літоўскім у першай палове XVI ст. Праўленне Аляксандра і Жыгімонта I Старога. Абмежаванне ўлады вялікага князя і правоў паноў рады. Мяцеж Міхаіла Глінскага. Адмена Гарадзельскага прывелея. Усталяванне палітычнай талерантнасці. Узрастанне ролі сойма як кіруючага органа дзяржаўнай улады. Статуты 1529, 1566 і 1588 гг. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная і судовая рэформы.

Тэма 5.4 Культура Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст.

Уплыў ідэй Адраджэння на развіццё беларускай культуры. Спецыфічныя рысы беларускага Рэнесансу. Полілінгвізм. Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар-асветнік, гуманіст, вучоны і пісьменнік эпохі Адраджэння. Рэфармацыйнае кнігадрукаванне. Лацінамоўная паэзія. Ян Вісліцкі, Мікола Гусоўскі. Беларуска-літоўскія летапісы, гісторыка-мемуарная і палітычная літаратура. Грамадска-палітычная думка. Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Феадосій Касы. Школа і школьная адукацыя. Праваслаўныя брацтвы. Жывапіс. Скульптура. Мураванае дойлідства. Музыка. Тэатр.

ВУЧЭБНЫ БЛОК

- ***Падручнікі, вучэбна-метадычныя дапаможнікі.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Спіс літаратуры

Асноўная

1. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. – Мінск, 1985.
2. Асветнікі зямлі беларускай (X – пачатак XX ст.): Энцыклапедычны даведнік. – Мірнск. 2001.
3. Беларускія летапісы і хронікі. – Мінск, 1997.
4. Беларусь.: Народ. Государство. Время. / Нац. Акад. Наук Беларуси, Ин-т истории; рэдкол.: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск: Беларус. Наука, 2009. – 879 с.: ил.
5. Белоруссия в эпоху феодализма: сб. документов и материалов: В 4 т. – Минск, 1959 – 1979.
6. Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя: У 2 т. – Мінск, 2006 – 2007.
7. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч.1. Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. . / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мінск, 2007.
8. Гісторыя Беларусі: У 6 т. / рэдкал.: М.П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Т. 1: Старажытная Беларусь : ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. – Мінск, 200.
9. Гісторыя Беларусі: У 6 т. / рэдкал.: М.П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, . – Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага – Мінск, 2008.
10. Гісторыя Беларусі / А.Л. Абецедарская, П.І. Брыгадзін, Л.А. Жылуновіч і інш.; пад рэд. А.Г. Коханоўскага і інш. – Мінск, “Экаперспектыва”, 1996. – 496 с.
11. Гісторыя сялянства Беларусі: У 3 т. Т.1. Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. – Мінск, 1997.
12. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч.1. М.П. Касцюк, У.Ф. Ісаенка, Г.В. Штыхаў і інш. – Мінск: “Беларусь”, 1994. – 527 с.: іл.
13. Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэб дапам. / пад рэд. В.І. Галубовіча. – Мпнск, 1999.
14. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мінск, 1993 – 2003.
15. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мінск, 1989.

Дадатковая

16. Архітэктура Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. – Мінск. – 1993.
17. Доўнар- Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. – Мінск. 1994.
18. Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд. – Мінск, 1994.
19. Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: полацкі і новагародскі перыяды. – Мінск, 2001.
20. Загарульскі Э.М. Заходняя Русь. IX – XIII стст. – Мінск, 1998.
21. Копысский З.Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI - первой половине XVII в. – Минск, 1978.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

22. Копысский З.Ю. Экономическое развитие городов Белоруссиии в XVI - первой половине XVII в. – Минск, 1966.
23. Краўцэвіч А.К. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага. – Мінск. 1998.
24. Литвин Михалон. О нравах татар, литовцев и москвитян. – Москва. 1994.
25. Лойка П.А. Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI – XVIII стст. – Мінск, 1991.
26. Лойка П.А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. Мінск, 2001.
27. Лыч Л.М., Навіцкі У.М. Гісторыя культуры Беларусі. – Мінск, 1997.
28. Магдэбургскае права на Беларусі. – Мінск, 1999.
29. Місарэвіч Н.В. Магдэбургскае права на Беларусі. – Гродна, 2003.
30. Статут Вялікага княства Ліітоўскага 1588: Тэкст. Даведнік. Каментарыі – Мінск, 1989.
31. Францыск Скарына і ягот час: Энцыклапедычнаы даведнік. – Мінск, 1988.
32. Янушкевіч А.М. Вялікае княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558 – 1570 гг. – Мінск, 2007.
33. Чарняўскі М.М. Ілюстраваная гісторыя старадаўняй Беларусі: першабытны перыяд. – Мінск,2003.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Канспект лекцый

Тэма: Уводзіны ў гісторыю Беларусі.

План

1. Гісторыя як навука. Метады і прынцыпы яе вывучэння.
2. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы ў вывучэнні гісторыі.
3. Прадмет вывучэння і перыядызацыя гісторыі Беларусі.
4. Гісторыя Беларусі ў даследаваннях айчынных вучоных.

1. Гісторыя як навука. Метады і прынцыпы яе вывучэння.

Аб'ектам пазнання гісторыі з'яўляецца працэсс і вынікі жыццядзейнасці людзей у сацыяльнай, матэрыяльнай і духоўнай сферах.

Гісторыя – навука канкрэтная, яна патрабуе ведання дакладнызх падзей, фактаў, дат, імёнаў. Таму **прадметам яе вывучэння** з'яўляецца ўся жыццядзейнасць грамадства ў мінулым, на працягу ўсяго гістарычнага працэссу.

Гісторыя як навука мае ўласцівую ёй ***сістэму метадаў*** (метадалогію) і ***прынцыпы.***

"***Гісторыя"*** ў перакладзе з грэческай мовы – апавяданне аб мінулых падзеях. Яе заснавальнікам лічыцца Геродот (485 – 425 гг. да н.э.) Першапачаткова гісторыя

існавала ў форме літаратурнага апісання падзей мінулага і лічылася адным з відаў мастацтва – муза ***Klio.***

Статус паўнавартай навукі гісторыя набыла ў XIX ст З'яўленне гістарычнай навукі было выклікана патрэбай грамадства ў асэнсаванні свайго мінулага, вызначэнні будучыні, а таксама выхаванні новых пакаленняў.

У мэтах усебаковага і аб'ектыўнага раскрыцця гістарычнага працэсу, а таксама лакальных яго асаблівасцяў існуюць **метады:**

агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз, індукцыя, лагічны і інш.);

уласнагістарычныя (гісторыка-генетычны, праблемна-храналагічны, сінхронны, параўнальна-гістарычны, рэтраспектыўны, тыпалагічны і інш);

спецыяльныя ці запазычаныя ў іншых навук (сістэмны, статыстычны, матэматычныя, кантэнт-аналіз, метады сацыяльнай псіхалогіі і інш.).

Агульнапрызнанымі **прынцыпамі** гістарычных даследаванняў з'яўляюцца ***аб'ектывізм*** і ***гістарызм***, а таксама ***сацыяльны*** і ***аксіялагічныя*** падыходы.

Прынцып ***аб'ектывізму*** павінен забяспечыць *праўдзівы,* незалежны ад аўтарскіх сімпатый ці антыпатый*, абгрунтаваны* погляд на факты і з'явы.

Рэалізацыя прынцыпа ***гістарызма*** дазваляе прасачыць тыя ж факты ці з'явы *ў дінаміцы,* у атанчэнні тагачасных рэалій і сувязей з іншымі суб'ектамі гістарычнага працэсу. Гістарызм дазваляе вызначэнне месца той ці іншай падзеі з пункту гледжання таго, чым гэта з'ява *адрознівалася ад папярэдняга часу,* што яна *сабоў ў'яляе* і які *уплыў падзея аказала* на далейшае развіццё.

Сацыяльны падыход дае магчымасць ацэньваць факты і з'явы з пункту гледжання *нісьбітаў тых ці іншых* (сацыяльныхз, клачсавых, канфесійных і г.д.) *інтарэсаў.*

Аксіялагічны падыход дазваляе ацэньваць падзеі мінулага з пункту гледжання агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей.

(Больш падрабязна аб прынцыпам і метадах гістарычнага пазнання вы даведаецеся падчас спецыяльнага курса па метадалогіі гістарычнай навукі, які будзе выкладацца на Ш курсе праф. Жытко А.П.)

Гісторыя як навука, ў сваі развіцці падзялілася на цесна звязанныя паміж сабой ***спецыялізаваныя часткі:***

гісторыя грамадства асобных **эпохаў** (гісторыя першабытнага грамадства, антычную, сярэднявечча, новую і навейшаю)

гісторыя **прасторава-геаграфічных** супольнясцяў, рэгіёнаў (гісторыя Еўропы, Лацінскай Амерыкі, Азіі і Афрыкі)

гісторыя **асобных народаў і краін** (гісторыя Беларусі, гісторыя Расіі, гісторыя ЗША і г.д.)

гісторыя **комплексных праблем** (гісторыя Адраджэння, Рэфармацыі, Асветніцтва, грамадска-палітычнай думкі і інш.)

гісторыя **асобных бакоў** грамадскага жыцця (сацыяльна-эканамічная, палітычная гісторыя, ваенная гісторыя, гісторыя мастацтва і інш.)

Акрамя таго, да гістарычнай навукі адносяць *спецыяльныя (дапаможныя) гістарычныя дысцыпліны*: археаграфію, генеалогію, геральдыку, нумізматыку, тапаніміку і інш.) Самастойнае месца займаюць *спецыяльныя гістарычныя навукі* – археалогія, этнаграфія і гістарыяграфія.

Вывучэнне гісторыі выконвае важныя **функцыі,** ў якіх зацікаўлена грамадства. Такімі функцыямі з'яўляюцца:

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

1. пазнавальная:

- збіраюцца факты;
- сістэматызуюцца і разглядаюцца ў сувязі адзін з другім.

2. практычная, або прагнастычная:

- падзеі мінулага цікавяць не самі па сабе, а з пунктаў пагляду іх уздзеяння на сучаснасць, выкарыстання для лепшай арыентацыі ў будучым.

3. выхаваўчая:

- фарміруе навуковы светапогляд;
- выхоўвае ў людзей на аснове гістарычных матэрыялаў патрыятызм, інтэрнацыяналізм, маральнасць і г. д.

2. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі.

Фармацыйны падыход.

Працяглы час у савецкай гістарычнай навуцы, у тым ліку і пры вывучэнні гісторыі Беларусі, выкарыстоўвалася сваеасаблівая сістэма прынцыпаў, падыходаў і метадаў, названая марксістска-ленінскай. У аснову яе была пакладзена распрацаваная К.Марксам канцэпцыя матэрыялістычнага тлумачэння гісторыі. Яна заключалася у тым, што гістарычны працэс разглядаўся як паслядоўная змена спосабаў вытворчасці, абумоўленая барацьбой прыгнечаных класаў супраць эксплуататараў. “Уся гісторыя існаваўных да гэтага часу грамадстваў, - гаварылася ў “У Маніфесце камуністычнай партыі” – гісторыя барацьбы класаў. Патрыцый і раб, феадал і крепостной знаходзіліся у непрымірымай барацьбе, якая заканчвалася гібелью класаў і зменай сацыяльна-эканамічнай фармацыі”. Паводле К. Маркса, класавая барацьба выглядала асноўнай рухаючай сілай грамадскага прагрэсу, а змена фармацый – аб’ектыўным, фатальна непазбежным працэсам, дзе роля саміх людзей адыходзіла на другі план.

Паводле марсксістскай тэорыі развіццё чалавецтва разглядаецца ў выглядзе заканамерных змен 5-ці асноўных грамадска-эканамічных фармацый:

Першабытнаабшчынная
Рабаўладальніцкая
Феадальная
Капіталістычная
Камуністычная

а пераход ад адной да другой ажыццяўляецца ў выніку сацыяльных рэвалюцый.

Галоўны недахоп фармацыйнага падыхода, які нельга цалкам адкідваць, заключаецца у тым, што зробленая на яго падставе выснова аб непазбежнай гібелі капіталізму, апынулася марнай: капіталістычная фармацыя, гібель якой прадракалі прыхільнікі марксізма, не вычерпала сябе, а выявіла резервы для свайго далейшага развіцця.

Фармацыйны падыход у гісторыі не вытрымаў праверкі часам, выявіў сваю істотную недасканаласць.

Цывілізацыйны падыход.

У пачатку мінулага XX стагоддзя з’явіўся новы, ***цывілізацыйны*** падыход для вывучэння гісторыі чалавецкага грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Цывілізацыйны падыход у асэнсаванні гісторыі чалавецкага грамадства пазбаўлены акцэнтацыі на класава-вытворчыя адносіны, у яго аснове – *чалавек у сукупнасці яго інтарэсаў, ведаў і волі*, рухаючай сілай прагрэсу чалавецтва з'яўляецца *рост патрэб* самаго чалавек.

Само паняцце "цывілізацыя" даволі разнастайнае.

У цэлым, пад ім разумецца *ўзровень грамадскага развіцця*, яго матэрыяльнай і духоўнай культуры, лакалізаваны *па прасторы*(тэрыторыі) і *часе.*

Некаторыя навукоўцы паняцце "цывілізацыя" атаясамліваюць з *нацыянальнай культурай*, якая існуе на працягу доўгага часу, мае больш-менш выразныя тэрытарыяльныя межы і характаразуецца асобным, непаўторным шляхам развіцця.

Найбольш прызнана, што пад тэрмінам **"цывілізацыя"** разумецца колькасна *вялікія,*

якасна разнастайныя і

самадастатковыя супольнасці людзей, з уласцівымі ім

светапоглядам,

ментальнасцю,

сістэмай каштоўнасцей і культурай,

сваеасаблівай сацыяльна-эканамічнай і палітычнай арганізацыяй.

Існуюць агульнапрынятыя вызначэнні: "усходняя цывілізацыя", "еўрапейская цывілізацыя" і інш.

Вылучаецца асобная "ўсходнеславянская цывілізацыя", у якую трапляе і Беларусь.

Першы беларускі гісторык Вацлаў Ластоўскі пісаў: "Гісторыя – гэта фундамент, на каторым будуецца жыццё народу. І нам, каб адбудаваць сваё жыццё, трэба пачаць з фундаменту, каб будынак быў моцны. А фундамент у нас важны, гісторыя наша багата…"

Гэтыя словы яшчэ раз падцвярджваюць тую думку, што без гісторыі нацыя не можа быць жыццястойкай, не можа мець будучага. Вывучэнне гісторыі закладвае аснову для абуджэння гістарычнай памяці і нацыянальнай свядомасці, засцярагае ад паўтарэння памылак мінулага. Вывучэнне нацыянальнай гісторыі спрыяе выхаванню чалавека-грамадзяніна, патрыёта, добрага гаспадара на сваёй зямлі, які адчувае духоўную сувязь з пакаленнямі продкаў, а значыць, – і адказнасць за працяг іх спраў, за будучыню сваёй краіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3.Прадмет вывучэння і перыядызацыя гісторыі Беларусі

Прадметам вывучэння гісторыі Беларусі з'яўляецца зараджэнне, станаўленне і развіццё беларускага грамадства ад старажытнасці да нашых дзён. Вывучэнне беларускай мінуўшчыны як састаўной часткі *ўсходне-славянскай, агульнаеўрапейскай і сусветнай гісторыі* дае магчымасць параўнаць узровень развіцця беларускага народа, дынаміку яго развіцця, вызначэнне месца беларусаў сярод іншых народаў.

У ***кола пытанняў, якія падлягаюць разгляду і вывучэнню*** уваходзяць найбольш значныя і разнастайныя формы жыццядзейнасці нашых ьсуайчыннікаў. Мы будзем разглядаць пытанні сацыяльна-эканамічнага, палітычнага характару, праблемы дзяржаўнасці, этнагенезу, культуры Беларусі як суб'екта гісторыі, разумеючы айчынную гісторыю як арганічную частку еўрапейскай і сусветнай. Мы зробім

намаганні пазнаць непаўторнасць, арыгінальнасць пройдзенага народам шляху, яго матэрыяльнай і духоўнай культуры, усвядоміць яе нацыянальную адметнасць і каштоўнасць у суквецці славянскай, еўрапейскай і сусветнай культуры.

Наша мэта:

засвоіць гістарычны вопыт продкаў;

навучыцца крытычна аналізаваць мінулае;

адчуваць водгулле гістарычных працэсаў ў сёняшнім жыцці;

асэнсоўваць сучаснасць праз прызму мінулага і наадварот;

навучыцца знаходзіць прычына-выніковыя сувязі гістарычных працэсаў і падзей;

вызначыць фактары (эканамічныя, знешнепалітычныя, ідэалагічныя, рэлігійныя, геаграфічныя, прыродныя, цывілізацыйныя і інш.), што абумовілі тэмпы, характар і асаблівасці развіцця беларускага народа;

навучыцца арыентавацца ў альтэрнатыўных канцэпцыях гісторыі Беларусі, ацэньваць іх аб'ектыўнасць, зыходзячы з фактаў.

Асаблівасці гістарычнага развіцця Беларусі

працяглая адсутнасць у мінулым сваёй сапраўднай дзяржаўнасці;

амаль несупынныя працэсы дэнацыяналізацыі (спачатку паланізацыі, а потым русіфікацыі);

канфесійная "разарванасць" беларускага этнаса (праваслаўе, каталіцызм, уніяцтва);

позняе фарміраванне і нязначны лік да пачатку XX стагоддзя нацыянальнай інтэлігенцыі ("галавы народа" – У. Ігнатоўскі);

асаблівасці менталітэта беларусаў (талерантнасць), нізкі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці;

геапалітычнае становішча: Беларусь знаходзіцца ў геаграфічным цэнтры Еўропы, паміж Усходам и Захадам, Каталіцызмам і Праваслаўем, таму яна зведала добратворны ўплыў суседніх народаў, але таксама з'явілася арэнай крывавых канфліктаў, жорсткага супрацьстаяння розных дзяржаў;

Перыядызацыя гісторыі Беларусі

Перыядызацыя гісторыі – храналагічныя пласты, выдзеленыя з агульнай масы фактаў, ілюструючыя асобныя этапы эвалюцыі жыцця народа. Яны – своеасаблівы каркас, на якім узнімаецца гістарычны будынак.

Гісторык С. Салаўёў лічыў галоўнай рухаючай сілай гісторыі дзяржаву. Ён аўтар дзяржаўніцкай канцэпцыі гісторыі Расіі.

Таксама У. Ігнатоўскі ў "Кароткім нарысе гісторыі Беларусі" (1919) падзяліў нашу гісторыю на 4 перыяды:

Полацкі

Літоўска-Беларускі

Польскі

Расійскі

У савецкія часы гісторыкі падзялялі гісторыю на грамадска-эканамічныя фармацыі:

1. першабытнае грамадства (100 тыс. г. да н. э. – IX ст. н. э.)
2. феадалізм (IX – 1861г.)
3. капіталізм (1861-1917 гг.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. сацыялізм (1917 да…)

Аб недахопах такога падыхода мы ужо казалі.

Сучасная перыядызацыя гісторыі Беларусі, якая грунтуецца на ***цывілізацыйным*** падыходзе, забяспечвае лепшае разуменне **нацыянальнай гісторыі** у кантэксце сусветна-гістарычнага працэсу. У адпаведнасці з гэтым прынцыпамі ў гісторыі чалавечага грамадства на тэрыторыі Беларусі выдзяляюцца наступныя перыяды:

Старажытнае грамадства (40 тыс. гадоў да н.э. – V ст. н.э.) Гэты перыяд падзяляецца на 3 этапа: каменны век (40 – 3 тыс. гадоў да н.э.), бронзавы век (“-е – пачатак 1-га тысячагоддзя да н.э.), жалезны век (пачатак 1-га тысячагоддзя да н.э. – 5-е ст. н.э.)

Сярэднявечча (канец V – XV ст.) Гэты перыяд падзяляецца на 2 этапы: пачатак перахода да класавага грамадства і ўзнікненне дзяржаўнасці (VI – першая палова XIII ст.) ; развіццё феадальнай сістэмы (сярэдзіна XIII – XV ст.)

Новы час (XVI – пачатак XX ст.) Гэты перыяд таксама падзяляецца на 2 этапы: афармленне феадальнай сістэмы і выспяванне яе крызісу (XVI - канец XVIII ст.); генезіс і зацвярджэнне капіталізму, выспяванне крызісу буржуазнага грамадства (канец XVIII – 1917 г.)

Навейшы час (ад заканчэнне Першай сусветнай вайны у 1918 г. – да нашых дзён

Адным з варыянтаў сучаснай перыядызацыі гісторыі Беларусі, што ужываецца у шэрагу даследаванняў, з’яўляецца той, у падмурак якой пакладзены рысы грамадскага стану і дзяржаўнасці нашых зямель:

Старажытнае грамадства (100 тыс. г. да н. э. – V ст. н. э.)

Полацкі перыяд (ранняе сярэднявечча) VI – пач. XIII ст., калі на нашых землях з’яўляюцца племянныя саюзы (крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў), а потым узнікаюць і развіваюцца дзяржавы-княствы (Полацкае, Тураўскае і інш.).

Утварэнне і росквіт ВКЛ (п. п. XIII – др. п. XVIст.).

Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай (1569 - кан. XVIII ст.)

Беларускія землі ў складзе Расійскай Імперыі (кан. XVIII – пач. XX ст.).

Беларусь у складзе СССР (1922 – 1991 гг.).

Сучасны перыяд (1991 – па сённяшні дзень).

На мяжы XX – XXI стагоддзяў у беларускай гістарычнай навуцы сфарміравалася **нацыянальная канцэпцыя гісторыі Беларусі**, якая

- *спалучае* цывілізацыйны і фармацыйныя падыходы у сукупнасці

- *прызнае* крытэріем ісціны гуманістычныя, агульна-чалавечыя і нацыянальна-дзяржаўныя каштоўнасці, надае ім прыярытэт у ацэнцы гістарычных падзей, фактаў, гістарычных дзеячоў і асоб

- *разглядае* айчынную гісторыю як арганічную частку еўрапейскай і сусветнай гісторыі

што забяспечвае аптымальныя магчымасці для высвятлення заканамернасцяй і спецыфікі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага, дзяржаўнага і культурнага развіцця Беларусі на кожным з этапаў яе гісторыі.

На працягу нашай работы ў гэтым сяместры мы будзем вывучаць перыяд у гісторыі Беларусі ад старажытнасці да сярэдзіны XVII ст. Планам работы прадугледжана 30 гадзін лекцый, 24 гадзіны семінараў, кантралюемая самастойная работа, у канцы сяместра прадугледжан экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. **Гісторыя Беларусі ў даследаваннях айчынных і замежных вучоных**

Вывучэнне гісторыі Беларусі, як самастойнай этнічнай часткі Еўропы, пачалося *у канцы XIX – пачатку XX ст.,* калі з'явіліся публікацыі беларусазнаўцаў П. Шпілеўскага, П. Баброўскага, М. Федароўскага, **Н.** Раманава, А. Сержпутоўскага, М. Нікіфароўскага і іншых аб багатым гістарычным мінулым беларускага народа. Артыкулы гістарычнага зместу змяшчаліся на старонках «Нашай Нівы». Нарэшце ў 1910 г. выйшла ў свет «Кароткая гісторыя Беларусі» В. Ластоўскага, які сфармуляваў першую канцэпцыю паходжання беларусаў.

У БССР у 1920-я гг. выйшлі творы У. Ігнатоўскага «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» і «Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецця», якія вывучаліся адпаведна ў школе і ў ВНУ. Праца В. Кнорына «1917 год в Белоруссии и на Западном фронте» паклала пачатак вывучэння сацыялістычнай рэвалюцыі. Дастаткова аргументаваныя погляды на рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. уласцівы зборніку артыкулаў і дакументаў «Кастрычнік на Беларусі» (Мінск, 1927).

У часы беларусізацыі намаганнямі З. Жылуновіча, А. Луцкевіча, У. Пічэты, А. Станкевіча, А. Цвікевіча, М. Шчакаціхіна ў нашай рэспубліцы з'явілася шмат гістарычных артыкулаў і манаграфій, але з усталяваннем сталінскай дыктатуры барацьба супраць «нацдэмаў» і іншых «ворагаў народа» прывяла да забароны большасці твораў. Ім на змену прыйшлі новыя, накшталт «Нарыса гісторыі Беларусі» (Мінск, 1934), заснаваныя на сталінскіх ацэнках гістарычных падзей.

У пасляваенны перыяд развіццё беларускай гістарычнай навукі характарызавалася найбольшай увагай да ролі Камуністычнай партыі ў Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. і Вялікай Айчыннай вайне. Нягледзячы на існаванне ў ёй ідэалагічнага ўціску з боку КПСС **і** панаванне марксісцка-ленінскай метадалогіі, сталі актыўна распрацоўвацца праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі (З. Абезгауз, Ф. Болбас, З. Капыскі), рэвалюцыйнага руху (А. Саладкоў, М. Сташкевіч)**,** грамадзянскай вайны (І. Ігнаценка, П. Петрыкаў, П. Селіванаў), усенароднай барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў (А. Залескі, І. Краўчанка, А. Філімонаў).

Лепшымі на той час творамі былі прызнаны манаграфіі Л. Абэцэдарскага, М. Біча, В. Гняўко, Э. Загарульскага, А. Ігнаценкі, І. Ігнаценкі, Н. Каменскай, М. Касцюка, І. Краўчанкі, В, Круталевіча, П. Лысенкі, А. Лютага, Я. Мараша, І. Марчанкі, У. Міхнюка, У. Палуяна, І. Палуяна, П. Петрыкава, Л. Побаля, П. Селіванава, Г.Нітыхава;

У ліку буйнейшых прац 1960-1980-х гг. - двухтомная «История Белорусской ССР» і пяцітомная «Гісторыя Беларускай ССР», чатырохтомная «Исторня рабочего класса Белорусской ССР», трохтомная «Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчнков в годы Великой Отечественной войны"

З пачаткам перабудовы, у канцы XX – пачатку XXI ст, беларуская навука значна пашырыла свой дыяпазон і ўзнялася на новы ўзровень. Сярод навуковых тэм, якія раней па ідэалагічных меркаваннях замоўчваліся або скажаліся, а зараз атрымалі новае гучанне былі: Вялікае княства Літоўскае, беларускі нацыянальны рух, сталінскія рэпрэсіі, дзейнасць калабарантаў і многія інш. Гэты час вызначыўся выхадам у свет грунтоўных манаграфій Я. Анішчанкі, А. Вішнеўскага, М. Ермаловіча, І. Ігнаценкі, А. Кавалені, М. Касцюка, А. Краўцэвіча, А. Літвіна, Р. Платонава, Г. Сагановіча, Л. Сарокіна, А. Цітова, З. Шыбекі і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Значным дасягненнем у асэнсаванні беларускай гісторыі зрабілася выданне шасцітомнай «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі». Адметнай з'явай у гістарычнай навуцы і адукацыі стаў выхад у 1994 – 1995 гг. «Нарысаў гісторыі Беларусі», а таксама чатырохтомнай «Археалогіі Беларусі», двух тамоў «Гісторыі сялянства» і пяці тамоў «Гісторыі Беларусі» пад рэд. М.П. Касцюка.

Якасць навуковых твораў у многім залежыць ад выкарыстання **гістарычных крыніц** - носьбітаў інфармацыі пра жыццядзейнасць людзей у мінулым. У адпаведнасці з класіфікацыяй вылучаюць дакументальныя і апавядальныя крыніцы.

Да дакументальных крыніц адносяцца заканадаўчыя акты, статуты, указы, дэкрэты, законы**,** дакументы афіцыйных органаў, статыстычныя і іншыя матэрыялы.

Апавядальныя крыніцы ўключаюць у сябе летапісы («Аповесць мінулых гадоў», «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», «Хроніка Быхаўца» і інш.), перапіску манархаў і іншых знакамітых асоб, пісьмовыя звароты, справаздачы, перыядычныя выданні.

Максімальна ўсебаковаму і аб'ектыўнаму асвятленню гісторыі Беларусі будзе спрыяць **і** выкарыстанне іншых - этнаграфічных, лінгвістычных, тапаграфічных крыніц, кінафотадакументаў.

Найбольш значнымі выданнямі па гісторыі Беларусі, якія ***выкарыстоўваюцца у навучальным працэсе з'яўляюцца:***

Ластоўскі В. Кароткая гісторыя Беларусі. Вільня. 1910. – першая нацыянальная версія беларускай гісторыі.

Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1922. – напісана з пазіцый нацыянальнай гісторыі.

Доўнар-Запольскі М. Гісторыя Беларусі. Мн., 1926 (1994,2003).

Гісторыя Беларускай ССР. У пяці тамах. Мн., 1972-1975.- калектыўная праца савецкіх часоў. Вызначалася грунтоўнасцю выкладзенага матэрыялу.

У навучальным працэсе, для самстойнай работы пры падрыхтойкі да семінараў і экзамена мэтазгодна карыстацца ***сучаснымі выданнямі -***

Нарысы гісторыі Беларусі. Мн., 1994-1995. У 2-х частках. – першае выданне пра мінулае нашай краіны пасля распаду СССР – напісана з нацыянальна-дзяржаўных пазіцый.

Гісторыя Беларусі. У двух частках. Пад рэд. Я.К. Новіка і Г.С. Марцуля. Ч.І. Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. – Мінск. 1998, 2000 і інш. гады (усяго 5 выданняў) – адзінае выданне, якое дапушчана Міністэрствам адукацыі РБ у якасці падручніка для студэнтаў ВНУ.

Гісторыя Беларусі: У 6 т. Пад рэд. М.П. Касцюка. Ч. 1 Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст.. – Мн.: 2000. Ч. 2 – Мн. 2002.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.; Мінск, 1993 – 2003.

Для вывучэння гісторыі Беларусі, ў тым ліку і перыяда, які мы з вамі будзем вывучаць, маюць каштоўнасць такія выданні, як:

"Эканамічная гісторыя Беларусі" пад рэд. В. Галубовіча

"Гісторыя культуры Беларусі" Л. Лыча і У. Навіцкага

"Иллюстрированная хронология истории Беларуси" Мн., 1998.

"Атлас гісторыі Беларусі"(ад старажытнасці да нашых дзён) Мінск, 2006

«Беларусь: Народ. Государство. Время» / Нац.акад. наук Беларуси, Ин-т истории; редкол.: А.А. Коваленя и др. – Минск: Беларус. Навука, 2009, - 879 с: ил.

Акрамя названых выданняў, да кожнай тэмы, якую мы будзем вывучаць, ***у лекцыях*** будуць называцца іншыя спецыяльныя выданні – манаграфіі, артыкулы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

інш., які складаюць гістарыяграфію той і ці іншай праблемы. Больш падрабязна у дачыненні да кожнай тэмы будут называцца і гістарычныя крыніцы, на падставе якіх асвятляюцца падзеі і працэсы. Большасць з іх будзе названа таксама ў планах семінарскіх заняткаў, прапануецца для самастойнай працы.

Тэма 1.1 Старажытнае грамадства Беларусі

План

1. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі першабытнага перыяду

2. Перыядызацыя першабытнай гісторыі

3. Пачатак засяленне людзьмі сучаснай тэрыторыі Беларусі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1.**Гістарыяграфія гісторыі Беларусі першабытнага перыяду.**

Вывучэнне гісторыі старажытнага грамадства на Беларусі грунтуецца, перш за ўсе, на археалагічных даследаваннях. Таму ў гістарыяграфіі па названаму перыяду патрэбна звярнуцца да найбольш значных прац у гэтай галіне гістарычнай навуцы.

Сістэматычныя археалагічныя даследаванні старажытных паселішч людзей на тэрыторыі Беларусі пачаліся толькі у 20-30-я гады XX стагоддзя. Яны дазволілі з улікам папярэдніх набыткаў зрабіць спробы больш грунтоўных гістарычных абагульненняў аб першапачатковым засяленні людзьмі тэрыторыі Беларусі. На падставе даследаванняў стаянак Юравічы і Бердыж на паўднёвым усходзе Беларусі, праведзенных ***К. Палікарповічам***, была навукова падцверджана думка Е. Раманава аб першапачатковым засяленні Беларусі яшчэ *у палеаліце.* Да 1941 года у межах тагачаснай БССР былі выяўлены і часткова даследаваны 864 гарадзішчы, больш за 100 неўмацаваных пасяленняў – селішчаў, каля двух дзесяткаў магільнікаў. На падставе аналізу археалагічных фактаў ***А. Ляўданскі*** і інш. пачалі пераходзіць і да гістарычных абагульненняў, спрабуючы разглядаць не толькі матэрыяльную культуру, але і гаспадарку, сацыяльнае уладкаванне плямен железнага веку. Былі вылучаны тры зоны гарадзішчаў з рроznымі тыпамі керамікі.

У пасляваенны час на падставе інтэнсіўнага развіцця беларускай археалогіі з'яўляюцца шэраг спецыяльных прац, прысвечаных старажытнаму перыяду у гісторыі Беларусі.

Прыкметнай з'явай стала апублікаванне у 1977 годзе ***Э(***дуардам) ***Загарульскім*** нарысаў па гісторыі першабытнага грамадства Беларусі.

В.Ф. Ісаенка былі падрыхтаваны і выдадзены "Археологическая карта Беларуссии. Вып.1. Памятники каменного века".(Мн., 1968), Археологическая карта

Белоруссии. Вып.3. Памятники бронзового века.” (Мн., 1976.) У тым жа годзе выйшла яго кніга «Неолит Припятского Полесья».

«Археологическая карта Белоруссии. Вып.2. Памятники железного века и эпохи феодализма» (Мн., 1971.) была падрыхтавана вядомым беларускім археолагам, прафесарам ***Г.Штыхавам.***

З’явіліся шэраг прац ***Л.Д. Поболя***: “Славянские древности Белоруссии (ранний этап зарубенецкой культуры). – Мн, 1971; “Славянские древности Белоруссии (свод археологических памятников раннего этапа зарубенецкой культуры – с середины Ш в. до н.э. по начало П века н.э.) – Мн., 1974; “Археологические памятники Белоруссии. Железный век.” – Мн., 1983.

Е.Г. Калечыц выдала манаграфію «Первоначальное заселение территории Белоруссии» (Мн., 1984), у якой упершыню былі названы, стаўшыя хрэстапматыўнымі, даты абсалютнага ўзросту Бердыжскай і Юравіцкай стаянак. У 1987 годзе выйшла яе кніга “Памятники каменного и бронзовых веков Восточной Белоруссии”.

Вывученнем старажытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі займаюцца ***М. Чарняўскі, В. Капыцін, В. Ксянзов, В. Кудряшоў.*** Назвы іх прац мы сустрэнем у Планах семінарскіх заняткаў, імі вы будзеце карыстацца пры самастойнай працы.

Асноўныя дасягненні сучасных беларускіх навукоўцаў па вывучэнню першабытнай гісторыі Беларусі сканцэнтраваны ў першых дзух тамах чатарыхтомнага фундаментальнага даследавання **“Археалагія Беларусі”.** ***У 1997 годзе выдадзены “Археалогія Беларусі. Т.І: Каменны і бронзавы вякі”, у 1999 годзе – “Археалогія Беларусі. Т.2: Жалезны век.”.*** На падставе верыфікацыі, аналіза, сістэматызацыі і інтэрпрытацыі вялікай крыніцазнаўчай базы у названых тамах разглядаюцца праблемы:

- першапачатковага засялення тэрыторыі Беларусі,
- генезіса, эвалюцыйнага развіцця і гістарычнага лёсу насельніцтва на працягу, каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў;
- развіцця і дынамікі эканомікі ад ад вырабу першых прылад працы з крэмню да з’яўлення першых вырабаў з металу;
- этнічнай гісторыі, культурнага і духоўнага развіцця насельніцтва Беларусі з улікам традыцый і навацый, на падставе якіх сфарміравалася і існуе самабытная беларуская культура.

(Больш падрабязна аб іх, а таксама аб працы сучасных беларускіх археолагаў ў вывучэнні старажытнай Беларусі – гл.: “Институт истории НАН Беларуси.1929 – 2009”. – Мн., 2009. С. 230 – 333.)

2. Перыядызацыя першабытнага грамадства

У вывучэнні першабытнай гісторыі існуе шэраг перыядызацый: палеаантрапалагічная, морганаўская, геалагічная, агульна-гістарычная, археалагічная.

Палеаантрапалагічная перыядызацыя першабытнай гісторыі.

Заснавана на зменах у *біалагічнай* эвалюцыі чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Палеаантрапалогія вывучае *змены фізічнага тыпу* чалавека ад першапачатковых стадый яго існавання (архантрапы) да канчатковага сфарміравання сучаснага чалавека (неантрапы).

Прыкладна 3 млн гадоў назад у Афрыцы з'яўляюцца ***аўстралапітэкі*** –"Homo habilis" – (чалавек умелы). Яны былі здольнымі вырабляць штучныя прылады, были "яшчэ не людзі, але ужо і не жывёлы".

На змену ім прыходзяць **Архантрапы** ("Homo erectus" – чалавек прамаходзячы) – ***піцекантрапы,*** сінантрапы – несумненна старажытныя людзі. Яны жылі ў розных кутках Еўропы, былі знешне больш падобныя на сучасных людзей, харчаваліся мясной ежай, умелі вырабляць прылады працы з камянёў і костак.

Палеаантрапы: ***неандэртальцы*** ("Homo neandertalensis") з'явіліся прыкладна каля 2 млн. гадоў таму. Прапорцыі цела блізкія да сучасных, займаліся збіральніцтвам, паляваннем, будавалі прымітыўныя жытлы, выраблялі і выкарыстоўвалі каменныя прылады працы.

Неаантрапы: Прыкладна 40 – 35 тыс гадоў назад сфарміраваўся чалавек сучаснага тыпу, або "Homo sapies", -«чалавек разумны», які атрымаў назву ***краманьёнец.*** Яго прылады працы з крэменю (наканечнікі, нажы, сякеры, скрабкі) вызначаліся болшай дасканаласцю, а ў ліку іншых матэрыялаў з'явіліся косць і рог.

Архантрапы – *піцекантрапы*
Палеаантрапы – *неандартальцы*
Неаантрапы – *краманьёнцы*

Данымі палеаантрапалогіі мы будзем карыстацца пры вывучэнні антрапа- і сацыягенезу, гісторыі фарміравання, рассялення людзей на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Морганаўская перыядызацыя першабытнага грамадства.

Л. Морган (1808 – 1881) – амерыканскі этнолаг, які першы зрабіў спробу на падставе дадзеных этнаграфіі і археалогіі стварыць перыядызацыю старажытнага грамадства "па вертыкалі" (ад старадаўніх да нашых часоў).

Па перыядызацыі Л. Моргана старажытнае грамадства палдзяляецца на 3 этапы, на эпохі: дзікасці, варварства і цывілізацыі.

Морган вылучыў у кожнай з названых эпох ніжэйшую, сярэднюю і вышэйшую ступені: *ніжэйшая ступень* **дзікасці** пачынаецца са з'яўлення чалавека і членападзельнай мовы; *сярэдняя ступень* **дзікасці** пачынаецца з узнікнення рыбацтва і выкарыстання агню; *вышэйшая ступень* **дзікасці** пачынаецца з вынаходніцтва лука і стрэл;

- *ніжэйшая ступень* **варварства** пачынаецца з распаўсюджваннем керамікі; *сярэдняя ступень* **варварства** пачынаецца са з'яўлення земляробства і жывёлагадоўлі; *вышэйшая ступень* **варварства** пачынаецца з выкарыстання жалеза;

цывілізацыя пачынаецца са з'яўленнем іерагліфічнага ці алфавітнага пісьма.

Названая перыядызацыя шырока распаўсюджана пры вывучэнні старажытнага грамадства ў краіна Захада, некаторыя яе прынцыпы выкарыстоўваюцца і айчыннымі гісторыкамі.

Геалагічная перыядызацыя першабытнага грамадства

Геолагі ўмоўна падзялілі гісторыю Зямлі на 5 вялікіх адрэзкаў – эр:

Архейская (прасцейшыя аднаклетачныя арганізмы)

Пратэразойская (эра пачатку жыцця). Заселена мора, з'явіліся водараслі, чэрві, мядузы.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Палеазойская (эра старажытнага жыцця). З’явіліся расліны, насякомыя, паўзуны.

Мезазойская (эра сярэдняга жыцця). Дыназаўры, лятаючыя яшчуры.

Кайназойская (эра новага жыцця). Млекакормячыя, цяперашнія жывёлы, чалавек.

Эры падзяляюцца на перыяды (напрыклад, юрскі, крэйдавы, трацічны, чацвярцічны перыяды) і на эпохі (напрыклад, “эпоха дыназаўраў”, “эпоха млекакормячых”, “эпоха з’яўлення чалавека”). У апошнюю кайназойскую эру (эру новага жыцця) з’яўляецца чалавек.

Агульнагістарычная перыядызацыя першабытнага грамадства

Паводле фармацыйнай метадалогіі ў вывучэнні гісторыі першабытнае грамадства вызначаецца як ***першабытнаабшчынны лад*** – сацыяльна-экангамічная фармацыя, якуая ахоплівае перыяд ад з’яўлення першых людзей і да ўзнікнення класавага грамадства.

Для першабытнаабшчыннага ладу характэрны:

- паступовая біялагічная эвалюцыя чалавека,
- узаемаабумоўленасць абшчынных, роднастнызх і эканамічных сувязей паміж людзьмі,
- калектыўная ўласнасць на сродкі вытворчасці,
- ураўнальнае размеркаванне сродкаў існавання.

Першабытнае грамадства згодна з названымі падыходамі падзяляецца на перыяды:

Першы перыяд – першабытны статак, або праабшчына

Другі перыяд - ранняя радавая абшчына, або мацярынская радавая абшчына. Ёй уласцівы:прысвойваючая гаспадарка, ураўняльнае размеркаванне, агульная ўласнасць,кожны член абшчыны меў права на долю выработенага прадукта незалежна ад таго, прымаў ці не прымаў удзел у яго вытворчасці.

Трэці перыяд - познепершабытная абшчына, або патрыярхальная абшчына. Яе рысы: пераход да *вытворчай* гаспадаркі, з’яўленне залішкавага прадукта; побач з *ураўняльным* размеркаваннем атрымала развіццё *працоўнае* размеркаванне, пры якім частка прадукта паступала ў распараджэнне асобных членаў абшчыны; побач з агульнай уласнасцю развівалася *уласнасць асабістая*, прыватная.

Археалагічная перыядызацыя:

Заснавана на ***розніцы ў матэрыяле і тэхніцы вырабу*** прылад працы.. Яна падзяляе мінулае па ***характары сыравіны,*** што ішла на выраб прылад працы. Удасканаленне прылад працы адлюстроўваюць эвалюцыю *вытворчасці,* а з ёй можна звязаць *сацыяльную, культурную* і нават *этнічную* гісторыю.

Згодна з археалагічнай перыядызацыяй выдзяляюцца буйныя перыяды – вякі:

Каменны век - ён датуецца перадам ад 3 – 2,5 млн. гадоў да 4 000 гадоў на н.э.

Бронзавы век – ад 4 000 – да 2 800 - 2 700 гадоў назад

Жалезны век – 2 700 – 1 500 назад

У сваю чаргу, названыя вякі падзяляюцца на перыяды, якія адлюстроўваць асаблівасці і этапы іх развіцця – звычайна: *ранні* (ці ніжні), *сярэдні* і *позднi* (верхні) перыяды.

Гэтая перыядызацыя найбольш шырока ўжываецца беларускімі навукоўцамі, па ёй напісаны акадэмічныя і манаграфічныя даследаванні старажытнасці, на ей заснавана выкладанне названага перыяда ў падручніках, Менавіта археалагічнай перыядызацыі мы і будзем прытрымлівацца пры вывучэнні старажытнага грамадства

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на тэрыторыі Беларусі. Разам з тым, мы будзем ужываць і іншыя пераадызацыі, аб якіх ішла гаворка.

3. Пачатак засяленне людзьмі сучаснай тэрыторыі Беларусі.

Тэрыторыя сучаснай Беларусі, як і іншых краін Еўропы, ***не з'яўляецца*** прарадзімай чалавецтва.

Чалавек вылучыўся з жівёльнагна свету *каля 3 млн. гадоў назад*. Яго прарадзімай з'яўляецца тэррыторыі з больш спрыяльным дзя жыцця кліматам – Усходняя Афрыка, а магчыма, і Паўднёвая Азія. Каля 1 млн. гадоў таму 'чалавек пачаў засяляць поўдзень Усходняй Еўропы – Міжземнаморье, а затым Каўказ і поўдзень сучаснай Украіны.

Толькі каля 100 тыс. гадоў назад ён трапіў на тэрыторыю Беларусі.

Чаму так поздна адбылося засяленне старажытнымі людзмі тэрыторыі цэнтральнай і ўсходняй Еўропы?

Тлумачыцца гэта тымі прыроднымі умовамі, што складваліся на тут працяглы час. Старажытны чалавек ва ўсім – ў побыце, здабыванні ежы, умовах жыцця, сваіх занятках і іншым – **цалкам залежыў ад навакольнага ассяродзя, ад прыродных , у першаю чаргу – кліматычных, умоў.** А яны працяглы час былі вельмі ***неспрыяльнымі і нестабільнымі.***

Фарміраванне чалавека як біялагічнага віду адбывалася ва ўмовах прыкметнага пахаладання клімату, а яго распаўсюджанне на тэрыторыі Еўропы прыпадае і ўвогуле ***на ледавіковую эпоху.***

Максімальныя ***пахаладанні*** доўжыліся *сотні тысяч гадоў.* Разам з тым, зацяжныя халады змяняліся ***пацяпленнямі***, калі усталёўваўся больш спрыяльны для існавання чалавека клімат. Гэтыя кліматычныя ўмовы спрыялі эвалюцыі чалавека, вучылі яго прыстасоўвацца да розных экалагічных ўмоў, развівалі інталект, удасканальваць прылады для дабывання ежы, шукаць новыя крыніцы існавання, спосабы захавання жыцця.

Геалагічная перыядызацыя вылучае на тэрыторыі сучаснай Беларусі на працягу апошняга мільёна гадоў **5 ледавіковых эпох**:

Беларуская ледавіковая эпоха,

якая змянілася *белавежскім межледавіковым* перыядам;

Бярэзінская ледавіковая поха,(ахоплівае перыяд ад 500 да 350 тыс гадоў да н.э, т. ч. – цягнулася 150 тыс гадоў). У гэты час ледавік пакрываў тэрыторыю Беларусі па лініі Пінск – Мазыр – Рэчыца – Гомель, фактычна ім была пакрыта уся тэрыторыя Беларусі.

На змену Бярэзінскай ледавіковай эпохі прыйшоў *александрыйскі* межледавіковы перыяд, які цягнуўся каля 50 тыс гадоў. Тэрыторыя пакрылася лясамі, у якіх вадзіліся маманты, насарогі, алені і іншыя жывёлы.

Дняпроўская ледавіковая эпоха,(320 – 250 тыс. гадоў назад)

за якой прышоў *шклоўскі* межледавіковы перыяд

Сожская ледавіковая эпоха, (220 – 110 тыс. гадоў назад)

якую змяніў *муравінскі* межледавіковы перыяд

Паазерская ледавіковая эпоха. (100 – 14 тыс. гадоў назад)

Апошні **Паазерскі** ледавік *каля 100 тыс. гадоў* таму пачаў рухацца з боку Скандынаўскага паўвострава, распачаўшы тым самым перыяд *апошняга,* самага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

халоднага паазерскага абледзянення. На працягу Паазерскага ледавіковага перыяду меліся 3 фазы пацяплення і пахаладання.

Ваганні клімату прыводзілі да змен у раслінным ассяродзі. З наступленнем ледавікоў паступова знікаюць шыракалістыя лясы. Іх змяняюць хваёва лясы, а з наступленнем большых халадоў пераважалі бярозвыя рэдкалессі, ўласцівыя тундры.

Адпаведным клімату і расліннасці ў час паазерскага абледзянення быў і жывёльны свет, які складаўся з прадстаўнікоў *тундры* (паўночныя алені, пясцы, белыя курапаткі), *стэпу* (зубры, коні, зайцы, лісы, суслікі), *лесу* (алені, бурыя мядзведзі, казулі). Характэрнымі прадстаўнікамі прыледавіковай фаўны былі маманты і валасатыя насарогі.

Максімальнае пахаладанне апошняга ледавіковага перыяда пачалося каля 20 тыс. гадоў назад. Да 18 тысячагоддзя да н.э. ледавік дасягнуў **максімальнай мяжы,** якая на тэрыторыі Беларусі пралягала ад раёна Гродна, на поўнач ад Вілейкі і на усход да Оршы. На поўдзень ад гэтай мяжы існаваў шырокі пас прыледніковай пустыні, непрыгоднай для жыцця. На поўдні Беларусі была тундра. Землю Беларусі у гэты час скавала вечная мерзлата. У выніку наш край стаў цалкам непрыгодным для існавання тут чалавека.

Толькі ў ***15-тым*** тысячагоддзі пачалося прыкметнае *пацяпленне,* ледавік пачаў адступаць на поўдзень. Да ***14-га тысячагоддзя*** да н.э. ледавік цалкам пакінул тэрыторыю Беларусі. Наступае *позналедавіковы* перыяд, калі яшчэ здараліся зацяжныя пахаладанні, але ўсе часцей назіраліся хвалі *пацяплення*. Паступова сталі змяняцца *кліматычныя умовы,* раслінны і жывёльны свет. На тэрыторыі Беларусі зноў вяртаюцца *лясы,*, знікаюць холадалюбівыя жывёлы – валасаты насарог, маманты. У позналедавіковым перыядзе ў жывёльным свеце пануюць поўночныя алені.
Аднак адбывалася гэта паступова, на працягу значнага часу.

Толькі ў 10-м тысячагоддзі да н.э. канчаткова заканчваецца апошняя *Паазерская ледавіковая эпоха.*

Найбольшая пацяпленне адбываецца 6-тым тысячагоддзі да н.э.. Менавіта з гэтага часу ствараюцца *найбольш спрыяльныя ўмовы для сталага пражывання* ўсяго жывога, ў тым ліку і *людзей,* на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Ад гэтага часу у асноўным было завершана фарміраванне сучаснага ***рэльефу*** Беларусі.

У цэлым рэльеф Беларусі мае *раўнінны* характар. *Захад і поўнач* яе вышэйшыя, з няроўным узрогістым ладшафтам. На *поўдні* распасціраецца роўная балоцістая Палеская *нізіна.* На тэрыторыі Беларусі знаходзіцца водападзел паміж Балтыйскім і Чорным марамі – тут пачынаюцца вялікія рэкі Еўропы – ***Днепр, Прыпяць*** (да Чорнага мора) і ***Нёман, Дзвіна, Буг*** – да Балтыйскага мора. У цэлым на Беларусі налічваецца каля 20 тыс. рэк і каля 10 тыс. азёраў. Рэкі у старажытнасці мелі вельмі важнае месца у жыцці чалавека: - па іх прасоўваліся групы людзей, засвоўваючы новыя тэрыторыі (іншых дарог не было); - рэкі былі асноўнымі шляхамі зносін з іншымі племенамі;- на берагах рэк і у іх поймах будаваліся паселішчы; - на берагавых тэрасах і надпоймавых узвышшах размяшчалісчя палі, пасвілі жывёлу, нарыхтоўвалі сена; - у вадаёмах лавілі рыбу, палявалі на вадаплаўную птушку і іншую жывёлу.

Таму ў гістарычнай тэрміналогіі трывала ужываюцца і назвы тэрыторый па басейнам рэк – ***Верхняе Падняпроўе*** (басейн Дняпра і яго прытокаў на тэрыторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Беларусі), ***Панямонне*** (басейн Нёмана), ***Пабужжа*** (арэал р. Буг), ***Падзвінне*** (уздолж Заходняй Дзвіны), ***Пасожжа*** і інш., якімі мы будзем карыстацца у далейшым.

Такім чынам, засяленне і асваенне людзьмі тэрыторыі Беларусі патрэбна разглядаць як ***працяглы і вельмі складаны перыяд***, у якім *вызначальнае* месца належала кліматычным умовам. Толькі з ўсведамленнем працэсаў змены кліматычных умоў, дакладным ў'яўленнем іх працягласці па часу і тэрыторыі, магчыма зразумець старажытную гісторыю Беларусі.

Пры самастойнай рабоце карысна звернуцца да карты " Пашырэнне археалагічных культур на тэрыторыі Беларусі", змешчанайў "Атласе гісторыі Беларусі" (Мн.,2006. С. 5)., дзе азначаны ***межы зледзяненняў*** на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і Паазерскага.

Тэма 1.2 НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў КАМЕННЫМ ВЕКУ

План

1. Перыядызацыя каменнага века
2. Насельніцтва Беларусі ў раннім каменным веку (палеаліце)
3. Сярэдні каменны век (мезаліт) на тэрыторыі Беларусі
4. Насельніцтва Беларусі ў позднім каменным веку (неаліце)

1. Перыядызацыя каменнага века

Самы старажытны перыяд у гісторыі чалавецтва – **каменны век.** Ён пачаўся каля ***2 –х млн. гадоў*** назад, калі чалавек выдзеліўся з жывотнага свету , і завершыўся каля ***8 – 4 тыс гадоў*** назад са з'яўленнем металічных вырабаў.

Каменны век – *найбольш працяглы па часу, вельмі складыны* перыяд у гісторыі чалавецтва. На тэрыторыі Беларусі на яго прыпадае некалькі перыядаў ледавіковага пахаладання (аб чым мы казалі на папярэдняй лекцыі), а таксама з'яўленны прыдатных для пражывання жывёлы і людзей перыядаў пацяпленняў.

Галоўнай вызначальнай рысай гэтага перяда з'яўляецца вырабы чалавекам прылад працы з **каменю.**

Гэта быў першы прыродны матэрыял, які чалавек навучыўся апрацоўваць і выкарыстоўваць у сваіх разнастайных мэтах. Разам з тым, на працягу часу старажытны чалавек пастаянна *ўдасканальваў тэхніку апрацоўкі* камню, узнікаюць *новыя заняткі* людзей, пашыраўся дыапазон выкарыстання прылад працы, з'яўляюцца новыя асаблівасці у *сацыяльнай арганізацыі* першабытнага грамадства, назіраліся *адметнасці* і ў іншых праявах *матэрыяльнай і духоўнай культуры.* Таму каменны век нельга лічыць аднародным, у ім дакладны вызначаюцца шэраг перыядаў.

Навукоўцы падзяляюць каменны век на наступныя перыяды:

1. Палеаліт (з грэч. мовы: *палеа* старажытны, *літас* – камень) старажытны каменны век. Ён мае агульныя межы ***ад 3 млн. гадоў да н.э да 10 тысячагаддзя да н.э.***

У сваю чаргу **палеаліт** падзяляют на:

- ***ранні (ніжні) палеаліт*** Ніжні (ранні) палеаліт (3 – 2,5 млн. – 100 тыс. г.). У гэты час назіраецца біялагічная эвалюцыя чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- ***сярэдні палеаліт*** (т.зв. эпоха *мусцье,* ці *мустьерская эпоха* па агульнаеўрапейскай перыядызацыі), на тэррыторыі Беларусі ён адпавядае ранняму, ці ніжнему пелеаліту, датуецца перыядам ад **100 тыс гадоў да 40 – 35 тысячы гадоў да н.э.**

- ***позднi (верхні) палеаліт*** (т.зв. *фінальны*) датуецца на тэрыторыі Беларусі ад 40 тыс. гадоў да 10 – 9 тыс. да н.э.

2. Мезаліт *(меза* – сярэдні) сярэдні каменны век датуецца на **Беларусі 9 – 5 тыс. да н.э.** У сваю чаргу мезаліт частка даследчыкаў падзяляюць таксама на *ранні, сэрэдні і позднi.*

3. Неаліт *(неа – новы) новы каменны* век, заключны этап каменнага веку. На Беларусі – перыяд **5 – 3 тысячагоддзяў да н.э.** У межах названага часу ў навуковых даследаваннях сустракаюцца вызначэнні таксама *ранняга, сэрэдняга і позднягa* ***неаліту.***

Названая перыядызацыя будзе намі ўзята за аснову пры вывучэнні гісторыі першабытнага грамадства.

2. Насельніцтва Беларусі ў раннім каменным веку (палеаліце)

Калі пачалося засяленне тэрыторыі сучаснай Беларусі старажытнымі людзьмі?, калі першыя людзі з'явіліся на гэтай тэрыторыі? – пытанні, адказ на якія грунтуецца выключна на археалагічных матэрыялах, да сённяшняга часу з'яўляецца навуковай праблемай, якая падлягае далейшаму даследаванню.

Ніжні (ранні) палеаліт.

Ці быў чалавек на тэрыторыі Беларусі ***ў ніжнім (раннім) палеаліце?***

Мы ужо казалі, што ў перыяд да 100 тысяч гадоў да н.э. быў часам , калі ледавікі перыядачна пакрываалі усю тэрыторыю Беларусі. Прыдатнымі для жыцця раслiннага і жывельнага свету былі толькі асобныя перыяды пацяпленняў. Таму не выключна, што магчыма, у часы міжледавікоўя клімат быў спрыяльны для пранікнення сюды першых людзей. Існуюць і укосныя сведчанні таму.

Каля *Жытоміра* (на Валыні), недалека ад тэрыторыі Беларусі, знойдзены *прылады працы* найстаражытнага чалавека.

У *Віцебскай вобласці* знойдзены рэшткі *паўднёвага слана*. Гэта характарызуе сабой фаўністычны комплекс, што звычайна суправаджаецца знаходкамі прылад працы ашэльскай эпохі раняга палеаліта. Але ледавікі знішчылі рэшткі чалавечай культуры таго часу.

Таму ў першым томе "Археалогіі Беларусі" зроблена агульнапрынятая выснова, што "Толькі ў перыяд сожскага і паазрскага зледзяненняў крайні поўдзень і паўднёвы ўсход Беларусі былі свабодныя ад ільду, таму *пошукі дамусцьерскага насельніцтва на Беларусі бесперспектыўныя*" (с. 23).

Сярэдні палеаліт.

Больш верагодныя сведчанні аб першапачатковым засяленні паўднёва-усходняй часткі тэрыторыі сучаснай Беларусі маюць дачыненне толькі да ***сярэдняга палеаліта*** (ці *мусцьерскай эпохі*), які пачынаецца ад 100 тыс. гадоў да н.э.

У той час у Еўропе з'явіліся і панавалі палеаантрапы – *неандартальцы.*

Аб пранікненні людзей таго тіпу на тэрыторыю Беларусі сведчаць знойдзеныя археолагамі каменныя, зробленыя *з крэмня прылады* працы на левым беразе Дняпра,

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

каля вёсак

Абідавічы (Быхаўскага раёна) – знайдзена скрэбла

Свяцілавічы (Веткаўскага раёна) – востраканечнік

Клеявічы (Касцюковічскі раён)

Падлужжа (Чачэрскі раён) **(**у навуцы атрымала назву ***Бердыжская стаянка***) – скрэбла, нож.

Беларускія археолагі выказваюць думку, што гэтыя знаходкі можна аднесці да мусцьерскай эпохі., датуюцца яны прыкладна 40 – 30 тысячагоддзямі да н.э.

Калі гэта так, то *неандарталец* прадстаўляў сабой першых насельнікаў Беларусі.

У сацыяльным стане неандартальцы аб'ядноўваліся ў невялікія (ў 20-30 дарослых асоб) групы – *т.зв. "праабшчыны"* і сумеснымі намаганнямі шукалі харчаванне і бараніліся ад звяроў.

Прылады працы першымі пачалі вырабляць менавіта неандартальцы, за што набылі назву "чалавек умелы". З крэмню рознымі тыпамі апрацоўкі, ў асноўным *адколамі, рэтушаваннем* выраблялі крамянёвыя **востраканечнікі** для дзідаў (коп'яў) Для разбірання дзічыны - **ручныя рубілы, скрэблы, нажы.** Для вырабу адзення **-скрабкі, шылы, праколкі**.

Асноўнымі заняткамі з'яўлялася паляванне і збіральніцтва ядомых раслін і карэнняў. Палявалі на мамантаў, валасатых насарогаў, аўцабыкоў, аленяў, пясцоў і іншых жывёл, якія існавалі ў прыледавіковай зоне.

Гаспадарка людзей гэтага перыяда мела ***прысвойваючы характар*** – людзі жылі толькі кошт таго, што бралі, атрымлівалі (прысвойвалі) з навакольнага ассяродзя.

Існаванне прысвойваючай гаспадаркі абумоўлівала яго ***вандроўны лад*** жыцця. Каб жыць ва ўмовах халоднага клімату, чалавек навучыўся карыстац-ца ***агнём, вырабляць адзенне*** са скуры і меху забітых звяроў, ***будаваць жытло*** з касцей і рагоў буйных жывёл, пакрытае скурамі.

Позднi (верхнi) палеаліт

Прыкладна да 40-35 тысячагоддзяў таму пачынаецца ***позднi, цi верхнi палеалiту.*** На змену ***неандартальцу*** прыйшоў чалавек сучаснага фізічнага тыпу - ***краманьенец,*** або «чалавек разумны».

Маюцца больш несумненныя сведчанні, што краманьёнцы працяглы час, *падчас пацяпленняў у перыяд паазерскага ледавікой эпохі*, засялялі паўднёвы усход Беларусі. Сведчаннеі таму з'яўляюцца адкрытыя беларускімі археолагамі рэшкі *пасельшчаў – стаянак* людзей таго часу.

Самые старажытнае паселішча *краманьёнцаў* на Беларусі адкрыта каля вёскі **Юравічы** Калінкавіцкага раёна, на р. Прыпяці (датавана каля 26 тыс. гадоў таму)). Да краманьёнцаў археолагі адносяць і найбольш даследаванную і вядомую стаянку каля вёскі ***Падлужжа*** (Чачэрскі раён) на р. Сожы. У навуцы яна атрымала назву ***Бердыжская стаянка***, якае датуецца часам каля 23 тыс. гадоў да н.э.. Прыкладна да таго перыяду адносяцца і стаянкі ***Берасценава*** (Аршанскі раён) і каля в. ***Лудчыцы*** (Быхаўскі раён).

Прылады працы з крэменю гэтага перыяда вызначаліся большай дасканаласцю, а ў ліку іншых матэрыялаў з'явіліся *косць і рог.* Сярод знаходак - рэшткі каркасаў жытла,

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

крамянёвыя востраканечнікі, нажы розных тыпаў, кінжалы, скрабкі, праколкі, наканечнікі коп'яў і інш. З'яўляюцца і сякерападобныя інструменты. Асобныя касцяныя вырабы былі аздоблены арнаментам у выглядзе шасцікутнікаў і зігзагападобных рысак.

У ***сацыяльных адносінах*** адбываецца пераход ад *першабытнай абшчыны* да радавога ладу. Паляванне на буйных жывёл – мамантаў, насарога, мядведзёў, зубраў, а таксама пражыванне ў прыледавіковых ўмовах патрабавалі *сумесных дзеянняў* шматлікой колькасці людзей. Таму асноўнай сацыяльна-гаспадарчай адзінкай позняга палеаліту з'яўляўся калектыў родзічаў, які атрымаў у навуцы вызначэнне ***"радавая абшчына".*** Яна складаўся з некалькіх радоў, размешчаных на асобных стаянках. Маёмасць, тэрыторыя для палявання, збіральніцтва і лоўлі рыбы, здабытае харчаванне належала ўсяму роду. Пры гэтым жанчына мела асаблівы статус: менавіта па яе лініі вялася роднасць, а шлюбныя адносіны паміж блізкімі родзічамі забараняліся (экзагамія). З гэтай нагоды дарослыя мужчыны мусілі шукаць пару ў іншай родавай абшчыне. Насельніцтва таго часу не было шматлікім. Семьі, якія жылі у асобным жытле, збудаваным з жэрдак і касцёў, пакрытых карой ці скурамі, налічвалі 5 – 7 чалавек. Некалькі такіх семьяў складалі абшчыну колькасцю ад 25 да 50 чалавек.

Гаспадарчыя заняткі людзей гэтага перыяда засталіся ранейшымі – паляванне, збіральніцтва, лоўля рыбы.

15 тысячагоддзяў таму апошні ледавік пачаў адступаць на поўнач, а праз 1 тыс. гадоў ледавіковая эпоха скончылася. 10 тыс. гадоў таму ўсталяваліся сучасныя ўмерана кантынентальны клімат, флора і фаўна. Пачаўся перыяд ***фінальнага палеаліту.***

Ранейшыя аб'екты палявання - мамант і калматы насарог вымерлі або адступілі на поўнач. З'яўленне лясных масіваў, шматлікіх рэк, азёр, балот, а разам з імі прадуктаў палявання, збіральніцтва і рыбалоўства значна павялічылася.

У першабытных людзей значна павялічылася магчымасць для засваення новых зямель. Паўсюдна тэрыторыя Беларусі стала засяляцца людзьмі.

Пачынаючы з эпохі *фінальнага палеліта* (14 – 10 тыс. гадаў назад) можна казаць аб пастаянныі *мэтанакіраваным засяленні* тэрыторыі Беларусі рознымі племенамі паляўнічых на паўночнага аленя. Менавіта паляванне на паўночнага аленя прывяло да з'яўлення новай прылады, больш эфектыўнай зброі – *лука і стрэл*.

Насельніцтва фінальнапалеатычнага часу на тэрыторыі Беларусі складалася з розных прышлых плямен, таму і адносілася да розных культурных супольнасцяў. Археолагі вызначаюць шэраг археалагічных культур:

- *грэсская культура* (правабярэжжы Дняпра, у Падняпроў'і);
- *свідэрская культура* (паўднёвы захад і захад Беларусі, у верхняў Прыпяці, на сярэднім і ніжнім Панямонні);
- *лінгбійская культура* і
- *арэнсбурская культура* на захадзе Беларусі.

Кожная з іх мела свае *асаблівасці* у формах наканечнікаў копій і стрэл, разнастайных нажоў, разцоў, скрабкоў, іншага крамяневага інвентару.

Гаспадарчыя заняткі людзей, удасканаленне сацыяльных адносін, назапашванне ведаў аб навакольным асяроддзі фармавалі адпаведны светапогляд. З'яўляюцца і першыя **вераванні** людзей, якія былі цесна звязаны з іх штодзенным побытам. Спробы чалавека растлумачыць значнасць тых ці іншых прыродных з'яў, а таксама фізіялагічных працэсаў (сон, дыханне, смерць) трансфармаваліся ў рэлігійныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўяўленні: веру ў ***існаванне душы (****анімізм****), духаў*** (*аніматызм*), ***звышнатуральныя ўласцівасці прадметаў*** (*фетышызм*), ***звышнатуральную значнасць для роду той ці іншай жывёлы ці расліны*** (*татэмізм*). Каб задаволіць душы продкаў, а паляванне або лоўлю рыбы зрабіць удалымі, людзі здзяйснялі пэўныя магічныя абрады. З цягам часу функцыя іх арганізатара засяродзілася ў руках аднаго з суродзічаў - ***мага*** (*вешчуна, калдуна і* г. д.).

3. Сярэдні каменны век (мезаліт) на тэрыторыі Беларусі

Мезаліт - сярэдні каменны век, эпоха паміж палеалітам і неалітам. На тэрыторыі Беларусі вылучаецца *ранні* (9 – 7е тысячагоддзі на д.э.) і *позднi* (6 – 5-е тысячагоддзі да н.э.) Мезаліт.

У першым перядзе Мезаліта адбываецца засяленне берагоў рэк і азёр у адноўленнай пасля ледавіковай эпохі лясной зоне. Заўважым, што менавіна **рэкі былі першымі шляхамі зносін**, уздолж іх ішло рассяленне людзей, асваенне новых тэрыторый.

Эпохаі мезаліта была больш *сапрыяльнай* для жыцця чалавека. Каля 10 тыс. гадоў таму ўсталяваліся ***сучасныя ўмерана*** *кантынентальны клімат, флора і фаўна*. З'яўленне лясных масіваў, шматлікіх рэк, азёр, балот прывяло да з'яўлення новых відаў *жывёлы* - лісаў, мядзвядзёў, дзікоў, зайцаў і іншых, паляванне на якіх было больш лёгкім. У вадаёмах значна павялічылася колькасць *рыбы,* а таксама *птушак*, асабліва вадаплаўных (качкі, гусі, цяцеркі). Вынікам стала значнае павялічэнне *колькасці прадуктаў* палявання, збіральніцтва і рыбалоўства. Гэта давала магчымасць харчавацца больш значнай колькасці людзей, зрабіла існаванне людзей больш трывалым.

Асновай гаспадаркі насельніцтва перыяда мезаліта заставаліся прысвойваючыя яе формы.

Вядучаю ролю, як і раней адыгравала **паляванне.** Але яно набыло новыя рысы. Пры паляванні ў лясной зоне і на адносна невялікіх жывёл больш эфектыўным стала выкарыстанне ***лука са стрэламі.*** Шырокае распаўсюджанне набывае вырабы каменных наканечнікаў для стрэл розных формаў. Па ранейшыму эфектыўным было выкарыстанне капья.

Спосабы палявання на буйных жывёл у мезаліце былі разнастайныя:

Гон - (праследаванне жывёлы да яе знясілення)

Высочванне (каб падабрацца бліжэй да здабычы выкарыстоўваліся маскі)

Загон на лоўчыя ямы

У позднi перыяд мезаліта, пры распаўсюджанні палявання на дробную лясную дзічыну *загонае* паляванне паступова саступіла месца больш прагрэсіўнаму метаду - паляванню *індывідуальнаму.* Значным чынам таму паспрыяла вынаходніцтва лука і стрэл.

У гэты ж час чалавек прыручыў ***сабаку,*** які дапамагаў у паляванні на звяроў і птушак, а таксама ў ахове чалавечага жытла.

У перыяд мезаліту значна павялічваецца роля **рыбалоўства,** якое становіцца не менш важным заняткам, чым паляванне. Менавіта у мезаліце з'явіліся першыя спецыялізаваныя для рыбалоўства прылады – ***кручкі з лескай.*** Здабывалася рыба таксама з дапамогай касцяных гарпуноў і кручкоў, плеценых кашоў і сетак.

Вялікім вынаходніцтвам чалавека зрабіліся ***плыты*** і выдзябаныя з камля дрэва ***чаўны***. Яны сталі выкарыстоўвацца для лоўлі рыбы і ў якасці транспартнага сродку.

Такім чынам, максімальна *спрыяльныя кліматычныя ўмовы* (існуе нават

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вызначэнне ў адносінах да 7 – 6 тысячагоддзяў да н.э. як “кліматычны оптымум”), *удасканаленне прылад працы і спосабаў* здабычы даюць магчымасць лічыць перыяд ***мезаліта часам росквіту прысвоўваючай гаспадаркі.***

У перыяд мезаліта у параўнання з фінальнапалеатычнай эпохай адбыліся важныя змены у ***сацыяльных адносінах.***

Галоўнае з іх была тая, што людзі сталі весці больш ***аседлы*** вобраз жыцця, месца жыхарства людзей становяцца больш пастаяннымі.

Наяўнасць дастатковай колькасці сродкаў харчавання ў параўнаўча лакальнай (кампактнай, невялікай тэрыторыі) прасторы адкідвала патрэбу чалавека ў перамене месца жыхарства. Людзям ужо не было патрэбы часта змяняць месца свайго абітання, пастаянна рухацца ў пошуках сродкаў харчавання. Цяпер насельніцтва, як правіла, рабілася *пастаянным* (аўтахтонным), будавала ***паселішчы*** (больш-менш працяглыя месца жыхарства, а не каротка часовыя стаянкі), ***асвойвала, абжывала тэрыторыю***, (а не проста прахадзіла праз яе). Будаваліся паселішчы паблізу вадаёмаў, на ўзвышшы берагоў рэк. Галоўным патрабаванням пры выбары пастаяннага месца жыхарства была, як правіла, блізасць да багатага рыбай вадаёма, а таксама радовішчаў (залежаў) крэмлю.

Таму помнікамі эпохі мезаліта з’яўляюцца адкрытыя археолагамі ***мезалітычныя стаянкі,*** якіх налічваецца каля **120-ці.,** што сведчыць аб тым, што насельніцтва на тэрыторыі у параўнанні з перыядам палеаліта значна павялічылася. Большасць іх знайдзена ўздоўж Дняпра, Прыпяці і Нёмана.

Родавыя абшчыны больш цесна кантактавалі паміж сабой, утвараючы сваяцкія супольнасці — ***плямёны,*** якія пражывалі на адной тэрыторыі, мелі агульныя рысы матэрыяльнай і духоўнай культуры.

- У перыяд мезаліту працягвалі існаваць плямены **грэсскай культуры** (у Падняпроў’і);
- у Падняпроў’і і ва Усходнім Палессі жылі плямены **днепра-дзяснінскай (сожскай)** культуры;
- на поўначы Беларусі у мезаліце былі плямены **кундскай** культуры;
- захад Беларусі засялялі плямены **нёманскай** культуры;
- на поўдні Беларусі археолагі знаходзяць помнікі плямен **кудлаеўскай, яніславіцкай** культур.

Назвы культур даны сучаснымі археалагамі, як правіла, ў залежнасці ад тэрыторыі, ці па назвах насельных пунктаў, дзе былі адкрыты стаянкі, пасельшчы з тыповымі для іншых рысамі матэрыяльнай культуры – спосабамі апрацоўкі камню, асаблівасцямі вырабу прылад працы, іх упрыгожванняў і г.д.

Больш дакладна аб асаблівасцях названых культур эпохі мезаліту мы пагаворым на семінарскіх занятках (Гл.: Гісторыя Беларусі (пад рэд. М.Касцюка) Т.1. С.31 – 34)

4. Насельніцтва Беларусі ў позднім каменным веку (неаліце)

Неаліт – (новы каменны век) – апошні (поздні) перыяд каменнага веку. На тэрыторыі Беларуси пачаўся з канца 5-га тысячагоддзя да н.э. і скончыўся 2000 – 1800 гады да н.э.

Прыроднае ассяродзе: Кліматычныя умовы на працягу неаліту не былі аднолькавым. *Ранненеалітычны* перыяд характэрызаваўся вельмі кліматычным *оптымом,* калі сэрэднегадавая тэмпература была на 1,5 – 2 градуса вышэй за сучасную. У подненеалітычны час назіралася некаторое *паніжэнне* тэмпературы

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

ассородзя, клімат быў блізкі да сучаснага на тэрыторыі Беларусі. Гэта знаходзіла свае адлюстраванні у распаўсюджанні лясоў, іншага расліннага міру, складзе жывёльнага ассородзя. У прынцыпе, яно заставалася такім жа, як і у эпоху поздняга мезаліту.

Гаспадарчае жыццё. Яно якасна змянялася на працягу неаліта, ў ім адбываліся больш хутка радыкальныя змены, якія далі падставу нават для ужывання гісторыкамі такога вызначэння, як "***неалітычная рэвалюцыя".***

У *раннім неаліце* праця працягвала *даміпіраваць прысвойваючая* гаспадарка – паляванне, рыбацтва і збіральніцтва. Паляпшалася паляўнічая зброя, росквіту дасягнула рыбная лоўля – выкарыстоўваліся кручкі, гарпуны, грузілы, паплаўкі, сеткі і інш. Прыкментае месца працягвала займаць збіральніцтва (збіралі не толькі зерня, але і лясныя і вадзяныя арэхі, жалуды, карані і іншыя часткі раслін, грыбы, ягады).

Прысвойваючая гаспадарка, заснаваная на збіральніцтве, паляванні і рыбнай лоўлі, абапіралася на *ўдасканаленыя* прылады працы і спосабы здабычы прадуктаў. На якасна новы ўзровень узнялася апрацоўка каменю, дрэва, косці, скуры. З'явіліся інструменты *для шліхтавання і нават свідравання* каменю.

Попыт на крэмень абумовіў яго здабычу ровым, ***шахтавым*** метадам. Крэменю, што залягалі на паверхні зямлі, было шмат, але ён быў высахлы і падыходзіў для вырабу дробных прылад працы. Для вырабу такіх вялікіх рэчаў, як сякеры і цеслы, боль падыходзіла сыравіна, што залягала ў зямноў толшчы. Таму і з'явілася дабыча крэмню спачатку ў невялікіх ямах і траншэях, а потым і ў калодзежах і нават **шахтах**.такім чынам, адбываецца пераход ад *пошуку і збіральніцтва* крэмню да мэтанакіраванай працы па яго ***здабычы.***

Аб ўстройстве і спосабах дабычы ў крэмнездабываючых шахтах будзем гаварыць на *семінарскіх занятках*, для чаго карысна пазнаёміцца з манаграфіяй: ***Чарняўскі М.М., Кудрашоў В.Я. Ліпніцкая В.Л. "Старажытныя шахцёры на Росі".*** (Мінск, 1996 г.), якая заснавана на даслеваняях археалагічных помнікаў поўдня Беларусі., асабліва Краснасельскіх шахтаў.

Галоўным *здабыткам і прынцыпова новым* у гаспадарчых занятках людзей перыяда сярэдняга позднягa неаліта быў пераход *ад прысвойваючай гаспадаркі* да ***вытворчых формаў*** гаспадаркі. Мэтанакіраваная вытворчая дзейнннасць павінна была ***зменьшыть залежнасць*** людзей у задавальненні сваіх патрэб ад *навакольнага ассяродзя, выпадковасці* ў паляўніцтве, рыбнай лоўлі і збіральніцтве.

Гісторыкі звязваюць з неалітам узнікненне *чатырох* формаў такой ***вытворчай дзейнасці***:

1. **земляробства,** якое узнікла на падставе збіральніцтва
2. **жывёлагадоўля,** якое выросла з паляўніцтва

3. **крэмняздабыча,** (а таксама **ш**ліфаванне і свідраванне каменных вырабаў;
4. **выраб** ***глінянага посуду.***

Аднак патрэбна разумець, што з'яўленне гэтых новых формай дзейнасці чалавека *не прывяло да адказу* ад ранейшых формай здабычы харчавання. Паляўніцтва, рыбалоўства, збіральніцтва *заставаліся як і раней важнай крыніцай* задавальнення патрэб чалавека, але гэтыя формы паступова (не адразу) страчвалілі сваё першынство, дамініруючае становішча, пераходзілі ў разрад *дапаможных заняткаў.* Новыя формы вытворчай гаспадаркі з цягам часу даказвалі сваю больш высокую эфектыўнасць ва устойлівым забяспячэнні патрэб людзей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Зараджэнне земляробства на тэрыторыі Беларусі адносіцца да перыяда паміж **4** і 3-м тысячагоддзямі да н. э.. На паўднёвым захадзе Беларусі ў плямён нёманскай і днепраданецкіх культур збіральніцтва злакавых раслін абумовіла вынаходніцтва прымітыўнага (матычнага або агароднага) земляробства. Амаль на кожным неалетычным паселішчы поўдня Беларусі знойдзены крамянёвыя *сярпы* (асновы сярпоў былі зроблены з рога або дрэва, у пазы якіх укладваліся крэмянёвыя лезы), таксама і масіўныя *жніўныя нажы*. Пад прыдатныя пад пасевы злакавых раслін землі расчышчаліся невялікія кавалмкі зямлі, як правіла, паблізу ад паселішчаў. Для вырубкі лесу выкарыстоўваліся больш масіўныя крэмневыя сякеры са звужаным абушком і пашыраным выпуклым лязом, якія пастаянна удасканальваліся і набывалі падобны на сучасны выгляд.

Жывёлагадоўля зарадзілася і распаўсюджвалася на тэрыторыі Беларусі прыкладна адначасова з земляробствам – у сярэднім і позднім неаліце. Археалагічныя раскопкі стаянак таго часу даюць падстапы сцвярджаць, што паступова людзі прыручылі, пачалі разводзіць і гадаваць ***кароў, свіней, коз і авечак, а таксама коней.*** Гэта зрабіла забяспячэнне мясам людзей больш трывалым, знаходзілі прыямяненні таксама скура жывёлы, якая ішла на адзенне, косткі і рогі.

Крэмнездабыча. Пашырэнне попыту на прылады працы, якія у неаліце, як і раней, выраблялiся перш з крэменю, абумовіў яго здабычу новым, ***шахтавым*** метадам. Крэменю, што залягалі на паверхні зямлі, было шмат, але ён быў высахлы і падыходзіў для вырабу дробных прылад працы. Для вырабу такіх вялікіх рэчаў, як сякеры і цеслы, больш падыходзіла сыравіна, што залягала ў зямноў толшчы. Таму і з’явілася дабыча крэмню спачатку ў невялікіх ямах і траншэях, а потым і ў калодзежах і нават **шахтах**. Такім чынам, адбываецца пераход ад *пошуку і збіральніцтва* крэмню да мэтанакіраванай працы па яго ***здабычы.***

Аб ўстройстве і спосабах дабычы ў крэмнездабываючых шахтах будзем гаварыць на *семінарскіх занятках*, для чаго карысна пазнаёміцца з манаграфіяй: ***Чарняўскі М.М., Кудрашоў В.Я. Ліпніцкая В.Л. “Старажытныя шахцёры на Росі”.*** (Мінск, 1996 г.), якая заснавана на даследаваннях археалагічных помнікаў поўдня Беларусі, асабліва Краснасельскіх шахтаў, што знаходзяцца на р. Рось у Ваўкавыскім ра1не.

Выраб глінянага посуду. З пачаткам вытвараючай і ўдасканаленнем прысвойваючай гаспадарак колькасць прадуктаў харчавання значна павялічылася, што дало магчымасць стварэння запасаў. Патрэба ў іх захаванні прывяла да вырабу з гліны адмысловых ёмістасцей з іх далейшым абпальваннем у **агні.** Такім чынам адбылося вынаходніцтва керамікі - першага ў свеце штучнага матэрыялу, які значна палепшыў жыццё чалавека.

Неалітычны посуд на тэрыторыі Беларусі з’яўляецца сваеасаблівым адлюстраваннем змен у гаспадарчых занятках, умовах быту, а таксама развіцця культуры і этнічных змен. Менавіта па форме посуду, спосабах яго апрацоўкі, асаблівых рысах упрыгожвання археолагі вызначаюць нават класіфікацыю культур пляменаў, што насялялі тэрыторыю Беларусі.

У *раннім* неаліце пераважалі *яйцападобныя гаршкі, з вострым дном*, ці прыкругленным. Такая форма была абумоўлена тым, што гаршкі ставілі (утыкалі) у вогнішчы. Краі вянцоў маглі быць простымі ці крыху зведзенымі да сярэдзіны, а таксама злёгку адагнутымі.

У *позднім* неаліце з’яўляюцца новыя формы гаршкоў – з’яўляюцца *пласкадонныя* гаршкі (іх можна было ставіць на роўны под на агнішчы, а таксама на стол і паліцу),

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУ

з’яўляюцца гаршкі з *выдзеленай шыйкай і алдагнутым вянцом* (выкарыстоўваліся для малочных страў і напояў), а таксама выраб *місак, амфараў, кубкаў* (выкарыстоўваліся для прыему ежы). Усё гэта з’явілася вынікам больш разнастайнага харчавання, з’яўленнем новых спосабаў прыгатавання ежы, а таксама пранікненнем на нашу тэрыторыю іншакультурных людзей, якія прыносілі свае керамічныя традыцыі.

Такім жа значным вынаходніцтвам зрабілася *ткацтва*, якое дазволіла вырабляць адзенне на цёплы час года. Чалавек навучыўся з валокнаў дзікарослых раслін рабіць ніткі, якія выкарыстоўваліся для шыцця і ткацтва У канцы неаліту ніткі пачалі рабіць і з воўны свойскай дробнай рагатай жывёлы – авечак і коз.

Такім чынам, новыя занятки людзей у неаліце, асабліва сярэднім і позднім, сведчылі аб паступовым пераходзе ***ад прысвойваючай гаспадаркі да вытвараючай. Гэты якасна новы этап у гісторыі чалавецтва прынята называць «неалітычнай рэвалюцыяй».***

Сацыяльныя адносіны. Пад уздеяннем вялікіх гаспадарчых і духоўных перамен родавая арганізацыя дасягнула свайго росквіту. Узмацненне сувязей паміж родавымі абшчынамі і павелічэнне ліку родзічаў сталі падставай пераходa да эндагаміі - звычаю абавязковага для мужчын шлюбу толькі з жанчынамі свайго племені, што значна спрыяла яго кансалідацыі, выпрацоўцы ***адзінай мовы, традыцый, духоўных каштоўнасцей.***

Развіццё ўсіх форм прысвойваючай і вытвараючай гаспадарак станоўча адбівалася на дэмаграфічнай сітуацыі, аб чым, у прыватнасці, сведчыць больш за 600 знойдзеных археолагамі неалітычных паселішчаў, дзе маглі пражываць каля 5-6 тыс. чалавек.

Вытворчы характар гаспадаркі абумовіў размяшчэнне паселішчаў, зручнае для жывёлагадоўлі і падсечнага земляробства. Жытло мела напалову зямлянкавую і слупавую канструкцыю і аздаблялася ачагом.

Павелічэнне прадукцыйнасці працы вяло да яе ***індывідуалізацыі.*** Пры захаванні агульнародавай уласнасці працэс накаплення прылад працы і атрыманых прадуктаў набыў тэндэнцыю да канцэнтравання ў распараджэнне асобных *сем'яў на чале з мужчынам*, сацыяльная роля якога ў гэты час значна *ўзрасла*. Да гэтага мела дачыненне і тое, што новыя заняткі – земляробства і жывёлагадоўля, а таксама дабыча крэменю, патрабавалі значнай фізічнай сілы. Выраб жа посуду з керамікі, як і рыбалоўства і збіральніцтва заставаліся пераважна заняткамі жанчын. Таму цяпер жанчына, ўступаючы у шлюб, павінна была пераходзіць у чужы род. З гэтага часу роднасць пачала весціся па мужчынскай лініі. Вялікая патрыярхальная сям'я складалася з яе галавы (бацькі), жонкі, а таксама жанатых сыноў і іх дзяцей.

Імкненне мужчыны як галавы сям'і абмежаваць колькасць карыстальнікаў і спажыўцоў сямейнай маёмасцю толькі дзецьмі і іншымі бліжэйшымі родзічамі прымушала яго весці *асобную* ад іншых членаў рода *гаспадарку*. Распад родавых абшчын на вялікія патрыярхальныя сем'і паслужыў першам этапам яе разлажэння.

Акрамя таго, сталі разбурацца існаваўшыя тэрытарыяльныя межы пражывання родаў. Для кіравання новай тэрытарыяльнай абшчынай спатрэбілася вылучэнне адмысловай групы людзей - патрыярхальнай знаці. У гэты ж час назіраецца рост ваенных сутыкненняў паміж родамі і плямёнамі за перадзел агульнай і захоп чужой маёмасці. Адпаведна ўзрасла роля мужчын-воінаў. З іх удзелам адбывалася абмеркаванне родавых спраў, абранне старэйшын, вызначэнне адносін з суседнімі абшчынамі. Такі грамадскі лад мае назву ваеннай дэмакратыі. Павелічэнне ваенных сутыкненняў абумовіла з'яўленне адмысловых паселішчаў, умацаваных абарончымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пабудовамі, - гарадзішчаў.

У перыяд неаліту на тэрыторыі Беларусі археолагі вызначаюцца сваеасаблівыя рысы матэрыяльнай і духоўнай культуры розных плямен, як існаваўшых тут раней, у перыяд мезаліту, так і з'яўвіўшыхся зноў. Выдзяляюцца яны і па геаграфічнаму прынцыпу, звязаннаму з буйшейшімі рэкамі і іх прытокамі.

- На *Усходнім Палессі* жылі плямёны ***днепра-данецкай культуры.***

- Неалітычнае насельніцтва *Падняпроў'я* засялялі плямёны ***верхнедняпроўскай культуры,*** якая сфарміравалася ў выніку развіцця мясцовай познамезалітычнай культуры. Выяўлена не менш 500 стаянак верхнеднепроўцаў.

- На тэрыторыя *Заходняй Беларусі,* што была населена плямёнамі з грабеньчата-накольчатай керамікай, выдзяляюцца плямёны ***нёманскай*** археалагічнай культуры.

- Тэрыторыю *Паўночнай Беларусі* ў неаліце засялялі плямёны ***нарвенскай*** культуры, якая вела свае паходжанне ад мясцовага насельніцтва кундскай мезалітычнай культуры.

Аб тэрыторыях рассялення названых культур, іх арэоле у пэху неаліта дае ўяўленне карта "Каменны век" у "Атласе гісторыі Беларусі" (гл. С.6). Асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры названых плямёнаў мы разгледзім на семінарскіх занятках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма 1.3 Бронзавы век на Беларусі

План:

1. Агульная характарыстыка бронзавага века.
2. Гаспадарка бронзавага веку.
3. Насельніцтва перыяду бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі

1. Агульная характарыстыка бронзавага веку.

Бронзавы век, які пачаўся на большай частцы Еўрапейскага кантыненту ў канцы 3-га – пачатку 2-га тысячагоддзя да н.э. і працягваўся да пачатку 1-га тысячагоддзя да н.э. – адна з *найважнейшых эпох* у гісторыі першабытнага грамадства. Звязана гэта з узнікненнем і пачаткам распаўсюджання ***металургіі.*** Людзі пачалі дабываці і плавіць з пачатку легкасплаўныя матэрыялы – *медзь і бронзу* (бронза – сплаў медзі с волавам, свінцом, цынкам, з дабаўленнем мышьяку), якія не патрабавалі высокай тэмпературы.Так, бронза плавіцца пры адносна невысокай тэмпературы ў 700 - 900 градусаў. Сярод зноўдзеных на Паўднёвай Беларусі бронзавых вырабаў большасць складалась з алавяна-свінцовай бронзы, затым ішла алавяна-свінцова-мышьяковая бронза, потым – алавянная і алавяна-мышьяковай бронзы. Аднак у параўнанні з крэмянем, *металы,* хаця і заступалі яму у цвёрдасці, лёгка набывалі неабходную форму – наканечнікі стрэлаў і копій, сякеры, упрыгожванні. Зноўдзены ***тыглі*** –

невялікія керамічныя пасудзіны для плаўкі металу, льячак – невялікія керамічныя лыжачкі для разліўкі металу, абломкі ліцейных форм. Формы рабіліся з каменю або гліны, былі аднастворкавымі, састаўнымі з некалькіт створак, было ліццё па васковай мадэлі.

Засваенне металаў адыграла важную ролю ў *гаспадарчым і сацыяльным* жыцці людзей. Выкарыстанне бронзавых прылад:- павысіла прадукцыйнасць працы; - што у сваю чаргу прывяло да з'яўлення лішкаў прадуктаў; - як вынік – ўзнікае маёмасная няроўнасць людзей; - пашыраецца абмен (таргоўля) паміж рознымі рэгіёнамі; - узнікаюць войны за захоп маёмасці і людзей;- пачынае вылучацца рамяство.

Бронза з'явілася напачатку ў краінах Цэнтральнай Азіі, Егіпце, Індыі, Кітаі. Паздней з'яўляецца дабыча сыравіны для бронзы ў некаторых краінах Заходняй і Цэнральнай Еўропы, а таксама ў Закаўказзі, Казахстане, Сібіры. Увогуле вядома, што Усходняя Еўропа ў бронзавым веку не ўваходзіла ў кола старажытных цэнтраў станаўлення і развіцця металургіі. На тэрыторыі сучаснай Беларусі выкапняў неабходных рудаў для вырабу медзі і бронзы не было.

Таму для тэрыторыі Беларусі вызначэне "*бронзавы век*" з'я'ляецца некалькі ***ўмоўным.*** Медных і бронзавых вырабаў у карыстанні насельніцтвам было вельмі мала.. Гэта тлумачыцца *адсутнасцю* рудных радовішчаў і *аддаленнасцю* ад старажытных металургічных цэнтраў, такіх як Альпы, Картпаты, Каўказ. Мясцовая вытворчасць некаторых бронзавых рэчаў на тэрыторыі не была распаўсюджана шырока. Яна грунтавалася на *прывазной* сыравіне, а таксама на *пераплаўцы сапсаваных* медных і бронзавых вырабаў. Таму уладанне металічнымі вырабамі з-за іх рэдкасці і і значнай цэннасці было, ў большасці выпадкаў, паказальнікам значнага статуса іх уладальнікаў.

Металічныя вырабы распаўсюджваліся на тэрыторыі Беларусі павольна, гэты працэс займаў даволі працяглы час. Першыя металічныя прылады з'явіліся сярод плямёнаў *сярэднеднепроўскай культуры* ў канцы 3-га – пачатку 2-га тысячагоддзя. У археалагічных помніках гэтай культуры знойдзена вялікая колькасць металічных вырабаў, такіх як *шылы, нажы сякеры, дыядэмы, грыўны, бранзалеты, наканечнікі копьяў* і інш. Большасць з іх зроблена з *чыстай медзі і мыш'яковістай бронзы*. Для вырабаў нажа і бранзалеты выкарыстоўвалася *алавяністая бронза*.Таму *толькі ад гэтага часу і толькі на тэрыторыі Паўднёва-Усходняй Беларусі* магчыма казаць аб пачатку бронзаваа веку.

У *астатніх рэгіёнах* Беларусі пачатак бронзавага веку адносіцца да *першай паловы 2-га тысячагоддзя* да н.э., калі на Заходняй Беларусі, на Прыпяцкім палессі, а паздней і на цэнтральнай Беларусі, у Паазер'і і на Аршанска-Магілёўскай раўніне рассяляюцца плямёны ***тшцінецкай культуры***. Колькасць металлічных вырабаў, знойдзеных у цэнтральных і паўночных раёнах Беларусі дазваляе меркаваць, што вялікае значэнне ў поздні перыяд эпохі бронзы мелі так званыя **кельты** – *сякеры з алавяністай бронзы, ў якіх утулка размяшчалася ў абушковай частцы перпендыкулярна лязу (лезвію.).* Ёсць звесткі таксама пра знаходкі бронзавых мячоў, наканечнікі стрэлаў, меднае плоскае цесла і інш.

Перыяд ***позднята бронзавага веку*** Беларусі – канец 2-га тысячагоддзя да н.э. – 800-700 гады да н.э. – з'яўляецца найменьш даследаваным. У гэты час у Верхнім Падняпроў'і Усходнім Палессі пачынаюць распаўсюджвацца старажытнасці культуры ***лебядоўскага*** тыпу, на Захадзе Беларуси адбываецца зараджэнне ***штрыхаванай***

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

керамікі і назіраецца пранікненне ***лужіцкай культуры.*** Плямены названых культурных ассяродзяў *валодалі навыкамі* металургіі, паступова *распаўсюджвалі* іх на іншае насельніцтва, з'яўляліся носьбітамі характэрных *традыцый і асаблівасцяў*, уласцівых бронзаваму веку.

Разам з тым, і ў эпоху бронзавега веку большая частка прылад працы і зброі выраблялася ***з*** **каменню,** апрацоўка якога стала больш дасканалай. З'явіліся новыя прыёмы крэмнеапрацоўкі. Краі некаторых рэжучых і колючых вырабаў пачалі пакрываць струменчатай або пільчатай *рэтушшу.* Распаўсюджвалася *шліфаванне* крэмянёвых сякер, асабліва на лёзах. Пачалі рабіць трохвугольныя наканечнікі стрэл *з шыпамі* паабапал увогнутай асновы. Пачалося майстраванне *сякер і булавоў* з *прасвідраванымі* адтулінамі для рукаятак. Большасць *матык* таксама мелі такія ж адтуліны. Свідраванне праводзілася з дапамогай свідравальнага станка, асноўнай рабочвй часткай якого з'яшлялася трубчатая костка з пяском.

Людзі бронзавай эпохі па-ранейшаму выкарыстоўвалі для сваіх патрэб і іншыя матэрыялы, асабліва косці, рогі і дрэва. У некаторых выпадках, каменныя і касцяныя прылады імітыравалі асаблівасці формаў бронзавых вырабаў, асабліва сякер і наканечнікаў коп'яў.

2. Гаспадарка бронзавага веку.

У эпоху бронзавага веку працягваўся працэс актыўнага авалодання насельніцтвам Беларусі вытворчымі формамі гаспадаркі – земляробствам і жывёлагадоўляй.

Носьбітамі гэтых форм гаспадарання на тэрыторыі Беларусі з'явіліся прышлыя яшчэ у перыяд поздняга неаліта плямёны ***шнуравой*** керамікі (шнуравікі). Менавіта плямёны шнуравікоў былі аселымі жывёлаводамі і земляробамі. Але і ранейшае насельтніцтва, асабліва плямёны ***сярэднедняпроўскай культуры,*** паспяхова авалодвалі гэтымі формамі гаспадаркі.

У **жывёлагадоўлі** стадкі складаліся з буйной рагатай *жывёлы, свіней і коней.* Менш разводзілі *коз і авечак*. Памочнікам чалавека ў выпасе жывёлы быў *сабак*а. Археалагічныя даследаванні сведчаць, што каля *чвэрці мяснога харчавання* насельніцтва паўночнабеларускіх культур атрымлівала ужо не з палявання, а з *жывёлагадоўлі.*

У **земляробстве** вырошчвалі *пшаніцу, ячмень, авёс, сачавіцу* і інш культуры. У лясной зоне беларускай тэрыторіі земляробства вялося на палях, якія адваёўвалі ў лясоў – т.зв. *падсечна-агнявое (ляднае*) земляробства.

У бронзавым веку як у *мясцовага позненеалітычнага насельніцтва,* так і *прышлага насельніцтва шнуравікоў* важную ролю працягвалі адыграваць **прысвойваючыя формы гаспадаркі** – паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва.

Найбольш распаўсюджаным аб'ектам ***палявання*** ў *лясной зоне быў лось*, на другім месце – *дзік,* на трэцім – *мядзвед*ь. Палявалі, але менш, таксама на *тура, казулю, зубра*. Каб здабыць пушніну, палявалі на *куніц, барсукоў, лісіц, выдраў, бабра.*

У балотна-азерным краі поўдня Беларусі важным аб'ектам палявання з'яўляліся *вадаплаўваючыя птушкі – краква, гусі, качкі, чыркі, гагары* і інш.

На паселішчах бронзавага веку археолагі знаходзяць шмат сведчанняў аб ***рыбалоўстве.*** Гэта гарпуны і кручкі, грузілы і паплаўкі да сетак, рэшкі пастак з прутоў і лучынак, пешні для падлёднай лоўлі з масіўных трубчатых костак, фрагменты

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чоўнаў. Важнейшыя сведчанні рыбалоўстве – косткі рыбы і луска. Калі меркаваць па іх, то найбольш *лавілі акунёў*, крыху менш - *шчупакоў*. Лавілі таксама *ляшчоў, плоткі, лінёў*, а вось рэшкаў костак сама, карася і ярша выя'ўлена зусім мала.

Важнай галіной гаспадарчай дзейнасці чалавека, асабліва у ляной зоне, нават ў бронзавым веку, заставалася ***збіральніцтва.*** У напластаваннях крывіцкіх стаянак даволі шмат рэшкаў лясных і вадзяных *арэхаў, жалудоў, карнявішчаў* раслін, якія таксама ішлі на харч. Сустракаюцца і ракавіны перлавіцы, якія выкарыстоўваліся у якасці посуду, спажывалася чалавекам і *мяса малюскаў.*

У ***гаспадарчай дзейнасці*** працягвалі шырока выкарыстоўваліся крэмянёвыя *сякеры,* асабліва з *прышліфаваным*, альбо *запаліраваным* лёзам, для **высечкі лясоў** выкарыстоўваліся зашліфаваныя *каменныя сякеры-клінны*. У якасці **зброі** выкарыстошўваліся каменныя *сякеры са свідравanымі адтулінымі*. **Землю рыхлілі** каменнымі, рагавымі і нават драўлянымі *матыкамі.* Для **жніва** служылі масіўныя *крэмянёвыя пласціны з рэтушаваным краем*, а таксама *серпападобныя нажы,* з'явіліся масіўныя *крэмянёвыя сярпы з двухбаковай буйной рэтушшу ляза.* У канцы бронзавага веку значна больш сталі выкарыстоўвацца металлічныя вырабы, але каменнымі сякерамі, асабліва пры вырубцы лясоў пад пашню, карысталіся і ў наступным, жалезным веку.

Па-ранейшаму важнае месца і ў бронзавым веку працягваў займаць выраб **керамікі. Ж**ыхары бронзавага веку Беларусі ляпілі ўжо пераважна *плоскадонны* посуд – *гаршкі* з выдзеленай шыйкай, а таксама розныя *слоікі, місы, кубкі*. З'явіліся раней зусім не вядомыя *друшлакі.* Удасканаленне прцэсу вырабу керамікі прывяло да таго, што кераміка перыяду бронзавага век была звычайна *тонкасценнай* і добра *выпаленая.* Змяняўся і стыль аздаблення керамікі – узоры пераважна канцэнтруюцца *ў версе* пасудзін, з'яўляюцца невядомыя раней *наляпныя валікі і вушкі.*

Эканамічнае развіццё ў эпоху бронзы прыводзіла да фарміравання некаторай спецыялізацыі асобных рэгіёнаў і груп насельніцтва на вытворчасць тых ці іншых відаў прадукцыі. Адсюдь з'явілася развіццё **абмену** паміж рознымі групамі насельніцтва і плямёнамі розных культур. Прадметамі абмену з'яўляліся: *сыравіна і матэрыялы* (крэмень, медзь, іншыя кампаненты для атрымання бронзы), *прадметы апрацоўкі і вырабы* з *металаў,* прадукцыя *жывёлагадоўлі,* кераміка.

Як сведчаць вынікі археалагічных даследванняў, насельніцтва Беларусі бронзавым веку мела даволі *шырокую геаграфію* абменных сувязей. Металічныя вырабы траплялі у межы нашага краю з Каўказа, Украіны і Цэнтральнай Еўропы, са Скандынавіі, Прыбалтыкі, цэнтральных раёнаў Расіі. Напрыклад, на паселішчах бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі зноўдзены *бурштынавыя* (янтарныя) упрыгожванні з Прыбалтыкі, *фаянсавыя вырабы* з Цэнтральнай Еўропы. Попытам сярод насельніцтва іншых тэрыторый карысталіся матэрыялы *шахтавай крэмнездабычы* на Краснасельскіх радовішчах пад Ваўкавыскам

3. Насельніцтва перыяду бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі

У канцы 3-га тысячагоддзя да н.э., у раннім перыядзе бронзавага веку, пачынаюцца выключныя па сваіх значэнні змены ***этнічнага складу*** насельніцтва Беларусі. На тэрыторыі усёй Еўропы пачынаецца перыяд **індаеўрапеізацыі.**

У глубокай старажытнасці індаеўрапейцы прышлі з Цэнтральнай Азіі і рассяліліся на Балканскім паўвостраве, у Малой Азіі і заходнім Прычарнаморы. *На*

ВЕТОЎСКІ ГОРЫЙ ВГПУ

рубяжы 3 і 2 тысячагоддзяй да н.э. у сувязі з развіццём жывёлагадоўлі (пастаяннае павялічэнне пагалоўя жывёлы патрабавала новых выпасаў), ростам насельніцтва індаеўрапейцы пакідаюць сваю тэрыторыю і пачынаюць засяляць вялікія прасторы Цэнтральнай і Усходняў Еўропы, засвоўваюць тэрыторыю ад Рэйна на захадзе да Волгі на усходе, ад Фінляндыі на поўначы да Сярэдняга Падняпроў'я і Карпат на поўдні. Індаеўрапейцы змешываліся з мясцовым насельніцтвам, перадавалі ім сваю гаворку і культуры, навыкі працы, апрацоўкі металаў. Індаеўрапеізацыя паклала пачатак утварэнні многіх сучасных еўрапейскіх народаў – галаў, грэкаў, кельтаў, германцаў, балтаў, славян і іншых. (Гл.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.3 С. 485 – 486 . *"Індаеўрапейцы*") У выніку ў 2-м тысячагоддзі да н.э. большасць Еўропы ужо была заселена насельніцтвам, якое размаўляла на індаеўрапейскіх мовах.

На тэрыторыі Беларусі першымі прадстаўнікамі індаеўрапейцаў зрабіліся плямёныя так званай ***«шнуравой керамікі».*** Назву яны атрымалі ад характэрнага арнаменту ў выглядзе *адбіткаў шнура* на гліняным посудзе. У адрозненне ад абарыгенаў, яны валодалі вырабамі з бронзы (наканечнікі стрэл, кінжалы, сякеры, упрыгожанні і інш.), а таксама майстэрствам яе апрацоўкі. Адначасова адбываецца працэс асіміляцыі мясцовага даіндаеўрапейскага насельніцтва. Мяркуюць, што менавіта ***шнуравікі*** адыгралі важную ролю ў фарміраванні *балцкай, германскай і славянскай* культрных супольнасцяў.

На тэрыторыі Беларусі археолагі выдзяляюць некалькі культур шнуравой керамікі:

Сярэднедняпроўская культура (Верхняе Падняпро'е, Усх. Палессе)

Шнуравой керамікі Палесся (у межах тшцінецка-сосніцкай культуры)

Вісла-неманскай культуры шнуравой керамікі

Паўночнабеларускай культуры шнуравой керамікі.

Асаблівасці названых культур на працягу бронзавага веку - тып паселішчаў, прылады працы, асаблівасці керамікі і посуду, пахавальныя абрады, вераванні – будзем разглядаць на семінарскіх занятках.

Тэма 1.4 Жалезны век на Беларусі

План.

1.Агульная характарыстыка жалезнага века.
2. Гаспадарка ў жалезным веку.
3. Насельніцтва жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі

1.Агульная характарыстыка жалезнага века.

Заключным перыядам першабытнай гісторыі стаў жалезны век, які датуецца перыядам з 8 – 7 стагоддзяў да г.э. па 4 – 5 стагоддзе нашай эры. Ён характаразуецца з'ўленнем і шырокім распаўсюджаннем металлургіі **жалеза,** вырабам з яго прылад працы і зброі, што карэнным чынам паскорыла прагрэс ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці, істотна паўплывала на сацыяльную яго арганізацыю. Фактычна і сёння вырабы з металлу – жалеза займаюць галоўнае месца ў вытворчай дзейнасці людзей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У *Еўропе* вытворчасць жалеза пачалася на рубяжы 2-га і 1-га тысячагоддзяў да н.э. у Грэцыі, а на больш паўночных тэрыторыях у першай палове 1-га тысячагоддзя да н.э.– у 9 – 8 стагоддзях да н.э. Для насельніцтва таго часу працэсс авалодання вырабам жалеза быў доўгім, ён расцягнуйся на некалькі стагоддзяў.

На тэрыторыі *Паўдневай Беларусі* насельніцтва авалодала навыкамі жалезнаробчай вытворчасці амаль *адначасова з* многімі іншымі еўрапейскімі народамі, прыкладна 7 – 6 стагоддзях да н.э. У *другой палове* таго ж тысячагоддзя, прыблізна да 2 – 1-га стагддзяў да н.э., здабыча і апрацоўка жалеза была засвоена і насельніцтвам *цэнтральнай і паўночнай частак Беларусі*. Спрыяла таму *наяўнасць* на тэрыторыі Беларусі *мясцовай сыравіны* для выраба жалеза (у адрозненні ад вырабу бронзы).

Выключнае значэнне для атрымання і распаўсюджання жалеза на *тэрыторыі Беларусі* мелі ***прыродныя ўмовы*.**

Сыравінай для жалеза былі *балотная і азёрная руда* (т.зв. буры жалязняк, вокіснае жалеза), што меліся практычна па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Шмат яе было у нізінах узбярэжжаў рэк, азер і балот, залягала яна блізка ад паверхні, што рабіла лёгкадаступнымі радовішчы сыравіны.

Адносна нескладанай была і тэхналогія варкі жалеза. Звычайна для металургіі жалеза у той час рабіліся спецыяльныя *печы-домніцы*. Шахту печы загружалі пластамі драўніннага *вуглю,* сушанай і здробленай балотнай *руды,* вапнай у якасцю флюсу (прысадкі). У ніжняй частцы домны меліся адтуліны для нагнятання паветра. Паветра ўдзімалі ў домніцу праз гліняныя трубкі – *соплы.* Ў камеры згарання ствараласа тэмпература да 1200 градусаў.

У выніку атрымлівалася жалеза, якое мела выгляд дробных размякчаных *зярнят,* якія спякаліся паміж сабой і асядалі на дно печы. Такім чынам, фактычна жалеза не плавілася, а толькі выдзялялася з руды і размягчалася. Такі спосаб атрымання жалезу мае назву “сырадутны”. Калі печ астывала, яе разбуралі, каб узяць атрыманую порыстую масу (крыцу).

Атрыманае жалеза было яшчэ не прыгодным, каб з яго вырабляць рэчы. Патрэбна была яго далейшая апрацоўка. Таму старажытныя майстры-металургі з’яўляліся адначасова і *кавалямі.* Атрыманую з домніцы порыстую крыцу зноў разагравалі, а потым *пракоўвалі*, каб выдзяліць з яе шлакі і зрабіць кавалак больш шчыльным. Такім чынам ствараласа *нарыхтоўка* з жалеза, пазбаўленага ад прымясяў гарэння (шлакаў) і порыстасці. Далей атрыманую жалезную масу зноў разагравалі і ў размягчаным стане апрацоўвалі коўкай, надаючы неабходныя формы рэчаў. Молаты і накавальні у старажытных металургаў – кавалёў былі каменнымі. Такі прасцейшы тэхналагічны спосаб апрацоўкі метала называецца *гарачай коўкаў*.

Існуюць археалагічныя сведчанні, што некотрыя культуры насельніцтва Беларусі паступолва авалодвалі і больш складанымі працэсамі апрацоўкі жалеза. Сустракаюцца прадметы, вырабленыя з сырцоваў (нізкаякаснай) *сталі,* і нават з *высокавугляродзістай сталі.* Прымяняліся больш складаныя тэхналагічныя схемы і пры апрацоўкі метала – кавалі *навучыліся зварцы* жалеза са сталлю, прымянялі *загартоўку* метала, што паляпшала якасць вырабаў.

Старажытныя металургі і кавалі мелі ў грамадстве асобны, даволі высокі статус, бо вынікі іх працы мелі устоўлівыя патрэбы. Яны выраблялі з жалеза прылады працы (

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сякеры, сярпы, нажы, цёсла і інш.), узбраенне (коп'і, дроцікі, наканечнікі стрэл і г.д.), упрыгожванні (шпількі, бранзалеты, кольцы і інш), прадметы побыту (шылі, іголкі).

2. Гаспадарка ў жалезным веку.

У гаспадарцы насельніцтва Беларусі ў жалезным веку *працягвала* ***ўзрастаць*** *роля вытворчых галін* – земляробства і жывёлагадоўлі. Аднак патрэбна адзначыць, што на іх стан і развіццё вялікі ўплыў аказвалі *знешныя* умовы (рэльеф, змены клімата), удасканаленне прылад *працы,* знешнія *сувязі* і *этнаграфічныя у*мовы. Таму значэнне і развіццё земляробства і жывёлагадоўлі ў *разныя перыяды часу* і на *канкрэтных тэрыторыях* Беларусі у перыяд жалезнага веку было *розным.*

Напрыклад, у Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі ў гаспадарцы насельніцтва значную ролю адыгравала падсечнае (ляднае*) земляробства*, асноўнай зернавой культурай была пшаніца. Вяліся вялікія высечкі і выпальванні лясоў вакол гарадзішчаў. На поўдні ж Беларусі, ва ўмовах вялікай забалочанасці тэрыторыі у гаспадарцы вядучую ролю адыгравала *жывёлагадоўля.*

У сярэдзіне Першага тысячагоддзя да н.э. адбылося *пагаршэнне клімата – пахаладанне, вялікая вільготнасць*. Таму назіраецца *заняпад* земляробства, пры яго вядзенні насельніцтва было вымушана выкарыстоўваць землі не ў нізінах, як раней, а на *узвышшах* і водападзелах. Глебы там былі не менш урадлівыя, але патрабавалі больш намаганняў для падрыхтоўкі поля для пасеву. Таму і паселішчы людзей пачынаюць стварацца каля участкаў з распрацаванай глебай.

Глебу апрацоўвалі драўлянымі ворнымі прыладамі – драўлянымі ***раламі,*** з'яўляліся і жалезныя наканечнікі на іх. Распаўсюджанне іншых прылад працы земляробаў з выкарыстаннем жалеза дазваляла зрабіць працу больш прадукцыйнай. З'яўляецца ворнае (пашенное) земляробства – калі землю не проста узрыхлялі, а параворчвалі., што давала больш высокія ураджаі.

Выкарыстанне землі мела *экстэнсіўны* характар. Поле апрацоўвалі і засявалі да таго часу, пакуль глеба радзіла. Потым яно зарастала, яго не выкарыстоўвалі, яно адпачывала да аднаўлення сваёй урадлівасці. Людзі ж распрацоўвалі новыя дзялянкі. Акрамя *пшаніцы* вырошчвалі таксама *проса, ячмень*, пачыналася распаўсюджанне *жыта* (*рожь*), якое было больш прыстасавана для вырошчвання у лясной зоне.

Адбывалася і ***інтэнсіфікацыя жывёлагадоўлі***. Асноўным відам была *буйная рагатая жывёла*, аднак і іншыя віды жывёлы мелі не меншае значэнне. У шэрагу плямёнай на другім месце быў *конь,* потым *свіння* і дробная рагатая жывёла – *авечкі і козы*. У некаторай частцы насельніцтва на другім месце была *свінн*я, а потым *дробная рагатая жывёла і конь*. У часы *пагаршэння клімату* перавага нават была на баку *стадкаў коз і авечак*, як больш непатрабавальных для знешніх умоў (іх было лягчэй пракарміць, яны больш былі устоўлівы да пахаладанняў). Рагатую жывёлу і коней утрымлівалі на пасьвішчах паблізу селішча. Зімой жывёлу трымалі ў абароненых ад непагоды месцах, падкармлівалі сенам.

Бліжэй да поўначы і захаду Беларусі вызначаліся плямёны, што аддавалі перавагу ў стадку жывёлы *свінням*, якія стаялі на першым месце і пераважалі нават над буйной рагатай жывёлай.

Інтэнсіфікацыя і удасканаленне вытворчай гаспадаркі давала больш стабільнае павялічэнне колькасці прадуктаў. Зараз гаспадарку маглі паспяхова весці *асобна адносна невялікія сем'і,* таму асноўнымі тыпамі пасельшчаў становяцца невялікія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

неўмацаваныя *селішчы,* у наваколлі якіх знаходзіліся апрацаваныя землі і пастбішча для жывёлы.

На працягу жалезнага веку ***прысвоўваючыя*** *(ці забываючыя*) формы гаспадаркі працягвалі адыгравать значную ролю ў жыцці старажытнага насельніцтва.

Як сведчаць вынікі археалагічных даследаванняў, прыкладна ад 13% да паловы і больш мяснога харчавання складала мяса, дабытае ў выніку ***палявання.*** Гэта таму, што вага такіх жывёл была даволі значнай: зубр – 700-900 кг, лось – 400-500 кг., дзік – да 300 кг, алень – да 200 кг.

Сярод аб'ектаў палявання жыхароў Беларусі таго часу было каля 12 відаў жывёлы. Адбывалася нават пэўная *спецыялізацыя палявання* насельніцтва розных рэгіёнаў ў залежнасці ад распаўсюджання тыпаў жывёлы і яе прадназначэння. Можна выдзяліць два напрамкі: паляванне для задавальнення патрэб у *мясе* і патрэб *у футры.*

Для большасці плямёнаў жалезнага веку асноўным было паляванне з мэтай здабычы *мяса.* Асноўнымі аб'ектамі такога палявання былі *лось, зубр, алень, дзік і мядзведь.*

У той жа час, на поўначы Беларусі важным было паляванне на жывёл з-за іх *футры*, якая часта выступала сродкам менавага гандлю з іншымі народамі. Для гэтых мэтаў палявалі на *бабра, лісіцу, зайца, барсука.*

У гаспадарцы жалезнага веку ***зменшылася роля рыбалоўства і збіральніцтва,*** але гэтыя заняткі працягвалі заставацца істотнай крыніцай існавання чалавека. Новым з'яўлялася стала здабыча *мёду і воску* лясных пчол.

Да ***хатніх гаспадарчых заняткаў*** жыхароў жалезнага веку ўласцівы *лепка посуду*, апрацоўка *дрэва, каменю, косці*, а таксама *прадзенне і ткацтва*.

Выраб **керамікі** ў жалезным веку стаў больш дасканалым, ёй пераймаў некаторую тэхналогію апрацоўкі металаў. Выраб посуду ўя'ляў складаны працэс, які уключаў *падрыхтоўку сыравіны*, *фармоўку* вырабаў, *абпрацоўку* паверхні і *абпальванне.*

Майстры-ганчары звычайна карысталіся глінай з мясцовых радовішчаў, што знаходзіліся паблізу. Яны сталі падчас прыгатаўлення сыравіны *дасыпаць* пэўную колькасць *дамешак* (валунны камень, бітую кераміку, балотныя руды) каб зменшыць дэфарімацыю і растрэскаванне вырабу. Посуд ляпілі звычайна *стужкавым метадам*, месца злучэння стужак з*аглажвалі*, потым апрацоўвалі ўсю паверхнасць вырабу, аздабляючы яе *упрыгожваннямі* у выглядзе узораў з ямкавых уціскванняў, а таксамы штрыхамі. Абпальвалі посуд пры даволі высокай тэмпературы ад 500 да 750 градусаў. З'явілася некаторая колькасць посуду з *глянцавай паверхнасцю*.

Архалагічныя звесткі даюць ўяўленне аб стане **абмена і гандлю**, перш за ўсё знешняга, насельніцтва Беларусі жалезнага веку. Разам з тым, патрэбна улічваць, што ўзровень яго развіцця быў *нізкім,* бо Беларусь знаходзілася **ў** *баку ад асноўных* старажытных гандлёвых шляхоў. Таму паступленне рэчаў з іншых тэрыторый *не было стабільным*, яно было вынікам толькі межплемянных кантактаў. Найбольш цікавымі знаходкамі прадметаў іншаземнага паходжання на тэрыторыі Беларусі з'яўляюцца:

- *шкляныя пацеркі* (выраб шкла на Беларусе не ведалі), зноўдзеныя на Поўдні Беларусі, датуюцца 2 стагоддзям да н.э.;
- правінцыяльна-*рымскія рэчы і рымскія сярэбраныя манеты*, якія датуюцца 1-3 стагоддзямі н.э., больш 30 месцазнаходжанняў, найбольш значны – скарб з Клімавічаў уключае 1815 манет;
- знаходкі *залатых рімскіх манет* 4-5 стагоддзяў н.э. на паўночным захадзе Беларусі;

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

- знаходкі рэчаў, упрыгожаных *выемістымі эмалямі*.

Знойдзеныя прадметы даюць падставы казаць, што у пачатку нашай эры, напрыканцы жалезнага веку існавалі два асноўныя напрамкі – з Захаду і Паўднёвага Усходу – кантактаў насельніцтва Беларусі з іншымі народамі.

3. **Насельніцтва жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі**

У перыяд жалезнага веку колькасць насельніцтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі значна павялічылася. Па падліках археолагаў у канцы 1-га тысячагоддзя да н.э. на гэтай тэрыторыі існавала прыблізна ад 800 да 1200 паселішчаў-гарадзішчаў. У кожным з іх пражывала ад 50 да 70 чалавек. Таму можна сцвярджаць, што *агульная колькасць насельніцтва* складала прыблізна ***50-70 тысяч чалавек.*** Тэрыторыя была адносна слаба заселена.

Змены ў вытворчай дзейнасці чалавека ў жалезным веку выклікалі і змены ў ***сацыяльных адносінах*** і, адпаведна, ***у грамадскім уладкаванні.***

Развіццё вытворчасці прывяло да з'яўлення падстаў **да супярэчнасцяў,** якія набывалі формы **ўзброеных сутычак, войнаў**. ***Па-першае***, падставай для іх стала накапленне плямёнамі *пэўных каштоўнасцяў,* калі людзі пачалі атрымліваць прадуктаў больш, чым было патрэбна для іх уласнага спажыфвання. Адсюль з'явілася жаданне з боку іншых плямён *прысвоўваць* сябе гэтыя каштоўнасці (жывёлу, вынікі земляробства, металургіі і інш.) шлягам гвалтоўнага захопу, ізымання. ***Па-другое***, пашырэнне вытворчасці патрабавала *новых земляў, тэрыторый*, што знаходзіла ўвасабленне таксама шляхам захопу ўжо асвоеных іншымі племенамі зямель. ***Па-трэцяе***, для далейшага развіцця вытворчай гаспадаркі патрабавалася *новая рабочая сіла.* Задавальнялася гэта патрэба шляхам захопа *пленых*, якіх ужо не забівалі, а выкарыстоўвалі як *рабоў.* Ва ўмовах Беларусі колькасць такіх рабоў (някроўнікаў) была не вялікай, рабства насіла хатні характар.

Такім чынам, **войны і ваенныя набегі** ў жалезны век былі распаўсюджанай і звыклай з'явай у жыцці грамадства.

Усе плямёны, што насялялі тэрыторыю Беларусі, жылі ва умовах **патрыярхату,** пераход да якога пачаўся яшчэ ў бронзавым веку. Роля мужчынам ў жыцці плямён *узрастала*. Звязана гэта было і з развіццём *металургіі,* заняткі якой патрабавалі значнай *фізічнай сілы.* Ва умовах ваеннай небяспекі узрастала адказнасць *мужчын-воінаў* за захаванне жыцця роду. Таму на апошняй стадыі першабытнаабшчыннага ладу *вярхоўнай уладай* у родзе і племені становіцца ***агульны сход мужчын-воінаў***, які вырашаў першажыццёвыя пытанні вайны і міру, а таксама выбіраў старэйшын роду і правадыра племені. Такі грамадска-палітычны лад атрымаў назву *ваеннай дэмакратыі.*

У ***сацыяльных*** адносінах насельніцтва Беларусі жалезнага веку знаходзілася на *этапе разлажэння (распаду) першаабшчыннага ладу.*

Радавая абшчына распадаецца на ***вялікія патрыархальныя сем'і.*** Гэта было вынікам змен у вытворчасці, калі не стала неабходнасці агульнага вядзення гаспадаркі разам усімі радамі – часткамі радавой абшчыны. Кожная сямья была ўжо ў стане сама, паасобку забяспечваць свае патрэбы. Таму ў эпоху жалезнага веку менавіта *вялікая патрыярхальная сям'я стала асноўнай гаспадарчай і сацыяльнай адзінкай.*

Такая вялікая патрыярхальная сямья, якая налічвала прыблізна 50 – 70 чалавек, пражывала на сваім ***паселішчы.*** Першапачаткова такія паселішчы не мелі ўмацаванняў і абгарожваліся толькі драўлянай сцяной. Але з ростам пагрозы ваенных набегаў з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

боку іншых радоў плямён, узнікла патрэба ва *абарончых ўмацаваннях*, якімі сталі штучныя валы, рвы. Таму узнікаюць і умацаваныя селішчы, і больш умацаваныя гарадзішчы-сховішчы, дзе маглі знайсці прытулак у час небяспекі жыхары навакольных селішчаў.

Некалькі такіх кроўных семьяў што жылі побач, іх гарадзішчы знаходзіліся разам, стваралі гнёзды па два, тры, чатыры гарадзішчы. Яны мелі агульную тэрыторыю для пражывання і гаспадарання. Археолагі лічаць, што на тэрыторыі Беларусі ў жалезным веку налічвалася *каля 500 родаў*. Некалькі родаў, якія мелі цесныя эканамічныя сувязі, аднолькавыя рысы ў вырабах прылад працы, падобныя культурныя рысы аб'ядноўваліся ў *племя,* а некалькі плямён утваралі *саюзы, аб'яднанні плямён*.

У пачатку нашай эры адбываецца паступавая трансфармацыя ***радавой*** абшчыны (у аснове якой былі крэўныя, кроўнароднасныя сувязі) у ***тэрытарыяльную*** абшчыну, якая аб'ядноўвала сем'і, што пражывалі на сумеснай тэрыторыі і не абавязкова былі звязаны родам. Падставай для распада радавой абшчыны з'явілася і ўзнікненне ***маёмасной няроўнасці.*** З'яўляюцца багатыя і бедныя семьі. Яны панычаюць пражываць і весці гаспадарку на адной тэрыторыі побач з семьямі з іншых радоў. Такім чынам ўзнікае ***суседская абшчына.***

Паступова ў межах суседскай абшчыны выдзяляецца асобная група ўзброеных людзей, што складалі ***узброеную дружыну,*** асновай якой былі воіны-коннікі. Дружынікі ўжо амаль не займаліся вядзеннем гаспадаркі, знаходзіліся на утрыманні абшчыны, выконвалі функцыі яе абароны ад ворагаў, але таксама і самі прымалі удзел у ваеных набегах, рабаванні суседніх плямён.

Такім чынам,узнікненне ***маёмаснай няроўнасці, распад радавой*** абшчыны, ***пераход да патрыярхальнай сям'і***, узнікненне ***суседскай абшчыны***, выдзяленне у яе складзе прафесійнай ваеннай групы ***дружынікаў,*** стварэнне ***плямён і іх саюзаў*** – гэта важнейшыя моманты ў развіцці *сацыяльных адносін* на тэрыторыі Беларусі на працягу жалезнага веку.

Жалезны век – гэта перыяд складаных **этнакультурных працэсаў** на тэрыторыі Беларусі. Менавіта у гэты час адбывалася фарміраванне розных *племянных і этнічных груповак,* частка якіх у далейшым склала аснову ***народнасцей*** – продкаў сучасных народаў.

На тэрыторыі Беларусі на працягу названага перыяду фіксуецца шэраг археалагічных культур, якія змянялі адзін аднаго. Сучасныя археолагі выдзяляюць каля ***10-ці такіх культур:***

1. **Днепра-дзвінская** (8 ст. да н.э. – 3-4 стст. н.э.) Арэал рассялення – Поўнач і усход Беларусі. Склалася на падставе развіцця культуры шнуравой керамікі.

2**. Штрыхаванай керамікі** (8 ст. да н.э. – 4-5 стст. н.э.) Арэал рассялення - Усходняя Літва і значная частка Заходняй і Сярэдняй Беларусі. Таксама паходжаннем звязана з культурай шнуравікоў.

3. **Мілаградская** (8 ст. да н.э. – 2 ст. н.э.) Займала Паўднёва-усходнюю частку Беларусі і паўночную частку Украіны. Узнікла на аснове развіцця лебядоўскай культуры.

Паводле этнічнай прынадлежнасці насельніцтва трох названых культур – Днепра-дзвінскай, Штрыхавой керамікі і Мілаградскай адносіліся да ***балцкага*** насельніцтва. На тэрыторыі Беларусі у сярдзіне і першай палове 1га тысячагоддзя да ін.э.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дамініравалі ўсходнія балты. Названыя культуры размяшчаліся уздолж гандлёвагу шляху, што звязваў Паволжа па Дзвіне з Прыбалтыкай і Швецыяй.

4. **Паморская культура(** 4 – 2 ст. да.н.э.) культура плямён, якія насялялі тэр. Польшчы, Паўднёва-заходняю чатку Беларусі, паўночна-заходняю частку Украіны. На тэрыторыі Беларусі знаходзілася перыфірыйная частка прадстаўнікоў названай культуры.

5. **Зарубінецкая культура** (2 ст. да н.э. – 1 ст.н.э) . Займала тэрыторыю Паўднёвай Беларусі (сучаснае Палессе і чеастка Верхняга Падняпроўя) і Паўночнай Украіны. Узнікае на падставе эвалюцыі ***мілаградскай*** культуры, якая цалкам знікае. Праіснавала да сярэдзіны 1-ша стагоддзя н.э.

6. **Кіеўская культура** (2 – 5 ст. н.э.) Сфарміравалася на падставе позднезарубенецкай культуры. На тэрыторыі Беларусі займала Верхнее Падняпроўе.

7. **Вельбарская культура** (2 – 4 ст. н.э.) Заходнее Палессе і Побужжа. З'яўленне на частцы тэрыторыі Беларусі названай культуры паказвае напрамак міграцыі ***готаў,*** якія рухаліся з нізоўяў Віслы ў Пабужжа , Падняпроўе і Падунаўе.

Археалагі знаходзяці і праявы на тэрыторыі Беларусі рэшкаў іншых культур, якія не былі тут шырока распаўсюджаны, мелі лакальны характар.

8. Старажытнасці заходніх балтаў (5 ст да н.э. – 8 ст. н.э.)

9. Лужіцкая культура (10 – 5 ст да н.э.) Выяўлены толькі асобныя памятнікі ў некаторых заходніх раёнах.

10 Юхноўская. Маюцца толькі лакальныя памятнікі.

Такім чынам, развіццё насельніцтва у жалезным веку патрэбна разглядаць як узнікненне, развіццё і знікненне культур розных груп плямёнаў, што этнічных адносінах належалі да:

- ўсходніх балтаў (культура штрыхавой керамікі, днепра-дзвінская і мілаградская)
- заходніх балтаў і германскага этнасу (вельбарская культура)

а таксама плямёнаў, этнас якіх цяжка вызначыць (зарубінецкая кудльтура, кіеўская культура.)

Усе названыя культуры мелі сваі асаблівасці *матэрыяльнай культуры* (выраб прылад працы і зброі, гаспадарчыя заняткі, асаблівасці апрацоўкі метала і керамікі і інш.), *побыту* (усталяванне розных тыпаў паселішчаў, жылля,) *духоўнага жыцця* (выявы упрыгожванняў, асаблівасці вераванняў, тыпы пахавання і г.д.). Аб іх мы будзем гаварыць на семінарскіх занятках.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Тэма 2.1 Беларускія землі ў раннім сярэднявеччы (VI ст – першая палова XIII ст.)

План

1. Гістарыяграфія і крыніцы.
2. Этнічная працэссы на тэрыторыі Беларусі.
3. Полацкае княства.
4. Тураўскае княства.
5. Беларускія землі у 12-13 ст.
6. Гаспадарчае жыццё.
7. Грамадскі лад і сацыяльныя адносіны.
8. Культура Беларусі ранняга сярэднявечча.

1. Гістарыяграфія і крыніцы.

Сярэднія вякі, сярэднявякоўе, сярэднявечча – гэтыя тэрміны гістарычнай перыядызацыі, якія выкарысоўваецца для вызначэнні эпохі паміж *старажытнасцю і Адраджэннем.* Такая гістарычная перыядызацыя трывала з 17-га стагоддзя прымяняецца да вывучэння еўрапейскай гісторыі, гісторыі народаў Еўропы. Маецца нават асобная гістарычная дысцыпліна, што вывучае сярэднія вякі – *медыявісціка.*

У межах Сярэднявечча выдзяляюць тры перыяда:- *раннее* сярэднявечча (канец 4 – XI стагоддзі); - *высокае* сярэднявечча (XI – 1-ая палова XIII ст.); - *позднее* сярэднявечча (2-ая палова XIII – пач. 16 ст.).

Пры вывучэнні названага перыяда ў *гісторыі Беларусі* ў большасці падручнікаў і выданняў выкарастоўваецца *такая ж заходнееўрапейская перыядызацыя*, прыкладна з тымі ж храналагічнымі межамі, хаця правамернасць яе прымяненне да тэрыторыі Беларусі і аспрэчваецца ў некаторых навуковых публікацыях.

Гістарыяграфія.

Пытанні гісторыі беларускіх зямель у перыяд сярэднявечча закраналіся ў абагульняючых працах і курсах гісторыі вядомых райсіскіх гісторыкаў 18 – 19 стагоддзяй В.Таціщава, М.Карамзіна, С.Салаўёва, В.Ключэўскага і інш.

Напрыклад, ***В.Н.Таціщаў*** у сваёй працы "***Гісторыя Расійская***" (першае выдане 1768- 1848; другое выданне т. 1-7. М-Л. 1962-1968) змяшчае шматлікія важныя звесткі па гісторыі Беларусі. Пад **1217 г**. ён прыводзіць урывак з полацкага летапісу, які дае інфармацыю пра ўнутраны парадак у Полацкім княстве.

У канцы XIX ст. з'явіліся першыя абагульняючыя работы аб старажытных княствах на тэрыторыі Беларусі, аўтарамі якіх з'яўляліся першыя беларускія навукоўцы.

Мітрафан Віктаравіч ***Доўнар-Запольскі*** (1867-1934) у адным з першых сваіх даследаванняў "**Очерк истории кривичской и дреговичской земель до конца XII столетия". *(Киев, 1891.)*** зрабіў сробу асвяціць гісторыю крывіцкай і дрыгавіцкай зямель г.зн. гісторыю большай часткі этнічна беларускай зямлі. У гэтай працы ён імкнуўся выйсці за межы старажытнарускіх летапісаў і прыцягнуць звесткі іншых крыніц (хронік, дадзеных гістарычай геаграфіі, тапанімікі і г.д.).

У пачатку 1920-х гг. М.В. Доўнар-Запольскі напісаў працу па гісторыі Беларусі, якая убачыла свет толькі ў 1994г. ***Доўнар-Запольскі М.В.Гісторыя Беларусі (.Мн., 1994***). У ей разглядаецца палітычная гісторыя Полацкай зямлі, Смаленскага і Тўрава-Пінскага княстваў. Адной з асаблівасцей палітычнага ладу ўсходнеславянскіх зямель і княстваў вучоны лічыў т. зв. *валасную с*істэму кіравання, калі горад быў арганічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

часткай сваёй воласці (акругі) і ў адміністрацыйных адносінах не адзяляўся ад яе. Таму Веча – на думку Доўнар-Запольскага – орган кіравання ўсёй воласцю.

Значным даследаваннем канца XIX – пачатку XX ст. па гісторыі Полацкай зямлі стала работа **У.Данілевіча** (***Данилевич В.Е. Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия. Киев, 1896).*** Аутар нанова вывучыў усе вядомыя рускія і замежныя першакрыніцы, сярод якіх прыцягнуў шмат новых, што дазволіла яму напісаць даследаванне па гісторыі Полацкай зямлі ад каменнага века. Разглядалася палітычнае і грамадскае ўладкаванне Полацкай зямлі, юрыдычная роля веча і князя, роля прыгарадаў, класавая дыферэнцыяцыя насельніцтва, роля гандлю і г.д.

А. Грушэўскі (1877-1943), украінскі гісторык, напісаў працу "*Пинское Полесье*", у якую ўваходзіць "*Очерк истории Турово-Пинского княжества XI- XIII вв." (1901)* вызначыў граніцы гэтага княства, выклаў гісторыю ўзаемадачыненняў мясцовых князёў з Кіевам.

Першую нацыянальную версію беларускай гісторыі выклаў **Вацлаў Ластоўскі** у сваёй "***Кароткая гісторыя Беларусі***" (Вільня 1910) Кніга заснавана ў значнай ступені на апублікаваных выданнях таго часу расійскіх, польскіх і ўкраінскіх гісторыкаў. У сваёй гісторыі В. Ластоўскі карыстаўся вельмі сваеасаблівай перыядызацыяй. Напрыклад, распавядаючы аб Полацкім княстве ён выдзяляе ч.I пад назвай "Ад першых часоў да ўцеку Полацкіх князеў у Літву (1129 г.), Ч.II-я - "Ад павароту Полацкіх князёў (1132 г.) да сьмерці Віьаўта (1430 г.), ч.Ш – "Ад сьмерці Вітаўта (1430 г.) да Люблінскай Уніі (1569 г.)". Такі падыход не ужываецца сёння, але каштоўнасць працы В. Ластоўскага у тым, што ён першым радзгядаў беларускі народ як толькі аб'ект гісторыі, залежны ад волі суседніх народаў, але і творца сваёй гісторыі, гаспадар свайго лёсу.

З нацыянальных пазіцый напісана праца **У.Ігнатоўскага** ***"Кароткі нарыс гісторыі Беларусі" (1919.)*** У ёй даволі падрабязна характарызуецца гісторыя Беларусі ў "полацкі перыяд" IX- XIII стст.

У.Пічэта абагульніў асноўныя моманты сярэднявечнай гісторыі Беларусі ў раздзелах "Полацка-Мінскае княства" і "Турава-Пінскае княства" у калектыўнай працы "***Очерки истории СССР. Период феодализма IX-XV стст." (Ч.1, 1953).*** Двайныя назвы княстваў ён лічыў апраўданымі таму, што Мінск і Пінск адыгрывалі важную ролю ў старажытнай гісторыі Беларусі.

Леанід Васільевіч **Аляксеяў** на базе пісьмовых крыніц і дадзеных археалогіі напісаў грунтоўную манаграфію "*Полоцкая земля в IX- XIII вв.:Очерки истории северной Белоруссии" (1966),* а таксама манаграфію "*Смоленская земля в IX- XIII вв.:Очерки истории Смоленщины и Восточной Белоруссии" (1980)* Аўтар зрабіў выснову, што Полацкае княства ў раннім сярэднявеччы было самастойнай палітычнай адзінкай з арыгінальнай культурай.

Расійскі гісторык Валянцін **Сядоў** у манаграфіі "***Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья" (М.,1970)*** распрацаваў канцэпцыю субстратнага паходжання беларусаў у выніку змешвання славян з балтамі.

Петр Федаравіч **Лысенка** выпускнік гістарычнага факультэта нашага універсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар, археолаг. З 1961 г. ён даследуе археалагічныя помнікі ранняга сярэднявечча на тэрыторыі Паўднёвай і цэнтральнай Беларусі, займаецца вывучэннем курганоў дрыгавічоў XI-XIII стст., старажытных гарадоў Тураўскай зямлі. Па выніках яго даследаванняў выдадзена кніга –

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУ

П.Ф.Лысенка ***Тураўская зямля IX-XIII стст. Мн., 1999.*** У ей аўтар адстойвае правамернасць тэрміна “Тураўская зямля”, выказвае думку, што яна склалася ў канцы X ст. і захоўвала сваё значэнне ў XI ст.

П.Ф. Лысенка таксама аўтар такіх кніг, як “***Города Туровской земли***” (Мн. 1974), “***Берестье***” (Мн., 1985), “***Дреговичи***” (Мн., 1991).

выказвае думку, што яна склалася ў канцы X ст. і захоўвала сваё значэнне ў XI ст.

Гісторык з Маладзечна Мікалай Іванавіч **Ермаловіч,** папулярны у 1990-я гады сваім неардынарным поглядам на гістарычнае мінулае, выдал даволі грунтоўные даследаванне **“*Старажытная Беларусь:Полацкі і навагародскі перыяды*.”**(Мн.,1990). Выкарыстоўваючы дадзеныя летапісаў, тапанімкі, археалогіі, аўтар прасочвае лёс нашай зямлі, пачынаючы са старажытных часоў і канчаючы ўтварэннем і ўмацаваннем ВКЛ. Ён выказаў шэраг слушных меркаванняў, згадак і заўваг, поўнасцю адхіліў тэзіс шэрагу гісторыкаў пра заваяванне літоўцамі беларускіх зямель у другой палове XIII ст. Аднак яго сцвярджэнні аб летапіснай Літве на прасторы паміж Мінскам, Маладзечна, Слонімам большасць гісторыкай лічаць не дастаткова абгрунтаванымі.

Вядомым даследчыкам сярэднявечча з’яўляецца старэйшы беларускі гісторык, доктар гістарычных навук **Георгій Васільевіч. Штыхаў**. Асноўнымі яго выдавннямі з’яўляюцца: “*Древний Полоцк IX – XШ вв.*» (Мн., 1975), “*Города Полоцкой земли IX – XШ вв”*. (Мн., 1978), *“Крывічы*” (Мн., 1992), і асабліва *“Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі”* (Мн., 1999 і 2002 гг). Ён выказаў і абгрунтаваў думку, што ва ўсходніх славян гаспадарка была шматукладнай, у ёй існавалі тры уклада – першабытнаабшчынны , які зыходзіў з гістарычнай арэны, рабаўладальніцкі, які не атрымаў значнага развіцця, і новы феадальны, які нараджаўся. Ён таксама распрацаваў пытанні гарадскога самакіравання, дзейнасці полацкага веча, яго складаных адносін да княжацкаш улады. Менавіта Г. Штыхаў з’яўляецца разам з іншымі аўтарам адпаведнага раздзела пра сярэднявечча у “***Нарысах гісторыі Беларусі***.” Ч. 1.(Мн. 1994.) і першага тома 6-ці томнай “***Гісторыі Беларусі”*** пад рэд М.П. Касцюка.

Сярод сучасных беларускіх навукоўцаў, што займаюцца пытаннямі гісторыі Беларусі перыяда сярэднявечча, патрэбна назваць таксама:

Зверуго Я.Г. “Древний Волковыск” (Мн., 1975), “Верхнее Понеманье в IX – XШ вв. (Мн., 1989)

Коробушкина Т.Н. “Земледелие на территории Белоруссии в X – XШ вв.” (Мн., 1979)

Значная колькасць артыкулаў па праблемах гісторыі Беларусі 6 – 13 стагоддзяў змешчана у “***Энцыклапедыі гісторыі Беларусі.”*** У 6 т. Карысным пры самастойнай працы будзе і зварот да “Гісторыі культуры Беларусі” Л. Лыча, У. Навіцкага і “Эканамічнай гісторыі Беларусі” пад рэд У Галубовіча.

Гэтую і іншую літаратуру, якой будзе патрэбна карыстацца пры самастойнай працы, вы знойдзіце ў планах семінаскіх заняткаў.

Крыніцы.

Асаблівасцю перыда раненнга сярэднявечча з’яўляецца наяўнасць *першых пісьмовых* памятнікаў таго часу, якія адсутнічалі у папярэднія эпохі.

Важнейшым з іх для вывучэння гісторыі Беларусі X– XШ стагоддзяў з’яўляецца “***Аповесць мінулых гадоў***” (“Повесть временных лет”), (у беларускамоўных выданнях сустракаецца таксама назва – *“Аповесць аб мінулым часе”, “Аповесць аб мінулых*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ

часах"), складзеная у пачатку XI стагоддзя., і дапоўненая пазднейшымі Кіеўскім і Галіцка-Валыскім летапісамі. Разам яны складаюць т.зв. "***Іпацьеўскі летапіс"***. У ім утрымліваюцца важнейшыя звестки і пра беларускія землі:

- прыводзецца паданне пра Рагнеду, забоўства полацкага князя Рагвалода і двух яго сыноў;

- гаворыцца аб сутыкненнях кіеўскіх князёў з полацкімі, у прыватнасці – арганізацыі кіеўскім князем Мсціславам пахода на Полацкую землю ў 1127 годзе;

- знайшлі адлюстраванні падзеі, звязаныя з гісторыяй старажытных гарадоў на тэрыторыі Беларусі – Полацка (ум тым ліку і дзейнасці яго веча), Менска, Турава, Друцка, Берасця, Гародні, Пінска, Наваградка, Слоніма, Ваўкавыска.

Менавіта *Іпацьеўскі летапіс* з'яўляецца важнейшай крыніцай па вывучэнню гісторыю Беларусі да пачатку ўтварэння ВКЛ.

Сваеасаблівым пісьмовым творам па гісторыі перяда сярэднявечча з'яўляецца *Радзівілаўскі летапіс*, (да нас дайшоў яго спіс, зроблены у канцы XV стагоддзя), які складаецца з "Аповесці мінулых гадоў" і летапісу за XIII-е стагоддзе. У ім, акрамя тэксту, змешчаны 617 рознакаляровых мініяцюр, якія тэматычна звязаны з тэкстам.

Даследчыкі сярэднявечча на тэрыторыі Беларусі адзначаюць таксама важнасць такіх пісьмовых помнікаў таго часу, як *Лаўрэнцьеўскі спіс* (1096 г.), *Устаўная грамата смаленскага князя Расціслава* (1136 г.), *Смаленская праўда* (1229 г.) і інш.

Гэтыя і іншыя матэрыялы можна знайсці у зборніку "***Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі ў сярэднія вякі (VI – XV стст.)"*** Мн, 1998.

2. Этнічная працэссы на тэрыторыі Беларусі.

Перыяд раннега сярэднявечча – гэта час імкніваых падзей этнічнага характара у Еўропе, якія закранулі і тэрыторыю Беларусі, прывялі да істотных знен у яе насельніцтве. Менавіта у гэты перыяд тут адбыліся працэсы, што прывялі да узнікнення продкаў сучасных беларусаў.

Пачынаючы з другой паловы 4 –га і на працягу першай паловы 5-га стагоддзя нашай эры на еўрапейкім канціненце адбываецца т. зв. ***Вялікае перасяленне народаў.*** Пад націскам "варвараў" з поўначы ў 455 годзе пала, спыніла свае існаванне Рымская імперыя. Гэтыя падзеі прывялі да ўзнікнення новых народаш і плямён, стварэння новых дзяржаў.

Землі Беларусі *толькі часткова* былі закрануты падзеямі, выклікавшымі патрасянні ў масштабах Еўропы, аднак міграцыя пэўных груп народаў *з захада і поўдня* прывялі да значных змен у этнічных адносінах і на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Яны былі *сінхронымі* (саўпадалі па часу) і *адэкватнымі* (адпаведнымі па зместу) агульнаеўрапейскім працэсам, што дазваляе разглядаць матэрыяльную і духоўную гісторыю беларускага народа як састаўную частку еўрапейскай цывілізацыі перыяда сярэднявечча.

Археалагамі даказана, што да канца 5-га стагоддзя карэнным насельніцтвам тэрыторыі Беларусі былі ***балты.*** Да такой высновы прыйшлі і мы, калі разглядалі і аналізавалі культуры плямён, што жылі тут у жалезным веку.

Пачынаючы з сярэдзіны 1-га тысячагоддзя ў жыцці насельніцтва Цэнтральнай і Паўночнай Беларусі адбываюцца значныя змены. *Днепра-дзвінская культура і культура штрыхавой керамікі,* якія тут былі асноўнымі, змяняюцца **Банцараўскай культурай.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Так называецца культура плямён, што жылі у 6-м – 8-мым стагоддзях у Верхнім Панямонні, Верхнім Падняпроўі, Верхнім і Сярэднім Падзвіньі. Назву культура атрымала ад гарадзішча, што знайшлі каля хутару Банцараўшчына пад Мінскам на левым беразе ракі Свіслачь (каля цяперашняга вадасховішча Дразды). Такія ж паселішчы былі выяўлены пры расклопках у Мядзельскам, Барысаўскім Полацкім, Віцебскім і іншых раёнах.

Аналіз матэрыяльных археалагічных помнікаў, тыпаў паселішч – гарадзішчаў, пахавальных магільнікаў і іншых арціфактаў дазволіл зрабіць выснову, што *сфарміравалася* Банцараўская культура на аснове культур штрыхавой керамікі і дзнепра-дзвінскай, якія адносіліся да балцкіх, пад уздзеяннем ***славянскіх плямёнаў.*** Яны *з'явіліся* на тэрыторыі, дзе жылі балты, і у значнай ступені з імі асімілявaліся. Адбывалася гэта у межах Вялікага перасяленняў народаў у цэнтральнай і усходняй Еўропы, у якой ад гэтага часу пачался працэс *славянізацыі*. Таму большасць вучоных лічаць, што **Банцараўская культура** належала ***балтам са славянскім уплывам***.

Тое ж самае можна казаць і аб **Калочынскай культуры**, плямёны якой займалі ў тыя ж вякі тэрыторыю *Паўднёвай Беларусі* – Падняпроўе, Пасожжа, басейн Прыпяці, **Пражскай культуре** на Паўднёвым захадзе Беларусі.

У гістарычнай навуцы працэс ***славянізацыі*** мясцовага насельніцтва на усходе Еўропы, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі, займае значнае месца, выклікае разнастайныя стаўленні і ацэнкі. Пачатак *беларускага сярэднявечча* супал *са славянізацыяў* большай часткі нашага края, у выніку якога склаўся *старабеларускі этнас.*

Славяне *не былі тут мясцовым насельніцтвам*, не былі абарыгенамі гэтага краю. Існуюць некалькі тэорый паходжання славян, іх першапачатковага рассялення. У сціплым выглядзе яны даны ў першай частцы падручніка *"Гісторыя Беларусі"* пад рэд Я.К. Новіка і Г.С. Марцуля. (сс. 28 – 31) Гэтыя пытанні вы будзеце вывучаць і у іншых курсах гістарычнай навукі, у прыватнасці па гісторыі славянскіх народаў.

У 6-м стагоддзі славяне уключыліся у працэс Вялікага перасялення народаў, пачалі свій рух на полдзень, паўднёвы усход. У выніку склаліся некалькіх груп славянскіх супольнясцяў, якія паклалі пачатак існавання сённяшніх народаў: **Паўднёвыя славяне** (сёння гэта – балгары, сербы, харваны, славенцы, македонцы і інш народы Балкан), **Заходнія славяне** (палякі, чэхі, славакі) **Усходнія славяне** (рускія, беларусы, украінцы).

У 6-м стагоддзі невялікія, але добра ўзброеныя групы славян пачалі з поўдня, ад Прыпяці і Днепра, рух на *поўнач.* У 8 – 9-м стагоддзі славяне массава рассяліліся ў балцкім рэгіёне у *Падзвінні і Падняпроўі*, а у X стагоддзі і на *Верхнім Панямонні*. Яны асядалі сярод мясцовага насельніцтва, успрымалі яго культуры і самі ўплывалі на мясцовае насельнітва, у выніку чаго склаліся ўжо названыя *Банцараўская і Калочынская культуры*.

Большая частка балцкага насельніцтва была

асімілявана,(г.зн. – успрыняла славянскую культуры, была паглынута славянамі);

некаторая частка – працягвала жыць разам, побач са славянамі, але абасоблена, захоўваючы сваю адметнасць;

частка –была *знішчана* ці выціснута на наўночны захад, у Прыбалтыку (дзе стварыліся у далейшым этнічныя літоўцы і латышы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Розныя славянскія плямёны мелі шмат агульнага ў гаспадарцы, грамадскім жыцці, побыце, культуры, мелі агульную мову.

Славяне знаходзіліся на этапе *разлажэння радавых* адносін. Хаця і працягвала існаваць абшчына, але ворныя землі, якія апрацоўваліся паасобку, ужо сталі адасабляцца як *асобная уласнасць*. Паміж членамі абшчыны узнікала *маёмаснае расслаенне*, з'яўляюцца заможныя і збяднелыя. У выніку войнай і захопу чужой маёмасці фарміруецца *ваенна-племянная вярхушка* плямен. Менавіна ім дастаецца усе найбольш каштоўнае ў выніку войнай – рабы, зброя, жывёла, каштоўнасці, яны становяцца уладальнікам найбольш пладародных зямель. Апорай гэтай знаці станавілася *ваенная дружына* – аб'яднанне прафесійных воінаў, якія страчвалі сувязі з сваімі родамі і абшчынамі. Такім чынам узніклі *органы племяннога кіравання* – племянная арыстакратыя – *племянныя правадыры і ваенныя кіраўнікі*. Такім чынам, славянскія плямёны знаходзіліся на этапе зараджэння дзяржаўнасці.

Паступова *складваюцца тэрытарыяльныя аб'яднанні славянскіх плямёнаў* – вялікія патрыярхальныя семьі пераўтвараюцца ў суседскія абўчыны, што аб'ядноўваюцца на тэрытарыяльнай аснове.

Да IX – X стагоддзяў на асноўнай частцы тэрыторыі Беларусі сфарміраваліся устойлівыя этнічныя супольнасці славян, саюзы славянскіх плямён – **дрыгавічоў, крывічоў-палачан і радзімічаў.**

Звесткі аб гэтым утрымлівае "*Аповесць мінулых гадоў*" ("Повесть временных лет"), у якой знаходзім:

*"... те же словене пришедше седоша по Днепру и нарекошася **поляне**, а друзии **древляне**, зане седоша в лесах, а друзии седоша межи Припетью и Двиною и нарекошасе **дреговичи**, а инии седоша на Двине и нарекошася **полочане**, речки ради, яже втечь в Двину,именем Полота, от сея прозвашася полочане".*

Акрамя таго, у "*Аповесці мінулых гадоў*" названы і іншыя племянныя аб'яднанні усходніх славян – севяране, валыняне, вяцічы бужане, паляне і іншыя, усяго больш за 10. Карту аб размяшчэнні важнейшых плямен усходніх і іншых славян, а таксама і неславянскіх плямён (у т.л. жемайтаў, латгалаў, яцвягаў і інш.) гл. у "Атласе гісторыі Беларусі", с. 8)

Крывічы-палачане, ці проста крывічы, былі *самай вялікай усходнеславянскай супольнасцю* на абшары Усходняй Еўропы – ад Дняпра і Заходняй Дзвіны да Волгі і Чудскога возера на усходе. Фарміраванне крывічаў – вынік асіміліцыі прышлымі славянамі балцкіх і заходнефінскіх плямён. На тэрыторыі сучаснай Беларусі арэал іх рассялення ўключаў *Падзвінье і верхняе Падняпроў'е. Палачане* – гэта група крывічскіх плямён, цэнтрам якоў быў Полацк. (гл.: "Атлас гісторыі Беларусі", с. 9.)

Дрыгавічы таксама з'яўляліся аднім з усходнеславянскіх племянных аб'яднанняў, што займалі вялікую тэрыторыю на поўдні Беларусі – у басейне Прыпяці і вярхоў'і Немана, да Заходняга Буга, Гародні, Мінска, Барысава. Дыгавічы, як і крывічы, належылі да ліку найбольш развітых усходнеславянскіх плямён. (гл.: "Атлас гістотрыі Беларусі", с.10)

Такога ж змешанага славяна-балцкага паходжання был і **радзімічы,** якія займалі Пасожжа (басейн р. Сож) – тэрыторыю паміж Днепром і Дзясной. На поўначы яны межавалі з крывічамі, на захадзе – з дрыгавічамі. (гл.: "Атлас гісторыі Беларусі", с.11.)

Усе названыя аб'яднанні славян мелі ўстоўлівыя сувязі, ў аснове якіх ляжала агульная славянская мова, агульныя рысы гаспадарча-культурнага жыцця, аднолькава знаходзіліся на этапе разлажэння радавога ладу і перахода да стварэння дзяржаўных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адносін. Таму славянскія аб'яднанні крывічаў, дрыгавічоў, радзімічаў адыгралі надзвычана вялікую ролю у гістарычным працэсе. У *этнаграфічных а*носінах гэтыя супольнасці можна назваць ***пранароднасцямі,*** бо на іх падстве і узнікла у тым ліку і беларуская народнасць. У *сацыяльных* адносінах яны былі пачатковымі дзяржаўнымі утварэннямі тэрытарыяльна-палітычнага характару, ці ***прадзяржавамі.***

На працягу другой паловы 1-га тысячагоддзя н.э. славяне асвоілі амаль усю тэрыторыю Беларусі. Аднак частка балцкага насельніцтва *засталася* жыць на гэтай тэрыторыі сярод славян, утвараючы ў некаторых мясцовасцях зхаволі значныя "астравы" сярод прышлых славян, асабліва на паўночным захадзе. На думку археолагаў, у канцы тысячагоддзя *этнічная граніца* рассялення паміж *славянскімі і балцкімі народамі* на тэрыторыі Беларусі праходзіла прыблізна па лініі *Дзісна – Пліса – Будслаў - Заслаўе – Рубяжэвічы – Слонім – Ваўкавыск.* На поўнач ад яе, на паўночным захадзе Беларусі, у сяроднім Панямонні значнай этнічнай групай былі **яцвягі.** Яны адносіліся да *заходнебалцкай* культуры. Да *усходнебалцкай* культуры адносіліся ***літоўцы,*** якія на тэрыторыі сучаснай Беларусі у той час жылі у вярхоўі Віліі, каля Свіры, Крэва.

Такім чынам, на рубяжы 1-га і 2-га тысячагоддзяў завершылася славянізацыя большасці тэрыторыі Беларусі, тагачаснае грамадства ўступіла ў новый этап свайго развіцця.

Аднім з самых складаных у гісторыі Беларусі з'яўляецца пытанне аб тым, калі і на падставе каго сфарміравалася ***беларуская народнасць***, адкуль пашла ***назва Белая Русь?*** Адзінага адказа на гэтыя пытанні да сённяшняга дня няма.

Паняцце "народнасць" выкарыстоўваееца для вызначэння супольнасці людзей, звязаных адзінствам ***мовы, тэрыторыі, матэрыяльнай і духоўнай культуры.***

У вывучэнні *этнагенезу (паходжання)* беларусаў існуюць шэраг **канцэпцый.** Ні адна з іх не дае абсалютна бясспрэчнага адказу, мае як сваі сільныя,так і слабыя бакі.

Сярод асноўных канцэпцый вызначым наступныя:

Велікаруская канцэпцыя зыходзіць з таго, что беларусы – частка велікарускай народнасці.

Польская канцэпцыя лічыць беларусаў часткай польскага этнасу, а беларускую мову дыялектам польскай мовы.

Крывіцкая канцэпцыя продкамі беларусаў лічыць крывічоў, але яны займалі толькі паўночную і цэнтральную частку сучаснай тэрыторыі Беларусі.

Балцкая канцэпцыя, якая лічыць, што беларусы з'явіліся у выніку змяшэння славян з балцкім этнасам, які пражываў тут раней.

Сярод сучасных канцэпцый, што з'явіліся напрыканцы XX стагоддзя свае погляды выказвалі ***С. Токараў*** (што ў раннефеадальны перыяд склалася адзіная старажытнаруская народнасць з цэнтрам у Кіеве, якая і з'яўляецца вытокам рускай, украінскай і беларускай народнасцяў).

Г. Штыхаў, М. Ярмаловіч, М. Ткачоў катэгарычнам адмаўлялі прызнаваць існаванне старажытнарускай народнасці, лічылі, што беларускаянароднасць узнікла на падставе як змешвання славянскага элемента з балцкім, так і ў выніку інтэнсіўнага перамешвання саміх славянскіх супольнасцяў (крывічоў, радзімічай, дрыгавічоў).

М.Ф.Піліпенка прапануе адмовіцца ад спрошчанага падыхода, што абсалютызуе толькі эвалюцыю ці толькі міграцыю насельніцтва. Ён лічыць, што фарміраванне беларускага этнасу мелі месца як эвалюцыя, так і дыфузія (пранікненне) насельніцтва, якія цесна ўзаемадзейнічалі і дапаўнялі адна другую.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Усе названыя канцэпцыі маюць права на існванне, маюць як сваіх прыхільнікаў, так і праціўнікаў.

На маю думку, найбольш абгрунтаванымі з'яўляюцца ў сваёй сукупнасці балцкая канцэпцыя ў спалучэнні з канцэпцыямі М. Ярмаловіча і М.Піліпенка.

Зразумела адно – працэс складвання беларускай народнасці быў *працяглым па часе, шматбаковым па зместу* і завершылся не раней *за XIV* стагоддзе.

Такія ж неадназначныя погляды існуюць і на паходжанне тэрміна *"Белая Русь"*.

У розныя часы паходжанне назвы звязвалі з: прыгажосцю зямлі; мноствам снегу; вольнасцю насельніцтва; незалежнасцю ад татара-манголаў; з антрапалагічным тыпам жыхароў (светлавокія і светлавалосыя; з больш раннім прыняццем хрысціянства; шырокім распаўсюджаннем ў тапаніміцы (назве насельн. пунктаў) назваў са словам "белая".

Калі звернуцца да гістарычных крыніц, то ў летапісах, на заходнеўрапейскіх картах, хроніках тэрмін *"Белая Русь*" у ХШ – ХІУ стагоддзях ужывался ў дачыненні да шмат якіх тэрыторый усходнеславянскага насельніцтва – да Маскоўскіх,Смаленскіх, Пскоўскіх і іншых зямель. З сярэдзіны ХУІ стагоддзя ім сталі абазначаць тэрыторыю ***падзвінска-дняпроўскага рэгіёну*** на тэрыторыі сучаснай Беларусі (землі Полацкай, Віцебскага, Мсціслаўскага і часткова Мінскага ваяводстваў. Ад назвы рэгіёна паходзіць і назва яго жыхароў – *беларусы ці беларусцы.*

На заходнюю частку беларускай тэрыторыі (беларускае панямонне) з канца ХУІ стагоддзя распаўсюджваецца назва *"Чорная Русь*" (да таго часу яна ужывалася да назваў тэрыторый паўднёва-заходняй часткі сучаснай Украін – тагачаснай Галіцкай зямлі). Паходжанне і гэтага тэрміна не мае адназначнай трактоўкі.

Падрабязна аб паходжанні назвы "Беларусь" гл.: Імя твае Белая Русь. Мн., 1991

3. Полацкае княства.

Полацкае княства было першай ***дзяржавай,*** якая утварылася на беларускіх землях. Яно паклала пачатак *дзяржаўнасці* на беларускіх землях, але яго *нельга называць беларускай дзяржавай*, бо гэта быў адзін з трох моцных дзяржаўных цэнтраў (палянскі Кіеў, славянскі Ноўгарад і крывіцкі Полацк) *славянскай* дзяржаўнасці, а беларуская народнасць яшчэ не сфарміравалася.

Вялікую ролю ва ўзнікненні дзяржаўнасці менавіта тут, на паўночным усходе Беларусі, адыгрывалі *геаграфічны, сацыяльна-эканамічны і этнічныя* фактары.

Да ***геаграфічных*** асаблівасцяў, што спрыялі развіццю края, адносіцца разгалінаваная тут *рачная сетка* (аб ролі рэк як шляхоў зносін і крыніц існавання насельніцтва мы ужо казалі), а таксама вялікая колькасць *азёр* і *хваёвых лясоў.* Ворныя землі на месца такіх лясоў былі асабліва урадлівымі. Акрамя таго, *клімат* у гэтай зоне значна цяплей і больш вільготны, што вельмі спрыяльна адбівалася на вядзенні земляробства і жывёлагадоўлі.

Таму і ***сацыяльна-эканамічнае*** развіццё гэтага краю адбывалася даволі трывала. ***Этнічныя*** аб'яднанні крывічоў, якія прыйшлі ў Прыдзвінье і Верхняе Падняпроўе мелі *даволі высокі ўзровень вытворчай гаспадаркі,* у іх рана пачаліся працэсы *сацыяльнай і маёмаснай дыферэнцыяцыі*, што вяло да зародкаў дзяржаўнасці.

Росту полацкай зямлі ў палітычным і эканамічным аднгосінах спрыяла і тое, што тэрыторыя знаходзілася на аднім з адгалінаванняў гандлёвага шляху *"з варагаў ў грэкі",* які злучаў Чорнае і Балтыйскае моры. Ён праходзіл з Балтыйскага мора па

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

заходняй Дзвіне да яе вярхоўяў, потым волакам да вярхоўяў Дняпра і далей па ім да Чорнага мора.

Гісторыю Полацкага княства адлічваюць ад пачатку існавання горада Полацка, які у "Аповесці мінулых гадоў" упамінаецца ў **862** годзе. Несумненна, аднак, што і да гэтага часу тут існавала гарадзішча днепра-дзвінцаў, якія і далі пасяленню назву ад раки Палаты. Па звестках археолагаў, у IX стагоддзі тут жыло каля 1 тысячы чалавек, што па тым часам лічылася вельмі масавым паселішчам.

Мяркуючы па звестках з "Аповесці мінулых гадоў", першым князем у Полацку стаў стаўленнік *скандынаўскага князя Рюрыка,* што княжыў ў Ноўгарадзе, і раздаваў гарады падначальных зямель на княжэнне. Прозвішча першага Полацкага князя не вядома, але з вялікай долей вераготнасці ян таксама быў скандынавам. Летапісы згадваюць прозвішча Полацкага князя Рагвалода, які таксама належыў да скандынаваў.

Таму ў другой палове IX стагоддзя Полацк і полацкая зямля сталі *аб'ектам барацьбы* паміж *Кіеўскім княствам*, якое імкнулася распаўсюдзіць свой уплыў на поўнач, і *Ноўгародскім княствам*, якое імкнулася захаваць кантроль на падначальных тэрыторыях. Такое геапалітычнае становішча Полацкай зямлі – паміж двума буйнымі дзяржаўна-палітычнымі цэнтрамі – Кіевам і Ноўгарадам, якія знаходзіліся ў пастаянным праціборстве, наклала адбітак на шмат стагоддзяў палітычнай і эканамічнай гісторыі Полацкага княства.

У гісторыі Полацкага княства можна выдзяліць некалькі перыядаў.

Першы перыяд **–** канец IX- пачатак X стагоддзя, калі княжыла дынастыя Рагвалода – Полацкае княства знаходзілася у пастаянных палітычных і эканамічных сувязях як з Ноўгарадскім так і з Кіеўскім княствамі. Вядома, што крывічы-палачане прымалі ўдзел у паходзе 882 года кіеўскага князя Алега на Смаленск, у паходзе 907 года на Царьград (Візантыю). Навукоўцы лічаць, што Полацкае княства у той час намінальна ўваходзіла ў склад Кіеўскай дзяржавы, але яе адносіны абмяжоўваліся толькі ўдзеламі ў ваеных паходах.

Другі перыяд – паміж 907 і 980 гадамі, калі няма ніякіх звестак аб падначальным стане Полацка Кіеву, фактычна адбыўся *выхад* Полацкага княства *з-пад улады Кіева*. У гэты час полацкія княззі вядуць ***самастойную*** ваенна-палітычную і гандлёва-эканамічную дзейнасць, узмацняць дзяржаўную уладу, аб'ядноўваюць новыя землі. На аснове Полацкага княства сфарміравалася абшырная і адносна самастойная ***Полацкая зямля.*** Яе тэрыторыя ў *паўночна-заходнім* накірунку пашырылася ад р. Дзісна ўздолж Заходняй Дзвіны. На *паўдневым захадзе* ўлада Полацка распаўсюджвалася да вярхоўяў Свіслачы, да сучаснага Заслаў'я, на *Поўдні– да Рагачёва.* На поўначы княства межавала з Наўгародскай зямлёй на тэрыторыі Пскоўшчыны. (гл.: Атлас гісторыі Беларусі. С.12.)

Трэці перыяд – ад 980 да 1003 года. У 70-я гады X стагодзя ў Полацку княжыў **Рагвалод.** Полацкая зямля пры ім канчаткова сфарміравалася як самастойная дзяржава, займала важнае месца сярод славянскіх дзяржаў – княстваў. Сэнс падзей 980-га году быў у тым, што ён апынуўся ў гушчары барацьбы паміж братамі – *наўгародскім* князем Уладзімірам і *кіеўскім* князем ***Яраполкам.*** (абодва з'яўляліся унукамі кіеускай княгіні Вольгі.)

Пытанне аб прыцягненні Полацкага княства на свой бок кожны з іх спрабаваў вырашыць шляхам шлюбу з дачкой Рагвалода – ***Рагнедай***. *Шлюбныя адносіны* паміж прадстаўнікамі княжэцкіх дынастый у той час былі сферай не сколькі *прыватнага*, колькі *палітычнага жыцця*. Менавіта праз дынастычныя шлюбы падчас вырашаліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лёсы дзяржаў і народаў. Абіраючы сярод прэтендэнтаў, Рагнеда і Рагвалод аддалі перавагу кіеўскаму князю *Яраполку,* што адлюстроўвала жаданне да палітычнага саюза з кіеўскім княствам.

Пакрыўджаны наўгародскі князь *Уладзімір* сабраў вялікае войска, штурмам узяў Полацк, *забіў Рагвалода* і яго двух сыноў і прымусам узяў *Рагнеду ў жонкі*. Неўзабаве Уладзімір захапіў Кіеў і стаў правіцелем Кіеўскай Русі.

Асноўным вынікам падзей 980 года для Полацкага княства стала страта незалежнасці і ўключэнне яго у склад Кіеўскай дзяржавы.

Ад шлюбу з Уладзімірам Рагнеда мела 4-х сыноў: *Яраслава* (князь наўгародскі, а потым і кіеўскі князь Яраслаў Мудры), *Ізяслава* (які стаў полацкім князем), *Мсціслава* (у далейшым стаў чарнігаўскім князем), *Усеслава* –(князь уладзіміра-валынскі) і двух дачок.

Пасля *неудалага замаха* Рагнеды на жыццё Уладзіміра (з мэтай помсты за забойства бацькі, братоў і гвалтоўны шлюб), яна з другім па старшынству сынам – *Ізяславам*, (які уступіўся за маці і даў бацьке расправіцца з ёй пасля неудалага замаху) была саслана на пасяленне ў крэпасць пад Мінскам, якая пазней сталя вядома як г. Ізяслаўль (сучасны Заслаўль). Усе гэтыя перапетыі палітычнага і асабстага жыцця і сталі асновай "***Падання пра Рагнеду",*** якое вядома з "Летапісу мінулых гадоў".

Сасланы ***Ізяслаў*** тым не меньш ужо ў 984 (988 па некаторых крыніцах) годзе атрымаў у княжэнне ***Полацкую землю***, стаў *новым Полацкім князем*.

Ізяслаў паклаў пачатак ***новай полацкай княжэцкай дынастыі***. Паколькі Ізяслаў па *матчынай лініі* з'яўляўся унукам Рагвалода, ён быў прадстаўніком *мясцоваў княжацкай дынастыі,* а *бацькоўскай* лініі ен быў прадстаўніком дынасцыі *Рюрікавічаў,* што давала яму права прэтэндаваць на уладу ў Кіеўскай дзяржаве. Па самых сціплых звестках да дынастыі Ізяслаўвавічаў адносяцца каля 10-ці у далейшым князёў Полацкага, Тураўскаг і іншых княстваў. ***Памёр*** князь ***Ізяслау ў 1001 годзе***.

Пасля яго засталося два сына: ***Усяслаў*** (старэйшы, памёр неўзабаве пасля бацькі, ў 1003 годзе) і ***Брачыслаў***, які застаўся адзіным нашчадкам княжэцкай дынасцыі ў Полацку.

Новы – ***чацвёрты перыяд*** у гісторыі Полацкага княства – перыяд першай паловы XI стагоддзя, час княжэння ***Брачыслава Ізяслававіча*** **- 1003 – 1044 гады.** Пры ім складваецца *другая полацкая дзяржава*, *росквіт* якоў прыпадае на сярэдзіну – другую па XI стагоддзя.

У часы Брачыслава *пашыраецца* тэрыторыя Полацкай зямлі, у першаю чаргу на захад і поўнач. Паустаюць навыя *гарады,* у тым ліку і *Брачыслаўль* (названы у гонар князя – сучасны Браслаў), і гарады сярэднім рэчашчы Дзвіны – *Кукенойс і Герціка* (зараз на тэрыторыі Латвіі), што дае магчымасць кантраляваць гандлёвы шлях да Балтыйскага мора, збіраць даніну з балтыйскіх плямён. Усклад Полацкага княства былі *ўключаны Віцебск* і *Усвяты,* дзе праходзілі валокі гандлёвага шляху. Разам з тым, на перыяд княжэння Брачыслава прыпадае зніжэнне знешнепалітычнай актыўнасці Полацкага княства. Полацкае княства амаль не ваявала з сваімі суседзямі. Вядома толькі, што у *1021 годзе* Брачыслаў нападае на *Ноўгарад* і захоплівае яго. Але неўзабаве была заключана мірная дамова паміж братамі – полацкім Брачыславам і наўгародскім Яраславам.

Пяты перыяд у гісторыі Полацкага княства звязаны з княжэннем сына Брачыслава – **Усяслава Брачыславіча (Усяслава Чарадзея),** ахоплівае перыяд **1044 – 1101 гадоў.**

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУ

У *першы п*ерыяд свайго княжэння, прыкладна да сярэдзіны 60-х гадоў XI-га стагоддзя, Усяслаў Чарадзей з'яўляўся *прадаўжальнікам палітыкі* свайго бацькі на ўмацаванне сваёй дзяржавы. Узмацняецца улада Полацкага княства на тэрыторыі ніжняга *Падзвіння,* у склад Полацкай зямлі было уключана *Менскае княства, а таксама Орша і Капысь*. Значна растуць плошчы гарадоў, у іх хутка развіваюцца рамяство і гандаль. У самім Полацку, насельніцтва якога ўзрасло да 10-15 тысяч чалавек, пачалося будаўніцтва *Сафійскага сабора,* які адлюстроўваў моц і незалежнасць Полацкай дзяржавы.

Але у **1065** годзе адбываецца паварот у знешняй палітыцы Полацкага княства ад мірнага суіснавання да ваенных супярэчнасцяў. У гэтый год адбыўся ваенны паход Усяслава Чарадзея на Пскоў. Такім чынам, аднаўляецца ваенная барацьба з Ноўгарадам, а потым і Кіевам. У ходзе гэтай барацьбы былі як *перамогі,* так і *паражэнні.* Складаным і няпростым быў і *лёс* самаго Усяслава Чарадзея.

Ім быў арганізаваны шэраг паспяховых паходаў на суседнія землі. У перыяд з 1065 па 1078 год адбываюцца бітвы: ***за Пскоў*** (захоплены ў 1065 г.), ***Ноўгарад*** (у 1066 г. быў захоплены, разрабаваны і падпалены), ***Менск, Смаленск.*** (у 1078 годзе захапіў і спаліў яго).

Супраць ваяўнічай актыўнасці Полацкага князі выступілі аб'яднаныя сілы, якія склаліся з войскаў *кіеўскага, чарнігаўскага і пераяслаўскага* князеў Яраславічаў. Імі ў лютым 1066 годзе быў захоплены, разрабаваны і знішчаны ***Менск.*** У сакавіку 1067 года (3 сакавіка) адбылася жорсткая бітва на р. ***Нямізе,*** дзе перамога была на баку антыполацкай кааліцыі, але частка войска Усяслава і ён сам ацалелі.

У 1067 годзе Усяслаў Чарадзей і двое яго сыноў самі апынуліся ў *палоне у* кіеўскага князя і больш за год правялі у зняволенні. Але ужо ў верасні 1068 года ён сам становіцца кіеўскім князем, аднак у хуткім часе вяртаецца да сябе ў Полацк. У перыяд з 1069 па 1071 год Усяслаў нават *не з'яўляўся полацкім* князем. Фактычна на некалькі год, на непрацяглы перыяд з 1067 па 1071 год, Полацкае княства губляе сваю незалежнасць.

З 1071 года адбываецца аднаўленне у Полацку княжэння Усяслава Чарадзея. Яшчэ некалькі год працягваліся яго напружанныя адносіны з суседзямі, з паўднёва рускімі князямі. У 1978 годзе Усяслаў Чарадзей захапіў ***Смаленск***. У сваю чаргу ў 1084 годзе ягоныя праціўнікі зноў захапілі і знішчылі ***Менск.***

Перыяд полацкага княства, звязаны з дзейнасцю Усяслава Чарадзея, скончыўся з яго смерцю **ў 1101-м** годзе.

Якую *гістарычную ацэнку* можна даць Усяславу Брачыславічу (Чарадзею), яго ролі у гісторыі Полацкай зямлі – першай дзяржавы на тэрыторыі Беларусі?

Некаторыя даследчыкі называюцьяго аднім *з выдатнейшых палітычных дзеячаў старажытнай Беларусі*. З гэтым нельга цалкам пагадзіцца. Усяслаў Чарадзей быў тыповым прадстаўніком дзяржаўнага, палітычнага і ваеннага дзеяча свайго часу. З 57-мі гадоў княжэння каля 15 – 20 год Полацкім княствам вяліся актыўныя ваенныя дзеянні, яно само не пазбегла разбуральных спусташэнняў гарадоў і тэрыторый з боку суседніх княстваў. Полацкае князства не набыло значных новых тэрыторый, але і *не страціла сваёй* палітычнай незалежнасці. Полацкая зямля заставалася ***цэластнай дзяржавай*** з адзіным цэнтрам у Полацку, ***адыгрывала важную ролю ў палітычным жыцц***і ўсходніх славян.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Тураўскае княства

Тураўскае княства ўтварылася ў межах ***рассялення дрыгавічоў*** — у паўднёвай Беларусі, басейне р.Прыпяць. Сталіца княства — ***горад Тураў*** — прыгадваецца **пад 980** г., калі на Беларусі з'яўляюцца князі, магчыма, браты — *Рагвалод і Тур*. Ад апошняга, як паведамляе летапіс, "тураўцы празваліся".

Сярод гарадоў Тураўскага княства найбуйнейшымі былі *Пінск і Бярэсце,* меншымі — *Кобрын, Камянец, Драгічын, Бельск, Мазыр, Рагачоў, Брагін.*

У часы Рагвалода (да 980 года) Тураўская зямля, магчыма, належала да Полацка, а пасля 980 года была далучана да Кіева.

Падзеі 988 г., калі былі вызначаны межы Тураўскай зямлі, сведчаць аб тым, што Тураўшчына з самага пачатку развівалася як *самастойная дзяржаўная* адзінка з усімі адпавядаючымі гэтай пабудове інстытутамі, але былі і свае асаблівасці, што накладвалі адбітак на умовы існавання і лёс Тураўскай зямлі.

Галоўнай складанасцю ў фарміраванні гэтай дзяржавы было тое, што яна займала *не ўсю этнічную тэрыторыю дрыгавічоў*, а толькі землі левага берага *Прыпяці* з гарадамі ***Туравам***, ***Слуцкам***, пазней — ***Бярэсцем***. На *поўначы* землі дрыгавічоў вакол Менска належалі *Полацкай дзяржаве,* на поўдні і ўсходзе Турацскае княства межавала з Кіеўскім і Чарнігаўскім княствамі, на захадзе частка *зямель дрыгавічоў* была ва ўладанні *ўладзіміра-валынскіх князёў.* Аб тэрыторыі Тураўскага княства і яе межах дае ўяўленне карта, змешчаная на стар. 12 “Атласа гісторыі Беларусі”.

Тураўскае княства, у адрозненні ад Полацкай зямлі, знаходзілася значна бліжэй да Кіева. Гэта і абумовіла тое, што менавіта кіеускія княззі імкнуліся усталяваць кантроль над Тураўскім княствам, разглядалі яго як сваю вотчынну. Як правіла, Тураўскае княства *давалася ва ўладанне трэцяму* па старшынству з сыноў кіеўскага князя. Нярэдка, яны нават калі станавілся кіеўскімі князямі, пакідалі за сабоў валоданне Тураўшчынай.

Усяго за перыяд ад 980 года і да сярэдзіны XII стагоддзя было 10 князёў Тураўскай зямлі.

У **988 г.** ***Уладзімір*** кіеўскі выдзеліў Тураўскую зямлю свайму трэцяму сыну ***Святаполку***. Гэта сведчыць аб вялікай *значнасці і ролі* Тураўскага княства. Пасля смерці Уладзіміра Святаславіча ў 1015 г. менавіта Святаполк тураўскі становіцца *кіеўскім князем*, але пакідае за сабой і *Тураўскую* зямлю.

Таксама і Яраслаў Мудры — князь кіеўскі — напрыканцы свайго жыцця аддаў Тураўшчыну свайму *сыну* ***Ізяславу***. Гэта сведчыць пра ўстойлівасць дзяржаўна-княжацкай традыцыі ў Тураве, таксама як і пра пастаянства тэрыторыі гэтай дзяржавы. Пасля смерці Яраслава Ізяслаў становіцца вялікім князем кіеўскім, але таксама пакідае за сабой і Тураў.

Два сыны Ізяслава — ***Яраполк і Святаполк*** — трымалі за сабой Тураў. Але ў 1113 г. са смерцю Святаполка ўлада Ізяславічаў у Тураве скончылася і сталіца разам з княствам перайшла да роду Манамахавічаў. Кіеўскім князем стаў Уладзімір Манамах. Ён і яго паслядоўнікі трымалі Тураўскае княства ў якасці дадатку да сваіх асноўных уладанняў — Кіева, Пераяслаўя і іншых зямель. Але гэта было права сілы, а не вынік прыналежнасці Тураўскай зямлі да Кіеўшчыны. За перыяд ад 1113 па 1146 год змянілася **11 к**іеўскіх князёў, з якіх **8 таксама валодалі і Тураўскай зямлёй**, былі князямі тураўскімі.

У сярэдзіне XII ст. паміж паўднёварускімі князямі адбывалася зацятая барацьба за валоданне Кіевам. Разам а Кіевам з рук у рукі пераходзіў і Тураў — то да суздальскіх,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ

то да валынскіх князёў. Але ў 50-я гг. XII ст. на тураўскім троне апынуўся князь Юрый Яраславіч, які вярнуў зямлю ва ўладанне дынастыі Ізяславічаў. З гэтым не жадалі мірыцца кіеўскія князі. Аб'яднаўшыся ў 1158 г., яны зрабілі паход на Тураў, каб адабраць яго ў Юрыя. Відавочна, што Юрый Яраславіч быў не толькі ўдалым военачальнікам, але і карыстаўся павагай тураўцаў, іх поўнай падтрымкай. Ён клапаціўся ў першую чаргу пра жыхароў зямлі, разглядаючы княства як сваю законную спадчыну. Толькі гэтым і моцнай фартыфікацыяй горада можна растлумачыць, што дзесяцідзённая аблога была паспяхова вытрымана. Таксама быў адбіты напад на Тураў валынскіх князёў у 1160 г. На гэты раз варожыя войскі прастаялі пад сценамі горада тры тыдні. Праз цяжкую барацьбу Тураўскае княства аднавіла сваю самастойнасць і незалежнасць..

5. Беларускія землі ў 12-13 стст.

У XII – першай палове XIII стагоддзяй беларускія землі перажывалі новый перыяд свайго існавання ў час сярэднявечча. Як і большасць тагачасных краін Еўропы пачынаецца этап ***феадальнай разробленасці.*** Гэта быў заканамерны працэсс існавання раннефеадальных дзяржаў, які большасць даследчыкаў лічаць *прагрэсіўным,* таму што ён спрыял *палітычнаму* росту асобных зямель, касалідацыі іх *эканамічнага* жыцця, росту *гарадоў*. Аналагічныя працэсы адбываліся і ў Кіеўскай Русі, а таксама і на Беларусі. На Любецкім з'ездe князёў1097 года быў пакладзен пачатак размежавання паміж асабнымі княствамі, пасля смерці кіеўскага князя Мсціслава ў 1132 годзе Старажытная Кіеўская Русь канчаткова раскалолася, распалася на асобныя часткі.Аналагічныя працэсы адбываліся і на тэрыторыі Бнларусі.

Фактычна распадаецца калісці магутнае **Полацкае княства.** Ужо пры жыцці полацкага князя Усяслава Чарадзея, таксама пасля его смерці ў 1101 годзе тэрыторыя Полацкай зямлі была падзелена паміж яго сынамі, якіх у яго было 7 (семера). Раней існаваўшыя *воласці, якія падпарадкоўваліся непасрэдна* Полацку, пераўтвараюцца ва *ўдзелы-княствы,* што аддаюцца на княжэнне сынам полацкага князя. Яны пасля смерці Усяслава сталі самастойнымі валадарамі асобных удзельных княстваў.

Узніклі асобныя княствы з цэнтрамі ў

- ***Менску (1086г. , першы князь Глеб),- Друцку,- Віцебску,- Лагойску,- Заслаўлі,*** а таксама ***Вільні, Кукеноўсе, Герцыге*** і інш.

Разам з тым, Полацк заставаўся самым буйным палітычным цэнтрам, "старшым" горадам Полацкай зямлі.

Узнікшыя княствы імкнуліся адстойваць сваю незалежнасць у барацьбе *супраць паўднёварускіх князёў,* а тасама вялі і паміж сабоў *міжўсобную барацьбу*. Вядома, напрыклад, што калі ў 1105 годзе на Менск напала аб'яднанае войска кіеўскага, чарнігаўскага і валынскага княстваў, у тым паходзе супраць мінскага князя Глеба прымаў удзел і яго брат полацкі князь Давыд Усяславіч. Умацоўваючы Мінскае княства сам Глеб у 1116 годзе нападае на Слуцкае княства, у 1117 годзе разам з палачанамі прымаў удзел у паходах супраць Наўгародскага і Смоленскага княстваў. У адказ войскі сына Кіеўскага князя Мсціслава ў 1119 годзе асадзілі Менск, захапіілі горад і паланілі князя Глеба, які неўзабаве памёр. У выніку Менскае княства страціла свааю самастоўнасць, было далучана кіеўскіх уладанняў.

У пачатку XП стагоддзя працягвалася упартая барацьба паміж Полацкай зямлёй і яе паўднёвымі суседзямі. Адбыліся яшчэ два буйных паходa паўднёварускіх князёў на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Полацкую землю - ў **1116 г**одзе і у **1127 г**одзе , якія меў сваёй мэтай падпарадкаванне Полацкай зямлі кіеўскай дзяржаве.

Асабліва знішчальным быў паход ***1127 года.*** Тады Полацкая зямля падверглася нападу з *8-мі* розных накрункаў - з боку Ноўгарада, Смаленску, Чарнігава, Кіева, Уладзіміра, Гродна і нават беларускіх княстваў Тураўскага і Клецкага.

Войскі асадзілі і захапілі *Ізяслаўль, Лагойск, Барысаў, Друцк,* якія з'яўляліся цэнтрамі адпаведных князстваў, накіроўваліся да Палацку. У выніку ў палон былі захоплены полацкія князі Усяславічы і разам з сынамі высланы у Візантыю.

Нестабільнасць знешепалітычнай абстаноўкі была характэрна для беларускіх княстваў, што ўваходзілі ў склад Полацкай зямлі, і ў другой палове XII – пачатку XШ стагоддзяў.

Раздробленасць перажывала і **Тураўская зямля.**

Мы ужо казалі, што самастойнасць Тураўскага княства была адноўлена у ***1157 г***одзе пры Юрыі Яраславічы. У перыяд з 1167 па 1174 гады пачынаецца драбленне княства паміж яго сынамі. Выдзяляюцца ***Пінскае*** княства, ***Клецкае*** яняства, ***Слуцка***е княства, ***Дубровіцкае*** княства захоўваецца ***Тураўскае*** княства. У гэтых княствах сядзелі нашчадкі Юрыя – ***у Пінскім*** княстве – князі *Яраслаў, Яраполк і Уладзімір*, у ***Дубровіцкім*** княстве – князь *Глеб*, у ***Тураўскім княстве*** – *Святаполк.*

Характэрнай асаблівасцю Тураўскай зямлі таго часу было тое, што ў адрозненні ад князёў Полоцкай зямлі, паміж нашчадкамі Юрыя – князямі Юравічамі, удзельнымі княствамі Тураўскай зямлі склаліся мірныя, па-сапраўднаму брацкія адносін У летапісах не сусракаюцца ўпамінанні аб іх міжусобных войнах.

У другой палове XII стагоддзя - пачатку XШ стагоддзя княствы Тураўскай зямлі знаходзіліся пад моцным уплывам *Кіева,* а тасама *Галіцкага, Уладзіміра-Валынскага і Чарнігаўскага* княстваў. У выніку са складу Тураўскай зямлі выйшлі *Берасце і Драгічын* Надбужны, якія перайшлі да Уладзіміра-Валынскага княства. Некаторыя гарады паўдневай часткі былой Тураўскай зямлі былі пераданы Чарнігаўскім княззям.

Тураўская земля у пачатку XШ стагоддзя, раней за іншыя беларускія княствы, апынуліся пад націскам *літоўцаў,* якія праз Пінскае княства як мінімум 8 разоў звяршалі паходы на Валынскае княства.

Разам з княствамі Полацкай і Тураўская зямель, у XП – пачатку XШ стагоддзяў актыўную ролю пачынаюць адыгрываць ***Гарадзенскае*** і ***Навагрудскае*** княствы.

Летапісы упамінаюць князя ***Гародненскага*** Усевалада ужо у 1116 годзе. Гародненскае княства размяшчаласяу басейне сярэдняга Панямоння, займала выгаднае геаграфічнае становішча. Яно мела выхад да Балтыйскае мора па Нёмане, яго прытокі звязвалі землі з басейнамі Заходняй Дзівы, Прыпяці, Дняпра. Усё гэта спрыяла хуткаму эканамічнаму і культурнаму развіццю княства. Гародненскія княззі актыўна ўдзельнічалі у барацьбе паміж Кіевам і Галіцка-Валынскім княствамі, у сваю чаргу падвяргаліся іх нападам. У 1277 годзе вытрымала напад галіцка-валынскім і татарскіх войскаў. У канцы XШ стагоддзя на княства адбываліся грабежніцкія напады крыжакоў.

Другім буйным удзельным княствам сярэдняга Панямоння было ***Наваградскае*** княства. Склалася яно крыху паздней. Наваградскі князь Ізяслаў упершыню прагыдваецца у летапісах у 1236 годзе. Навагрудскаму княству ў далейшым будзе адведзена асобная гістарычная роля. Менавіту ў Навагрудку ў 1252 годзе адббудзецца каранацыя князя Міндоўга.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ХШ-е стагоддзе ў гісторыі Беларусі – не толькі перыяд феадальнай разробленасці, але і час, калі на долю усходніх славян выпалі вялікія выпрабаванні. У той ці іншай ступені закранулі яны і лёс жыхароў тагачаснай Беларусі. Насельніцтва беларускіх зямель вымушана было бараніцца ад пагрозы адразу з *двух бакоў* – ад ***татара-мангольскай навалы з усходу*** і ***крыжацкай агрэсіі з поўначы.***

У пачатку ХШ стагоддзя у Цэнтральнай Азіі склалася моцная **Мангольская дзяржава.** У 40-я гады пачаўся яе паход на захад. Першымі сярод усходніх славян пад удар манголаў-татараў нашэсся трапілі старажытнарускія княствы. У **1240** годзе быў захоплены *Кіеў,* потым орды заваёўнікаў накіраваліся на Галіцка-Валынскую зямлю. Сярод беларускіх гарадоў, што былі зруйнаваны манголамі, можна назваць гарады поўдня Беларусі – ***Гомель, Бярэсце, Мазыр і Тураў.*** Вядома паданне, змешчанае у беларуска-літоўскіх летапісах, што непадалёку ад Мінска, каля горада *Крутагорье* адбылася бітва, ў якой войскі Міндоўга разгромілі войскі хана Койдана. Ад таго часу гэта мястэчка стала называцца ***Койданава (***сучасны – Дзяржынск). Аднак больш дакладных звестак, акрамя летапісаў, гэтай падзеі не знойдзена.

Аднак мангольская навала 1238 – 1241 гадоў не закранула большасць тэрыторыі Беларусі. Не зведала манголаў-татараў нашэсця Полацкая земля.

У далейшыя гады – (татара-мангольскае іга праснавала на старажытнарускіх княства больш за 200 год) – набегі манголаў-татараў войскай на беларускія землі мелі ***эпізадычны*** характар. Яны адбыліся ў ***1258, 1259, 1275 і 1287 гады.***

У гэтых паходах манголаў-татары рабавалі маёмасць, спальвалі гарады, зводзілі людзей у палон. Але *накласці пастаянную даніну, усталяваць пастаянны кантроль* на мясцовымі княствамі праз выдачу “ярлыкоў”, як гэта было у рускіх землях, на Беларусі татара-манголы не змаглі.

Татара-мангольскага іга на тэрыторыі Беларусі не было усталявана. **Але пагроза** такой небяспекі пастаянна працягва існаваць, падштурхоўвала да пошукаў шляхоў ёй супрацьстаяць.

Не меншая небяспека склалася у тыя ж гады з **паўночнага захаду.** Асабліва яна датычылася Полацкай зямлі.

У **1201** годзе з дазволу полацкага князя Уладзіміра ў вусці р. Дзвіны немецкім *крыжыцкім ордэнам* была была пабудавана крэпасць Рыга., а у **1202** утварыўся **ордэн *мечаносцаў.*** Мэтай яго была хрысціянізацыя мясцовага насельніцтва (дарэчы – таму і полацкі князь не быў супраць), а на самой справе – заваёва Ніжнядзвінскіх полацкіх зямель. У выніку полацкае княства страчвала выхад да Балтыйскага мора і адпаведна да ўсёй Еўропы.

Таму ўжо ў **1203** годзе адбылася першая сутычка полацкага войска з крыжакамі, але яна завершылася неудала. Лівы ад гэтага часу пачалі плаціць даніну ужо не Полацку, а Ордэну.

У наступныя гады Ордэн мечаносцаў, які з **1237 г**. называўся ***Лівонскім,*** узяў пад свой кантроль землі *латгалаў і ліваў* па ніжнім цячэнні Дзвіны, былі захоплены ***полацкія гарады Кукейнас (1208) і Герсіка (1209),*** у 1224 г. імі быў заняты эстонскі горад Тарту (Юр'еў).

Крыжацкая пагроза прымушала ісці на ваенны саюз Полацка з Ноўгарадам і Полацка з Літвой. Дачка полацкаі-віцебскага князя Брачыслава — Параскева стала жонкай Аляксандра Яраславіча наўгародскага (Неўскага) у 1239 г. Але пераможныя бітвы з крыжакамі ***на р.Нява*** **ў1240 г**. і. ***Чудскім возеры ў 1242*** г., у якіх прымалі удзел

РЕПОЗИТОРИЙ ВГТУ

і полацкія дружыны, карэнным чынам сітуацыю не змянілі. Полацкая зямля паступова губляла сваю магутнасць і былую веліч.

У такіх абставінах палачане і пайшлі на саюз з землямі Верхняга Панямоння, сталіцай якіх быў ***Наваградак,*** праз запрашэнне на сваё княжанне літоўскіх князёў. У канцы 50 —пачатку 60-х гг. XIII ст. на полацкім княжанні з'яўляецца першы літоўскі князь Таўцівіл. Пачынаецца перыяд існавання Полаччыны ў саюзе з Літвой ў новай дзяржаве — Вялікім Княстве Літоўскім.

6. Гаспадарчае жыццё

Сельская гаспадарка.

Характар эканамічнага жыцця беларускіх зямель у сярэднія вякі у асноўным вызначала *сельская гаспадарка*. Галоўнай галіной сельскай гаспадаркі працягвало быць ***земляробства.*** Яно знаходзілася ў непасрэднай залежнасці ад *прыродна-кліматычных умоў* і традыцый, але на яго стан уплывал і ўзровень развіцця сельскагаспадарчых *прылад працы* (некаторыя аўтары называюць – узровень землеапрацоўчай *тэхнікі* – але гэта яшчэ нельга назваць "*тэхнікай*", у лепшым выпадку можна казаць аб удасканаленні *тэхналогіі* апрацоўкі глебы і вядзення земляробства).

Ворныя прылады працы ў сярэднявеччы рабілі, як і раней, з дрэва. Металічнымі (жалезнымі) былі толькі асобныя часткі. Асноўным прыладай працы для апрацоўцы зямлі былі ***ралы***, якія маглі быць *беспалозныя і ралы з полазам*, мелі металічны ***наральнік.***

Удасканаленне земляробчых прылад прывяло да з'яўленні прынцыповаі новага, больш дасканалага ў параўнані з ралам прыстасавання для апрацоўкі глебы – ***сахі.*** Яны таксама выраблялiся з дрэва, але былі, як правіла, *двузубыя,* з двума *металічнымі сашнікамі.* Саха не толькі добра рыхліла глебу (як рала), але і падразала карэнні пустазелля.(Але яшчэ не пераварачвала глебу. Прыстасаванні для перагортвання, адкідвання глебы з'явіліся толькі 14 ст.). Гэта было найбольш карысна ва умовах лясной зоны. Пашырэнне колькасці вораўнай зямлі дало магчымасць паступова перайсці да больш эфектыўнай ***папаравай*** *сістэмы земляробства*. У XI – XШ ст. на тэрыторыі Беларусі папаравая сістэма земляробства існавала у выглядзе *двухполля і нават трохполля* (чаргаване пасеваў на адным і тым полі 2-3 культур). Але у вядзенні земляробства захоўвалася і лядная сістэма, і лясны пералог.

Сеялі ў глебу насенне *ўручную*, баранавалі зямлю *драўлянай бараной.*

Пры рабоце на агародах выкарыстоўваліся і прылады ручной апрацоўкі глебы – ***матыка*** з жалезнай акоўкай, (т.зв. рыльцам), а таксама драўляная ***рыдлёўка*** (лапатка) з жалезнай рабочай часткай.

Ураджай збіралі металічнымі ***сярпамі,*** якія мелі даволі працяглае, да 30 см. лязо, часта з насечкамі. (Блізка да сучаснага выгляда). Зерне абмалочвалі *цапамі,* малолі на муку пры дапамозе каменных *жорнаў,* крупы выраблялiся ў ручных і *нажных ступах.*

У X – XШ стагоддзях на тэрыторыі Беларусі *вырошчвалі* амаль усе вядомыя ў наш час *зернавыя культуры.* Шырокае распаўсюджанне атрымала *азімае* ***жыта,*** а тасама *яравое* ***жыта.*** З XI ст. *жыта* становіцца вядучай зернавой культурай (дарэчы – як і зараз у Беларусі). На другім месце пасля азімага жыта ішла ***пшаніца,*** на трэцім быў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ячмень, радзей сусіракаліся пасевы ***аўса.*** Паўсюдна, як і раней, вырошчвалася ***проса***. Новай культурай, якую пачалі вырошчваць на тэрыторыі Беларусі з XI ст., стала ***грэчка.*** З *агародных* культур у гэтыя часы вядомы ***капуста, рэпа, цыбуля, буракі, агуркі.***

У ***жывёлагадоўлі*** значных змен, у параўнанні з позднім жалезным векам, не адбылося. Яно складалася з развядзення усіх вядомых і у наш час відаў хатняй жывёлы. Адбывалася толькі пэйная спецыялізацыя па развядзенню жывёлы ў залежнасці ад тыпаў паселішчаў.

На *паселішчах побач з гарадзішчамі,* дзе жыло *залежнае* ад знаці насельніцтва, якое павінна было забяспечваць прадукцыяй у першаю чаргу насельніцтва гарадзішчаў, разводзілі ***буйную ранатую жывёлу і свіней***.

У *гарадах* і на *умацаваных паселішчах* ***свіней ў*** сувязі з іх высокапрадукцыйнасцю разводзілі значна *больш*, чым іншых жывёл. Вядучае месца ў хатнім статку жыхароў гарадоў і ўмацавых паселішчаў займаў таксама ***конь,*** які меў асабліваю каштоўнасць для вайсковых паходаў дружыннікаў.

У X – XШ стагоддзяў насельніцтва тэрыторыі Беларусі апрача жывёлагадоўлі занімалася і ***птушкагадоўлей*** – разводзілі, ў тым ліку і ў гарадах, *курэй, качак, гусей.* Хатнюю птушку ў XI – XШ стагоддзяў на тэрыторыі Беларусі разводзілі паўсюдна.

У гарада, якія узніклі як ваенныя крэпасці (напрыклад Ваўкавыск, Гродна і інш.) і знаходзіліся ў лясной зоне, захавалася і значная роля ***паляванння на дзікую жывёлу.*** Палявалі таксама і на дзікіх птушак – глухароў, курапатак, гусей, буслоў і інш – спецыялісты налічваючь іх да 11-ці відаў .

Не страціла сваёй ролі ў жыцці насельніцтва ў сярэднявеччы і ***рыбалоўства,*** якім займаліся як сельскае, так і гарадское насельніцтва. Пры раскопках знаходзяць самыя розныя прылады рыбалоўства таго часу , у тым ліку ***кручкі*** самых розных размераў і форм*, грузілы, паплаўкі* і нават ***блёсны*** з каляровых металаў. Пры раскопках у Ваўкавыску былі выяўлены рэшкі ***12 відаў*** прамысловых рыбаў, у тым ліку *балтыйскага асятра, ласося, шчупака, галаўля, жэреха, судака* і інш.

Апрача сельскай гаспадаркі як сельскае, так і гарадское насельніцтва займалася ***промысламі.*** Самамі распаўсюджанымі хатнімі промысламі былі *прадзенне, ткацтва і ганчарства.* Усюды пралі *лён і шэрсць,* з атрыманых нітак выраблялі *тканіны.* У сельскай мясцовасці распаўсюджана было *ганчарства* – выраблялі пераважна *пячныя гаршкі.*

Значнае месца займала *бортніцтва.* Калі улычваць, што ў тую пару не ведалі цукру, то спажывецкія патрэбы *мёду* цяжка пераацаніць. Атрымлівалі таксама і воск. Акрамя таго, мёд, воск і футра з'яўляліся галоўнымі гандлёвымі прадметамі з іншымі краінамі і народамі.

Металургія таксама заставалася важным заняткам людзей у сярэднявеччы. Але адбылася пэўная спецыялізацыя самаго працэсу - у *сельскай мясцовасці дабывалася руда*, яна праходзіла там *першастную* апрацоўку і ў выглядзе *таварных крыц* (жалезных ляпёшак) пастаўлялася у *гарады,* дзе жалеза праходзіла далейшую *апрацоўкі і* з яе *выраблялі* большасць прылад працы, *ўпрыгожванні* і іншыя рэчы.

Гарады.

Узнікненне гарадоў і гарадскога жыцця было пераломным момантам у жыцці сярэднявечнага грамадства. Гарады узнікалі у найбольш развітых і густанаселенных раёнах, у месцах перасячэння важных шляхоў зносін. Узнікалі яны як цэнтры

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

княжэцкай улады, паселішча рамеснікаў і гандляроў. Працэс узнікнення гарадоў складаны і разнастайны. Гарады вырасталі з ***умацаваных паселішчаў***, княжацкі і феадальных ***замкаў***, і таксама з ***крэпасцяў.***

Пісьмовя крыніцы называюць на тэрыторыі Беларусі ***звыш 35 гарадоў*** (некаторыя налічваюць іх да 50-ці). Старэйшымі з іх былі – Полацк (862), Тураў (980), Віцебск (974), Заслаўе (985), Друцк (1001), Бярэсце (1017), Копысь (1059), Браслаў (1065), Менск (1067), Орша (1067), Лагойск (1078) і інш. Фактычна , пераважная большасць сучасных гарадоў Беларусі бярэ свой пачатак ад XI – XШ стагоддзяў.

Гаспадарчая дзейнасць насельніцтва гарадоў мела комплексны характар – спалучала ў сябе *рамество, гандаль і промыслы.*

Гарады з'яўляліся цэнтрамі ***рамеснай вытворчасці***. (наогул, *аддзяленне* рамяства ад сельскай гаспадаркі, выдзялене яго ў *самастойный* занятак пэўнай катэгорыі людзей – т.зв. *рамеснікаў,* аддзяленне горада ад вёскі лічыцца першым *рэвалюцыйным* этапам у развіцці вытворчых сіл). Ужо ў IX – X стагоддзях у гарадах Беларусі налічвалася звыш *40 спецыяльнасцяў* раместніцтва: кавалі, збройнікі, ювеліры, ганчары, каменяцёсы, гарбары (апрацоўшчыкі скуры),бондары, ткачы, шаўцы і інш.

Больш дакладна аб спосабах вырабаў тых ці іншых рэчаў, распаўсюджаннасці асобных відаў рамества сярод насельнітва беларускіх гарадоў пагаворым на семінарскіх занятках

Гарады з'ўляліся па свайму прызначэнню і цэнтрамі ***гандлю,*** як унутранага, так і знешняга.

У XП – XШ стагоддзях, у сувязі з аддзяленнем горада ад вёскі, зараджаецца *унутранні гандаль як сродам абмены паміж гарадскім і сельскім* насельніцтвам. Аднак патрэбна ўяўляць, што значная частка жыхароў горада працягвала *сумяшчаць* заняткі рамяством з працай на зямлі, займалася земляробствам. Таму ўнутраны гандаль развіваўся паступова, па меры таго, як усё большая частка жыхароў гарадоў парывала з працай на зямлі. Унутраны гандаль ажыццяўляўся, як правіла, шляхам простага прадуктаабмену. У XI – XШ стагоддзях на Беларусі быў т.зв. "*безманетгны перыяд*".

Знешні гандаль, які развіваўся на Беларусі ў сярэднявеччы, меў тыя ж самыя накірункі, што склаліся раней: Кіеў, Паўночнае Прычорнаморье, Візантыя, арабскі Усход, Прыбалтыка і Польшча, а праз іх і заходнееўрапейскія краіны, скандынавія. Сутракаюцца ў археалагічных раскопках беларускіх гарадоў таго часу і рэчы з больш аддаленных і экзатычных краін - з астравоў Індыйскага акеана, Цейлона і Суматры (ракавіны, косці паўлінаў), тканіны, посуд і ўпрыгожванні з Персіі.

Менавіта да знешняга гандлю маюць дачыненні і першыя *грашовыя* сродкі – манеты. Зноўйдзены *арабскія* манеты – *дырхемы,* срэбраныя манеты – *дынарыі* з Германіі, Англіі, Чэхіі, Францыі, Італіі, срэбраныя і залатыя манеты з Візантыі. З'яўляюцца і манеты, што чаканілі ў Кіеве – *срэбранікі і златнікі.* У абарачэнні у якасці плацёжных сродкаў выкарыстоўваліся і *зліткі з срэбра*, выраблены у *Кіеве* (у выглядзе ромба, вагою140 – 165 г.), *Ноўгарадзе* (лодкападобныя, вагою 200 г.), а таксама *літоўскія ці заходнерускія* (у выглядзе палачак вагою 100-110 г.). У пісьмовых крыніцах іх называюць *грыўняй, рублём, срэбрам літым*, а іх палавінкі – *паўцінаю.* Але выкарыстоўваліся яны толькі пры буйных абменных аперацыях, як правіла, ў знешнім гандлі. Усе вядомыя гарады Беларусі таго часу былі цэнтрамі такога гандлю.

7. Грамадскі лад і сацыяльныя адносіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Перыяд сярэднявечча – гэта час станаўлення і фарміравання новага грамадскага ладу – ***феадалізма.***

Феадалізм – гэта *грамадска-эканамічная фармацыя*, якая прыходзіць на змену рабаўладальніцкаму ці першабытнаабшчыннаму ладу і папярэднічае капіталізму. Асноўная эканамічная сутнасць *феадалізма – прысванне феадаламі дадатковага прадукту шляхам* ***эксплуатацы****і сялян на аснове манапольнай уласнасці феадалаў* ***на землю*** *і уласнасці на непасрэдных вытворцаў (сялян*). На тэрыторыі Беларусі феадалізм існаваў працяглы час – з IX па XIX стагоддзі.

Асновай складвання феадальных адносін з'яўляюцца:

- ***распад патрыярхальнай абшчыны***, пераўтварэнне яе у суседскую сельскую абшчыну

- ***з'яўленне прыватнай уласнасці на землю***

- ***сацыяльнае расслаенне*** грамадства, выдзяленне сацыяльных груп, якія прысвоўваюць сябе кіруючыя функцыі і абараняюць гэтае права з дапамогай узброенай сілы, *(параўнанне з сучасным* ***рэкетам)***

У пачатковы перыяд фарміравання феадальных адносін *суседская абшчына* заставалася нацйбольш *масавай сацыяльнай структурай,* адной з асноўных форм арганізацыі грамадства. Менавіта ў выглядзе суседскай абшчыны існавала большасць сельскага насельніцтва таго часу. Селькая абшчына уяўляла сабою *тэрытарыяльнае аб'яднанне* непасрэдных вытворцай – земляробаў. Гэта былі сяляне, якія яшчэ *не трапілі ў праватніўласніцкую* залежнаць і былі падпарадкаваны толькі дзяржаве. Ворная зямля знаходзілася *ва ўладанні сялян*-абшчыннікаў і перадавалася ў спадчыну. Абшчына несла *агульную адказнасць* перад княжацкімі ўладамі за выкананне дзяржаўных павіннасцей і падаткаў. Абшчына валодала *самакіраваннем* – выбірала свае арганы кіравання, мела свой абшчынны суд. Ва умовах умацавання феадальных адносін абшчына паступова трапляла у залежнасць ад феадалаў – вотчыннікаў, якія аб'яўлялі абшчынныя землі сваёй уласнасцю. Тады члены абшчыны з уласнікаў зямлі пераўтвараліся у трымальнікаў, карыстальнікаў землі феадала. У выніку сама абшчына ці распадалася альбо падпарадкоўвалася феадалу.

З *узнікненнем прыватнай уласнаці* на зямлю (што пачалося яшчэ у перяд поздняга жалезнага веку), землі прысвоўваліся не толькі асобнымі абшчыннікамі, але і кіруючай вярхушкай плямен, дружыннікамі, з якіх і фарміраваўся слой ***феадалаў.*** **Яны захоплівалі сілай** абшчынныя землі, абкладалі сялян, якія працавалі на ёй, данінай. Сяляне-абшчыннікі (***смерды) пазбаўляліся*** зямлі, траплялі такім чынам у залежнасць ад уласніка зямлі – феадала.

Некаторыя частка сяляне-абшчыннікаў *страчвалі* нават *асабістую* свабоду, траплялі ў феадальную *асабістую* залежнасць рознымі шляхамі. Значная часка сялян *бяднела* ад уплаты цяжкіх *княжацкіх данін,* ад рабаўніцкіх *войнай*, падчас якіх іх гападарка разбуралася, і была не ў стане выконваць падаткі. Збяднялі сялян і судовыя *штрафы,* а таксама "кормы", якія яны павінны былі даваць прадстаўнікам княжецкай ўлады. У выніку збяднення сяляне-абшчыннікі *не маглі выканаць падаткі*, траплялі ў кабалу, у іх адбіраліся *землі* за неуплату подацей і нават *асабістая свабода*

Узнікае феадальнае землеўладанне, якое у IX – XII стагоддзі значна умацоўвалася і пашыралася. Уласнікамі зямлі з'яўляліся князі, прыбліжаныя да іх людзі – баяры, а таксама княжацкія дружыннікі, якія атрымлівалі землі у якасці платы за службу князю. Землі, што належылі ім, перадаваліся іх нашчадкам у спадчыну. Уласнікі зямлі пачалі жыць "карміцца" за кошт падаткаў (даніны), а таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аблкладвалі насельніцтва штрафамі, якія называліся у той час “віры”, “продажы”. На гэтай падставе феадалы пераўтвараюцца ў пануючы клас.

Землі, якія яшчэ не былі захоплены феадаламі і фармальна належылі абшчынам, аб’яўляліся ўласнасцю ***дзяржавы***, дзяржаўнымі. Сялене, што жылі на іх, падпарадкоўваліся князю, як вярхоўнаму правіцелю, плацілі падаткі дзяржаве і выконвалі іншыя дзяржаўныя павіннасці. Часта гэтыя змлі раздаваліся князямі ў ва увалоданне сваім набліжаным. На карысць дзяржавы сяляне плацілі перш за ўсё даніну. Часта яна была ў выглядзе каштоўнай футры (сабаліная, гарнастаявая, куніцавая, бабровая і інш), а таксама мёд, воск, прадукты земляробства і лесу. Акрамя даніны былі іншыя павіннасці: “***палюддзе”*** – паборы, якія дадаткова збіраліся з насельніцтва акрамя збора даніны, (часта на гэта давалася адраразовае права за асобныя заслугі перад князем, які такім чынам плаціў сваім набліжаным), “***павоз*** “ – павіннасць, звязаная з дастаўкаў даніны у пэўнае месца.

На апрацягу XI – XIII стагоддзяў узўнікае не толькі феадальнае (свецкае), але і ***царкоўнае землеўладанне.*** Узнікнене і умацаванне царквы на Беларусі як грамадскага інстытута суправаджалася раздачай часткі дзяржаўнай зямлі ў валоданне тых ці іншых царкоўных устаной (епархій, манастыроў і інш.). Гэтыя землі не маглі адчуждацца (адбірацца), а таксама, у адрозненні аб княжацкіх і баярскіх уладанняў, не раздрабляліся, паколькі ў спадчыну каму-небудзь не перадаваліся. Таму царкоўнае землеуладанне пастаянна узрастала.

Не толькі сяляне-абшчыннікі, але і жыхары ***гарадоў,*** што былі рамешчаны на землях феадалаў, у XI – XШ стагоддзі траплялі ў феадальную залежнасць і выконвалі на карысць землеўладальнікаў розныя павіннасці, плацілі даніну. Гарады, што былі размешчаны на дзяржаўных (княжацкіх) землях, нярэдка проста дырыліся ўладальнікам.

Грамадскі лад у перыяд сярэднявечча набывае новыя рысы, якіх не было да гэтага часу.

З узнікненнем на тэрыторыі Беларусі першых дзяржаў – княстваў з’яўляецца і *новая рыса грамадскага жыцця – **дзяржаўны лад.*** *Дзяржава* – гэта разгалінаваная *сістэма палітычнай ўлады,* якая ажыццяўляецца ў краіне. Яна (дзяржава) *аб’ядноўвае* ўсё насельніцтва ў адно тэрытарыяльнае цэлае, мае сваю унутраную *структуру,* выконвае пэўныя *функцыі.*

Важная роля ў арганізацыі ўлады належала **князю.**

Першым і важнейшым ***абавязкам*** князя былі ***арганізацыя*** вайска і ***камандванне і***м. Князь павінен быў клапаціцца ***пра бяспеку і абарону*** княства ці зямлі ад ад знешняга ворага. Ён кіраваў знешняй палітыкай, зносінамі з іншымі князямі і дзяржавамі, мог аб’явіць вайну і заключаць мір, іншыя пагадненні.

Другім абавязкам князя быў сбор *даніны* і іншых пабораў з падначальнага насельніцтва для утрымання дружыны і на іншыя дзяржаўныя патрэбы.

Трэцім абавязкам князя можна лічыць упраўленне, кіраванне княствам. Ён назначаў службовых асоб. Напрыклад, у Полацкім княстве – цівуноў (выконвалі судовыя і фінансавыя функцыі), мытнікаў, ключнікаў і інш.

Апорай княжацкай улады была ***дружына,*** якая складвалася з груп узброеных людзей, для якіх вайсковая справа стала прафесіяй. Дружыннікі былі найбольш блізкімі да князя людьмі, менавіта з ім князь раіўся па пытаннях арганізацыі паходаў, суда і адміністрацыйнага кіравання. Дружына служіла непасрэдна князю і была яму асабіста адданая, пастаянна знаходзілася пры князі і на яго ўтрыманні. Асобным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прадстаўнікам са сваёй дружіны князь мог даручыць і выкананне асобных даручэнняў, у тым ліку і абавязкаў кіраўнікоў у некаторых гарадах.

У некаторых мясцовасцях меліся сваі асаблівасці арганізацыі дзяржаўнага кіравання. Напрыклад, у Тураўскім княстве акрамя ўлады князя ўзгадваецца кіраванне княжацкім "*пасаднікам"*, які прызначаўся князем і выконваў яго функцыі кіравання ў горадзе. Знаходжанне адначасова ў горадзе князя і пасадніка – з'ява незвычайная для іншых гарадоў. У тым жа Тураве існавала пасада "*тысяцкага"*, які ўзначальваў гарадское ўзброенае апалчэнне, роля якога у абароне горада была важнай, асабліва калі князь з дружынай пакідал княства.

У Полацкай і Тураўскай княствах на працягу ХП – ХШ стагоддзяў, ў перыяд раннега сярэднявечча, ўлада князя хаця і была значнай, але *не была неабмежаванай.* Дзейнічалі дзве галіны ўлады – улада князя і ўлада Веча. **Веча –** народны сход, арган дзяржаўнай улады (разам з князем) у асобных княствах на тэрыторыі Беларусі – у *Полацку, Друцку, Менску, Тураве, Віцебску* і інш. княствах. Правам удзелу Вечы карысталіся ўсе вольныя мужчыны, рашэнне прымалася шляхам адабрэння крыкам, але вядучая роля ў Вечы належала заможным гараджанам, баярам. Па звестках летапісаў у некаторых вечах абіралі вузкі па свайму складу выканаўчы орган, які ад імя Веча вырашаў бягучыя справы. Так было у Полацку, дзе абіралі 30 мужош, старцаў. Веча збіралі па меры неабходнасці, а тасама па ініцыятыве князя, пасадніка ці гарадскога насельніцтва.

Веча мела даволі значныя функцыі, яго роля узрастала асабліва падчас аслаблення княжецкай улады ў перыяд феадальнай раздробленасці.

Веча істотна ***абмяжоўвала княжацкую уладу.*** На Вечы вырашаліся важнейшыя пытанні – *вайны і міру*, заключэння знешніх *дагавораў, заканадаўства,* ажыццяўляўся *вышэйшый суд* за палітычныя і іншыя злачынствы. Веча мела права *выбіраць* некаторых службовых асоб, магло ***запрашаць на княжэнне князёў ці*** наадварот, ***выганяць іх.*** Калі Веча не падрымлівала князя, ён вымушан быў пакінуць горад. Так здарылася ў *1127* годзе з полацкім князем *Давыдам,* які не здолел выйграць адзін з ваенных паходаў. Полацкі князь *Рагвалод* Барысавіч у *1161 годзе* пасля паражэння ад менскага князя Валадара Глебавіча не рызыкнул вярнуцца ў Полацк, бо, вераготна, *баяўся адказнасці* перад Веча за гібель многіх палачан з свайго войску. Пры абранні князя паміж ім і Веча заключаўся *дагавор*, які павінен быў выконвацца абодвымі бакамі, у тым ліку на князем.

Па меры узмацнення ролі царквы, аб чым мы будзем казаць крыху падзней, высокае грамадскае палажэнне займаў ***епіскап.*** Ён з'яўляўся не толькі вышэйшай духоўным кураўніком, але і вельмі ўпловай асобаў ў Вечы. Ад яго імя пісаліся дагаворы, якія заключаліся полацкім вечам, выдаваліся граматамі. Полацкія біскупы разам з князямі адносіліся да вузкага кола асоб, што мелі вялыя пячаткі, якія прымацоўваліся да дакументаў.

Такім чынам , княствы, дзе існавалі выбарныя органы у выглядзе Веча, можна лічыць княствамі з абмежаванай княжэцкай уладаў, якое было на шляху да пераўтварэння ў сярэднявечную рэспубліку.

Але з наступленнем перыяда феадальнай раздробленасці, узмацненнем ўлады удзельных князёу Веча там, дзе яно існвала, паступова страчвала свае значэнне і у 14 – 15 стагоддзях у ВКЛ было заменена соймам.

Важнейшай новай рысаў грамадскага жыцця ў сярэднявечча на тэрыторыі Беларусі стала з'яўлянне хрыстыянскай **царквы.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Царква ў перыяд сярэднявечча – гэта арганізацыя духавенства і веруючых, якая пачынае адыгрываць значную ролю ў *жыцці грамадства,* была цесна звязана з *дзяржаўнай уладай*, мела сваю *унутранную арганізацыю*, аказала вызначальный уплыў на стан і развіццё *культуры і духоўнага жыцця.*

Распаўсюджанне хрысцыянства на беларускіх землях пачынаецца з канца X-га стагоддзя.

Першыя славянскія супольнасці, якія жылі тут - крывічы, дрэгавічы, радзімічы,балты і іншыя былі паводле сваіх вераванняў і культу ***язычнікамі*** (ці *паганцамі*. Тэрмін утвораны ад лацінскага слова “паганус” - язычнік). Язычніцкі перыяд у нашай гісторыі вымяраецца тысячагоддзямі і з’яўляенцца самым працяглым па часе. Язычніцтву Беларусі, як і іншых краін, характэрна шматбожжа. Усе яны пакланяліся праявам навальнага ассяродзя, якія атаясамліваліся з адпаведнымі багамі: ***Сварог*** – бог неба і нябеснага агню, ***Дажбог*** – бог солнечнага святла, ***Перун*** – бог грому, маланкі і дажжу, ***Харс –*** бог Сонца, ***Волас*** (Велес) – бог жывёлагадоўлі і інш. Менавіта ад іх залежала жыццё чалавека.

Аднак на мяжы першага тысячагоддзя язычніцкія вераванні паступова змяняюцца ***монатэістычным***і вераванніямі. Прынцыпова новым было тое, што замест *шматбожжа* з’яўляецца вераванне ў сілу *аднаго бога*, што афармляецца ў выглядзе адпаведнай *рэлігіі.* (язычніцтва – не рэлігія, а вераванні. Рэлігія – стройная сістэма поглядаў). Узнікнене рэлігіі, веры у аднаго бога, было звязана з этапам узнікнення і умацавання *монаэ*тнічных *дзяржаў,* неабходнасцю падмацаваць існаванне *адзінства улады на зямле* (у дзяржаве, княстве) як і *адзінства на небе*. (Бог – на небе, Князь – на зямле).

У канцы X ст. і на тэрыторыю сучаснай Беларусі пачынае пранікаць адна з буйнейшых рэлігій **– *хрысціянства***, прычым у абодвух яе формах – і *праваслаў’е,* і *каталіцызм.* Трывалыя сувязі ўсходніх славян з Візантыяй спрыялі прыняццю пераважна *праваслаўных* абрадаў, і да сама Візантыйская царква разглядала усходнеславянскія княствы як рэгіён свайго уплыву. Носьбітамі хрысцыянства *каталіцкага абраду* на беларускіх землях былі *крыжацкія ордэны,* сувязі з прадстаўнікамі каталіцкай *скандынавіі* і *Польшчы.*

Прамых звестак пра хрышчэнне Беларусі няма. У нас не было такіх падзей, як у Кіеве ў 988 годзе і у Ноўгарадзе (публічнае знішчэнне язычніцкіх багоў, прымусовае прывядзенне кіеўлян на Дняпро з мэтаў хрышчэння, крывавая бойка у Ноўгарадзе).

Распаўсюджанне хрысцыянства у полацкай і тураўскай землях пачыналася з прыняцця веры прадстаўнікамі *вышэйшая знаці* – князямі, членамі іх сямей, асобамі з акружэннем князяі іншымі прадстаўнікамі улады. Паступова пашыралася кола вернікаў сярод іншых плыняў насельніцтва, перш *за усе гарадскога*. Аднак у сельскай мясцовасці працэс хрысцыянізацыі ішоў вельмі марудна, павольна, паступова выцясняючы язычніцтва. На нашай тэрыторыі у перыяд распаўсюджання хрысцыянства амаль не было праяў жорсткасці у барацьбе з языцтніцтвам, як гэта было у некаторых краснах. Хрысцыянства на Беларусі больш памяркоўна ставілася да захавання у насельніцтва, асабліва сярод сялянства, язычніцкіх звычаяў. Каб не даводзіць справу да абвастрэння сітуацыі, праваслаўная царква нават была вымушана успрыняць некаторыя язычніцкія рытуалы, святы, традыцыі.

Спрыяла распаўсюджанню новай рэлігіі *раздача зямель* прадстаўнікам царквы, *будаўніцтва* манументальных культавых *збудаванняў*, утварэнне царкоўнай *структуры.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З прыходам новай рэлігіі паўсюдна ў гарадах, пры княжацкіх замках у XII стагоддзі узнікаюць *культавыя збудаванні хрысціянства*. Ужо ў канцы IX ст. у Полацку была пабудавана першая царква імя Багародзіцы. У гэтую царкву ў XI ст. былі перанесены мошчы невядомых святых. У сярэдзіне XI стагоддзя быў пабудаваны вялікі *саборны храм* **– *Сафія.*** Такія ж існавалі ў Кіеве і Ноўгарадзе. Полацкая Сафія з'яўлялася яскравым увасабленнем ідэі магутнасці, адзінства і непадуладнасці. У XII стагоддзі ў Полацку было не менш ***10 к***ультавых манументальных збудаванняў, ***тры*** манастыры. Да сённяшняга часу захавалася Спаская царква Ефрасіннеўскага манастыра. Выдатныя храмы хрысціянства таго часу былі пабудаваны ў Гародне (3 царквы, сярод іх – Барысаглебская (каложская) царква), ў Тураве, Віцебску, Менску, Наваградку, Ваўкавыску, Пінску і інш.гарадах.

Разам з тым, у XI – XIII стст. працягвалі існаваць язычніцкія свяцілішчы, дзе людзі працягвалі пакланяцца *язычніцкім багам*. Гэтую з'яву гісторыкі і называюць "*двоеверства*". Яна адлюстроўвала складаны шлях хрысціянства сярод славянскага насельніцтва.

Утварыўшаяся хрысціянская царква мела сваю унутранную структуру - цэнтралізаванае кіраванне, пэўную іерархію. Наогул, у грамадстве з'явілася новая сацыяльная група - прафесійныя служыцелі культу (клір) **– *духавенства.***

На чале царквы на Русі стаяў ***мітрапаліт,*** які прызначаўся візантыйскім партыярхам. Паводле правіл візантыйскай царквы, царкоўная структура павінна была адпавядаць структуры свецкай улады. Таму у канцы X – пачатку XI стагоддзяў пачалі ствараццa царкоўныя акругі – ***епархіі*** (епіскапіі). Яны тэрытарыяльна ад'ядноўвалі веруючых, межы епархій саўпадалі з межамі княстваў ці земляў, у некаторых выпадках аб'ядноўвалі некалькі іх. Начале епархій стаялі ***епіскапы,*** якія *прызначаліся* кіеўскім метрапалітам, але пры гэтым кандыдатура *ўзгаднялася* з мясцовым князем, а затым, вераготна, як гэта было у Полацкай зямлі, павінна была *зацверджана* Вечам.

Гісторыкі прыйшлі да высновы, што прыблізна ў 992 годзе была створана Полацкая епархія. У 1005 годзе была заснавана епархія у Тураве, вядома і прозвішча першага епіскапа – Фама. У далейшым тураўскімі епіскапамі былі – Ігнацій (1137 г.), Іакім (1144 г.), Кірыл (каля 1169 г.. найбольш вядомы – Кірыл Тураўскі), Лаўрэнцый (1182 г.).

Епіскап быў у сваёй епархіі вышэйшым прадстаўніком царквы. Яму належала права *пропаведзі* і *нагляду* за казаннямі святароў. Ён меў права *рыхтаваць* усе богаслужэбныя акты, *назначаць* святароў. Епіскап быў галоўным начальнікам усіх царкоўных устаноў і ўсяго духавенства яго епархіі. Таксама ён меў права *суда* над царкоўнікаі па усіх грамадзянскіх і крымінальных справах і часткова права суда над вернікамі (міранамі).

Ніжняў царкоўнай ячэйкай быў ***прыход,*** цэнтрам якога з'яўлялася ***царкоўная пабудова*** ў горадзе ці на вёсцы. Цэрквы будаваліся на сродкі епіскапаў, князёў ці іншых багатых людзей (баяр, купцоў). Саборы, цэрквы і манастыры сталі самымі велічнымі і прыгожымі будынкамі.

Царква мела значныя ***матэрыяльныя сродкі.*** *Па-першае*, яны складаліся з з часткі феадальнай ренты – князі перадавалі царкве ***дзесяцін***у (дзесятую частку) ад даніны, якую ён збіраў у розных формах. *Па-другое*, на карысць царквы ішлі ***сродкі ад судовых спраў***, якія разглядаліся епіскапскім судом (сямейныя і шлюбныя справы). *Па-трэцяе*, паступова епархіі атрымлівалі ва ўвалоданне землі, а таксама і сялян, даходы ад якіх ішлі епархіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такім чынам, з увядзеннем хрысціянства на беларускіх землях узнікла узнікла асобная ветвь улады – царква, якая стала неад'емнай часткай сяреднявечнага грамадства. Вера ў *адзінага бога* Ісуса Хрыста, якую прынесла і ўпарта распаўсюджвала хрысціянства, адпавядала адзінаўладдзю князя ў дзяржаве. Хрысцыянскае веравучэнне сцвярджала, што ўсякая ўлада ад Бога, а ўсё, што ад бога, з'яўляецца свяшчэнным і нязменным. Нездарма таму *прыняцце хрысціянства супала па часе з усталяваннем дзяржаўнасці* у беларускіх землях, было важным інструментам гэтага працэса.

Таму духавенства *падтрымлівала* свецкую уладу, *адстойвала* і садзейнічала распаўсюджанню ідэі моцнай княжецкай ўлады ў дзяржаве, *была ёй апорай.* З свайго боку, свецкая ўлада была *зацікаўлена* ў існаванні царквы, падтрымлівала яе матэрыяльна. У сярэднявеччы на Беларусі царква валодала вялікімі палітычнымі правамі, мела велізарныя матэрыяльныя сродкі.

Разам з тым, прыняцце хрысціянства аказала моцны ўплыў *на духоўнае жыццё* грамадства. Паступова сфарміравалася *саслоўе духавенства*, якое склалі ў той час самыя *адукаваныя і ўплывовыя* людзі. Аб уплыве хрысціянства на *развіццё адукацыі, літаратуры, мастацтва, архітэктуры* мы будзем гаварыць далей. Хрысцыянства з яго запаведзямі станоўча ўплывала і на *маральны* стан грамадства (зніклі такія звычаі паганства, як ахвярапрынашэнне, многажонства, кроўная помста і інш.).

Ацэньваючы *значэнне прыняцця хрысціянства,* ёсць падставы сцвярджаць, што прыход на змену язычніцтву новай хрысціянскай рэлігіі быў *гістарычны абумоўлены* палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі працэсамі, ў цэлым садзейнічаў *прагрэсіўнаму* развіццю грамадства, мёў самыя розныя вынікі.

8. Культура Беларусі ранняга сярэднявечча.

Распаўсюджанне хрысцяінства на старажытнабеларускх землях стала аднім з вызначальных фактараў ў развіцці культуры ва ўсіх яе праявах, і нават прывяло да з'яўленне новых яе формаў. Нараджаецца ***прафесійнае мастацтва*** – архітэктура, літаратура, жывапіс, пласціка. (тэрмін "прафесійнае" азначае, што з'яўляюцца *катэгорыі* людзей, для якіх *асноўным заняткам* становятся названыя віды дзейнасці)

Менавіта з усталяваннем хрысціянства звязана з'яўленне ***манументальнага дойлідства.***

На тэрыторыі Беларусі з XI стагоддзя з'яўляюцца *мураваныя (каменныя)* храмы. Першым з іх быў Сафійскм сабор у Полацку. Паступова *мураваныя* збудаванні з'яўляюцца і у іншых гарадах. Гэта сведчыла аб тым, што паступова будаўнікі авалодвалі новым *будаўнічым матэрыялам* (камнем, да таго ўсе збудаваніі былі з дрэва), тэхнікай яго апрацоўцы, планіроўкі збудаванняў, што знайшло свае прымяненні ў далейшым і ў светскіх збудаваннях. У XII стагоддзі у Полацку сярод 13 мураваных збудаванняў была ужо адна *і грамадзянская пабудова* – княжэцкі хорам (харомы), які ўя'ўляў сабою невялікі, квадратны ў плане мураваны будынак.Такія ж мураваныя збудаванні з'яўляюцца і ў Гародні, дзе таксамы быў пабудаваны мураваны княжэцкі хорам. Мураваныя збудаванні былі у той час былі даступны толькт вышэйшай знаці, бо іх узвядзенне патрабавала значна больш сродкаў, чым драўляных. Але каменныя пабудовы, ў адрозненні ад драўляных, вытрымлівалі пажары, іх было цяжка знішчыць, разбурыць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Авалоданне прыемамі апрацоўкі камня, выраб брусковай цэглы (з камню выпіліваліся брускі у выглядзе кірпічоў, цэглы) дало магчымасць пачаць будаваць мураваныя *абарончыя* збудаванні. Найбольш вядома і добра захавана з XIII стагоддзя *Белая Вежа* у Камянцы.У Навагрудку у канцы XIII стагоддзя была таксама ўзведзена мураваная абарончая вежа. Усяго да Беларусі вяўлена і даследавана *25 мураваных* помнікаў культавай і грамадзянскай архітэктуры XI – XII стагоддзяў.

З'яўленне мураванага доўлідства выклікала і складванне пэўных *архітэктурных традыцый і школ.* Мураванае дойлідства беларускіх зямель у XII стагоддзі развівалася ў рэчашчы архітэктурных традыцый ўсяго *ўсходнехрысціянскага* свету (*візантыйскія траддыцыі планіроўкі і упрыгожвання*), але мела і шэраг *арыгінальных асаблівасцяў,* што вылучалі яго сярод архітэктурных школ суседніх рэгіёнаў і выяўляліся ў сферы архітэктурных рашэнняў , будаўнічай тэхнікі і дэкору.

Гісторыкі архітэктуры лічаць, што на працягу XI – XII стагоддзяў на тэрыторыі сучаснай Беларусі склаліся две архітектурныя школы – *полацкая і гародненская,* таму, што менавіта там пачалося першае мураванае дайлідства. *Агульнымі расамі* абедзвюх архітектурных школ было:

выцягнутасць планаў здудаванняў,

лаканічнасць пластычнага архітектурнага дэкору,

беражлівае стаўленне да архітектурнай *плоскасці,*

шырокае *ужыванне колеру* для аздаблення пабудоў,

пэўны кансерватызм у развіцці *будаўнічай тэхнікі,*

багаты набор *маёкалевых* падлог (пола) з плітак жоўтага, зялёнага і кпрычневага колеру самай разнастайнай формы,

вялікая колькасць *клеймаў і знакаў* майстроў на старажытнай цэгле.

Шэраг асаблівасцяў мураваная архітэктуры на Беларусі ў другой палове XIII стагоддзя сведчыць і *аб раманскім, "заходнім"* уплыве, што праяўлялася і вонкава, і канструкцыйна. Раманскі стыль адчуваецца, напрыклад, у шырокім выкарыстанні пры збудаванні *валуноў,* якія не проста уключаліся ў муроўкі ў выглядзе апрацаваных каменных блокаў, а выступалі *неапрацаванымі адпаліраванымі бакамі*, ўпрыгожваючы фасады збудаванняў.

Храмавае будаўніцтва выклікала з'яўленне новага віда мастацтва, якога да таго не было **– манументальнага жывапісу.**

Сцены кожнай святыні абавязкова ўпрыгожваліся рознымі відамі мастацтва. Шырокае распўсюджанне атрымалі ***фрэскі.*** *Фрэска* – тэхніка манументальнага жывапісу, калі *размалёўка* ажыццяўлялася па свежым *сырым тынку*, які пры высыханні утварае вельмі тонку празрыстаю плёнку, што замацоўвае фарбы і робіць фрэску далгавечнай. Такая тэхніка зарадзіласчя яшчэ ў 2-м тысячагоддзі да н.э. у антычным і візантыйскім мастацтве, гэтыя прыёмы асвоівалі і ўсходнеславянскія мастакі, ў тым ліку і на беларускіх землях.

На Беларусі найбольш старажытныя фрэскі захаваліся ў інтэрьеры Сафійскага сабора і Спаса-Ефрасінненскай царквы ў Полацку. Фрэскамі былі аздоблены інтэрь'еры царквы Бельчыцкага манастыра ў Полацку. Благавешчанскай царквы Віцебску, Барысаглабскай царквы ў Гродне.

Роспіс храмаў складаўся з *выяў святых і пакутнікаў*, у тым ліку і князеў, якія кананізаваліся (уводзіліся ў лік святых, напрыклад святыя у полацкім храме Барыс, Глеб напісаны, відавочна, з выяў адпаведных князёў). Абавязкова ствараліся фрэскі *тэматычных кампазіцый*, якія адлюстроўвалі важнейшыя біблейскія сюжэты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ужываліся таксама фрэскі ў выглядзе *арнаментальных* роспісаў, у тым ліку не толькі *сіметрычнага,* але і *асіметрычнага а*рнаменту.

Узнікла і развівалася і такая галіна *жывапіснага мастацтва*, як ***кніжная графіка.*** Тагачасныя рукапісныя кнігі – толькі крыніца ведаў, але і твор мастацтва *каліграфіі, жывапісу, залатарства.* Жывапіснае аздабленне старажытных рукапісаў выяўлялася ў афармленні *аніцыялаў, застававак* і *канцовак* тэксту, а таксама ў *мініяцюрах.*

Ілюмінаыя (мастацкае афармленне) кніг уключала таксама аргаменты з геаметрычных, раслінных і тэраталагічных элементаў.

Помнікамі кніжнай графікі XI - XII стагоддзяў на Беларусі служаць Тураўскае, Аршанскае і Мсціслаўскае евангеллі, Служэбнік Варлаама Хутынскага. На думку мастацтваведаў, кніжная графіка развівалася у рэчашчы візантыйскага мастацтва з раманскім уплывам.

Дэкаратыўна – прыкладное мастацтва ў сярэднявеччы таксама атрымала сваё далейшае развітццё, ў тым ліку і пад значным уплывам хрысціянства. Мастацкія рамёствы забяспечвалі патрэбы *як знаці*, так і больш шырокіх *слаёў грамадства* ў *дэкаратыўных рэчах* для асабістага ўпрыгожвання, а таксама ўпрыгожвання адзення, жытла, ў масавых рэчах культавага (царкоўнага) прызначэння.

Паступова складваецца пэўны слой *людзей,* якія спецыялізаваліся у гэтай сферы вытворчасці – мастакі-рамеснікі, майстры-ювеліры, залатары і інш. Адбываецца іх дыферэнцыяцыя.

Самыя прывілеяваныя з іх працавалі ў *княжэцкіх майстэрнях*, якія абслугоўвалі *дзяржаўную эліту і царкву*. Тут выраблялiся ўпрыгожванні з золата, срэбра, іншых каштоўных металаў і камянёў. Найкаштоўнейшы твор і узор узроўня прыкладнога мастацтва Беларусі таго перяда – крыж Кфрасінні Полацкай. Зроблен ён у Полацку ў 1161 годзе майстрам-залатаром Лазарам Богшам. Драўляная аснова (51 см. даўжыней) пакрыта срэбранамі і залатымі пласцінкамі, упрыгожванні зроблены з каляровых эмаляў, а таксама з 8-мі вялікіх і 8-мі маленькіх каштоўных камянёў, па перыметру яго ахоплівала нізка перлаў. (Крыж у арыгіналі страчаны, але адноўлена яго выява.)

Акрамя Полацку, майстры – ювеліры ўжо у X ст. працавалі ў Віцебску, Лукомлі, Заслаўі, Клецку, а ў XП стагоддзі – практычна ва ўсіх гарадах і ўмацаваных паселішчах.

Значная частка майстроў працавала на задавальненне патрэб *гарадскога* насельніцтва

ва *ўпрыгожваннях* (кольцы, гріўны, пацёркі, прывескі, бранзалеты) і

прадметах хрысцтянскага культу (крыжы, абразкі, нацельныя крыжакі).

Выраблялiся яны, як правіла з больш даступных металаў – *бронзы. свінца, іншых каляровых металаў*. Для вырабу прадметаў дробнай пластыкі выкарыстоўваліся таксама дэкаратыўная *кераміка, косць і камень*. Вядомы *каменныя* абразкі святых, зробленыя к*астарэзамі* прадметы хрысцянскага культу, а таксама знойдзеныя самых розных гарадах старажытнай Беларусі *касцяныя шахматныя фігуркі* мясцовага вырабу.

Значнай з’явай ў развіцці культуры беларускіх земляў ў сярэднявеччы стала **пісьменства.**

Насельніцтва усходнеславянскіх плямён стварала сваю сістэму гукавых сімвалаў. З пачатку была створана азбука, якую называюць “Глаголіца”. Яна мела даволі складанае графічнае напісанне. Потым у другой палове IX ст.на яе аснове

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

братамі Кірылам і Мефодзіям была створана больш простая ва ўжытку азбука “Кірыліца” (мела 43 літары), якая атрымала шырокае развіццё і выкарыстанне ў выглядзе стараславянскай мовы.

Першым датаваным надпісам на ўсёй тэрыторыі Беларусі з’яўляецца *надпіс на пячатцы* полацкага князя Ізяслава. Імя князя перададзена кірылічнымі літарамі ў грэчаскім звучанні – “Ізяславос”. Выдатнымі помнікамі пісьменнасці з’яўляюцца т.зв. “*Барысавы” і “Рагвалодавы” камені.* Гэта былі язычніцкія культавыя камяні, на якіх полацкія князі загадвалі выбіваць надпісы хрысціянскага змксту.

Першымі кнігамі былі перакладзеныя з грэчаскай на стараславянскю мову *рукапісныя* царкоўныя кнігі ***евангеллі.*** Па свайму зместу гэта былі зборнікі евангельскіх чытанняў. Выкарыстоўваліся яны пры правядзенні царкоўных пропаведзяў ў хрысцыянскіх храмах.

Першыя кнігі была вялікай каштоўнасцю. Кнігі пісаліся на *пергаменце* – спецыяальна выраблена скуры маладых жывёл. Рукапісы складвалі ў сшыткі. Вокладкамі служылі дзве *дошкі.* Пераплёт каштоўных рукапісаў аздабляўся металічнымі *ўпрыгожваннямі.*

Перапісванне і афармленне кніг патрабавала шмат часу, было справай толькі асобных пісьменных людзей з царкоўнага ассяроддзя. Таму і існавалі яны толькі ў асобных экземплярах, захоўваліся пры буйных царквах, манастырах, былі даступны толькі вышэйшай царкоўнай і свецкай знаці. Ёсць звесткі, што ў Полацку пры Сафійскім саборы існавала бібліятэка, ў якой захоўваліся рукапісныя кнігі, але яна была знішчана у час Лівонскай вайны.

Старажытнейшымі кнігамі на беларускіх землях былі *Тураўскае евангелл*е (створана ў XI ст.), *тры* старажытных рукапісы XII – XIУ стст. з *Полацку* (самае першае канца XII ст. належала Траецкаму манастыру, мела 172 ліста), *Аршанскае евангелле* (створана у канцы XII – пач. XIII ст., упрыгодана 300 выкананамі ў “звярыным” стыле ініцыяламі (заглаўнымі літарамі), некалькімі застаўкамі і мініяцюрамі.

Аўтарамі старабеларускіх кніг з’яўляліся нешматлікія адукаваныя асобы з вышэйшай царкоўнай і дзяржаўнай знаці, такія як Ефрасінья Полацкая, Кірыла Тураўскі, Клім Смаляціч, Аўрамій Смаленскі, невядомыя духоўныя дзеячы таго часу.

Напрыклад, ***Кірыл Тураўскі,*** будучы епіскапам, з’яўляецца аўтарам больш за 60 літаратурных твораў розных жанра, такіх як *малітвы* (каля 30-ці), *словы* (звароты, павучанні на біблейскія сюжэты - 8), *3 прытчы* (іншасакзальнае апавяданне з павучальнай высновай) *прамовы*, некалькі *канонаў* (царкоўнае песнапенне ў пахвалу святога, самаго свята) і інш.

Помнікамі літаратурнай творчасці таго часу з’яўляецца таксама “Полацкі летапіс” (упамінаецца Тацішчавым, але не захаваўся), “Слова пра паход Ігаравы”,

Памятнікамі старажытнай пісьменнасцы з’яўляюцца таксама надпісы на *віслых пячатках* князёў, старажытных свінцовых *пломбах,* а таксама надпісы (графіці) на *падмурках, сценах* сабораў, на *крыжах* і інш., зробленыя майстрамі, што іх будавалі і распісвалі. (а не сучаснымі наведвальнікамі!) Паступова пісьменнасць атрымлівае распаўсюджанне і сярод часткі *гарадскога* насельніцтва. Складаліся прыватныя лісты з паведамленнямі, даручэннямі, просьбамі, распараджэннямі. Літары пісаліся (выцарапаўліся) касцяной ці жалезнай палачкай на тым баку кары бярозы, *бяросты*, які прылягаў да дрэва (т.зв.берасцяныя граматы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адзначыючы *станоўчы ўплыў хрысціянізацыі* на развіццё культуры, нельга не ўзгадаць, што гэты працэс ішоў *памяркоўна, паступова,* пачаўся з вышэйшага дзяржаўнага і гарадского саслоўя. Таму акрамя форм культурнага жыцця, што з'явіліся пад уплывам хрысціянства, (аб якіх мы казалі), у перыяд сярэднявечча культурнае жыццё большасці насельніцтва, сялянства заставалася пад уплывам язычніцтва, мела формы разнастайцнай ***народнай творчасці.***

У сярэднявеччы значнае месца працягвалі мець ***вусная народная*** *творчасць.* Развівалася яна ў выглыдзе *паданняў*, народных *святаў і абрадаў,* што захоўвалі сваёй большасці рысы *язычніцкіх вераванняў*. У той час, калі адукацыя і пісьменнасць не былі даступны пераважнай большасці насельніцтва, доўгія стагоддзі менавіта паэтычная творчасць народа існавала толькі ў вуснай форме.

Захоўвалася і перадавалася ў нашчадкам праз вусную творчасць і сістэмы **свят, абрадаў гульняў.**

Іскравым сведчаннем таму з'яўляецца *беларускі народны каляндар,* які падзялял год на две роўныя часткі: з 1 студзеня і з 1 ліпеня. Назвы месяцаў, што ужываюцца у беларускай мове, пайшлі з таго часу. Выключэннем з'яўляецца май – называўся *"травень*", жнівень – *серпень.* Беларускі народны каляндар з'яўляецца адной з форм духоўнага жыцця беларусаў.

Значны пласт народнай культуры уяўляла сабой **абрадавая творчасць.**

Трывала існавала і *каляндарна-абрадавая паэзія, калядныя песні***,** цесна звязаныя з працай земляроба.

Захоўвалася *сямейная абраднасць*, якая адлюстроўвала тры галоўныя моманты ў жыцці чалавек – *нараджэнне, уступленне ў шлюб і смерць.* Да кожнай з гэтых падзей мелася свая сістэма абрадавых звычаяў, што аблюстроўвала бытавыя і культурныя умовы існавання чалавека ў перыяд сярэднявечча.

Больш падрабязна гэтыя пытанні мы разгледзім на семінарскіх занятках.

Тэма 3.1 УТВАРЭННЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

План:

1. Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі ВКЛ.
2. Знешнепалітычныя перадумовы ўтварэння ВКЛ
3. Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя перадумовы ўтварэння ВКЛ
4. Працэс стварэння ВКЛ.

1. Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі ВКЛ

Гістарыяграфія

Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага здаўна прыцягвала ўвагу даследчыкаў мінуўшчыны. Ужо XVI ст. з'яўляюцца творы, што абапіраліся на беларуска-літоўскія летапісы і дакументальныя матэрыялы з дзяржаунага і родавых магнацкіх архіваў. Пэўна самай значнай з падобных прац была "Хроніка польская,

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі" Мацея Стрыйкоўскага, выдадзеная ў Каралеўцы (сённяшні Калінінград) у 1582 г.

Але сістэматычнае, усебаковае вывучэнне гісторыі Вялікага Княства Літоўскага *пачалося ў XIX ст*. Афіцыйная гістарычная *расійская школа* гэтага часу разглядала развіццё Вялікага Княства з пункту гледжання *агульнарускага адзінства*.

Некаторыя прадстаўнікі гэтай школы — ***М.Устралаў,*** *М.****Каяловіч, П.Бранцаў*** — менавіта *заходнерускім землям* адводзілі *галоўную ролю* ў грамадска-палітычным жыцці Княства да канца XIV ст. Але потым, калі Княства заключыла шэраг уній з Польшчай, на думку гэтых гісторыкаў, "рускія" землі трапілі пад *іншаземна-каталіцкі прыгнёт* і далейшая іх гісторыя развівалася пад знакам пастаяннага *імкнення да аб'яднання з* праваслаўнай Расіяй. Пры гэтым згаданыя даследчыкі не заўважалі на землях Русі, што сталі складовай часткай Вялікага Княства Літоўскага, працэсаў фарміравання асобных народаў — беларускага і ўкраінскага. Гэтыя народы з'яўляліся для іх не больш чым галінамі аднаго "рускага' (мелася на ўвазе вялікарускага) народа, толькі з некаторымі адрозненнямі ў культуры і мове.

Пэўны адыход ад прыведзенан трактоўкі гістарычнага лёсу Вялікага Княства Літоўскага назіраўся у працах гісторыкаў *канца XIX — пачатку XX ст.* — ***М.Любаускага, Ф.Леантовіча, М.Доўнар-Запольскага, У.Пічэты***.

Мацей Кузьмчч Любаўскі (1860 – 1936), расійскі акадэмік, у 1911 – 1917 гг. рэктар Маскоўскага універсітэта, шмат займаўся вывучэнне розных аспектаў гісторыі ВКЛ. Яго магістерская дысертацыя "*Абласны падзел і мясцовае кіраванне Літоўска-рускай дзяржавы да часу выдання першага Літоўскага статута*" (М. 1892 г.), доктарская дысертацыя – " *Літоўска-рускі сейм*" (М., 1900 г.).

Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі (1867 – 1934) прафесар, вядомы беларускі гісторык у сваёй шматбаковай навуковай дзейнасці значную увагу надаваў перыяду ВКЛ, праблемам яго сацыяльна-эканамічнага развіцця. У сваёй магістарскай дысертацыі *" Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах*" (1901 г.) і доктарскай дысертацыі "*Нарысы па арганізацыі заходнерускага сялянства ў XVI ст."* (1905 г.) на велізарным архіўным матэрыяле разглядаў праблемы фарміравання беларуска-літоўскай дзяржаўнасці, сацыяльна-эканамічныя развіццё і сацыяльна-эканамічныя адносіны ў ВКЛ 14 – 16 стагоддзяў.

Іх працы, а таксама даследаванні І. *Лапо, М. Максімейкі, А. Праснякова – вышыня* расійскай гістарыяграфіі канца XIX – пачатку XX стагоддзя ў даследаванні гісторыі ВКЛ.

Яны разглядалі Вялікае Княства як дзяржаву *федэратыўную,* што ўзнікла ў працэсе галоўным чынам мірнага дагаворнага аб'яднання Літвы і Заходняй Русі. Прычым усходнеславянскія землі ў складзе гэтага дзяржаўнага арганізма адыгрывалі значную ролю на працягу ўсёй яе гісторыі, а не знаходзіліся з канца XVI ст. пад зверхнасцю заходніх суседзяў. У XV — XVI стст., згодна з высновамі М.Любаўскага, у "Літоўска-Рускай" дзяржаве (так ім вызначалася Вялікае Княства Літоўскае) усталяваўся палітычны лад, які меў значнае падабенства з сярэдневяковым заходнееўрапейскім феадалізмам.

(Больш падрабязна аб гэтым перыядзе гістрыяграфіі ВКЛ гл.:Гісторыя Беларусі. Пад Рэд. М.К. Касцюка. Т.2. С. 14 – 19)

Значны ўклад у вывучэнне гісторыі ВКЛ зрабілі *беларускія гісторыкі*, што працавалі ў пачатку гг. XX ст. У абагульняючых працах ***Вацлава Ластоўскага*** "*Кароткая гісторыя Беларусі"* (Мн., 1993), ***Усевалада Ігнатоўскага*** "*Кароткі нарыс*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гісторыі Беларусі" (Мн., 1991) ВКЛ разглядалася як дзяржава абодвух раўнапраўных –беларускага і літоўскага народаў. Час існавання беларускіх зямель у складзе ВКЛ яны, нават, называлі "залатым векам" у гісторыі беларускай народнасці.

Важнае месца гісторыя ВКЛ займала ў даследаваннях ***Уладзіміра Іванавіча Пічеты*** (1878 – 1947), першага рэктара БДУ. Яшчэ у 1910 годзе у сваёй працы "*Літоўска-Руская дзяржава*" разгледзіў пытанне пра ўключэнне беларускіх і ўкраінскіх зямель у склад ВКЛ, адзначаў, што большая іх частка была далучана *не насільна*. У лютым 1918 г. ён абараніў доктарскую дысертацыі на тэму "*Аграрная рэформа Сігізмунда –Аўгуста ў Літоўска-Рускай дзяржаве"*. У далейшым ён адмівіўся ад тэрміна "Літоўска-Руская дзяржава" і замяніў яго на "Літоўска-Беларуская дзяржава", а ў апошнія гады карыстаўся вызначэннем "Вялікае княства Літоўскае". Найбольш значнай яго працай па названай праблеме стала грунтоўная манаграфія "*Белоруссия и Литва в XV– XVI вв.*" (Мн., 1961).

Але пачынаючы з 30-х гадоў XX стагоддзя ў савецкай гістарыяграфіі, у працах беларускіх і расійскіх гісторыкаў, зноў пануючай стала *праваслаўна-русафільская канцэпцыя* гісторыі беларускага народа часоў ВКЛ. Беларускія землі ў складзе ВКЛ ўяўляюцца падначальнай і эксплуатаванай літоўскай знаццю краінай. Вялікае Княства Літоўскае падавалася для беларусаў як чужародная дзяржава-прыгнятальніца, польскае панаванне над беларускім народам" прыраўноўвалася да мангола-татарскага ярма для ўсходняй і паўднёвай Русі.

У другой палове XX стагоддзя, асабліва ў 60 – 80-я гады, беларускімі гісторыкамі вялася даволі інтэнсіўная распрацоўка праблем ВКЛ, назіраецца значный адыход ад раней існаваўшых стэрыятыпаў. Грунтоўнай для свайго часу з'явілася праца ***У. Пашуты "****Образование Литовского государства*" (Мн., 1957). Адносна больш аб'ектыўна перыяд ВКЛ выкладзены ў першым томе пяцітомнай "*Гісторыі Беларускай ССР"* (Мн., 1972)

Пачынаецца вывучэння асобных праблем у гісторыі ВКЛ.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё асвятляецца ў працах:

З. Копысский "*Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в.*» (Мн., 1966), *«Социально-политическое развитиет городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в»*. (Мн., 1975)

Грицкевич А.П. *«Частновладельческие города Белоруссии в XVI – XVIII вв.»* (Мн., 1975), "*Социальная борьба городжан Белоруссии (XVI – XVIII вв.)*"

Гісторыі *канфесійных адносін,* у тым ліку і ў часы ВКЛ, была прысвечана манаграфія ***Я. Мараша*** «*Ватикан и католическая церковь в Белоруссии*» (Мн., 1971), даследаванне ***Т. Блінавай*** "*Иезуиты в Белоруссии*» (Мн., 1990).

Пытанні царквы і культуры перыяда ВКЛ разглядаюцца ў працы ***С. Падокшына*** "*Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы (вторая половина XVI – начало XVII вв.)"* (Мн., 1979).

З'яўляюцца даследаванні матэрыяльнай і духоўнай *культуры* беларусаў часоў ВКЛ. Сярод іх:

В. Чамярыцкі "*Беларускія летапісы як помнікі літаратуры: узнікненне і літаратурная гісторыя першых зводаў*" (Мн.. 1989)

Л. Малчанава "*Матэрыяльная культура беларусаў"* (Мн., 1968)

М. Яніцкая. "*Беларускае мастацкае шкло (XVI – XVIII стст."* (Мн., 1977)

Г.Каханоўскі, Л. Малаш, К. Цвірка. *"Беларуская фальклярыстыка (эпоха феадалізму)*" (Мн., 1089)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ю. Якімовіч.”*Зодчество Белоруссии XVI – середины XVII в.»* (Мн, 1991)

М. Ткачоў. “*Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XI – XVIII ст*” (Мн., 1978).

О. Трусов. «*Памятники монументального зодчества Белоруссии XI- XVII вв.»* (Мн., 1988)

У канцы XX стагоддзя, намаганнімі сучасных беларускіх навукоўцаў вывучэнне гісторыі Беларусі часоў ВКЛ набывае *новы імпульс*, у выніку з’яўляюцца новыя *канцэптуальныя падыходы*, спроба а*сэнсаваць* назапашанае ў выглядзе абагульняючых работ і манаграфій.

Адметнае месца займаюць новыя публікацыі ***Міколы Ярмаловіча,*** прысвечаныя перыяду ВКЛ. Шырокі рэзананс, навуковыя дыскусіі выклікалі яго працы “*Па слядах аднаго міфа*” (Мн., 1991) і “*Старажытная Беларусь. Віленскі перыяд*” (Мн, 1994). У выказаным ім пункце гледжання на гісторыю Вялікага Княства Літоўскага пераважае *думка,* згодна з якой утварэнне гэтай *дзяржавы адбывалася на сучасных беларускіх землях* і па сваім змесце яна з'яўлялася адназначна ***беларускай.*** Ён выказаў меркаванне аб полацкім паходжанні вялікіх князёў літоўскіх, вядучай ролі Наваградскага княства ва ўтварэнні ВКЛ, што ніяк не знаходзіла падцвярджэнне фактамі, было аспрэчаны вядомымі гісторыкамі.

Больш *узважана* падыходзяць да ацэнкі дзяржаўнасці Вялікага Княства Літоўскага сучасныя беларускія даследчыкі, якія падкрэсліваюць яго *федэралізм, поліэтнічнасць*. Так, удзельнікі міжнароднага круглага стала "***Беларусь у Вялікім Княстве Літоўскім"*** (1992 г.) прыйшлі да высновы, што "ўсе народы, якія прымалі ўдзел у палітычным, эканамічным і культурным жыцці Вялікага Княства, а найперш *беларускі і літоўскі*, з'яўляюцца гістарычнымі *спадкаемцамі г*этай дзяржавы".

В. Насевіч ў сваёй невялікай, але дастаткова змястоўнай рабоце *“Пачаткі Вялікага княства Літоўскага. Падзеі і асобы”* (Мн., 1993) зрабіў рэалістычны вывад аб тым, што на *ранніх стадыях фарміравання* ВКЛ пэўны *палітычны прырытэт* мела *літоўская* знаць, у той час як “рускія” (*беларускія і украінскія*) землі адыгрывалі *прырытэтную* ролю ў *культурным і сацыяльным* развіцці поліэтнічнай дзяржавы.

А. Краўцэвіч абараніў доктарскую дысертацыю і выдаў кніжку “*Стварэнне Вялікага княства Літоўскага”* (Мн., 1998 г.)

Атрымала сваё далейшае развіццё вывучэнне сацыяльна-эканамічных праблем Беларусі ў перыяд феадалізма. Назавём некаторыя публікацыі:

П. Лойка “*Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі: Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI – XVIII ст*.”(Мн., 1991).

В. Голубеў падрыхтаваў першую беларускай гістарыяграфіі працу “*Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі: XVI – XVIII стст*.” (Мн., 1992). У 2008 годзе ім апублікавана манаграфія “*Сельская абшчына ў Беларусі XVI – XVIII стст*.)”, якая стала падставай да абароны ў 2010 годзе доктарскай дысертацыі. Аўтарам на падставе крыніц даказана, што *абшчына ў перыяд ВКЛ не знікла*, як гэта раней сцвярджалася, а існвала як форма *самаарганізацыі* сялянства, *прызнавалася* дзяржавай, *прыстасоўвалася* да эканамічных і палітычных умоў, таму што была *неабходна* сялянству.

А. Доўнар вывучае сацыяльную структуру на беларускіх земля ВКЛ, выдал манаграфію “*Сяляне-слугі Беларусі другой паловы XVI – сярэдзіны XVIII* ст.” (Мн., 2007)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У канцы XX – пачатку XXI стагоддзяў з'яўляюцца і шэраг ***абагульняючых прац,*** якія аб'ядноўваюць усе напрацоўкі навукоўцай, адлюстроўваюць сучасныя погляды на гісторыю Беларусі перыяда Велікага княства Літоўскага.

Першая спроба разглядаць эканамічныя, сацыяльныя, палітычныя, канфесійныя праблемы гісторыі Беларусі перыяда феадалізма з *нацыянальна-дзяржаўных пазіцый* беларускага народа была зроблена ў першым томе "***Нарысаў гісторыі Беларусі***" (Мн., 1994), якім вы будзеце карыстацца у самастойнай працы.

У 1997 годзе вышла абагульняючая праца беларускіх гісторыкаў ***"Гісторыя сялянства Беларусі***" У 3- х тамах. Том 1. "*Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г."*

Вялікі артыкул пад назвай "*Вялікае Княства Літоўскае*" змешчаны ў 2-м томе "***Энцыклапедыі гісторыі Беларусі***" (Мн., 1994, С. 387 – 423). Аутарамі яго з'яўляюцца *А. Грыцкевіч* (гістарычны нарыс), *І. Юхо* (дзяржаўны і палітычны лад), *В. Голубеў* (сельская гаспадарка і становішча сялян), *З.Капыскі* (гарады), *Г. Галенчанка, А. Лявонава, І. Саверчанка* (культура і асвета), *П.Лойка* (крыніцы,гістарыяграфія). Наогул, артыкул "Вялікае Княства Літоўскае" самы вялікі ў "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі", ён займае 36 старонак! (для параўнання: арт. "Вялікая Айчынная вайна 1914 - 1945 гг." – 11 стар.)

Апошняе, самай сучаснай працай па гісторыі ВКЛ з'яўляецца Другі том шасці томнай "***Гісторыі Беларусі"*** пад. рэд. М.П. Касцюка "***Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага"*** (Мн., 2008. – 688 с.)., якім мы будзем таксама карыстацца пры самастойнай працы.

Крыніцы

Перыяд Вялікага княства Літоўскага ўтрымлівае *значна больш* ***гістарычных крыніц,*** чым папярэдні перыяд пачатку Першага тысячагоддзя нашай эры. Гэта стала вынікам з'яўлення і распаўсюджанне *пісьменства,* шырокага яго ужывання ў дзяржаўным, палітычным і гаспадарчым справаводстве.

Гэтыя пісьмовыя помнікі падзяляюцца на *дакументальныя (*актавыя матэрыялы, заканадаўства, матэрыялы справаводства) *і апавядальныя,* да якіх адносяцца летапісы і хронікі, літаратурныя і публіцыстычныя творы, мемуары.

Найбольш масавымі крыніцамі з'яўляюцца ***акты і граматы*** сацыяльна-эканамічнага і сацыяльна-палітычнага характару. Яны характарызуюць працэс фарміравання феадальнага землеўладання, стан гаспадаркі, саслоўную структуру насельніцтва і сацыяльную палітыку ўрада. Люстэркам свайго часу з'яўляюцца заканадаўчыя помнікі — ***Судзебнік Казіміра 1468 г.*** і ***Статуты Вялікага Княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг***. Па іх можна ўявіць грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя адносіны, правасвядомасць, мараль і побыт, культуру і мову людзей XV — XVI стст.

Багацейшай крыніцай ведаў аб мінулым з'яўляецца ***справаводчая*** дакументацыя, што адклалася ў вялікакняжацкай канцылярыі ў Вільні (***Метрыка Вялікага Княства Літоўскага***), у ***актавых*** кнігах судовых устаноў дзяржавы.

Розныя бакі жыцця Беларусі адлюстроўваюць ***матэрыялы рэвізій*** гаспадарскіх уладанняў адміністратыўных раёнаў (старостваў, эканомій, валасцей, княстваў), ***інвентарныя апісанні*** феадальных уладанняў, гарадоў і мястэчак, ***мытныя кнігі.*** Гісторыя вайсковай справы знайшла адбітак у "***попісах" (вопісах) войска*** Вялікага Княства Літоўскага 1528, 1565 і 1567 гг.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Значную цікавасць для гісторыка ўяўляюць ***дакументы*** вальных ***Соймаў*** Вялікага Княства Літоускага і Рэчы Паспалітай, ***павятовых соймікаў, з'ездаў шляхты***: спісы пытанняў для разгляду, інструкцыі, наказы дэпутатам ад шляхты, прамовы, паведамленні розных камісій, скаргі, пратаколы пасяджэнняў, універсалы, дэкларацыі, канстытуцыі (пастановы) і інш. Іх дапаўняюць "дыярыўшы" з апісаннем сеймавых падзей, выступ-ленняў дэпутатаў, закулісных палітычных інтрыг.

Для гісторыі гаспадарскага землеўладання найбольш важныя ***гаспадарскія ўставыдля заходніх і ўсходніх валасцей ВКЛ*** 1524, 1529, 1542 гг., "Устава на валокі" 1557 г.,і іншыя дакументы, які зацвердзілі прынцыпы аграрнай рэформы, арганізацыі фальваркава-паншчынай сістэмы, вызначалі памеры падаткаў і павіннасцей насельніцтва.

Для вывучэння сацыяльна-палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця беларускіх гарадоў і мястэчак, працэсу фарміравання гарадскога саслоўя першаснае значэнне маюць ***прывілеі на магдэбурскае права***, што атрымлівалі беларускія гарады Берасце, Гародня, Слуцк, Полацк, Менск і іншыя (усяго больш за 20) у канцы XVУ – на працягу XV стагоддзяў

Асобную групу крыніц складаюць ***перапіска*** вялікіх князёў літоўскіх з магнатамі Беларусі, Літвы, Украіны,' з кіраўнікамі суседніх дзяржаў, карэспандэнцыя паноў-рады, гаспадарскай канцылярыі, вышэйшых царкоўных іерархаў.

Асноўным відам ***апавядальных крыніц*** з'яўляюцца ***летапісы***. Падзеі XIII — XIV стст. знайшлі адлюстраванне ў галіцка-валынскім, ноўгарадскім, пскоўскім**,** уладзіміра-суздальскім летапісах XV — XVI стст. — у агульнарускіх летапісных зборах.

Выдатнымі помнікамі агульнадзяржаунага летапісання Вялікага Княства Літоўскага з'яўляюцца:

Летапісец вялікіх князёў літоўскіх, Збор 1446 г., Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жмойцкага, Хроніка Быхаўца. Хроніка польская, літоўская і ўсяе Русі" Мацея Стрыйкоўскага.

У іх знайшлі адлюстраванні палітычныя падзеі і ідэалагічныяіканцэпцыі магнатаў і арыстакратыі ВКЛ, па заказе якіх і была створана большасць з іх.

Бурлівыя падзеі XVI —XVII стст. пакінулі вялікую колькасць ***мемуараў*** рознай гістарычнай, інфармацыйнай і мастацкай вартасці. Найбольш прыкметнымі з'яуляюцца "*Гістарычныя запіскі*" Ф.Еўлашоўскага і "*Дьярыўш*" А.Філіповіча.

Фрагментарньш звесткі пра Беларусь палітычнага, геаграфічнага і быта-вога характару сустракаюцца і ў *запісках замежных дыпламатаў,* вандроунікау, пісьменнікаў (С.Гербершгэйна, А.Гваньіні, А.Пасевіна і інш.). Яны адлюстроўваюць погляды еўрапейцаў на нашу гісторыю.

Для вывучэння гісторыі *культуры, ідэалогіі, рэлігіі* важнае значэнне маюць *літаратурныя і публіцыстычньш помнікі.* Найбольш інфармацыйна насычанымі з'яўляюцца трактат М.Ліцвіна "*Аб норавах татар, літоўцаў і маскавіцян"* (складзены ў сярэдзіне XУI ст.), публіцыстьгчная спадчына Ф.*Скарыны, С.Буднага, В.Цяпінскага,* палемічныя сачыненні П.Скаргі, І.Пацея, І.Руцкага, С.Зізанія, Х.Філалета, М.Сматрыцкага і іншых аўтараў.

2. Знешнепалітычныя перадумовы ўтварэння ВКЛ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У вывучэнні прычын утварэння ВКЛ усе навукоўцы пагаджаюцца з тым, што *знешнепалітычныя ўмовы*, якія склаліся ў пачатку XIII стагоддзя для беларускіх зямель, адыгралі *важнейшую ролю.*

Значная пагроза для існвання беларускіх княстваў зыходзіла з паўночнага захада, з Прыбалтыцы, дзе ўзмаўнілася пазіцыя крыжацкіх Ордэнаў. У канцы XII стагоддзя тут узнікае магутны ***Тэўтонскі Ордэн***, які знішчыў у прыбалтыцы балцкае племя прусаў і трывала заснаваўся на яго тэрыторыі. У *1237* годзе Тэўтонскі ордэн аб'ядноўваецца з існаваўшым раней Ордэнам мечаносцаў, у выніку чаго ўтвараецца ***Лівонскі ордэн.*** Стварэнне такога магутнага аб'яднання ў Прыбалтыцы карэнныч чынам змяніла тут палітычную сітуацыю. Галоўнай мэтай Ордэна была *каланізацыя* прыбалтыйскіх і усходнеславянскіх народаў, *распаўсюджанне* на гэтай торыторыі заходняга, *рымскага* варыянта *хрысціянства* (т.зв. місіянерская дзейнасць).

Полацкае княства страціла ў выніку выхад да Балтыйскага мора, над ім і іншымі княствамі на тэрыторыі Беларусі навісла пагроза заваявання. У другой палове XIII стагоддзя аб'яднаным дружынам заходнерускіх зямель давялося стрымліваць натіск крыжакоў на землі Літвы і Чорнай Русі. На пачатку XIУ стагоддзя ў залежнасць ад рыжскага архіепіскапа часова трапіў Полацк. Крыжакі ўпарта спрабавалі захапіць Панямонне. Іхнія набегі на Гародню рабіліся ўсё больш частымі і спусташальнымі.

Яшчэ аднім знешнім фактарам, які паўплываў на ўтварэнне ВКЛ, была пагроза для беларускіх і літоўскіх зямель з боку *татара-мангольскіх заваёўнікаў.* І хаця беларускія землі засталіся ў баку ад шляху татара-манголаў у Еўропу, не трапілі ў залежнасць ад Арды, пагроза іх зняволення працягвала існаваць. У Канцы 1240 года татара-манголы уварваліся з поўдню ў *Берасцейскую* зямлю, якая моцна пацярпела. У тым жа годзе ў часовую залежнасць ад Арды часова трапілі *турава-пінскія землі***.** Паводле летапісных звестак па'ходы татара-манголаў на беларускія землі працягваліся і ў XIУ стагоддзі – яны адбыліся ў *1315, 1325 і 1338 гадах*. Беларускія і літоўскія землі здолелі адстаяць сваю незалежнасць, але зведалі спусташэнні і рабаўніцтва.

Адносіны беларускіх княстваў са сваімі літоўскімі суседзямі былі даўнімі і складанымі. У XI – XII стагоддзях землі літоўскіх плямён былі аб'ектам заваявання з боку суседніх славянскіх каняствў На Літву разам з кіеўскімі князямі хадзілі Полацкі князь Брачыслаў (1040 г.), Гародзенскі князь Усевалад (1131-1132 гг.), а таксама іншыя полацкія, смаленскія, чарнігаўскія князі.

У сваю чаргу літоўцы і самі хадзілі на землі заходняй Русі з мэтай рабавання, захопу палонных, жывёлы. Толькі за перыяд з 1200 па 1268 год літоўцы 35 разоў нападалі на славянскія княствы. Цікава, што літоўцаў часта выкарыстоўвалі беларускія і іншыя славянскія князі ў сваіх феадальных і палітычных сутыкненнях.

Але новыя палітычныя рэаліі міжнародных адносін, што складваліся ў беларуска-літоўскім рэгіёне у сярэдзіне – другой палове XIII стагоддзя, паступова ўзмацнялі тэндэнцыю да аб'яднання сумесных намаганняў.

Складаная і небяспечная *знешнепалітычная сітуацыя* (пагроза з *захаду* ад крыжакоў, а таксама з *поўдню і ўсходу* ад татара-манголаў) стала аднім з важных фактараў, які падштурхоўваў да аб'яднання беларускія і літоўскія землі ў супрацьстаянні знешняй пагрозе.

У такіх канкрэтна-гістарычных умовах пачынала *складвацца ваенна-палітычнае аб'яднанне славянскіх і балцкіх народаў.* Перад пагрозай небяспекі князі беларускіх княстваў нярэдка ўступалі ў саюз з літоўскімі і сумесна выступалі супраць крыжакоў і татара-манголаў. Ваенная пагроза паскорыла працэсс іх далейшага палітычнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аб’яднання. Адначым, што гэты працэс меў двубаковы характэр, у ім былі зацікаўлены абодвы – беларускі і літоўскі – народы. Для беларускага насельніцтва пагроза мангольскага нашэсця ў 30 – 50-я гады XIII стагоддзя стала асноўнай ў вызначэнні адносін з Літвой. Для Літвы ўсё больш актуальнай станавілася пагроза нямецкай экспансіі, неабходнасць умацавання адносін з беларускімі княствамі як рэальнымі саюзнікамі.

3. Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя перадумовы ўтварэння ВКЛ

Якія б знешнепалітычныя пагрозы не існавалі, яны самі па сябе не маглі прывесці да аб’яднання , калі б на гэта не было *ўнутранных перадумоў*, калі б гэта не было *тэндэнцыяй* палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця.

У канцы XII – пачатку XIII землі народы Беларусі і Літвы знаходзіліся на розных этапах свайго грамадска-палітычнага развіцця.

Землі Беларусі знаходзіліся на стадыі феадальнай раздробленасці. Яны ужо прашлі *першапачатковы этап заснавання* буйных дзяржаўных утварэнняў. Вынікам сацыяльна-эканамічнага развіцця стала эканамічнае і палітычнае абасабленне асобных зямель, стварэнне самастойных княстваў. Засталіся ў мінулым моц і аўтарытэт Полацкай і Тураўскай княстваў. Некалі магутныя, яны распаліся на ўдзельныя княствы, якіх у пачатку XIII стагоддзя на *беларускіх землях было* ***каля 20.*** Ад былога адзінства не засталося і следа, нават ва ўмовах знешняй пагрозы з боку крыжакоў і татара-манголаў *асабістыя амбіцыі* (барацьба за лідэрства, падпарадкаванне іншых) ўдзельных князёў бралі верх, нярэдка прыводзілі да ўнутранных, міжусобных ваенных сутычак паміж княствам.

Літва адставала ў сваім палітычным і эканамічным развіцці.Літоўскае адгалінаванне балтаў займала ў раннім сярэднявеччы асноўную тэрыторыю сучаснай Літвы - правябярэжную частку Панямоння. Сярод літоўскіх княстваў вылучаліся *Літва, Жэмайты, Аўкштайты, Латгалы, Селы, Земгалы.* Паступова сфарміраваліся дзве вялікія групы – Жэмайты (на захадзе) і Літва (на ўсходе).

Калі беларускія землі мелі сваю дзяржаўнасць ужо з канца IX стагоддзя, то насельніцтва літоўскіх зямель жыло яшчэ радаплеменным ладам. Уся тэрыторыя літоўскіх плямён была падзелена на пастаянныя акругі, заснаваныя на родасным паходжанні. Паміж сабой іх звязвала агульная мова, традыцыі, язычзніцкія вераванні. У іх толькі пачынаўся працэс маёмаснай дыферэнцыяцыі, станаўлення класавага грамадства. Літоўцы ў большасці заставаліся земляробамі, ў іх яшчэ не развілося гарадское жыццё, не было буйных гарадоў з развітымі рамёствамі і гандлем.

У пачатку XIII стагоддзя ў адрозненні ад зямель Беларусі, якія прайшлі некалькі стадый дзяржаўна-палітычнага развіцця (аб’яднання і раздробленасці), Літва яшчэ стаяла на парозе сваёй дзяржаўнасці.

Толькі *першай палове XIII* стагоддзя ствараецца *цэнтралізаваная раннефеадальная Літоўская дзяржава* з моцнай велікакняжецкай ўладай. Яе ўзнікненне звязана з імем вядормага літоўскага князя Міндоўга. Шляхам унутраннай барацьбы яму удалося аб’яднасць большасць літоўскіх княстваў, стварыць моцную дзяржаву, што мела сур’ёзную перавагу над раздробленымі княствамі Беларусі.

Такім чынам, складваюцца *палітычныя перадумовы* ўзнікнення новага дзяржаўнага ўтварэння ВКЛ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Імі сталі ***супадзенне*** ўзаемных імкненняў з двух бакоў –

- патрэба *раздробленых княстваў* на тэрыторыі Беларусі ў *кансалідацыі* перад пагрозаў з боку знешніх ворагаў пры адсутнасці свайго аб'яднальнага палітычнага ядра

-супала з імкненнем узнікшай літоўскай дзяржавы, якая знаходзілася на стадыі роста сваёй магутнасці, да пашэрэнне свайго уплыву на іншыя тэрыторыі і народы.

Літоўскія княствы, негледзячы на тое, што знаходзіліся на больш нізкай ступені свайго сацыяльна-эканамічнага развіцця, менавіта таму, што знаходзіліся на стадыі фарміравання дзяржаўнасці, выступілі *носьбітам цэнтралісцкіх, аб'яднальных тэндэнцый з беларускімі землямі.*

Прыходзіцца канстатаваць, што беларускія землі ў той час *не змаглі знайсці ў сваім ассяродзі палітычнага лідэра,* які здолеў аб'яднаць разрозненыя княствы у адно магутнае цэлае. *Аб'яднальнай сілай* заходнерускіх княстваў выступіла ўлада *вялікіх князёў літоўскіх.*

Да ліку ***сацыяльна-эканамічных прычын***, што з'явіліся падставай для утварэння агульнай літоўска-беларускай дзяржавы, патрэбна аднесці *агульнасць працэсаў развіцця феадальнага грамадства.* У XIII стагоддзі і на беларускіх і ў літоўскіх землях інтэнсіўна развіваюцца *феадальныя адносіны.* У плынь феадальнай эксплуатацыі ўцягваюцца новыя катэгорыі насельніцтва з былых вольных абшчыннікаў і гараджан. Узрастае моц баярства, заможных слаёў насельніцтва. Усе гэта патрабавала заканадаўчага замацавання на дзяржаўным узроўны, што магла зрабіць толькі моцная улада ў адзінай дзяржаве. Феадалам спатрэбілася аб'яднаць сілы для прававога замацавання феадальных адносін, уніфікацыі феадальнага прыгнёту, спынення ўцёкаў сялян ад аднаго феадала да другога, прымацавання сялян да зямлі.

Стварэння адзінай, *вялікай па тэрыторыі дзяржавы,* з адзінай эканамічнай прасторай бы патрабавала і далейшае развіццё *прадукцыйных сіл – земляробства, рамёстваў, гандлю*.

Землі Літвы і Беларусі не зведалі татара-мангольскага іга. Не гледзячы на перыядычныя спусташэнні, яны ўсё ж менш за іншыя тэрыторыі пацярпелі ад разбурэнняў. Тут не было масавага знішчэння насельніцтва, раслі і развіваліся гарады. Рост вытворчасці прыводзіў да таго, што *межы* асобных невялікіх княстваў ствараліі *штучныя перашкоды* на шляху абмена таварамі, спецыялізацыі асобных тэрыторый у вытворчасці. Адыгравала сваю ролю і тое, што беларуска-літоўскія землі былі звязаны паміж сабой значнымі *гандлёвымі шляхамі,* што пралягалі па буйных рэках рэгіёна.

Усё гэта разам з палітычнымі працэсамі і знешнепалітычнымі абставінамі стала ***перадумовамі да*** ўтварэння ВКЛ.

4. Працэс стварэння ВКЛ.

Існуе некалькі варыянтаў **назвы** новага дзяржаўнага ўтварэння, што узнікла ў выніку аб'яднальных працэсаў літоўскіх і беларускіх зямель. Яны адлюстроўваюць змены ў тэрыторыі, якую ахоплівала ў сябе дзяржава.

- ***Вялікае княства Літоўскае*** (з канца XIУ ст., калі адбылося дзяржаўнае аб'яднанне беларускіх і літоўскіх зямель)

-***Вялікае княства Літоўскае і Рускае*** (з 1362 г., калі ў яго склад былі ўключаны сучасныя украінскія землі)

- ***Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае*** (з 1442 г (некаторыя лічаць – з 1454 г), калі былі далучаны землі Жамойцкага княства.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- ***Вялікае княства Літоўскае і Жамойцкае*** (пасля таго, як напярэдадні Люблінскай Уніі 1569 г. Украіна была далучана да Кароны Польскай адпала неабходнасць захоўваць у назве азначэнне “Рускае”)

Стварэнне новай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага – ***працяглы па часе*** *і* ***складаны па зместу працэс,*** у гісторыі якога да сённяшняга часу існуюць не да канца *высветленыя моманты*, а сярод навукоўцай сустракаюца *розныя пункты гледжання*. Адбываўся гэты працэс у розных *формах*, увасабляўся падчас у *драматычных падзеях,* якія з’яўляліся адлюстраваннем той эпохі.

Тлумачыцца гэта і тым, што ажыццяўленне ідэі аб’яднання балтаў і усходнеславянскіх народаў адбывалася ва ўмовах *барацьбы за лідэрства* паміж чатырма цэнтрамі, якія прэтэндавалі на ролю кансалідуючай сілы. Імі з’яўляліся: - Наваградак,- літоўска-жмудскі асяродак, - Полацк і магутнае галіцка-валынскае княства.

У гэтыую барацьбу, у тым ці іншым выглядзе, былі ўцягнуты таксама - Тэўтонскі ордэн, - татара-мангольскія заваёўнікі, - каралеўства польскае, - каталіцкая царква, - усходне-рускія землі.

Значную ролю адыгравала і *міжусобная барацьба князёў,* якая нярэдка прымала формы *змовы,* не выключала *вераломства, здрады* і нават *забоўстваў* сваіх супернікаў.

Адказваючы на пытанне, *чаму не Полацк* стаў цэнтрам аб’яднання княстваў, гісторыкі прыходзяць да высновы, што ў сярэдзіне XIII стагоддзя полацкае *княства не было ўжо столь магутным*, як раней. Паўплывала на гэта *страта выхада* да Балтыйскага мора, зацяжная *барацьба* з крыжацкай агрэсіяў, *аслабленне* княжыцкай дынасцыі. Летапісы сведчаць, што ў Полацку у 50 – 60-я гады XIII стагоддзя былі ужо літоўскія князі Таўцівіл і Гердзень, тут узмацняецца ўплыў каталіцкага Рыма.

У сярэдзіне XIII стагоддзя цэнтр палітычнага жыцця на беларускіх землях паступова перамяшчаецца *у Панямонне*, дзе асабліва узвышаецца ***Навагрaда*** ***(***упершыню упамінаецца пад 1044 годам). Паўплывала на гэта і яго *геапалітычнае становішча* (знаходзіўся у баку ад крыжацкіх і татара-мангольскіх паходаў), імкліва развівалася *гаспадарчае* жыццё, існавалі шэраг *значных гарадоў* (Наваградак, Гарадзен, Слонім, Ваўкавыск, Свіслач і інш), трывалыя *эканамічна-гандлёвыя сувязі* з іншымі краінамі. Вялікія багацці былі сканцэнтраваны у феадальнай вярхушкі княства – баяр і заможных гараджан. Але для ажыццяўлення планаў аб’яднання іншых зямель вакол Навагрудскага княства не хапала толькі моцнай асобы, якая б узяла на сябя ролю кіраўніка гэтага працэсу.

Такой асобай стаў літоўскі князь **Міндоўг** (1195 – 1263). Да сярэдзіны 1230- х гг. ён дасягнуў аднаасобнай вярхоўнай ўлады ў Літве сярод іншых князеў, існуе нават вызначэнне “Літва Міндоўга” (1236 г.).

Існуе некалькі думак аб тым, *як Міндоўг з’явіўся у Навагрудку.*

- Адны навукоўцы лічаць, што ён ***заваяваў*** Наваградскае княства, далучыў яго да Літвы. У энцыклапедыі “Гісторыі Беларусі” (Т.2, с. 144) гаворыцца “…далучыў да сваіх уладанняў Навагародскую (Навагрудскую) землю і ўладкаваў свайго стаўленіка ў Полацку, што фактычна дало пачатак утварэнню ВКЛ)

- Іншыя перакананы, што таго, як памёр апошні наваградскі князь Ізяслаў, Міндоўг ***быў запрошаны*** сюды на княжэнне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Выказваецца думка, калі пазіцыі Міндоўга ў Літве аслаблі (пасля неўдалага пахода на крыжакоў) і супраць яго пачалася барацьба іншых літоўскіх князёў, Міндоўг з часткай сваёй дружына *знайшоў прытулак у* Навагрудку, дзе быў прыняты на княжэнне.

Але ні водная з прыведзеных думак не бяспрэчна, бо трывалых падцверджанняў у летапісах не знаходзіць. Як гаворыцца ў другім томе "Гісторыі Беларусі" пад. рэд. М.П. Касцюка "У цэлым трэба прызнаць, што на аснове наяўных фактаў немагчыма дакладна высвятліць, якім чынам Навагрудак перайшоў пад уладу літоўскага князя. Але ў любым выпадку гэтая падзея мела выключна важныя наступствы". (с. 73)

Таксама спрэчным ў'яўляецца сцвярджэння, што ў **1246** годзе Міндоўг ў Наваградку прыняў *хрысціянскую веру ў* ***праваслаўным*** выглядзе. Больш абгрунтаваны гістарычнымі крыніцамі факт прыняцця Міндоўгам ***каталіцтва*** (у канцы 1250 г. ці ў пачатку 1251 года прыняў хрышчэнне па каталіцкім абрадзе). Аб арыентацыі Міндоўга не на Візантыю, а на каталіцкі Рым, сведчыць тое, што ў **1253 г**одзе ён *каранаваўся каралеўскай* каронай, прысланай з Рыма. Такі крок быў выклікан жаданнем знайсці патрымку з боку Рымскага папы, зняць напружанасць у адносінах з каталіцкімі ордынамі.

Асобнага заканадаўчага акта аб стварэнні Вялікага Княства Літоўскага не існуе. Гісторыкі зыходзяцца ў тым, што ў *сярэдзіне XIII стагоддзя* можна казаць *аб пачатку працэса ўтварэння ВКЛ.*

Склалася ўстойлівая палітычная структура, у якой *вярхоўнаму князю* літоўскага паходжання непасрэдна належала *частка этнічнай Літвы*, *Наваградская зямля*, а *Жамойцкая літва і Полацкае княства* знаходзіліся ў поўнай залежнасці ад яго. Паводле падлікаў гісторыкаў, агульная плошча падкантрольнай тэрыторыі у той час складала каля ***153 тыс. кв***. км, з якіх на этнічна балцкія землі прыходзілася звыш *100 т*ыс. кв. км. (65%), на Наваградскую зямлю – каля 26 тыс. кв. км, на Полацкую зямлю – 29 тыс. кв. км. Магчыма, ужо пры Міндоўгу яна пачала называцца Вялікае Княства Літоўскае.

Аб тэрыторыі ВКЛ ў XIII – першай палове XIУ ст. гл. карту ў "*Атласе гісторыі Беларусі* " на стар. 15.; *Электронную карту,* ч. 1.

Утвораная Міндоўгам дзяржава адразу выклікала негатыўнае стаўленне з боку суседзяў. Палітычная гісторыя ВКЛ другой паловы XIII стагоддзя – гэта перыяд упартай барацьбы ВКЛ супраць агрэсіі з боку

- ***галіцка-валынскага княства.*** (тройчы звяршала паход на Наваградскую зямлю)
- ***Залатой арды*** (у 1258 г. татарскі ваявода *Бурундай* здейсніў спусташальны паход супраць Літвы, у 1277 г. аб'яднанае войска галіцкага княяства і татараў захапіла Наваградак)
- ***крыжацкіх ордэнаў*** (у 1284, 1295, 1296, 1305, 1306 (двойчы), 1311(тройчы) гадах нападалі на землі ВКЛ, дасягалі Гародні, а у 1314 годзе – нават Наваградка.)
- ***Жамойцкага княства*** і іншых літоўскіх княстваў, арганізатарам якіх стаў жмудскі князь ***Трайната.***

Палітычная гісторыя таго часу сведчыць аб *жорсткай, бязлітаснай, крывавай* міжусобнай *барацьбе к*нязёў за ўладу.

У восень ***1263 года Міндоўг*** і два яго малодшых сына былі *забіты* змоўшчыкамі, начале якіх стаяў Трайната.

Пасля забойства Міндоўга, які заклаў падмурак утварэння ВКЛ, у яе гісторыі пачайся *10-ці гадовы перыяд міжкняжацкайч барацьбы*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Уладу ў ВКЛ пасля забойства Міндоўга у 1263 годзе захапіў князь **Трайнята,** які арганізаваў неўзабаве забойства пляменніка Міндоўга полацкага князя ***Таўцівіла,*** у якім бачыў свайго суперніка.

Але літаральна праз некалькі месяцаў, у **1264** годзе, таксама ў выніку змовы, ***Трайната быў забіты*** (зарэзаны) конюхамі Міндоўга.

Новым князям у Навагрудку становіцца старэйшы сын забітага Міндоўга **Войшалк,** які да гэтага укрываўся ў Пінску. Пры ім аднаўляецца магутнасць Навагрудскай зямлі, да яе далучаюцца некаторыя землі, заселеныя балцкімі плямёнамі, адбываецца далучэнне Полацка-Віцебскай зямлі. Некаторыя даследчыкі, нават лічаць, што *Міндоўг* толькі "*падрыхтаваў глебу*" для з'яўлення ВКЛ, а "***дрэва новай дзяржавы пасадзіў Войшалк."***

Але такое вызначэнне ролі Войшалка не зусім зразумела, бо частка гісторыкай звяртае увагу на тое, што ён прызнаваў сябе васалам валынскага князя, неузабаве увогуле адмовіўся ад улады на карысць яго стаўленіка, фактычна быў марыянеткай галіцка-валынскіх князеў. Лёс яго таксама склаўся трагічна – ў **1268 ё**н быў забіты галіцкім князем Львом.

У **1270 г**одзе да ўлады прыходзіць князь **Трайдзен,** які правіў 12 гадоў.

Княжанне Трайцдзена было часам умацавання ВКЛ. Яно праходзіла ў барацьбе з унутранай і знешняй пагрозай, ВКЛ выступала як унутрана стабільная дзяржава, якая здольна весці актыўную знешнюю палітыку.

Далейшая гісторыя ВКЛ пасля смерці Трайдзена (прыблізна ў 1282 годзе) на 10 год не мае нават дакладных звестак аб князях, што займалі пасаду князчя у Наваградку.

Гісторыкі могут толькі з упэўнасцю казаць, што Вялікім князем Літоўскім у **1293 годзе** стаў **Віцень,** але дзе і калі ён нарадзіўся, з якога роду паходзіл, як памёр – не вядома. Пры ім ўдалося дабіцца **ўнутранней умацавання дзяржавы.** З 1307 года адбылося канчатковае далучэнне *Полацкай зямлі* да ВКЛ. У 1315 годзе у склад ВКЛ была ўключана *Берасцейская зямля*. Пры княжэнні Віценя ВКЛ паспяхова супрацьстаяла шматразовым набегам крыжакоў, павялічвала свой уплыў на суседнія рускія землі. Памёр Віцень каля **1316** года

Такім чынам, другая палове XIII – пачатак XIУ стагоддзяў былі часам стварэння і ўмацавання новай дзяржавы - Вялікага княства Літоўскага, у склад якога была ўключана большасць беларускіх зямель.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма 3.2 Палітычнае развіццё ВКЛ у XIV– XV ст.

План:

1. Умацаванне ВКЛ пры Гедеміне і Альгердзе.
2. Дынастычная барацьба
3. Крэўская ўнія
4. ВКЛ пры Вітаўце
5. ВКЛ у 30 – 80-я гады XV стагоддзя.

1. Умацаванне ВКЛ пры Гедеміне і Альгердзе.

Пасля смерці Віценя вялікім князем ВКЛ у ***1316*** годзе стаў ***Гедемін*** (*Гедзімін, малодшы брат ці сын ? Віценя*), які княжыў 25 год, да ***1341*** года.

Менавіта пры Гедеміне яскрава выявіліся *цэнтралізатарскія* памкненні, у выніку реалізацыі якіх ВКЛ пераўтварылася ў магутную дзяржаву. У час княжэння Гедеміна *завершыўся працэс* аб'яднання асноўнай часткі беларускіх зямель у ВКЛ.

Шляхі ўваходжання беларускіх княстваў у склад Літоўскай дзяржавы былі розныя.

Гісторыкі лічаць, што ў дачыненні да найбольш буйных беларускіх зямель – Полацкай і Віцебскай можна з вялікай доляй упэўнасці казаць аб ***дабравольна-дагаворнай*** аснове іх уваходжання ў склад ВКЛ.

Але разам з тым, не выключэннем былі і фактары ***ваенна-палітычнага ўціску***, калі ў *выніку ваенных паходаў,* што былі звычайнай з'явай у адносінах паміж княствамі, ці пад *пагрозай заваявання,* мясцовыя княззі былі вымушаны прызнаваць ўладу мацнейшага, аб'яўляць сябе яго васаламі. Ні адна з сярэднявечных дзяржаў не ўзнікала толькі на аснове свабоднага волевыяўлення насельніцтва. Не было выключэннем і ВКЛ.

Сваю ролю ў пашырэнні дзяржаўнай тэрыторыі ВКЛ адыгравалі ***шлюбныя*** сувязі. Міждынастычныя шлюбныя саюзы ў перыяд сярэднявечча былі не сколькі *асабістай* справай людзей, колькі важным элементам міжнароднай палітыкі, прыводзілі да аб'яднання зямель супругаў, перадачы ўлады ў спадчыну.

Усе названыя шляхі аб'яднання выкарыстоўваліся Гедемінам пры пашырэнні тэрыторыі ВКЛ.

Трывала злучылася з ВКЛ ***Полацкае княства***, дзе княжыў брат Гедеміна – Воінь. Непасрэдна да ўлады вялікага князя было далучана ***Менскае княства*** пасля серці Менскага князя Васіля. Адзін з сыноў Гедеміна (Нарымонт-Глеб) стаў уладальнікам ***Пінскага княства***, а потым і Полацкага княства, быў запрошаны ў якасці служылага князя у Вялікі Ноўгарад, які, такім чынам, трапіў пад уплыў Літвы. Другі сын Гедыміна – *Альгерд* праз шлюб атрымаў ***Віцебскае княства,*** васалам якога была і ***Друцкае*** княства.

Значна пашыралася тэрыторыя ВКЛ у выніку далучэння ***Берасцейскай зямлі,*** якая да гэтага часу знаходзілася ў складзе галіцка-валынскага княства і была адваявана Гедымінам. Напрыканцы яго княжэння пад уладу ВКЛ перайшлі ***Валынь*** і ***Падляшша.***

Беларуска-літоўскія летапісы сведчаць і аб узмацненні ўплыва ВКЛ на *Кіеўскае княства і Смаленскае княства*, якія яшчэ захоўвалі самастойнасць.

У выніку такой актыўнай дзейнасці Гедыміна **тэрыторыя** ВКЛ павялічылася больш чым удвая, прыблізна да ***325 – 330 тыс***. кв. км. (узгадаем – пры Міндоўгу – 153 тыс. кв. км.). З іх прыблізна каля паловы, *150 тыс*. кв.км. прыходзілася на *беларускія землі (*у тым ліку: Віцебскае княства – 20 тыс. кв.км, Друцкае – 17, Менскае – 19, Берасцейшчына з Падляшшам – 29, Піншчына са Слуцкам – 34 тыс. кв.км.). Такім чынам, пры Гедеміне ***большая частка*** сучасных беларускіх зямель апынулася ў складзе ВКЛ

Пры Гедыміне (*некаторыя гісторыкі лічаць – яшчэ пры Віцене)* ў ВКЛ з'явілася новая сталіца – ***Вільна,*** якая ужо ў 1323 годзе ў гедемінавых граматах называецца "каралеўскім горадам", гэта значыць сталіцай. Былі пабудаваны княжацкія мураваныя замкі ў Ліде, Троках, Крэве, Віцебску.

Памёр Гедымін (*загінул ці быў атручаны?)* у ***1341 годзе***. Пасля яго смерці вялікім князем стаў яго сын ***Яўнут.*** Але яго браты, сыны Гедыміна ***Альгерд і Кейстут у 1345***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

годзе скінулі яго з пасады вялікага князя, утварыўшы *дуумвірат.* Фактычна браты з'яўляліся суправіцелямі ВКЛ, тэрыторыя якога была падзелена паміж імі.

Вялікім князем літоўскім быў абвешчаны **Альгерд** (1345 – 1377 гг.), але ён атрымаў толькі *ўсходнюю* частку дзяржавы – Вільна, Крэўскае і Віцебскае княствы, а паздней і Полацкае княства. **Кейстуту** належала заходняя частка – Жамойць, беларускае Панямонне, Берасцейшчына і Падляшша.

Абодвы яны, *Альгерд і Кейстут*, выконвалі агульную задачу – ***захаванне, умацаванне і пашырэнне*** ВКЛ. Гісторыкі адзначаюць не характэрную да даго часу рысу іх узаемаадносін – адсутнасць *варожасці* паміж сабой, агульную працу на карысць дзяржавы.

Галоўным клопатам **Кейстута** стала надзейная абарона ВКЛ ад агрэсіі з боку *крыжакоў з* поўначы і захаду. Прускія і лівонскія крыжакі на парацягу 1345 – 1377 гг. зрабілі на землі Панямоння і Падзвіння, Жамойці каля *100* спусташальных рэйдаў. У адказ Кейстутам было арганізавана каля 30 паходаў на Прусію і 10 – на Лівонію, была разбіта немецкая крэпасць Каралевец (Кенісберг).

Альгерд жа працягваў справу бацькі (Гедыміна) па *пашырэнню* тэрыторыі ВКЛ за кошт далучэння новых зямель на *ўсходе і поўдні.*

Пры **Альгердзе** тэрыторыя ВКЛ значна пашыралася. Яна павялічылася больш чым удвая ў выніку далучэння большай часткі Украіны, усходніх беларускіх зямель, заходняй часткі рускіх княстваў. У 1350-я гады да ВКЛ былі далучаны Бранскае і Чарнігава-северскае княствы, заходняя частка Смаленскага княства з беларускімі гарадамі Орша, Мсціслаў, Чачэрск, Прапойск, Рэчыца. У 1360-я гады у склад ВКЛ было ўключана Кіеўскае княства, у тым ліку і беларускія Брагінская і Мазырская воласці.

У **1363** годзе Альгерд перамог *татар у бітве на* ***Сініх Водах*** (сучасная тэр. Украіны), што прывяло да карэнных змен у лёсе украінскага народа: уся паўднева-заходняя частка Украіны была *пазбаўлена ад татара-манголькага* гнёту, была уключана ў склад ВКЛ.

Пры ***Альгердзе*** ВКЛ пачанае барацьбу з Маскоўскім княствам, з гэтай мэтай ён нават заключае саюз з Ардой і цверскімі князямі (*Цверскім княствам*). У 1368, 1370 і 1372 гадах адбыліся паходы на Маскву, але яны скончыліся безвынікова.

У выніку дзейнасці **Альгерда** тэрыторыя ВКЛ павялічылася да 630 тысяч кв.км (*пры Гедыміне было 330 тыс*), з якіх на землі Літвы прыходзілася 10%, сучасныя беларускія землі занімалі каля адной трэці (30%) агульнай плошчы дзяржавы. Менавіта з гэтага часу і ужываецца назва дзяржавы ***Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае.***

Такім чынам, можна канстатаваць, што пры Альгердзе *завяршылася аб'яднанне ўсіх беларускіх зямель у складзе ВКЛ.*

(Гэты працэс занчяў больш за 100 год, пачаўся пры Міндоўгу, пры Гедыміне – большасць бел. зямель, пры Альгерде – завершыўся)

Аб тэрыторыі ВКЛ гл.: Атлас гісторыі Беларусі, с. 16

Электронную карту, ч.2

2. Дынастычная барацьба

Смерць ***Альгерда ў 1377*** годзе парушыла палітычную раўнавагу ў ВКЛ, паміж прадстанікамі вялікакняжацкай сямьі пачынаецца барацьба за ўладу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Падставы да гэтага былі закладзены яшчэ пры жыцці Альгерда. У яго ад двух шлюбаў было *12* сыноў. Большасць з іх, а таксама сыны Кейстута і іншыя родзічы атрамалі ў якасці ***ўдзелаў*** большасць тэрыторыторыі ВКЛ. Напрыклад, сын Альгерда *Андрэй* валодал Полацкім княствам, *Ягайла* – Віцебскім і Крэйскім, сын Кейстута *Вітаўт* – Гродзенскім і Берасцейска-Падляшскім княствамі і г.д. Удзельныя княствы мелі значную самастойнасць, сам Альгерд кантралявай толькі 10-15 %, тэрыторыі дзяржавы, Кейстут – прыкладна столькі ж, а удзелы ахоплівалі 70-75% тэрыторыі ВКЛ.

Штуршком да дынастычнай барацьба пасля смерці Альгерда стала парушэнне традыцыі заняцця пасады пасля смерці бацькі старэйшым з сыноў. Ім быў сын ад першага шлюбы Андрэй, аднак Альгерд сваім спадкаёмцам абвясціў не яго, а старэйшага сына ад другога шлюбу – ***Ягайлу.***

Такім чынам, сфарміраваліся две групоўкі князёй – сыноў Альгерда ад першага шлюбу начале з **Андрэям** і сыноў ад *другога шлюбу,* што падтрымлівалі ***Ягайлу.***

У гэтых умовах некаторыя ўдзельныя князі пачалі нават адасабляцца ад ВКЛ.

Андрэй і яго прыхільнікі пачалі шукаць падтрымку ў Маскоўскім княстве.

Ягайла пачал арыентавацца на падтрымку захада – Польшчы, а таксама нават крыжакоў і Залатой Арды, саюзнікам якой ён быў падчас Кулікоўскай бітвы ў 1380 годзе, хаця яго войскі ўстрымаліся ад удзелу непасрэдна ў сражэнні.

Акрамя дзяцей Альгерда, на пасаду Вялікага князя сваі прэтэнзіі мелі і **Кейстут,** малодшы брат Альгерда, і яго сын – **Вітаўт.**

Стары ***Кейстут*** карыстаўся вялікай папулярнасцю і меў значную падтрымку на Берасцейшчыне, Гарадзейшчыне і Жамойці. У 1381 годзе ён нават паланіў Ягайлу і абвясціў сябе Вялікім князем. Але у 1382 годзе Ягайла зрабіў пераварот, заняў Вільню і Трокі, а Кейстута з сынам Вітаўтам заманіў у Крэва, дзе Кейстут быў задушаны падасланым забойцам.

Вітаўту удалося уцячы. Ён паспрабаваў заручыцца падтрымкай нават Тэўтонскага ордэна, каб адпомсціць за смерць бацькі, але калі рыцары пад выглыдам дапамогі пачалі рабаваць і паліць беларускія гарады і вёскі, Вітаўт летам 1384 года пайшоў на прымірэнне з Ягайлам, за што той вяртае яму Бярэсце, Гародню, Падляшша.

Такім чынам, у пачатку 80-х гадоў ВКЛ перажывала перыяд складаны перыяд міжусобнай барацьбы, у ходзе якой супернікі шукалі падтрымкі з боку розных магчымых саюзнікаў.

Як прыходзяць да высновы навукоўцы, у 80-я гады XIУ стагоддзя існавалі і былі рэальнымі два шляхі далейшага развіцця ВКЛ:

1. У саюзе з Маскоўскай Руссю.
2. У саюзе з Польскім каралеўствам

3. Крэўская ўнія

У першай палове 80-х гадоў XIV стагоддзя склаліся ўмовы для палітычнага аб’яднання ***ВКЛ і Польшчы.***

Да іх патрэбна аднесці як *міжнародныя,* так і *ўнутранныя* абставіны, што склаліся у той час, а таксама *аб’ектыўныя і суб’ектыўныя фактары.*

Да ***знешніх*** фактараў патрэбна аднесці тое, што абодзвюм дзяржавам пагражаў адзін і той жа *вораг – Тэўтонскі ордэн*. Агульная небяспека схіляла краіны да

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

збліжэння. Знайсці сябе моцнага саюзніка ў супрацьстаянні набегам крыжакоў была зацікаўлена ВКЛ.

З *польскага боку* існавала жаданне польскіх феадалаў пашырыць свае ўладанні за кошт зямель ВКЛ, разлічвалі яны і на прывілеі, пашырэнне сваіх правоў у дзяржаве.

Сваю карысць імкнуўся набыць і *польскі каталіцкі касцёл*, які разлічваў пашырыць свой ўплыў на ўсходе, атрымаць новыя землі і даходы.

Ягайла, як вялікі князь ВКЛ, таксама быў зацікаўлены ў саюзе з моцнай польскай дзяржавай.

Пасля смерці Альгерда ў ВКЛ узмацнілася *ўнутрыдынастычная* барацьба, аб чым мы казалі раней. ВКЛ ужо *не уяўляла* сабой ранейшай адзінай, моцнай дзяржавы. Яно пераўтварылася ў *канґламерат* розных зямель, княстваў. Моцную апазіцыю Ягайле саставілі нашчадкі Кейстута начале з Вітаўтам. Таму каб утрымацю цэнтральную ўлада і захаваць тэрытарыяльную цэласнасць сваёй дзяржавы Ягайле патрэбна было абапірэцца на моцнага саюзніка.

Нельга не браць на улік і *асабістыя амбіцыі Ягайлы*. Яго вельмі прываблівала магчымасць стаць у адзін рад з мацнейшымі манархамі Еўропы праз атраманне каралеўскага статусу ў Польшчы.

Рэалізацыя названых намаганняў стала магчымай у выніку сітуацыі, што склалася у Польскім каралеўстве. У 1382 годзе там памёр кароль Людовік, які не пакінуў пасля сябе мужчынскага патомства. Праз два гады польская знаць абвясціла новай каралевай яго малалетнюю, 12-ці гадоваю дачку ***Ядвігу,*** якой тэрмінова шукалі мужа. Ядвіга нават была заручана з аўстрыйскім прынцам Вільгельмам Габсбургам. Ягайле ў той час было 35 год і ён не быў яшчэ жанаты, што дазваляла яму прэтэндаваць на польскую карону.

У першай палове 1385 года пачаліся перамовы паміж прадстаўнікамі Ягайлы і польскім бокам, вынікам якіх стало заключэнне т. зв. **Крэўскай ўніі.**

Дзяржаўны саюз паміж ВКЛ і Польшчай быў заключаны ***14 жніўня 1385*** года ў *Крэўскім замку.*

Крэўская ўнія дакументальна замацавала абавязацельства з боку

Ягайлы

- *перайсці у каталіцтва* і ахрысціць паводле лацінскага абраду ўсіх язычнікаў-літоўцаў;
- стварыць дзяржаўны саюз (унію) ВКЛ і Кароны Польскай, “на вечныя часы далучыць свае землі, літоўскія і рускія, да кароны Польскай”
- *дапамагчы* сваімі родкамі *адваяваць* захопленыя суседнімі дзяржавамі польскія тэрыторыі;
- *перавесці* велікакняжэцкі *скарб* з Вільні ў Кракаў;
- *заплаціць* былому жаніху Ядвігі прынцу Вільгельму 200 тыс. форынтаў;

Польскі бок

- афіцыйна запрашаў Ягайлу заняць *каралеўскі пасад* у Кракаве;
- *ажаніцца* на каралеве Ядвіге;
- *абяцал дапамогу* ў барацьбе з крыжакамі.

Канчатковае зацвярджэнне і рэалізацыя ўніі адбылося ў ***1386 г***одзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2 лютага 1386 года адбыўся *з'езд* польскай шляхты ў Любліне, дзе Ягайлу аднагалосна *абралі каралём* Польшчы.

15 лютага Ягайла, яго браты і баярства прынялі *каталіцтва.*

18 лютага Ягайла *ажаніўся* з Ядвігай.

4 сакавіка Ягайла быў *каранаваны* польскай каралеўскай каронай як *Уладзіслаў II.*

Крэўская унія і адбыўшаеся аб'яднанне ВКЛ і Польшчы да сённяшняга часу выклікаюць ***розныя,*** падчас супрацьлеглыя ацэнкі і стаўленні гісторыкаў.

Некаторыя даследчыкі звяртаюць увагу на тое, што больш карысці ад аб'яднання атрымала Польшча. Выказваецца меркаванне, што Ягайла *здрадзіў* інтарэсам ВКЛ, прынёс у ахвяру *асабістым, уласным* інтарэсам дзяржаўнасць і самастойнасць ВКЛ.

Частка гісторыкаў ставіць пад сумненне *даставернасць тэкста* Крэўскай уніі. Паколькі тэкст уніі быў апублікаваны толькі ў XIX стагоддзі, некаторыя даследчыкі называюць яго *фальсіфікацыяй, падробкай* 16 – 17 стагоддзяў.

Па рознаму гісторыкі трактуюць і ***змест уніі.*** Асабліва спрэчкі разгарнуліся вакол пытання аб дзяржаўным статусе ВКЛ. Што азначала унія для ВКЛ – ***інкарпарацыю*** (уключэнне, уваходжанне) у склад Польшчы? ***Страту ці захаванне свайго*** суверынітэту? *Пераўтварэнне* ВКЛ у правінцыю каралеўства? *Федэрацыю* двух дзяржаў, стварэнне *ваенна-палітычнага саюза*?

Больш падрабязна аб гэтых поглядах, іх абгрунтаванні і крытыкі гл.: Гісторыя Беларусі. Пад. рэд. М.П. Касцюка. Т.2. С.107 – 110.

Некаторыя даследчыкі бачаць, наадварот, толькі *станоўчыя* вынікі Крэўскай уніі. Напрыклад, у "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" *(Т. 4, с. 286-287. Аўтар артыкула А.П. Грыцкевіч*) вызначаецца, што ***ў выніку уніі***, дзякуючы саюзу ВКЛ і Польшчы

- *удалося ліквідаваць пагрозу* з боку Тэўтонскага ордэна, перамагчы яго ў Грюнвальдскай бітве;
- *адкрыць* для ВКЛ *гандлёвыя* шляхі ў Еўропу;
- з дапамогай Польшчы *стрымліваць націск* з боку Маскоўскай дзяржавы;
- дабіцца шырокага *дыпламатычнага* выхада ВКЛ у Еўропу;
- *культурнага* збліжэння з іншымі краінамі Еўропы.

Названыя высновы не бяспрэчны, яны маюць як сваіх прыхільнікаў, так і крытыкаў. Усе гэта адлюстроўвае неадназначнасць і супярэчлівасць у гісторыі значэння Крэўскай уніі.

Але *галоўны вынік Крэўскай уніі* заключаецца ў тым, што ёй быў ***пакладзены пачатак збліжэння ВКЛ і Польшчы***. Гэты працэс не завершыўся, а толькі *пачаўся* ад Крэўскай уніі, зацягнулся яшчэ амаль на 2 стагоддзя да Люблінскай уніі 1569 года. Аб тым, што гэты працэс быў непростым, супярэчлівым, меў як сваіх прыхільнікаў, так і моцных праціўнікаў, стварыў апазіцыю аб'ядненню, сведчыць той факт, што ў далейшым, на працягу XV – першай паловы XVI стагоддзяў *больш за 10 разоў прымаліся і падпісываліся дзяржаўныя акты*, якія у той ці іншай ступені *падцвярджалі, аднаўлялі ці дапалнялі Крэўскую унію*.

4. ВКЛ пры Вітаўце

Крэўская унія не толькі прадэманстравала *перамогу* тых сіл ВКЛ, якія былі зацікаўлены ў аб'яднанні з Польшчай, але і парадзіла новы *раскол* у грамадстве, прывяла да новага *ўсплеску міжусобнай барацьбы ў ВКЛ*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пасля Крэўскай уніі і ўступленя ў сан польскага караля Ягайла пачаў ажыццяўляць узятыя абавязкі. Найбольш складанай і важнай праблемай было распаўсюджанне каталіцкага веравызнання, што выклікала супрацьстаянне ў грамадстве і актывізацыю апанентаў Ягайлы. Каб забяспечыць рэалізацыю сваіх планаў Ягайла *выдаў правілей тым* баярам, што прынялі *каталіцтва*: ім давалася *полнае права ўласнасці* на спадчанныя землі, яны *вызваляліся* ад усіх абавязкаў на карысць уладара, за выключэннем вайсковай службы і даніны.

Вялікія прывілеі, поўны фінансавы і судовы імунітэт, а таксама землі з подданым насельніцтвам былі даны на тэрыторыі ВКЛ **каталіцкаму касцёлу**, які ў выніку стаў першай латыфундыяй ў Літве і Беларусі.

Усе гэта выклікала адкрытае непрыманне сярод праваслаўнага насельніцтва і большасці баяр Беларусі і Украіны.

Ягайла, стаўшы каралем Польшчы, заставаўся вярхоўным уладаром ВКЛ. Удзельныя князі павінны былі падаць прысяжныя лісты аб вернасці яму і Кароне Польскай.

Але паступова ў Вялікім княстве ўзмацнялася і набірала моц ***апазіцыя*** інкарпарацыі. Першым выступіў ***полацкі князь Андрэй,*** які звярнуўся ў барацьбе супраць Ягайлы за дапамогай к Ордэну і ў лютым 1386 года пачаў адкрытыя *ваенныя дзеянні*, хаця і неудалыя.

Зімой 1389-1390 гадоў *паўстанне* супраць інкарпарацыйнай палітыкі Ягайлы ўзняў ***Вітаўт,*** які абапірался на падтрымку незадаволеных праваслаўных баяр і насельніцтва Беларусі, а таксама на прускіх рыцараў – у студзені 1390 года нават падпісаў пагадненне з Ордэнам. Адкрытая вайна паміж сіламі Вітаўта і Ягайлы доўжылася каля 2-х гадоў. Вітаўт неаднойчы пагражаў захопам Вільні, авалодал Гародняй, Навагрудкам.

Склаўшаяся сітуацыя прадэманстравала *немагчымасць для Ягайлы* захаваць ***уласны кантроль над ВКЛ.*** У такіх умовах ён вымушан быў пайсці на кампраміс.

5 жніўня 1392 года ў маёнтку *Вострава*, што пад Лідай, адбылася сустрэча і прымірэнне паміж польскім каралём і адначасова Вялікім князем Літоўскім ***Ягайла*** і князем гарадзенскім і трокскім ***Вітаўтам,*** замацаванае дагаворам. У гісторыі названая падзея атрымала назву **Востраўскае пагадненне**.*(Гл.: Энцыклапедыю гісторыі Беларусі. Т.2. С. 361)*. У ім фактычна ўлада ў ВКЛ была перадана *Вітаўту.* Ён быў прызнаны старэйшым сярод родных і стрыечных братоў Ягайлы ў Літве, пажыццёвым *намеснікам караля* у ВКЛ (хоць пакуль і без тытула “Вялікі князь”). У сваю чаргу, Вітаўт абавязаўся захоўваць вернасць каралю, каралеве і польскай кароне.

Ацэньваючы адбыўшаюся падзею, гісторыкі лічаць, што хоць Вітаўт і знаходзіўся *ў васальнай залежнасці* ад Каралеўства польскага, ***Востраўскае пагадненне*** стала *першым* юрыдычна-прававым *крокам* на шляху да *аднаўлення дзяржаўнага сувярэнітэту* Вялікага княства Літоўскага, бо ў параўнанні з Крэўскай уніяй яно *вяртала ВКЛ пэўную самастойнасць*. Яно паказала, што на практыцы ажыццявіць ***ідэю*** поўнай *інкарпарацы*і літоўска-беларускай дзяржавы ў Каралеўства Польскае ў той час аказалася ***немагчыма.***

Асобу **Вітаўта** (гады жыцця – 1350 – 1430) гісторыкі адносяць да ліку самых ***выдатных дзеячоў ВКЛ.*** Вялікім князем Літоўскім Вітаўт быў з ***1392 па 1430 год***.

Яго праўленне праходзіла ва ўмовах складаных *знешніх і ўнутранных абставін*

- пагрозы агрэсіі з боку немецкіх рыцараў,
- намаганняў *Польшчы* да *аб’яднання* ў адну дзяржаву,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- прэтэнзій *Маскоўскага княства* на беларускія і украінскія землі,
- існаваўшай пагрозы з боку *татарскіх ханаў,*
- міжусобнай барацьбы унутры ВКЛ.
- *канфліктаў* паміж прыхільнікамі праваслаўя і каталіцізму.

Таму ***Вітаўт*** праводзіў палітыку *лавіравання* паміж гэтымі пагрозамі, падчас браў у саюзнікі былых ворагаў і наадварот – варагаваў з былымі саюзнікамі, задавальняючы не толькі *дзяржаўныя* інтарэсы ВКЛ, але і сваі асабістыя амбіцыі. Сучаснікі і гісторыкі характарызуюць Вітаўта як ***таленавітага, валявога і беспрынцыпнага*** палітыка.

Каб умацаваць сваю ўладу ў ВКЛ Вітаўт жорстка расправіўся з тымі князямі, што выступалі супраць яго. Ён ліквідаваў многія удзельныя княствы, пераўтварыўшы у тым ліку Віцебскае, Полацкае і іншыя княствы у намесніцтвы. Замест спадчынных князёў у іх былі прызначаны намеснікі, верныя Вялікаму князю.

Вітаўт працягваў збіральніцкую палітыку зямель на ўсходзе, тым больш, што ў той час адбывалася аслабленне былоў магутнай Залатой Арды. У 1395 годзе Вітаўт авалодал Смаленскам і падпарадкаваў Смаленскае княства. Пад пратэктарат ВКЛ трапілі таксама Рязанскае княства, Пскоў і Ноўгародская зямля. Пры Вітаўце да ВКЛ былі далучаны землі паўднёвага Падолля, што дало выхад да Чорнага мора. У канцы XIV – пачатку XV стагоддзя пры Вітаўце ВКЛ займала ***найбольшую ў сваёй гісторыі тэрыторыю*** – ад Нёмана і Дзвіны да нізоўя Дняпра і Днястра, да прычарнаморскіх стэпаў.

Аб тэрыторыі ВКЛ пры Вітаўце гл.: Атлас гісторыі Беларусі. С.16, 20
Электронную карту. Ч.3.

У канцы XIV стагоддзя Вітаўт нават вылучыл ідэю стварэння самастойнай літоўска-славянскай дзяржавы, якая б супрацьстаяла Польшчы. Абапіраўся ён не толькі на праваслаўную знаць ВКЛ, незадаволеную каталіцкай экспансіяў, а таксама на *Ордэн* і апальнага татарскага хана *Тахтамыша*, з якім заключае пагадненне. У **1399** годзе адбылася бітва на ***р. Ворскле*** паміж войскамі Вітаўта і Тармелана з аднаго боку і войскам татара-мангольскімі войскамі начале з Цімурам (Тармеланам). Армія Вітаўта пацярпела там грандыёзнае паражэнне.

У выніку Вітаўт вымушаны быў зноў падцвердзіць сваю залежнасць ад Польскай кароны, што было замацавана ў новай ***Віленска-Радаменскай уніі*** **1410 года**., якую можна разглядаць як працяг і замацаванне Крэўскай уніі.

У пачатку ХУ стагоддзя дасягае свайго апагею барацьба ВКЛ і Польшчы супраць крыжацкага ***Тэўтонскага ордэна.*** Менавіта пагроза з боку крыжакоў стала асновай аб'яднання ВКЛ і Польшчы, прымушала Вітаўта адкінуць сваі спрэчкі з Ягайла. Тэўтонскі Ордэн прэтэндаваў на Жамойць, пастаянна то ўступаў у саюз з ВКЛ і Польшчай, неаднаразова заключаў з імі дагаворы (апошні у 1404 годзе), то вёў актыўную дыпламатычную і ўзброеную вайну супраць іх, спадзяваўся на раскол паміж Ягайла і Вітаўтам. Абодвы бакі вялі падрыхтоўку да масштабнай вайны.

Напружаныя адносіны перараслі ў аб'яўленне вайны ***6 жніўня 1409 года,*** калі у Жамойці ўспыхнула паўстанне супраць Ордэна.

У ліпені 1410 года аб'яднаныя сілы Польшчы і ВКЛ (каля 40 тыс. чалавек, - 90 атрадаў, з якіх 50 былі выстаўлены Польшчай і 40 – ВКЛ. У ліку 40 – 22 былі уласна беларускія –гарадзенскі, лідскі, полацкі, віцебскі, пінскі, драгічінскі і інш. палкі.) перайшлі мяжу Тэўтонскага ордэна, уступілі на тэрыторыю Прусіі. Войскі

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУ

Тэўтонскага ордэна, якімі камандаваў вялікі магістр Ульрых фон Юнгінген, складалі 51 атрад, але былі лепш узброены.

15 ліпеня 1410 года каля вёскі Грюнвальд адбылася знакамітая **Грунвальдская бітва,** у выніку якой армія Ордэна была разбіта, перастала існаваць. Аб ходзе бітвы, удзеле ў ёй беларусаў можна даведацца з шматлікіх публікацый з нагоды 600-годдзя бітвы, якое адзначалася ў 2010 годзе. Сярод іх карысна звернуцца да "*Беларускага гістарычнага часопіса*" *2010 г., № 7,* у якім змешчаны артыкул Р. Гагуа "***Грунвальдская бітва 1410 года".***

Грунвальдская бітва была буйнейшай бітвай сярэднявечча, яна адыграла значную ролю ў гісторыі Беларусі, Польшчы, Літвы, Чэхіі, Германіі.

Вынікі бітвы былі замацаваны ў ***дагаворы аб міры*** паміж Нямецкім ордэнам, з аднаго боку, і Каронай Польскай і ВКЛ – з другога, заключаным 1 лютага 1411 года у Торуні (***Тарунскі мірны дагавор 1411 г***). Згодна з ім *Жамойць вярталася* у склад ВКЛ, Польшча *атрымлівала Добрыжскую зямлю,* Ордэн абавязан быў *выплаціць в*ялізарную па тым часе суму *ў 300* тыс. залатых дукатаў. Але некаторыя даследчыкі лічаць такія ўмовы міру *кампрамісам*, адзначаюць яго *палавінчаты характар*, бо хаця *магутнасць* Ордэна і была *падарвана*, ён заставаўся *значнай сілай*. Нават выказваецца думка, што Вітаўт *не жадаў полнага разгрому Ордэна*, яго знікнення ў міжнародных стасунках, маючы намер выкарыстоўваць Ордэн для падтрымкі сваёй барацьбы супраць Польшчы. Пасля 1422 года ВКЛ наогул *устрымлівалася ад удзелу ў войнах* Каралеўства польскага супраць Ордэна.

Усё гэта знайшло сваё авасабленне ў далейшых падзеях і новай вайне ў сярэдзіне XV стагоддзя.

Толькі ў выніку *30-ці гадовай вайны 1454 – 1466 гадоў* і новага Тарунскага дагавора 1466 года завершыцца незалежнае, самастойнае існаванне Тэўтонскага Ордэна.

Значнай падзеяй у палітычным жыцці ВКЛ і Польшчы пасля Грюнвальда стала **Гарадзельская унія 1413 года** (заключана ў замку Гарадле над Бугам) і выдадзены па яе выніках **Гарадзельскі прывілей 1413 года**. (гл. Энцыклапедыю гісторыі Беларусі. Т.2. С. 470)

Гарадзельская ўнія яшчэ раз (пасля Крэўскай 1382 г. і Віленска-Радаменскай уніі 1410 года) падцвердзіла саюз ВКЛ з Польшчай. Былі даны абавязацельства ў выпадку смерці Вітаўта не абіраць *новага вялікага князя* без парады і згоды польскіх феадалаў, якія ў сваю чаргу ў выпадку смерці караля Ягайлы таксама не павінны былі абіраць *новага караля* без згоды Вітаўта і феадалаў ВКЛ. Але такія правы, якія ўраўноўвалі правы феадалаў ВКЛ з польскімі феадаламі, надаваліся толькі тым з іх, хто *прыняў каталіцтва* і атрымаў польскія гербы.

Гарадзельскі прывілей устанаўліваў, што *карыстацца прывілеямі і пажалаваннямі*, якія мелі польскія паны і шляхта, мець права на свабоднае *распараджэнне сваёй маёмасцю і атрыманне спадчыны*, прымаць удзел у *абранні* караля і Вялікага князя маглі толькі паны, шляхта і баяры ВКЛ ***каталіцкага веравызнання.*** Усе некатолікі не павінны былі дапускацца да *дзяржаўных пасад,* забараняліся нават *шлюбы* паміж католікамі і праваслаўнымі. Гарадзельскі прывілей азначай значны крок па шляху акаталічвання насельніцтва, і ў першаю чаргу – феадальнай знаці, якая пачала шырока пераходзіць у каталіцтва.

Такая палітыка ставіла праваслаўных ў няроўныя ўмовы, ушчамляла іх палітычныя і эканамічныя правы, што надавала новыя падставы для барацьбы розных

ВЕТОЗИГОРИЙ ВГПУ

груповак унутры грамадства, было выкарыстана рускімі княствамі як повад для ўмяшальніцтва ў жыццё ВКЛ. У далейшым праваслаўныя феадалы беларускіх і украінскіх зямель неаднаразова пратэставалі супраць замацаванай у Гарадзельскім прывілеі дыскрымінацыі праваслаўных, дамагліся адмены некаторых яго норм у 1432 і 1434 гадах Цалкам артыкул аб недапушчэнні праваслаўных да выўэйшых дзяржаўных пасад у ВКЛ быў адменены толькі ў XVI ст.

Такім чынам, пры Вітаўце ВКЛ дасягнула сваёй ***вышэйшай*** *магутнасці*, пераўтварылася ў вялікую моцную дзяржаву, а сам ён быў важным палітычным лідэрам усходняй Еўропы. Не гледзячы на фармальнае падпарадкаванне Вітаўта і яго дзяржавы ВКЛ польскай кароне, з яго пазіцыяй былі вымушаны лічыцца і польскія феадалы, якія далі абяцанне не выбіраць сябе караля без яго згоды. Памёр ***Вітаўт*** у кастрычніку ***1430 года.*** Неузабаве,ў 1434 годзе памірае і ***Ягайла.***

5. ВКЛ у 30 – 80-я гады XV стагоддзя.

Пасля смерці Вітаўта, а потым і Ягайлы, у ВКЛ наступілі цяжкия часы. Даследчыкі прыходзяць да высновы, што ў 30-я гады фактычна *дынастычная* барацьба за ўладу перарасла ў ***грамадзянскую вайну*** ў ВКЛ. У барацьбу за вяліканяжацкаю пасаду былі ўцягнуты не толькі вярхі баярства і князяў, але і больш шырокія пласты насельніцтва, якія былі незадаволены *нацыянальна-рэлігійнымі* супярэчнасцямі ў грамадстве. Асабліва абвастралі сітуацыю *дыскрымінацыйныя* ў адносінах да праваслаўнай знаці артыкулы *Гарадзельскага прывілея* 1413 года.

Усё гэта прывяло *да расколу* ВКЛ, страты яго *ваенна-палітычнай* магутнасці і *дзяржаўнага* сувярэнітэту.

У 1430 годзе пасля смерці Вітаўта на вялікакняжацкі прастол у ВКЛ узышоў малодшы брат Ягайлы – **Свідрыгайла.** Атрымаўшы прастол Свідрыгайла, не гледзячы на тое, што ён быў братам караля, паспрабаваў пачаць праводзіць палітыку ўзмацнення ВКЛ, якая набывала антыпольскі характар.

Абапіраўся ён на *праваслаўных князёў і баяр рускіх* абласцей ВКЛ, якія, насупярэк Гарадзельскага прывілея, пачалі набываць вышэйшыя пасады ў ВКЛ, выцясняць з іх прадстаўнікоў каталіцкай арыстакратыі.

Такое становішча выклікала незадаволенасць апошняй (*каталіцкай арыстакратыі, каталіцкіх феадалаў*). У верасні ***1432*** года яны арганізавалі замах на Свідрыгаўлу, які быў вымушаны збегчы ў Полацк.

Вялікім князем Літоўскім быў абвешчаны брат Вітаўта, старадубскі князь **Жыгімонт.**

У выніку склалася сітуацыя, што існавалі два вялікіх князя – *Свідрыгайла*, які знаходзіл падтрымку Полацкага, Віцебскага,Смаленскага і іншых рускіх княстваў на ўсходняй частцы ВКЛ, і *Жыгімонт*, які княжыў у Вільні і прызнаваўся літоўскімі і каталіцкімі феадаламі Гародні, Жамойці, Бярэсця.

Такмі чынам у 1432 годзе адбыўся раскол ВКЛ на два дзяржаўныя ўтварэнні: - ***Вялікае княства Літоўскае*** на чале з *Жыгімонтам* і

Вялікае княства Рускае на чале са *Свідрыгайла.*

Такое становішча працягвалася 4 гады.

Жыгімонт і Свідрыгайла вялі непрымірымаю барацьбу паміж сабой, у якую аказалася ўцягнута насельніцтва падўласных ім тэрыторый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На працягу 1432 – 1435 гадоў Свідрыгайла з дапамогай Лівонскага ордэна неаднаразова, як пішуць летапісы “Ваяваў Літоўскую землю, шмат бяды нарабіміўшы ёй: паліў гарады (Крэва, Заслаўе, Менск і іншыя), людзей жа шмат пасек і ў палон пабраў”. У снежні 1432 года Свідрыгайла дайшоў да Вільні, але пасярпеў паражэнне ў бітве пад Ашмянамі.

З свайго боку Жыгімонт, каб аслабіць падтрымку Свідрыгайле, імкнуйся прыцягнуць на свой бок праваслаўных феадалаў. У 1432 і 1434 гадах былі выдадзены *Прывілеі*, па якім прадстаўнікі знакамітых княжацкіх родаў і іх баяры ***праваслаўнага*** *веравызнання* ***ўраўноўваліся*** ў некаторых правах з *феадаламі-****каталікамі.*** Гэта было кампрамісам, які павінен быў перадолець варожасць унутры пануючага класа, умацаваць яго адзінства.

Рашаючай у супрацьстаянні Свідрыгайлы і Жыгімонта аказалася ***бітва,*** якая адбылася **1 верасня 1435 года** пад ***Вількамірам,*** у якой, акрамя войскаў падначальных ім княстваў, прымалі ўдзел палякі, каля 6 тысяч татар, больш за сотню рыцыраў-крыжакоў. Сучаснікі пісалі, што бітва пад Вількамірам была большай, чым Грунвальдская. Свідрыгайла пацярпеў поўнае паражэнне, з 25 князёў, якія былі з ім, 13 загінулі, астатнія разам з тысячамі татар трапілі ў палон, загінў інфлянскі магістр Керскорф, а яго ордэн панёс вялікія страты.

Толькі ў 1436 годзе, пасля паражэння войскаў Свідрыгайлы пад Валькамірам, паходаў *войска Жыгімонта на Віцебск і Полацк,* ***спыніла*** свае існаванне *Вялікае княства Рускае,* было адноўлена адзінства дзяржавы. Свідрыгайла вымушан быў бегчы на Валынь.

Але і ўлада Жыгімонта не была трывалай. У сакавіку ***1440 года*** ён быў забіты змоўшчыкамі ў Крэўскім замку.

Пасля гэтага***, 29 чэрвеня 1440 года*** ў Вільні Рада вяльмож ВКЛ, без узгаднення з польскім Каралём Уладзіславам, абрала Вялікім князем ВКЛ яго малодшага брата, 13-ці гадовага **Казіміра.** Яго уладу неўзабаве прызналі амаль усе землі ВКЛ – Жамойць, Віцебскае і Полацкае княствы, украінскія землі. Адзніства ВКЛ было адноўлена.

У 1444 годзе у бітве пад Варнаю згінуў без вестак польскі кароль Уладзіслаў. У такіх умовах, дамагаючыся аднавіць унію Польшчы з ВКЛ польскія паны прапанавалі Казіміру карону польскую. У червені **1447 Казімір** Ягайлавіч прыняў *карону польскага караля*, але адначасова ён *заставаўся і Вялікім княем літоўскім.*

Такім чынам, пры *Казіміры была адноўлена* ***персанальная ўнія*** ВКЛ з Польшчай, аднак ў гэты раз, у адрозненні ад Крэўскай уніі, у ёй не было ні слова аб інкарпарацыі ці падпарадкаванні ВКЛ Польшчы.

ВКЛ захоўвала сваю цэласнасць і самастойнасць, і ВКЛ і Польшча мелі сваю эканоміку, фінансы, армію, заканадаўства, дзяржаўны апарат, вялі самастойна знешнюю палітыку. Адзінства трымалася толькі на персанальным спалучэнні адной асобай (Казімірам) вышэйшых пасад у абодзвюх дзяржавах – *Караля польскага і Вялікага князя Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.*

Гісторыкі лічаць, што абраннем вялікага князя Казіміра на польскі прастол пачаўся ***другі этап саюзных*** адносін ВКЛ з Польшчай. (Першы – ад Крэўскай уніі да смерці Ягайлы у 1434 г.,).

Казімір кіраваў ВКЛ 52 гады (***памер у 1492 годзе***), у тым ліку 47 гадоў ён адначасова быў Каралём польскім.

Перыяд Казіміра – гэта цэлая эпоха ў жыцці ВКЛ, калі нарэшце ў ВКЛ усталявалася пэўнае адзінства, скончыліся ўнутраныя міжусобныя сутычкі. Было

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

забяспечана і міжнароднае існаванне дзяржавы. У 1449 годзе быў заключаны мір з *Маскоўскай дзяржавай,* згодна з якім ВКЛ захавала ўсе свае тэрыторыі на ўсходзе. У выніку вайны *з Ордэнам ў* 1466 годзе было падпісана *Таруньскае пагадненне*, па якім тэўтонцы прызналі сваю васальную залежнасць, а Жамойць канчаткова была ўключана у ВКЛ.

Тэма 3.3 ДЗЯРЖАЎНЫ ЛАД ВКЛ.

План:

1. Адміністрацыйна – тэрытарыяльны падзел Беларусі
2. Улада і кіраванне ў ВКЛ.
3. Судовая і прававая сістэма ВКЛ
4. Эвалюцыя саслоўнай структуры грамадства.

1. Адміністрацыйна – тэрытарыяльны падзел Беларусі

Адміністрацыйна – тэрытарыяльны падзел Беларусі ў XIII – XIV стагоддзях заставаўся ў асноўным у старых межах, якія былі паміж асобнымі княствамі да ўтварэння ВКЛ. Але на працягу далейшых XV – XVI стагоддзяў ў тэрытарыяльным уладкаванні адбываліся пэўныя змены, адпаведныя працэсам умацавання дзяржавы і палітычнай улады.

Асноўнымі найбуйнейшымі адміністрацыйнымі ўтварэннямі з'яўляліся удзельныя **княствы.** Іх на тэрыторыі беларускіх зямель у канцы XIII стагоддзя існавала каля 20-ці. *(Мы іх ужо неаднолькава называлі*). Яны ўяўлялі сабой дробныя ***дзяржаўныя ўтварэнні***, бо князі, што стаялі на чале іх, мелі ўсе правы суверэнных валадароў: распараж*а*ліся *ўнутранымі справамі,* маглі надзяляць *землямі* сваіх васалаў, мелі свае *ўзброеныя сілы,* маглі аб'яўляць *войны і* падпісываць пагадненні, заключаць лыбыя *саюзы*.

Фактычна ***княствы,*** нават пасля ўтварэння ВКЛ, з'яўляліся ***дзяржаўна-палітычнымі адзінкамі,*** з якіх складалася дзяржава.

У гістарычных дакументах, акрамя назваў асобных княстваў, ужываецца таксама тэрмін ***"зямля***" (напрыклад, - Полацкая зямля, Віцебская зямля і інш.). Як правіла, пад такой назвай разумеецца тэрыторыі, якія былі эканамічна, палітычна і культурна звязаны з пэўным цэнтрам княжацкай ўлады і адміністрацыйна яму падпарадкаваны.

Таму, на думку гісторыкаў, абодвы тэрміны – *княства і зямля* – з'яўляюцца ідэнтычнымі.

З канца XIV да першай паловы XVI стагоддзяў частка княстваў пераўтвараюцца ў *наместніцтвы, ваяводствы і паветы*, частка раздрабілася на асобныя маёнткі.

Наместніцтва – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, якая утварылася пасля *скасавання ўдзельных княстваў* і падпарадкавання іх вялікакняжацкай уладзе. Начале наместніцтваў стаялі ***намеснікі*** – прадстаўнікі вялікага князя, якім належала адміністрацыйна-гаспадарчая, фінансавая і судовая ўлада на тэрыторыі былых самастойных княстваў. Канчаткова княствы былі афіцыйна скасаваны падчас адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы 1565- 1566 гадоў.

У пачатку XV стагоддзя з'яўляюцца новыя адміністрацыйныя адзінкі – **ваяводствы.** Яны былі *ваенна-адміністрацыйнымі* акругамі, ў склад якіх уваходзілі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

княствы і наместніцтвы. Першымі былі ўтвораны ***Віленскае і Трокскае ваяводствы.*** У ***Віленскае*** ваяводства ўвайшла тэрыторыя большай часткі заходніх, цэнтральных і ўсходніх зямель Беларусі. Віленскаму ваяводзе ў вайсковых справах падпарадкоўваліся намеснік *наваградскі, а таксама Слуцкае, Клецкае і Мсціслаўскае княства.* У ***Трокскае*** ваяводства ўваходзіла значная частка заходніх і паўднёвых зямель Беларусі*, Кобрынскае і Пінскае княствы, падначальваліся наместнікі берасцейскі, драгічынскі, бельскі.* Астатняя тэрыторыя Беларусі ў ХУ стагоддзі ў склад ваяводстваў не ўваходзіла

У пачатку XVI стагоддзя у ВКЛ былі праведзены адміністрацыйна-тэрытарыяльныя рэформы. Полацкая зхямля была пераўтворана ў *Полацкае ваяводства,* са складу Віленскага ваяводства была вылучана *Новагародскае* ваяводства. У сярэдзіне XVI стагоддзя ў ВКЛ было **13 ваяводстваў**, у тым ліку акрамя ўжо названых – *Берасцейскае, Мсціслаўскае, Мінскае* і іншыя. У выніку далейшых змен колькасць ваяводстваў ў ВКЛ была зменьшана **да 9-ці.**

Адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі ўнутры княстваў ў XIII – XIV стагоддзях былі **воласці.** Яны былі звязаны з сельскімі абшчынамі, на тэрыторыі якіх ажыццяўлялася кіраванне шэрагам сельскіх пасяленняў. Воласць звычайна ахоплівала 10 – 30 і больш сельскіх паселішчаў і складалася з тэрыторыі сельскіх абшчын сялян-даннікаў, якія былі яшчэ свабоднымі, працавалі на дзяржаўнай зямлі. У крыніцах перыяду ВКЛ іх паселішчы называюць *сёламі.*

Воласць мела двайную сістэму кіравання. З сялян для кіравання выбіраўся ***соцкі*** (у 15 – 16 стагоддзях – *старац*), які пры дапамозе ***дзесяцкіх*** размяркоўваў паміж сялянамі павіннасці, збіраў падаткі, выступаў пасрэднікам паміж насельніцтвам воласці і ўладай. Інтарэсы дзяржавы ў воласці прадстаўляў намеснік – "***цівун***". Знаходзіўся ён у валасным цэнтры, якім з'яўляўся горад ці замак. У абавязкі цівуна уваходзілі прыём падаткаў ад старца (***цівун*** *не меў права сам вольна ездзіць па воласці з мэтай збору падаткаў*), перасылка іх дзяржаве ці ўладальніку воласці, арганізацыя будаўніцтва і рамонту замка, дарог, суд па справах, якія не падлягалі кампетэнцыі абшчыннага, *копнага* суда.

З канца XIV стагоддзя пачалося *разбурэнне воласцей* як аб'яднанняў сялян на дзяржаўнай зямлі. Асобныя сёлы (і зямля і насельніцтва) са складу воласці вялікімі князямі перадаваліся ў вотчыну (маёмасную ўласнасць) шляхце. Там узнікаюць феадальныя двары, а сяляне-даннікі пераўтвараюцца ў *цяглых* сялян.

У шэрагу выпадкаў воласці ўяўлялі сабой асобныя, даволі буйныя часткі княстваў, якія належалі не дзяржаве, а адной асобе, як правіла з прадстаўнікоў княжэцкіх дынастый. Адначасова пашыраліся правы цівуноў, якія маглі самі збіраць падаткі, а таксама страчвалася права сялян выбіраць старцаў.

У гістарычных дакументах, а таксама ў літаратуры сустракаецца і такая адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, як "**павет**". Гэты тэрмін польскага паходжання пачаў ужываацца на Беларусі з XV стагоддзя як сінонім тэрміна *воласць.* У першай палове XVI стагоддзя пад *паветам* звычайна разумелі буйную *воласць,* цэнтрам якой быў горад або замак, што належыў дзяржаве. Часам пад паветам разумелі толькі тэрыторыю, падкантрольную *намесніку* – у такім выпадку павет быў *сінонімам наместніцтва.*

Афіцыйна статус **павета і іх межы на тэрыторыі ВКЛ** былі зацверджаны ў вынікум адміністрацыйна-тэрытіарыяльнай рэформы ***1565 – 1566 гадоў***. Па ёй *паветы* ўваходзілі ў склад *ваяводстваў* як асноўная адміністрацыйная адзінка. Тыя ж

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

наместніцтвы і воласці, што не атрымалі статус павета, ўваходзілі ў іх склад (склад павета) у якасці маёнткаў.

Канчаткова адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі склаўся ў выніку рэформы ***1565 – 1566 гадоў***. Паводле яе на тэрыторыі Беларусі былі:

1. - Берасцейскае ваяводства (у складзе Берасцейскага і Пінскага павета)
2.- Віленскае ваяводства (Ашмянскі, Браслаўскі, Віленскі і Лідскі паветы)
3. - Віцебскае ваяводства (Аршанскі і Віцебскі паветы)
4. - Менскае ваяводства (Менскі, Рэчецкі і Мазырскі паветы)
5. - Мсціслаўскае ваяводства (без паветаў)
6. - Новагародскае ваяводства (Ваўкавыскі, Новагародскі і Слонімскі паветы)
7. - Полацкае ваяводства (без паветаў)
8. - Трокскае ваяводства (Гарадзенскі павет)

*Такім чынам, тэрыторыя Беларусі з другой паловы XVI стагоддзя ўваходзіла ў склад **8 ваяводстваў** і падзялялася на **15 паветаў.** (у некаторых выданнях называецца: 6 ваяводстваў і 14 паветаў. 6 ваяводстваў чыста беларускіх, але некаторыя беларускія тэрыторыі ўваходзілі ў склад яшчэ 2-х ваяводстваў – Віленскага і Трокскага. Таму правільна казаць – тэрыторыя Беларусі ўваходзіла ў склад 8-мі ваяводстваў).*

2. Улада і кіраванне ў ВКЛ.

Арганізацыя кіравання і ўлады на беларускіх землях у складзе ВКЛ на працягу ад XIII да сярэдзіны XVI стагоддзяў прайшла пэўны шлях эвалюцыі, змянялася ў залежнасці ад развіцця дзяржавы, працэсаў у сацыяльных адносінах унутры грамадства. Таму пастаўленае пытанне патрэбна разглядаць у дынаміцы, вызначаючы змены, што адбываліся ў сферы дзяржаўнага кіравання на працягу існавання ВКЛ.

Першапачаткова, у XIII – XIV стагоддзях арганізацыя кіравання і улады цалкам адпавядала сістэме, створанай яшчэ ў часы феадальнай раздробленасці, шмат у чым захоўвала яе.

З самага пачатку палітычны лад ВКЛ складваўся як **абмежаваная феадальная манархія.**

Гаспадаром, вышэйшай дзяржаўнай асабай, кіраўніком дзяржавы з'яўляўся ***Вялікі князь***. Яму былі падпачалены князі, магнаты, што валодалі асобнымі княствамі, землямі, вочынамі. Вялікі князь меў шырокія паўнамоцтвы: камандваў узброенымі сіламі; выдаваў заканадаўчыя акты; кіраваў фінансава-гаспадарчай дзейнасцю;вёў міжнародныя справы – меў права абвяшчаць вайну, заключаць мір,уступаць ў саюзы; мог распаражацца дзяржаўнай маёмасцю і скарбамі – дараваць дзяржаўную маёмасць, тытулы і званні, прызначаць на дзяржаўныя пасады; ажыццяўляў вышэйшы суд і памілаванне.

Яму належала заканадаўчая ініцыятыва, усе асноўныя законы і прававыя акты выдаваліся за яго подпісам.

Роля Вялікага князя ўзрастала яшчэ і таму, што ён з'яўляўся буйным землеўласнікам – яму належалі не толькі асабістыя земельныя ўладанні, але ён распаражаўся таксама і ўсімі дзяржаўнымі землямі.

Аднак асаблівасцю дзяржаўнага ладу ВКЛ, было тое, што ўлада Вялікага князя ад самага пачатку ***не была абсалютнай***, яна была абмежавана ***шэрагам фактараў.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У XIII – XIV стагоддзях захоўваліся значныя правы ***ўдзельных князёў,*** якія пры утварэнні ВКЛ прызналі сябе васаламі (падначальнымі) Вялікага князя, але з'яўляліся сапраўднымі *гаспадарамі ў сваіх вотчынах.* Яны мелі ўсе ўласныя прэрагатывы : судовыя, вайсковыя, гаспадарчыя, фінансавыя. Вялікі князь усе дзяржаўныя пытанні быў вымушаны вырашаць разам з васальнымі князямі. Да і сама пасада Вялікага князя фактычна была *выбарнай,* паколькі ў абранні той ці іншай асобы на вялікакняжэцкі прэстол удзельнічалі прадстаўнікі феадальнай знаці. Акрамя таго, кожны новы Вялікі князь ВКЛ, нават калі ён станавіўся адначасова і Каралём Польшчы, даваў клятвы і абяцанні захоўваці пэўныя права і прывілеі, што меліся ў мясцовых князеў і цалкам ў ВКЛ.

Такое становішча не магло задаволіць тых вялікіх князжеў, якія імкнуліся да ўзмацнення і цэнтралізацыі дзяржавы, умацавання вялікакняжацкаў улады. Таму пры Вітаўце, у 1393 – 1395 гг. (у 90-х гадах XIV стагоддзя) буйныя ўдзельныя *княствы былі ліквідаваны*, а замест іх было ўводзена *наместніцтва*, аб чым мы ўжо казалі. Сутнасць была ў тым, што наместніцкая пасада была прызначальнай вялікім князем (а не спадчыннай, як княжацкая), цалкам залежнай і адказнай перад ім, а таму намеснікі былі асабіста больш адданымі Вялікаму князю.

Аднак нават у пачатку XVI стагоддзя ў складзе ВКЛ захоўвалася фактычна *аўтаномнае становішча* дзвух буйных тэрыторыяльных адзінак на тэрыторыі Беларусі – Полацкай і Віцебскай земляў. Пачынаючы ад Вітаўта, ўсе вялікія князі выдавалі і падцвярджалі ***Прывілеі д***ля гэтых зямель (земскія прывілеі). Яны фіксавалі *асобныя правы,* што мелі ў грамадска-палітычным і гаспадарчым жыцці названыя тэрыторыі ў параўнанні з іншымі часткамі ВКЛ. Напрыклад, намеснік (затым і ваявода) ў Полацкай і Віцебскай землях прызначаўся Вялікім князем толькі са згоды мясцовых баяр і мяшчан. Судовая улада намесніка і ваяводы была абмежавана абавязковай прысутнасцю таксама прадстаўнікоў мясцовага баярства і мяшчан. Пытанні мясцовага кіравання, у тым ліку *абранне службовых асоб толькі з мясцовых прадстаўнікоў,* выкананне вайсковай службы, гаспадарчыя гарадскія справы і інш. таксама былі ў распараджэнні мясцовых феадалаў.

Найбольш значнай сілай, што абмяжоўвала ўладу Вялікага князя, у XV – XVI стагоддзях у ВКЛ былі **Сойм і Рада ВКЛ,** існаванне і функцыі якіх былі замацаваны ў граматах 1447, 1497, 1506 гадоў і ў Статутах ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гадоў.

Сойм ВКЛ - гэта саслоўна-прадстаўнічы орган, які мае свае карані і вырас з мясцовых ***Веча.*** У выніку фарміравання шляхецкага саслоўя (феадалаў, уласнікаў зямлі) узрастала іх роля ў вырашэнні агульнадзяржаўных спраў і выкананні прынятых рашэнняў. *Без падтрымкі з боку феадалаў, без апоры на іх не магла нармальна функцыяніраваць* ні вышэйшая ўлада, ні сама дзяржава. Прадстаўнічым органам менавіта шляхецкага саслоўя і былі ***Соймы*** (па-польску – сеймы, бел.аналаг – сходы).

Спачатку ў ***агульных, агульнадзяржаўных*** **(т. зв. вальных)** соймах ВКЛ маглі ўдзельнічаць усе жадаючыя шляхцічы, з пачатку XVI стагоддзя – па 2 дэпутата ад кожнага павета, абраных на павятовых соймiках. На соймы, акрамя таго, запрашаліся *вярхі* каталіцкага і праваслаўнага *духавенства, службовыя асобы* цэнтральных і некаторых мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання, знатныя *князі і паны.*

Збіраліся агульнадзяржаўныя (вальныя) соймы не регулярна, а па меры патрэбы. Ініцыятарам іх правядзення мог быць Вялікі князь, які прымаў рашэнне пра скліканне Сойма і яго склад. У выключных выпадках ініцыятыва правядзення Сойма магла зыходзіць і ад паноў-рады. Гісторыкі лічаць, што да ліку *першых агульнадзяржаўных,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГПУ

вальных соймаў можна аднесці Віленскі сойм 1401 года, Віцебскі 1433 года, Віленскі 1436 года.

Кампетэнцыя вальнага Сойма не была дакладна вызначана ці абмежавана.

Але былі пытанні, якія маглі быць вырашаны *выключна* на вальных сеймах: выбары Вялікага князя, абвяшчэнне вайны, заключэнне міру, заключэнне пагадненняў з суседнімі дзяржавамі і уніі з Польшчай, устанаўленне павіннасцей і падаткаў са шляхты на ваенныя патрэбы, разгляд крымінальных спраў па абвінавачванню паноў у дзяржаўнай здрадзе і інш.

Маглі вырашацца і іншыя любыя пытанні, што прапаноўваліся ці Вялікім князем, ці панамі-радай. На Сойме вялікі князь выдаваў найбольш значныя заканадаўчыя акты і разглядаў значныя судовыя справы. Паводле Прывілеяў 1447 і 1492 гадоў вялікі князь не меў права самастойна вырашаць найбольш значныя пытанні знешняй і унутранай палітыкі без згоды князёў і магнатаў. Прадстаўнікі ад зямель – удзельнікі Сойму маглі падаваць просьбы і скаргі, адказы на якія даваў гаспадар.

У “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” (Т.6, кніга І.) у артыкуле “Сойм” (с.375 – 382) даецца пералік Соймаў ВКЛ, што адбыліся з 1440 па 1568 год з назвай месяца, года, месца правядзеннея і абраных на іх вялікіх князёў. Усяго названа 63 Сойма ВКЛ.

Фактычна Соймы з’яўляліся сваеасаблівым саслоўным ***парламентам,*** які абмяжоўваў асабістую ўладу манарха у ВКЛ.

Вышэйшым ***дзяржаўным*** (не прадстаўнічым, а *дзяржаўным*) органам у ВКЛ была **Рада** Вялікага княства літоўскага. Існае таксама яе назва як ***паны-рада.*** Узнік такі орган як *дапаможны* пры вялікім князе з яго бліжайшага асяродзя, з якім ён раіўся пры прыняцці важнейшых рашэнняў. Але паступова, да XV стагоддзя Рада набыла большую самастойнасць. Яна стала пастаянна дзеючым *выканаўча-распарадчым, заканадаўчым, кантралюючым і судовым органам.* Складалася Рада ВКЛ з вышэйшых *дзяржаўных службовых асоб,* каталіцкіх *епіскапаў,* а таксама ў яе склад уваходзілі па асабістых запрашэннях вялікага князя і некаторыя князі і найбуйнейшыя феадалы. У першай палове – сярэдзіне XVI стагоддзя Рада ВКЛ складалася з *45 – 65 асоб.*

Кампетэнцыя Рады была фактычна той жа, што і Сойма (некаторыя даследчыкі нават лічаць Сойм і Раду сінонімамі). Рада магла абіраць Вялікага князя, вырашаць пытанні абароны дзяржавы, міжнародных зносін, прызначэння на вышэйшыя дзяржаўныя пасады, рыхтаваць важнейшыя заканадаўчыя акты, вырашаць судовыя справы. Для вырашэння гэтых пытанняў Рада збіралася на свае паседжанні і магла *сумесна з Вялікім князем прымаць* рашэнні. Але каб заручыцца падтрымкай усяго шляхецкага саслоўя ў найважнейшых справах Рада магла ***выносіць*** *абмяркаванне і прыняцце рашэнняў на разгляд* ***Сойма.***

У XV стагоддзі Ў ВКЛ існавала развітая ***сістэма дзяржаўнага кіравання***. Важнейшымі дзяржаўнымі *пасадамі* ў ВКЛ былі:

Ваявода – кіраўнік мясцовай *адміністрацыі* ў ваяводстве (аб яго функцыях мы казалі, усяго было 8 ваяводстваў) . Абавязкова засядаў у Радзе ВКЛ.

Каштaлян – у службовай іерархіі займаў другое месца пасля ваяводы. Першапачаткова каштaлян *загадваў замкам* і меў некаторыя судовыя функцыі. Пасада каштaляна ўзнікла у Польшчы, з 1413 года ўведзена у ВКЛ у Вільні і Троках, а потым і ў іншых ваяводскіх гарадах. Уваходзіл у Раду ВКЛ.

Маршалак *земскі* – найвышэйшы шраднік ВКЛ. Кіраваў дваром вялікага князя, прымаў замежных паслоў, вышэйшых дзяржаўных асоб. Назіраў за этыкетам, загадваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прыдворнаю стражаю, сачыў за бяспекаю манарха, прызначаў дваран, кіраваў *вальным сеймам.*

Былі таксама ***Маршалкі:*** *гаспадарскі* (кіраваў прыдворнымі службамі), *павятовы* (кіраваў шяхтай у павеце,склікаў і вёў мясцовы павятовы соймік), *дворны* (загадваў гаспадарчымі справамі вялікакняжацкага двара, кіраваў маршалкамі гаспадарчымі, фактычна быў намеснікам Маршалка земскага), а таксама маршалкі *сеймавы, трыбунальскі, дворскі.* Маршалкі ***земскі і дворны*** уваходзілі ў склад Рады ВКЛ.

Канцлер –начальнік канцылярыі вялікага князя і Рады, трымальнік дзяржаўнай пячаткі. Прызначаўся пажыццёва з феадальнай знаці. Дакладваў вялікаму князю і Радзе пра дзяржаўныя справы, рэдагаваў статуты і рашэнні, замацоўваў афіцыйныя дакументы пячаткаў і падпісваў іх, захоўваў копіі дзяржаўных дакументаў. Лічыўся другім пасля маршалка міністрам. Уваходзіл у склад Рады. Тыя ж паўнамоцтвы меў і ***падканцлер*** (намеснік канцлера), які кіраваў працай пісараў і сакратароў у канцылярыі ВКЛ, быў захавальнікам малай дзяржаўнай пячаткі, дзяржаўных архіўных актаў, уваходзіл у склад Рады ВКЛ.

Гетман – галоўны начальнік над *узброенымі сіламі* дзяржавы ў ВКЛ, прызначаўся вялікім князем для непасрэднага кіраўніцтва вайсковымі справамі. Уваходзіл у склад Рады ВКЛ.

Падскарбі земскі – захоўваў скарб (казну) ВКЛ, выконваў фінансавыя, гаспадарчыя, судовыя і дыпламатычныя даручэнні Вялікага князя і Рады ВКЛ, уваходзіл у яе склад.

Староста – службовая асоба, якая кіравала адміністратыўнай акругай – паветам, ажыццяўляў у ёй поўную дзяржаўную і судовую ўладу. Некаторыя старосты (гарадзенскі, жмуцкі, луцкі і інш.) уваходзілі ў склад Рады ВКЛ.

Акрамя пералічаных, ніжэйшымі дзяржаўнымі пасадамі былі: - ***падваявода*** (намеснік ваяводы), - ***ключнік, цівун (*** загадвалі зборам даніны, вялі гаспадарчы улік маёмасці у ваяводстве, - ***гараднічы*** (камендант замка), - ***падстараста (*** намеснікі старасты),- ***харунжы***(вёў улік ваеннаабавязаных людзей у павеце і збіраў апалчэнне), - ***дзяржаўца*** (ажыццяўляў нагляд за дзяржаўнай маёмасцю і кіравалі ёй у воласці).

Пры дзяржаўных пасадах, перш за ўсё ваяводах, намесніках, а таксама і ў феадальных уладаннях, існаваў і пэўны апарат *служачых-памагатых*. Гістарычныя дакументы згадваюць такія з іх, *як ключнік* (загадваў харчовымі запасамі ва ўладаннях), *канюшы, гараднічы* (арганізоўваў будаўнічыя работы у гарадах і на абарончых аб'ектах), *гаёўнік* (даглядаў бортныя дрэвы), *ляснічы, сакольнічы* і інш.

На вышэйпералічаныя пасады асобы прызначаліся намеснікам ці князем прадстаўнікі з дробнафеадальнага ці служылага ассяродзя.

Што датычыцца *мясцовага кіравання на узроўні валасцей,* то тут асноўныя функцыі выконвалі ***цівуны,*** *у* абавязкі якіх уваходзіла разнастайная *адміністрацыйна-гаспадарчая, фінансавая і судовая* дзейнасць.

Ніжэйшым звяном мясцовай ўлады зў'яўлялася *вясковая адміністрацыя.* Існавалі пасады ***прыстава, сотніка, сарочніка, дзесятніка, старца.*** У іх функцыі ўваходзіла размеркаванне і збор даніны і чыншу з сялян, назіранне за працай сялян у панскай гаспадарцы. Такія пасады займалі людзі, як правіла, з мясцовага сялянскага ассяродзя, доўгі час іх нават выбіралі самі сяляне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такія ж пасады – сотнікі, дзесятнікі і інш., а таксама веча, былі хзарактэрны і для ***гарадскога самакіравання*** ў “дамагдэбургскі” перыяд. На чале гарадской ўлады стаяў ***войт,*** якога прызначаў урад ВКЛ з феадалаў ці мяшчан. Дарадчым органам пры войце была *гарадская рада, я*кая складалася з з 6-ці *радцаў* у мястэчках і да 20-ці *радцаў* у вялікіх гарадах. Войт сумесна з радаю выбіралі 2 або 4-х *бурмістраў,* якія наглядалі за парадкам у горадзе і вырашалі ўсе бягучаі гарадскія справы.

Такімі былі асноўныя органы ўлады і кіравання ВКЛ, што канчаткова склаліся да XV стагоддзя. Дзяржаўны лад ВКЛ таго часу можна назваць ***феадальнай саслоўнай манархіяй***, пры якім улада Вялікага князя спалучалася з шырокімі правамі феадальнай знаці.

3. Судовая і прававая сістэма ВКЛ

Судовая сістэма у ВКЛ з’яўлялася важнай часткай дзяржаўнага і грамадскага жыцця, да XV стагоддзя набыла завершаны і рэгламентаваны выгляд, адлюстроўвала грамадска-палітычны лад дзяржавы.

Судовы лад ВКЛ уключаў 2 сістэмы судоў – ***агульныя*** і ***саслоўныя.***

Агульнымі судамі, у якіх разглядаліся правы розных груп насельніцтва, былі ***гаспадарскі*** (або вялікакняжацкі) і ***гродскі (***або замкавы) суды. Зауважым, што звяртацца у такія суды маглі толькі свабодныя людзі, колькасць якіх пастаянна скарачалася.

Самым высокім судовым органам для ўсяго насельніцтва ВКЛ быў ***гаспадарскі,*** або ***Вялікакняжацкі суд, які*** складаўся з гасудара і паноў-рады. Да сярэдзіны XVI-га стагоддзя кожны вольны чалавек ВКЛ мог звярнуцца з сваёй скаргай да гасудара і яго справа павінна была разгледзена. Пазней быў устаноўлены парадак, што спачатку неабходна было разглядаць справу ў мясцовым судзе першай інстанцыі, а толькі потым звяртацца ў гаспадарскі суд. Паступова даступнасць гаспадарскага суда для большасці вольнага насельніцтва скарачалася. У ім разглядаліся толькі некаторыя, найбольш значныя судовыя справы, што закраналі інтарэсы дзяржавы ці самаго гаспарара.

З 1582 года пачаў дзейнічаць *Трыбунал Вялікага княства Літоўскага* (*Галоўны суд*), які з’яўляўся вышэйшым апеляцыйным судом ВКЛ. Трыбунал замяніў гаспадарскі суд па разгляду большасці апеляцый, быў канчатковай інстанцыяй.

Найбольш старажытным *агульным* судом быў ***гродскі, або замкавы суд***. Гэта быў павятовы суд для шляхты, мяшчан і сялян. Гродскі, замкавы суд меў дзве інстанцыі - вышэйшую і ніжэйшыю. *Вышэйшы гродскі суд* складаўся з ваяводы або старосты ці дзяржаўцы, а таксама галоўнага суддзі і прадстаўніка феадалаў ці гараднічага. Гэты суд разглядаў справы пра найбольш цяжкія крымінальныя злачынствы, а таксама цывільныя справы, апеляцыйныя скаргі. *Ніжэйшы гродскі суд* складаўся з 3-х чалавек – намесніка ваяводы ці іншай дзяржаўнай асобы, намесніка галоўнага судзі і пісара. Гэта быў суд першай інстанцыі, якому была падсудна большасць крымінальных спраў. Суды таксама сведчылі здзелкі, копіі дакументаў, вялі актавыя кнігі.

Судовая сістэма ВКЛ мела і **саслоўныя суды,** юрысдыкцыі якіх распаўсюджваліся толькі пэўныя групы насельніцтва.

Судамі першай інстанцыі для **шляхты** былі ***земскі суд*** і ***падкаморскі*** суд.

Земскі суд – павятовы *шляхецкі* суд, які разглядаў крымінальныя і грамадзянскія справы якія датычыліся *шляхты*, выконваў натарыяльныя акты, сведчыў дагаворы

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

куплі-продажу маёнткаў, завяряў завяшчанніі г.д. Складаўся з суддзі, падсудка і пісара, якія прызначаліся ўрадам з кандыдатаў, абраных шляхтаю на павятовых сеймiках. Шляхцыч меў права асабістай *недатыкальнасці,* ён не мог быць арыштаваны і пакараны без рэчавых доказаў яго віны, а судзіць яго маглі толькі роўныя яму, г.зн. шляхецкі суд.

Падкаморскі суд - разглядаў спраы па спрэчках аб межах маёнткаў і зямель паміж землеўладальнікамі, шляхтай. Фактычна гэта быў судова-арбітражны орган у межах павета, які складаўся з аднаго суддзі – *падкаморнага,* што меў 1-2 памочнікаў – каморнікаў, пісара. Па выніках разгляду зямельных спраў выдаваўся “гранічны ліст”, які замацоўваў межы землеўладання.

Крымінальныя і цывільныя справы **мяшчан** (гарадскога насельніцтва) разглядалі ***войтаўска-лаўніцкія*** і ***бурмістраўскія*** суды.

Войтаўска-лаўніцкі суд – гэта мясцовы суд у гарадах ВКЛ, які разглядаў найбольш значныя справы ў дачыненні да мяшчан. Дзейнічаў у гарадах, якія атрымалі магдэбурскае права, але таксама і ў прыватнаўласніцкіх гарадах. *Войт*, які узначальваў адміністрацыю горада, меў таксама судовыя функцыі. Ён, альбо яго намеснік лентвойт, з удзелам лаўнікоў разглядаў крымінальныя , грамадзянскія, маёмасныя і іншыя спраы, выносіў прысуды.

Адначасова ў гарадах, што мелі магдэбурскае права, дзейнічалі ***бурмістраўска-радецкія суды.*** У яго склад уваходзілі гарадскі *бурмістр і радцы* (*фактычна – прысяжныя суда)*, колькасць якіх залежала ад памераў горада. Суд разглядаў пераважна нязначныя правапарушэнні мяшчан, маёмасныя цяжбы купцоў і рамеснікаў.

Судовая сістэма, якая датычылася **сялян,** прадуглежвала існаванне ***копных судоў*** *(копа-* грамада), якія разлядалі справы, што датычыліся свабодных сялян, а таксама паноў і шляхты, калі яны выступалі ісцамі да сялян. Суддзямі копных судоў з’яўляліся абраныя самімі сялянамі *копныя мужы* ці *копныя старцы,* колькасць якіх склада падчас 10 – 20 і болей чалавек. Пастановы копных судоў абскарджанню не падлягалі і адразу выконваліся.

Аднак копны суд не меў дачынення да тых сялян, якія знаходзіліся у *феадальнай залежнасць.* У адносінах да іх існаваў ***суд феадала***, які для паднявольных сялян з’яўляўся апошняй інстанцыяй і вяршыў суд па свайму жаданню.

Такім чынам, судовая сістэма ВКЛ адпавядала працэсам умацавання феадальных адносін у грамадстве, спалучала, з аднаго боку – агульнасць судоў да грамадзян свабодных саслоўяў, а з другога боку – непадсуднасць звычайным судам прывелігіраванага саслоўя – шляхты, замацавання яе права судзіць феадальна-залежных сялян.

Прававая сістэма ВКЛ XV – XVI стагоддзяў склалася на аснове мясцовых традыцый, т.зв. “звычаёвага права”, атрымала развіццё і замацаванне ў прававых актах дзяржаўных і судовых установ.

Да сярэдзіны XV стагоддзя ўсе бакі жыццяя грамадства вызначаліся ***Звычаёвым правам*** – сістэмай *непісаных прававых нормаў*, якія заснаваны былі на *агульнапрынятасці, звычаях* (*так было здаўна, так прыята*), што існавалі ў грамадскіх адносінах. Звычаёвае права, што склалася і мела свае асаблівасці ў розных землях, вызначалася кансерватызмам, нязменнасцю. Яго нормы пільна абярагаліся, нават, Вялікія князі пры уваходжанні на прастол вымушаны былі даваць абяцанні не парушаць старажытныя звычаі і не уводзіць новых парадкаў. Аднак з узмацненнем цэнтралізацыі ВКЛ, выкараненнем сепаратызму асобных княстваў і зямель, *непісанае*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Звычаёвае права паступова заступае месца аформленым у адпаведных дакументах нормам грамадскага жыцця, уніфікаваным у межах адзінай дзяржавы.

Першы *пісаны* ***кодэкс*** крымінальнага і працэсуальнага права ВКЛ быў прыняты вялікім князем Казімірам на сойме 1486 года і атрымаў назву ***"Судзебнік 1468 года".*** Складзены ён быў на аснове *мясцовага звычаёвага права і судова-адміністратыўнай практыкі* ў ВКЛ таго часу, складаўся з 25 артыкулаў. Статут замацаваў і устанавіў адзіныя для ўсёй дзяржавы віды пакаранняў за злачынствы супраць феадальнай ўласнасці і прыватнай асобы. Умацаванне феадальнага прыгнёту і пазбаўленне залежных сялян права свабоднага адыходу ад феадала было замацавана у 24-м артыкуле, які прадуглежваў суровае пакаранне асоб, што садзейнічалі уцёку челядзі нявольнай і феадальна залежных сялян. (*Аб Судзебніку 1468 г. гл.: Энцыклапедыю гісторыі Беларусі. Т.6. Кн.І, с. 441*).

Важнейшыя нормы жыцця ВКЛ былі аформлены ў выглядзе агульна-земскіх (агульных для усіх зямель дзяржавы), абласных, гарадскіх, валасных і іншых граматах, т.зв. **Прывілеях** (privos – асаблівы + lex - закон). Фактычна гэта былі першыя пісаныя прававыя акты, дзяржаўныя дакументы.

Навукоўцы- прававеды падзяляюць Прывілеі на *ільготныя, даравальныя і ахоўныя.*

У ***агульназемскіх Прывілеях*** Вялікія князі падцвярджалі ці устанаўлівалі *асаблівыя правы* пануючага класа, саслоўя, пэўных сацыяльныхбо этнічна-рэлігійных груп, асоб.

Першы земскі Прывілей быў выдадзены вялікім князем Ягайла ў **1387** годзе. Ён устанаўліваў *ільготы д*ля феадалам за пераход у *каталіцкую веру* і вызваляў каталіцкае духавенства і іх маёнткі ад усіх дзяржаўных падаткаў.

Прывілей 1388 года, выдадзены Вітаўтам, устанаўліваў правы статус *яўрэяў,* што пачалі актыўна сяліцца ў гарадах заходняй часткі ВКЛ.

Найбольш вядомы таксама:

Гарадзельскі Прывілей 1413 года (пашыраў правы феадалаў – каталікоў і абмяжоўваў правы праваслаўных феадалаў),

Гродненскі Прывілей 1432 года (*ураўноўваў* у правах феадалаў праваслаўных ікаталікоў),

Прывілей 1447 года, які замацаваў правы феадалаў, паклаў пачатак юрыдычнай замацаванасці *феадальнай залежнасці сялян,*

Прывілей 1492 года, які меў характар феадальнай *канстытуцыі* ВКЛ, замацаваў асновы дзяржаўнага і грамадскага ладу, пануючае становішча баяр і паноў. *(Аб гэтых і іншых Прывілеях гл.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 5. сс. 579 – 581).*

Вышэйшай формай заканадаўства ВКЛ з'яўляліся ***Статуты Вялікага княства Літоўскага.*** Усяго было прыняты 3 Статута ВКЛ – ***1529, 1566 і 1588 гадоў.*** Яны былі *першымі ў* Еўропе *зводамі законаў,* выдадзены на аснове мясцовага права.

Першы Статут ВКЛ быў прыняты у ***1529 годзе.*** Складзены ён быў на аснове кадыфікацыі і сістэматызацыі норм *мясцовага*, звычаёвага права, прынятых раней *пастаноў* судовых і дзяржаўных органаў, *судзебніка* 1468 года, *прывілеяў*. Тэкст Статута ўтрымлівае 13 раздзелаў і 244 артыкулы, якія датычыліся усіх бакоў дзяржаўнага і грамадскага ладу. Напрыклад , у 1-3 раздзелах змешчаны ўсе асноўныя нормы дзяржаўнага права, у 4 і 5 раздзелах – сямейна-шлюбнае права, у 8-м – зямельнае права, у 10-м – цывільнае права і г.д. *(Падрабязнее гл.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 6., кн.І, сс. 414 – 415.).*

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Другі звод законаў феадальнага права – ***Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года.,*** складаўся з 14 раздзелаў і меў 367 артыкулаў. Складзены ён быў на аснове папярэдняга Статута 1529 года, дапоўненага нормамі, замацаванымі ў агульназемскіх і абласных Прывілеях, а таксама нормамі царкоўнага права. У ім больш выразна знайшлі адлюстраванее такія нормы *феадальнага п*рава, як стварэнне *льгот і пераваг для класа феадалаў* і саслоўя шляхты, *недапушчэнне простых* людзей ў органы кіравання, замацаванне *прававой няроўнасці* розных сацыяльных груп насельніцтва. *(Гл.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.6. кн.І. сс. 415 – 416.).*

Найбольш дасканалым у кадыфікацыі права ў ВКЛ быў ***Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 года.*** Складаўся з 14 раздзелаў і 488 артыкулаў. Гісторыкі-прававеды лічаць, што ён абагульніў тагачасную судовую апрактыку і дзяржаўна-прававыя ідэі, некаторыя з якіх нават апярэджвалі свой час. У Статуце знайшло ў першыню адлюстраванне і замацаванне ***падзелу ўлад*** на *заканадаўчую* (сойм), *выканаўчую* (вялікі князь, дзяоржаўная адміністрацыя) і *судовую* (Трыбунал ВКЛ, земскія і падкаморныя суды, выбарныя і незалежныя ад адміністрацыі). У ім знайшлі адлюстраванні ідэі *Рэфармацыі і верацярпімасці, гуманізму*. Напрыклад, гарантаваліся маёмасныя і асабістыя правы мяшчан, права кожнага вольнага чалавека выехаць за мяжу, калі гэта рабілася не на шкоду сваёй краіне. У той жа час, Статут яскрава абараняў інтарэсы *феадалаў,* ўзмацняў іх *прывілеяванае* становішча, *канчаткова запрыгоніў сялянства*. *(Гл.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.6. Кн.І. сс.416 – 417).*

Статуты Вялікага княства Літоўскага з'яўляюцца найбольш каштоўнай *гістарычнай крыніцай* па вывучэнню дзяржаўнага і грамадскага ладу Беларусі перяда ВКЛ. У 1989 годзе выдавецтвам "Беларуская энцыклапедыя" падрыхтавана і выдадзена комплекснае выданее ***"Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г.".*** Названае выданне уключае: - *арыгінальны тэкст* Статута (факсімільнае ўзнаўленне), яго адаптаваны тэкст і пераклад на рускую мову; - *нарыс* "Сацыяльна-гістарычныя ўмовы ўзнікнення Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 года"; - *энцыклапедычны даведнік* з 820-ці артыкулаў пра адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел ВКЛ, катэгорыі насельніцтва, саслоўі, службовыя пасады і асобы, грашовую сістэму і інш.; - *каментарыі* да артыкулаў Статута, якія раскрываюць іх прававую сутнасць.

Выданне было прысвечана 400-годдзю Статута і з'яўляецца першай ў Беларусі яго поўнай публікацыяй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма 4.1. СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА Ў XIV – XVI стагоддзях.

План.

1. Землеуладанне ў ВКЛ.
2. Станаўленне фальваркава-паншчынай сістэмы.
3. Становішча сялянства
4. Сялянская гаспадарка.

1. Землеўладанне ў ВКЛ.

У сярэднявеччы асновай жыцця грамадства была сельская гаспадарка. Зямля была галоўнай каштоўнасцью дзяржавы і асобнага чалавека. Менавіта ад зямлі, працы на ёй залежалі дабрабыт як дзяржавы, так і кожнага члена грамадства. Усталяванне феадальных адносін у грамадстве прывяло да замацавання зямлі ў асабістую ўласнасць. Менавіта ад валодання зямлёй, вялічыной зямельнай уласнасці вызначаўся сацыяльны статус чалавека. Людзі, якія валодалі зямлёй, феадалы – з'яўляліся асноўным кіруючым класам, складалі прывілеяваную, пануючыую частку грамадства. Усе астатнія, тыя, хто працаваў на чужой зямлі, знаходзіліся ў падпарадкаваным, падначальным стане, былі феадальна-залежнымі.

У ВКЛ перыяда XIV – XV стагоддзяў землеўладанне падзялялася на:

1. ***дзяржаўнае,***
2. ***прыватнае*** (памешчыкаў, сялян, купцоў),
3. ***сялянскае надзельнае*** (абшчыннае, падворнае),
4. ***царкоўнае.***

Развіццё феадальных адносін, эканамічнае і палітычнае ўзмацненне класа феадалаў прывялі да таго, што *сялянства пазбавілася права валодаць* зямлёй, яна стала манапольнай ўласнасцю дзяржавы, свецкіх і духоўных феадалаў. У сярэдзіне XVI стагоддзя ў ВКЛ амаль *50% зямлі належала дзяржаве, 45% - прыватным уласнікам, 5%. – царкве.*

Буйнейшым землеўласнікам у ВКЛ быў Вялікі князь. Асоба Вялікага князя з'яўлялася не толькі вярхоўным кіраўніком дзяржавы, але і ўвасабляла сабой дзяржаву. (*прынцып манархіі: дзяржава – гэта Я).* Таму Вялікі князь распараджаўся шматлікімі дзяржаўнымі землямі, т.зв. "гаспадарскімі ўладаннямі". Даходы з іх іншлі як на *ўтрыманне манарха* і яго двара, так і на *дзяржаўныя* патрэбы. У складзе непасрэдна гаспадарскіх уладанняў на тэрыторыі Беларусі былі значныя тэрыторыі, шмат гарадоў, мястэчак і вёсак.

Такое становішча, калі не было падзелу гаспадарскіх ўладанняў на *асабістыя* вялікага князі і *дзяржаўныя*, працягвалася да сярэдзіны XVI стагоддзя. Пры Жыгімонце Аўгусце пачынае выдзяляцца з гаспадарскіх уладанняў фонд ***асабістых зямельных уладанняў*** *Вялікага князя (яго дамен),* для таго каб забяспечыць матэрыяльна сваіх нашчадкаў, якія не будуць абраны на вялікакняжацкі прастол.

Фонд гаспадарскіх уладанняў *скарачаўся* не толькі ў выніку замацавання з яго значнай часткі зямель ва *ўласнасць* самаго Вялікага князя, але таксама і у выніку шматлікіх *падараванняў* з яго зямель з сялянамі сваім *васалам* за адданую службу, *каталіцкай* царкве.

Калі ў канцы XIV стагоддзя на землях гаспадарскіга фонда пражывала каля 80% падданых (насельніцтва), а ў сярэдзіне XVI стагоддзя – толькі 30%. Пераважная большасць насельніцтва пражывала на прыватнаўласніцкіх землях.

Самым буйным прывіляваным саслоўем у ВКЛ была **шляхта.**

Тэрмін гэты мае сваю гісторыі. У ВКЛ з XIII стагоддзя аснаўная маса феадалаў, тых, хто валодаў зямлёй (акрамя князёў), называліся ***баярамі.*** З пачатку XV стагоддзя пад польскім уплывам у дакументах ВКЛ пачынае сустракацца і вызначэнне "*шляхта"* (*род, парода)*, "баяры-шляхта". У пачатку XVI стагоддзя пануючае, прывілеяванае саслоўе землеуласнікаў у ВКЛ і Польшчы трывала мае назву "***шляхта."*** Тэрмін "**пан**" ужываўся для вначэння спачатку тых шляхцічаў, якія займалі высокія пасады ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзяржаўных, судовых і адміністратыўных органах, мелі сваіх васалаў, а з другой паловы - ўсіх шляхцічаў, што мелі прыгонных сялян.

У сярэдзіне XVI стагоддзя на тэрыторыі Беларусі, насельніцтва якой складала ***каля 1,8 млн***. чалавек, *феадалаў, шляхты* было прыблізна ***162 тысячы*** чалавек, г.зн. 9% ад усяго насельніцтва.

Шляхецкае саслоўе было неаднародным. Былі феадалы, як правіла нашчадкі былых княжацкіх дынастый, якія падпарадкоўваліся вялікаму князю (былі яго васаламі). Частка менш заможных феадалаў былі васаламі больш буйных феадалаў, князёў і паноў, знаходзіліся ў залежнасці ад іх, неслі ім службу. Іх вызначаюць як "вотчынная шляхта" – яны атрымлівалі маёнткі ад сваіх гаспадароў (сеньёраў), неслі ваеную службу ў складзе іх ваеных атрадаў.

Сацыяльны статус шляхты вызначаўся не столькі паходжаннем і вызнаннем, колькі вялічыной зямельнай уласнасці. Існуюць розныя падлікі колькасці зямлі, што знаходзілася ў валоданні шляхты ВКЛ. Паказчыкам заможнасці была і наяўнасць прыгонна залежных сялян, сялянскіх гаспадарак, т.зв. "дымоў".

У асяроддзі шляхты выразна існаваў падзел на 5 ці нават 6 катэгорый. Па вялічыне зямельнай ўласнасці і наяунасці залежных сялян выдзяляюцца: - найдрабнейшая шляхта, якая нават не мелі ні зямлі , ні сялян (фактычна не з'яўляліся феадаламі), ці мела 1-3 сялянскія гаспадаркі; - дробная шляхта; - сярэдняя; - буйная шляхта (мелі некалькі соцен прыгоддных сялянскіх гаспадарак); - найбуйнейшыя феадалы, т.зв. *магнаты* (мелі па некалькі тысяч сялянскіх гаспадарак). Да апошніх у сярэдзіне XVI стагоддзя на беларускіх землях адносіліся крыху больш за 30 фамілій, сярод іх князі Астрожскія, Вішнявецкі, Гальшанскі, а таксама Радзівілы, Сапегі, Хадкевічы.

Але большаю частку ў ВКЛ па велічыне сваёй зямельнай уласнасці складалі *найдрабнейшыя* і *дробныя* феадалы.

Тым не меньш, менавіта шляхта была пануючым класам, прывілеяваным саслоўем, якое мела выключнае права валодаць зямлёй. Мы ўжо казалі, што прыватнаўласніцкай (належалі феадалам, шляхце) было каля 45% усей зямлі ВКЛ. Землеўладанні шляхты павялічвалася за кошт перадачы гаспадаром, вялікім князем землі *з дзяржаўнага фонда ў прыватную ўласнасць.*

Акрамя зямельнай ўласнасці свецкіх феадалаў (шляхты) у ВКЛ існавала ўласнасць на зямлю ***духоўных феадалаў*** – *праваслаўны*х і *каталіцкіх* духоўных устаноў.

У XV – XVI стагоддзях захавалі і некалькі павячылі свае ўладанні ў выніку пажалавання зямель вялікім князем ўстановы *праваслаўнай ц*аркавы - *епіскаскапства, цэркавы, манастыры.* Асноўныя царкоўныя маёнткі праваслаўнай царквы былі размешчаны ў тых паветах ВКЛ, дзе пераважала праваслаўнае насельніцтва. Царква атрымлівала землі і залежных сялян і ад мясцовых кнчязёй і паноў у выглядзе ахвяраванняў і падараванняў.

З канца XIV стагоддзя, у выніку дзяржаўнай палітыкі па насаджэнню і распаўсюджанню *каталіцызма* на землях ВКЛ, хуткімі тэмпамі павялічвалася маёмасць ***каталіцкай царквы***. Яна пашыралася ў выніку пажалавання вялікім князем з дзяржаўнага фонду каталіцкім установам – *біскупствам, касцёлам, кляштарам* зямлі з сялянамі. Уласнікамі зямельных надзелаў былі і каталіцкія ордэны, перш за ўсё езуіцкі, які атрымліваў значную матэрыяльную падтрымку з боку дзяржавы і магнатаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У выніку гэтага да сярэдзіны XVI стагоддзя каталіцкая царква стала аднім з буйнейшых феадалаў ВКЛ. Ёй належалі значная частка сялянскіх гаспадарак (толькі Віленскаму біскупству належала больш за 11,5 тысяч сялянскіх дымоў) і зямель валасцей па усёй тэрыторыі ВКЛ.

2. Станаўленне фальваркава - паншчынай сістэмы.

Сацыяльна-эканамічнай асновай феадальнага грамадства была гаспадарка землеўласніка — феадалаў. На працягу XIV – XV стагоддзяў у ёй пад уплывам сацыяльна-эканамічных і палітычных фактараў адбываліся *пэўныя змены.*

Уласная гаспадарка феадалаў з пачатку свайго з'яўленне была арыентавана на забяспячэнне *ўласных патрэб* ў сельскагаспадарчай прадукцыі. Адміністрацыйна-гаспадарчым цэнтрам маёнткаў былі "***двары***", якія ўключамі жылёвыя і гаспадарчыя пабудовы феадала, некатораю частку вораўнай зямлі, а таксама сады, агароды, паркі. Сельскагаспадарчая прадукцыя выраблялася ў адносна невялікіх памерах, неабходных для забяспячэння уласных, асабістых патрэб феадала працай "*челяді невольнай*"(рабоў, якія не мелі уласнай гаспадаркі і асабіста належалі гаспадару). Феадал атрымліваў таксама *даніну* з сялянскіх гаспадарак, якія былі асабіста свабоднымі, але знаходзіліся на яго землях. Такі *натуральны* характар панскай гаспадаркі быў асноўным да сярэдзіны XV стагоддзя на ўсёй тэрыторыі ВКЛ.

У канцы XV – пачатку XVI стагоддзя змяняецца сітуацыя на *знешнім і унутранным рынку*. У гэты перыяд значна ўзрастае *попыт* на *збожжа* і іншую сельскагаспадарчую прадукцыю ў краінах Заходняй Еўропы і на ўнутораным рынку ВКЛ у сувязі з ростам гарадскога насельніцтва.

У такіх спрыяльных для феадалаў ВКЛ умовах пачынаецца перабудова арганізацыі іх гаспадарак. Для павялічэння даходнасці сваіх маёнткаў яны пачынаюць ***пашыраць вытворчасць прадукцыі*** з мэтай збыта яе на рынку і атрымання грошай. Гэты працэс выявіўся ў пашырэнні ворыва (пахатнай зямлі) непасрэдна ў гаспадарцы феадала, пашырэнні старых і стварэнні новых двароў. З сярэдзіны XVI стагоддзя такія феадальныя гаспадаркі, арыентаваныя на вытворчасць прадукцыі, пачалі ўсё часцей называць ***фальваркамі*** (*польскі і ням. тэрмін – хутар, аднак Фальварак абазначае не назву пасельшча, а форму арганізацыі гаспадаркі).*

Фальварак ўяўляў сабою *новую форму* арганізацыі феадальнай *гаспадаркі,* заснаванай на працы паднявольных сялян і арыентаваную на вытворчасць збожжа на продаж, г.зн. мела ужа не натуральны, а *таварны* характар. Асноўнай вытворчай сілай ў фальварку была праца *ужо не челядзі,* а больш шырокага кола паднявольнага сялянства.

У склад ***фальварка*** ўваходзілі панскі двор (сядзіба, месца пастаяннага жыхарства феадала) з жылымі і гаспадарчымі пабудовамі, вораўныя землі, агароды, сенажацці, выганы. Умаль ва ўсіх фальварках гадавалі свойскую жывёлу і птушку. У некаторых фальварках былі таксама сады, млыны, кузні, цагельні, пякарні, бровары. Арганізоўваліся фальваркі як на прыватных землях феадалаў, а таксама на дзяржаўных і царкоўных землях. На тэрыторыі буйных землеўладанняў (маёнткаў) магло быць некалькі фальваркаў. Плошчы фальваркаў у большасці выпадкаў складалі некалькі дзесяткаў гектараў, але у буйных феадалаў янп магла перавышаць і 100 гектараў.

Фальваркі з'яўляліся *шматгаліновымі* гаспадаркамі. Пераважнае месца аддавалася вытворчасці збожжа, асабліва жыта. Важнай галіной было жывёлагадоўля,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асабліва конегадоўля. Утрымліваліся таксама каровы, авечкі, свінні, валы, хатняя птушка. Гаспадарка вялася таксама па рыбных, паляўнічых, борцевых і інш. угоддзях

Да сярэдзіны XVI стагоддзя *фальваркі* сталі *пануючай* формай *арганізацыі ўласнай гаспадаркі феадалаў* на тэрыторыі беларускіх зямель на яе цэнтральнай і заходняй частцы. (*прыблізна на захад ад лініі Пінск-Слуцк-Менск-Полацк).*

Перабудова феадальнай гаспадаркі, рост яе вытворчасці прадукцыі на продаж, патрабавалі карэнных змен ў адносінах да сялянства. Неабходна было прыцягненне як мага большай колькасці сялян ***непасрэдна да працы*** на гаспадарскай зямлі. Не выпадкова, што менавіта на гэты час прыпадае канчатковае запрыгоньванне сялянства.

Новая форма арганізацыя вытворчасці ў гаспадарках феадала патрабавала прыстасавання да яе патрэб усёй арганізацыі працы на зямлі. Таму у сярэдзіне XVI стагоддзя можна казаць ***аб аграрнай рэформе ў ВКЛ.***

Яе састаўнымі часткамі былі – увядзенне *паншчыны*, а таксама удасканаленне *сістэмы землекарыстання* сялянства (т.зв. “валочная памера”).

З пашырэнне непасрэднай вытворчасці ў панскім фальварку узнікла патрэба у *непасрэднай працы залежных* сялян на панскай зямлі. Таму замест *даніны* у прыватнаўласніцкіх уладаннях феадалаў уводзіцца ***паншчына*** – абавязковая праца сялян на зямлі феадала як плата за карыстанне гаспадрскай зямлёй, на якой сяляне жылі і вялі сваю гаспадаркую. Паншчына складала ***2 дні на тыдзень – 102 дні*** ў год сяляне павінны былі хадзіць на працу ў фальварак. Сяляне павінны былі працаваць у фальварках ад усходу да заходу сонца. За адсутнасць на працы сяляне строга караліся: за першы дзень штраф складаў адзін грош (*дзень працы селяніна на паншчыне у сярэднім ацэваўся у 0,5 гроша, гусь каштаваў 1,5 грошаў),* за другі дзень забіралі барана, а за трэці – білі бізуном.

Такім чынам склалася т.зв. ***фальваркава-паншчыная*** сістэма, якая стала галоўнай у вытворчых адносінах.

Асадныя сяляне (што жылі і працавалі на дзяржаўных землях) замест паншчыны павінны былі плаціць грашовую плату.

Аграрная рэформа сярэдзіны XVI стагоддзя уніфікавала сістэму абкладання сялян павіннасцямі праз увядзенне агульнай для усіх гаспадарак і рэгіёнаў ВКЛ адзінкі па плошчы зямлі – ***валокі,*** якая бралася для разліку памеру павіннасцяў з сялян.

Валока – асноўная зямельная мера і адзінкка абкладання сялян павіннасцямі, мела размер у 21,3 га. *(ці 30 “моргоў”, альбо 9000 “прутоў” па іншых адзінках вымярэння плошчы, што існавалі ў той час*). Валокі павінны былі складацца з 3-х палёў, што адпавядала трохпольнай сістэме, у залежнасці ад якасці зямлі падзяляліся на добрыя, сярэднія, кепскія і велькі кепскія, ад чаго залежылі памеры чыншу.

Валочная памера, (прыняцце *валокі* за адзінку вымярэння зямельнай плошчы, якой карысталіся сяляне, і разліку іх павіннасцяў) была ўведзена “***Уставай на валокі” 1557 года***. З пачатку яна была уведзена толькі на гаспадарскіх (вялікакняжацкіх) уладаннях, а потым знаходзіла сваё ужыванне (хаця і не з’яўлялася абавязковай) і ў прыватнаўласніцкіх фальварках.

Яе ажыццяўленне выклікала супярэчлівае стаўленне сялянства, па рознаму ацэньваецца гісторыкамі. З аднаго боку, увядзенен валочнай памеры стварыла *роўныя умовы* для атрымання надзелу і адбывання павіннасцяй, памеры якіх былі *адзінымі* ва усіх гаспадарках, аднолькавымі для усіх сялян. Павіннасці сялян былі замацаваны на дзяржаўным узроўні, але маглі змяняцца асобнымі феадаламі ў бок павялічэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З другога боку, сялянства апынулася у больш *цяжкім становішчы*, бо калі раней павіннасці выконваліся з разліку аднаго сялянскага *дыма,* (гаспадаркі), незалежна ад колькасці зямлі, то зараз размеры павіннасцяў дыферыянцываліся ў залежнасці ад наяўнай зямлі, якой карысталася сялянская гаспадарка. Гэта быў новы крок у працэсе далейшага *ўзмацнення феадальнай эксплуатацыі сялянства.*

Для эканамічнага стану дзяржавы і феадалаў пераход да валочнай памеры быў безумоўна карысным, ён значна павялічыў іх даходы. Па няпоўным данным, толькі на гаспадарскіх уладаннях у выніку пераходa на валочную памеру даходы павялічыліся у 4 разы.

Сялянскія гаспадаркі не заўсёды мелі ў сваім карыстанні землі ў памеры валокі. Як правіла, сяляне бралі ці мелі ў карыстанні зямлі ў памеры толькі па *паўвалокі (*0,5 валокі). На плошчы адной валокі, у большасці выпадкаў, вялі гаспадарку дзве сялянскія семьі, як правіла сваякоў. Невялікія участкі зямлі па 3 моргі (0,1 валокі) часта перадаваліся невольнай челядзі, якая станавілася агароднікамі.

Валока, з улікам якасці зямлі, была ўзята за адзінку разліку павіннасцей, што неслі цяглыя і асадныя сяляне. Больш падрабязна з іх зместам можна пазнаёміцца *у 2-м томе "Гісторыі Беларусі" пад рэд. М.П. Касцюка, дзе на стар 304 – 305 і 308 – 309* прыведзены табліцы аб відах і нормах павіннасцей з цяглых і асадных валок, а таксама з прыкладамі па асобных маёнтках некаторых феадалаў.

Разам з тым, патрэбна улічваць, што валочная сістэма ў другой палове XVI стагоддзя была здейснена *толькі на дзяржаўных* (гаспадарскі) землях і толькі ў *некаторай частцы маёнткаў* свецкіх і духоўных феадалаў, у асноўным у паўночна-заходняй частцы Беларусі, дзе ўкаранялася *фальваркава-паншчыная сістэма* гаспадарання. У многіх жа маёнтках, якія заставаліся па-ранейшаму натуральнымі гаспадаркамі, і надалёй існавала ранейшая сістэма землекарыстання і абкладання сялянства.

3. Становішча сялянства

Сялянства было асноўнай масай насельніцтва і асноўным вытворцам у ВКЛ. Сялянства было разнастайным па сваяму *сацыяльнаму* статусу, роду *заняткаў* і *ступені* асабістай і эканамічнай залежнасці.

Ва ўмовах феадальнага грамадства агульным для ўсяго саслоўя сялян была залежнае становішча, аднак і тут былі сваі асаблівасці.

Сяляне па сваёй прыналежнасці падзяляліся на ***дзяржаўныя*** (гаспадарскія), ***шляхецкія*** (княжацкія, панскія, баярскія), ***духоўныя*** (царкоўныя альбо касцёльныя). Зразумела, што такі падзел склаўся ў залежнасці ад таго, каму *належала,* хто з'яўляўся *ўладальнікам* той **зямлі**, на якой жыло і працавала сялянства.

Вызначаліся і асобныя катэгорыі сялян па той ці іншай ***павіннасці,*** якую яны неслі – *даннінкі* (плацілі даніну),

цяглыя (выконвалі працу у гаспадарскім маёнтку),

чыншавікі (плацілі грашовы аброк).

Па ступені *асабістай залежнасці* сяляне падзяляліся на

вольныя, асабіста яшчэ свабодныя, т.зв. "***людзі похожыя***" і

"***людзі непохожыя***", якія страцілі права пераходa ад аднаго феадала да іншага, былі ўжо запрыгоненымі, асабіста залежнымі. Асобнай катэгорыяў залежнага сялянства была

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“***челядь невольная***”, па сваяму становішчу фактычна *рабы,* якія не мелі сваёй гаспадаркі.

Сваеасаблівасць становішча сялянства ў перыяд феадальных адносін заключалася ў тым, што сялянства, яхоць і *было асноўным вытворцам* у сельскай гаспадарцы, між тым *не мела зямлі ва уласнасці*, а было толькі яе *карыстальнікам.* ***Зямля належала дзяржаве, свецкім і царкоўным феадалам.*** Кожная сялянская гаспадарка карысталася зямлёй, якой сялян надзялялі феадалы-уласнікі зямлі. Гэта было неабходнай і істотнай рысай сістэмы феадальных адносін і абумовіла павіннасны характар сялянскага землекарыстання.

За карыстанне зямлёў сяляне павінны былі выконваць на карысць зямельных уласнікаў разнастайныя ***павіннасці***. Гэта была фактычна зямельная *рэнта.* (*рэнта – **плата за арэнду**, карыстанне*). Яна мелы тры тыпа – *прадуктовая, атработачная і грашовая*.(*плата прадуктамі, працай ці грашыма*).

Прыкладна да канца XV стагоддзя, да з’яўлення фальваркавай шляхецкай гаспадаркі, пераважнай формай рэнты сялян была ***даніна.*** У складзе *даніны* былі прадукты сялянскай вытворчасці, што пастаўляліся гаспадару: *збожжа, сена, лён, гусі, куры, яйкі, футра, мёд, воск* і некаторыя іншыя прадукты. Асноўнай адзінкай абкладання данінай служыла сялянская гаспадарка, “дым”, хаця адказнасць за выкананне даніны была агульная, яе неслі калектыўна ўсе жыхары сяла.

У розных рэгіёнах і маёнтках феадалаў памеры і формы *даніны* былі неаднолькавыя, нормы даніны вызначаў сам феадал. Існавалі нават тры групы даннікаў: 1.- “*людзі данныя*” (пастаўлялі прадукты ці плацілі грошы). 2. – “*людзі прыгонныя*” (акрамя даніны “прыганяліся” на выкананне некаторых відаў работ у панскай гаспадарцы – касіць сена, лавіць рыбу, будаваць двор і інш.). 3. – “*дольнікі*” (павінны былі аддаваць даніну у выглядзе чацвёртай часткі (долі) ураджаю сваёй гаспадаркі).

З сярэдзіны XV стагоддзя, па меры развіцця грашова-таварных адносін і арганізацыь фальваркаў *даніна* пачынае *выцясняцца **адработачнай*** (паншчына) і ***грашовай (***чынш) формамі рэнты.

Сяляне пачынаюць усё больш прыцягвацца да выканання вытворчых работ у панскай гаспадаркі, менавіта ***праца*** становіцца асноўнай платай за карыстанне зямлёй. Сяляне ў выглядзе паншчыны (*працы на пана)* выконвалі самыя разнастайныя сельскагаспадарчыя работы ў фальварку – *аралі і баранаваля зямлю, праводзілі сяўбу, касьбу, жніво, малацьбу* і інш. Выкарыстоўвалі яны для гэтых работ *сваіх коней і свой сельскагаспадарчы інвентар* – саху, сярпы, касу і інш.

З сярэдзіны XVI стагоддзя пашыраецца выкарыстанне *грашовай рэнты* – **чыншу.** Галоўнай павіннасцю сялян у дзяржаўных маёнтках і маёнтках магнатаў, буйных феадалаў становіцца плата грашыма.

Але і да канца XVI стагоддзя, разам з развіццём і пашырэннем паншчыны і чыншу, захоўвалася і *прадуктовая рэнта – даніна.*

Увядзенне паншчыны і нават перавод на чынш не адмяніла іншых *павіннасцяў сялян.* Асноўнымі з іх былі – *чыніш* (грашовыя выплаты), *дзякла* (абавязковыя пастаўкі натуральных прадуктаў – дзякла аўсом, сенам, гусямі, курамі, яйкамі, баранамі і інш). Акрая таго сяляне павінны былі выконваць і шэраг дадатковых павіннасцей: *касіць* фальварачныя сенажацці, *перавозіць* розныя грузы, *будаваць* і рамантаваць масты, *хадзіць на варту* панскіх двароў і інш. Прыцягваліся сяляне і да працы на іншых

ВГПОЗИГОРИЙ ВГПУ

работах у залік пагашэння часткі плацяжоў, чыншу. *(Напрыклад, праца работніка з канём і возам на будаўніцтве замка ацэньвалася усяго ў 2 грошы за тыдзень працы*).

Такім чынам, у сярэдзіне XVI стагоддзя на Беларусі існавала ***змешаная рента,*** у структуры якой мелі месца як традыцыйныя форма (даніна) , так і новыя – паншчына і чынш.

Акрамя пералічаных катэгорый сялянства ў панскіх гаспадарках, асабліва пакуль яны мелі натуральны характар, была даволі значнай катэгорыя ***сялян-слуг***. Яны выконвалі работы, якія патрабавалі спецыяльных навыкаў. У склад сялян-слуг уваходзілі *конюхі* (займаліся доглядам коней), *рамеснікі* (бондары, ганчары, кавалі інш.), а таксама сяляне, што займаліся пэўнымі промысламі – *баброўнікі, бортнікі, рыбаловы* і інш. Частка сялян з'ўлялася дваровай *прыслугай,* выконвала ніжэйшыя адміністрацыйна-гаспадарчыя функцыі (сотнікі, старцы), з'яўлялася вайсковымі слугамі феадала (панцарныя слугі). Паступова гэтая катэгорыя сялян скарачалася, яны пераводзіліся ў разряд цяглых і асадных людзей.

Найбольш бяспраўнай часткай феадальна залежных людзей была "***челядзь нявольная***". Гэта катэгорыя фарміравалася ў выніку збяднення сялян, якія былі не ў стане выплачваць падаткі, у выніку голада і іншых бедстваў, за кошт палонных, што захопліваліся пад час войнаў і інш. Челядзь невольная знаходзілася асабіста ў поўнай уласнасці феадала, якія маглі прадаваць і купляць такіх людзей. Але па меры развіцця гаспадркі, запрыгоньвання асноўнай масы сялянства, стала эканамічна не выгадна феадалам трымаць челядь, яна надзялялася невялікімі надзеламі зямлі, пераўтваралася ў прыгонных сялян-агароднікаў.

З сярэдзіны XV стагоддзя узмацняецца працэс замацавання сялян за яго гаспадаром, абмяжаванне магчымасці сялян пакінуць панскую гаспадарку. Гэты працэс атрымаў назву ***запрыгоньванне сялянства***, які павінен быў стаць галоўным сродкам *пазаэканамічнага прымусу сялянства* да ўсё больш працяглай працы на феадалаў. Феадальная дзяржава была зацікаўлена у скарачэнні колькасці "людзей-пахожых", свабодных сялян, якія маглі пры выкананні пэўных умоў перайсці ад аднаго феадала да другога.

Прачынаючы з другой паловы XV стагоддзя фарміруецца і заканадаўча афармляецца *сістэма юрыдычных нормаў,* якія замацавалі *права уласнасці феадала* не толькі на зямлю, але і *на сялян*, пераутварэння свабодных катэгорый сялян ў прыгонных.

Аднім з асноўных прынцыпаў, які павінен быў пазбавіць пахожых людзей волі змяніць свайго гаспадара, быў абраны прынцып ***даўнасціі***. З пачатку ён датычыўся 10-ці гадовага *тэрміну пошуку збеглых сялян*, якія павінны былі вяртацца ранейшаму феадалу. У далейшым прынцып даўнасці стаў трактавацца як *10-ці гадовы тэрмін пражывання селяніна* у аднім маёнтку, пасля якога ён страчваў права перахода. (*калі пражыў 10 год, то не меў права пакідаць феадала*).

Такія нормы феадальнага права былі сфармуляваны ў ***Статутах ВКЛ 1529 і 1566 гадоў*** і канчаткова замацаваны ў ***Статуце 1588 года***. Хаця ў Статуце і была захавана норма аб тым, што і пасля 10-ці год пражывання селянін мог пайсці ад свайго пана, але яна была абстаўлена такімі ўмовамі (выплата значнага выкупу, аплата усіх даўгоў і пазык і інш), што рабіла гэта нерэальным.

Такім чынам, у другой палове XVI стагоддзя адбылося канчатковае замацаванне асноўнай часткі сялянства за феадаламі, у выніку чаго сфарміравалася адзінае саслоўе – ***прыгоннае сялянства.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Сялянская гаспадарка.

Асноўнай вытворчай ячэйкай сельскай гаспадаркі з'яўлялася ***гаспадарка селяніна***, якая ў той час называлася "*дым"*. Гаспадарка селяніна вялася сіламі адной сям'і, якая складалася з бацькоў і дзяцей, у тым ліку маглі быць і дзеці, якія мелі сваю сям'ю (жанаты сын, замужняя дачка), якія жылі разам з бацькамі і не стваралі сваёй асобнай гаспадаркі. Як сведчаць гістарычныя крыніцы таго часу, сямья, што ўтварала сялянскі дым, складалася прыкладна з 6 – 9 чалавек, з якіх 3- 5 чалавека былі дарослымі работнікамі.

Асноўнай формай сельскіх паселішчай была *вёска,* (*село),* у якой жыло некалькі, да дзесятка дымоў. Гаспадарка такога сяла складала суседскую абшчыну, а некалькі сёл – валасную абшчыну.

Галоўным паказчыкам *заможнасці,* дабрабыту сялянскіх гаспадарак была *колькасць зямлі* ў надзеле, якую яны атрымлівалі ад феадала ці дзяржавы ў карыстанне, з працы на якой яны жылі і выконвалі даніну.

У большасці выпадкаў на адну сялянскую гаспадарку (*дым, двор*) ў XVI стагоддзі на Беларусі ў сярэднім прыходзіўся зямельны надзел *10,7 га.* (0,5 валокі).

Існавалі сялянскія гаспадаркі, што мелі надзел і ў *валоку і больш* – яны лічыліся *заможнымі*. Такіх гаспадарак было 34 – 39 % ад агульнай колькасці дымоў, але іх колькасць паступова змяншалася і у пачатку XVII стагоддзя яны складалі толькі 7 – 17 %.

Бедняцкімі лічыліся гаспадаркі, якія мела *менш за палову валокі*, бо пражыць і выканаць усе павіннасці з такой колькасці зямлі было цяжка. У канцы XVI стагоддзя такіх гаспадарак было 10 – 13%, але ў першай палове XVII стагоддзя – ужо 42 – 48 %.

Была праслойка і зусім маламаёмасных сялян (*бабылі, кутнікі, каморнікі, парабкі і інш*.), якія амаль не вялі гаспадаркі, бо не мелі для таго неабходных сродкаў, і існавалі за кошт выпадковых заробкаў.

Сялянская гаспадарка, акрамя зямельнага дадзела, *складалася* з жылёвай пабудовы, мела розныя гаспадарчыя пабудовы – гумно, пуню, хлеў і інш. У сялянскай гаспадарцы меўся, як правіла, і неабходны *гаспадарчы інвентар* – бароны, косы, сохі, сякеры, сярпы і інш. Асноўнай прыладамі для апрацоўкі землі былі драўляная *двухзубая саха*, на рабочыя часткі якой насаджваліся жалезныя наканечнікі, і драўляная *барана*.

У якасці *цяглавай сілы* на захадзе Беларусі пераважалі *валы,* на ўсходзе – *коні.* Забяспечанасць сялянскіх гаспадарак рабочай жывёлай у розных маёнтках была неаднолькавай, залежала яна і ад заможнасці самой сялянскай гаспадаркі. Напрыклад, у сярэдзіне XVI стагоддзя у маёнтку Ляды Наваградскага паветы на 54 дымы прыходзілася 60 валоў і 16 коней, у маёнтку Глыбокае Ашмянскага павета – на 60 дымаў – 58 валоў і 31 конь, у маёнтку Радашковічы Менскага павета на 142 дыма прыходзіліся 174 валы і 151 конь. Як сведчаць гістарычныя крыніцы, у сярэднім на дым (гаспадарку) прыходзілася па 0,5 – 1,7 вала і па 0,3 – 1,2 каня. Гэта азначае, што як правіла у сялянскіх гаспадарках была цяглавая сіла, але была і частка бядняцкіх наспадарак, дзе не было ні каня, ні вала.

Нагадаем, што *сваімі прыладамі* працы і з сваім канём ці валом сяляне апрацоўвалі *не толькі свае надзелы*, але і працавалі *на паншчыне*, на гаспадарскай зямлі.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Асноўную ролю ў сялянскай гаспадарцы адыгравала ***раслінаводства.*** Вырошчвалі жыта, авёс, грэчку, ячмень, проса, а таксама бабовыя і тэнічныя культуры. Ураджаўнасць асноўных зерневых культур была неўстойлівай, у значнай ступені залежала ал прыродных ўмоў, неўраджаі здараліся часта. Але нават і ў самыя ураджайныя гады з гектара збіралі прыкладна толькі *4 центнера* збожжа, што адпавядала ураджайнасці каля "сам-3". На сваіх прысядзібных *агародах* сяляне вырошчвалі, як і раней, капусту, моркву, буракі, рэдзьку, рэпу, цыбулю, часнок і іншыя культуры.

Развівалася і ***жывёлагадоўля***, якая была накіравана на вытворчасць прадуктаў *харчавання* для *панскага маёнтка (*значная частка яе прадукцыі – мяса, скуры здавалася ў якасці даніны), і сялянскай сямьі. Жывёлагадоўля была і адзінай крыніцай атрымання *ўгнаенняў* для раслінаводства і агародніцтва. У гаспадарках сялян утрымліваліся *коні, каровы, свінні, козы, авечкі*. З хатняй птышкі трымалі *курэй, гусей, качак*. Значная частка іх, а таксама яек, пастаўлялася ў якасці даніны на панскі двор. Напрыклад, з кожнай валокі зямлі як цяглыя, так і асадныя сяляне павінны былі ў выглядзе дзякла пастаўляць па 1 гусю, 2 куры, 20 яек.

Наяўнасць хатняй жывёла ў розных гаспадарках была неаднолькавай. У некаторых заможных сялянскіх гаспадарках было да 6-ці кароў, 10-ці авечак, па 6-7 коз і свіней. Але ў большасці гаспадарак, як правіла, было па 1-2 карове, па 2-4 свінні, авечкі, 5-6 курэй. Разам з тым, былі былі гаспадаркі, дзе наогул не было хатняў жывёлы і птушкі.

Дадатковымі заняткамі заняткамі сялян у вольны ад земляробства час з'яўляліся *бортніцтва, рыболўства, лясныя промыслы*. Бортніцтва (догляд пчол, збор мёду і воску) было распаўсюджана амаль па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Аб гэтым сведчыць тое, што паўсюдна ў складзе павіннасцяў усіх катэгорый сялян была і *даніна мёдам.* Паступова бортніцва нават выдзяляецца для некаторых сялян у асобны занятак. З воску выраблялі свечы, воск і мёд былі каштоўным таварам і на рынку.

Таксама асобным заняткам у панскіх маёнтках, дзе былі каштоўныя рыбныя ўгоддзі ("ловы", "тоні", "езы"), для некаторых сялян становіцца развядзенне і лоў рыбы. З'яўляюцца такія катэгорыі, як "пруднікі" і рыбаловы. Астатнія сяляне маглі ў панскіх маёнтках лавіць рыбу толькі за плату і ў абмежаванай колькасці. Нават за карыстанне рыбнымі ўгоддзямі, якія не ўвадзілі непасрэдна ў склад панскай гаспадаркі, сяляне павінны былі ўносіць спецыяльныя *плацяжы* сваім феадалам ці дзяржаве.

Такія ж правы мелі сяляне і пры *паляванні* на дзікую жывёлу. Найбольш каштоўныя паляўнічыя ўгоддзі знаходзіліся ў непасрэдным уладанні феадалаў, у якіх былі сяляне-слугі, што займаліся доглядам і арганізацыяй паляваннем на жывёлу - *асочнікі, баброўнікі, сакольнічы, стральцы* і інш. Сяляне за плату маглі здабываць у панскіх лясах толькі, у асноўным, дробных жывёл. Калі ж ім даводзілася злавіць ці забіць каштоўнага звера, то яго скуру яны павінны былі аддаць пану. Высокімі былі штрафы за браканьерства.

Сялянская гаспадарка, якая ў тыя часы мела ў асноўным, натуральны характар, *сама забяспечвала* сваі патрэбы ў рэчах бытавога і хатняга ўжытку. Сваімі сіламі сяляне будавалі жылыя і гаспадарчыя пабудовы, выраблялі шмат якія прылады працы, адзенне, абутак, посуд і іншыя прадметы побыту. У сялян меліся навыкі традыцыйных сялянскіх рамёстваў, звязаных з ручной апрацоўкай прадукцыі раслінаводства

РЕПОЗИТОРИЙ ВГТУ

(ткацтва, прадзенне), жывёлагадоўлі (апрацоўка скуры, мылаварэнне і інш.), а таксама драўніны (плотніцтва), гліны (ганчарства).

Разам з тым, некаторая частка сялян, не парываючы з вядзеннем сельскай гаспадаркі, пераўтвараецца сельскіх рамеснікаў, для якіх занятак рамяством становіцца галоўным, асноўным. Таму феадалы прымушалі іх у якасці павіннасці (замест працы на зямлі ці ў якасці даніны) вырабляць на панскія патрэбы разнастайныя рэчы з *дрэва* (бароны, бочкі, калёсы, сані і інш), *з гліны* (посуд, цэгла і інш.), *ільну і воўны* (адзенне, палатно, сукно і інш.), *са скур* (абутак, адзенне, футра і інш.), *з жалеза* (косы, сярпы, сякеры і інш). Частка такіх рэчаў сельскімі рамеснікамі збывалася ці адменьвалася сярод аднавяскоўцаў ці на бліжэйшых рынках.

Такім чынам, ***сялянская*** гаспадарка Беларусі ў XIV – XVI стагоддзях існавала і развівалася як шматгаліновая, якая забяспечвала ў першаю чаргу патрэбы феадалаў і дзяржавы, але таксама і існаванне самаго сялянства. Менавіта сяляне сваёй працай ствараліасноўны *эканамічны патэнцыял дзяржавы*, з'яўляліся асноўнай вытворчай сілай у ВКЛ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма4.2 ГАРАДЫ І МЯСТЭЧКІ БЕЛАРУСІ ў XIV – XVI ст.

План:

1. Урбанізацыйныя працэсы
2. Грамадскае і сацыяльнае жыццё гарадоў
3. Эканамічнае жыццё гарадоў. Гандаль і транспарт**.**

1. Урбанізацыйныя працэсы

Яшчэ да ўтварэння ВКЛ на тэрыторыі Беларусі існавала значная сетка гарадоў, якія ўтварыліся ў выніку аддзялення рамяства ад сельскай гаспадаркі. Узнікалі гарады на месцы былых паселішчаў, а таксама вакол замкаў, на скрыжаванні гандлёвых шляхоў, на берагах рэк і азёр. У IX – XIII стагоддзях на тэрыторыі Беларусі існавала ***35 гарадоў.*** *(іх мы ужо называлі)* Усяго на пачатку XV стагоддзя ў ВКЛ налічвалася не менш за 60 гарадоў.

На працягу XV – XVI стагоддзя *новых гарадоў* узнікла ***нешмат –*** гарадскі статус у той час атрымалі *Рэчыца, Быхаў, Дзісна, Друцк*. Тлумачыцца гэта тым, што на заснаванне горада патрэбна была спецыяльная дазвола вялікага князя, а тыя не былі зацікаўлены ў стварэннем канкурэнцыі існаваўшым гарадам, з якіх яны атрымлівалі

даходы. Таму некаторыя выданні называюць лічбу каля 40 гарадоў на тэрыторыі Беларусі.

Гарады адрозніваліся паміж сабой колькасцю насельніцтва. У той час *буйнымі* гарадамі лічыліся такія, што мелі *10 і больш* тысяч жыхароў.Такіх на тэрыторыі Беларусі таго часу было 5-6. *Сярэднімі* былі гарады, дзе пражывала больш за *5 тысяч* чалавек, (такіх налічвалася прыкладна 15 – 16), а *малымі* – дзе было *2-3 тысячы* жыхароў.

Больш хутка расла колькасць гарадскога насельніцтва за кошт узнікнення ***мястэчак*** – насельных пунктаў, якія адрозніваліс ад гарадоў меншай колькасцю насельніцтва – *да 1,5 тысячы* чалавек (прыкладна 200 – 300 дамоў). На Беларусі *мястэчкі,* як паселішчы рамеснікаў і гандляроў, пачалі ўзнікаць з XIV стагоддзя, а ў XV – XVI стагоддзях іх было ***больш за 200,*** ў пачатку XVII стагоддзя – ***320*** *паселішчаў* местачковага тыпу. Узнікалі мястэчкі каля месцаў традыцыйных кірмашоў, на бойкіх гандлёвых скрыжаваннях, каля перапраў, у мястэчкі пераўтвараліся буйныя сёлы і вескі. Менавіта шырокае *распаўсюджанне мястэчак* можна лічыць праявай *урбанізацыйнага працэса* на Беларусі ў разглядаемы перыяд.

Гарадскія паселішчы мелі не толькі важную ролю ў эканамічных і гандлевых адносінах, але і выконвалі значныя сацыяльныя функцыі. Усе *буйныя* гарады ў XVI стагоддзі былі *цэнтрамі* адміністрацый-тэрытарыяльных адзінак – сталіцамі *ваяводстваў, буйных паветаў*. У іх размяшчалася вышэйшая адміністрацыя, яны былі цэнтрамі кіравання значных тэрыторый. Выключэннем з'яўляўся толькі Магілёў, які ўваходзіл у Аршанскага павета, хаця і значна пераўсходзіл Оршу. *Сярэднія і нават малыя гарады* з'яўляліся цэнтрамі *паветаў, валасцей*, феадальных уладанняў, царкоўных *прыходаў,* служылі крэпасцямі, месцамі збору і канцэнтрацыі войску.

У навуковых выданнях не названа нават прыблізная лічба гарадскога насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў XV – XVI стагоддзях. Але звесткі па асобным гарадам, што існуюць у крыніцах, даюць падставу сцвярджаць аб паступовым колькасным росце насельніцтва гарадоў. Адбываўся ён не хутка, павольна, на працягу значнага часу. Напрыклад, у Бярэсці ў канцы XIV стагоддзя было каля 2 тысяч чалавек, а у сярэдзіне XVII стагоддзя – больш за 10 тысяч. У Пінску за сто гадоў ад сярэдзіны XVI да сярэдзіны XVII стагоддзя колькасць домаўладальнікаў павялічылася з 650 чалавек да 5 – 6 тысяч. Дынаміку гарадскога насельніцтва прасачыць цяжка і таму, што першыя інвентарныя апісанні гарадоў пачаліся праводзіцца толькі ў сярэдзіне XVI стагоддзя. Таму вядома дакладна, што ў Гародні ў той час было 716 дамоў, пражывала каля 4-тысяч чалавек.

Крыніца росту гарадскога насельніцтва была адна - *сялянства*, але ***шляхі*** папаўнення гарадскога насельніцтва былі розныя.

У шэрагу выпадкаў гараджанамі станавіліся жыхары *вёсак,* калі гарады ці мястэчкі закладваліся (узнікалі) з буйных сёлаў, а таксама, калі пашыраліся межы горада і яны паглынялі навакольныя вёскі.

Перасяляліся ў гарады і *сельскія рамеснікі*, нярэдка гэта арганізоўвалі і самі феадалы, каб трывала атрымліваць прыбытак ад вырабу і гандлю іх прадукцыяй. Таму ў вялікакняжацкіх гарадах існавалі т.зв. "юрыдыкі" кварталы, часткі горада, заселеныя падданымі таго ці іншага феадала.

Крыніца адзначаюць даволі масавый характар і *самавольнага перасялення* сялян у гарады, прычым не толькі *асабіста вольнага*, але і *залежнага* сялянства. Цяглыя сяляне, уцякаючы ад сваіх феадалаў, шукалі прытулак у горада. Вярхоўная улада нават

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

была вымушана забараняць гарадам прымаць *беглых сялян,* але не рэдка гарадскія ўлады і нават уладальнікі гарадоў закрывалі на гэта вочы, будучы зацікаўленымі ў прыцягненні ў гарады працоўнай сілы.

2. Грамадскае і сацыяльнае жыццё гарадоў.

У перыяд сярэднявечча ў гарадах, у тым ліку і ВКЛ, адбываліся складаныя сацыяльныя і грамадскія працэсы. Каб разабрацца ў іх, патрэбна мець дакладныя ўяўленні аб стане саміх гарадоў, арганізацыі іх жыцця.

Гарады адрозніваліся паміж сабой па статусу іх юрыдыкцыі.

Існавалі гарады, якія былі заснаваны на *вялікакняжацкіх, дзяржаўных* землях. Падаткі з такіх гарадоў ішлі ў казну дзяржавы. Каб заахвоціць рост гарадоў, і адпаведна прыбыткаў з іх, дзяржава надавала пэўныя льготы, *прывілеі* гарадам (напрыклад, выключнае права на правядзене кірмашоў, утрыманне корчмаў). Насельніцтва найбольш развітых гарадоў, такіх як Вільня, Полацк, Менск, Навагрудак было вызвалена ад ранейшіх сумесных з воласцю цяглых павіннасцей. У іх раней пачало фарміравацца самакіраванне.

Значная колькасць невялікіх гарадоў і асабліва мястэчак былі на землях феадалаў (як свецкіх так і духоўных), з.гн. былі *прыватнаўласніцкімі,* належалі феадалам. На іх распаўсюджвалася ўсё правы феадалаў. Напрыклад, *Магілёў* у канцы XIV – пачатку XVI ст. належаў каралеве Ядвізе – жонцы польскага караля Ягайлы, з 1431 года – вялікаму князю ВКЛ Свідрыгайлу. У 1506 годзе горад быў падараваны Алене Іванаўне – жонцы польскага караля і вялікага князя ВКЛ Аляксандра. З 1514 года з'яўляўся ўласнасцю Ю. Зяновіча.

Большасць жыхароў гарадоў, акрамя заняткаў рамеством, мела зямельныя надзелы ў горадзе ці ў яго наваколлі, таму таксама, як і сяляне, выконвалі павіннасці на карысць уладальніка зямлі, феадала. Рамеснікі прыватнаўласніцкіх гарадоў павінны былі частку сваёй прадукцыі здаваць у гаспадарку феадала. Як правіла, становішча прыватнаўласніцкіх гарадоў было больш складаным у параўнанні з гарадамі на дзяржаўных землях, насельніцтва іх больш цярпела ад свавольства феадалаў. Разам з тым, сустракаліся выпадкі, калі феадалы, каб прыцягнуць у свае гарады насельніцтва, асабліва ад іншых феадалаў, надавалі часовыя *льготы новапрыбыўшаму* ў гарады насельніцтву, вызваляючы на некаторы час іх ад падаткаў.

Рост гарадскога насельніцтва, паглыбленне гаспадарчага падзелу паміж горадам і вёскай прывялі да паступовага фарміравання, выдзялення іх жыхароў у асобную, спецыфічную *сацыяльную групу, саслоўе* – ***мяшчанства.***

Тэрмін "*мяшчанства"* вядзе свае паходжанне ад слова "месца", як называлі ў той час гарады, "месцічы" – жыхары гарадоў, па-польскі "мешчанін". На Беларусі тэрмін "мяшчане" замацаваўся на працягу XV стагоддзя, калі ім пачалі называць *розныя катэгорыі гараджан* – рамеснікаў, дробных гандляроў, купецтва, што складалі *гарадское падатковае саслоўе*.

У больш шырокім сэнсе тэрмін падчас ужываюць да вызначэння увогуле *усяго гарадскога насельніцтва*. Але гэта недакладна, бо мяшчанамі былі толька частка насельніцтва гарадоў (падчас 50-60%), якая складалася з асабіста свабодных, вольных людзей, яны плацілі падаткі ў казну, падпарадкоўвалася гарадскому самакіраванню.

Умацаванню гарадоў, іх эканамічнаму і сацыяльнаму росту спрыялі *змены ў арганізацыі гарадскога жыцця,* што адбыліся з канца XIV і на працягу XV стагоддзяў. У гэты час атрымала далейшае развіццё і афіцыяльнае юрыдычнае замацаванне гарадское *самакіраванне гарадоў*, якое мела свае карані ў *вечавай*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

арганізацыі. *(аб існаванні X-XI стагоддзях у некаторых гарадах Веча казалася ў ранейшых лекцыях)*.

З канца XVI стагоддзяў ў ВКЛ з'яўляецца т.зв. ***Магдэбурскае права.*** Гэтая ***сістэма феадальнага гарадскога права*** ўзнікла ў XIII стагоддзі ў нямецкім горадзе Магдэбургу і паступова атрымала распаўсюджанне ў гарадах Усходняй Германіі, Цэнтральнай і Усходняў Еўропы. *Магдэбурскае права* вызначала становішча мяшчан, давала гарадам самакіраванне, судовы імунітэт, падатковыя льготы, устанаўлівала парадак выбару і функцыі гарадской улады. Рашэнне аб увядзенні Магдэбурскага права ў тым ці іншым горадзе прымаў Вялікі князь ВКЛ, а ў прыватнаўласніцкіх гарадах - іх уладальнікі, што падцвярджалася адпаведнымі дакументамі – "*Граматамі на магдэбургскае права."*

Першымі беларускімі гарадамі, што атрымалі Магдэбурскае права былі:

Вільня – 1387 г., - ***Брэст*** – 1390 г.,- ***Гародня*** – 1391 г. (непоўнае) і 1496г. поўнае, - ***Слуцк*** – 1441 г., - ***Полацк –*** 1498 г., - ***Менск*** – 1499 г. ***Навагрудак*** – 1511 г., ***Магілёў*** – 1577 г..

На працягу XV – XVII стагоддзяў Магдэбургскае права атрамалі *ўсе беларускія гарады* (як дзяржаўныя, так і прыватнаўласніцкія) і некаторыя *мястэчкі.* Але ў кожным выпадку былі свае асаблівасці прымяненні магдэбурскага права, яно спалучалася з мясцовымі традыцыямі, *звычаёвым* гарадскім правам. Грамата на Магдэбурскае права давала гораду і ўласны гэрб. Нормы Магдэбурскага права былі замацаваны і ў Статутах ВКЛ.

Набыццё Магдэбурскага права значна паўплывала на стан гарадскога насельніцтва, зрабіла гарадское жыццё больш *прывабным.* Але зауважым, што нормы Магдэбурскага права распаўсюджваліся *далёка не на ўсіх* жыхароў гарадоў, а толькі на тых, якія былі *асабіста свабоднымі.* Магдэбурскае права *не вызваляла гарады ад іх залежнасці* ад дзяржавы ці ўладальніка, а датычылася толькі арганізацыі гарадскога жыцця, рэгламентацыі праў і абавязкаў іх жыхароў.

Гарады, якія атрымалі Магдэбурскае права, *вызваляліся* толькі з пад улады *тэрытарыяльнай мясцоваў адміністрацыі* (ваявод, старостаў, дзяржаўцаў), а падпарадкоўваліся непасрэдна Вялікаму князю ці сваяму ўладальніку.

Найбольш значным у змяненні статуса гарадоў было тое, што у гарадах Магдэбурскага права ўсталёўвалася *асобная гарадская ўлада* самакіравання – **магістрат.** Магістрат – выбарны адміністрацыйны і судовы арган гарадскога самакіравання. Складаўся магістрат з гарадской ***рады*** і ***лавы.*** У яго склад уваходзілі таксама *войт* і *пісар*.

Рада займалася справамі гарадскога кіравання і суда па маёмасных і цывільных справах. Складалася рада з *радцаў* (ад 6 да 24 чалавек), якія *абіраліся* штогод агульным сходам мяшчан. Рада вызначала агульныя напрамкі развіцця гарадской гаспадаркі, усталёўвала нормы і правіла ўнутрыгарадскога жыцця, падаткі з гараджан і сачыла за выкарыстаннем іх на патрэбы горада. Клопацілася рада і аб бяспецы горада і гараджан, у яе распараджэнні былі гарадскія умацаванні, арсенал, узброенае апалчэнне (міліцыя). З ліку радцаў вылучаліся *бурмістры* (1 – 3 чалавекі), якія па чарзе вялі паседжанні рады і ажыццяўлялі некаторыя адміністрацыйныя функцыі па выкананню рашэнняў, прынятых радаю. (*Фактычна* ***рада*** *– гарадскі* ***савет,*** *гарсавет - у сучасным разуменні, існуе і зараз як орган мясцовага самакіраванняі. Па-беларуску: рада сінонім слова савет)*

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУ

Лава выконвала функцыі суда па крымінальных справах гараджан. (аб войтаўска-лаўніцкім судзе мы казалі, калі разглядалі судовую сістэму ВКЛ).

Цэнтральнае месца ў гарадской адміністрацыі займаў **войт,** пасада якога была ўведзена у некаторых гарадах нават раней за магдэбургскае права. Войт, як правіла, прызначаўся уладальнікам горада (дзяржавай ці феадалам), яму належала вярхоўная адміністрацыйная улада ў горадзе. *(войт па сваім функцыям - сучасны* ***мэр*** *горада)*.

Такім чынам, ажыццяўленне Магдэбурскага права ў беларускіх гарадах прывяло да ўсталявання асноўным прынцыпаў і форм самакіравання, якія і *сёння* з'яўляюцца *нормамі гарадкога жыцця.*

Разам з тым, ва ўмовах феадальных адносін, маёмаснай дыферэнцыяцыі гараджан, абмежаванасці права выбара ў магістрат толькі за жыхарамі, якія былі асабіста свабоднымі, і у выніку іншых абставін, *магістраты* часта пераўтвараліся ў орган *карпаратыўнага* кіравання горадам з боку *заможных гараджан, купцоў, цэхмістраў і іншай мяшчанскай алігархіі.*

Акрамя таго, значная частка жыхароў горада (у некаторых выпадках не менш паловы, а то і болей) не была асабіста свабоднай, а гэта значыць: - *не належала* да мяшчанскага саслоўя, - *не мела права* удзельнічаць у выбарах органаў самакіравання, - была *непадўладна м*агістрату, - і адпаведна *не магла* разлічваць на *абарону сваіх правоў* з боку гарадскога кіравання.

3. Эканамічнае жыццё гарадоў. Гандаль і транспарт.

Важным элементам магдэбурскага права былі эканамічныя стымулы для развіцця гаспадарчай дзейнасці ў гарадах. Зацікаўлены ў гэтым былі як самі жыхары гарадоў, якія імкнуліся да паляпшення ўмоў свайго жыцця, свояго дабрабыту, таксам і ўладальнікі гарадоў – дзяржава і феадалы – якія павялічвалі паступленні ў якасці падаткаў з гарадоў.

Гарады з магдэбурскім правам былі самастойнымі фінансава-гаспадарчымі адзінкамі. Яны неслі адказнасць за выкананне павіннасцяў, але разам з тым значная *частка прыбыткаў(падаткааў)* ад гаспадарчай дзейнасці заставалася непасрэдна ў гарадской *казне.* Таму магістраты шмат рабілі для гарадской гаспадарцы, падтрымкі развіцця рамяства і гандлю. У некаторых выпадках, гарады нават набывалі навакольныя землі, станавіліся калектыўнымі феадальнымі ўласнікамі.

Асновай эканамічнага жыцця гарадоў было **рамяство.** Менавіта яно давало галоўны прыбытак, было галоўнай вытворчай сілай.

Развіццё рамяства ў XV – XVI стагоддзях мела свае *асаблівасці,* раместная вытворчасць набывала некаторыя *новыя рысы.*

- Галоўнае было ў тым, што рамяство паступова пераходзіла ад працы *на заказ* да працы на *продаж, на рынак.* У выніку пашыраліся памеры вытворчасці, паляпшалася якасць прадукцыі, паглыблялася спецыялізацыя рамеснікаў.
- Праходзіў працэс *канцэнтрацыі* рамесніцкай вытворчасці *ў гарадах* і адпаведна *скарачалася* колькасць *сельскіх рамеснікаў,* частка якіх перасялялася ў гарады (сама ці перасялялася феадаламі). Сельскія рамеснікі працавалі на задавальненне ўласным патрэб ці патрэб сваёй вёскі і не маглі канкурыраваць з гарадскімі рамеснікамі на рынку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Адбывалася паглыбленне *спецыялізацыі* рамеснай вытворчасці. Гэты працэс непасрэдныі чынам адбіваўся на *якасці* прадукцыі, *ўдасканаленні* вытворчага працэсу, садзейнічаў росту яго *прадукцыйнасці.*
- Рост памераў рамеснай вытворчасці выклікаў пашырэнне *грашова-рынкавых адносін, узрастанне ролі гандлевай і фінансавай* дзейнасці ў жыцці гарадоў і ўсяго грамадства.

Сучасныя гістарычныя даследаванні не утрымліваюць больш-менш дакладных звестак аб *колькасці рамеснікаў* у беларускіх гарадах XV – XVI стагоддзяў. Агульна прынята выснова, што колькасць іх павялічвалася, аб чым сведчаць асобныя звесткі па некаторых гарадах. У сярэдзіне XVI стагоддзя колькасць рамеснікаў вагалася ад 20 да 40 % гарадскога насельніцтва. Больш дакладна можна казаць аб колькасці рамеснікіх *спецыяльнасцей.*

Беларускія гісторыкі лічаць, што у канцы XYI – першай палове XYII стагоддзя было каля *200 рамесніцкіх спецыяльнасцей*, з іх 41 спецыяльнасць была звязана з апрацоўкай ***метала,*** 27 – з апрацоўкай ***дрэва,*** 25 **– *скураной*** і футравай выцтворчасцю, 26 – з вырабам ***тканін*** і пашывам адзення, 21 – з вырабам прадуктаў ***харчавання і напояў***. Вызначаецца, што найбольш разнастайнай была спецыялізацыя ў *дзяржаўных* гарадах, менш – у *прыватнаўласніцкіх,* дзе налічвалася калі 120 рамесніцкіх прафесій.

У буйных гарадах таго часу магло быць да 80-ці рамесніцкіх спецыяльнасцей, у сярэдніх – ад 40 да 60, у невялікіх – 20-30 спецыяльнасцей рамеснай вытворчасці.

Сярод найбольш распаўсюджаных рамесных спецыяльнасцяў былі:

- звязаныя з апрацоўкай *метала. Кавалі* меліся ў той час паўсюдна. Меліся і вузкія спецыялізацыі па апрацоўке металу - *слесары, мечнікі, пушкары* і інш. Інтэнсіўна развівалася ювелірная справа, *ювеліры* выраблялі залатыя, сярэбраныя і іншыя прадметы побыту і ўпрыгожванні.
- Шматлікай была дыфенцыяцыя рамеснікаў, што займаліся першаснай апрацоўкай *скур – гарбары, кажамякі, балтушнікі, дубатолкі* і інш. Калі 5-6 спецыялізацый было ў *шавецкай* справе – *кушняры, шубнікі, замшавікі* і інш.
- Шырока былі прадстаўлены рамёствы, звязаныя з працай па *дрэву.* Былі *цесляры, пільнікі,* асобныя спецыяльнасці па вырабу транспартных сродкаў – *вазоў, рачных судоў, колаў* і інш., прыладаў працы, *посуду* (вёдраў, талерак і інш.), *бондарскіх вырабаў* (бочак, кадзяў інш.).
- З'яўляюцца і будаўнічыя спецыяльнасці – *муляры, печнікі, капачы (капалі землю пад калодзежы, фундаменты і інш.)*. Меліся спецыялісты па узвядзенню і рамонту мастоў – *борці.*
- Сустракаюцца ўпамінані ў гістарычных дакументах і аб *новых* спецыяльнасцях рамеснікаў – *саленнікі* (займаліся атрыманнем *солі*, у тым ліку і высокаякаснай), *шкляры* (выраб *шкла* з мясцовай сыравіны)
- На задавальненне патрэб гарадскога насельніцтва значную колькасць рамеснікаў складалі *півавары, медавары, хлебнікі, пірожнікі* і інш, што былі звязаны з вырабам харчавання і напояў.

Пераважная большасць названых спецыянасцяў была прадстаўлена *гарадскімі* рамеснікамі, але значную частку больш простых рамесных вырабаў давалі і *сельскія* рамеснікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Існаванне разнастайных спецыяльнасцяў сярод рамеснікаў выклікала новую *сацыяльную з'яву* – з'яўленне *карпаратыўных* арганізацый рамеснікаў *адной ці некалькі блізкіх спецыяльнасцяў*, якія аб'ядноўваліся ў ***цэхі.*** Ствараліся цэхі для абароны рамеснай вытворчасці ад самавольства феадалаў, канкурэнцыі іншых рамеснікаў, манапалізацыі вытворчасці і збыту прадукцыі, абароны агульных і асабістых правоў вытворцаў.

Унутраная дзейнасць *цехоў* вызначалася Статутамі, якія рэгламентавалі *вытворчасць і збыт* прадукцыі, *якасць* сыравіны і гатовых прадуктаў, *тэхналогію* вытворчых працэсаў, *час і ўмовы* работы, арганізацыю *навучання* і інш. Статуты цэхаў рэгламентавалі ўсе бакі адносін паміж членамі цэха, прадуглежвалі сістэму *пакаранняў* за парушэнне норм вытворчай дзейнасці, асабістых адносін і абавязкаў перад царквой і гарадскоў радай.

Цэхі таксама кантралявалі работу і паводзіны сваіх членаў, наладжвалі ўзаемадапамогу. Цэхі ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці горада, знаходзіліся пад юрысдыкцыяй магістрата, неслі вайскавую і іншыя павіннасці на карысць дзяржавы ці ўладальніка горада.

Паўнапраўнымі членамі цэхаў былі *майстры* – рамеснікі, якія мелі ўласную вытворчасць, кваліфікацыю, а таксама сямейны маральны цэнз. Майстрам падначальваліся *падмайстры,* якія працавалі на майстра, набывалі кваліфікацыю. Адпрацаваўшы пэўны час на майстра, падцвердзіў сваю кваліфікацыю *падмайстр*, выканаўшы ўсе ўмовы, што былі замацаваны ў Статуце цэха, мог стаць майстрам, што павінна было падцверджана цэхам. У склад цэхаў уваходзілі і *вучні,* якія працавалі на майстра. Пасля заканчэння навучанні яны маглі перайсці на пасаду падмайстра.

На чале цэхаў стаялі *цэхмістры,* якія выбіраліся штогод толькі паўднапраўднымі членамі цэха – майстрамі. Цэхмістры *захоўвалі* цэхавы скарб, касу і дакументы, пячатку і харугву цэха, *наглядалі* за выкананнем членамі цэха ўсіх патрабаванняў цэхавага статута, *сачылі* за вытворчай дзейнасцю членаў цэха, якасцю прадукцыі, *праводзілі судовы* разбор па ўнутрыцэхавых спаравах і спрэчках, вызначалі меру пакарання. Цэхмістры ўваходзілі ў склад органа гарадскога самакіравання – магістрата, дзе прадстаўлялі інтарэсы сваяго цэха і яго членаў. У буйных цэхах меліся пасады *падцэхмістраў*, а таксама *пісара, ключніка, шафара* (*займайся раскладам і зборам падаткаў сярод членаў цэха)* і інш.

Усе названыя рысы і асаблівасці рамеснай вытворчасці сведчалі аб далейшым узрастанні яе ролі і месца ў эканамічным жыцці грамадства.

З развіццём рамеснай вытворчасці самым непасрэдным чынам было звязана развіццё і пашырэнне **гандлю.** Выраб рамеснікамі прадукцыі на рынак, на продаж патрабаваў і адпаведнай арганізацыіі яе збыту. З свайго боку, развіццё і пашырэнне як унутранага, так і знешняга гандлю было стымулам доля развіцця вытворчасці. У такіх умовах, у такой узамасувязі арганізацыя гандлю набывала самастойнае значэнне, яго роля *як пасрэдніка паміж вытворцам і спажыўцом* пачынала станавіцца важным фактарам эканамічнага жыцця. Больш таго, гандлёвая дзейнасць для пэўнай катэгорыі людзей становіцца *самастойнай крыніцай атрымання сродкаў* праз адрозненне цэн, па якіх закупалася і рэалізоўвалася прадукцыя.

Цэнтрам гандлёвых аперацый у той час з'яўляўся *гарадскі рынак,* які меўся у кожным горадзе і падаткі з якога атрымлівалі гарадскія ўлады. Таксама ўладальнікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гарадоў праводзілі некалькі раз у год *кірмашы,* дазвол на якія даваліся дзяржаўнымі прывілеям, і падаткі на продаж з іх таксама шлі ў казну, ці феадалу.

На рынках вялі продаж, ажыццяўлялі гандлёвыя аперацыі некалькі катэгорый прадаўцоў:

- айчынныя і замежныя *купцы*, якія займаліся продажам закупленымі мясцовымі ці замежнымі таварамі;
- *рамеснікі,* якія гандлявалі сваімі вырабамі;
- з'явіліся і *гандляры*, што рэалізоўвалі тавары, набытыя у купцоў, рамеснікаў, сялян - "т.зв. "перакупні", "прасолы";
- на рынку гандлявалі і *сяляне,* што прывозілі ў горад прадукты сваёй гаспадаркі і промыслаў.

На працягу XV стагоддзя фарміруецца агульнадзяржаўны рынак ВКЛ. Дзяржава падтрымлівала гэты працэс шляхам адмены ў першаю чаргу мытных збораў паміж найбольш значнымі эканамічнымі цэнтрамі.

Шмат увагі у той час надавалася *арганізацыі* як унутранага, так і знешняга гандлю. Складваецца цэлая сістэма *правілаў арганізацыі* продажу, дазволаў і забарон, уплаты *падаткаў* з куплі-продажу тавараў, існавала разгалінаваная сістэма *мытных плацяжоў*.

Напрыклад, існаваў дакладна вызначаны парадак правядзення *таргоў,* якія павінны былі праходзіць кожны тыдзень у адзін і той жа день. На іх дазваляўся свабодны рознічны і аптовы гандаль усіх удзельнікаў. З усіх тарговых аперацый уплачваліся разнастайныя ***падаткі*** – існавала старое і *новае мыта* (падаткі пры перасячэнні межаў зямель, княстваў, ваяводстваў), *маставое мыта* (за праезд мастоў), падатак на карысць *гарадскіх улад*, дзе праходзілі таргі, мыта *тарговае (кірмашовае), памернае* і інш. Тарговае мыта бралася, напрыклад, за продаж вала ці каровы – 1 грош, каня- 1 грош, жывой ці забітай свінні, барана, казы, цяляці і інш. жывёлы (па 3 пенезі). Нават рэзнікі жывёлы на рынку павінны былі плаціць з кожнай забітай жывёлы.

Існавала шырокае кола ўселякіх *абмежаванняў*. Замежныя купцы маглі праводзіць гандлёвыя аперацыі толькі ў гарадскіх паселішчах, ім было забаронена закупляць сыравіну і гандляваць сваімі таварамі ў сёлах. Мяшчане ж гарадоў ВКЛ маглі свабодна купляць тавары ў сельскай мясцовасці. Існавалі і пэўныя *прывілеі* пры правядзенні тарговых аперацый. Напрыклад, калі на таргах прадавалася прадукцыя з панскага фальварку, ніхто не мог прадаваць такі самы прадукт, пакуль не раскупяць панскі.

На гарадскіх рынках і кірмашах для штодзённага гандлю ўзнікаюць *крамы,* а для складзіравання тавараў – *каморы*. Валодалі імі мяшчане, яўрэі, трымалі іх і шляхта, якія плацілі па вызначаных нормах падаткі мясцовым органам. Гарадскія улады кантралявалі таксама ўсю *сістэму гандлёвых мер і вагі,* за што таксама бралі падаткі. Назіралася таксама ўсталяванне *кантролю за цэнам*і з мэтай іх стабілізацыі і недапушчэння дарагавізны.

З развіццём гандлю узнікаюць і *грашова-крэдытныя аперац*ыі, якія таксама падпадалі пад рэгуляванне ўлады.

Такім чынам, гандаль становіцца важнай састаўной часткай эканамічнага развіцця, набывае пэўную сістэму нормаў і правілаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Знешні гандаль развіваўся ў тых накірунках, што склаліся раней, але ён набыў некаторыяновыя рысы, з'ўляўся значнай крыніцай дзяржаўнага даходу.

Пры перасячэнні дзяржаўнай мяжы, а таксама па шляху прасоўвання ў межах краіны купцы павінны былі на мытных каморах плаціць разнастайныя пошліны *(мыты),* перапісваць свой тавар, паведамляць яго склад і колькасць, кошт і месца прызначэння. У выпадку выяўлення незаяўленага тавару ён канфіскоўваўся на карысць вялікага князя і мытнікаў.Толькі на тэрыторыі цэнтральнай і паўднёвай Беларусі у канцы XV стагоддзя мыты збіраліся у 25 гарадах, у першай палове XVI стагоддзя існавала каля 10-ці дзяржаўных мытных камор. Існавалі дакладна вызначаны пералік тавараў і стаўкі мытных пошлін, якія складалі ад 1,7% да 4, 2 % ад кошту тавара. Найбольш высокія стаўкі пабораў – да 10%, існавалі на прывезенаю ці прададзеную рыбу.

Новым у развіцці замежнага гандлю было тое, што зыходзячы з геаграфічнага становішча беларускіх зямель праз іх ажыццяўляўся ***транзіт*** тавараў з Расіі ў заходнюю Еўропу. Заходняя Еўропа была важным накірункам *экспарту тавараў і непасрэдна з ВКЛ.* Змест экспарту змяняўся ў залежнасці ад кан'юктуры, попыту тавараў і цэн на замежным рынку.

Асноўным прадметам экспарту ВКЛ з'яўлялася *сыравіна.,* прадметы рамеснай вытворчасці займалі ў ім незначнае месца. У першай палове XV стагоддзя вывозілі ў асноўным *воск і футра,* у другой палове XV стагоддзя да іх далучыліся таксама *лён, пянька*, лясныя тавары – *драўніна* для караблебудавання, *попел, дзёгаць*. З канца XV стагоддзя стала экспартавацца *збожжа.* У складзе імпарта з Заходняй Еўропы найважнейшае месца займалі *соль*, розныя віды *тканін,* жалезныя вырабы – *косы, сярпы, сякеры, нажы* і інш., сярод харчовых тавараў – *селядцы, прыправы.*

У гандлі з Расіяй пераважалі тавары з Заходняў Еўропы, што перакупляліся ў заходніх купцоў, а потым перапрадаваліся ў рускіх княствах. З мясцовых беларускіх вырабаў у вялікай колькасці вывозіліся з ВКЛ на усход скураны абутак, вупраж, адзенне, гаршкі.

Пашырэнне гандлю суправаджалася развіццём ***шляхоў зносін.*** Галоўнымі з іх былі *водныя* артэрыі – буйныя рэкі Нёман, Вілія, Заходні Буг, Дзвіна, Днепр і іх прытокі. На іх сталі ўзнікаць прыстані, склады тавараў, праводзіліся ачышчальныя работы, развівалася будаўніцтва транспартных сродкаў, якімі былі *платы*, разнастайныя рачныя судны – *стругі, шкуты, байдакі, чаўны* рознай канструкцыі.

У XV – XVI стагоддзях склалася на тэрыторыі Беларусі і разгалінаваная сетка *сухапутных шляхоў*. Узніклі і былі абустроены ўсе і зараз існуючыя *важнейшыя дарогі*, у тым ліку з *Смаленска* праз Оршу, Барысаў, Менск на *Гародню* і далей на захад, з *Мазыра* праз Пінск, Кобрын да *Берасце*, а таксама з *Вільні* на Навагрудак, Барысаў, Берасце і інш. У якасці сухапутных транспартных сродкаў летам выкарыстоўваліся *вазы,* (у большасці адна-двух конныя, але сустракаліся і 4-х, 6-8 конныя), у зімовы перыяд – сані. Многія жыхары Беларусі наймаліся да купцоў у якасці перавозчыкаў (фурманаў), што давала недрэнны прыбытак. У цэлым транспартная сістэма на Беларусі ў XV – XVI стагоддзях задавальняла існаваўшыя патрэбы, забяспечвала дастаўку тавараў. Можна нават лічыць, што ў той час *транспарт і яго абслугоўванне* вылучыліся як важная, самастойная частка гаспадаркі, эканамічнага жыцця.

Такім чынам, падводзячы вынікі разгляду *эканамічнага* жыцця ВКЛ і беларускіх зямель у прыватнасці, можна зрабіць выснову, што яно стала больш *разнастайны*м, ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ім з’явіліся якасна *новыя рысы*, у тым ліку і пачаткі *грашова-рынкавых адносін*, што было праявай *агульнаеўрапейскіх* тэндэнцый таго часу.

Тэма 4.3 ЦАРКВА І КАНФЕСІІ ў ВКЛ

План:

1. Асаблівасці этнаканфесійнай гісторыі ВКЛ.
2. Становішча праваслаўнай царквы ў ВКЛ.
3. Арганізацыя каталіцкай царквы.
4. Рэфармацыя і контррэфармацыя
5. Спробы рэалізацыі царкоўнай уніі
6. Нехрысціянскія канфесіі.

1. Асаблівасці этнаканфесійнай гісторыі ВКЛ.

У гісторыі чалавецтва перыяда сярэднявечча значнае месца займала ***царква,*** якая адыгравала важную ролю не толькі ў *духоўным жыцці людзей*, фарміравала іх *светапогляд*, але і прымала ўдзел ў працэсах стварэння і ўмацавання тагачаснага *дзяржаўнага ладу,* з’яўлялася элементам *гаспадарчага, эканамічнага* жыцця, займала вядучую ролю ў *этнакультурных* працэсах.

На развіццё царкоўна-канфесійных адносін у ВКЛ, асабліва на беларускіх землях, непасрэдным чынам уплывала і становішча паміж *каталіцкім захадам* і *праваслаўным усходам*, якія імкнуліся павялічыць свой *уплыў* на беларускіх землях. Беларускія землі былі аб’ектам супрацьстаяння каталіцтва і праваслаў’я.

Рэлігійны фактар займаў важнае месца *ў дзяржаўнай* як унутранай так і знешняй *палітыцы* ВКЛ. Не выпадкова, што менавіта тут з’яўвіліся тэндэнцыі пераадолення раскола ўнутры хрысціянства, ажыццяўляліся спробы прымірэння і дасягнення *ўніі* паміж каталіцызмам і праваслаў’ем.

У гісторыі развіцця царкоўна-канфесійных адносін у ВКЛ у XIII – XVI стагоддзях гісторыкі вызначаюць некалькі *этапаў.*

Першы з іх ахоплівае перыяд з канца XIV да пачатку XV стагоддзяў, перыяд складвання ВКЛ як дзяржавы. У гэты час на землях Беларусі, Польшчы і Украіны панавала *хрысціянства*, а на тэрыторыі Літвы – *язычніцтва.* Таму першы перыяд ВКЛ – гэта перыяд *сімбіёзу хрысцыянства і язычніцтва*, калі ў грамадстве існавала язычніцка-хрысціянская супольнасць, што, на думку гісторыкаў, можна лічыць *феноменам* еўрапейскай дзяржаўнай і этнаканфесійнай гісторыі. (*назваць гэта феноменам, выключэннем з правіл, можна таму, што такога не было ў іншых народаў і ў іншых краінах Еўропы)* Існаваннем такога становішча былі закладзены падставы для захавання ў далейшым грамадскай і канфесійнай *талерантнасці* (цярпімасць) ў ВКЛ. *Талерантнасць* выяўлялася ў адносінах да звычаяў і традыцый народаў і этнічных груп, у гаспадарчых, гандлёвых, побытавых кантактах, у палітычнай і духоўнай дзейнасці кіруючых колаў і розных пластоў насельніцтва.

Другі этап этнаканфесійнай гісторыі ВКЛ працягваўся з сярэдзіны XV да сярэдзіны XVI стагоддзя. У гэты час язычніцтва было ўжо выцеснена хрысціянствам, але і ў ім самім з’яўляюцца і набываюць узмацненне працэссы рэфармацыі, з’яўляецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пратэстанцыянізм. У ВКЛ існавалі і супернічалі 3 хрысціянскія цэрквы – праваслаўе, каталіцызм і пратэстанцтва.

Трэці этап пачынаецца ў другой палове XVI стагоддзя, пасля Люблінскай уніі, калі пэўная раўнавага ў міжцаркоўных адносінах была парушына, *ўзмацняюцца пазіцыі каталіцтва*, якое набывае рысы *дзяржаўнай* канфесіі. У гэты час узмацняецца і набывае рэальны выгляд *канфесіны падзел* паміж рознымі сацыяльнымі групамі: пануючыя класы – магнацтва і шляхта становяцца ў сваёй большасці *каталіцкімі,* у той час, як сярод мяшчанства і асабліва сялянства захоўваецца ўплыў *праваслаў'я.*

2. Становішча праваслаўнай царквы ў ВКЛ.

У ВКЛ праваслаўная царква апынулася і існавала ў незвычайна сваеасаблівам і складаным становішчы.

З аднаго боку, праваслаўная царква працягвала непадзельна *панаваць* у тых рускіх княствах (на усходніх беларускіх землях), якія ўвайшлі ў склад ВКЛ і працяглы час захоўвалі ў ім пэўную самастойнасць. Тут праваслаўная царква мела фактычна *дзяржаўны статус*, знаходзіла падтрымку з боку княжацкай ўлады і дзяржаўных фарміраванняў.

З другогу боку, праваслаўная царква з утварэннем ВКЛ стала залежнай ад пануючай *літоўскай дынастыі*, якая абапіралася на язычніцкае літоўскае насельніцтва, а таксама ў мэтах умацавання дзяржаўнасці мела арыентацыю на каталіцкую царкву, шукала падтрымкі ў Вацікане.

З XIV стагоддзя беларускія землі уваходзілі ў склад некалькіх праваслаўных царкоўна-адміністрацыйных епархіальных структур: *Кіеўскай* мітраполіі (усходняя і паўднёва-усходняя частка Беларусі), *Галіцка-Валынскай* мітраполіі (заходнія і паўднева-заходнія землі ВКЛ) і *Літоўскай* мітраполіі (паўночна-заходнія землі). Начале іх стаялі *мітрапаліты (архіпастыры)*, якія займалі вышэйшую ступень у духоўнай іерархіі.

У складзе мітраполій былі *епархіі,* заснаваныя на асобных землях і наместніцтвах. Напрыклад, у складзе Літоўскай мітраполіі былі Наваградская, Полацкая і Тураўская епархіі. Усяго ў XIV – XV стагоддзях у ВКЛ было *8-9 праваслаўных епархій*. Начале праваслаўных епархій былі *епіскапы*, якія таксама ўваходзілі ў склад вышэйшага духавенства.

Ніжэйшым структырным элементам мітраполіі і епархій з'яўляліся *прыходы,* якія ахоплівалі непасрэдна насельніцтва паветаў, сёл і гарадскіх паселішчаў.

Вызначыць колькасць праваслаўных храмаў, *цэркваў,* што існавалі ў той час, немагчыма, але існавалі яны паўсюдна, будаваліся з дрэва і таму каштавалі нядорага, часта ўзводзіліся не толькі на епархіяльныя сродкі, але і на абшчынныя грошы саміх сялян. Большасць цэркваў размяшчаліся ў *вёсках і мястэчках*.

Значная колькасць праваслаўных храмаў была і *гарадах*. Дакладна вядома, што ў сярэдзіне XVI стагоддзя у Бересце іх было 9, у Віцебску – 7, у Гародні – 6, Наваградку – 10, Пінску – 14, Полацку – 9. Клецку – 5 і г.д. Усяго у буйных і сярэдніх гарадах Беларусі праваслаўных храмаў было больш за 100.

У навуковай літаратуры выказваецца меркаванне, што па ўкосных звестках у сярэдзіне XVII стагоддзя на тэрыторыі Беларусі існавала 1,5 – 2 тысячы праваслаўных храмаў.

На землях Беларусі дзейнічалі некалькі дзесяткаў праваслаўных *манастыроў.* Існавалі яны па некалькі ў большасці паветаў. Напрыклад, у Менскім – 4, Віцебскім –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4, Аршанскім - 5, Слонімскім – 2 і г.д. Усяго у сярэдзіне XVI стагоддзя было *51 – 56 праваслаўных манастыроў*, з іх 8 – 10 жаночых. Царкоўна-манастырскімі цэнтрамі праваслаўнай мітраполіі былі таксама Вільня (3 праваслаўныя манастыры і 16 праваслаўных цэркваў), Наваградак, Менск, Полацк.

Такім чынам, ёсць падставы сцвярждаць, што праваслаўная царква па колькасці прыхаджан, храмаў, памерах кананічнай тэрыторыі заставалася самай *уплывовай і распаўсюджанай* у Беларусі ў часы ВКЛ.

3. Арганізацыя каталіцкай царквы.

Узнікненне арганізацый каталіцкай царквы ў ВКЛ гісторыкі звязваюць з вялікім князем ***Ягайлам,*** які пры прыняцці польскага каралёўства ў *1386* годзе сам прыняў *каталіцызм*, хрысціў у каталіцкую веру сваіх набліжаных. У наібліжэйшы час, услед за вялікім князем да каталіцкай веры далучаецца знаць і баяры ВКЛ, вышэйшыя службовыя асобы.

У 1387 годзе было заснавана ***Вілепнскае біскупства*** - першая царкоўна-адміністрацыйная адзінка рымска-каталіцкай царквы у ВКЛ. Быў выдадзены вялікі *фундацыйны прывілей Ягайлы*, у якім быў вызначаны і замацаваны *прававы статус каталіцкай царквы*, прызначалася яе матэрыяльнае забяспячэнне – перадаваліся землі, вызначаліся павіннасці і падаткі з насельніцтва на карысць касцёла. Ягайла ў абмен на польскую карону даў абяцанне прывесці ўсё насельніцтва Вялікага княства да каталіцкай веры.

Акрамя таго на тэрыторыі ВКЛ некалькі пазней былі утвораны *Жамойцкае* (1413 г.) і *Луцкае* біскупствы. У склад апошняга уваходзілі парафіі, што існавалі на некаторых тэрыторыях паднёва-заходняй часткі Беларусі.

На чале біскупства стаяў ***біскуп.*** Яго духоўны сан у каталіцкай царкве адпавядае сану епіскапа ў праваслаўнай царкве. Першымі Віленскімі біскупамі былі Андрэй (1388 – 1398), Якуб Пліхта (1398 – 1407), Мікалай Бяркоўскі (1408 – 1414) і інш. *(гл. Энцыклапедыю гісторыі Беларусі. Т.2. С. 272. Пералічаны ўсе біскупы*). Штодзённымі справамі біскупства займалася *біскупская курыя,* якая падзялялася на канцалярыю, духоўны суд – *кансісторыю,* і прыватны двор біскупа, у якім былі пасады маршалка, падскарбія, кухмістра, ключніка, капелана і інш.

Пры біскупе існавала калегія духоўных асоб - ***капітул,*** для выраўэння важных пытанняў біскупам склікаліся ***сіноды*** (з'езды) каталіцкага духавенства.

Наступнай, пасля біскупства, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай каталіцкай царквы была ***дыяцэзія*** (дыяцэза), якая адпавядала праваслаўнай *епархіі.*

Ніжэйшай тэрытарыяльна-адміністрацыйнай адзінкай рымска-каталіцкай царквы ў складзе дыязэціі з'яўлялася ***парафія*** (***плябанія)***, яна адпавядала праваслаўнаму прыходу. Узначальвалася яна ***пробашчам***, у каталіцкай царкве ён называўся ***ксёнзам,*** які з'яўляўся настаяцелем парафіяльнага (*галоўнага ў парафіі*) касцёла.

Тэрыторыя створанага Віленскага біскупства ахоплівала літоўскія і большаю частку беларускіх зямель. Яна падзялялася на *7 парафій,* з якіх 3 знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі – у Абольцах, Гайне і Крэве. Да 1430 года узнікла яшчэ 20 парафій. Усяго ў сярэдзіне XVI стагоддзя ў 17 паветах ВКЛ дзейнічала 259 парафій.

Храмы рымска-каталіцкай царквы – ***касцёлы*** (*тэрмін "**касцёл**" выкарыстоўваецца таксама і для вызначэння рыска-каталіцкай царквы як арганізацыі – каталіцкі касцёл, польскі касцёл*) выконвалі розныя функцыі і падзяляліся па сваяму статусу на:

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

базілікі (касцёлы са спецыяльнымі папскімі прывілеямі), ***кафедральныя (***дзе знаходзілася кафедра епіскапа),

кляштарныя (пры манаскіх ордэнах),

парафіяльныя ці фарныя (галоўныя, цэнтральныя ў парафіі),

філіяльныя (у складзе парафіі, прыхода).

Найбольш значнымі *парафіяльными касцёламі*, пабудаванымі на тэрыторыі Беларусі, былі касцёлы ў Крэва (1387 г.), Навагрудку (1393 г.), Лідзе (1397 г.), Браславе (1423 г.), Гародне, Ваўкавыску (1430 г.). За перыяд з 1430 па 1500 год было пабудавана *129 касцёлаў*

Акрамя таго ўзнікалі *капліцы* - невялікія збудаванні (малы касцёл), як правіла на скрыжаванні дарог са статуяй святога для малітвы. Настаяцелем капліцы з'яўляліся *капеланы.*

Эканамічную аснову каталіцкай царквы складалі ***фундушы.*** *Фундацыя* – гэта ахвяраванне (а таксама дарэнне, завяшчанне) манастырам, цэрквам, касцёлам і іншым царкоўным установам і іх кіраўнікам. Рабілі іх дзяржава ці феадалы звычайна для заснавання духоўных устаноў і іх матэрыяльнай падтрымкі.

Асноўнай формай фундуша *дзяржавы і насельніцтва* ў першай палове XVI стагоддзя была *дзесяціна* - натуральны падатак збожжам у памеры адной дзесятай часткі ўраджаю. У выніку валочнай памеры у дзяржаўных уладаннях дзесяціна была з*аменена* надзяленнем касцёлаў *зямлёй* у памеры 1-2 валок, даходы з якой ішлі касцёлу.

Феадалы ахвяравалі, дарылі і завяшчалі на карысць царквы (як правіла мясцоваму касцёлу) землі з сялянамі, сенажаці, лясы, вёскі, маёнткі, грошы, каштоўнасці, рухомую маёмасць, сялянскія павіннасці і інш.

Акрамя таго, з боку *вялікіх князеў літоўскіх* выдаваліся спецыяльныя *Прывілеі,* якія надавалі каталіцкай царкве значныя ільготы і буйныя землеўладанні. Пры ўтварэнні Віленскага біскупства ў 1387 годзе Вялікі князь вызначыў касцёлу матэрыяльнае забяспячэнне – землі, даходы і павіннасці з боку падданага насельніцтва. У складзе зямель, што адрымала Віленскае біскупства былі і дзве значныя воласці Беларусі – *Баштыи Дуброўна.* У наступным годзе Віленскае біскупства ад Вітаўта атрымала некалькі вёсак у Берасцейскай і Ваўкавыскай валасцях, а крыху паздней – цалкам вялікую воласць у Беларусі – *Ігумен* (*зараз Чэрвень*). Зямельная маёмасць Віленскага біскупства ў 1430 годзе дасягалане не менеў 100 вёсак, 1300 дымоў. Яшчэ больш яна пашыралася ў далейшыя гады. У першай палове XVI стагоддзя Віленскае біскупства пераўтварылася *ў буйнешага духоўнага феадала*: у яго латыфундыях налічвалася каля 11500 дымоў, каля 81 тысячы насельніцтва абодвух палоў.

З утварэннем *Жамойцкга біскупства* яму таксама былі падараваны землі, дзе пражывалі каля 300 сялянскіх дымоў. Мела на тэрыторыі Беларусі свае ўладанні і *Луцкае біскупства.*

Прывілеі, выдадзеныя вялікімі князямі ВКЛ каталіцкаму касцёлу, надавалі яму і іншыя значныя правы. Вышэйшыя асобы каталіцкай царквы *ўваходзілі ў склад Рады ВКЛ*, разам з буйнейшымі феадаламі прымалі ўдзел у вырашэнні дзяржаўных спраў. Падчас правы, надзеныя каталіцкай царкве, ўшчамлялі правы праваслаў'я, якое апынулася ў дыскрымінацыйных умовах. Дастаткова казаць, што паводле пастановы, выдадзенай у 1481 годзе вялікім князем Казімірам, на тэрыторыі ВКЛ *было забаронена*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*будаўніцтва праваслаўных храма*ў. Такое становішча існавала амаль 30 год, толькі 1507 годзе была выдадзена грамата аб фундушу на карысць праваслаўнай царквы.

Галоўную ролю у пашырэнні каталіцызму на беларускіх землях адыгравалі **манаскія жабрацкія ордэны**. (**жабрацкія** – ордэны, якія патрабуюць ад сваіх членаў зароку беднасці, адмовы ад маёмасці, існавання на міласціну, падаянне, былі афіцыйна прызнаны папствам). Асаблівасцю іх былі: - непасрэдная падпарадкаванасць Папе і самастойнасць ад біскупства; - разнастайнасць па сваіх уставах; - місіянерская дзейнасць. Месцам знаходжання манахаў з'яўляліся **кляштары,** канвенты (манастыры), пры іх існавалі кляштарныя касцёлы. Як правіла, манастыры не мелі значных зямельных уладанняў, таму і лічыліся "жабрацкімі."

У ВКЛ першыя манаскія ордэны з'яўляюцца з Еўропы ў XIV стагоддзі,

Манастыры (канвенты) ордэна ***францысканцаў*** былі ўтвораны ў Вільні, Пінску (1396 г.), Лідзе (1397 г.), Ашмянах (1505 г.),

Ордэн ***бернардынцаў*** заснаваў кляштары ў Гродна (1494 г.), Полацку (1498 г.), Будславе (1504 г.), іх колькасць значна павялічылася ў 17 стагоддзі.

Ордэн ***аўгусцінцаў*** заснаваў кляштары ў Бярэсці (1410 г.), Гародні (1503 г.), Міхалішках (Астравецкі раён) 1653 г.

Першы касцёл ***кармелітаў*** быў заснаваны ў Вільні ў 1506 годзе.

Фундатарамі пры заснаванні кляштароў манаскіх ордэнаў выступалі, як правіла, буйнейшыя феадалы, магнаты, а таксаміа вышэйшыя дзяржаўныя асобы ВКЛ, на сродкі якіх будаваліся і ўтрымліваліся касцёлы, кляштары.

У сярэдзіне XVI стагоддзя на тэрыторыі ВКЛ дзеінічалі **8** каталіцкіх манаскіх ордэнаў, якія мелі больш за ***25 кляштароў*** (манастыроў). Найбольш актыўна пашыралася сетка кляштароў манаскіх ордэнаў на тэрыторыі Беларусі ў наступным XVII стагоддзі.

4. Рэфармацыя і контррэфармацыя

Рэлігійнае жыццё ВКЛ адбывалася пад уплывам тых працэсаў, што адбываліся ў перыяд сярэднявечча і ва ўсёй Еуропе.

У сярэдзіне XVI стагоддзя ў ВКЛ пачалося распаўсюджанне ідэй ***Рэфармацыі.*** *Рэфармацыя* – гэта шырокі сацыяльна-палітычны і ідэалагічны рух ў Еўропе, накіраваны супраць значнай ролі рымска-каталіцкай царквы. Ідэйнымі крыніцамі Рэфармацыі былі ідэі *гуманізма* эпохі Адраджэння. Ідэолагі рэфармацыі (М. Лютар, Ж. Кальвін, Т. Мюнцер і інш.) выступалі за адмену царкоўнай дзесяціны і пышнага каталіцкага культу, за секулярызацыю (адчужэнне) царкоўнай маёмасці, перш за усё зямель, на карысць дзяржавы і прыватных асоб, стварэнне танных самастойных нацыянальных цэркваў. Рэфармацыя знайшла сваё увасабленне ў розных формах т.зв. ***пратэстантызму,*** асобнымі плынямі якога з'яўляліся *кальвінізм, лютэранства* і інш.

Такія ідэі пазбаўлення ад усеуладдзя з боку каталіцкай царквы, якая пераўтварылася ў буйнога феадальнага ўласніка, займала ключавыя пазіцыі ў дзяржаве, знаходзілі сваіх прыхільнікаў сярод розных пластоў грамадства ВКЛ. Гараджане імкнуліся вызваліцца аб феадальнай залежнасці, магнаты і шляхта разлічвалі захапіць багацце і зямельныя уладанні царквы, гарадскія нізы і сяляне змагаліся супраць уціску царкоўных феадалаў.

Асаблівасцю Рэфармацыі, пратэстантызму ў ВКЛ было тое, што асноўнай яе рухаючай сілай была *феадальная знаць, магнаты і заможная шляхта,* якія жадалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

захаваць адасобленасць сваёй ***дзяржавы і царквы*** ад Польшчы. Таму яны спрыялі ўтварэнню пратэстанскіх абшчын, ахвяравалі на гэта сродкі. Галоўным пратэктарам Рэфармацыі ў ВКЛ у 50 – 60-я гады XVI стагоддзя быў ***Мікалай Радзівіл Чорны*** – Віленскі ваявода, канцлер ВКЛ, прадстаўнік аднага з буйнейшых радоў магнатаў. Акрамя яго да Рэфармацыі далучыліся прадстаўнікі іншых знатных шляхецкіх родаў ВКЛ – *Сапегі, Валовічы, Глябовічы, Зяновічы, Кішкі, Хадкевічы, Пацы* і інш. Нават у Радзе ВКЛ у 1569 годзе было 17 пратэстантаў, 9 праваслаўных і толькі 2 каталіка.

Асноўныя рэфармацыйныя плыні – *лютэранства, кальвінізм*, а таксама *антытрынітарызм* з'явіліся ў ВКЛ у 50 – 60-я гады XVI стагоддзя.

Лютэранства на беларускіх землях з'явілася раней за іншых пратэстанцкіх цэркваў. Ёсць звесткі, што слуцкі князь яшчэ ў 1535 годзе выдзеліў зямельны участак для лютэран у Слуцку. У сярэдзіне 50-х гадоў XVI стагоддзя лютэранскія суполкі з'яўляюцца сярод гараджан у Вільні, Менску. Аднак лютэранства не атрымала значнага распаўсюджання, у канцы XVI стагоддзя на тэрыторыі ВКЛ было ад 5 да 8 лютэранскіх арганізацый.

Больш шырока пратэстацкая царква ў ВКЛ была прадстаўлена ***кальвінізмам.*** Да канца XVI стагоддзя вядома ад 40 да 50-ці кальвіністскіх цэркваў (збораў) на тэрыторыі Беларусі. У духу кальвінізму былі рэфармаваны цэрквы ў Нясвіжы, Клецку, Брэсце, Ляхавічах, Койданаве, Навагрудку, Іўе і іншых гарадах. Рэфармацыйны рух на Беларусі, лічаць гісторыкі, набыў стройную *кальвінісцкую* арганізацыю.

Рэфармацыя адыграла важную ролю ў культурна-адукацыйнай сферы, спрыяла актывізацыі духоўнага жыцця грамадства. Пры пратэстанцкіх абшчынах адкрываюцца школы, шпіталі, прытулкі, друкарні, вакол іх групуюцца выдатныя вучоныя таго часу, прапаведнікі, пісьменнікі, мысліцелі, такія як Сімон Будны, Васілій Цяпінскі і інш.

Разам з тым існуе думка, што ў адрозненні ад заходнеўрапейскай Рэфармацыя на Беларусі *не знайшла* шырокага распаўсюджання сярод *народных мас*, таму і рух тут не набыў такога размаху, як у Еўропе. Ужо ў канцы XVI – першай палове XVII стагоддзя пачынаецца крызіс Рэфармацыі, узмацняецца супрадзеянне прастэстанцтву з боку традыцыйнай каталіцкай царквы. Канчатковы разгром рэфармацыі адбыўся у сярэдзіне XVII стагоддзя, калі Сейм адступніцтва ад каталіцызму прыраўняў да злачынства.

Адразу з з'ўяленнем Рэфармацыі узнікае і ***Контррэфармацыя*** як рэлігійна-палітычны рух, накіраваны на рэстаўрацыю, захаванне і аднаўленне пазіцый каталіцызма. Галоўнай сілай конррэфармацыі ў ВКЛ стаў ордэн **езуітаў,** утвораны у 1540 годзе для барацьбы з рэфармацыяй і ўмацавання каталіцызму ва ўсім свеце. *Езуіты* вызначаліся строгай дысцыплінай, сістэмай маралі "Мэта апраўдвае сродкі", назапашанымі вялікімі багаццямі і лепшай на той час сістэмай адукацыі.

Пачатак дзейнасці езуітаў у ВКЛ лічыцца 1569 год, калі ў Вільню прыйшло 13 першых езуітаў, сярод якіх былі паляк, харват, шатландзец, бельгіец, ірладзец і інш. Праз год у ВКЛ было ужо 300 езуітаў. Галоўным ідэолагам контррэфармацыі у ВКЛ выступаў *Пётр Скарга*, вядомы царкоўны і палітычны дзеяч, здольны аратар і публіцыст. Дастатковаі казаць, што менавіта ён змог вярнуць у каталіцызм уплывовага прыхільніка кальвінізму Мікалая РаздзівілаЧорнага, а таксама 4-х яго сыноў.

Езуіты галоўнай саёй задачай паставілі вяртанне ў каталіцызм пратэстанцкіх і праваслаўных феадалаў. У пачатку XVII стагоддзя да рымка-*каталіцкай царквы* далучыліся 47 самых уплывовых магнацкіх праваслаўных родаў – Сапегі, Валовічы, Чартарыйскія, Храптовічы і інш. Усё гэта значана аслабіла пазіцыі рэфармацыи.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Напрыклад, адзін з сыноў Мікалая Радзівіла Чорнага – Мікалай Крыштоф Сіротка прымусіў кальвіністаў пакінуць падначалшьныя яму гарады – Нясвіж, Клецк, Койданава і інш.

Нечураліся езуіты і гвалтоўных, прымусовых мераў у адносінах да пратэстантаў – закрывалі іх школы і друкарні, палілі кнігі, учынялі пагромы. Напрыклад, толькі Віленскі кальвіністскі збор (царква) 4 разы зведаў пагромы, арганізаваныя езуітамі, быў цаліком спалены яго архіў і збор літаратуры.

Па - рознаму можна ацэваць дзейнасць езуітаў на Беларусі. Відавочна толькі, што менавіта іх разнабаковая актыўнасць прывяла да заняпаду ідэй і спроб Рэфармацыі, значна аслабіла рэфармацыйны рух, спрыяла ўмацаванню пазіцый каталіцкай царквы. Нельга адмаўляць і значнага ўплыву дзейнасці езуітаў на стан адукацы, школьнай справы, развіццё кнігадрукарства, тэатраў, іх культурна-асветніцкую і дабрачынную дзейнасць.

Да канца XVII стагоддзя контррэфармацыя ў ВКЛ канчаткова перамагла.

5. Спробы реалізацыі царкоўнай уніі

XVI стагоддзе ў развіцці міжканфесійных адносін на Беларусі сталі часам, калі былі прадпрыняты спробы, як лічаць некаторыя гісторыкі, стварыць *беларускаю нацыянальную царкву*. Такой магла стаць ***уніатства,*** якое набывала паступова сваіх прыхільнікаў у розных частках грамадства.

Царкоўная ***унія*** – гэта аб'яднанне 2-х або некалькіх цэркваў на пэўных умовах – як правіла, *вяршэнства дагматыкі* (*асноўных догмаў, непахісных прынцыпаў)* адной з іх *пры захаванні* іншымі *сваеасаблівасцей* у абраднасці. Царкоўная унія заключалася пераважна рымска-каталіцкай царквой з праваслаўнай, гэтым сцвярджалася, што такім чынам аднаўляецца былое ***адзінства*** *ўсяленскай* ***хрысціянскай*** *царквы*.

Новы накірунак хрысціянства – ***уніяцтва*** ў ВКЛ і Польшчы быў аформлены на Берасцейскім саборы 6 – 9 кастрычніка 1596 года. Прыняты ёй акт атрымаў назву ***Берасцейская ўнія,*** ён аформіў арганізацыйнае аб'яднанне каталіцкай і праваслаўнай цэркваў.

Што з'явілася прычынамі, падставай для такога аб'яднання? Якія мэты былі у праваслаўнай і каталіцкай царквы, якія пайшлі на пэйныя ўступкі? Хто выйграў ад заключэння уніі? Такія пытанні і зараз дыскутуюцца даследчыкамі канфесійнай гісторыі.

Разглядаючы прычыны Берасцейскай царкоўнай уніі, патрэбна зыходзіць з той сітуацыі, таго становішча і тых праблем, якія склаліся да сярэдзіны XVI стагоддзя у грамадстве, у каталіцызме і праваслаў'і ў ВКЛ.

Праваслаўная царква ў ВКЛ у той час перыжывала значны *крызіс,* які быў выкліканы пашырэннем каталіцызму на абшарах ВКЛ, палітыкай улад, якія адкрыта аддавалі першанства каталіцызму і ўселяк падтрымлівалі яго. Да таго ж мясцовыя *праваслаўныя іерархі* (*кіраўнікі праваслаўнай царквы на Беларусі)* імкнуліся быць незалежнымі ад канстанцінопалькага і маскоўскага патрыярхаў, захаваць недатыкальнасць уладанняў цэрвы і яе маёмасці. Праваслаўныя епіскапы ў ВКЛ у выніку уніі з каталіцтвам разлічвалі атрымаць такія ж самыя правы, як і каталіцкія біскупы, месцы ў вышэйшых дзяржаўных органах краіны.

Каталіцкі касцёл бачыў ў уніі магчымасць дабіцца ідэйнага адзінства хрысціянства, пашырыць свой уплыў у грамадстве, дабіцца вярхавенства сваіх хрысціянскіх догмаў. Не малаважную ролю адыгравала і жаданне даць адпор ідэям Рэфармацыі, што закраналі асновы царкоўнай арганізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Зацікаўлены ў заключэнні уніі, аб'ядноўваючага пагаднення паміж каталіцтвам і праваслаў'ем былі і *ўлады ВКЛ,* якія імкнуліся узмацніць адзінства феадальнага ладу, пераадоліць адрозненні ў веравызнанні ўнутры класа феадалаў, дабіцца кансалідацыі іншых пластоў насельніцтва і тым самым умацавання дзяржавы.

Нельга адмаўляць і таго, што менавіта тэрыторыя Беларусі была найбольш спрыяльнай для такога аб'яднанне. Само канфесійнае становішча насельніцтва, дза адначасова існавалі дзве буйнейшыя хрысціянскія цэрвы, падштурхоўвала да не *распальвання варожасці,* а да пошуку спроб *прымірэння, кампрамісаў,* аб'яднання.

Такім чынам, можна прыйсці да высновы, што ў заключэнні царкоўнай уніі былі зацікаўлены абодвы бакі – праваслаў'е (яго кіраўнікоў на землях ВКЛ можна нават лічыць ініцыятарамі аб'яднання) і каталіцызм. Але кожны з іх у выніку ўніі імкнуўся дасягнуць сваіх мэтаў, свайго узмацнення, што і прадвызначыла цяжкі лёс уніяцтва.

Ужо пры прыняцці і абвяшчэнні ўніі праявіліся сілы, якія выступалі супраць яе. У кастрычніку 1569 года, пасля папярэдняга адабрэння уніі у Рыме папай, у Берасце адбыуся царкоўны сабор (*вышэйшы царкоўны сход*), на якім у прысутнасці вышэйшых прадстаўнікоў каталіцкай і праваслаўнай цэркваў, вышэйшых дзяржаўных асоб ВКЛ была урачыста абвешчана царкоўная унія. Адначасова ў Берасце праходзіў антыуніяцкі сабор, у якім прынялі ўдзел больш за 200 прадстаўнікоў праваслаўнага духавенства, частка свецкіх асоб на чале з князем *Канстанцінам Астрожскім,* якія выступілі супраць заключэння уніі, заклікалі праваслаўных не прымаць уніяцтва.

У выніку абвешчанай уніі склалася новая ***уніяцкая*** ці *грэка-каталіцкая* царква. Яны у'яўляла сабой пэўны сімбіёз каталіцызма і праваслаў'я. Уніяцкая царква, з аднаго боку, прызнавала вярхавенства папы рымскага, канонаў хрысціянскага веравучэння у каталіцкім звучанні, з другога боку – захоўвалася праваслаўная абраднасць у набажэнстве, царкоўна-славянская мова магла выкарыстоўвацца разам з лацінскай, захаваліся юліянскі каляндар і традыцйныя для праваслаў'я святы.

У ацэнцы такога кампрамісу паміж каталіцызмам і праваслаў'ем *адні гісторыкі* лічаць, што ад яе *больш атрымала каталіцтва*, бачаць пераарыентыроўку духоўнага жыцця Беларусі з усхода на захад, паколькі цэнтрам царквы станавіўся Рым. Іншыя гісторыкі адзначаюць выгаднасць *уніі для праваслаў'я*, бо яна дазволіла спыніць распад і дэзарганізацыю праваслаўнай царквы, стварыла перашкоду яе паланізацыі і лацінізацыі, дазволіла захаваць яе незалежнасць ад польскага касцёла.

Аднак большасць гісторыкаў адзіны у тым, што увядзенне уніі не прывяло адразу да спынення раздораў унутры грамадства на міжканфесійнай аснове. Больш таго, замест жаданага пакою, увядзенне уніі выклікала абвастрэнне барацьбы. Яна сустрэла моцнае супраціўленне з боку праваслаўнай часткі духавенства і свецкіх людзей, пераважна мяшчан, якія убачылі у вуніі пакушэнне на асновы праваслаў'я. Іх апазіцыйнасць праяўлялася у розных формах – ад пратэстаў, соймавых дэбатаў, антыуніяцкай палемікі, стварэння праваслаўных братстваў да рознага роду выступленняў і нават паўстанняў, якія адбыліся на антыуніяцкай глебе ў Магілёве ў 1618 годзе, у Віцебску ў 1623 годзе. Падставай для гэтага была і палітыка улад ВКЛ, якія жадалі зліць уніяцтва з рымска-каталіцкай царквой.

Пераход да уніяцтва асноўнай часткі насельніцтва – сялянства і мяшчан разцягнуйся на доўгі час, заняў некалькі стагоддзяў. Большасць насельніцтва не спяшыла адмаўляцца ад сваіх традыцыйных рэлігійных поглядаў. Нават амаль праз сто год пасля Бэрасцейскай уніі, у сярэдзіне XVII стагоддзя у Рэчы паспалітаў было каля 4 тысяч уніяцкіх прыходаў і больш як 13,5 тысяч праваслаўных прыходах. Толькі ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

канцы XVIII стагоддзя на беларускіх землях уніятамі былі ўжо ад 60 да 70% (у сельскай мясцовасці да 80%) насельніцтва.

6. Нехрысціянскія канфесіі.

Наяўнасць у складзе насельніцтва ВКЛ прадстаўнікоў іншых, акрамя беларусаў, літоўцаў, рускіх і ўкраінцаў, народаў абумовіла з'яўленне у сярэднявечча і іншых, акрамя хрысціянскай, сусветных рэлігій.

З'яўленне к межах ВКЛ яўрэяў прывяло да з'яўлення на землях Беларусі ***іудаізма.*** Першыя яўрэі-пераселенцы з краін Еўропы з'явіліся ў XIV стагоддзі. Сяліліся яўрэі кампактна, засноўваючы свае абшчыны – ***кагалы.*** Ужо пры Вітаўце вядомы прывілеі, выдадзеныя такім абшчынам у Брэсце і Гродна. У XV – першай палове XVI стагоддзя яўрэі рассяліліся ў цэнтральнай і ўсходняй Беларусі – у Віцебску, Кобрыне, Магілёве, Менску, Клецку, Навагрудку, Пінску, Оршы і іншых гарадах і мястэчках. Кагалы існавалі на прынцыпах аўтаномнага самакіравання, узначальвалі іх *равіны,* агульныя справы вырашаліся на *ваадзе* – агульным сейме прадстаўнікоў рэгіянальных абшчын.

Цэнтрамі рэлігійнага і духоўнага жыцця яўрэяў былі *сінагогі,* якія былі пабудаваны па некалькі ў кожным горадзе і мястэчкі. Асноўнай святыняй у сінагогах была ***Тора*** у пергаментных скрутках, не было ікон і упрыгожванняў, у іх вывучайся і тлумачыўся талмуд, свяшчэнныя кнігі, праходзілі іншыя рэлігійныя цэрымоніі. Акрамя таго існавалі невялікія малітоўныя дамы.

У цэлым, адносіны дзяржавы і насельніцтва да іўдаізму на тэрыторыі ВКЛ былі хоць не без канфліктнымі, але больш спрыяльнымі, талерантнымі, чым у іншых краінах тагачаснай Еўропы.

Значнай этнаканфесійнай групай на тэрыторыі ВКЛ былі ***татары***, якія з'яўляліся носьбітамі ***ісламa.***

З'яўленне асадніцтва татар на землях ВКЛ было выклікана рознымі, у асноўным, палітычнымі *прычынамі.* Татары запрашаліся Вялікі князямі на вайсковую службу, для удзелу у барацьбе з Тэйтонскім ордэнам, за што яны атрымлівалі зямельныя надзелы, асядалі на сталае жыццё, у тым ліку, і на беларускіх землях. Частка татарскіх князёў – *мурзаў* у выніку міжусобнай барацьбы сама шукала прытулак на землях ВКЛ. Простае татарскае насельніцтва магло апынуцца на беларускай тэрыторыі у выглядзе падначальных мурзаў, а таксама у якасці палонных ці добраахвотных перасяленцаў.

У асноўным татары былі *ваенна-службовым* насельніцтвам на тэрыторыі ВКЛ, але па сваяму маёмаснаму і сацыяльнаму становішчу падзяляліся на некалькі груп. Былыя нашчадкі ардынскіх ханаў і мурзаў за сваю ваенную службу якасці даніны ад Вялікага князя мелі вялікія вотчыны з сялянамі. Да другой групы належалі належалі простыя воіна і іх нашчадкі, якімя мелі невялікія надзелы зямлі, неслі ваенную службу і, апрача таго, неслі на карысць вялікага князя транспартную, курьерскую, каравульную і іншыя павіннасці. Найбольш шматлікай была група простых татар, якія сяліліся ў гарадах і мястэчках, мелі землю пад сярзібу і агароды, займаліся гарбарствам, агародніцтвам, жывёлагадоўляў, неслі павіннасці мяшчан. Гісторыкі лічаць, што агульная лічба татар на беларускіх землях у XV – XVI стагоддзя складала 7-10 тысяч.

Культавымі будынкамі ісламa былі ***мячэці.*** Узнікалі яны у месцах больш-менш кампактнага пражывання татараў, у XVI стагоддзі на землях Беларусі іх было 8-10. ***Мула*** ажыццяўляў набажэнствы, кіраваў сходамі, вырашаў адміністрацыйныя судовыя справы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У цэлым, можна адзначыць, што поліэтнічны характар ВКЛ, у тым ліку і беларускіх земляў, заклаў у гісторыі асновы для *верацярпімасці* ў міжканфесійных адносінах, што можна аднесці да важнай гістарычнай спадчыны нашага грамадства.

Па пытаннях гісторыі рэлігіі і царквы ў Беларусі, акрамя агульных выданняў,

Гл.: Верашчагіна А.У., Гурко А.В. Гісторыя канфесій у Беларусі: мінулае і сучаснасць. Мн., 2000.

Рэлігія і царква на Беларусі: энцыклапедычны даведнік. Мн., 2001.

Тэма 4.4 КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ XIV – XVI стагоддзяў.

План:

1. Адукацыя
2. Літаратура
3. Кнігадрукаванне і біблятэкі
4. Музычнае і тэатральнае мастацтва.
5. Дойлідства.
6. Выяўленчае мастацтва

1. Адукацыя.

У перыяд ВКЛ адукацыя захоўвала свой ***канфесіянальны*** характар. Гэта азначае, што школьныя ўстановы існавалі пры праваслаўны і каталіцкіх царкоўных установах, сваю сістэму адукацыі мелі іўдзейскія арганізацыі. Звязана гэта было з тым, што *рэлігія* у той час адыгравала найважнейшую ролю ў духоўным жыцці грамадства, а *царкоўныя ўстановы* з'яўлялася ассяродкам канцэтрацыі адукаваных прадстаўнікоў таго часу. Таму *школьная справа* як сістэма атрымання пэўных ведаў у перыяд сярэднявечча цалкам знаходзілася ў сферы дзейнасці царквы. Разам з тым, як і сама царква, так і школьная справа ў XV – XVI стагоддзях апынуліся пад уплывам *Рэфармацыі і контррэфармацыі*, а таксама ідэй *Рэнесансу*, што назіраліся у Еўропе.

Пры ўстановах ***праваслаўнай ц***арквы, перш за ўсё, пры манастырах, а таксама і ў праваслаўных прыходах існавалі школы, якія давалі адукацыю тым, хто рыхтаваўся да духоўнай дзейнасці. У такіх школах вывучалі царкоўнаславянскую граматыку, матэматыку, філасофію, тэалогію.

Новым у канцы XVI стагоддзях стала з'яўленне т. зв. "*брацкіх школ*". ***Праваслаўныя брацтвы*** – гэта рэлігійна-дабрачынныя і культурныя аб'яднанні, што ствараліся вакол праваслаўных цэрквах і манастырах гарадскім насельніцтвам праваслаўнага веравызнання. Культурна-асветніцкая дзейнасць брацтваў выражалася ў арганізацыі школ, друкарняў, выданні падручнікаў, іншай літаратуры. Фінансавыя сродкі брацтваў складаліся з уступных і членскіх узносаў, за кошт якіх і ствараліся школы.

У ліку першых былі *брацкія школы* у Вільні (1584 г.), Магілёве (1590г.), Берасце (1591 г.), Менску (1612 г.), брацкія школы былі адчынены таксама Шклове, Пінску, Полацку і інш. гарадах. Кожная брацкая школа мела свой статут, на чале школы стаяў абраны брацтвам рэктар, настаўнікі (дыдаскалы) з ліку манахаў таксама выбіраліся брацтвам, якое плаціла ім плату. У брацкіх школах выкарыстоўвалася групавая, або

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

класная, *урочная сістэма навучання*, панаваў *катэхічны метад навучання*, пабудаваны на пытаннях і атказах. За вучобу ў брацкіх школах *не плацілі*, у іх вучыліся ў асноўным дзеці мяшчан, якія уваходзілі ў брацтва, а таксама дзеці праваслаўнай шляхты і духавенства. Выкладанне вялося на царкоўна-славянскай і беларускай мовах.

Пачатковае навучанне ў брацкіх школах складалася з вывучэння азбукі, для чаго выкарыстоўваліся Псалтыр, Часаслоў і буквары. Пасля таго вучні пераходзілі да засваення т.зв. "сямі вызваленых (свабодных) навук" – у ліку якіх былі граматыка, рыторыка, дыялектыка, арыфметыка, геаметрыя, астраномія і музыка. Для брацкіх школ былі складзены падручнікі, аўтарамі якіх былі настаўнікі брацкіх школ, вядомыя асветнікі і царкоўныя дзеячы таго часу браты *Лаўрэнтый* ***Зізаній*** і *Стафан* ***Зізаній*** (аутары "Азбукі" і інш. царк. твораў), *Мялецій* ***Смотрыцкі*** (аўтар "Граматыкі" і шматлікіх царк. твораў). Пры школах, звычайна існавалі і свае друкарні, дзе выдаваліся царкоўныя кнігі, падручнікі і вучэбныя дапаможнікі. Але брацкія праваслаўныя школы адчувалі значны ўціск з боку уніяцкай царвы, якая пры падтрымцы магнатаў і каралеўскай улады дамаглася перадачы у пачатку XVII стагоддзя праваслаўных брацкіх школ у большасці беларускіх гарадоў уніятам.

Каталіцкая царква таксама мела сваю сістэму адукацыі, якая адпавядала яе тэалагічным, царкоўна-рэлігійным патрэбам. Галоўнай яе мэтай было распаўсюджанне каталіцкага веравызнання, выхаванне моладзі ў яе духу, падрыхтоўка кадраў прапаведнікаў. Разам з тым, нельга адмаўляць, што і каталіцкія навучальныя ўстановы садзейнічалі росту адукацыі ў цэлым насельніцтва.

Каталіцкія школы існавалі ў кожныі прыходзе (плябані). У першай палове XVI стагоддзя на сродкі багатага каталіцкага духавенства, магнатаў і шляхты, мяшчан каталіцкага веравызнання аткрываюцца *прыхадскія* каталіцкія вучылішчы ў *Гаева* Барысаўскага павета, *Мастах* Гродзенскага павета, *Нядзведзічах* Слуцкага павета, у *Гродна*, *Заблудаве* і інш. У буйных гарадах пры епіскапскіх кафедрах (саборах) адкрываюцца *кафедральныя* вучылішчы.

Прыходскія і кафедральныя каталіцкія вучылішчы былі ў асноўным ніжэйшымі навучальнымі ўстановамі. Іх праграма была даволі вузкая – веравучэнне, пісьмо,чытіанне, лічэнне, спевы. Толькі ў пачатку XVII стагоддзя для каталіцкіх вучылішчаў была складзена новая праграма, якая утрымлівала 7 свабодных навук, аб якіх мы казалі.

Значныя змены у стане адукацыі ў сярэдзіне XVI стагоддзя адбыліся з пачаткам ***рэфармацыі,*** калі ўзнікшыя плыні пратэстантызму пачалі шырокую культурна-асветніцкую дзейнасць. Заснаванне *кальвінісцкіх* храмаў суправаджалася, як правіла, будаўніцтвам пры іх школ. Напрыклад, такія школы існвалі не толькі ва ўсіх буйных гарадах Беларусі, але таксама і ў Глыбокім, Заслаўі, Івянцы, Іўі, Койданава, Любчы і іншых гарадах і мястэчках.

Кальвінісцкія школы насілі канфесійны характар і асноўная ўвага ў іх удзялялася рэлігійнаму навучанню і выхаванню, хаця значнае месца адводзілася і свецкім навукам. У такіх школах выкладаліся: багаслоўе, царкоўныя спевы, старажытныя мовы – лацінская, старагрэчаская, родная мова (беларуская або літоўская), польская мова, рыторыка, паэзія, дыялектыка, гісторыя, матэматыка. Менавіта з кальвінісцкай школай была звязана дзейнасць выдатнага рэфарматара-педагога таго часу ***Сімона Буднага.*** Найбольш вядомы яго "Катіхісіс", (выд. у Нясвіжы ў 1562 г.) па якому вучні вывучалі не толькі кальвінісцкае веравучэнне, але і *беларускаю мову*. У ім выказваліся таксама адносіны да свецкай улады, разглядаліся ўзаемаадносіны паміж феадаламі і сялянамі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

майстрамі, падмастэр'ямі і вучнямі, былі выказаны ідэі неабходнасці асветы не толькі для асобных прывілеяваных саслоўяў, але і *для ўсяго народа*.

У 1617 годзе узнікла і вядомая на Беларусі навучальная установа – *Слуцкая* кавінісцкая (евангелічная) школа, (у далейшым - Слуцкае вучылішча, Слуцкая гімназія), выпускнікі якой мелі веды, дастаковыя для паступлення ў любы еўрапейскі ўніверсітэт.

Росквіт дзейнасці кальвінісцкіх і іншых пратэстанцкіх школ на Беларусі прыпадае на другую палову XVI стагоддзя. Ідэі Рэфармацыі аказалі вялікі ўплыў на развіццё адукацыі. З'явілася значная колькасць школ, адукаваных настаўнікаў, было выдадзена некалькі друкаваных і таму больш даступных падручнікаў, аформілася арганізацыйная структура вычэбнага працэсу. Разам з тым, адукацыйная сістэма пратэстантызму была па-ранейшаму прасягнута рэлігійным духам (веравучэнне займала каля паловы вучэбнага часу), у ёй мала месца надавалася прыродазнаўча-матэматычным навукам.

Узмацненне ***контррэфармацыі*** ў пачатку XVII стагоддзя прывяло да з'яўлення новай значнай сілы ў развіцці адукацыі – ***езуітаў.***

Езуіты ўзялі ў свае рукі *адукацыю,* якўю лічылі галоўным сродкам уплыва на свядомасць людзей. У 1570 годзе ў Вільні імі была адкрыта першая навучальная ўстанова – *Віленская езуіцкая калегія.* Яе першым рэктарам стаў Станіслаў Варшавіцкі, навучалася каля 160 чалавек, у 1576 г. – каля 500. У калегіі выкладаліся матіэматыка, філасофія, маральная і палемічная тэалогічя.

У 1579 гаду віленская калегія папай Грыгорыям XIII была уведзена ў ранг універсітэта. Першыі рэктарам *Віленскай езуіцкай Акадэміі* стаў Пётр *Скарга*. Акадэмія мела 2 факультэта - філасофскі і тэалагічны. Першай ступенню ва ўніверсітэце з'яўляўся *філасофск*і факультэт, на якім навучанне працягвалася 3 гады і вывучаліся ўсе гуманітарныя і прыродазнаўчыя навукі таго часу. Навучанне ў Акадэміі заканчвалася на *багаслоўскім* (тэалагічным) факультэце, курс якога быў разлічаны на 4 гады. Вывучаліся такія прадметы, як схаластычнае, станоўчае, маральнае, палемічнае і казуістычнае багаслоў'е, кананічнае права, свяшчэннае пісанне і інш.

Акадэмію актыўна падтрымліва каталіцкае духавенства, мясцовыя магнаты і шляхта. Напрыклад, М. Разівіл Сіротка перадаў ён друкарню, Казімір Сапега – каштоўную бібліятэку, на сродкі ахвяраванняў былі адкрыты юрыдычны факультэт, заснавана астранамічная абсерваторыя. Менавіта Віленская езуіцкая Акадэмія стала потым асновай для *Віленскага універсітэта.*

Акадэмія стала не толькі буйным адукацыйным цэнтрам, але і актыўна змагалася з лютэранствам, кальвінізмам, іншымі праявамі пратэстанства, рэфармацыі.

Акадэмія адыграла значную ролю ва ўзмацненні каталіцызма ў ВКЛ – яна рыхтавала не толькі служыцеляў каталіцкага касцёлу, але і выкладчыкаў для *езуіцкіх сярэдніх навучальных* устаноў – ***калегіўмаў.*** Такія навучальныя ўстановы былі створаны *езуітам*і амаль ва ўсіх буйных гарадах Беларусі – Полацку (1581 г.), Нясвіжы (1584 г.), Навагрудку, Мінску, Оршы, Магілёве, Брэсце, Гародні, Віцебску, Слуцку, Драгічыне і інш.

Калегіумы складаліся з 3 – 5 класаў: 1 – пачатковы клас граматыкі, 2 – сярэдні клас граматыкі, 3 – вышэйшы клас граматыкі, 4 – клас паэзіі, 5 – клас рыторыкі (навучанне 2 гады). Такім чынам тэрмін навучання ў пяцікласнай калегіі раўняўся 6-ці гадам. Плата за навучанне не бралася.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Навучанне ў езуіцкіх калегіях насіла філалагічны характар, прыродазнаўчым і матэматычным навукам не ўдзялялася ўвагі, у многіх калегіях не вывучалася нават арыфметыка.

Езуіцкая педагагічная сістэма была арыентавана толькі на развіццё памяці, ставіла сваёй задачай выхаваць у вучняў глыбокую рэлігійнасць, фанатычную адданасць каталіцызму, справе ордэна, слепое падпарадкаванне старэйшым і начальству, непрыманне ўсяго новага, ваяўнічае стаўленне да іншых веравызнанняў.

Езуіцкія калегіумы былі не толькі навучальнымі установамі, але пры іх існавалі школьныя тэатры, аптэкі, якія зўабяспечвалі бесплатнымі лекамі не толькі езуітаў, але і мясцовае насельніцтва. Пры езуіцкіх установах, таксама як і пры іншых манаскіх ордынах, існавалі прытулкі, лячэбніцы і інш.

Свая сістэма адукацыі склалася і сярод ***яўрэйскага насельніцтва.***

Пры яўрэйскіх абшчынах узнікаюць іўдзейскія рэлігійныя вучэбныя ўстановы – *ешіботы,* якія акрамя рэлігійнай давалі недрэннаю па таму часу агульную адукацыю. Яўрэйскія мужчыны былі амаль усе пісьменыя, што адпавядала і патрэбам заняткаў гандлем, рамяством. Аднак яўрэйская адукацыя была больш этнічна замкнутай. У ешіботах навучаліся толькі дзеці яўрэяў, выкладанне ў іх вяліся толькі на ідыш. У сваю чаргу, дзеці яўрэяў не прымаліся ў іншыя навучальныя ўстановы, ім фактычна было недаступна атрыманне вышэйшай адукацыі.

Больш падрабязна аб стане адукацыі і адметных прадстаўніках асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі ў XVI – першай палове XVII стагоддзя - Ф. Скарыне, Сімоне Будным, Васілі Цяпінскім, Мялеціі Сматрыцкім і інш.

гл.: *“Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі*” (Мн., 1968), “*Асвета і педагагічная думка ў Беларуі: Са старажытных часоў да 1917 г.”*, (Мн.,1985). “*Асветнікі зямлі беларускай: Энцыклапедычны даведнік*”. (Мн., 2001).

2. Літаратура

У развіцці літаратуры ў XIII – XV стагоддзях працягваліся кніжна-пісьмовыя *традыцыі*, закладзеныя ў папярэднія часы. Разам з тым, пад уплывам Рэфармацыі і Асветніцтва, у XVI – XVII стагоддзях у літаратурнай творчасці з’яўляюцца *новыя жанры, формы*, набывае новае гучанне *змест* літаратурных твораў.

У XIV стагоддзі атрымала далейшае развіццё такая адметная для ВКЛ форма сярэднявекавой літаратуры, як ***летапісанне.*** Пры захаванні ранейшай формы апісання падзей, новым у летапісанні стала ўключэнне ў іх вусна-паэтычных легендаў і паданняў, гісторыка-лірычных аповясцяў, у тым ліку і антычных. Асноўнай ідэалагічнай накіраванасцю летапісаў (іх называлі з XVI стагоддзя – *Хронікі*) становіцца абарона цэнтралізацыйных намаганняў Вялікіх князёў літоўскіх, узмацненне вялікакняжацкай улады.

Сярод найбольш значных твораў такога характара адзначым наступныя:

- “***Летапісец вялікіх князёў літоўскіх***” - найбольш даўні помнік беларуска-літоўскага летапісання, адзін з першых твораў уласнабеларускай гістарычна-дакументальнай прозы. Напісаны ён на старабеларускай мове невядомым аўтарам у Смаленску ў канцы ***1420***-х гадоў. Асноўны яго змест – палітычная гісторыя ВКЛ ад смерці Гедыміна (1341 г.) да канца XIV стагоддзя. Тэкст цалкам ці часткова выкарыстоўваўся ў далейшых Хроніках і летапісных зводах. (*Больш падрабязна – гл.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.4. С. 354-355*.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

• ***Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г. –*** першы *агульнадзяржаўны* летапісны звод Вялікага княства Літоўскага. Храналагічна ахоплівае перыяд ад сярэдзіны IX да сярэдзіны XVI стагоддзяў, складзены на падставе папярэдніх летапісаў і іншых дакументаў. Адметнасць гэтага помніка грамадска-палітычнага і культурнага жыцця ў тым, што ён спалучае традыцыйную пагадовую форму выкладання падзей з літаратурным апавяданнем пра гістарычныя падзеі. (*Больш падрабязна – гл.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.1. С. 363*.)

• ***Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага*** – напісаны ў 1520-я гады. Мае выгляд гістарычнай аповесці пра сапраўдныя падзеі, крыніцамі да яе паслужылі розныя гістарычныя паданні і папярэднія летапісы. Як вызначаюць гісторыкі, Хроніка відаць была складзена ў ассяродзі літоўскіх феадалаў і таму ў её *узвялічваецца і гераізуецца* мінулае Літвы і прыніжаецца гісторыя Русі, маецца шмат фактычных недакладнасцей і свядомых скажэнняў.

• ***Хроніка Быхаўца*** – трэці, найбольш поўны звод летапісны звод ВКЛ. Прысвечана гісторыі ВКЛ ад легендарных часоў да пачатку XVI стіагоддзя. Дамініруючая тэма – ваенна-патрыятычная, асабліва дасканала і літаратурна апісаны паходы і бытвы, у тым ліку адзін з паходаў Альгерда на Маскву, Грунвальдская бітва, забойства вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча. З'яўляецца важнай крыніцай па сярэднявекавой гісторыі Беларусі і Літвы, каштоўным помнікам грамадска-палітычнай думкі, беларускай мовы і літаратуры эпохі Адраджэння. (*Больш падрабязна – гл.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.6. кн. 2. С. 82 - 83*.)

Больш падрабязна пра названыя Летапісы і Хронікі, іх змест і каментарыі да іх акрамя "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" (Т.4, с. 356-357, артыкул "Летапісы беларускія"), гл. асобнае выданне: "*Беларускія летапісы і хронікі*" Мн., 1997 г.

Новым ў развіцці літаратуры ў перыяд сярэднявечча стала пашырэнне яе ***жанравай*** разнастайнасці. Узнікаюць такія новыя *жанры* літаратурнай творчасці як

перакладная літаратура,
паэтычная літаратура.
публіцыстычная літаратура,
палемічная літаратура,
сатырычная літаратура

Пад уплывам ідэй Рэфармацыі і Гуманізма з'яўляецца *свецкая* літаратура, ў якой адлюстроўвалася жыццё людзей.

Да ***перакладной*** літаратуры можна аднесці пераклад на стараславянскую і старажытнабеларускую мову твораў замежных аутараў. У XV стагоддзі з'явіліся і атрымалі распаўсюджанне пераклады такіх твораў, як "Александрыя", "Аповесць пра Трыстана і Ізольду", " Гісторыя пра Трою", "Гісторыя пра Антылу". Пераклады славутых старажытнагрэчаскіх і старажытнарымскіх твораў карысталіся папулярнасцю сярод феадалаў, адукаванай частцы шляхты і гараджан.

Развіццё літаратуры як важнейшай формы духоўнага жыцця грамадства XV – XVI стагоддзях звязана з *дзейнасцю славутых беларускіх асветнікаў і гуманістаў* таго часу.

Этапнае значэнне у гісторыі беларускай літаратуры мела шматгранная творчая дзейнасць пісьменніка і перакладчыка ***Францыска Скарыны*** (1490 – 1551). Аб жыцці і разнабаковай дзейнасці Ф. Скарыны мы будзем гаварыць на семінарскіх занятках. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

падрыхтоўцы да іх патрэбна выкарыстаць разнастайную літаратуру . Змястоўным з'яўляецца артыкул "***Скарына"*** у "*Энцыклапедыі гісторыі Беларусі"* (Т.6, кн.1, с.309 – 315). Існуе нават комплексная навуковая дысцыпліна "*Скарыназнаўства"*, у якой гісторыкі, філолагі, філосафы вывучаюць жыццё і дзейнасць Ф. Скарыны, яго творчую і духоўную спадчыну, ассяродзе, эпоху, уплыў на развіццё беларускай і еўрапейскай культуры. (Гл.: Энцыклапедыі гісторыі Беларусі". Т.6, кн.1, с. 315 - 319).

Літаратурная дзейнасць Ф.Скарыны заключалася ў тым, што ён *пераклаў* на царкоўна-славянскую мову тэксты Бібліі і даў да іх *уласныя каментарыі.* У **1522** годзе ў Вільна ім была выдадзена ***"Малая падарожная кніжка",*** якая складалася з 23-х частак і ў даступнай форме тлумачыла асновы хрысцыянства. Аб кнігавыдавецкай дзейнасці Ф. Скарыны мы будзем казаць крыху пазней.

Вядомым перакладчыкам на беларускаю мову "*Евангелле*" быў ***Васіль Цяпінскі*** (1530-я гг. – 1599), беларускі пісьменнік, гуманіст. У напісанай ім Прадмове да выдання ён крытыкаваў духавенства, палітыку акаталічвання беларускага народа, выступаў за пашырэнне яго адукацыі

Паэтычная літаратура

Гісторыя таго часу дала нам і прозвішча ***Міколы Гусоўскага,*** (1470 – 1533гг.), якога лічаць пачынальнікам у Беларусі *свецкай* літаратуры, беларускай *паэтычнай* творчасці. Ім на *лацінскай* мове была напісана і выдадзена ў 1523 годзе ў Кракаве паэма "***Песнь пра зубра***". Літаратуразнаўцы называюць М. Гусоўскага *заснавальнікам лацінамоўнай* рэнесансавай *паэзіі* Беларусі, стваральнікам першай, адрасаванай *еўрапейскаму чытачу* рэалістычнай ліра-эпічнай паэмы пра *нашу краіну.* У паэме апісваецца маляўнічая прырода Беларусі, заняткі і звычаі беларусаў, гераічнае мінулае ВКЛ.

На польскай і беларускай мове пісаў свае *паэтычныя* творы ***Андрэй Рымша*** (1550 – 1595). У 1581 годзе ён выдаў на беларускай мове вершаваную "*Храналогію*" біблейскіх падзей, размешчаных па календарнаму тыпу. А. Рымша стаў пачынальнікам і *панегірычнай* паэзіі – на беларускай мове ім былі напісаны ўхваленні на гербы вядомых магнатаў Валовіча, Сапегі, Скуміна.

Палемічны жанр.

Рух рэфармацыі і контррэфармацыі парадзіў *палемічны* жанр ў літаратурнай творчасці. Да яго адносяцца творы *палеміка-тэалагічнага* характара, у якіх аўтары адстойвалі свае погляды на ролю царквы, вылучалі пэўныя сацыяльна-палітычныя тэорыі, крытыкавалі сваіх праціўнікаў.

Да найбольш вядомых парадстаўнікоў такога напрамку патрэбна аднесці ***Андрэя Волана*** (*націск на О*) (1530 – 1610), які з'яўляўся ідыёлагам рэфармацыйнага руху на Беларусаі і ў Літве. Ён з'яўляецца аўтарам трактатаў "*Пра палітычную або грамадзянскую свабоду*" (1572), "*Пра шчаслівае жыццё, або Найвышэйшае чалавечае дабро*" (1596), "*Пра гасудара і ўласцівыя яму дабрачыннасці*" (1608), у якіх выступаў супраць асноўных догмаў каталіцкай царквы, вёў палеміку з езуітамі, выступаў за рэформы ў сацыяльных і палітычных адносінах, распрацаваў канцэпцыю *свабоды* чалавека – абароны маёмасці, асабістай бяспекі, міру і згоды у грамадстве. Яго працы былі занесены каталіцкай царквой у пералік забароненых кніг і перавыдаваліся гугунотамі ў Францыі і пратэстантамі у Германіі.

Да палемічнай літаратуры адносяцца таксама працы

прыхільнікаў і абаронцаў **уніі**, сярод якіх былі Пётр Скарга, Ігнацій Пацей , Іван Марахоўскі і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

іх *пратэстанцкіх і праваслаўных крытыкаў* – Міленція Сматрыцкага, Афанасія Філіповіча, Сімона Буднага і інш.

Сярод іншых тагачасных публіцыстычных твораў неабходна назваць сваеасаблівы і цікавы трактат ***Міхалона Літвіна*** "*Пра норавы татар, літвінаў і маскавітаў*" (1550 г.)

Сатырычны жанр.

Новым літаратурным жанрам сталі творы *гумарыстычнага і парадзійна-сатырычнага* характара.

Узорам такога жанру можа служыць "***Прамова Мялешкі",*** створаная ў пачатку XVII стагоддзя невядомым аўтарам з ассяродзя служылай беларускай шляхты, напісана жывой беларускай мовай. Твор ўяўляе сабой сатыру на прамову на сейме смаленскага кашталяна І . Мялешкі. У ім парадзіруюцца норавы і звычкі беларускай шляхты, высмеіваюцца яе баязлівасць і бездзейнасць, нізкапаклонства перад усім замежным, крытыкуюцца грамадскія парадкі ў дзяржаве.

Такога ж жанру з'яўляецца і "***Ліст да Абуховіча***", напісаны ў 1655 годзе і адрасаваны смаленскаму ваяводзе П.К. Абуховічу, які ў 1654 годзе ў час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай здаў горад расійскім войскам. У пасланні, поўным злой іроніі, аўтар (*ім называюць Цыпрыяна Камуняку, але дакладна невядома хто ён*) развенчвае бяздарнасць ваяводы, асуджае яго як здрадніка, высмейвае норавы і паводзіны буйной шляхты. Напісаны жывой беарускай мовай, месцамі рыфмаванай, перасыпанай вострымі словамі, каларытнымі прыказкамі і прымаўкамі.

Абодвы названыя творы, як лічаць даследчыкі, сталі этапнай з'явай у гісторыі беларускай літаратуры на шляху яе дэмакратызацыі.

Такім чынам, завяршаючы кароткі агляд тагачаснай айчыннай літаратуры можна сцвярджаць, што дзякуючы ўплыву эпохі Адраджэння, яна ўступіла ў *якасна новы этап* свайго развіцця, характэрнымі рысамі якога сталі *сацыяльная скіраванасць* твораў, паглыбленне *індывідуалізацыі* ў падачы матэрыялу, пашырэнне *тэматыкі* і выяўленчых *форм.* Літаратура стала важным элементам тагачаснага грамадска-сацыяльнага і культурнага жыцця Беларусі.

3. Кнігадрукаванне і біблятэкі

Рост грамадскай патрэбы ў кнізе, пашырэнне літаратурнай творчасці, адукацыі і асветы, пісьменнасці насельніцтва, а таксама ўплыў заходнееўрапейскага Адраджэння абумовілі ўзнікненне ў ВКЛ ***кнігадрукавання.***

Важным у распаўсюджанні кніг стала у XIV – XV стагоддзях выкарыстанне ***паперы.*** Яна была значна таннейшай у параўнанні з пергаментам, на якім да таго пісаліся кнігі. І хаця папера на тэрыторыі ВКЛ у той час не выраблялася, а прывозілася з Еўропы, выкарыстанне паперы зрабіла кнігі больш даступнымі для шырокага круга людзей.

У XIII – XVI стагоддзях працягвалася *рукапіснае* кнігавыданне. Майстэрні па рукапіснаму перапісу кніг – *скрыпторыі* дзейнічалі пры буйцных манастырах і цэрквах у Новагародку, Полацку, Віцебску і іншых гарадах, а таксама пры дварах буйных феадалаў, дзе пісцы выконвалі заказы на высокім прафесійным і мастацкім узроўні.

Па сапраўднаму рэвалюцыйнай з'явай стала з'яўленне *тыпаграфій,* дзе кнігі пачалі *друкавацца* з выкарыстаннем *наборнага шрыфту*. Арганізацыя кнігадрукавання была звязана з такімі *складанымі тэхналагічнымі* працэсамі, як выраб

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

матрыцы, адліўка *шрыфта*, вынаходніцтва *наборнага станка,* прыгатаванне асобай тыпаграфскай *фарбы* і інш. Пераход ад рукапісных да друкаванных кніг значна павялічыў іх колькасць, тыраж з аднаго набора мог дасягаць некалькіх соцен і нават тысяч экземпляраў, што рабіла кнігу больш даступнай для выкарыстання ў навучальных установах, значна пашырала кола людзей, якія маглі яе набыць.

Узнікненне кнігадрукавання на беларускіх землях звязана з дзейнасцю ***Ф. Скарыны***, які быў не толькі асветнікам і навукоўцам, але і арганізатарм кнігавыдавецкай справы. Першая тыпаграфія ім была ўтворана ў Празе, дзе ў 1517 – 1519 гадах было выдадзена 23 кнігі Старога запаведу агульным аб'ёмам каля 1200 аркушаў.

У 1522 ці 1523 гадах Ф. Скарына пераехаў у Вільню, дзе ў доме бурмістра Я. Бабіча арганізаваў тыпаграфію. У ей былі надрукаваны "Малая падарожная кніжка" (1522г.) і "Апостал" (1525 г.), якія сталі першымі кірылічнымі друкаванымі выданнямі ў ВКЛ.

Пераемнікамі Скарыны ў справе кнігавыдання сталі Сымон ***Будны,*** Мацей ***Кавячынскі*** і Лаўрэнцій ***Крышкоўскі,*** якія перавезлі з Вільні ў Нясвіж кірылічныя шрыфты Ф. Скарыны і заснавалі ў 1561 – 1562 гадах ***Нясвіжскую друкарню.*** У 1562 годзе ў ёй былі выдадзены творы С. Буднага "*Катэхізіс*" (першая на Беларусі кніга на беларускай мове), і "Пра апраўданне грэшнага чалавека перад богам". Да 1571 года ў тыпаграфіі было выдадзена яшчэ 11назваў кніг на польскай і лацінскай мовах.

У другой палове XVI – першай палове XVII стагоддзяў прыватныя тыпаграфіі і выданне літаратуры ўзнілі ў іншых мясцовасцях Беларусі. Іх арганізатарамі былі: ***Васіль Цяпінскі*** – на Полаччыне, у радавым маёнтку, ***Іван Фёдараў*** і ***Пётр Мсціславец*** у Заблудаве, ***Спірыдон Собаль*** у Магілёве і Буйнічах і інш.

Узўнікненне і распаўсюджанне кнігадрукавання ў тыпаграфіях актыўна стала выкарыстоўвацца ў перыяд Рэфармацыі рознымі грамадскімі арганізацыямі.

З канца XVI стагоддзя узнікаюць ***брацкія тыпаграфіі***, якія былі арганізаваны на сродкі брацкіх рэдігійных аб'яднанняў. Вялікую ролю ў распаўсюджанни культуры, мовы, пісьменнасці адыгралі выданне літаратуры ***ў*** *Віленскай брацкай друкарні, Еўнінскай* друкарні, *Куцеінскай (каля Оршы)друкарні, Магілёўскай брацкай друкарні.* Большасць кніг, да 70%, былі надрукаваны на царкоўна-славянскай і беларускай мовах, кірылічным шрыфтам. Кірылічнае кнігадрукаванне праіснавала да забароны брацтваў і іх тыпаграфій ўладамі ў сярэдзіне XVII стагоддзя.

Пратэстанцкія друкарні былі заснаваны у Брэсце, Нясвіжы, Любчы, Слуцку, Узде, Ашмянах і іншых гарадах.

Езуіты таксама актыўна ўзяліся за арганізацыю кнігадрукавання. Іх першай і буйнейшай была *Віленская акадэмічная друкарня*, пасля заняпада рэфармацыйнага руху *каталіцкімі сталі тыпаграфіі* ў Нясвіжу, Слуцку і іншыя. Літаратура выдавалася ліцінскім шрыфтам, на польскай і іншых мовах. З другой паловы XVII кірыліцкае кнігадрукаванне значна скарачаецца, а у сярэдзіне XVIII стагоддзя на беларускай мове не было надрукавана ніводнай кнігі.

У XVII стагоддзі з'яўляюцца тыпаграфіі, што выдавалі кнігі на яўрэйскай мове – *іўрыце.* Такія друкарні ўзнікаюць у Гродна, Вільні і Шклове.

Усяго, па падліках даследчыкаў, да сярэдзіны XVII стагоддзя на тэрыторыі Беларусі налічвалася каля 30 друкарняў.

Аб арганізацыі кнігавыдання на беларускіх землях больш падрабязна гл.: арт. "*Кнігадрукаванне"* у "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" т.4., с.209 – 210; Галенчанка

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Г.Я. “*Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар*”. Мн., 1993.; Галенчанка Г.Я. “*Францыск Скарына: Спадчына і пераемнікі*”. Мн., 2002.

Павялічэнне колькасці кніг, іх даступнасці прывяло да пашырэння **бібліятэк** – *кнігазбораў,* для грамадскага, калектыўнага або прыватнага *кнігакарыстання*.

На тэрыторыі Беларусі бібліятэкі пачалі складвацца пры цэрквах яшчэ з XI стагоддзя. Сярод найбольш старажытных – бібліятэка Полацкага Сафійскага сабора, якая існавала з сярэдзіны XI стагоддзя да 1597 года. У бібліятэцы зберагаліся рукапісныя кнігі пераважна рэлігійнага зместу. Паздней з’яўляюцца і друкаваныя кнігі, а таксама і кнігі свецкага зместу.

Бібліятэкі пры храмах і манастырах, як праваслаўных, так і каталіцкіх, існавалі ў XV-XVI стагоддзях. Але пакуль не набыло распаўсюджанне кнігадрукаванне, фонды бібліятэк былі невялікімі. Напрыклад, бібліятэка Слуцкага Траецкага манастыра у 1494 годзе налічвала 45 кніг, бібліятэка Пінскага Ляшчынскага манастыра – 34 кнігі.

Бібліятэка Супральскага Благавешчанскага манастыра, заснаваная ў 1498 годзе, адна з буйнейшых біблятэк ВКЛ у 1557 годзе мела 211 кніг, у тым ліку друкаваных – толькі 7, (астатнія рукапісныя), У сярэдзіне XVII стагоддзя у бібліятэцы было кало 600 кніг, з якіх больш за палову ужо былі друкаванымі.

У канцы XVI стагоддзя складваецца сістэма бібліятэк ордына *базыльян,* асновай якіх найчасцей былі бібліятэкі праваслаўных манастыроў. Цэнтральныя бібліятэкі базыльян былі ў *Віленскім* Святатраецкім, *Жыровічскім* і *Супральскім* манастырах. Кожная з іх налічвала ужо па некалькі тысяч кніг, а таксама карт, нот, эстампаў, дакументаў.

Вялікія кнігазборы мелі і іншыя каталіцкія кляштары: *кармеліты* ў Глыбокім, *дамініканцы* ў Гродне і Шклове, *бернадзінцы* ў Слоніме, *кальвіністы* ў Слуцку і Смаргоні.

З XVI стагоддзя бібліятэкі узнікаюць пры ***навучальных установах***. Найбольшай з іх была бібліятэка, заснаваная у 1570 годзе пры Віленскім езуіцкім калегіуме, а з 1579 года – бібліятэка Віленскай езуіцкай Акадэміі. Ужо ў той час яна налічвала 4,5 тысячы тамоў разнастайнай літаратуры, карысталіся ёй прафесары і студэнты універсітэта. Існавалі невялікія бібліятэкі і пры езуіцкі, базыльнянскіх, піярскіх і іншых калегіўмах і вучылішчах

У той жа час, з канца XV стагоддзя з’яўляюцца і першыя ***прыватныя*** бібліятэкі. Уладальнікамі іх былі *буйныя феадалы*, асобы, што займалі вышэйшыя *дзяржаўныя і духоўныя* пасады, бо набыццё кніг, як рукапісных, так і друкаваных, патрабавала значных матэрыяльных сродкаў.

Самымі вядомымі і буйнымі прыватнымі бібліятэкамі былі:

- бібліятэка ***Радзівілаў у Нясвіжы***, заснаваная ў XVI стагоддзі Мікалаем Радзівілам Чорным, у сярэдзіне XVIII стаггоддзя налічвала каля 9 тысяч тамоў;
- ***бібліятэкі Сапегаў***, што існавалі з XVI стагоддзя ў *Ружанах* (Пружанскі раён), дзе была закладзена канцлерал ВКЛ Львом Сапегай, а таксама ў *Слоніме, Дзеречыне,* якія былі створаны яго нашчадкамі. Бібліятэка Сапегаў была другім па вялічыні, пасля бібліятэкі Радзівілаў, прыватным кнігазборам.
- ***бібліятэка Храптовічаў*** была заснавана ў другой палове XVIII стагоддзя ў маёнтку Шчорсы (Навагрудскі раён), складалася з набытых канцлерам ВКЛ Іахімам Храптовічам кніг падчас падарожжаў па Францыі, Германіі, Галандыі, Польшчы, з бібліятэк Рыма і Варшавы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Меншымі па памерам, налічвалі па некалькі дзесяткаў альбо адзінак кніг, былі кнігазборы, якія маглі дазволіць сябе асобы з заможных *гараджан і ніжэйшага духавенства.* Кнігі ў той час цаніліся як значныя асабістыя каштоўнасці, перадаваліся ў спадчыну, упаміналіся ў завешчанні, ахвяраваліся манастырам, навучальныі установам.

4. Музычнае і тэатральнае мастацтва.

Развіццё музычнага мастацтва ў перыяд сярэднявечча на беларускіх землях абапіралася на народныя традыцыі і вырастала з форм народнай творчасці, прыстасоўвалася да запатрабаванняў сацыяльна-эканамічнага развіцця. На стан і развіццё музычнага і тэатральнага мастацтваў уплывалі *шмат якія фактары* - гэта рост гарадоў і урбанізацыя насельніцтва, развіццё гандлю і правядзенне бўйных кірмашоў, захаванне і распаўсюджанне каляндарных і сямейных свят і абрадаў, пашырэнне форм царкоўнай абраднасці, з'яўленне кнігадрукавання, рост адукаванасці насельніцтва і інш. Менавіта з гэтага часу можна казаць аб з'яўленні ***артыстычных рамёстваў,*** асобных катэгорый людзей, для якіх асноўным заняткам з'яўлялася музычнае і тэатральнае мастацтва.

Неад'емнай часткаў гарадскога жыцця былі выступленні на плошчах, асабліва падчас правядзення буйных кірмашоў вандроўных *музыкантаў* – гусляроў, дудароў, лірнікаў і інш. Распаўсюджаным былі выступленні *скамарохаў*, якія спалучалі розныя віды сценічнага мастацтва – пелі, танцавалі, выконвалі цыркавыя нумары. Як правіла, у большасці выкарыстоўваліся простыя музыкальныя інструменты – *трашчоткі, флейты, жалейкі, бубны*. Арыгінальным музычным інструментам была т.зв. "*дуда – каза*", ці валынка, а таксама "*ліра-арганіструм*". Яна ў'яўляла сабой вялікую скрыпку з ручкай і шэрагам клавіш, у выніку пастаянна гучаў нізкі гук, на фоне якога на больш высокіх танах выконвалася мелодыя смычком па струнах. З XVI стагоддзя на Беларусі з'яўляюцца ***цымбалы,*** якія сталі потым неад'емнай часткай айчынная народнай музыкі.

Паступова скамарошніцтва вылучаецца ў асобны занятак пэўных людзей, становіцца іх *прафесіяў*. Адбываецца нават пэўная спецыялізацыя – былі танцоры, канатаходцы, спевакі, сілачы, музыкі і г.д. У XVI – XVII стагоддзях значна ўзрасла іх колькасць, яны утваралі вандроўныя ці аседлыя *трупы,* якія падчас налічвалі да 60 – 100 чалавек, выступалі на рынкавых плошчах гарадоў і мястэчак, пры корчмах, у шляхецкіх маёнтках.

Развівалася мастацтва і пры вялікакняжацкіх, а таксама магнацкіх дварах, пры дварах духоўных і свецкіх феадалаў, пры калегіумах, дзе ствараюцца ***капэлы.*** Складаліся яны з прафесійных артыстаў, мелі аркестр і салістаў-вакалістаў, ці невялікі хор. Яны суправаджалі музыкай і спевамі спектаклі, балі, рэлігійныя службы, ваенныя парады, паляванні. Напрыклад, у Гародні па загаду Вялікага князя ў 1543 годзе была арганізавана "*Літоўская капэла",* якая праіснавала звыш паўстагоддзя. У яе склад уваходзілі 15 спевакоў і музыкантаў, як мясцовых, так і запрошаных з замежжа. Для капэлы пісалі мызыкальныя творы прафесійныя кампазітары. Буйны аркестр са 100 музыкантаў трымаў і М. Раздівіл Чорны.

Шмат увагі развіццю песеннага мастацтва удзелялася ў духоўных храмах. Царкоўнае песнапенне выкарыстоўвалася ў праваслаўных, і асабліва ў каталіцкіх храмах пры набажэнстве, Меліся асобныя наборы спеваў, якія адпавядалі царкоўна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

календарнаму цыклу, выкарыстоўвалася вакальная сістэма нават з 8-мі галасоў-лядаў. Музыкантаў і спевакоў рыхтавалі манастырскія і брацкія школы, для іх меліся пеўчыя азбукі. Складаліся, перапісваліся, а потым і друкаваліся нотныя зборнікі.

Музычнага мастацтва стала асновай для з'яўлення і развіцця **татральнага мастацтва.**

З XVI стагоддзя з'яўляецца беларускі народны лялечны тэатр – ***батлейка.*** Найбольш пашыраны былі двух'ярусныя батлейкі. На верхнім ярусе разыгрываліся сцены з рэлігійнай тэматыкі, на ніжнім – з свецкага жыцця, як правіла з камічнымі сцэнамі, народнымі песнямі і танцамі. Свецкія пьесы адлюстроўвалі ў гратэскавай форме штодзённае гарадское жыццё жыцця, аб чым сведчаць іх назвы "Вольскі – купец польскі", "Ірыяда, Рыгор і франт", "Барыня і доктар", "Цыган і цыганка", "Яўрэй і казак" і інш.

Тэатральнае мастацтва на Беларусі зараджалася ***з школьных тэатраў,*** якія ствараліся ў *пратэстанцкіх* навучальных установах, *уніяцкіх* семінарыях, *праваслаўных* брацкіх школах, *езуіцкіх* калегіумах. Утвараліся яны для паглыблення і замацавання ведаў вучняў, прапаганды рэлігійных поглядаў, таму пераважалі пьесы рэлігійна-павучальнага характара, але падчас і з элементамі інтэрмедыі, народнага беларускага фальклору. У тэатральных пастаноўках, асабліва ў езуіцкіх акалегіумах, практыкаваліся нават змены дэкарацый, гукавыя і аптычныя эфекты.

Першы езуіцкі школьны тэатр узнік пры Віленскай акадэміі ў 1580-я гады, потым тэатры з'явіліся ў Полацкім, Нясвіжскім, Берасцейскім і іншых калегіумах. Школьныя тэатры, кіраўнікамі якіх былі настаўнікі, а акцёрамі – семінарысты, вучні, давалі публічныя спектаклі для гараджан, мясцовага насельніцтва.

Паздней, толькі у сярэдзіне XVIII стагоддзя з'яўляюцца і прыватныя тэатры пры дварах буйных магнатаў. Акцерамі ў іх былі як асобы з прыгоннага насельніцтва, а таксама і запрошаныя прафесійныя акцеры з свабодных людзей і іншаземцаў. Найбольш вядомы Нясвіжскі і Слуцкі тэатры Радзівілаў, Шклоўскі тэатр Зорыча, тэатры Агінскага – у Слоніме, Чарнышова – Магілёве і Чачэрску, Тышкевічаў – Свіслачы і Плешчаніцах.

5. Дойлідства. (архітэктура і будаўніцтва)

Архітэктура і будаўніцтва ў перыяд сярэднявечча на беларускіх землях былі прадстаўлены найбольш выразна ў двух асноўных фармах – ***абарончыя*** збудаванні і ***храмавае*** дойлідства. Акрамя таго набыло пазвіццё і ***гарадское*** будаўніцтва. Развіваліся яны у рэчашчы ранейшых візантыйскіх і мясцовых традыцый, а таксама і пад уплывам найбольш каштоўных здабыткаў тагачаснай *заходнееўрапейскай* архітэктуры.

Абарончыя збудаванні у XIV – XVI стагоддзях былі найбольш дасканалымі, пры ўзвядзенні якіх выкарыстоўваліся сучасныя па таму часу будаўнічыя тэхналогіі. Асноўнымі тыпамі абарончых збудаванняў былі ***замкі.*** Іх планіроўка, памеры, спосабы будавання і вонкавы выгляд найбольш выразна адлюстроўваюць здабыткі архітэктуры таго часу.

Ва ўмовах пастаянных пагроз з боку знешніх ворагаў – татарскіх атрадаў і крыжацкіх набегаў, ранейшыя драўляныя замкі паступова заступаюць месца цамкам *мураваным,* якія мелі цэлы коплекс абарончых збудаванняў. Па тыпу яны адносіліся да заходнееўрапейскіх "кастэляў", якія можна назваць невялікай *крэпасцю*. ***Замкі –***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

крэпасці выконвалі абарончыя функцыі, а таксама жылыя і прадстаўнічыя функцыі для буйных магнатаў і феадалаў.

Узорам такіх збудаванняў можна назваць узведзены ў пачатку XIV стагоддзя замак-крэпасць у ***Крэва.*** У плане ён уя'ўляў чатырохвугольнік з двумя вежамі, якія мелі вышіню ў 18 і 11 метраў, таўшчына сцен была да 3 метраў. Яшчэ адзін замак-кастэль быў узведзены ў 1320-я гады ***у Лідзе,*** сцены якога мелі вышыню да 12 метраў і таўшчыню да 2 метраў. Названыя замкі будаваліся па загаду Вялікіх князеў, на дзяржаўныя сродкі, адыгрывалі важную ролю не толькі у ваенных, але і палітычных падзеях. Гэта адносіцца і ***Гарадзенскага*** замка, які быў адной з асноўных вялікакняжацкіх рэзідэнцый. Узведзены у тыя часы ***Навагрудскі*** замак-крэпасць доўгі час лічыўся *найбольш магутным на* Беларусі. Мураваныя замкі-цытадэлі былі узведзены таксама ў ***Віцебску*** і ***Оршы.***

У XV – XVI стагоддзях узнікаюць і *прыватнаўласніцкія* замкі-крэпасці, якія належалі буйным феадалам. Магутныя феадальныя крэпасці ўя'ўлялі сабой

Іказненскі замак непадалёку ад Браслава, які належаў *Яну Сапегі* і быў закладзены у 1504 годзе,

Геранёнскі замак (*у в. Геранёны сучаснага Іўеўскага раёна*), што належаў канцлеру ВКЛ і віленскаму ваяводзе *Войцаху Гаштольду*, быў пабудаваны на мяжы XV – XVI стагоддзяў

Любчанскі замак (*сучасны г.п. Любча Навагрудскага раёна*) *Радзівілаў,* пабудаваны на высокім беразе Нёмана.

Радашковічскі замак (*суч. г.п. Радашковічы Маладзечненскага раёна*), які узгадваецца ў інвентары Радашковіч за 1549 год.

Прыкладам такога збудавання з'яўляецца і абарончы комплекс **у Міры** (*суч. Карэлічскі раён*), т. зв. ***Мірскі замак,*** пабудаваны у 1506 – 1510 гадах магнатам Юрыем *Іллінічам* і перабудаваны М. *Раздівілам* у канцы XVI – пачатку XVII стагоддзя.

Аб тым, што ўяўлялі сабой названыя замкі-крэпасці мы на прыкладзе Мірскага замка і іншых такіх жа збудаванняў пагаворым на *семінарскім занятку*. Пры падрыхтоўцыі па гэтаму пытанню акрамя падручнікаў карысна паглядзець наступную літаратуру: *Трусаў А*. Манументакльнае дойлідства Беларусі XI – XVIII ст. Мн., 2001; *Ткачоў М.А.* Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII – XVIII стст. Мн., 1978; *Ткачоў М.А*. Замкі Беларусі. Мн.,1987; *Ткачоў М.А.* Замкі і людзі. Мн., 1991; *Калнін В.В.* Мірскі замак. Мн., 2002.

Па меры развіцця *ваеннай справы*, з'яўлення гармат, якія маглі разбураць замкі,

увядзення ў *ваеннае* будаўніцтва заходнееўрапейскіх *фартыфікацыйных сістэм,* калі абарона выносілася па-за межы замка і ствараліся абарончыя збудаванні на подступах да яго, для чаго будуюцца знешнія валы з басціёнамі,

замкі-крэпасці паступова страчваюць свае ваеннае прызначэнне і *трансфарміруюцца* ў ***палацава-замкавыя комплексы,*** якія становяцца месцам грамадскага жыцця феадалаў, іх рэзідэнцыямі.

Пачатак гэтаму быў пакладзены ў 1580-я гады, калі *Гарадзенскі замак* пераўтвараецца ў буйны палацавы комплекс у стылі рэнесансу. Яго тры абарончыя вежы былі разбураны, значна быў пашыраны сам палац, адбываецца яго перабудова пад пабытавыя патрэбы гаспадара, унутры і знешне палац быў упрыгоджаны роспісамі, дэкаратыўным атыкам, эркерамі з фігурамі і г.д. Пры замку ствараецца парк, кветнікі, пруды і дэкаратыўныя зоны.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

У такім жа стылі перабудоўваецца *Мірскі замак*. У канцы XVI стагоддзя было распачата стварэнне яшчэ адной рэзідэнцыі Радзівілаў – ***Нясвіжскага*** замка, будаўніцтвам якога займаўся вядомы італьянскі дойлід Я. Бернардоні. У 1620-я гады быў пабудаваны замкава-палацава комплекс Л. Сапегі ў *Быхаве.* У тыя ж гады буйны замкавы комплекс быў створаны ў в. *Смаляны* (*суч. Аршанскі раён*) князя С. Сангушкі. У г. Ляхавічы гетманам Янам Хадкевічам быў пабудаваны *Ляхавіцкі замак.*

Такім чынам, пад уплывам Рэнесансу рэзідэнцыі айчынных магнатаў пачалі *страчваць абарончы* характар і пераўтвараюцца ў *палацавыя* комплексы, што сведчыла аб пашырэнні свецкай культуры тутэйшай арыстакратыі, далучэнні яе да заходнееўрапейскіх тагачасных традыцый.

Храмавае дойлідства.

У царкоўным, ***храмаваым дойлідстве*** на працягу XV – XVI стагодзяў таксама адбываліся пэўныя змены, якія адлюстроўвалі канфесійныя працэсы, што адбываліся ў той час на землях ВКЛ.

У будаўніцтве *праваслаўных храмаў* даследчыкі гісторыі архітэктуры вызначаюць з'яўленне самабытнага тыпу 4-х вежавых праваслаўных цэркваў, якія спалучалі сакральную і абарончую функцыі. Прыкладам таму з'яўляецца

- ***Мураванкаўская царква-крэпасць***, пабудаваная ў пачатку XVI стагоддзя ў в. Мураванка (*суч. Шчучынскі район)*, якая мела ўсе прыкметы храма абарончага тыпу;
- помнік абарончага дойлідства ***Сынковіцкая царква-крэпасць***, пабудаваная ў канцы XV ст. у в. Сынковічы (*суч. Зельвенскі район)*, якая мела 4 баявыя вежы.;
- перабудаваны Полацкі Сафійскі сабор.

Праваслаўныя храмы, таксама як і заснаваныя праваслаўныя манастыры, да XVIII стагоддзя былі пераважна драўлянымі, прытрымліваліся візантыйскага крыжова-купальнага стылю.

Новыя рысы храмавага дойлідства на Беларусі прынесла распаўсюджанне ***каталіцызму,*** а таксама пратэстацкіх і уніяцкіх тячэнняў.

Каталіцкія храмы будаваліся па іншаму, чым прасаслаўныя, прынцыпу. Яны мелі аднаапсідную аб'емна-прасторавую кампазіцыю, галоўныя фасады будаваліся ў стыле *заходне-еўрапейскай* ***готыкі,*** паступова ў іх знайшоў распаўсюджаннеі стыль ***барока.***

У Гародні яшчэ ў 1380 годзе быў узведзены *Марыінскі касцёл*, больш вядомы пад назвай "Фара Вітаўта".

У XV стагоддзі у стыле готыкі былі пабудаваны храмы ў в. *Ішкалдзь* (*суч. Баранавіцкі раён*),

у в. *Уселюб* пад Навагрудкам,

Іўеўскі касцёл бернардынцаў,

узорам архітэктуры барокка з'яўляецца *Нясвіжскі* касцёл езуітаў.

Як адзначаюць даследчыкі гісторыі архітэктуры, на Беларусі мела месца не проста капіраванне заходнееўрапейскіх стыляў, але і спалучэнне іх з адметнымі нацыянальнымі, мясцовымі асаблівасцямі, традыцыямі, таму ёсць падставы казаць аб з'яўленне беларускіх *варыянтаў готыкі і барока*.

Як *выснову* разгляда тэндэнцый у храмавым дойлідстве адзначым, што галоўная адметнасць культавай архітэктуры Беларусі таго перыяду заключалася ў тым, што *візантыйскія традыцыі*, уласцівыя праваслаўнай царкве, паступова *саступалі месца заходнееўрапейскім*, якія прынеслі каталіцтва, пратэстантызм і ўніяцтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Да вывучэння названай праблемы з'яўляецца цікавай манаграфія *Кушнярэвіча А.М.* "Культавае доўлідства Беларусі XIII – XVI стст." (Мн., 1993).

Гарадское дойлідства на працягу XIV- XVII стагоддзяў таксама набывае новыя рысы. Беларускія гарады пад уплывам Рэнесанса сталі паступова набываць знешні выгляд на заходнееўрапейскі манер. *Хаатычная* гарадская забудова пачала заступаць месца дакладнай *планіроўцы у*звядзення пабудоў.

Узнікаюць новыя кварталы – месцы сканцэнтравання грамадскага і эканамічнага жыцця, пабудаваныя па дакладнай планіроўцы на італьянскі манер. Уявіць гэта можна на прыкладзе *Ракаўскага* і *Троіцкага* прадмесцяў, якія з'явіліся ў гэты час у Мінску. У невялікіх гарадах планіроўка цэнтральных частак пачынае набываць форму квадрата з прамавугольнымі кварталамі і гандлёвай плошчай у цэнтры. Прыкладам таму з'яўляюцца забудовы Несвіжа, Міра, Быхава, Гародні і інш. гарадоў, дзе такая планіроўка захавалася і да сённяшняга часу.

Найбольш значнымі гарадскімі пабудовамі (акрамя храмаў) былі ***гарадскія ратушы***, у якіх засядаў магістрат. Звычайна ратушы мелі два-тры паверхі і абарончую вежу, на якой размяшчаліся герб горада і гадзіннік.

6. Выяўленчае мастацтва

Выяўленчае мастацтва перыяда XIV – XV стагоддзяў па-ранейшаму было арыентавана на стварэнне вобразаў *рэлігійнага* характара. Разам з тым, новымі яго рысамі стала павялічэнне твораў *свецкага* характару, а таксама ўзмацнене уплываў *заходнееўрапейскіх стылявых* напрамкаў.

Манументальны жывапіс быў прадстаўлены ў выглядзе *размалёвак* храмавых збудаванняў, у якіх *пашыраецца* кола сюжэтаў, структура становіцца больш *адвольнай,* насычанай канкрэтнымі дэталямі. З XVII стагоддзя у іх назіраецца пранікненне эстэтычных прынцыпаў *барока*. У такім выглядзе былі выкананы ўпрыгожванні Мікалаеўскай царквы ў Магілёве, у касцёлах Мсціслава, Нясвіжа, Гародні і інш.

Станкавы жывапіс быў, як і раней, прадстаўлены пераважна *іканапісам.* Але ў ім, асабліва з другой паловы XVI стагоддзя, вызантыйскія традыцыі спалучаюцца з рысамі Адраджэння – на іконах з'яўляюцца элементы бытавога і этнаграфічнага характара, больш натуральнымі становяцца позы і жэсты асоб, каспазіцыі перадаюць аб'ем і прасторавую пэрспектыву. Усё гэта узмацняе выразнасць твораў, натуральнасць адзення і інтэр'ера. Узорам такога жывапісу з'яўляецца абраз "*Маці Боская Адзігітрыя*", створане якога адносіцца да канца XV – пачатку XVI, і абраз "*Успенне*" (1650 г.), якія захаваліся і іх можна бачыць ў Дзяржаўным мастацкім музеі Беларусі.

Новым у развіцці жывапісу з'яўляецца стварэнне *патрэтаў свецкіх асоб* ВКЛ, буйнейшых феадалаў, зробленых мясцовымі жывапісцамі, што працавалі пры дварах магнатаў. З твораў таго часу вядомы, створаныя у канцы XVI стагоддзя, партрэты княгіні *Кацярыны Слуцкай*, князя Юрыя *Алелькевіча,* старасты ваўкавыскага і ваяводы брэсцкага Юрыя *Тышкевіча,* а таксама *Льва Сапегі*, Юрыя і Альбрэхта *Радзівілаў* і інш. У тагачасных партрэтах шмат увагі надавалася да *атрыбутаў і гербаў* выяўленых асоб, перадачы фактуры *аддзення, стужак, узнагарод* і іншых дэталяў, якія падкрэслівалі урачыстасць і параднасць, знатнасць магнатаў.

Узнікненне і развіццё кнігадрукавання прывяло да з'яўлення на тэрыторыі Беларусі такога віда мастацтва, як ***кніжная графіка.*** Яго ўзнікненне звязана з дзейнасцю Ф. Скарыны, выданні якога мелі вялікую колькасць упрыгожванняў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

друкавага тэкста – мастацка выкананых *заглаўных* літараў, дэкаратыўна-арнаментальных *застaвак, канцовак,* а таксама сюжэтных *кампазіцый*. З пачатку гравюры для оттіскаў выконваліся з дрэва, потым з'явілася і *металагравюра*, у развіцці якой на Беларусі вялікі уклад унёс *Т. Макоўскі*, што у пачатку XVII стагоддзя працаваў пры двары Юрыя Радзівіла ў Нясвіжы. Адметнасцю вызначалася і *магілёўская гравёрная* школа, што склалася пры Магілёўскай брацкай друкарні. Як лічаць даследчыкі мастацтваў, менавіта *кніжная графіка* да XVIII стагоддзя была *вядучым відам графікі* на Беларусі.

Аб развіцці такога віда выяўленчага мастацтва, як ***скульптура,*** мы можам казаць толькі на нешматлікаіх прыкладах, што дайшлі да нашага часу. На жаль, большасць з скульптур таго часу, што упрыгожвалі храмы і палацы, выраблялася *з дрэва* і таму не захаваліся, былі страчаны падчас войнай і разбурэнняў.

Самы ранні помнік драўлянай скульптуры, што захаваўся да нашага часу – *"Распяцце"* – выява Хрыста з кампазіцыі ў царкве в. Галубічы (суч. Глыбокскі раён), што датуецца канцом XIV стагоддзя.

Выдатным помнікаў культуры канцы XV стагоддзя з'яўляецца і драўляная скульптура "*Св. Гжэгаж"*, зробленая полацкімі майстрамі. Выразнасць скульптуры набліжаецца да партрэтнай, яна ў'яўляе вобраз святога у выглядзе простага, сталага, стомленага, перанесшага пакуты чалавека, які сядзіць у крэсле ў вольнай позе.

Значны ўплыў на развіццё скульптуры аказала распаўсюджанне каталіцкіх ***касцёлаў,*** якія абавязкова ў сваім унутраннім упрыгожванні прадуглежвалі наяўнасць *скульптурных выяў*. У касцёлах з'яўляюцца створкавыя алтары-рэтаблі – складаныя *скульптурна-жывапісныя комплексы*. Напрыклад, унікальным па мастацкай дасканаласці з'ўляецца скульптурны ансамбль ў стыле раннега барока ў касцёле аўгусцінцаў у в. *Міхалішкі* Астравецкага раёна. Скульптарамі з'яўляліся італьянцы П. Перці і Ян Галі, якія працавалі тут каля 1677 года. Францысканцкі касцёл у *Пінску ў* пачатку XVIII стагодзя налічваў у сваім убранстве каля 100 скульптур, што стваралі атмасферу ўрачыстасці і ўзнёсласці.

Асобнымі часткамі выяўленчага мастацтва перыяда XIV – XVI стагоддзяў з'яўляліся таксама:

дэкаратыўна-прыкладнае мастацтва, вядучымі галінамі якога з'яўлялася апрацоўка *металаў* і *ювелірныя* вырабы;

шкларобства – узнікаюць *шкляныя гуты* ў Гародне, Магілёве, Полацку. Брэсце, Шклове, Тураву, Пінску. Яны выраблялі гладкасценныя *чаркі* з масіўнымі донцамі, цыліндрычныя *флаконы, бутэлькі* з шарападобнымі тулавам і высокай гарлавінай.

архітэктурна-дэкаратыўная кераміка, асабліва выраб кафлі, якая адыгрывала вялікую ролюў афармленні свецкіх і культавых інтэр'ераў, пячной абліцоўцы.

ткацтва прывяло да з'яўленння *ткацкіх цахоў* у большасці беларускіх гарадоў. У сярэдзіне XVIII стагоддзя узнікае выраб золата- і шаўкатканны паясоў у Слуцку.

Па названых пытаннях гл. літаратуру:

Ганецкая І. Маёліка на Беларусі XI – XVII стст. Мн., 1995;

Гісторыя беларускага мастацтва. У 2. Т. Мн., 1987, 1988.

Дэкаратыўна-прыкладнае мастацтва Беларусі XII – XVIII стагоддзяў. Мн., 1984.

Сярэдневякавыя старажытнасці Беларусі. Мн., 1993.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў . У 6 т. Мн., 2001 – 2003. . Т. 1-2.

Церашчатава В.В. Старажытна-беларускі манументальны жывапіс XI – XVIII стст. Мн., 1986.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У цэлым, культурнае жыццё на беларускіх землях у XIV – XVI стагоддзях было дастаткова разнастайным. У ім знаходзіла адлюстраванне становішча Беларусі паміж праваслаўным усходам і еўрапейскім захадам, пранікненне ідэй Адраджэння і Рэнесансу, уласцівых культурнаму развіццю Еўропы.

Тэма 4.5 БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ У XVI – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII СТАГОДДЗЯЎ.

План

1. Войны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княства Літоўскім
2. Люблінская унія.
3. Беларускія землі ў другой палове XVI – першай палове XVII ст.

1. Войны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княства Літоўскім

Сацыяльна-эканамічнае і культурнае жыццё ВКЛ, аб якім мы казалі ў папярэдніх тэмах, у XV-XVI стагоддзях адбывалася ў складаных ***знешнепалітычных*** умовах.

Пастаянная пагроза для ВКЛ існавала не толькі з боку *крыжакоў і татарскіх набегаў* (апошня набегі татар на беларускія землі адбыліся ў 1502, 1503, 1505 і 1506 гадах, толькі *Клецкая бітва 1506* года паклала ім канец), але і значна яна узмацнілася з боку *усходняга суседа – Маскоўскай дзяржавы.* Калі ў першай палове XV стагоддзя, асабліва пры Вітаўце, ВКЛ яшчэ паспяхова падпарадкоўвала сябе ўсходнія рускія землі (у 1404 годзе быў далучаны да ВКЛ Смаленск, у 1406 – 1408 гг. ВКЛ замацавалася да вярхоўяў р. Акі), то пачынаючы з сярэдзіны XV стагоддзя *ініцыятыва* пераходзіць да Маскоўскай дзяржавы, якая вызвалілася аб татара-мангольскага іга і пачала актыўна збіраць вакол сябе рускія княствы. Ужо ў 1486 годзе пачаліся *пагранічныя канфлікты* паміж Маскоўскай дзяржавай і ВКЛ, якія неўзабаве перараслі ў працяглыя войны.

Гісторыкі налічваюць як мінімум *5 войн* Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ.

Першая адкрытая вайна Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ адбылася ў **1492 – 1494 гадах**. У выніку вайны да Маскоўскай улады адышло Вяземскае княства і землі ў вярхоўяў Акі.

Другая вайна адбылася ў **1500 – 1503 гадах.** Маскоўскі цар Іван III для вайны з ВКЛ заключыў саюз з Крымскім ханствам, выкарыстоўваў як повад для вайны чуткі аб ганеннях на праваслаўнае насельніцтва у ВКЛ, на бок Масквы перайшлі і некаторыя князі парубежных тэрыторый ВКЛ. Значна ўскладніла становішча ВКЛ у вайне і паражэнне войска ВКЛ на чале з найвышэйшым гетманам Канстанцінам Астрожскім на р. *Вядрошы*, дзе яго конны корпус быў амаль цалкам знішчаны. (*Аб гэтым гл. у "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" артыкул "Бітва на Вядрошы 1500 г." Т.2. С. 45*) У ходзе вайны масакоўскае войска заняла і спаліла Оршу, разрабавала землі на Віцебшчыне і Полаччыне. У выніку вайны да Масквы адыйшлі значныя тэрыторыі ВКЛ на ўсходе, у тым ліку і беларускі Гомель.

Трэцяя вайна адбылася ў **1507 – 1508** гады, калі ВКЛ паспрабавала вярнуць страчаныя ў папярэнія гады тэрыторыі. Пад час вайны маскоўскія войскі накіроўваліся на Полацк і Смаленск, абмінуўшы фартэфікацыі глыбока зайшлі на тэрыторыю Беларусі, у студзені 1508 г. узняў *мяцеж* супраць улады вялікага князя буйны феадал, маршалак дворны *Міхаіл Глінскі* з братамі (гл. артыкул "*Глінскіх мятеж 1508 г*" у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Энцыклапедыі гісторыі Беларусі”. Т. 3., С. 45 – 46), які разам з маскоўскім войскам асадзіў Мінск, Слуцк, спустошылі наваколлі Слоніма, Новагародка. Вайна закончылася ў цэлым безвынікова, падпісаны мір замацаваў межы паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай, што склаліся ў выніку двух папярэдніх войн.

У **1512 – 1522** гады адбылася ***чацвёртая*** вайна Маскойскай дзяржавы з ВКЛ за ўсходнеславянскія землі. На працягу 10-ці год вяліся ўпартыя баі, звяршаліся рэйды, аблогі гарадоў, рабаванне насельніцтва. Маскоўскія войскі тройчы звяршалі паходы на *Смаленск і* у *1514* годзе захапілі яго. Важнай падзеяй у вайне стала генеральная ***бітва пад Оршай*** у верасні 1514 года (Гл. “*Аршанская бітва 1514”* у “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” Т.1. с.187 – 188), адна з буйнейшых бітваў у Еўропе ў пачатку XVI стагоддзя, у якой войскі ВКЛ (больш за 30 тысяч чалавек) пад началам К. Астрожскага разбіла 80-ці тысячнае маскоўскае войска, страты якога склалі каля 40 тысяч чалавек. Пасля бітвы пад Оршай на парацягу 3-х гадоў ваенныя дзеянні з боку маскоўскай дзяржавы вяліся вельмі стрымана, абодвы бакі абмяжоўваліся толькі асобнымі рэйдамі. Аднак з 1519 года актыўнасць Масквы ўзрастае, яе войскі накіроўваюцца да Вільні, па дарозе палілі гарады і вёскі, бралі у палон жыхароў, дайшлі да Крэва, Ашмян, хадзілі на Полацк і Віцебск. Падпісанае ў 1522 годзе пагадненне насіла кампрамісны характар, Смаленск застаўся ў Маскоўскай дзяржаве.

Пятая вайна паміж Маскоўскай дзяржавай і ВКЛ адбылася **ў 1534 – 1537 гадах.** Смерць у 1533 годзе вялікага князя Маскоўскага Васіля III абудзіла ў ВКЛ надзеі на *рэванш і вяртанне* страчаных раней тэрыторый. Пачала вайну фактычна ВКЛ, калі ў 1534 годзе вялікі гетман літоўскі Юры Радзівіл прывёл 20-ці тысячнае войска пад Магілёў, адтуль яго частка накіравалася на Смаленск, а другая – у Северскую землю. У сваю чаргу маскоўскія войскі дайшлі да Браслава і Наваградка, у наступным годзе спалілі Крычаў, Дуброўну, Оршу. Вайна велася с пераменным поспехам і завяршылася мірам без значным змен (толькі Гомель быў вернуты у склад ВКЛ) у межаванні паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай.

Галоўным вынікам працяглых войн можна лічыць ***вялікія матэрыяльныя і людскія страты***, якія панеслі абодвы бакі, ў тым ліку і ВКЛ.

Найбольш значным выпрабаваннем для ВКЛ з’явілася т.зв. ***Лівонская***, ці ***Інфлянцкая вайна*** **1558 – 1582 гг. (*Інфлянты*** *– гістарычная назва зямель сучасных Латвіі і Эстоніі*). – вайна Маскоўскай дзяржавы з Інфлянцкім ордэнам, ВКЛ і Польшчай (з 1569 г. Рэччу Паспалітай), у якой прымалі ўдзел таксама Швецыя і Данія. Вайна падзяляецца на 2 этапы: 1558 – 1570 і 1577 – 1582 гг.

На Інфляндскія землі пачала прэтэндаваць Маскоўская дзяржава, з свайго боку ВКЛ і Польшча імкнуліся кантраляваць выхад да Балтыйскага мора, бо гандлёвы шлях па р. Дзвіне з’яўляўся аднім з найважнешых выхадаў у Заходнюю Еўропу. На дапамогу ВКЛ разлічваў і Інфлянскі Ордэн.

Ваенныя дзеянні разгарнуліся не толькі ў Прыбалтыцы, але закранулі і іншыя тэрыторыі ВКЛ. Напрыклад, у 1562 годзе маскоўскія войскі дайшлі да Шклова, Оршы, Дуброўны і Віцебска. У пачатку 1563 года больш чым 60-цітысячнае войска пад камандаваннем Івана IV аблажыла *Полацк,* які пасля 2-х тыдняў абароны капітуляваў, што з’явілася цяжкай стратай для ВКЛ. Далейшае прасоўванне маскоўскіх войскаў углуб тэрыторыі ВКЛ было спынена ў студзені 1564 года *бітвай пад Улай* (*непадалёк ад Чашнікаў. Гл. “Энцыклапедыю гісторыі Беларусі”. Т. 6. Ч. 1. С. 580, арт. “Ульская бітва 1564”*), у якой гетман М. Радзівіл разбіў 24-х тысячны атрад маскоўскіх войскаў

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

на чале з Шуйскім. Пасля яе назіраліся толькі лакальныя ваенныя сутычкі, а ў 1570 годзе было падпісана перамірье.

Ваенныя дзеянні аднавіліся ў 1577 годзе, у 1579 годзе войскамі ВКЛ быў узяты Полацк, а ў наступным годзе вызвалена ўся паўночная Беларусь. У 1582 годзе быў падпісаны *Ям-Запольскі* мірны дагавор, у выніку якога беларускія землі былі замацаваны за ВКЛ.

2. Люблінская унія.

Люблінская унія 1569 года стала паваротным момантам у развіцці Вялікага княства Літоўскага, а гэта азначае – і беларускіх зямель. Прычыны і перадумовы Люблінскай уніі, яе неабходнасць і вынікі, наступствы для развіцця беларускіх зямель – усе гэтыя праблемы і сёння трактуюцца па-рознаму, сустракаюць падчас супрацьлеглыя ацэнкі і думкі сярод даследчыкаў. Увага да названай падзеі вынікае з яе значнасці ў лёсе беларускагам народа. Які быў шлях да уніі? У чым быў сэнс заключаных дамоўленасцей? Хто выіграў і хто праіграў ад уніі? Якое месца Люблінская унія займае у гісторыі беларускага народ? – паспрабуем разабрацца ў гэтых пытаннях і даць на іх адказ.

Люблінская унія 1569 года – гэта міжнародна-прававы акт аб'яднання ВКЛ з Польшчай ў *федэратыўную* дзяржаву – ***Рэчь Паспалітую.***

Заключэнне Люблінскай уніі паміж ВКЛ і Польшчай не з'явілася нечаканасцю ці выпадковасцю. Яна мела свае карані, мэты, непасрэдныя перадумовы і прычыны.

Да перадумоў Люблінскай уніі патрэбна аднесці *долгае*, на працягу амаль 200-т год, існаванне ***персанальнай уніі*** **ВКЛ і Польшчы**. Пачынаючы ад *Крэўскай уніі 1385 года*, калі Вялікі князь Літоўскі *Ягайла* прыняў карону польскага караля, унія (адзінства) ВКЛ і Польшчы існавала ў выглядзе *аднаго кіраўніка абодвух дзяржаў*. Вялікі князь ВКЛ з'яўляўся адначасова і каралём Польшчы ці наадварот – польскі кароль лічыўся адначасова і вялікім князем ВКЛ. Таму такое становішча, калі адзін чалавек (адна *персона*) сумяшчае пасады вышэўшага дзяржаўца ў двух краінах, і лічыцца *персанальнай уніяй*. Гісторыкі выкарыстоўваюць для вызначэння такога становішча таксама тэрмін "*дынастычны саюз*". На працягу амаль двух стагоддзяў былі перыяды аслаблення такіх сувязей, разам з тым не меньш за 5 разоў прымаліся акты, падцвярждаўшыя унію.

Існаване столь працяглы час разам, у цесным саюзе ВКЛ і Польшчы, пры захаванні іх адметнасцяў, непазбежна вяло да ***паступовага збліжэння*** *палітычных і дзяржаўных устаноў, уніфікацыі заканадаўства і дзяржаўнага* ладу абедзвюх дзяржаў. ВКЛ і Польшча вымушаны былі праводзіць узгодненую, у асноўным *адзіную знешнюю палітыку* ў міжнародных адносінах, асабліва калі сустракаліся са знешнімі пагрозамі. Немалаважным фактарам было і існаванне адзінай *каталіцкай* царквы, якая паступова павялічвала свой уплыў у ВКЛ.

Адзначаючы агульнае, што аб'ядноўвало, стварала падставу для адзінства двух дзяржаў, нельга не казаць і аб пэўных ***адрозненнях*** ВКЛ і Польшчы. *Па-першае*, краіны адрозніваліся *грамадска-палітычным ладам*. Польшча была *канстытуцыйнай манархіяй* на чале з выбарным каралём і заканадаўчым сеймам. ВКЛ – *спадчынная манархія, з* амаль не абмежаванай уладаў вялікага князя. У Польшчы існавала шляхецкая роўнасць – у ВКЛ гэтага не было, тут усім запраўлялі магнаты. *Па-другое,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

меліся адрозненні ў *этнічным* складзе насельніцтва: Польшчу насялялі галоўным чынам *заходнія* славяне, а ВКЛ існавала як поліэтнічная дзяржава, населеная *усходнімі* славянамі, балтамі, татарамі, яўрэямі і інш. *Па-трэцяе*: меліся адрозненні *канфесійнага х*арактара – дзяржаўнай рэлігіяй Польшчы быў *каталіцызм,* а ў ВКЛ большасць насельніцтва было *праваслаўнымі,* існавалі нават рэшткі язычніцтва.

Імкненне да ўмацаванне адзінства *было з двух бакоў* – як з боку ВКЛ, так і з боку Польшчы, кожны з іх меў свае інтарэсы, дамагаўся сваіх выгад і мэт.

Польскі бок быў зацікаўлены ў *пашырэнні* для польскай шляхты магчымасці набываць землі і нерухомасць на тэрыторыі ВКЛ. Свае інтарэсы мела і каталіцкая царква, якая намагалася стаць адзінай дзяржаўнай рэлігіяй. Польшча імкнулася да стварэння як мага большага цеснага аб'яднання, фактычна была зацікаўлена у ***інкарпарацы***і (уваходжанні) ВКЛ у склад польскай дзяржавы.

У ВКЛ галоўнай зацікаўленай у аб'яднанні сілай выступала *шляхецтва,* якое імкнулася набыць тыя ж правы, т.зв. "шляхецкія вольнасці", што мела шляхта ў Польшчы, пазбавіцца сваёй залежнасці ад магнатаў. Але разам з тым, ідэя інкарапацыі ВКЛ у Польшчу сярод беларуска-літоўскай шляхты, у тым ліку і магнатаў, не сустракала падтрымкі. Пануючы клас ВКЛ выступал за аб'яднанне ў выглядзе ***федэрацыі*** – стварэння агульнай дзяржавы з захаваннем аўтаноміі (самастойнасці) кожнай яе часткі.

Такую сітуацыю ананімны аўтар у 1564 годзе ў творы "Размова поляка з літвінам" выказал наступным чынам: "… хацелі б разам з Вамі быць, мець Вашыя вольнасці, але страчваць сваю дзяржаву не жадаем".

Непасрэднай ***прычынай,*** якая паскорыла працэс аб'яднання ВКЛ і Польшчы, гісторыкі бачаць неудалы для ВКЛ першы перыяд Лівонскай (Інфлянцкай) вайны, калі ў 1558 – 1570 гады ВКЛ страціла Полацк, стала рэальнай пагроза з боку Маскоўскай дзяржавы беларускіх зямель. Стала відавочна, што аднаасобна спыніць агрэсію Маскоўскай дзяржавы, а, тым больш, вярнуць страчаныя землі, Княства не можа. Менавіта неудачы ў вайне падштурхнулі шляхту ВКЛ для саюза з Польшчай. З свайго боку, Польшча сваю дапамогу ВКЛ у вайне абяцала толькі пры заключэннем дзяржаўнай уніі паміж краінамі.

Працэс заключэння дзяржаўнага саюза паміж ВКЛ і Польшчай зацягнулся на некалькі год, быў непросты, бо бакі імкнуліся правесці сваі праекты, упарта адстойвалі свае інтарэсы. Падчас падрыхтоўкі уніі выкарыстоўваліся метады не толькі вядзення перамоў і пошукаў узгадненняў, але расколу, запалохвання і прымусу.

Ужо пачынаючы з 1562 года вяліся перамовы і вылучаліся ўмовы аб'яднання. Адбыўся ***з'езд шляхты ВКЛ пад Віцебскам***, які выразна паказаў, што ні шляхта, ні магнаты не хацелі інкарпарацыі, а дамагаліся саюза двух дзяржаў з агульным манархам і супольнай знешняй палітыкай пры захаванні ўсіх правоў і вольнасці ВКЛ, асобных судоў, сеймай, заканадаўства, войска.

З свайго боку, ***Варшаўскі сейм 1564 года*** зацвердзіў польскія умовы аб'яднання, якія фактычна азначалі інкарпарацыю ВКЛ, страту яго самастоўнасці і падпарадкаванне Кароне польскай.

Перамовы аб уніі былі працягнуты ў 1566 годзе ***на сейме ў Бярэсці*** і ***Любліне.*** У 1566 – 1568 гадах адбыліся мясцовыя сеймікі шляхты ВКЛ у *Жамойці, Бярэсці,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Віцебску, Валыні, Гародні, якія далі наказы і паўнамоцтвы сваім паслам прасіць польскага караля склікаць ***агульны сейм*** для выпрацоўкі і заключэння уніі.

Такі з'езд пачаўся ў ***Любліне 10 студзеня 1569 года***. З 12 лютага пачаліся спрэчкі аб умовах аб'яднання. Існавалі два варыянта. Практ уніі, прадстаўлены польскім бокам, прадуглежваў, што ВКЛ і Каралеўства польскае утваралі "*адзінае цела, адзіны народ*". Свой праект дала дэлегацыя ВКЛ, па якому агульныя органы ўлады вырашалі толькі пытанні *знешняй палітыкі і абароны*, а ва ўнутраных справах ВКЛ захоўвала самастойнасць. Але напярэдадні канчатковага паседжання, 1 сакавіка паны-рада і паслы ВКЛ раптоўна *пакінулі Люблін.*

Пасля ад'езда прадстаўнікоў ВКЛ польскім бокам былі зроблены захады па расколу ВКЛ. Да Польшчы былі далучаны такія яго часткі *як Валынь, Усходняе Падолле і Падляшша,* якія былі гвалтоўна адарваны ад ВКЛ, у выніку чаго яго тэрыторыя скарацілася толькі да земляў Беларусі і Літвы. У такіх умовах у канцы сакавіка ў Вільні адбыўся з'езд паноў-рады ВКЛ, які паспрабаваў выпрацаваць кампрамісны варыянт уніі.

Толькі ***1 ліпеня 1569 года*** (*амаль праз паўгода з пачатку перамоў*) быў канчаткова зацверджаны *акт дзяржаўнай уніі* паміж ВКЛ і Каралеўствам польскім і утворана адзіная дзяржава – **Рэч Паспалітая.** (*з польскага – **рэспубліка, агульная дзяржава, агульная справа**; лацінскі эквівалент res publica - **государство общего блага)***, агульная дзяржава "абодвух народаў" Кароны (Польшчы) і ВКЛ.

Па умовах уніі у Рэчы Паспалітай ***агульным***і былі *кароль, сейм, сенат, знешняя палітыка і фінансы.* Кароль абіраўся *супольным соймам,* які меў таксама заканадаўчую і часткова судовую уладу, і складаўся з ***Сената,*** куды уваходзілі магнаты, прадстаўнікі цэнтральнай і мясцовай адміністрацыі і вярхі каталіцкай царквы, і ***Пасольскай ізбы (***сейма), у якую абіраліся па два паслы (дэпутаты) ад шляхты кожнага павета. Прадстаўніцтва ад ВКЛ у агульнадзяржаўных органах было фактычна чыста *фармальным*: паколькі ў Кароне было больш паветаў, чым у ВКЛ, таму з 180 паслоў толькі 46 прыходзілася на ВКЛ (у тым ліку ад беларускіх паветаў – 34). У выніку рашэнні прымаліся польскай большасцю галасоў, што азначала *палітычную дыскрымінацыю* інтарэсаў ВКЛ. Згодна з уніяў Сейм ВКЛ юрыдычна перастаў існаваць, што азначала страту палітычнага сувярэнітэту.

Разам з тым, па умовах уніі ВКЛ фармальна *захавала* сваю *адміністрацыю* і адпаведныя пасады ў ёй, *канцылярыю, войска* са сваім камандаваннем, *судовую і прававую сістэму*, права чаканкі аднолькавай *манеты, мытнае заканадаўства*.

Галоўнай заваёвай польскага боку па уніі стаў *дазвол польскай шляхце* набываць, атрымліваць у межах ВКЛ *зямельныя уладанні*, што стварыла для беларуска-літоўскай шляхты небяспечнага канкурэнта і было галоўным фактарам пашырэння польскага ўплыва на тэрыторыі ВКЛ.

У сучасных *ацэнках вынікаў Люблінскай уніі* для ВКЛ, у тым ліку і для беларускіх зямель, пераважаюць песімістычныя высновы. Сустракаюцца вызначэнні:

"Першае ўражанне ў Княстве ад вынікаў уніі было ***шокавым"***, "Вялікакняжацкія палітыкі імкнуліся вывесці дзяржаву з таго ***тупіка,*** у якім яна апынулася ў выніку Люблінскай уніі" ("Гісторыя Беларусі" пад рэд. М.П. Касцюка, Т.2, с.474, 475).

"1569 год паклаў пачатак новай, ***трагічнай*** старонцы ў гісторыі Беларусі", " Як здарылася, што без адзінага выстралу, без барацьбы ***знікла раптам цэлая дзяржава,*** добраахвотна пераўтварылася ў польскаю правінцыю?", "Люблінская унія - гэта ***анексія і інкарпарацыя*** княства ў Польскае каралеўства. Для Беларусі люблінскі акт –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гэта ***пагроза поўнага акаталічвання і паланізацыі краю***” (“Гісторыя Беларусі” пад рэд. Я.К. Новіка і Г.С. Марцуля. Ч.І, с.170, 177.)

Усе названыя ацэнкі маюць свае падставы, асабліва калі мы зараз ведаем, як змянялася становішча ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітаў у наступныя стагоддзі. Сапраўды, стварэнне адзінай дзяржавы паспрыяла ў наступным узмацненнб польскага ўплыву на беларускія землі, стварыла пагрозу апалячвання і акаталічвання насельніцтва. Размова аб гэтым будзе ісці, калі вы будзеце ў наступным семестры вычучаць перыяд з другой паловы XVII па канец XVIII стагоддзяў.

Але ацэньваючы сам акт Люблінскай уніі патрэбна стаяць на прынцыпах гістарызма, не забегаючы на 2 стагоддзі далей, а высвятляючы непасрэдныя ўмовы і вынікі утварэння Рэчы Паспалітай. У дадатак да тых перадумоў і прычын заключэння Люблінскай уніі, аб якіх мы казалі, патрэбна дадаць наступнае.

Па-першае, аб’яднанне ВКЛ і Кароны было здейснена не *народнымі масамі,* а тым класам *феадалаў,* у руках якога знаходзілася палітычная улада ў ВКЛ. *Менавіта шляхецкае саслоўе*, якое складала па падліках гісторыкаў 8 – 10 працэнтаў насельніцтва ВКЛ, кіруючыся сваімі палітычнымі, эканамічнымі, сацыяльнымі і іншымі *інтарэсамі* ажыццявіла злучэнне ВКЛ і Польшчы. У “*Энцыклапедыі гісторыі Беларусі*” (Т.6. Ч.1. С. 178. Артыкул “Рэч Паспалітая”) нават мы сустрэнем такое вызначэнне: “ Рэч Паспалітая лічылася ***агульнай дзяржавай*** “абодвух народа”, г.зн. польскай і беларуска-літоўскай ***шляхты***”. (пад вызначэннем *народ* – разумецца *шляхта*). З гэтым можна пагадзіцца.

Па-другое. Не гледзячы на намаганні з боку Польшчы, Рэч Паспалітая не стала ***унітарнай*** дзяржавай. (*Унітарная дзяржава* – форма дзяржаўнага ладу, пры якой тэрыторыя краіны *не мае федэратыўных, самастойных адзінак,* а падзяляецца на адміністрацый-тэрытарыяльныя часткі пры адзіным кірайніцтве краіны.) Таму назваць ВКЛ правінцыяй Польшчы падстаў няма.

Больш правільна, калі Рэч Паспалітую вызначаюць як ***федэратыўнаю*** дзяржаву. (*Федэрацыя – форма дзяржаўнага ладу, пры якой уваходзячыя ў склад дзяржавы адзінкі маюць* ***уласныя канстытуцыі, заканадаўчыя і судовыя органы,*** *але утвараюцца* ***адзіныя федэральныя, саюзныя органы улады****. Федэрацыя – саюз дзяржаў*). Менавіта па такому прынцыпу і будавалася Рэч Паспалітая.

Больш таго, некаторыя гісторыкі лічаць, што ВКЛ дамагалася эвалюцыі федэрацыі ў ***канфедэрацыю.*** (*Канфедэрацыя* – форма дзяржаўнага ладу, пры якой дзяржавы ***поўнасцю захоўваюць сваю незалежнасць***, маюць уласныя органы улады і кіравання, а створаныя аб’яднаныя органы толькі ***каардынуюць*** іх дзеянні ў адпаведных мэтах - ваенных, знешнепалітычных і інш.). Аб гэтым сведчаць захады, зробленыя ВКЛ неўзабаве пасля Люблінскай уніі, аб якіх мы будзем казаць крыху пазней.

Па-трэцяе. Ацэваючы стварэнне Рэчы Паспалітай, нельга абсалютазавацца толькі на адмоўных выніках аб’яднання ВКЛ і Польшчы. Патрэбна прызнаць, што пры ўсіх складанасцях і неадназначнасці зробленага шляхтай ВКЛ кроку, былі дасягнуты пэўныя мэты, якія стаялі перад аб’яднаннем.

Утварэнне Рэчы Паспалітай *змяніла на карысць* ВКЛ ход *Інфлянскай вайны*, аб якой мы казалі. Другі яе этап 1577 – 1582 гг. дазволіў захаваць тэрыторыю ВКЛ, адбіць намаганні Маскоўскай дзяржавы, умацаваць знешнепалітычнае становішча ВКЛ.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Унія стварыла умовы для паступовай *інтэграцыі* літоўска-беларускага шляхецтва у палітычную сістэму польскай дзяржавы, паступова яно (беларускае шляхецтва) набыло такія ж палітычныя і сацыяльныя правы, як і польская шляхта.

Стварэнне Рэчы Паспалітай спрыяла і умацаванню *эканамічных, палітычных, сацыяльных, культурных і і*ншых сувязей беларускіх зямель з заходнееўрапейскімі краінамі і народамі, спрыяла іх ***еўрапейскай інтэграцыі.*** (Некаторыя даследчыкі бачаць ў гэтым *пагрозу* страты беларускай культуры, яе самаіндэнтычнасці, пагрозу паланізацыі і г.д., але нацыяльная замкнутаць, самаізаляванасць не з'яўляецца гарантам захавання нацыянальнай адметнасці. Многія народы Еўропы здолелі захаваць свае нацыянальныя адметнасці ва умовах еўрапейскіх інтэграцыйных працэсаў).

Асноўны вынік разгляду пытання аб Люблінскай уніі заключаецца ў тым, што ў яе выніку на карце Еўропы ўзнікла ***новая магутная дзяржава*** – Рэч Паспалітая, з існаваннем якой больш чым на два стагоддзя апынуўся звязаным лёс беларускага народа.

3. Беларускія землі ў другой палове XVI – першай палове XVII ст.

Паслялюблінскі перыяд існавання ВКЛ з'яўвіўся часам складаных падзей як унутранняга, так і знешнепалітычнага характара.

Унутрыпалітычнае становішча.

У апошняй трэці XVI – пачатку XVII стагоддзяў, яшчэ як мінімум поўстагоддзя, у ВКЛ працягваліся спробы *змяніць ці перагледзіць* умовы Люблінскай уніі на *карысць захавання самастойнасці княства*. Адносіны паміж двума суб'ектамі Рэча Паспалітай складваліся даволі неадназначна. Шляхта ВКЛ успрымала Польшчу як захаднюю суседку, да якой мела шмат *прэтэнзій* – тэрытарыяльных (дамагалася вяртання у ВКЛ Валыні і Падляшша), памежных, фінансавых.

Найбольш значнай праявай імкнення магнацтва і шляхты ВКЛ умацаваць сваю адасобленасць ад Польшчы стала прыняцця ***Статута ВКЛ 1588*** года, артыкулы якога фактычна не прызнавалі ці скасоўвалі многія пастановы Люблінскай уніі. Дастакова казаць, што ў яго змесце *унія нават не ўпамнаецца.* Статут 1588 года прадстаўляе ВКЛ як дзяржаву з сваім асобным заканадаўствам, уласнай тэрыторыяў, сваім апаратам улады, войскам і фінансамі. Такое становішча нагадвала ужо не федэрацыю, а *канфедэрацыю,* пры якой захоўвалася поўная самастойнасць ВКЛ як часткі Рэчы Паспалітай.

Звышпрынцыповым з'ўляецца і тое факт, што Статут ВКЛ 1588 года *адмяніў* абвешчанае Люблінскай уніяй *права для палякаў* аб набыцці *зямельнай уласнасці і заняцця дзяржаўных пасад* у межах ВКЛ. Дарэчы, Статут ВКЛ 1588 года дзейнічаў на тэрыторыі Літвы і Беларусі без асаблівых змен ажно да 1840 года.

Таму гісторыкі не без падстаў лічаць, што польска-вялікакняжацкія адносіны ў першыя дзесяцігоддзі пасля Люблінскай уніі будаваліся не столькі на артыкулах уніі, колькі на аснове дзяржаўна-заканадаўчых рэалій, якія абаранялі інтарэсы ВКЛ.

Такое кампраміснае суіснаванне дзвух частак агульнай дзяржавы – Рэчы Паспалітай пры узаемным неўмяшальніцтве ва ўнутраныя справы адна другой паступова прыводзілі да іх збліжэння, умацавання адзінства. У 20-я гады XVII стагоддзя назіралася ужо адзінства шляхецкіх саслоў'яў ВКЛ і Польшчы, іх палітычных інтарэсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У названы перыяд Каралём Польскімі і адначасова Вялікім князем Літоўскім былі:

Жыгімонт Аўгуст – 1548 – 1572
Стэфан Баторый – 1576 – 1586
Жыгімонт Ваза – 1587 – 1632
Уладзіслаў Ваза – 1632 – 1648
Ян Казімір - 1648 – 1668

Сацыяльна-эканамічнае становішча.

Устойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё і знешнепалітычнае становішча у XVI – першай палове XVII стагоддзяў станоўча адбіліся на росце колькасці насельніцтва беларускіх зямель. Па прыблізных падліках навукоўцаў, у 1520-я годы насельніцтва Беларусі складала каля ***1 млн.*** чалавек, у сярэдзіне XVI стагоддзя – каля ***1,8 млн чалавек***. За наступнае стагоддзе яно ўзрасло яшчэ амаль мільён чалавек і ў сярэдзіне XVII стагоддзя складала звыш ***2,8 млн***. чалавек.

Асновай жыцця грамадства была сельская гаспадарка, сялянства складала каля 80 % ад агульнай колькасці насельніцтва. Праведзеная аграрная рэформа ў выглядзе ўвядзення валочнай памеры (аб чым мы казалі у адпаведнай лекцыі) вызначыла асноўныя умовы існавання сялянства. Стварэнне фальваркава-паншчынай сістэмы на заходняў і цэнтральнай частках Беларусі ўсталявала адзіныя нормы цягла з сялян на карысць феадала. У фальварках (гаспадарках феадалаў) на адну валоку *(30 моргаў ці 21,37 га зямлі)* фальваркавай зямлі прыходзілася ў сярэднім 7 валок зямлі цяглых сялян.

Землю сяляне атрымлівалі ў спадчыннае *карыстанне,* але зямля заставалася маёмасцю феадала. За карыстанне панскай зямлёй сяляне неслі ***паншчыну*** (*выконвалі работы на панскай зямлі, у панскай гаспадарцы)*, якая складала у пачатку XVI стагоддзя 1 дзень на тыдзень з валокі, а ў сярэдзіне XVI стагоддзя – 2 дня на тыдзень. З канца XVI – у першай палове XVII стагоддзя менавіта *паншчына,* а не чынш (*грашовая рэнта*) ці даніна (*рэнта натіуральнымі прадуктам)і*, становіцца галоўнай формай эксплуатацыі сялян. *Цяглыя* гаспадаркі (*цяглыя – што праведзены на пашчыну, мелі цяглыя надзелы, за якія працавалі паншчыну*) складалі ад 58 да 65 % ад усіх сялянскіх гаспадарк. Выконваліся на карысць феадала і іншыя павіннасці (чынш, дзякла і інш.), якія складалі 30 – 35% сялянскага гадавога дахода

Але разам з тым, неабходна адзначыць, што сялянства Беларусі, не гледзячы на запрыгоньванне, было у цэлым *нядрэнна забяспечана* зямлёй, якая была асноўным сродкам яго існавання. Па падліках гісторыкаў і эканамістаў, у той час для больш-менш нармальнага існавання адной сялянскай сямьі патрэбна было мець зямлі прыкладна каля 0,5 валокі. У сярэднім жа большасць сялянскіх гаспадарак мела 0,5 – 0,7 валокі. Існавалі больш заможныя сялянскія гаспадаркі. У канцы XVI стагоддзя па звестках з 8-мі паветаў Беларусі каля 35% сялянскіх гаспадарак мелі зямлі ад 1 валокі і болей. Разам з тым, існавалі катэгорыі сялян (чэлядь, агароднікі, слугі і інш.), якія наогул не мелі зямлі, ці мелі яе вельмі мала.

У другоў палове XVI стагоддзя завершыўся працэс *канчатковага запрыгоньвання большасці сялянства.* Менавіна Статут ВКЛ 1588 года вызначыў 10-гадовы тэрмін пражывання селяніна на гаспадарскай зямлі, пасля якога ён страчваў права перахода да іншага гаспадара. Паступова пераважная большасць сялянства пападае ў асабістую

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

залежнасць ад феадала, значна скарачаецца такая катэгорыя сялян, як “людзі пахожыя”.

Асноўным маёмасным класам становіцца феадалы, якім належала (акрамя дзяржавы і царквы) большасць зямлі, асновы багатства грамадства. У сярэдзіне XVI стагоддзя колькасць ***шляхты,*** якія мела землі на тэрыторыі Беларусі, складала каля ***162 тысяч*** чалавек.*(не гаспадарак, а чалавек, усіх членаў сямей, 9% насельніцтва)*. Шляхецкае саслоўе падзялялася на катэгорыі паводле сваёй эканамічнай моцы і палітычнай ролі ў дзяржаве.

На тэрыторыі Беларусі было ***29 магнатаў***, да якіх адносіліся гаспадаркі, што мелі больш за 1000 сялянскіх “дымоў”. Іх было толькі 0,7% ад агульнай колькасці шляхты, але яны валодалі 42% сялянскіх гаспадарак. Сярод магнатскіх родах *13 было літоўскага* паходжання (Алелькевічы, Пацы, Чартарыйскія, Радзівілы і інш.), 7 – *беларускага* паходжання (Тышкевічы, Валовічы, Глябовічы і інш.), астатнія – украінскага і польскага паходжання.

Блізкай да гэтай групы феадалаў былі тыя, што мелі маёнткі не меньш за 500 сялянскіх “дымаў”. Абодве гэтыя катэгорыі называліся *панамі,* складалі *вышэйшы* пласт шляхты, займалі вышэйшыя дзяржаўныя пасады, былі сенатарамі ў заканаўчых органах.

Сярэдні пласт шляхты складалі феадалы, якія мелі ад 20 да 500 сялянскіх “дымаў”, такіх было каля 650 феадалаў (разам з членамі сямей складалі 16% ад усяго ўляхецкага саслоўя).

Самай шматлікай была група *дробнай шляхты*. Да іх адносіліся гаспадаркі, што валодалі менш за 20 сялянскіх “дыма”, іх было каля 3 тысяч і яны складалі разам з членамі сямей больш за 70% аб усяго шляхецкага саслоўя, але валодалі толькі 28 % сялянскіх гаспадарак. Менавіта гэтая дробная шляхта дабівалася росту свайго ўплыву ў грамадстве была, саюзніцай Вялікага князя у барацьбе з магнатамі, ініцыятарам уніі з Польшчай.

У XVI стагоддзі, асабліва пасля Люблінскай уніі, канчаткова склаўся і быў заканадаўча замацаваны *комплекс правоў і прывілеў шляхты* – т.зв. “***шляхецкія вольнасці***”. Яны уключалі *роўнасць* усіх грамадзян шляхецкага стану перад законам, права *выбара* караля і зварота да яго, права на *свабоду голаса і права на пратэст,* а таксама *недатыкальнасць асобы* шляхціча і яго маёнтка. Нават за злачынствы шляхціча мог судзіць толькі шляхецкі суд.

У другоў палове XVI – першай палове XVII стагоддзя шляхта імкнулася заканадаўча *адгарадзіцца* ад іншых класаў, замацаваць сваё прывілігераванае становішча ў грамадстве, сачыла за чысціней сваіх шэрагаў, абмяжоўвала набыццё шляхецкага стану выхадцамі з іншых саслоўяў. Напрыклад, Статут ВКЛ 1588 года забараніў шляхцічам займацца рамяством, гандлем і шынкарствам. У 1601 годзе сейм прыняў пастанову, згодна якой шляхецкія званні маглі быць прасвоены толькі на сейме і павятовых сеймiках.

Роля і месца шляхецкага саслоўя у грамадстве была настолькі вялікай, што сучасныя даследчыкі трактуюць Рэч Паспалітую як ***шляхецкую рэспубліку***, дзе нават ўлада Караля была абмежавана інтарэсамі шляхты.

Знешнепалітычныя ўмовы.

Пасля Люблінскай уніі прынцыповыя змены адбыліся у вядзенні знешняй палітыцы. ВКЛ фактычна страціла самастойнасць пры яе вызначэнні, знешняя

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

палітыка вызначалася агульнай краінай – Рэччу Паспалітай, што мела як станоўчыя, так і некаторыя адмоўныя бакі для ВКЛ.

Да станоўчага выніку заключэння Люблінскай уніі у міжнародным становішчы патрэбна аднесці *пералом у ходзе Інфлянскай* (Лівонскай) вайны. Калі на першым яе этапе Маскоўская дзяржава вяла вайну з ВКЛ, то на другім яе этап, у 1577 – 1582 гг. Маскоўская дзяржава мела справу ўжо з Рэччу Паспалітай, ваенныя і эканамічныя магчымасці якой былі значна большымі, чым у аднаго ВКЛ.

Пад кіраўніцтваам польскага караля Стэфана Баторыя аб'яднанае войска ВКЛ і Польшчы, з удзелам венгерскіх наёмнікаў, пачынае ў 1577 годзе контрнаступленне супраць рускай арміі, вынікам якога стала *вызваленне* Полацка, *перанясенне* ваенных дзеянняў на ўласна *рускую тэрыторыю*. Вынікам вайны стала захаванне ранейшай тэрыторыі ВКЛ, аб чым мы ўжо казалі.

Да адмоўнага можна аднесці тое, што ВКЛ, як частка Рэчы Паспалітай, аказалася уцягнута ў шэраг войнай, а менавіта:

у вайну *Рэчы Паспалітай са Швецыяй 1600 – 1629 гадоў,*

у вайну *Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай 1609 – 1618 гадоў,*

у вайну *Расіі з Рэччу Паспалітай 1632 – 1634 гадоў. (г. ЭГБ. Т.2. С.188, 200, 201.)*

Войны не прынеслі значных здабыткаў дзяржаве, не гледзячыы на тое, што ў верасні 1610 года польскае і беларуска-літоўскае войска заняло на некаторый час Маскву, якая была вызвалена ў лістападзе 1612 года рускім апалчэнне пад началам Мініна і Пажарскага.

Вядомы сучасны даследчык ваеннай гісторыі таго часу *Генадзь Сагановіч* на падставе вывучэння гістарычных крыніц часоў вайны Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай 1609 – 1628 гадоў прыйшоў да высновы, што нават *беларуская шляхта была незадаволена* экспасіяніскай палітыкай караля, а паслы ад ВКЛ на вальным сейме 1613 года, крытыкуючы палітыку ўлад, патрабавалі *выкрыць прозвішчы арганізатараў вайны і прыцягнуць іх* да адказнасці. Ён прыводзіць характэрны дакумент таго часу – ліст шляхты Аршанскага павета, падпісаны ў тым ліку вядомымі магнатамі Александрам Сапега, Мікалаем Глямбовічам, братамі Хадкевічамі і іншымі, у якім яны адзначалі, што пад уладай Жыгімонта III ВКЛ цалкам разбурана, а прычынай усіх бед быў паход караля на Маскву. (*Гл. "Гісторыя Беларусі". Пад рэд. М.П. Касцюка. Т.3. С.40-41)* Але знешнюю палітыку краіны вызначала ужо не ВКЛ, а Рэч Паспалітая, таму войны працягваліся.

У іх выніку тэрыторыя ВКЛ захавалася ў асноўным у тым выглядзе, якім яна склалася з XIV стагоддзя. Але шэраг працяглых войнай, якія доўжыліся *ўсю першаю палову XVII* стагоддзя, патрабавалі *значных сродкаў,* прывялі да *спушташэння казны,* павялічэння *падаткаў*, суправаджаліся шматлікі *людскімі стратамі*, падрывалі эканамічны стан ВКЛ, што ў рэшце абумовіла паражэнне ВКЛ у наступнай вайне Расіі з Рэчу Паспалітай 1654 – 1567 гадоў, якую вы будзеце вывучаць ужо ў наступным семестры.

Такім былі асноўныя рысы існавання беларускіх зямель у другой палове XVI – першай палове XVII стагоддзя.

Пытанні да семінарскіх заняткаў

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Тэма 1.2.1 1 **Гаспадарка, культура і побыт старажытных людзей на тэрыторыі Беларусі.**

План:

1. Перыядызацыя першабытнай гісторыі Беларусі.
2. Пачатак засялення людзьмі тэрыторыі Беларусі.
3. Заняткі людзей ў каменным веку.
4. Побыт і культура старажытных людзей каменнага веку.

Тэма 1.4.1 **Заняткі людзей бронзавага і жалезнага вякоў на тэрыторыі Беларусі.**

План:

1. Асаблівасці бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі.
2. Насельніцтва Беларусі перыяда жалезнага веку.
3. Змены ў гаспадарчым жыцці людзей жалезнага веку.
4. Археалагічныя культуры плямен бронзавага і жалезнага вякоў на тэрыторыі Беларусі (днепра-дзвінская, мілаградская, зарубінецкая, штрыхаванай керамікі і інш.)

Тэма 2.1.1 **Этнічныя і сацыяльна-эканамічныя працэсы на беларускіх землях у VI – XIII стагоддзях.**

План

1. Этнічныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў др.палове I тысячагоддзя н.э. Балты і славяне.
2. Крывічы, дрыгавічы і радзімічы. Асноўныя канцэпцыі паходжання беларусаў.
3. Сельская гаспадарка ў IX-XII ст.
4. Узнікненне і развіццё гарадоў ў IX-XII ст.
5. Промыслы і гандаль у XI-XII ст.

Тэма 2.1.2 **Узнікненне дзяржаўнасці на беларускіх землях**

План

1. Полацкае княства ў IX-XII ст.
2. Полацкая княская дынастыя. Жыццё і дзейнасць Усяслава Брачыслававіча (“Чарадзея”) (факультатыўна).
3. Тураўскае княства.
4. Княствы Панямоння ў XII-XIII ст.
5. Феадальная раздробленасць на беларускіх землях у XII-XIII ст.

Тэма 2.1.2 **Рэлігія і культура беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.**

План

1. Барацьба беларускіх зямель супраць мангола-татарскій і крыжацкай агрэсіі.
2. Складванне і развіццё феадальных адносін у IX-XIII ст. Грамадскі лад беларускіх зямель.
3. З’яўленне і распаўсюджанне хрысціянства на беларускіх землях. Роля царквы у грамадскім жыцці ў IX-XIII ст.
4. Культура беларускіх зямель у IX-XIII ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Жыццё і дзейнасць рэлегійна-асветніцкіх дзеячоў (Е.Полацкая, К.Тураўскі, К.Смаляціч і інш.) (факультатыўна).

Тэма 3.2.1 **Беларускія землі падчас утварэння ВКЛ.**

План

1. Знешнія і ўнутраныя перадумовы ўтварэння Вялікага княства Літоўскага.
2. Пачатак утварэння ВКЛ пры Міндоўгу.
3. Умацаванне дзяржавы і пашырэнне тэрыторыі пры Войшалке, Трайдзене, Віцені.
4. Праўленні Гедыміна і Альгерда.

Тэма 3.3.1. **Унутрыпалітычнае развіццё беларускіх зямель у складзе ВКЛ.**

План

1. ВКЛ пры Вітаўце. Крэўская унія.
2. Складванне феадальна-саслоўнай рэспублікі.
3. Структура дзяржаўнай улады і кіравання.
4. Статут ВКЛ як гістарычная крыніца.

Тэма 4.1.1 **Развіццё феадальных адносін у сельскай гаспадарцы ў XIV – XVI стст.**

План

1. Развіццё феадальнай гаспадаркі на беларускіх землях.
2. “Устава на валокі” і станаўленне фальваркавай сістэмы гаспадарання.
3. Увядзенне пашчыны, павіннасці сялян.
4. Канчатковае запрыгоньванне сялянства.

Тэма 4.2.1 **Сацыяльна-эканамічнае жыццё гарадоў Беларусі ў XIV – XVI стст.**

План

1. Крыніцы росту гарадскога насельніцтва.
2. Роля гарадоў у развіцці вытворчасці.
3. Магдэбургскае права беларускіх гарадоў.
4. Унутраны і знешні гандаль.

Тэма 4.3.1 **Рэлігійнае жыццё ў ВКЛ.**

План

1. Крызіс праваслаўнай царквы.
2. Узмацненне ўплыву каталіцызма на беларускіх землях.
3. Пратэстанцкія арганізацыі на тэрыторыі Беларусі.
4. Распаўсюджанне уніяцтва.

Тэма 4.4.1 **Асветніцтва на беларускіх землях ў XIV – XVI стст.**

План

1. Асаблівасці развіцця адукацыі у перыяд сярэднявечча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. З’яўленне кнігадрукавання на беларускіх землях.
3. Ф. Скарына – еўрапейскі і беларускі асветнік.

Тэма 4.4.2. **Мастацтва Беларусі XIV – XVI стст.**

План

1. Жанры літаратурнай творчасці.
2. Народнае і прафесійнае тэатральнае мастацтва.
3. Віды і помнікі беларускага выяўленчага мастацтва перыяда XIV – XVI ст.
4. Абарончае дойлідства (факультатыўна).

Тэма 4.5.1 **Люблінская ўнія ў гісторыі Беларусі.**

План

1. Інфлянская вайна і яе вынікі для ВКЛ.
2. Унутрыпалітычныя перадумовы Люблінскай уніі.
3. Змест і ўмовы Люблінскай уніі.
4. Барацьба за захаванне самастойнасці ВКЛ пасля Люблінскай уніі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура асноўная

1. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. – Мінск, 1985.
2. Асветнікі зямлі беларускай (X – пачатак XX ст.): Энцыклапедычны даведнік. – Мірнск. 2001.
3. Беларускія летапісы і хронікі. – Мінск, 1997.
4. Беларусь.: Народ. Государство. Время. / Нац. Акад. Наук Беларуси, Ин-т истории; рэдкол.: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск: Беларус. Наука, 2009. – 879 с.: ил.
5. Белоруссия в эпоху феодализма: сб. документов и материалов: В 4 т. – Минск, 1959 – 1979.
6. Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя: У 2 т. – Мінск, 2006 – 2007.
7. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч.1. Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. . / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мінск, 2007.
8. Гісторыя Беларусі: У 6 т. / рэдкал.: М.П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Т. 1: Старажытная Беларусь : ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. – Мінск, 200.
9. Гісторыя Беларусі: У 6 т. / рэдкал.: М.П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, . – Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага – Мінск, 2008.
10. Гісторыя Беларусі / А.Л. Абецедарская, П.І. Брыгадзін, Л.А. Жылуновіч і інш.; пад рэд. А.Г. Коханоўскага і інш. – Мінск, “Экаперспектыва”, 1996. – 496 с.

11. Гісторыя сялянства Беларусі: У 3 т. Т.1. Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. – Мінск, 1997.
12. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч.1. М.П. Касцюк, У.Ф. Ісаенка, Г.В. Штыхаў і інш. – Мінск: “Беларусь”, 1994. – 527 с.: іл.
13. Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэб дапам. / пад рэд. В.І. Галубовіча. – Мпнск, 1999.
14. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мінск, 1993 – 2003.
15. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мінск, 1989.

Літаратура дадатковая

16. Архітэктура Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. – Мінск. – 1993.
17. Доўнар- Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. – Мінск. 1994.
18. Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд. – Мінск, 1994.
19. Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: полацкі і новагародскі перыяды. – Мінск, 2001.
20. Загарульскі Э.М. Заходняя Русь. IX – XIII стст. – Мінск, 1998.
21. Копысский З.Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI - первой половине XVII в. – Минск, 1978.
22. Копысский З.Ю. Экономическое развитие городов Белоруссиии в XVI - первой половине XVII в. – Минск, 1966.
23. Краўцэвіч А.К. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага. – Мінск. 1998.
24. Литвин Михалон. О нравах татар, литовцев и москвитян. – Москва. 1994.
25. Лойка П.А. Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI – XVIII стст. – Мінск, 1991.
26. Лойка П.А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. Мінск, 2001.
27. Лыч Л.М., Навіцкі У.М. Гісторыя культуры Беларусі. – Мінск, 1997.
28. Магдэбургскае права на Беларусі. – Мінск, 1999.
29. Місарэвіч Н.В. Магдэбургскае права на Беларусі. – Гродна, 2003.
30. Статут Вялікага княства Ліітоўскага 1588: Тэкст. Даведнік. Каментарыі – Мінск, 1989.
31. Францыск Скарына і ягот час: Энцыклапедычнаы даведнік. – Мінск, 1988.
32. Янушкевіч А.М. Вялікае княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558 – 1570 гг. – Мінск, 2007.
33. Чарняўскі М.М. Ілюстраваная гісторыя старадаўняй Беларусі: першабытны перыяд. – Мінск,2003.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

КСР

Тэма 4.2.2 Рамесная вытворчасць беларускіх гарадоў і мястэчак ў XIV – XVI стст.

План

1. Развіццё і пашырэнне рамеснай вытворчасці.
2. Цэхавая арганізацыя рамеснай вытворчасці.
3. Спецыялізацыя рамеснай вытворчасці.
4. Арганізацыя унутранага і знешняга гандлю.

Пытанні для самакантролю:

1. Што спрыяла развіццю рамеснай вытворчасці на беларускіх землях?
2. Якія віды рамеснай вытворчасці былі развіты на беларускіх землях?
3. Чым адрозніваласа рамесная вытворчасць у сельскай мысцовасці і гарадах?
4. Як была арганізавана рамесная вытворчасць у гарадах?
5. Які уплыў на развіццё рамеснай вытворчасці у беларускіх гарадах аказалі сувязі з заходнееўрапейскімі гарадамі.?
6. Што з'яўлялася асноўнымі прадметамі экспарта і імпарта беларускіх гарадоў?

Тэма 4.3.2 Канфесіянальная гісторыя ВКЛ.

План

1. Праявы Рэфармацыі на беларускіх землях.
2. Манаскія ордыны.
3. Дзейнасць езуітаў на тэрыторыі Беларусі.
4. З'яўленне іўдзейства і ісламa на беларускіх землях.

Пытанні для самакатролю:

1. Як уплывала геапалітычнае становішча беларускіх зямель на стан канфесійнага жыцця на іх?
2. Хто з'яўляўся носьбітам ідэй Рэфармацыі ў ВКЛ?
3. Якія канфесіі мелі свае манаскія ардэны на тэрыторыі Беларусі?
4. Дзе знаходзіліся найбольш вядомыя і буйныя езуіцкія арганізацыі?
5. Якія палітычныя і эканамічныя прычыны паўплывалі на з'яўленне і распаўсюджанне іудаізма і і ісламa на беларускіх землях?

Тэма 4.4.3 Помнікі культуры Беларусі XIV – XVI стст.

План

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Абарончае дойлідства на тэрыторыі Беларусі.
2. Праявы еўрапейскага Рэнесансу ў свецкіх і духоўных збудаваннях.
3. Помнікі беларускага выяўленчага мастацтва XIV – XVI стст.

Пытанні для самакатролю:

1. Назавіце прычыны распаўсюджання абарончага дойлідства на тэрыторыі беларускіх зямель.
2. Якія асаблівасці і агульнаеўрапейскія рысы мела абарончае дойлідства на тэрыторыі Беларусі?
3. Якія найбольш вядомыя і характэрныя па стылю абарончыя замкі вы ведаеце?
4. Як сумяшчаліся рысы еўрапейскага рэнесансу і мясцовыя традыцыі у духоўных і свецкіх збудаваннях?
5. Якія помнікі беларускага выяўленчага мастацтва XIV – XVI стст. дайшлі да нашага часу?

Метадычны блок

Тэмы рэфератаў

1. Першыя стаянкі людзей на тэрыторыі Беларусі.
2. Асаблівасці вырабу прылад працы у каменным, бронзаавым і раннім жалезным веку.
3. Плаўка і апрацоўка жалеза на тэрыторыі старажытнай Беларусі.
4. Вераванні старажытнага насельніцтва Беларусі.
5. Мастацкі свет старажытнага чалавека.
6. Фарміраванне этнічнай тэрыторыі беларускага народа.
7. Роля балтаў у паходжанні беларусаў.
8. Старажытныя гарады Беларусі: Полацк, Тураў. Гародня, Менск і інш.
9. Полацкая княская дынастыя.
10. Феадальная раздробленасць на беларускіх землях.
11. Увядзенне хрысціянства на Беларусі.
12. Язычніцтва на беларускіх землях.
13. Сафійскі сабор у Полацку.
14. Ефрасіння Полацкая: жыццё і дзейнасць.
15. Погляды гісторыкаў на праблему ўтварэння ВКЛ.
16. Міндоўг і яго дзейнасць па збіранню балта-славянскіх зямель.
17. Вялікі князь Войшалк і яго роля ў стварэнні ВКЛ.
18. Унутраная і знешняя палітыка Гедыміна.
19. Аб’яднальная палітыка Альгерда.
20. Цэнтралізатарскія і дэцэнтралізатарскія працэсы ў ВКЛ.
21. Арганізацыя ўлады і каравання ў ВКЛ.
22. Вялікі князь Вітаўт і яго дзейнасць.
23. Леў Сапега – дзяржаўны дзеяч ВКЛ.
24. Люблінская ўнія і яе вынікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

25. Змест Статутаў ВКЛ (1529, 1566, 1588 гг.) і іх значэнн
26. Фальварк – таварна-збожжавая гаспадарка.
27. Юрыдычнае афармленне прыгоннага права на Беларусі.
28. Кіраванне, слад і побыт насельніцтва гарадоў Беларусі.
29. Гарады магдэбургскага права на Беларусі.
30. Мястэчкі Беларусі XIV – XVII стст.
31. Роля і асаблівасці ганлю на Беларусі ў XIV – XVII стст.
32. Арганізацыя і ўзбраенне войска ВКЛ.
33. Грундвальдская бітва.
34. К. Астрожскі – падкаводзец XVI ст.
35. Бітва пад Воршай 8 верасня 1514 г.
36. Мяцеж М. Глінскага.
37. Люблінская вунія і яе значэнне у лёсе ВКЛ.
38. Уплыў ідэй заходнеўрапейскага Адраджэнне на развіццё беларускай кулоьтуры.
39. Жыццё, творчасць і спадчына Ф. Скарыны.
40. С. Будны – беларускі асветнік і рэфарматар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Кантрольны блок

Пытанні да калоквіўма па тэме “Старажытнае грамадства ў Беларусі”

- *Перыядызацыя гісторыі Беларусі*. Чатыры варыянты перыядызацыі Беларусі. Перыядызацыі гісторыі старажытнага грамадства. Характарыстыка кожнай.
- *Гістарычныя крыніцы.* 2 стадыі апрацоўкі гістарычных крыніц. Формы існавання гістарычных крыніц.
- *Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны.* Археалогія. Этнаграфія. Антрапалогія. Лінгвістыка. Фальклор. Тапаніміка. Гідраніміка.
- *Гістарыяграфія гісторыі Беларусі першабытнага перыяду*. Вывучэнне старажытнай гісторыі Беларусі ад эпохі Адраджэння да пач. XX ст (праблематыка, прозвішчы даследчыкаў). Даследаванні першай паловы XX ст. Пасляваенны перыяд вывучэння старажытнай гісторыі. Абагульняючыя працы па гісторыі старажытнага грамадства.
- *Прадмет першабытнай гісторыі.* Спецыфіна першабытнай гісторыі. Рэлігійны і эвалюцыйны падыходы да праблемы паходжання чалавека. Погляды Ч. Дарвіна і Ф. Энгельса на антрапагенез.
- *Этапы развіцця гамінідаў* (людзей). Аўстралапітэкі. Архантрапы. Паленатрапы. Неантрапы.
- *Першыя спробы засялення чалавекам тэрыторыі Беларусі.* Ніжні (ранні) палеаліт. Сярэдні палеаліт. Верхні палеаліт. Мезаліт (Час. Археалагічныя знаходкі).
- *Гаспадарка, грамадскае ўладкаванне і мастацтва старажытнага чалавека эпохі палеаліту.* Прысвойваючыя формы гаспадарання (характарыстыка). Род, племя. Уласнасць, спажыванне, размеркаванне. Найстаражытнейшы арнамент. Скульптурныя выявы людзей. Рэлігійныя вераванні.
- *Мезаліт.* Агульная характарыстыка эпохі. Вынаходніцтва мезаліту. 3 вобласці, у якіх вытворчасць крамянёвых прылад працы набыла істотныя адрозненні. Характарыстыка культур эпохі мезаліту. Карта культур мезаліту.
- *Неаліт.* Агульная характарыстыка эпохі. Гісторыка-археалагічная культура. Характарыстыка культур грабенчатай керамікі.
- *Неаліт*. Гісторыка-археалагічная культура. Неалітычныя культуры шнураванай керамікі. Індаеўрапейцы. 3 этапы неманскай культуры. Карта неалітычных культур.
- *Прысвойваючая гаспадарка чалавека эпохі каменнага веку.* Палеаліт. Мезаліт. Неаліт. Зараджэнне земляробства, жывёлагадоўлі. Здабыча крэменю шахтавым спосабам. Выраб глінянага посуду.
- *Духоўная культура старажытнага чалавека ў каменным веку.* “Палеалітычныя Венеры” (версіі аб іх прызначэнні). Мастацтва мезаліту і неаліту.
- *Бронзавы век*. Перыядызацыя. Агульная характарыстыка эпохі. Індаеўрапейцы. Археалагічныя культуры ранняга бронзавага веку. Археалагічныя культуры сярэдняга бронзавага веку (месцазнаходжанне, заняткі, этнічная прыналежнасць). Карта культур бронзавага веку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- *Гаспадарчыя заняткі насельнікаў Беларусі ў бронзавым веке.* Металаапрацоўка. Вытворчая гаспадарка – жывёлагадоўля і земляробства. Прысвойваючая гаспадарка. Апрацоўка каменю, костак, рагоў і дрэва. Выраб керамікі. Абмен.
- *Духоўная культура старажытнага чалавека эпохі бронзы.* Зрухі ў светапоглядзе людзей эпохі бронзы. Вераванні насельніцтва. Культ жывёл. Пахавальныя абрады. Мастацтва. Упрыгажэнні.
- *Жалезны век.* Перыядызацыя эпохі. Культуры жалезнага веку (Месцазнаходжанне. Тыпы паселішчаў. Кераміка. Металургічная вытворчасць. Пахаванні. Этнічная прыналежнасць).
- *Гаспадарчыя заняткі ў жалезным веку*. Земляробства і жывёлагадоўля. Паляванне і рыбалоўства. Хатнія заняткі. Абмен і гандаль.
- *Сацыяльныя адносіны і грамадскі лад у эпоху жалезнага веку.* Распад першабытнаабшчынных адносін. Лад ваеннай дэмакратыі. Пераход ад радавой абшчыны да тэрытарыяльнай. Гарадзішчы-сховішчы.
- *Духоўная культура чалавека жалезнага века.* Культ жывёл. Пахавальныя помнікі. Арнаментацыя посуду. Мастацтва.

Пытанні да калоквіўма па тэме“Беларусь у раннім сярэднявеччы” (VI - п.п.XIIIст.)

1. Гістарыяграфія Першыя абагульняючыя работы аб старажытных княствах на тэрыторыі Беларусі (М. Доўнар-Запольскі, У. Данілевіч, П. Галубоўскі, А. Грушэўскі, М. Грушэўскі). Станаўленне нацыянальнай гістарыяграфіі (В. Ластоўскі, У. Ігнатоўскі). Працы У. Пічэты, Л. Аляксеева, В. Сядова, Э. Загарульскага, Г. Штыхава, П. Лысенка, М. Ермаловіча. Абагульняючыя работы. Энцыклапедыі.

2. Крыніцы. Звесткі аб славянах у творах епіскапа Іардана, П. Кесарыйскага, Маўрыкія, Гардзізі, Ал Мукадасі. “Аповесць аб мінулых часах”, Іпацьеўскі летапіс, Галіцка-Валынскі летапіс, Радзівілаўскі летапіс. Полацкі летапіс. Устаўная грамата князя Расціслава (1136г.). Дагавор Смаленска з Рыгай і Готкім берагам (“Смаленская Праўда”) 1229г. “Хроніка Лівоніі” Г. Латвійскага.

3. Балты і славяне ў VI – VIII ст.ст. Балты. Плямёны банцараўскай і калочынскай культуры.Культура смаленска – полацкіх доўгіх курганоў, культура ўсходне-літоўскіх курганоў. Культура каменных курганоў і каменных магіл (час, арэал, асобныя прыкметы, гаспадарка, этнічная прыналежнасць, карта культур). Славяне. Пражская культура. Ваенная дэмакратыя і зараджэнне дзяржаўнасці ў славян.

4. Усходнеславянскія саюзы плямён. “Аповесць аб мінулых часах” аб рассяленні славянскіх плямён. Княжэнне. Крывічы-палачане. Дрыгавічы. Радзімічы (першыя ўпамінанні ў летапісах, межы рассялення, асноўныя заняткі, асобныя прыкметы, карта).

5. Полацкае княства ў IX – XI ст.ст. Дзяржава. Галоўныя адзнакі дзяржавы. Саюзы княжэнняў. Хазары. Варагі. Нарманская і антынарманская тэорыі аб паходжанні дзяржавы ў усходніх славян. Першыя летапісныя звесткі аб Полацку. Рурык. Алег. Утварэнне старажытнарускай дзяржавы “Кіеўская Русь”. Ігар. Вольга.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Святаслаў. Прычыны выхаду Полацкага княства з-пад уплыву Кіева. Рагвалод. 980 г. Ізяслаў Уладзіміравіч. Брачыслаў Ізяслававіч. Усяслаў Брачыслававіч (Чарадзей).

*6. Тураўскае княства.*Тэрыторыя Тураўскай зямлі. Першы этап палітычнай гісторыі Тураўскай зямлі. Другі этап палітычнай гісторыі (Святаполк, Ізяслаў Уладзіміравіч, Яраполк Ізяслававіч, Святаполк Ізяслававіч). Тураўскае княства ў сістэме Кіеўскай Русі. Аднаўленне самастойнасці Тураўскага княства. Падзел Тураўскага княства.

7. Дзяржаўны лад у землях-княствах (Полацкае кн-ва, Тураўская зямля, Берасцейская зямля). Дзяржаўны лад у Полацкім княстве (дзяржава, полоцкая дынастыя князёў, княжацкая ўлада, веча, епіскап). Асаблівасці дзяржаўнасці Тураўскай зямлі. Арганізацыя ўлады ў Берасці.

8.Полацкія землі ў XII – п.п. XIII ст..Любецкі з'езд князёў. Часовае ўзвышэнне Менску. Паход на Полацкую землю 1127 г. і высылка князёў у Візантыю. Палітычнае жыцце Полаччыны ў сяр.XIII - пач. XIII ст. Раздрабленне Полацкай зямлі.

*9. Сацыяльна-эканамічнае развіцце Беларусі XI – XIII ст.ст.*Эканамічныя ўклады. Праблема рабаўладальніцкага ўкладу ва ўсходніх славян. Сінтэзны і бяссінтэзны шляхі развіцця феадалізму. Земляробства. Жывёлагадоўля. Промыслы. Гарады. Шляхі ўзнікнення гарадоў, структура і функцыі гарадоў. Рамяство. Гандаль. Звычаёвае права. Пісьмовае права XI-XIIстст. "Праўда" (дагавор) 1229 г.судаводства.

10. Культура Беларусі XI – п.п. XIII ст. Язычніцкія вераванні. Народны каляндар. Абрадавая творчасць. Прыняцце хрысціянства. Дваяверства. Унутраная структура царквы. Значэнне прыняцця хрысціянства. Дойлідства Полацкай зямлі і Панямоння. Архітэктурныя школы. Манументальны жывапіс. Кніжная графіка. Дэкаратыўна – прыкладное мастацтва. Рукапісныя кнігі. Пісьменства па археалагічных помніках «Полацкі летапіс» і звесткі В Тацішчава. «Слова пра паход Ігаравы». Рэлігійна-асветніцкія дзеячы. (Е. Полацкая, К. Тураўскі, Епіскоп Семяон, Аўрамій Смаленскі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пытанні да экзамену

1. Прадмет вывучэння і перыядызацыя гісторыі Беларусі.
2. Гістарыяграфія і перыядызацыя гісторыі Беларусі першабытнага перыяду.
3. Пачатак засялення людзьмі тэрыторыі Беларусі. Уплыў кліматычных ўмоў.
4. Ранні і сярэдні палеаліт на тэрыторыі Беларусі.
5. Позднi палеаліт на тэрыторыі Беларусі. Прылады працы і гаспадарчыя заняткі людзей у позднім палеаліце.
6. Сярэдні каменны век (мезаліт) на тэрыторыі Беларусі. Гаспадарка і сацыяльныя адносіны ў перыяд мезаліта. Археалагічныя культуры.
7. Насельніцтва Беларусі ў позднім каменным веку (неаліце). Змены ў гаспадарчым жыцці. З'яўленне вытворчых форм гаспадаркі. Сацыяльныя адносіны перыяда неаліта.
8. Характарыстыка бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі. Гаспадарчае жыццё і этнічны склад насельніцтва Беларусі перыяда бронзавага веку.
9. Агульная характарыстыка жалезнага века на тэрыторыі Беларусі. Авалоданне насельніцтвам вырабам і апрацоўкай жалеза.
10. Вытворчыя і прысвойваючыя формы гаспадаркі насельніцтва Беларусі жалезнага веку.

11. Побыт, абмен і гандаль насельніцтва Беларусі перыяда жалезнага веку. Змены ў сацыяльных адносінах.
12. Балты і славяне на тэрыторыі Беларусі ў другой палове І-га тысячагоддзя.
13. Славянскіе плямёны крывычоў, дрыгавічоў і радзімічаў на тэрыторыі Беларусі.
14. Навуковыя канцэпцыі паходжання беларусаў і тэрміна “Белая Русь”.
15. Полацкае княства ў IX – X стагоддзях
16.Тураўскае княства ў IX – X стагоддзях.
17. Полацкае княства ў XII – пачатку XIII стагоддзяў.
18.Тураўскае княства ў XII – пачатку XIII стагоддзяў.
19. Беларускія землі ва ўмовах пагрозы татара-мангольскай і крыжацкай агрэсіі.
20.Сельская гаспадарка Беларусі IX – XII стагоддзяў.
21.Узнікненне гарадоў на тэрыторыі Беларусі ў IX – XII стагоддзях.
22.Рамесная вытворчасць у IX – XIII стагоддзях.
23. Гандаль беларускіх зямель перыяда IX – XIII стагоддзяў
24. Складванне і развіццё феадальных адносін на тэрыторыі Беларусі ў IX – XIII стагоддзях.
25.Феадальнае і царкоўнае землеўладанне на тэрыторыі Беларусі ў IX – XIII стагоддзях.
26. Веча ў грамадскім жыцці на тэрыторыі Беларусі ў IX – XIII стагоддзях.
27.З’яўленне і распаўсюджанне хрысціянства на беларускіх землях. Роля і месца царквы ў грамадскім і культурным жыцці.
28. Манументальнае дойлідства Беларусі ў IX – XII стагоддзях.
29. Манументальны жывапіс і кніжная графіка Беларусі ў IX – XIII стагоддзях.
30. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі перыяда IX – XIII стагоддзяў.
31. З’яўленне пісьменства і яго помнікі на тэрыторыі Беларусі перыяда IX – XIII стагоддзяў.
32. Народная абрадовая творчасць Беларусі перыяда IX – XIII стагоддзяў.
33. Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі Вялікага княства Літоўскага.
34. Знешнепалітычныя перадумовы ўтварэння ВКЛ
35. Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя перадумовы ўтварэння ВКЛ.
36. Пачатак працэса ўтварэння ВКЛ пры Міндоўгу.
37. Умацаванне ВКЛ пры Гедеміне.
38. Пашырэнне і ўмацаванне ВКЛ пры Альгерде.
39. Дынастычная барацьба ў ВКЛ пасля смерці Альгерда.
40. Крэўская ўнія.
41. ВКЛ пры Вітаўце.
42. Барацьба ВКЛ з Тэўтонскім ордэнам. Грюндвальская бітва.
43. Палітычны лад ВКЛ у 30-80-я гады XV стагоддзя.
44. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі ў XIV – XVI ст.ст.
45. Органы ўлады і кіравання у ВКЛ.
46. Судовая і прававая сістэмы ў ВКЛ. Статуты ВКЛ.
47. Землеўладанне ў ВКЛ у XIV – XVI ст.ст. Станаўленне фальваркава-паншчынай гаспадаркі.
48. Аграрная рэформа ў сярэдзіне XVI ст. Увядзенне валочнай памеры.
49. Катэгорыі і павіннасці сялян ў XIV – XVI ст.ст.
50. Сялянская гаспадарка ў XIV – XVI ст.ст.
51. Гарады і мястэчкі Беларусі ў XIV – XVI ст.ст.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

52. Грамадскае жыццё гарадскога насельніцтва ў XIV – XVI ст. Увядзенне магдэбургскага права ў гарадах Беларусі.
53. Эканамічнае жыццё беларускіх гарадоў у XIV – XVI ст.
54. Развіццё гандлю і транспарту ў Беларусі ў XIV – XVI ст.ст.
55. Становішча праваслаўнай царквы на беларускіх землях ў XIV – XVI ст.ст.
56. Каталіцкая царква і манаскія ордэны на беларускіх землях ў XIV – XVI ст.ст.
57. Рэфармацыя і контррэфармацыя на беларускіх землях ў XIV – XVI ст.ст.
58. Царкоўная унія на беларускіх землях ў XIV – XVI ст.ст.
59. Нехрысціянскія канфесіі на беларускіх землях ў XIV – XVI ст.ст.
60. Стан і развіццё адукацыі на беларускіх землях ў XIV – XVI ст.ст.
61. Развіццё літаратуры на беларускіх землях ў XIV – XVI ст. Летапісанне. Творчасць Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, А. Рымшы і інш. прадстаўнікоў літаратуры.
62. Кнігадрукаванне на беларускіх землях ў XIV – XVII ст.ст. З'яўленне бібліятэк.
63. Музычнае і тэатральнае мастацтва на беларускіх землях ў XIV – XVII ст.ст.
64. Абарончае і храмавае дойлідства на беларускіх землях ў XIV – XVII ст.ст.
65. Манументальны жывапіс і кніжная графіка на беларускіх землях ў XIV – XVII ст.ст.
66. Скульптура і дэкаратыўна-прыкладнае мастацтва на беларускіх землях ў XIV – XVII ст.ст.
67. Знешнепалітычныя ўмовы існавання ВКЛ у канцы XV – першай палове XVI стст. Войны Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ.
68. Удзел ВКЛ у Лівонскай (Інфлянскай) вайне.
69. Палітычныя перадумовы, падрыхтоўка і заключэнне Люблінскай уніі. Вынікі Люблінскай уніі для ВКЛ.
70. Унутрапалітычнае і сацыяльна-эканамічнае становішча ў ВКЛ пасля Люблінскай уніі (канец XVI – першая паловаXVII стст.)

Тэсты

1. Якое першае механічнае прыстасаванне выкарыстоўваў старажытіны чалавек на тэрыторыі Беларусі ў эпоху мезаліту?
1. свідравальны станок
2. лук і стрэлы
3. арбалет
4. ганчарнае кола
5. млын

2. У канцы каменнагам веку бурштын трапляў на тэрыторыю Беларусі з:
1. Прыбалтыкі
2. Урала
3. Прычарнамор'я
4. Каўказа
5. Заходняў Еўропы

3. Калі старажытны чалавек на тэрыторыі Беларусі навучыўся вырабляць гліняны посуд?
1. палеаліт
2. мезаліт
3. неаліт
4. бронзавы век
5. жалезны век

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Як называюць людзей, якія першымі прыйшлі на землі Беларусі ў эпоху каменнага веку?

1. індаеўрапейцы
2. балты
3. славяне
4. Неандартальцы
5. краманьёнцы

5. Асноўнымі відамі паселішчаў людзей ранняга жалезнага веку ў Беларусі былі:

1. стаянкі
2. адкрытыя паселішчы
3. гарадзішчы
4. вёскі
5. гарады

6. Найбольш вераготна, што славяне прыйшлі на беларускія землі ў V – VII стст. н.э. з:

1. захаду
2. поўначы
3. паўночнага ўсходу
4. Усходу
5. поўдня

7. Што лішняе ў пераліку?

1. паляванне
2. рыбалоўства
3. земляробства
4. жывёлагадоўля
5 гуканне вясны

8. Беларускі асветнік Кірыла Тураўскі быў:

1. епіскапам
2. мітрапалітам
3. патрыярхам
4. кардыналам
5. князем

9. У горадзе Кукенойс напачатку XIII ст. княжыў:

1. Уладзімір
2. Усевалад
3. Глеб
4. Вячка
5. Давыд

10. Ефрасіння Полацкая была дачкой полацкага князя:

1. Рагвалода
2. Ізяслава Уладзіміравіча
3. Брачыслава Ізяслававіча
4. Усяслава Брачыслававіча
5. Святаслава Усяслававіча

11. Назва якога старажытнабеларускага горад пайшла ад імя аднаго з полацкіх князёў?

1. Брагін
2. Браслаў
3. Віцебск
4. Друцк
5. Слуцк

12. На землях якога славянскага племені ўзніклі беларускія гарады іТураў, Брэст, Мінск, Пінск, Слуцк, Мазыр, капыль, брагін і інш.?

1. крывічоў
2. дрыгавічоў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. радзімічаў 4. палян
5. валынян

13. Афіцыйная дата ўвядзення хрысціянства на беларускіх землях:
1. 862 г. 2. 980 г.
3. 988 г. 4. 992 г.
5. 1054 г.

14. Са складу Полацкай зямлі першым вылучылася самастойным княствам
1. Віцебскае 2. Друцкае
3. Ізяслаўскае 4. Мінскае
5. Лагойскае

15. У якім старажытным беларускім горадзе адбылася каранацыя Міндоўга?
1. Полацк *2. Мінск*
3. Вільня 4. Наваградак
5. Брэст

16. Пры якім вялікім князе літоўскім завяршылася аб'яднанне тэрыторыі сучаснай Беларуі ў складзе ВКЛ?
1. Віцень 2. Гедымін
3. Альгерд 4. Ягайла
5. Вітаўт

17. Чынш – гэта:
1. грашовая рэнта 2. натуральная рэнта
3. работа ў маёнтку 4. грашовая пазыка
5. пазыка прадуктамі

18. Сялян, якія ў XIV – XV плацілі аброк грашыма, называліся
1. сяляне-слугі 2. людзі цяглыя
3. пахожыя 4 асадныя
5. чэлядзь нявольная

19. Валока – гэта ўчастак зямлі памерам
1. 20 га 2. 24 га
3. 23,16 га 4. 21,36 га
5. 25,1 га

20. Згодна з адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформай 1569 г. ВКЛ падзялялася на:
1. воласці 2. удзелы
3. правінцыі 4. раёны
5. паветы

21. Хто ў ВКЛ кіраваў горадам?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. староста
2. ваявода
3. войт
4. каштэлян
5. цівун

22. Асновай эканамічнага развіцця Беларусі ў XV – першай палове XVII стагоддзяў з’яўлялася:
1.рамяство
2. сельская гаспадарка
3. прамысловасць
4. гандаль

23. Устанавіце адпаведнасць аўтараў і твораў:
1. В. Цяпінскі
2. Ф. Скарына
3. М. Гусоўскі
4. Я. Вісліцкі
5. С. Будны

а) “Катэхізіс”
б) “Апостал”
в) “Пруская вайна”
г) “Евангелле”
д) “Песня пра зубра”
е) “Фрынас”

24. У час Паўночнай вайны рускія войскі ўступілі на тэрыторыю Беларусі ў:
1. 1701 г.
2. 1703 г.
3. 1704 г.
4. 1708 г.
5. 1709 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Суправаджальны блок

Гласарый

Ледавіковы перыяд – перыяд у гісторыі Еўропы, калі у выніку рэзкага пахаладання паверхня сушы была пакрыта тоўстым слоем лёду.

Каменны век – перыяд у гісторыі і культуры, на працягу якога прылады працы і зброя выраблялiся з каменю, часткова з косці і дрэва.

Палеаліт – старажытнакаменны перыяд.

Мезаліт – сярэднякаменны перыяд.

Неаліт – новакаменны перыяд.

Бронзавы век – перыяд старажытнай гісторыі, калі побач з каменнымі ўжываліся прылады працы, зброі і упрыгожванні з бронзы.

Жалезны век – эпоха ў гісторыі чалавецтва, якая характарызуецца пашырэнне металургіі жалеза і вырабам жалезных рэчаў, прылад працы і зброі.

Стаянка – пасяленне першабытных людзей каменнага і бронзавага векоў.

Гарадзішча – умацаванае паселішча перыяду патрыярхату.

Селішча – старажытнае неумацаванае паселішча перыду распада першабытнаабшчыннага ладу.

Род – калектыў першабытных людзей, аб’яднанных кроўным радством.

Племя – аб’яднанне некалькі радоў.

Радавая абшчына – аб’яднанне кроўных сваякоў, якія мелі агульную уласнасць і вялі калектыўную гаспадарку.

Сельская абшчына – аб’яднанне людзей, у якім асобныя семьі маглі не мець сваяцкіх адносін.

Язычніцтва (паганства) – сістэма рэлігійных вераванняў, калі чалавек абагаўляў розныя сілы і стыхіі прыроды.

Мір, верв – назва сялянскай земляробчай суседскай абшчыны.

Абшчыннае землеўладанне – форма землеўладання, калі калі ворыўная зямля знаходзілася во ўладанні асобных сялян, хаця права агульнага ўласніка належала абшчыне – верві.

Смерды, закупы, радовічы, ізгоі – катэгорыі сялян, якія адрозніваліся паміж сабой формай і ступенью залежнасці ад феадалаў.

Чэлядзь – тэрмін, які ў XI – XIII стст. абазначаў феадальна-залежнае насельніцтва.

Халопы – катэгорыя насельніцтва, пазбаўленая асабістай свабоды.

Полацкая зямля – летапісная назва дзяржаўнага утварэння, цэнтрам якога з’ўлялася Полацкае княства

Лівонскі ордэн – каталіцкая дзяржаўная і ваенная арганізацыя нямецкіх рыцараў-крыжакоў во Ўсходняй Прыбалтыцы.

Магнаты – буйныя феадалы-землеўласнікі, прадстаўнікі радавітай знаці.

Шляхта – прывілеяванае саслоў’е ў Польшчы, ВКЛ.

Вялікі князь – найвышэйшы княжацкі тытул, кіраўнік дзяржавы у ВКЛ.

Ваявода – кіраўнік адміністрацыі тэрытарыяльнай адзінкі ВКЛ – ваяводства.

Каштэлян – камендант замка і адначасова адміністратар зямельных уладанняў вялікага князя, памочнік выяводы.

Маршалак земскі – старшыня на паседжаннях рады і сейма.

Маршалак дворны – намеснік маршалка земскага, начальнік шляхты.

Найвышэйшы гетман – камандуючы ўзброенымі сіламі ў ВКЛ.

Канцлер – кіраўнік Дзяржаўнай канцылярыі, захавальнік вялікай дзяржаўнай пячаткі.

Падскарбі земскі – вышэйшая службовая асоба ў ВКЛ, якая наглядала за спагнаннем натуральных і грашовых падаткаў і збораў, вяла ўлік дзяржаўных выдаткаў.

Сойм – саслоўна-прадстаўнічы орган у ВКЛ.

Рэнта – плата за карыстанне зямлёй.

Дзякло – даніна прадуктамі, асноўная форма рэнты да канца XV ст.

Чынш – грашовая рэнта.

Паншчына – абавязковая праца на зямлі феадала, від рэнты.

Талака – агульныя сельскагаспадарчыя працы на феадала.

Воласць – адмістратыўная адзінка ў ВКЛ.

Фальварак – феадальная гаспадарка, у якой прадукты выраблялiся на продаж.

Валока – зямельны ўчастак памерам 21,36 га., адзінка вымярэння зямелнай плошчы ў ВКЛ.

Мястэчка – прамежкавая форма пасельшча паміж горадам і вялікім сялом.

Магдэбургскае права – права на самакіраванне, якое атрымлівалі гарады.

Магістрат – адміністрацыйны орган самакіравання горада.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Рэфармацыя – грамадска-палітычны і ідэалагічны рух, які быў накіраваны на змены ў каталіцкай царкве.

“Войны і сацыяльна-палітычныя канфлікты другой паловы XVII - XVIII ст. Сацыяльна-эканамічны, палітычны і культурны заняпад Беларусі. Крызіс прыгонніцкай сістэмы (канец XVIII – першая палова XIX ст.)”

Войны сярэдзіны XVII ст.

Айчынная і замежная гістарыяграфія ваенных падзей у Беларусі ў 1648-1651 гг. Стыхійныя выступленні сялян супраць феадалаў у 1637-1647 гг. Прычыны пачатку і характар казацка-сялянскай вайны 1648-1651гг. Падзеі на Украіне 1648 г. Баявыя дзеянні на Поўдні і Паўднёвым Захадзе Беларусі. Падаўленне сялянскіх паўстанняў на Беларусі. Белацаркоўскі дагавор 1651 г. Прычыны паражэння сялян і гарадскіх нізоў на Беларусі.

Пачатак вайны Расіі з Рэччу Паспалітай. Ваенныя дзеянні 1654 г. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам-восенню 1655 г. Палітыка царызму на землях Беларусі падчас вайны 1654-1667 гг. Сутыкненне захопніцкіх інтарэсаў казацкай старшыны і Расіі ў Беларусі. Антыфеадальны характар народных паўстанняў. Гадзяцкі дагавор 6 верасня 1658 г. і яго ўздзеянне на ваенныя падзеі ў Беларусі. Андрусаўскае перамір’е 1667 г. Вынікі вайны 1654-1667 гг. для Беларусі.

Эканамічны заняпад Беларусі ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст.

Стан сельскай гаспадаркі пасля войнаў сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст. Маштабы разбурэння. Рост магнацкага землеўладання. Сельская гаспадарка ў другой палове XYII – першай палове XYIII ст. Феадальныя павіннасці і дзяржаўныя падаткі.

Гарады і мястэчкі ў другой палове XYII – першай палове XYIII ст. Сацыяльная барацьба гараджан Беларусі. Барацьба сялян супраць феадальнага прыгнёту. Паўстанне сялян пад кіраўніцтвам В.Вашчылы ў Крычаўскім старастве (1740-1744). Паўстанне на Каменшчыне ў сярэдзіне XYIII ст.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII ст.

Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя ўмовы развіцця сельскай гаспадаркі. Шырокае распаўсюджванне фальваркава-паншчыннай сістэмы гаспадарання і панаванне ў эканоміцы буйных феадалаў. Вотчынная мануфактура і яе роля ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

эканоміцы. Сялянская гаспадарка і становішча сялян. Рост беларускіх гарадоў і іх насельніцтва. Мястэчкі. Развіццё гарадскога рамяства і фабрычна-мануфактурнай прамысловасці. Прычыны нізкіх тэмпаў развіцця эканомікі Беларусі ў другой палове XVIII ст.

Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай. Далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі.

Разлад дзяржаўнай сістэмы кіравання ў Рэчы Паспалітай. Грамадзянская вайна канца XYII – пачатку XYIII ст. Паслабленне каралеўскай улады і ўзмацненне феадальнай анархіі. Абвастрэнне барацьбы магнацкіх груповак у 20-60-я гады XYIII ст. Падзеі Паўночнай вайны на Беларусі.

Дысідэнты. Таруньская, Слуцкая, Барская канфедэрацыя. Пецярбургская канвенцыя (5 жніўня 1772 г.). Першы падзел Рэчы Паспалітай. Далучэнне да Расіі ўсходняй часткі Беларусі. Сацыяльна-эканамічныя рэформы апошняй чвэрці XYIII ст. у Рэчы Паспалітай. Чатырохгадовы сейм. Прыняцце новай Канстытуцыі 3 мая 1791 г. і яе значэнне. Стварэнне Таргавіцкай канфедэрацыі, ліквідацыя рэформаў і канстытуцыі 1791 г. Другі падзел Рэчы Паспалітай (1793 г.). Далучэнне да Расійскай імперыі цэнтральнай часткі Беларусі.

Паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі. Ход паўстання на Беларусі. Я.Ясінскі і інш. Трэці падзел Рэчы Паспалітай (1795 г.). Далучэнне да Расіі заходніх земляў Беларусі. Ліквідацыя Рэчы Паспалітай як самастойнай дзяржавы. Гістарыяграфія пытання аб значэнні далучэння Беларусі да Расійскай імперыі. Аналіз новых крыніц і дакументаў.

Культура Беларусі ў другой палове XVII - XVIII ст.

Музыка і тэатр на Беларусі ў другой палове XYII-XYIII стст. Дойлідства Беларусі другой паловы XYII-XYIII стст. Гарадское будаўніцтва на Беларусі ў другой палове XYII-XYIII стст. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі. Адукацыя ў другой палове XVII-XVIII стст. Узмацненне каталіцкай рэакцыі ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст. Забарона беларускай мовы.

Беларуская народнасць XVII - XVIII стст.

Гістарычныя ўмовы ўтварэння беларускай нацыі. Палітыка царызму ў Беларусі па нацыянальным пытанні. Паланізацыя і русіфікацыя. Роля канфесійнага пытання. Іншыя народы і іх уплыў на этнічныя працэсы ў Беларусі. Захаванне патанцыялу для развіцця нацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Крызіс прыгонніцкай сістэмы (канец XVIII – першая палова XIX ст.)

Гістарыяграфія праблемы. Аналіз па гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст.

Палітыка царызму на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі. Рэформы расійскага урада на далучаных землях. Дзяржаўная палітыка на далучаных землях адносна разных слаёў насельніцтва, уніяцкай і каталіцкай царквы. "Даравальная грамата гарадам" 1785 г. і адмена юрысдыкцыі свецкіх і царкоўных феадалаў ў адносінах да пражываючых на землях гараджан. "Мяжа яўрэйскай аседласці" і яе роля ў развіцці гарадоў. Сацыяльна-эканамічныя мерапрыемствы. Палітыка царызму ў галіне духоўнай культуры і асветы. Праект аднаўлення Вялікага княства Літоўскага.

Вайна 1812 г. на тэрыторыі Беларусі.

Грамадска-палітычнае становішча Беларусі напярэдадні вайны 1812 г. Пачатак вайны 1812 г. Асноўныя ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі пры адступленні рускіх армій. Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі ў час вайны 1812 г. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі восенню 1812 г. Бярэзінская аперацыя. Вызваленне Беларусі ў канцы снежня 1812 г. Вынікі вайны 1812 г. для Беларусі.

Грамадска-палітычны рух. Паўстанне 1830-1831 гг.

Грамадска-палітычны рух на Беларусі ў пачатку XIX ст. Уплыў на Беларусь грамадска-палітычных падзей у Расіі і нацыянальна-вызваленчага руху ў Польшчы. Дзейнасць тайных таварыстваў. Дзекабрысты і Беларусь. Паўстанне 1830-1831 гг. у Польшчы, Літве і на Беларусі. Грамадска-палітычны рух і палітыка царызму пасля падаўлення паўстання. Замежная і айчынная гістарыяграфія аб характары паўстання.

Змены палітыкі самадзяржаўя ў Беларусі

Гістарыяграфія пытання. Курс на русіфікацыю Беларусі. Насаджэнне рускага землеўладання і чыноўніцтва. "Разбор шляхты". Полацкі царкоўны сабор і яго рашэнні. Адмена дзеяння ў Беларусі і Літве Статута Вялікага княства Літоўскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1588 г. Увядзенне расійскага заканадаўства. Забарона назваў “Беларусь” і “Літва” ў афіцыйнай дакументацыі.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.

Гістарыяграфія пытання. Сельская гаспадарка Беларусі ў канцы XYIII – першай палове XIX ст. Прамысловасць Беларусі ў канцы XYIII – першай палове XIX ст. Рост гарадоў і мястэчак Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Колькасны, саслоўны і нацыянальна-канфесійны склад гарадскога насельніцтва. Разлажэнне феадальна-прыгонніцкай сістэмы, заняпад сялянскай гаспадаркі ў 40-50-я гады XIX ст. Рэформы П. Кісялёва. Неабходнасць адмены прыгоннага права.

Асвета і культура Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.

Палітыка царызму ў галіне культуры ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Развіццё навуковых даследаванняў на Беларусі. Узмацненне цікавасці да гісторыі, быту і культуры Беларусі. Беларуская літаратура ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Беларускі фальклор. Грамадска-палітычная думка і распаўсюджанне асветніцкіх ідэй на Беларусі ў другой палове XVII—XVIII стст. Музычная і тэатральная творчасць на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Архітэктура і скульптура на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ВУЧЭБНЫ БЛОК

Буржуазные рэформы другой половы XIX ст.

Прыкладны план

Тэма 5. Беларусь у другой палове XVII – XVIII ст.

1. Войны сярэдзіны – другой паловы XVII ст. і іх уплыў на развіццё Беларусі.

2. ВКЛ у Паўночнай вайне (1700 – 1721).

3. Культура Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст. Ідэалогія

Асветніцтва.

4. Спробы мадэрнізацыі жыцця ў другой палове XVIII ст. Рэформы

А.Тызенгауза ў дзяржаўных уладаннях.

5. Падзелы Рэчы Паспалітай. Паўстанне Т.Касцюшкі 1794 г.

1. Войны сярэдзіны – другой паловы XVII ст. XVII і іх уплыў на развіццё Беларусі. Другая палова XVII ст. − пачатак XVIII ст. сталі самым цяжкім часам у беларускай гісторыі. Ён атрымаў назву *«разбуральнага»,* або *«крывавага стагоддзя»,* паколькі ў гэты перыяд усю Рэч Паспалітую ахапіла паласа працяглых войнаў і палітычнай смуты. Распачаўся ён з казацкага паўстання ва Украіне пад кіраўніцтвам гетмана Запарожскага войска Багдана Хмяльніцкага. ***Казацка-сялянская вайна (1648–1651).*** Змагаючыся за незалежнасць Украіны, Б.Хмяльніцкі меў на мэце стварэнне ўласнай дзяржавы, у межы якой хацеў уключыць і паўднёвыя землі Беларусі — Падняпроўе і Палессе. Каб заручыцца падтрымкай мясцовага насельніцтва, на землях Беларусі распаўсюджваліся *гетманскія універсалы,* у якіх Хмяльніцкі заклікаў жыхароў уздымацца на барацьбу супраць «паноў і ляхаў». Б.Хмяльніцкі нават пасылаў на Палессе казацкія *загоны,* якія ўзначальвалі Галавацкі, Галота, Нябаба, Гаркуша і іншыя яго паплечнікі. Гэтыя атрады адыгралі ролю каталізатара ў пачатку народнага руху на тэрыторыі Паўднёвай Беларусі.

Звесткі пра перамогі Хмяльніцкага над каронным войскам у маі 1648 г. пад Корсунем і Жоўтымі Водамі спрыялі ўцягванню ва ўзброеную барацьбу сялян і гарадскіх нізоў Беларусі, асабліва на памежных з Украінай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тэрыторыях. Казацка- сялянскія атрады авалодалі Гомелем, Лоевам, Чачэрскам, Брагінам, Бабруйскам, Пінскам, Кобрынам і некаторымі іншымі гарадамі.

Па сваім характары вайна ў Беларусі мела яскрава выражаны *антыфеадальны, антыкаталіцкі і антыуніяцкі* характар. Дзейнасць казацка-сялянскіх атрадаў заключалася найперш у руйнаванні і рабаванні шляхецкіх маёнткаў, а таксама перасследаванні і фізічным вынішчэнні уніятаў і католікаў, якія вымушаны былі ратавацца ўцёкамі ўглыб краіны. Не пазбеглі казацкіх рэпрэсій і прадстаўнікі іудзейскага веравызнання.

На ўтаймаванне паўстанцаў было накіравана спецыяльна сабранае войска ВКЛ на чале з гетманам Янушам Радзівілам, якое ў першай палове 1649 г. здолела ўзяць пад свой кантроль поўдзень Беларусі. Рашаючая бітва, у якой галоўныя сілы казакаў былі разбітыя, адбылася 6 ліпеня 1651 г. пад Лоевам. Армія ВКЛ, развіваючы поспех, 4 жніўня 1651 г. увайшла ў Кіеў. Паводле Белацаркоўскага пагаднення, падпісанага ў верасні 1651 г., Хмяльніцкі абавязваўся вывесці ўсе казацкія загоны з Беларусі. Гэта прывяло да спынення супраціўлення народных мас Беларусі, якія аказаліся пазбаўленымі арганізаванай ваеннай падтрымкі.

Чатыры гады вайны адмоўным чынам адбіліся на эканоміцы і дэмаграфічнай сітуацыі ў Беларусі. Найбольш пацярпелі паўднёвыя землі, дзе спачатку казацка-сялянскія атрады рабавалі і знішчалі феадальныя маёнткі разам з сем'ямі, а потым, помсцячы, войска Радзівіла спальвала разам з насельніцтвам вёскі і цэлыя гарады. У краіне абвастрыліся сацыяльнае становішча і канфесійная сітуацыя.

І галоўнае, заклікаючы сялян да паўстання, Хмяльніцкі зусім не дбаў пра самастойнасць беларускага народа, які ў той час ажыццяўляў сваю дзяржаўнасць у складзе Вялікага Княства і Рэчы Паспалітай. Украінскі гетман хацеў уключыць (інкарпараваць) паўднёвую Беларусь у склад сваёй казацкай дзяржавы. Каб захаваць сваю ўладу і забяспечыць спадчыннае панаванне дынастыі гетманаў Хмяльніцкіх, ён у 1654 г. заключыў з рускім царом пагадненне аб уваходжанні Украіны на правах аўтаноміі ў склад Маскоўскай дзяржавы (Пераяслаўская *рада)* і яшчэ здолеў адыграць адмоўную ролю ў гісторыі Беларусі.

Казацка-сялянская вайна з'явілася прадвеснікам больш разбуральных ваенных дзеянняў, якія паклалі пачатак сапраўднаму «крываваму патопу» на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тэрыторыі ўсёй Рэчы Паспалітай.

Вайна Маскоўскаґдзяржавы з Рэччу Паспалітаґза беларускія землі (1654 – 1667). Ва ўмовах нестабільнасці ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Рэчы Паспалітай у 1653 г. Масква разарвала дыпламатычныя адносіны з Варшавай, і непазбежнасць вайны стала відавочнай. Яна пачалася ў маі 1654 г. і стала самай жудаснай па сваіх выніках вайной у гісторыі Беларусі.

Дзеля дасягнення сваіх палітычных інтарэсаў маскоўскія ўлады традыцыйна разыгралі канфесійную карту — напярэдадні вайны ў Беларусь пасылаліся спецыяльныя *царскія граматы,* мэтай якіх была спроба пераканаць насельніцтва ў тым, што рускі цар Аляксей Міхайлавіч пачынае барацьбу з мэтай абароны праваслаўя. Тым, хто не акажа супраціву, гарантавалася царская міласць, іншых чакала бязлітасная расправа. Каб далучыць беларускія землі да сваёй дзяржавы, рускі цар накіраваў на тэрыторыю Беларусі 100-тысячнае войска, на дапамогу якому Хмяльніцкі паслаў 20 тыс. казакоў з Украіны.

ВКЛ не было падрыхтавана да вайны, агульная колькасць войска налічвала толькі 10–12 тыс. чалавек. Дзякуючы перавазе сіл, а таксама актыўнай агітацыі, скіраванай да праваслаўнага насельніцтва, рускай арміі за адзін год удалося захапіць амаль увесь усход Беларусі. Некаторыя гарады здаваліся без бою **—** Магілёў, Крычаў, Шклоў, Новы Быхаў. Іншыя аказвалі мужнае супраціўленне, напрыклад, Віцебск, Дуброўна, Гомель, Мсціслаў. Няскораным застаўся Стары Быхаў. Рускія ваяводы атрымалі загад бязлітасна знішчаць гарады, якія аказвалі супраціўленне. Яскравым прыкладам можа служыць абарона Мсціслава, якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай *«Трубяцкая разня»* (1654). Пасля чатырохдзённай аблогі і магутнага штурму рускія войскі ўварваліся ў Мсціслаўскі замак і **«народ розны шляхецкі, мяшчан і яўрэяў у пень высеклі».** Паводле дакументаў, у Мсціслаўскім замку загінулі каля 15 тыс. чалавек.

Сітуацыя ўскладнялася тым, што ў вайну супраць Рэчы Паспалітай уступіла і Швецыя. У такіх умовах, каб выратаваць краіну, вялікі гетман ВКЛ Януш Радзівіл стаў ініцыятарам заключэння дагавору са Швецыяй. Дагавор прадугледжваў аб’яднанне ВКЛ і Швецыі на роўных правах, а шведскі кароль Карл Х Густаў прызнаваўся вялікім князем ВКЛ. Ён абавязваўся выгнаць маскоўскае войска за межы Беларусі. Таксама дэкларавалася свабода веравызнання. Гэтае пагадненне, якое аўтаматычна скасоўвала Люблінскую

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

унію, вядома ў гісторыі як ***Кейданскі дагавор*** (1655). Аднак ён не дапамог выратаваць Вільню ад захопу маскоўскім войскам у жніўні 1655 г. Да таго ж, большасць шляхты захавала вернасць каралю Рэчы Паспалітай Яну Казіміру, і праз год Кейданскі дагавор фактычна страціў сваю сілу.

У 1656 г. Рэч Паспалітая і Маскоўская дзяржава падпісалі двухгадовае перамір'е, і рускія войскі на акупаваных беларускіх тэрыторыях паказалі свой сапраўдны твар захопнікаў. Гэта быў жудасны час для беларускага насельніцтва, адбывалася сапраўднае «паляванне на людзей», паколькі адной з асноўных мэтаў Маскоўскай дзяржавы быў вываз мясцовага насельніцтва. Служылыя рускія людзі мелі спецыяльны царскі дазвол **«имать полон»** (браць палонных). Гандаль «литовским полоном» стаў важнай крыніцай даходаў. Вывозіліся пераважна маладыя жанчыны, дзеці, рамеснікі, заможныя сяляне разам з інвентаром і цяглавай жывёлай. Тыя, хто застаўся на акупаваных тэрыторыях, зведалі рабаўніцтва, марадзёрства і гвалт з боку рускіх войскаў. Перасследаванням падвяргаліся католікі, уніяты, іудзеі і іншыя прадстаўнікі неправаслаўнага веравызнання.

Рабаванні і злоўжыванні рускіх войскаў прывялі да пачатку і хуткай актывізацыі на тэрыторыі Беларусі партызанскай барацьбы супраць захопнікаў. У афіцыйных дакументах Маскоўскай дзяржавы партызаны называліся *шышамі,* адзначалася іх асаблівая небяспека для разрозненых фарміраванняў рускіх. Шышамі былі ў асноўным мясцовыя сяляне, атрадамі якіх звычайна камандавалі шляхціцы. Да моцнай хвалі партызанскага руху і гарадскіх паўстанняў супраць акупантаў у 1660 г., пасля падпісання міра са Швецыяй, далучыліся і войскі ВКЛ і Кароны. Такім чынам, рух народнага супраціўлення аб'яднаў прадстаўнікоў розных станаў і канфесій. Вызваленчая барацьба набыла характар **усенароднай.**

Працяглая вайна скончылася на пачатку 1667 г. заключэннем Андрусаўскага міра. Згодна з яго ўмовамі, да Маскоўскай дзяржавы адыходзілі Смаленская і Северская землі, а таксама Левабярэжная Украіна.

Вынікі вайны для Беларусі. Па сваіх наступствах гэта была самая стратная вайна для беларускага народа за ўсю яго гісторыю: колькасць насельніцтва зменшылася на 53 % – з 2 млн. 876 тыс. чалавек у 1650 г. да 1 млн. 352 тыс. чалавек у 1667 г. Ва ўладаннях на ўсходзе Беларусі скарачэнне колькасці жыхароў дасягала 80 – 90 %. Ваенныя дзеянні, голад, эпідэміі і, галоўнае, маскоўскі палон зменшылі насельніцтва не толькі колькасна, але і якасна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лепшыя беларускія рамеснікі-майстры, сяляне, моладзь, вывезеныя падчас вайны, заставаліся ў межах Маскоўскай дзяржавы і працавалі на яе карысць (толькі ў Маскве ў 70-я г. XVII ст. яны складалі 10 % ад усяго пасадскага насельніцтва).

На тэрыторыі ж Беларусі наступіў глыбокі эканамічны крызіс. Звыш за 60 % ворыўнай зямлі ляжала ў пустках, не хапала ні рабочых рук, ні цяглавай жывёлы для яе апрацоўкі. Сялянства не мела магчымасцяў не толькі выплочваць феадальную рэнту, але і весці гаспадарку, неабходную для простага існавання сям'і.

Важную ролю ў працэсе вываду эканомікі краіны з пасляваеннага крызісу адыгралі гаспадарчыя мерапрыемствы, праведзеныя ўладай у дзяржаўных маёнтках — каралеўскіх сталовых эканоміях, староствах і дзяржавах. Асаблівасцю дзяржаўнай палітыкі аднаўленчага перыяду другой паловы XVII ст. стала **імкненне да ўзнаўлення патэнцыялу сялянскай гаспадаркі.** Адбывалася гэта праз увядзенне спецыяльна распрацаванай сістэмы льготных умоваў гаспадарання, у аснову якой была пакладзена палітыка ачыншавання — ліквідацыя фальваркаў і перавод сялян з адпрацовачнай рэнты на грашовую (з паншчыны на чынш).

Для ўвядзення ў гаспадарчае абарачэнне як мага большай плошчы зямель, павелічэння колькасці насельніцтва і цяглавай жывёлы ў найбольш разбураных уладаннях (асабліва на ўсходзе Беларусі) дзяржава актыўна ўжывала практыку «слабод» з частковым або поўным вызваленнем насельніцтва ад феадальнай рэнты на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў, а таксама дазваляла розныя формы апрацоўкі зямлі — «у наезд», «з долі ўраджаю» і інш.

Аб эфектыўнасці аднаўленчай палітыкі дзяржавы сведчыла масавае вяртанне сялян у сталовыя эканоміі. Да таго ж, узважаная палітыка скарбу па паслабленню павіннаснага абкладання насельніцтва стала прыкладам для многіх (безумоўна, не для ўсіх) прыватных уласнікаў.

Такім чынам, не адмаўляючы сутнасці феадальнай дзяржавы, неабходна падкрэсліць, што пасля войнаў сярэдзіны – другой паловы XVII ст. яна з'яўлялася не толькі апаратам, механізм якога быў накіраваны на эксплуатацыю насельніцтва. У тыя часы дзяржава выступіла ў першую чаргу са стваральнымі функцыямі, імкнучыся не толькі атрымаць як мага больш прыбыткаў у скарб, але і забяспечыць (заканадаўча, матэрыяльна, тэхнічна і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

інш.) стабільнае развіццё гаспадаркі і абавязкова даць магчымасць для жыцця і аднаўлення гаспадаркі селяніна — асноўнай вытворчай сілы феадальнай эпохі. Да пачатку XVIII ст. эканамічны крызіс быў пераадолены і гаспадарка Беларусі дасягнула даваеннага ўзроўню.

Змяненне канфесійнай сітуацыі. Нягледзячы на тое, што ВКЛ здолела выйсці з эканамічнага крызісу, агульная дэструкцыя, выкліканая наступствамі вайны 1654 – 1667 гг., кардынальна змяніла грамадскае жыццё ў краіне — сацыяльную структуру насельніцтва, моўна-культурную і канфесійную сітуацыі.

У сярэдзіне XVII ст. карэнным чынам мяняецца становішча праваслаўнай царквы ў краіне — ад рэлігійнай талерантнасці і верацярпімасці часоў Уладзіслава IV і Яна Казіміра ўлады Рэчы Паспалітай узялі курс на абмежаванне яе правоў. Звязана гэта было з тым, што праваслаўная царква ў ВКЛ мела прамаскоўскую арыентацыю і нярэдка аказвала падтрымку рускім войскам. Да таго ж, у 1685 г. Кіеўская мітраполія афіцыйна была пераведзена з-пад падпарадкавання Канстанцінопалю пад юрысдыкцыю Маскоўскага патрыярхату, і маскоўскія ўлады пачалі лічыць, што маюць «законныя» правы ўмешвацца ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай для «абароны правоў праваслаўных».

Другая палова XVII ст. стала перыядам хуткага заняпаду праваслаўя і пашырэння уніі на тэрыторыі Беларусі. У 1673 г . сойм пазбавіў права праваслаўных набываць шляхецтва, а ў 1699 г. — займаць выбарныя магістрацкія пасады. Палітычныя правы фактычна станавіліся прэрагатывай толькі католікаў.

Праваслаўная беларуская шляхта масава пераходзілі ў каталіцтва, разам з прыняццем якога выбіралі і польскія культурныя прыярытэты, што непазбежна вяло да паланізацыі і заняпаду беларускай культуры. Апагеем такой палітыкі стаў 1696 г., калі па рашэнню сойма ўсё справаводства ў ВКЛ пераводзілася на польскую мову. Адпаведна польскай станавілася і адукацыя, што не спрыяла з’яўленню ўласна беларускай інтэлігенцыі і на доўгі час замарудзіла фармаванне беларускай нацыі.

Змяненне дэмаграфічнай сітуацыі ў гарадах. У другой палове XVII – пачатку XVIII ст. у гарадах Беларусі назіраўся эканамічны і культурны заняпад, які быў выкліканы наступствамі папярэдніх войнаў. Калі ў XVII ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на тэрыторыі Беларусі налічвалася 37 гарадоў і 320 паселішчаў местачковага тыпу, то ў сярэдзіне XVIII ст. гарадоў і гарадскіх паселішчаў засталося 228, а колькасць жыхароў у іх зменшылася ў 2,5 раза. Да таго ж, адбыліся змены ў канфесійным і нацыянальным складзе насельніцтва беларускіх гарадоў. Калі да сярэдзіны XVII ст. у іх у асноўным пражывалі праваслаўныя, а беларускі этнас складаў 80 % агульнай колькасці гараджан, то да сярэдзіны XVIII ст. значна павялічылася колькасць яўрэяў.

Гэты працэс пачаўся пасля вайны 1654–1667 г., наступствы якой негатыўна адбіваліся і на гандлёвых сувязях паміж горадам і вёскай. Пасля ўвядзення дзяржавай сістэмы льгот і «слабод» гараджане ахвотна перасяляліся туды, дзе былі свабодныя хаты і шмат пустой зямлі, за карыстанне якой яны на працягу ад 5 да 15 гадоў вызваляліся ад усіх падаткаў і павіннасцяў. Таму асноўнай масай жыхароў гарадоў сталі яўрэі, якія не мелі права працаваць на зямлі і карыстацца льготамі.

Такім чынам, беларускі горад з канца XVII ст. па большасці насельніцтва стаў яўрэйскім, палітычная эліта была прадстаўлена спаланізаванай і акаталічанай шляхтай, а беларускі этнас пачаў атаясамлівацца толькі з сялянствам, якое складала большасць насельніцтва краіны.

2. ВКЛ у Паўночнай вайне (1700–1721). На пачатку XVIII ст. Рэч Паспалітая аказалася ўцягнутай у жорны чарговай вайны, а беларускія землі ператварыліся ў асноўны тэатр ваенных дзеянняў да 1709 г.

Галоўнай прычынай вайны стала жаданне Данii, Саксонii і Расii, якія ўтварылі так званы «Паўночны саюз», абмежаваць панаванне Швецыі на Балтыйскім моры. Да гэтых краін далучылася і Рэч Паспалітая, каралём якой з 1697 г. з'яўляўся саксонскі курфюрст Аўгуст II Моцны.

Пачатак вайны аказаўся няўдалым для саюзнікаў: на працягу 1700–1701 г. шведская армія па чарзе перамагла войскі Данii, Расii і Саксонii і на пачатку 1703 г. уварвалася на землі ВКЛ. Шведы хутка занялі Вільню, Гародню, крыху пазней — Варшаву і Кракаў, а Аўгуст II ратаваўся ўцёкамі.

Знешнепалітычнае становішча Княства ўскладнялася ўнутраным супрацьстаяннем у грамадстве: атрымаўшыя паразу ад сваіх палітычных сапернікаў 17 лістапада 1700 г. у бітве пад Алькенікамі Сапегі імкнуліся ўзяць рэванш і бачылі ў асобе Карла XII свайго саюзніка, а антысапегаўская шляхецкая партыя на чале з Агінскімі і Вішнявецкімі шукала падтрымкі ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

расійскага цара Пятра I. У ліпені 1704 г. арганізаваная Карлам XII Варшаўская канфедэрацыя выбрала каралём познаньскага ваяводу Станіслава Ляшчынскага. У адказ на гэта ў маі 1704 г. прыхільнікі Аўгуста II аб'ядналіся ў Сандамірскую канфедэрацыю і заключылі саюз з Расіяй супраць Швецыі. Такім чынам, на тэрыторыі ВКЛ апынуліся дзве варожыя арміі, а Беларусь да 1709 г. стала асноўнай арэнай, дзе Пётр I і Карл XII з дапамогай зброі высвятлялі свае адносіны, рабавалі і знішчалі краіну і разам з тым яшчэ больш садзейнічалі расколу і канфрантацыі ў шляхецкім стане Рэчы Паспалітай.

Як заўсёды, асноўны цяжар вайны прыняло на сябе простае беларускае насельніцтва, у якога і руская, і шведская арміі прымусова забіралі правіянт і фураж, а астатняе, каб не даставалася праціўніку, спальвалі, пакідаючы мясцовы люд практычна без сродкаў існавання.

У 1706 г. ваенныя дзеянні складваліся не на карысць саюзнікаў Аўгуста II. У студзені армія Карла XII на тры месяцы блакіравала рускі гарнізон у Гродне, а ў лютым былі разбіты саксонскія войскі. Шведы пачалі рабаўнічы марш па землях Беларусі. Былі абрабаваны, спустошаны і часткова спалены Карэлічы, Клецк, Ляхавічы, Пінск, Мір, Нясвіж і іншыя гарады. У такіх умовах пад націскам шведаў у 1706 г. Аўгуст II вымушаны быў афіцыйна адмовіцца ад улады на карысць Станіслава Ляшчынскага. На бок новага караля перайшлі і некаторыя буйныя магнацкія роды (Радзівілы, Пацы, Вішнявецкія), але частка шляхты не прызнала Ляшчынскага законным каралём, і грамадзянская вайна ў ВКЛ працягвалася.

Ля вёскі Лясная 28 верасня 1708 г. руская армія разбіла корпус Левенгаўпта з вялікім абозам правіянту для войска Карла XII, а 27 чэрвеня 1709 г. адбылася Палтаўская бітва, дзе шведскае войска пацярпела сакрушальнае паражэнне, і ваенная ініцыятыва перайшла да Пятра I. У 1709 г. на трон Рэчы Паспалітай ізноў узышоў Аўгуст II. Хаця шведы былі выгнаны з Рэчы Паспалітай і ваенныя дзеянні на яе тэрыторыі спынены, Пётр I не спяшаўся выводзіць свае войскі з беларускіх земляў. Прысутнасць у мірны час чужаземнага войска на тэрыторыі сваёй дзяржавы не падалася шляхце небяспечнай з'явай, і яна па-ранейшаму працягвала барацьбу за першынство ў краіне, чым бесперапынна паслабляла ўнутры- і знешнепалітычнае становішча Рэчы Паспалітай.

Вынікі вайны. Паўночная вайна не прынесла тэрытарыяльных зменаў Рэчы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паспалітай, аднак прынесла незлічоныя беды беларускаму народу, на плечы якога выпаў асноўны цяжар вайны. Яшчэ цалкам не аправіўшыся ад войнаў сярэдзіны – другой паловы XVII ст., Беларусь ізноў страціла трэцюю частку свайго насельніцтва, больш за 40 % ворыўнай зямлі ляжала ў пустках. Моцна пацярпелі і беларускія гарады. Яскравым прыкладам з'яўляецца лёс г. Магілёва, які, пасля разбурэння шведскай арміяй, быў 8 верасня 1708 г. дашчэнту спалены па загаду Пятра I. У выніку некалі магутны гандлёвы цэнтр у Беларускім Падняпроўі так і не змог аднавіць сваёй былой велічы.

З аднаго боку, аднаўленчы перыяд першай паловы XVIII ст. павінен быў быць лягчэйшым, паколькі скарбам ужо былі распрацаваны і праверaны на практыцы рычагі і механізмы гаспадарчай адбудовы ў другой палове XVII ст. Аднак аб'ектыўныя эканамічныя цяжкасці, звязаныя з ваенным ліхалеццем, ускладняліся яшчэ і тым, што ў пачатку XVIII ст. разбурэнне напаткала не поўнасцю адноўленую і ўмацаваную сельскую гаспадарку. Таму разам з выкарыстаннем ужо вядомых мер і льготаў дзяржава вымушана была шукаць новыя дзейсныя спосабы эфектыўнага гаспадарчага адраджэння. У гэты перыяд пашырылася сялянская каланізацыя (асабліва на ўсходзе Беларусі), узрасла роля грашовых падаткаў. Аднаўленчы перыяд першай паловы XVIII ст. быў больш працяглым па часе: калі ў мінулым стагоддзі для адбудовы гаспадаркі спатрэбілася каля трыццаці год, то ў пачатку XVIII ст., нягледзячы на меншыя разбурэнні, эканоміка выходзіла з крызісу амаль паўстагоддзя.

Другая палова XVII і пачатак XVIII ст. для эканомікі Беларусі былі, бадай што, самымі цяжкімі. «Страчанае стагоддзе» — так можна ахарактарызаваць гэты час адносна гаспадарчай гісторыі нашай краіны. Калі ў XVII–XVIII ст. у перадавых краінах Еўропы адбываўся працэс хуткага накаплення капіталу, а ў 60- я гады XVIII ст. у Англіі ўжо пачаўся прамысловы пераварот, то Вялікае княства Літоўскае двойчы аказвалася перад неабходнасцю ўздымаць з руінаў гаспадарку, разбураную войнамі. Працяглыя і спусташальныя ваенныя дзеянні штучна перарвалі натуральны працэс эканамічнага жыцця, і гаспадарка Беларусі гэтага перыяду не развівалася, а вырашала праблемы хутчэйшай адбудовы.

Унутрыпалітычная дэцэнтралізацыя. Ваенныя дзеянні адмоўна адбіліся не толькі на эканамічным становішчы краіны, але і сталі прычынай унутрыпалітычнай дэцэнтралізацыі, якая выявілася ў барацьбе магнацкіх груповак за ўладу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Яшчэ ў канцы XVI ст. у Рэчы Паспалітай склаўся комплекс шляхецкіх прывілеяў, якія ўтварылі так званыя «залатыя шляхецкія вольнасці». Галоўнымі сярод іх з'яўляліся роўнасць усіх шляхціцаў перад законам, права на свабоду выбараў караля, на свабоду галасавання (liberum veto), недатыкальнасць асобы шляхціца і яго маёнтка (права імунітэту), права ўтвараць канфедэрацыі і права рокаша.

Пасля войнаў сярэдзіны – другой паловы XVII ст. на фоне агульнадзяржаўнага эканамічнага крызісу і пагаршэння матэрыяльнага становішча большасці сярэдняй і дробнай шляхты палітычныя правы заставаліся адзіным, што рэальна магла захаваць шляхта ў нязменнасці. Галоўную сваю задачу яна бачыла не ў карпатлівай працы на карысць дзяржавы, а ў захаванні існуючай палітычнай сістэмы.

Вельмі хутка згубнасць «залатых шляхецкіх вольнасцяў» стала відавочнай. Усялякія прапановы новаўвядзенняў з боку ўлады расцэньваліся дэпутатамі соймаў як замах на іх даўнія правы і блакаваліся. Усё часцей на пасяджэннях соймаў паслы звярталіся да права «ліберум вета» і грэбавалі дзяржаўнымі справамі дзеля ўласных інтарэсаў. Фактычна ў другой палове XVII ст. распачаўся крызіс парламентарнай сістэмы Рэчы Паспалітай, які за стагоддзе ператварыў шляхецкую рэспубліку ў шляхецкую анархію.

Эканамічны крызіс другой паловы XVII ст. прывёў да паглыблення маёмаснай дыферэнцыяцыі ўнутры шляхецкага саслоўя. Усё большую вагу ў Княстве сталі адыгрываць магнацкія роды — Радзівілы, Сапегі, Пацы, Вішнявецкія, якія, валодаючы вялікімі зямельнымі латыфундыямі, не жадалі падпарадкоўвацца вярхоўнай уладзе, ператварыліся фактычна ва ўдзельных князёў і называлі сябе «ўладарамі Вялікага Княства». Яны абкружалі сябе збяднелай у час вайны дробнай шляхтай, з якой утваралі ўласную *кліентэлу* давалі ёй зямельныя ўладанні і патрабавалі за гэта вернасці і адданай службы ў іх прыватным войску.

Найбольш знакамітыя магнацкія роды вялі паміж сабой барацьбу за першынство ў краіне. У 50-я – пачатку 60-х г. XVII ст. унутрыпалітычнае жыццё ў ВКЛ вызначалася панаваннем роду Радзівілаў, у сярэдзіне 60-х – пачатку 70-х г. — Пацаў, а ў 90-я г. – Сапегаў. Нашчадкі гэтага аднаго з самых старажытных родаў ВКЛ на рубяжы XVII–XVIII ст. здолелі заняць амаль усе асноўныя дзяржаўныя пасады і хацелі ператварыць у жыццё ідэю вялікага гетмана Яна Казіміра Сапегі, якая заключалася ў разрыве уніі з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Польшчай і ўсталяванні незалежнасці ВКЛ. Сапежынская ўсеўладнасць выклікала незадаволенасць іншых магнацкіх сем'яў , у першую чаргу Агінскіх і Вішнявецкіх. Складанасць унутрыпалітычнай сітуацыі дапаўнялася яшчэ і бескаралеўем, якое наступіла ў 1696 г. пасля смерці Яна III Сабескага і якое імкнуліся выкарыстаць суседнія краіны, каб пасадзіць на трон Рэчы Паспалітай выгадную для сябе фігуру.

Выбраны каралём саксонскі курфюрст Фрыдрых-Аўгуст II (Моцны) (1697 – 1733) імкнуўся згладзіць канфлікт паміж магнацкімі родамі ў ВКЛ, але напачатку XVIII ст. канфрантацыя толькі ўзмацнілася і набыла характар грамадзянскай вайны. 18 лістапада 1700 г. пад Алькенікамі адбылася рашаючая бітва паміж войскам Сапегаў, якое складалася з кліентэлы, наёмнікаў і нават сялян, і паспалітым рушаннем, якое сабрала шляхта ВКЛ. Сапегі былі разбіты, а шляхта прыняла пастанову, па якой Сапегі страчвалі ўсе дзяржаўныя пасады і ўладанні ў

ВКЛ.

Паўночная вайна не спыніла барацьбы магнацкіх груповак за ўладу ў першай палове XVIII ст., што яшчэ больш спрыяла ўмяшальніцтву ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай іншых дзяржаў. Краіны-суседзі – Расія, Аўстрыя і Прусія прыкладалі шмат намаганняў для таго, каб не даць парушыць «дэмакратычныя» парадкі ў Рэчы Паспалітай і тым самым замацаваць *шляхецкую анархію.* У 1717 г. аднадзённы *«нямы»* сойм у Варшаве, пастановы якога, прадыктаваныя расійскім урадам, прымаліся без абмеркавання, яшчэ больш абмежаваў уладу караля. Акрамя таго, у 1720 г. Пётр I і прускі кароль Фрыдрых Вільгельм дамовіліся не дапусціць магчымасці палітычнага і эканамічнага рэфармавання Рэчы Паспалітай. У 1726 г. да гэтай дамовы далучылася Аўстрыя.

У 1733 г . большасцю галасоў каралём Рэчы Паспалітай быў абраны Станіслаў Ляшчынскі, але Расія і Аўстрыя пры падтрымцы расійскага войска дамагліся, каб новым манархам быў абвешчаны чарговы прадстаўнік саксонскай дынастыі **Аўгуст III Прыгожы** (1733–1763).

У сярэдзіне XVIII ст. на ўнутрыпалітычную сітуацыю ў краіне аказвалі ўплыў дзве магнацкія групоўкі: 1) «Фамілія» – прыхільнікі роду Чартарыйскіх, якія выступалі за неабходнасць правядзення эканамічных і палітычных рэформ у краіне; 2) «рэспубліканцы» – прадстаўнікі розных магнацкіх родаў , якіх з сярэдзіны XVIII ст. узначальваў Караль Станіслаў

РЕПОЗІТОРЫЙ БГПУ

Радзівіл («Пане Каханку»). Пасля смерці ў 1763 г. Аўгуста III гэтыя групоўкі актыўна ўключыліся ў барацьбу за вылучэнне свайго кандыдата на трон Рэчы Паспалітай. Больш слабая «Фамілія» для палітычнай перамогі папрасіла ваенную падтрымку ў Кацярыны II. Такім чынам, пры дапамозе расійскага ваеннага, палітычнага і фінансавага ўдзелу на сойме 1764 г. чарговым (і, як аказалася, апошнім) каралём Рэчы Паспалітай быў абраны пляменнік канцлера ВКЛ Міхала Фрэдэрыка Чартарыйскага ўраджэнец Беларусі **Станіслаў Панятоўскі** (1764–1795), які пры каранацыі ўзяў імя Аўгуст.

Такім чынам, абранне Станіслава Аўгуста Панятоўскага, стаўленніка прагрэсіўнай магнацкай групоўкі, сведчыла, што Рэч Паспалітая ў другой палове XVIII ст. выбрала новы вектар развіцця — шлях рэформ. Разам з тым перамога на выбарах пры апоры на іншаземнае войска чарговы раз адчыняла дзверы для ўмяшальніцтва замежных краін ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай, што ў далейшым і прывяло да знікнення дзяржавы ў выніку трох падзелаў яе тэрыторыі паміж Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй (1772, 1793, 1795).

3. Культура Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст. Беларуская культура ў другой палове XVII – XVIII ст. развівалася ў вельмі неспрыяльных умовах. Як адзначалася вышэй, пасля войнаў другой паловы XVII ст. змянілася канфесійная сітуацыя на землях Беларусі — ад талерантнасці да рэлігійнай нецярпімасці, што не магло не паўплываць на агульны стан культуры. Больш за тое, пасля пераводу ў 1696 г. усяго справаводства на польскую мову распачалася адкрытая паланізацыя і акаталічванне, у першую чаргу шляхты. Манаполію на адукацыю захапіў касцёл, што вылілася ў клерыкалізацыю культуры. Былі забытыя дасягненні «залатога веку» (Рэнесанса), паўсюдна ў Рэчы Паспалітай панаваў рэлігійны фанатызм.

Галоўным мастацкім стылем у той час было *барока,* якое асабліва выявілася ў архітэктуры (дынамічнасць кампазіцыі, кантрастнасць маштабаў , ілюзія бязмежнай прасторы і г. д.). У адпаведнасці з гэтым стылем у гарадах і вёсках будаваліся касцёлы, манастыры і магнацкія сядзібы.

На рубяжы XVII – XVIII ст. развівалася тэатральнае жыццё ў ВКЛ. Найбольш былі распаўсюджаны тэатры пры езуіцкіх навучальных установах, існаваў народны лялечны тэатр — *батлейка.* У якасці мецэнатаў культуры выступалі ў першую чаргу магнаты, якія мелі ва ўласных маёнтках прыгонныя тэатры. Яны нават пасылалі найбольш таленавітых прыгонных акцёраў вучыцца за мяжу. Адным з першых у XVIII ст. Францішкай Уршулай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Радзівіл быў заснаваны прыгонны тэатр у Нясвіжы. Вядомы быў таксама слонімскі тэатр Міхала Агінскага.

Нягледзячы на цяжкасці ў развіцці культуры, Беларусь мела ў тыя часы знакамітых асобаў, якімі па праву ганарыцца і сёння. Сярод іх грамадскія і царкоўныя дзеячы, аўтары падручнікаў *Мялецій Сматрыцкі* (1572 – 1633) і *Сімяон Полацкі* (1629 – 1680); *Казімір Лышчынскі* (1634 – 1689), які за свой трактат «Аб неіснаванні бога» быў спалены на вогнішчы інквізіцыі; *Казімір Семяновіч* (каля 1600 – пасля 1651), які выдаў кнігу «Вялікае мастацтва артылерыі», а таксама ўпершыню ў свеце стварыў праект шматступенчатай ракеты; *Ілля Капіевіч* (1651 – 1714), які выдаў больш за 20 падручнікаў па граматыцы і рыторыцы.

Другая палова XVIII ст. стала якасна новым этапам у эканамічным і палітычным развіцці ВКЛ і ўсёй Рэчы Паспалітай. У гэты час у краіне пачалі распаўсюджвацца ідэі ***Асветніцтва*** − антыфеадальнай, буржуазнай ідэалогіі перыяду станаўлення капіталізму, якая прапаведавала прыярытэт асветы, навукі і розуму ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы. Прыхільнікі Асветніцтва імкнуліся пераадолець недахопы існуючага грамадскага ладу, рэфармаваць яго сацыяльную

69

і дзяржаўную структуры, палітыку, паводзіны людзей шляхам распаўсюджання навукі, ведаў, прапаганды ідэй справядлівасці і гуманізму. Ідэолагам Асветніцтва стаў французскі філосаф *Вальтэр,* які выступаў за адмену саслоўных прывілеяў і надаваў вялікую ролю ў змене грамадства «адукаваным манархам».

Распаўсюджанне ідэй Асветніцтва на тэрыторыі Рэчы Паспалітай супала з перыядам стабілізацыі гаспадарчага жыцця. У пэўнай ступені неабходнасць зменаў была ўсвядомлена часткай патрыятычнай эліты Рэчы Паспалітай. Адбылася своеасаблівая «мадэрнізацыя ў розумах», для якой важнае значэнне меў асветніцкі спосаб разумення прагрэсу, у першую чаргу, як аддзялення (ці супрацьпастаўлення) сучаснасці і мінулага. Верагодна, упершыню *традыцыя,* якая была да гэтага часу бясспрэчным аўтарытэтам («старыны *не рушыць»),* з другой паловы XVIII ст. стала падвяргацца крытыцы, і з уласцівым для тых часоў аптымізмам пачала даказвацца перспектыўнасць увядзення палітычных і эканамічных навацый для паляпшэння становішча грамадства і дзяржавы. У гэты час выходзіла шмат

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кніг, у якіх прапагандаваўся еўрапейскі вопыт гаспадарання ў вёсцы і ў горадзе. Аўтары эканамічнай літаратуры заклікалі шляхту не баяцца новаўвядзенняў, выкарыстоўваць замежныя напрацоўкі, але не забываць свае традыцыі (здабыткі) і спалучаць іх з рэаліямі грамадскага і гаспадарчага развіцця.

На землях Рэчы Паспалітай пашырылася свецкая адукацыя. Пад кіраўніцтвам С. Канарскага была праведзена школьная рэформа. У 1773 г. для кіраўніцтва народнай асветай у Рэчы Паспалітай была створана спецыяльная ўстанова — *Адукацыйная камісія,* якая зрабіла спробу вызваліць адукацыю ад прамога ўплыву каталіцкай царквы. За 20 гадоў яе дзейнасці на тэрыторыі Беларусі было заснавана 20 школ сярэдняй ступені навучання ў такіх гарадах, як Гародня, Пінск, Мазыр, Бабруйск і інш.

4. Спробы мадэрнізацыі жыцця ў другой палове XVIII ст. Рэформы А.Тызенгаўза ў дзяржаўных уладаннях. Магнаты і шляхта, якія хацелі палепшыць сітуацыю ў краіне і імкнуліся правесці рэформы ў эканоміцы і палітыцы, аб'ядналіся вакол Станіслава Аўгуста і «Фамілii». Яны і склалі ядро ў *каралеўскай партыі,* якая павінна была стварыць апору ўлады і ўзняць яе аўтарытэт.

Спробы рэфармавання пачаліся на канвакацыйным сойме 1764 г., дзе, між іншым, было вырашана:

– абмежаваць практыку ўжывання права «ліберум вета» па эканамічных пытаннях, якія сталі прымацца простай большасцю галасоў;

– заснаваць Скарбавую камісію ВКЛ – Эканамічную Раду Літоўскага скарбу, якая з'яўлялася спецыяльным дзяржаўным органам па кіраванню фінансамі, кантролю за збіраннем і размеркаваннем падаткаў, ажыццяўленню судовых функцый па фінансавых справах, нагляду за гандлем і ўвогуле за гаспадарчай сітуацыяй у краіне;

– адмяніць ўнутрыдзяржаўныя гандлёвыя пошліны і замяніць іх адзіным «генеральным падаткам»;

- увесці ў дзяржаве адзіную сістэму мераў і вагі;
- стварыць разгалінаваную сістэму зносін для актывізацыі гандлю ў краіне і інш.

Рэформы А.Тызенгаўза ў дзяржаўных уладаннях. Пры ажыццяўленні свайго

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

палітычнага і эканамічнага курсу Станіслаў Аўгуст мог разлічваць толькі на асабіста адданых яму людзей, адным з якіх быў ***Антоній Тызенгаўз.***

Займаючы пасады надворнага літоўскага падскарбія, гарадзенскага старосты, генеральнага адміністратара ўсіх каралеўскіх эканомій у ВКЛ, А.Тызенгаўз распачаў сістэму эканамічных пераўтварэнняў, мэтай якіх было фінансавае ўмацаванне каралеўскай улады і пазбаўленне караля залежнасці ад магнатаў.

Цэнтрам эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця ў ВКЛ у другой палове XVIII ст. стала Гародня: у горадзе, згодна з пастановай сойма 1673 г., праходзіў кожны трэці сойм Рэчы Паспалітай (акрамя *канвакацыйных, элекцыйных* і *каранацыйных),* для чаго ў 1737–1742 г. быў пабудаваны новы каралеўскі палац; у Гародні праходзілі пасяджэнні Скарбавай камісіі і знаходзіўся яе архіў; горад стаў рэзідэнцыяй каралеўскай партыі ў ВКЛ і, нарэшце, цэнтрам эканамічных і культурных пераўтварэнняў А.Тызенгаўза.

Аграрная рэформа А.Тызенгаўза. Ажыццяўленне сваіх рэфарматарскіх планаў А.Тызенгаўз распачаў з правядзення аграрных пераўтварэнняў у сталовых эканоміях ВКЛ, якія з'яўляліся асноўнай крыніцай папаўнення каралеўскага скарбу, з мэтай павелічэння іх прыбытковасці.

Асноўныя мерапрыемствы рэформы.

1. Рэформа пачалася з *люстрацыі* – дакладнай рэвізіі ў сталовых эканоміях ВКЛ. У першую чаргу, неабходнасць вызначэння іх даходнасці тлумачылася тым, што пры сістэме «слабодаў» і іншых ільгот, якія ўводзіліся ў папярэдні перыяд пасляваеннай адбудовы гаспадаркі, многія сяляне значна пашырылі свае надзелы, але гэта не знайшло адлюстравання ў інвентарах. У выніку збор падаткаў і выкананне сялянамі павіннасцей ажыццяўляліся не з рэальнага ўчастка, а з замацаванага за пэўнай сям'ёй у даўніх дакументах, памеры якога звычайна былі значна меншыя за рэальны надзел.

2. Зямля, якая надавалася сялянам, падзялялася на дзве часткі – *сядзібную* (аселую) і *прыёмную.* З мэтай упарадкавання землекарыстання і падаткаабкладання кожная сялянская сям'я абавязана была ўзяць 1/4 частку валокі ў якасці сядзібнага надзелу, з якога прызначаліся асноўныя падаткі і павіннасці. Зямля, якая заставалася, атрымала назву прыёмнай і магла разбірацца сялянамі на добраахвотных пачатках у любой колькасці (у залежнасці ад наяўнасці яе ў маёнтку і ад гаспадарчых магчымасцяў той ці іншай сям'і) пераважна за дадатковы чынш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Для павелічэння прыбытковасці каралеўскіх уладанняў па ініцыятыве А.Тызенгаўза ў іх *аднаўляліся фальваркі,* якія былі ліквідаваны ў другой палове XVII ст. Вяртанне да фальваркавай сістэмы было выклікана ростам цэн на збожжа на рынках Заходняй Еўропы. Адзначым, што гэта была не простая рэанімацыя фальваркаў, паколькі ўжываліся новыя формы апрацоўкі глебы, ліквідавалася сістэма «параў» і ўводзіліся шматпольныя севазвароты, паляпшалася жывёлагадоўля.

4. У сталовых эканоміях уводзілася паншчына ў памеры 2 дні ў тыдзень з асноўнага надзелу (з 1/4 часткі валокі). У выніку сялянства падзялілася на дзве катэгорыі – *цяглыя,* якія адпрацоўвалі паншчыну, і *зямяне,* галоўнай павіннасцю якіх была выплата грашовай рэнты. 5. Рэформа прадугледжвала стварэнне ў вёсках «камунальных магазінаў» і «камунальных касаў», у якія сяляне абавязаны былі рабіць натуральныя і грашовыя ўзносы. У «камунальныя» ці «збожжавыя магазіны» ўзносы рабіліся ўсімі відамі зерня, якое прызначалася на выпадак агульнага неўраджаю альбо для пазыкі пацярпеўшым ад стыхійных бедстваў ці проста бедным. Грошы з «камунальных касаў» ішлі на добраўпарадкаванне вёсак, утрыманне дактароў, фельчараў, радзільных дамоў і да т. п. Існавалі таксама «правілы ўнутранага распарадку» для сельскага насельніцтва эканомій: сяляне не мелі права прымаць у сваіх дамах бадзяг, гультаёў, заразных і хворых людзей; павінны былі засцерагаць сваю жывёлу ад заразы; на таргі і кірмашы абавязаны былі ездзіць толькі ў каралеўскія мястэчкі.

Відавочна, што рэформа А.Тызенгаўза мела шмат падабенстваў з вялікай аграрнай рэформай сярэдзіны XVI ст. – валочнай памерай. Аднолькавай была ідэя перамеру worыўных зямель, стварэння фальваркаў у якасці гаспадарак па вырошчванню збожжа на продаж, падзел сялян на катэгорыі паводле іх асноўных павіннасцяў. Абедзве рэформы значна павялічылі даходы каралеўскага скарбу. Але пры гэтым павіннасны ціск у выніку рэформы А.Тызенгаўза ўзрос у некалькі разоў. Для параўнання, у час валочнай памеры паншчына вызначалася ў памеры 2 дні ў тыдзень з валокі, а ў другой палове XVIII ст. – 2 дні ў тыдзень з надзелу, г. зн., з 1/4 часткі валокі. Таму сяляне ў большасці сваёй не прынялі рэформу. Формы пратэсту былі розныя: ад простых уцёкаў з уладанняў да адкрытых сялянскіх выступленняў, як, напрыклад, у 1768 г. у Берасцейскай эканоміі і ў 1769 г. у Шавельскай (на тэрыторыі сучаснай Літвы).

«Вялікі мануфактурны план» А.Тызенгаўза. У адзначаны перыяд Рэч

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паспалітая вострa адчувала патрэбу ў высакаякаснай прамысловай прадукцыі, неабходнай у першую чаргу для арміі і флоту, якой уласная прамысловасць забяспечыць не магла.

Першае на тэрыторыі Беларусі прамысловае прадпрыемства мануфактурнага тыпу – *шкляная гута* – было заснавана ў 1717 г. ва ўладанні князёў Радзівілаў у Налібоках, а ў 1737 г. другая шкляная мануфактура была пабудавана Ганнай Радзівіл ва Урэччы. На прадпрыемствах выраблялiся аконнае шкло, шкляны посуд, крышталёвыя вырабы, люстэркі і інш. Акрамя таго, Радзівілам належалі шырока вядомыя фабрыка шпалераў у Карэлічах, мануфактуры габеленаў у Міры і Альбуці, фаянсавая мануфактура ў Свержані, Слуцкая фабрыка шаўковых паясоў, Нясвіжская суконная мануфактура. Усяго на сваіх землях Радзівілы мелі 23 мануфактуры.

Працавалі мануфактуры і ў маёнтках некаторых іншых магнатаў: паперня, суконная і палатняная фабрыкі князя Сапегі ў Ружанах (Слонімскі павет), шкляныя заводы графа Салагуба ў мястэчку Ілля (Менскі павет), гетмана Масальскага ў маёнтку Мыш (Наваградскі павет) і інш. Прыватнаўласніцкія мануфактуры, створаныя магнатамі ў сваіх уладаннях, пераважна абслугоўваліся працай залежных сялян, наёмныя работнікі былі тады рэдкасцю. Гэтая акалічнасць уплывала, натуральна, як на арганізацыю вытворчасці, так і ў пэўнай ступені на вынікі працы прадпрыемстваў.

Але ў другой палове XVIII ст. неабходнасць заснавання мануфактур была ўсвядомлена на дзяржаўным узроўні, і менавіта дзяржаўная ўлада выступіла ў той час ініцыятарам стварэння мануфактур. Адноўленая да сярэдзіны XVIII ст. гаспадарка разам з паляпшэннем кан’юктуры на рынках Еўропы стварылі станоўчы падмурак для арганізацыі прамысловай вытворчасці ў краіне, у тым ліку і ў каралеўскіх сталовых эканоміях ВКЛ.

Дзяржаўнае мануфактурнае будаўніцтва ў Рэчы Паспалітай звязваецца з дзейнасцю А.Тызенгаўза, які спецыяльна ездзіў за мяжу, дзе знаёміўся з арганізацыяй і дзейнасцю шэрагу прамысловых прадпрыемстваў , а таксама пасылаў туды сваіх прадстаўнікоў для вывучэння вопыту вядзення прамысловай вытворчасці. Праз стварэнне спецыяльнай падтрымкі прамысловасці сваёй краіны, своеасаблівай сістэмы «пратэкцыянізму», А.Тызенгаўз хацеў за невялікі тэрмін часу арганізаваць у аграрнай краіне развітую прамысловасць.

Цэнтрам гаспадарчых рэформаў стала рэзідэнцыя адміністратара каралеўскіх

РЕПОЗИТОРИЙ ГГПУ

эканомій у ВКЛ — Гародня і яе прадмесце вёска Гарадніца. На Гарадніцы быў пабудаваны прамыслова-культурны цэнтр, які налічваў 85 будынкаў рознага прызначэння. Яны ўтваралі тры асобных зоны: адміністрацыйную, вытворчую і навучальную. Заснаванне першых мануфактур – суконнай і палатнянай – адбылося ў 1766–1768 гг., а ў 1777 г. гарадзенскі прамысловы цэнтр ужо налічваў 15 прамысловых прадпрыемстваў. Тут дзейнічалі гарбарная мануфактура, мануфактура па вытворчасці гармат і ружжаў, вырабаў з золата, свечак, панчошная, тытунёвая, карэтна-экіпажная, металаапрацоўчая, шаўкаткацкая, карункавая, капялюшная, дывановая, шаўковых паясоў, па вырабу ігральных карт, гузікаў, фарбы і іншых тавараў, а таксама цукраварня і паперня.

«Машыны» (станкі), інструменты, іншае абсталяванне і каля 70 % сыравіны для гарадзенскіх мануфактур прывозіліся з-за мяжы. На мясцовых рынках куплялася толькі 25 % сыравіны, 5 % спецыяльна пастаўляла Гарадзенская эканомія (воўну, дрэва, вугаль і да т. п.). Натуральна, што мануфактурная вытворчасць, акрамя ўсяго іншага, стымулявала развіццё розных галін эканомікі ўнутры краіны, у прыватнасці, авечкагадоўлю, лясную і перапрацоўчую прамысловасць.

Агульная колькасць рабочых на гарадзенскіх каралеўскіх мануфактурах у 1777 г. складала больш за 3 000 чалавек. Асартымент мануфактурных тавараў быў вельмі разнастайны. Шаўковыя тканіны выраблялiся на шаўкаткацкай мануфактуры; на палатнянай — муслін, батыст, палатно для абрусаў і сурвэтак; цвікі, рыдлёўкі, замкі, напільнікі і іншыя вырабы з жалеза выраблялі на металаапрацоўчай мануфактуры; на карункавай і залататкацкай плялі каштоўныя карункі, выраблялі залатыя і сярэбраныя ніці, а таксама некаторыя ювелірныя вырабы; мануфактура пацерак у ліку сваёй прадукцыі мела, акрамя саміх пацерак, яшчэ і шкляны посуд; на карэтна-экіпажнай мануфактуры майстравалі экіпажы «накшталт парыжскіх». Кіравалі мануфактурамі наёмныя кваліфікаваныя майстры з Англіі, Францыі, Швейцарыі, Галандыі, Прусіі і іншых краін.

Мануфактуры ствараліся не толькі ў Гародні: суконна-капялюшная мануфактура была адчынена ў мястэчку Азёры Гарадзенскага павета, тонкасуконная мануфактура – у мястэчку Ласосна Гарадзенскага павета. У Рэчыцы (пад Берасцем) былі заснаваны суконная мануфактура, шліфавальня, фабрыка для выпрацоўкі медзі, жалезная гута. Усяго ў каралеўскіх эканоміях ВКЛ было створана звыш за 20 мануфактур, з іх 16 – у Гародні. Асноўнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пакупнікамі мануфактурнай прадукцыі быў каралеўскі двор і войска.

Для заснавання такой колькасці прадпрыемстваў А.Тызенгаўзу патрабаваліся вялікія грошы. Больш за 10,5 млн. польскіх злотых былі накіраваны ў прамысловасць з даходаў, атрыманых пасля правядзення аграрнай рэформы 1765 г. у эканоміях. Да таго ж, сума ў эквіваленце 10 млн. польскіх злотых па просьбе А.Тызенгаўза была ўзята Станіславам Аўгустам у Галандскім банку.

У аснове мануфактурнай дзейнасці А.Тызенгаўза ляжалі патрыятычныя памкненні – стварыць у краіне ўласную прамысловасць, тым самым павялічыць даходы дзяржаўнага скарбу і забяспечыць эканамічную незалежнасць ад Еўропы.

Неад'емнай часткай рэформ, ініцыяваных А.Тызенгаўзам, было ўладкаванне шляхоў зносін па сухапутных дарогах і па рэках для актывізацыі ўнутранага і знешняга гандлю. У другой палове XVIII ст. былі пабудаваны дзве новыя значныя дарогі: Пінска-Слонімская і Пінска-Валынская. Для стварэння адзінай воднай сістэмы ў 1767–1784 г. быў пабудаваны канал, які злучыў Нёман з Дняпром праз Шчару, Ясельду і Прыпяць, а пабудаваны ў 1781–1784 г. другі канал злучыў Прыпяць з Заходнім Бугам. Такім чынам, стала магчымым вывозіць водным шляхам прадукцыю з беларускіх земляў у чарнаморскія і балтыйскія порты.

Фінансавую стабільнасць павінна была забяспечыць грашовая рэформа, якая распачалася ў Рэчы Паспалітай у 1766 г. і мела на мэце выключыць з абарачэння старыя манеты і ўвесці новую паўнавартасную валюту. У ходзе рэформы была зменена каціроўка шэрагу грашовых адзінак: быў уведзены *талер* у 8 злотых і *злоты* ў 4 сярэбраных або 30 медных грошаў.

Але пры стварэнні мануфактур А.Тызенгаўзам быў дапушчаны шэраг памылак і пралікаў, што ў канчатковым выніку прывяло да згортвання «вялікага мануфактурнага плана» і адстаўкі А.Тызенгаўза:

* была створана занадта вялікая колькасць разнастайных прадпрыемстваў, якія будаваліся амаль адначасова і ў вельмі хутка. Здараліся выпадкі, калі будаўніцтва пачыналася, але так і не скончвалася па прычыне недахопу фінансаў, і часткова ўзведзеныя пабудовы хутка разбураліся;

* будаўніцтва практычна ўсіх мануфактур вялося на пазычаныя грошы, пры гэтым сродкі крэдыту выдаткоўваліся не толькі на будаўніцтва непасрэдна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мануфактур, з якіх потым разлічвалі атрымаць прыбытак для пагашэння крэдыту, але і на стварэнне розных установ навучальнага і культурнага характару. Толькі ў Гародні былі заснаваны медыцынская акадэмія, бухгалтарская і будаўнічая школы, кадэцкі корпус, а таксама тэатр, аптэка, батанічны сад, друкарня, у якой выдавалася першая ў ВКЛ *«Газета Гродзеньска»*. Усё гэта ў прынцыпе не магло даць прыбытку, а для нармальнага функцыянавання патрабавала далейшых датацый;

* аснову асартыменту мануфактурных тавараў складалі прадметы раскошы, а вузкасць мясцовых рынкаў і суадносіны грамадскіх сіл, калі большасць насельніцтва была беднай, не садзейнічалі хуткаму продажу гэтых рэчаў. Мануфактурная вытворчасць не абапіралася на натуральныя патрэбы, да таго ж, гарадзенскія тавары каштавалі часам даражэй за імпартныя з-за высокіх цэнаў на замежную сыравіну і аплату працы іншаземных майстроў. Таму фактычна не магла быць арганізавана дастаткова эфектыўная сістэма збыту мануфактурных вырабаў;

* мануфактуры былі заснаваны на дармовай працы каралеўскіх сялян. Аднак, не маючы ніякіх стымулаў (ні фінансавых, ні падатковых), сяляне, якія працавалі на гарадзенскіх мануфактурах, абсалютна не былі зацікаўлены ў выніках сваёй працы, што адмоўна адбівалася на якасці прадукцыі.

Такім чынам, мануфактуры не былі ў стане забяспечыць рэнтабельнасць вытворчасці звычайнымі капіталістычнымі сродкамі. Яны маглі існаваць толькі дзякуючы фінансам, якія чэрпаліся з розных крыніц, у першую чаргу з сельскай гаспадаркі каралеўскіх эканомій, што не спрыяла яе развіццю, а, наадварот, паскарала разбурэнне. Да таго ж, эканамічныя пераўтварэнні ажыццяўляліся на фоне палітычнага крызісу, які стаў вынікам першага падзелу Рэчы Паспалітай: з адыходам да Расійскай імперыі Усходняй Беларусі была згублена важная крыніца дзяржаўных даходаў, страта толькі Магілёўскай эканоміі вызначалася амаль у 1 млн. польскіх злотых.

Рэформы А.Тызенгаўза выразна паказалі, што прымусовая праца ці на ворыве, ці ў мануфактурах пры адсутнасці зацікаўленасці работніка ў яе выніках плёну не прыносіла. Таму адміністрацыя каралеўскіх эканомій у 80-я г. XVIII ст. пайшла на ўвядзенне пэўных ільгот: сялянам было скасавана 25 дзён паншчыны ў год і розных іншых паборaў на суму да 15 злотых з сялянскай гаспадаркі; ліквідаваліся непрыбытковыя фальваркі, а сяляне цэлымі вёскамі пераводзіліс ь на чынш. Грунтуючыся на эканамічных ведах і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ідэях Асветніцтва аб натуральных правах людзей, некаторыя прыватныя ўласнікі сталі праводзіць у сваіх уладаннях прагрэсіўныя эканамічныя і сацыяльныя рэформы. Сярод іх можна вызначыць *Іаахіма Храптовіча,* маршалка Галоўнага трыбунала ВКЛ, і *Паўла Бжастоўскага,* віленскага каморніка, якія ва ўмовах развіцця таварна-грашовых адносін шукалі аптымальныя шляхі для вядзення ўласнай гаспадаркі і вызвалілі сваіх сялян ад паншчыны і асабістай залежнасці (І.Храптовіч – у маёнтку Шчорсы Наваградскага павета, П.Бжастоўскі – ва ўладанні Паўлава Віленскага павета). Апошні стварыў нават своеасаблівую «сялянскую рэспубліку» з вартай, касай дапамогі, школай для сялянскіх дзяцей і інш.

Такім чынам, змяненне ў 80-я г. XVIII ст. накірунку гаспадарчай палітыкі (скарбу і некаторых прыватных уласнікаў) у бок паслаблення падаткова-павіннаснага абкладання, змяншэння паншчыны ці нават поўнага вызвалення ад яе сялян і, такім чынам, прадастаўлення ім пэўнай эканамічнай свабоды з’явілася стымулам для развіцця іх гаспадарчай ініцыятывы і агульнага паляпшэння эканамічнай сітуацыі ў краіне.

5. Падзелы Рэчы Паспалітай. Паўстанне Т.Касцюшкі 1794 г. У эканамічных рэформах, якія праводзіліся ў Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. з мэтай умацавання каралеўскай улады і стабілізацыі жыцця, не былі зацікаўлены, з аднаго боку, кансерватыўныя сілы ўнутры самой краіны. Магнаты не клапаціліся пра моц сваёй краіны, а, абапіраючыся на сваю кліентэлу, выкарыстоўвалі перыяды бескаралеўя для ўласнага ўзвышэння і ўзбагачэння. Яны выступалі супраць абмежавання «залатых шляхецкіх вольнасцей», за захаванне

шляхецкай дэмакратыі, якая да сярэдзіны XVIII ст. ператварылася па сутнасці ў шляхецкую анархію. У выніку непрацаздольным аказаўся вышэйшы дзяржаўны орган Рэчы Паспалітай — вальны сойм: за сто гадоў (з сярэдзіны XVII да сярэзіны XVIII ст.) з 55 яго пасяджэнняў 48 былі сарваны па прычыне ўжывання права «liberum veto».

З другога боку, суседнія дзяржавы — Расія, Прусія і Аўстрыя — ужо з сярэдзіны XVIII ст. вялі перамовы аб магчымасці падзелу Рэчы Паспалітай. Як падставу для ўмяшальніцтва яны выкарысталі канфесійнае пытанне, заявіўшы аб неабходнасці абароны правоў некатолікаў (дысідэнтаў). Сапраўды, праваслаўныя і пратэстанты цярпелі ў Рэчы Паспалітай непрыкрыты ўціск з боку ўладаў: у 1668 г. была прынята пастанова, згодна з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

якой асобы, якія перайшлі з каталіцтва ў праваслаўе ці уніяцтва, павінны былі карацца выгнаннем, а з 1732 г. пратэстанты і праваслаўныя былі пазбаўлены права выбірацца на соймы і займаць некаторыя дзяржаўныя пасады. Такая сітуацыя не задавальняла дысідэнтаў, якія ў барацьбе за свае правы разлічвалі на дапамогу праваслаўнай Расіі і пратэстанцкай Прусіі.

Першы падзел Рэчы Паспалітай. У 1765 г. Кацярына II узняла пытанне аб ураўнанні ў правах праваслаўных і пратэстантаў з католікамі, аднак сойм 1766 г. адмовіўся задаволіць гэтае патрабаванне. Незадаволеныя дысідэнты ў 1767 г. стварылі дзве канфедэрацыі: *праваслаўную* ў Слуцку пад апякунствам Расіі і *пратэстанцкую* ў Торуні пад патранатам Прусіі. На дапамогу канфедэратам Расія адправіла 40-тысячнае войска. Ва ўмовах прысутнасці ў Варшаве расійскага войска сойм у 1768 г. прыняў рашэнне аб ураўнанні ў правах дысідэнтаў з католікамі, а таксама пакінуў некранутымі падставовыя прынцыпы старога палітычнага ладу (выбарнасць караля, liberum veto, права стварэння канфедэрацый і інш.).

Праціўнікі прынятых соймам пастановаў у 1768 г. стварылі Барскую канфедэрацыю (ад назвы г. Бар ва Украіне), якая выступала за цэласнасць і незалежнасць дзяржавы. Да Барскай канфедэрацыі хутка далучылася значная колькасць беларускай і літоўскай шляхты, а таксама мяшчан і сялянства. Па сутнасці, у краіне пачалася грамадзянская вайна. У рашаючай бітве пад в. Сталавічы (каля Баранавіч) 12 верасня 1771 г. прыхільнікі Барскай канфедэрацыі пацярпелі паражэнне ад рускай арміі пад камандаваннем А. Суворава. 5 жніўня 1772 г. у Пецярбургу манархамі Расіі, Аўстрыі і Прусіі была падпісана тайная канвенцыя аб падзеле часткі тэрыторыі Рэчы Паспалітай, паводле якой Расія анексіравала беларускія землі на ўсход ад Дзвіны і Дняпра – 92 тыс. кв. км з насельніцтвам 1 млн. 300 тыс. чалавек.

Спробы выратавання краіны. Другі падзел Рэчы Паспалітай. Падзеі 1772 г. выразна паказалі, што захаваць цэласнасць і незалежнасць краіны можна толькі ў выпадку правядзення радыкальных эканамічных і палітычных рэформ. З 1773 г. усе соймы пачалі праходзіць у рэжыме канфедэрацый, што дазваляла пазбягаць liberum veto і прымаць рашэнні простай большасцю галасоў. Пастановай сойма 1775 г. была створана *Пастаянная рада* – агульны для ВКЛ і Кароны орган выканаўчай улады, у які ўваходзілі 18 дэпутатаў сойма і 18 сенатараў. Гэтая Рада знаходзілася пад кантролем невялікай групы магнатаў і моцным уплывам рускага пасла, а таму не дамагалася забеспячэння сапраўдных інтарэсаў Рэчы Паспалітай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У выніку яна атрымала назву «рада здрады» і ў 1789 г. была ліквідавана рашэннем Чатырохгадовага сойма (1788 – 1792).

На гэтым сойме, які пазней быў названы таксама «Вялікім», было прынята шмат пастаноў, мэтай якіх было забеспячэнне незалежнасці Рэчы Паспалітай. Сярод найбольш важных рашэнняў – павелічэнне колькасці войска да 100 тыс. чалавек, стварэнне Ваеннай камісіі, пашырэнне правоў мяшчан, дазвол шляхце займацца рамяством і гандлем, вяртанне магдэбургскага права гарадам, якія былі пазбаўлены яго ў 1776 г., і інш.

Кульмінацыйнай падзеяй Чатырохгадовага сойма стала прыняцце 3 мая 1791 г. Канстытуцыі («Урадавай *Уставы»)* Рэчы Паспалітай. Гэта быў другі ў свеце (пасля Канстытуцыі ЗША 1787 г.) і першы ў Еўропе дакумент, прысвечаны арганізацыі дзяржаўнай улады ў краіне і рэгуляванню правоў яе грамадзян. Па Канстытуцыі Рэч Паспалітая абвяшчалася прававой дзяржавай з вяршэнствам закона і падзелам улады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую. Да найбольш важных зменаў адносіліся:

– адмена выбарнасці каралёў і ўстанаўленне спадчыннасці трона;

– адмена «залатых шляхецкіх вольнасцей»;

– змяненне структуры і характару дзейнасці судовых органаў і абвяшчэнне прынцыпу ажыццяўлення правасуддзя толькі судом.

Такім чынам, Канстытуцыя 3 мая захоўвала феадальна-прыгонніцкі лад, але адначасова стварала больш выгадныя ўмовы для развіцця мануфактурнай вытворчасці і гандлю, надзяляла больш шырокімі правамі гарадскіх жыхароў. Менш за ўсё зменаў яна ўносіла ў прававое становішча сялян, дэкларатыўна адзначыўшы толькі недапушчальнасць самавольства паноў у адносінах да залежнага сельскага насельніцтва. Разам з тым відавочна, што Канстытуцыя мела прагрэсіўны характар, ператварала дзяржаўныя органы ўлады ў здольныя да рашучых дзеянняў. Але, па сутнасці, гэта была Канстытуцыя польскага народа і польскай дзяржавы, паколькі яна ліквідавала федэратыўны падзел на Карону і Княства, адмяніла паасобныя органы дзяржаўнай улады ВКЛ і Кароны, абвесціла каталіцызм дзяржаўнай рэлігіяй, а Рэч Паспалітую — унітарнай дзяржавай польскага народа. Усё гэта непазбежна вяло да паланізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беларускага народа.

Але ў поўнай меры Канстытуцыю не ўдалося ажыццявіць. Рэакцыйныя кансерватыўныя колы магнатаў і шляхты звярнуліся да Кацярыны II з просьбай аб дапамозе ў барацьбе супраць Канстытуцыі. Пад пратэктаратам Кацярыны II вясной 1792 г. была ўтворана Таргавіцкая канфедэрацыя, якая сваім Актам скасавала ўсе пастановы Вялікага сойма. Упэўненасці канфедэратам надало 100- тысячнае расійскае войска і пераход на іх бок Станіслава Аўгуста. Карыстаючыся момантам, на пачатку 1793 г. свае войскі на тэрыторыю Рэчы Паспалітай увяла Прусія. Завяршэннем гэтых падзей стаў другі падзел Рэчы Паспалітай, дамова аб якім была падпісана 23 студзеня 1793 г. у Пецярбургу. Згодна з ёй, да Расіі адыходзілі беларускія землі па лініі Друя – Пінск.

У складаных умовах у 1793 г. праходзіў «нямы» Гарадзенскі сойм. Прыхільнікі Таргавіцкай канфедэрацыі пры дапамозе расійскага войска, якое абкружыла гарадзенскі каралеўскі палац – месца правядзення сойма, дамагліся недапушчэння на сойм патрыятычных сіл, адмены Канстытуцыі 3 мая і зацвердзілі акт другога падзелу краіны.

Паўстанне Т.Касцюшкі. Трэці падзел Рэчы Паспалітай. Адказам на другі падзел Рэчы Паспалітай і апошняй спробай выратавання краіны з'явілася нацыянальна-вызваленчае паўстанне, якое ўзначаліў ураджэнец Беларусі і герой вайны паўночнаамерыканскіх калоній за незалежнасць (1775–1783) *Тадэвуш Касцюшка.* Акт паўстання быў абвешчаны на галоўнай плошчы г. Кракава 24 сакавіка 1794 г. Мэтамі паўстання былі аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г., вяртанне Канстытуцыі 3 мая і працяг рэформ, а дэвізам — *«Вольнасць, цэласнасць, незалежнасць».*

У красавіку да паўстанцаў (інсургентаў) далучылася патрыятычная беларуска-літоўская шляхта. Паўстаннем на землях ВКЛ кіраваў палкоўнік *Якуб Ясінскі,* вядомы сваімі радыкальнымі поглядамі, прыхільнік Французскай рэвалюцыі і праціўнік прыгону. Удзельнікаў паўстання ў ВКЛ не задавальняла Канстытуцыя 3 мая, паколькі яна ліквідавала дзяржаўнасць ВКЛ. Таму яны пачалі праводзіць палітыку з пэўнымі элементамі незалежнасці ВКЛ ад Кароны, палітыку так званага «ліцвінскага сепаратызму», а саміх інсургентаў сталі называць «віленскімі *якабінцамі».* У выніку створаная Найвышэйшая Літоўская Рада — выканаўчы орган паўстання ў ВКЛ — выступала з больш радыкальнымі дэмакратычнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

патрабаваннямі ў параўнанні з кіраўнікамі паўстання ў Польшчы.

Напачатку паўстанцы мелі поспех, яны ўзялі ўладу ў Вільні, Гародні, Берасці, Наваградку, Слоніме, Лідзе, Пінску, Ваўкавыску і іншых гарадах. Да паўстання далучылася значная частка шляхты на чале з *Міхалам Клеафасам Агінскім,* які напісаў *«Марш паўстанцаў 1794 года».* Актыўна дапамагалі інсургентам і ўзброеныя косамі сяляне (касінеры), якія спадзяваліся на адмену прыгоннага права. Гэтаму садзейнічаў выдадзены Т.Касцюшкам 7 мая 1794 г. *«Паланецкі універсал»,* у якім сяляне абвяшчаліся асабіста свабоднымі і ім гарантавалася апека ўрада, але разам з тым зямля заставалася ва ўласнасці шляхты. Т. Касцюшку палохала рэвалюцыйная праграма Я. Ясінскага. Ён абвінаваціў правадыра «віленскіх якабінцаў» у дзеяннях, накіраваных супраць «уніі братніх народаў», і 4 чэрвеня 1794 г. адхіліў ад кіраўніцтва паўстаннем. У той жа час расійскія ўлады абяцалі амністыю сялянам-паўстанцам і раздачу ім зямель шляхціцаў, якія прымалі ўдзел у паўстанні. Да таго ж, на падаўленне паўстання Кацярына II паслала войска пад кіраўніцтвам А. Суворава. У рашаючай бітве пад Мацяёвіцамі 10 кастрычніка 1794 г. армія інсургентаў была разбіта, а паранены Т. Касцюшка трапіў у палон.

У Пецярбургу 24 кастрычніка 1795 г. была падпісана канвенцыя аб апошнім падзеле Рэчы Паспалітай, у выніку якога некалі моцная дзяржава перастала існаваць. Усе беларускія землі, акрамя Беласточчыны, былі ўключаны ў склад Расійскай імперыі. 25 лістапада 1795 г. Станіслаў Аўгуст Панятоўскі падпісаў у Гародні акт адмовы ад трона. Пачаўся новы этап змагання за беларускую ідэнтычнасць, за права беларускага народа на дзяржаўную незалежнасць.

АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

Адукацыйная камісія − установа па кіраванню народнай асветай у Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст

Анексія – гвалтоўнае далучэнне, захоп.

Асветніцтва − антыфеадальная ідэалогія XVIII ст., якая прапаведавала прыярытэт адукацыі, навукі і розуму ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы.

Ачыншаванне − перавод сялян з адпрацовачнай рэнты на грашовую.

Дысідэнты – агульная назва ўсіх некатолікаў у Рэчы Паспалітай. ***Загоны*** − назва казацкіх атрадаў у войску Б.Хмяльніцкага.

Канвакацыйны сойм – сойм у Рэчы Паспалітай, які вызначаў месца і час выбараў караля.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Каранацыйны сойм – сойм у Рэчы Паспалітай, на якім адбываліся выбары караля.

Люстрацыя − перыядычны перапіс дзяржаўнай маёмасці з мэтай вызначэння яе даходнасці.

Мануфактура − прамысловае прадпрыемства, заснаванае на ўжыванні падзелу працы і ручной рамеснай тэхнікі.

Слабада − поўнае або частковае вызваленне сялян ад павіннасцей на тэрмін ад 5 да 15 гадоў.

Элекцыйны сойм – сойм у Рэчы Паспалітай, на якім кароль прысягаў выконваць умовы, паводле якіх адбылося яго выбранне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма 6. Эканамічнае і грамадска-палітычнае развіццё Беларусі ў XIX ст.

1. Змены ў становішчы беларускага насельніцтва пасля далучэння да Расійскай імперыі.

2. Беларусь у вайне 1812 г.

3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў першай палове XIX ст.

Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы.

4. Грамадска-палітычны рух на землях Беларусі.

5. Культура Беларусі ў першай палове XIX ст.

1. Змены ў становішчы беларускага насельніцтва пасля далучэння да Расійскай імперыі. Пасля кожнага падзелу Рэчы Паспалітай на далучаных тэрыторыях уводзіўся новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел на генерал- губернатарствы, губерні і паветы. У 1801 г. былі створаны два генерал- губернатарствы, у якія ўваходзілі пяць беларускіх губерняў: *Літоўскае генерал- губернатарства* (Віленская, Гродзенская і Мінская губерні) і *Беларускае генерал- губернатарства* (Віцебская і Магілёўская губерні). У 1807 г. па ўмовах Тыльзіцкага міра французскі імператар Напалеон I перадаў Расіі Беласточчыну ўзамен за згоду далучыцца да кантынентальнай блакады Англіі. Такім чынам уся этнічная тэрыторыя Беларусі апынулася ў складзе Расійскай імперыі.

Палітыка царскіх улад у адносінах да шляхты. За выключэннем сялянства, усё насельніцтва павінна было прысягнуць на вернасць Кацярыне II. Тыя, хто не жадаў прыносіць прысягу, у трохмесячны тэрмін маглі прадаць нерухомасць і пакінуць межы Расійскай імперыі. Калі прадаць маёмасць не ўдавалася, яна пераходзіла ва ўласнасць расійскага скарбу. Гэтыя землі, як і былыя сталовыя эканоміі, староствы і дзяржавы, раздаваліся ўрадам расійскім памешчыкам, у выніку чаго на тэрыторыі Беларусі насаджалася расійскае землеўладанне.

Шляхта, якая прынесла прысягу, захавала свае маёнткі, але разам з тым была пазбаўлена некаторых правоў, якія мела ў Рэчы Паспалітай: права выбіраць манарха, мець замкі, трымаць узброеныя сілы для абароны сваіх вольнасцей і інш. Але ідучы насустрач мясцовай шляхце, у якасці асноўнага закону на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

далучаных тэрыторыях расійскі ўрад захаваў Статут ВКЛ 1588 г.

У адносінах да шляхецкага саслоўя на землях Беларусі царскі ўрад праводзіў палітыку «разбору шляхты». У адпаведнасці з ёй, шляхціцы павінны былі прадставіць дакументы на пацвярджэнне дваранскага паходжання. Дробная шляхта, якая ў пераважнай большасці такіх дакументаў не мела, пераводзілася ў разрад аднадворцаў або мяшчан. Гэтае мерапрыемства па «разбору» шляхецкага саслоўя на землях Беларусі некалькі разоў выкарыстоўвалася расійскім урадам як своеасаблівая карная палітыка, асабліва ў часы ўздыму нацыянальна- вызваленчага руху.

Змены ў становішчы сялян і мяшчан. Пасля далучэння да Расійскай імперыі падаткі на насельніцтва выраслі ў 4-5 разоў; замест *падымнага* падатку, які збіраўся з гаспадаркі, быў уведзены *падушны,* якім абкладаліся асобы мужчынскага полу. У той час, як у Расіі падаткі збіраліся ў папяровых асігнацыях, беларускае насельніцтва абавязана было плаціць іх у сярэбранай манеце (курс сярэбранага рубля і рубля асігнацыямі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. суадносіўся як 1:6).

Былі ліквідаваны катэгорыі вольных сялян (зямян і баяр), а асноўнай павіннасцю станавілася паншчына, памер якой дасягаў да шасці мужчынскіх і жаночых дзён на тыдзень. Да таго ж, на сялян ускладвалася рэкруцкая павіннасць, па якой у расійскую армію на 25-гадовую службу (з 1834 г. – 20-гадовую) сялянам неабходна было выправіць аднаго рэкрута ад 200 душ мужчынскага полу (з 1820 г. – ад 125 душ). Такім чынам, распаўсюджанне на землях Беларусі расійскай падатковай і павіннаснай сістэм прывяло да пагаршэння становішча асноўнай вытворчай сілы грамадства – сялянства.

Падатковы ціск на гарадское насельніцтва таксама ўзрос: былі ўведзены падаткі на ўтрыманне чыноўніцтва, павялічаны падаткі на рамяство і гандаль. У 1785 г. на беларускія гарады былі распаўсюджаны прынцыпы, абвешчаныя Кацярынай II у так званай «Даравальнай грамаце гарадам». У адпаведнасці з ёй гарадское насельніцтва дзялілася на 6 разрадаў і на падставе маёмаснага цэнзу магло ўдзельнічаць у выбарах у гарадскую думу, але ўсе важныя пытанні гарадскога жыцця вырашаліся выключна са згоды царскай адміністрацыі (губернатараў і гараднічых). Такім чынам, самакіраванне гарадоў, якое мела на землях Беларусі больш чым 400-гадовую гісторыю і спрыяла развіццю гарадоў, было ліквідавана.

З 1794 г. згодна з указам Кацярыны II у Расіі ўводзілася «мяжа яўрэйскай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аселасці», якая амаль супала з межамі ВКЛ і Расіі. Яўрэі маглі сяліцца толькі на захад ад гэтай мяжы выключна ў гарадах і мястэчках, але пры гэтым ім забаранялася трымаць шынкі і карчмы, арандаваць маёнткі, прамысловыя прадпрыемствы, а падаткі, ускладзеныя на яўрэйскае насельніцтва, былі ў два разы большыя, чым з хрысціян.

Канфесійнае пытанне. Каб не згубіць падтрымкі шляхты, якая ў пераважнай большасці была каталіцкага веравызнання, расійскі ўрад напачатку дазволіў свабоднае выкананне каталіцкіх абрадаў, а таксама захаваў за касцёламі іх маёмасць. Але пры гэтым жорстка забаранялася схіляць у каталіцкую веру праваслаўнае насельніцтва.

Праваслаўная царква, якая цярпела ўціск у Рэчы Паспалітай, атрымала дзяржаўную падтрымку, у Расійскай імперыі ёй надаваліся землі і багацці. Пасля ліквідацыі уніяцтва, якое адбылося на Полацкім царкоўным саборы 1839 г., усе уніяты былі пераведзены ў праваслаўе.

Такім чынам, пасля падзелаў Рэчы Паспалітай беларускія землі апынуліся ў складзе адной з далёка не перадавых на той час у эканамічным развіцці краін Еўропы. Пагаршэнне становішча людзей простага стану, страта шляхтай рэальнай улады ў краіне, абвастрэнне нацыянальнага і рэлігійнага пытанняў падштурхоўвалі насельніцтва ад адзінкавых пратэстаў у канцы XVIII ст. да масавага нацыянальна-вызваленчага руху ў XIX ст.

2. Беларусь у вайне 1812 г. Да 1812 г. французскі імператар Напалеон Банапарт падпарадкаваў сваёй уладзе амаль усе краіны Еўропы (акрамя Англіі і Даніі) і прыблізіўся да межаў Расійскай імперыі. Руска-французскія супярэчнасці асабліва абвастрыліся пасля Тыльзіцкага міра 1807 г., згодна з якім Расія вымушана была далучыцца да кантынентальнай блакады Англіі. Такая палітыка была вельмі непапулярнай у Расіі, выклікала шырокую незадаволенасць у грамадстве і фактычна ўмовы кантынентальнай блакады не выконваліся. З 1809 г. Расія і Францыя пачалі рыхтавацца да вайны.

Напалеон 12 чэрвеня 1812 г. пераправіўся праз Нёман у раёне Коўна і з 448-тысячнай арміяй (у далейшым павялічылася да 600 тыс.) пачаў рухацца па літоўскіх і беларускіх землях. 1-я і 2-я расійскія арміі пад кіраўніцтвам **Барклая де Толі** (120 тыс. чал., штаб-кватэра ў Вільні) і **П.І. Багратыёна** (49 тыс. чал., штаб-кватэра ў Ваўкавыску) не маглі супрацьстаяць французам і з баямі вымушаны былі адыходзіць, каб злучыцца ў Смаленску. 3-я рэзервовая армія на чале з **А.П. Тармасавым** (44 тыс. чал.), якая перад вайной была

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

размешчана ў ваколіцах Жытоміра, на злучэнне з асноўнымі расійскімі ваеннымі сіламі не пайшла, а здзяйсняла ваенныя рэйды супраць напалеонаўскіх войск на Брэстчыне.

Насельніцтва Беларусі, асабліва заходняй яе часткі, звязвала з Напалеонам надзеі на паляпшэнне свайго становішча:

• шляхта, якая страціла ў Расійскай імперыі свае палітычныя правы і ўплывы, спадзявалася на магчымасць аднаўлення ВКЛ, тым больш, што Напалеон пасля захопу Аўстрыі і Прусіі стварыў на акупаваных імі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай землях Герцагства Варшаўскае. Нягледзячы на тое, што Герцагства Варшаўскае знаходзілася пад пратэктаратам Францыі, на яго тэрыторыі былі абвешчаны дэмакратычныя свабоды і ажыццяўлялася парламенцкая форма кіравання.

Першапачаткова частка беларускай і літоўскай шляхты мела надзею на аднаўленне аўтаномнага ВКЛ у складзе Расійскай імперыі. З гэтай нагоды ў 1811 г. ***Міхал Клеафас Агінскі*** падрыхтаваў і прапанаваў на разгляд Аляксандру I праект, па якому планавалася, што адроджанае ВКЛ будзе мець уласны ўрад, а ролю Канстытуцыі будзе выконваць Статут ВКЛ 1588 г. Але супрацьдзеянне з боку кансерватыўнага расійскага дваранства і абвастрэнне руска-французскіх супярэчнасцяў не дазволілі гэтаму плану ажыццявіцца. Таму большасць беларуска-літоўскай шляхты ў 1812 г. звязвала планы па аднаўленню дзяржаўнасці менавіта з Напалеонам;

• сяляне, знясіленыя вялікімі падаткамі і павелічэннем паншчыны, чакалі ад Напалеона адмены прыгоннага права, якога ўжо не існавала ў Еўропе.

Вышэйзгаданае тлумачыць, чаму на першым этапе вайны насельніцтва фактычна не аказвала значнага супраціўлення французскай арміі.

Французскі імператар не хацеў аднаўлення Рэчы Паспалітай, але быў не супраць таго, каб стварыць буфернае палітычнае ўтварэнне паміж Расіяй і Польшчай. Загадам Напалеона ад 1 ліпеня 1812 г. быў створаны Часовы ўрад ВКЛ на чале з мясцовым памешчыкам Станіславам Солтанам. Ураду падпарадкоўваліся Віленская, Гродзенская, Мінская губерні і Беластоцкая вобласць (Віцебская і Магілёўская губерні не ўваходзілі ў склад ВКЛ і падпарадкоўваліся непасрэдна французскім ваенным уладам).

Шляхта для адстойвання незалежнасці адноўленай краіны стварыла армію

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ВКЛ, якая налічвала каля 19 тыс. чалавек. Аднак хутка стала зразумела, што створаная на акупаваных землях дзяржава з’яўляецца толькі інстытутам для больш лёгкага і добраахвотнага забеспячэння французскай арміі фуражом і правіянтам. Рэальная ўлада ў краіне належала французскім генералам, якія ўзначальвалі адміністрацыйныя адзінкі – *дэпартаменты,* на якія па французскаму ўзору была падзелена тэрыторыя Беларусі. У вёсках і гарадах праходзілі *рэквізіцыі* на карысць французскай арміі, якія ўсё часцей суправаджаліся *марадзёрствам.* Рабаўніцтва простага насельніцтва з боку французскіх салдат, неспраўджанне надзей на аднаўленне ВКЛ і адмену прыгоннага права, якія звязваліся з Напалеонам, выклікалі ў значнай часткі грамадства незадавальненне, якое хутка пачало перарастаць у адкрыты супраціў. 14–16 лістапада 1812 г. пры пераправе напалеонаўскай арміі праз Бярэзіну каля вёскі Студзёнкі ад «Вялікай арміі» засталося толькі 60 тыс. чалавек.

У выніку вайны 1812 г. тэрыторыя Беларусі зноў была разбурана. Па некаторых падліках, страты насельніцтва вызначаліся больш чым у 25 %, амаль напалову скарацілася колькасць жывёлы, зменшыліся пасяўныя плошчы. На фоне гаспадарчай разрухі ўзмацніўся прыгон. Вясной 1813 г. паўсюдна была адноўлена расійская адміністрацыя. Зыходзячы з палітычных меркаванняў, урад Аляксандра I аб'явіў амністыю той шляхце, якая ўдзельнічала ў вайне на баку Напалеона.

3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў першай палове XIX ст. Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы. На пачатку XIX ст., калі ў вядучых краінах Еўропы адбываўся пераход да індустрыяльнай цывілізацыі, у Расійскай імперыі па-ранейшаму панавала феадальна-прыгонніцкая сістэма. Галоўнай галіной гаспадаркі на беларускіх землях з’яўлялася ворыўнае земляробства, якое вялося на аснове прыгонніцтва з выкарыстаннем *трохпольнай* сістэмы і пераважна прымітыўных прылад працы. Ад эканамічных рэформ, якія праводзіліся на землях Беларусі ў другой палове XVIII ст. і былі накіраваны на інтэнсіфікацыю сельскагаспадарчай вытворчасці пры паслабленні павіннаснага ціску сялян, засталіся адныя ўспаміны.

У першыя дзесяцігоддзі XIX ст. на гаспадарчае развіццё маёнткаў беларускіх памешчыкаў вызначальны ўплыў аказала кан’юнктура цэн на збожжа ў Заходняй Еўропе. Хуткае развіццё капіталізму ў эканоміцы Еўропы суправаджалася ростам колькасці насельніцтва і адпаведна павелічэннем

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

попыту і росту цэнаў на збожжа. Гэтая сітуацыя была выкарыстана беларускімі памешчыкамі. З мэтай павелічэння аб'ёмаў продажу зерня за мяжу пашыраліся плошчы панскага заворвання за кошт сялянскіх надзелаў і сенажацяў, але гэта прывяло да скарачэння колькасці жывёлы і адпаведна пагаршэння ўгнаення глебы. Аднак спыніць пранікненне капіталістычных адносін у вёску было ўжо немагчыма. У сувязі з рыначнымі патрабаваннямі ў першай палове XIX ст. адбываецца *спецыялізацыя* сельскай гаспадаркі асобных рэгіёнаў Беларусі: у Віцебскай, а таксама паўночных паветах Мінскай і Магілёўскай губерняў развівалася льнаводства; у цэнтральных і паўднёвых частках Мінскай і Магілёўскай губерняў − вырошчванне канопель і вытворчасць пянькі; у Гродзенскай губерні перавага аддавалася танкаруннай авечкагадоўлі. Ва ўсіх губернях была развіта вытворчасць збожжавых культур, з канца 30-х гадоў пачалі вырошчвацца цукровыя буракі. У Беларусі з'явіліся прадпрымальніцкія гаспадаркі, якія былі арыентаваны не толькі на вырошчванне сельскагаспадарчай сыравіны, а і на яе перапрацоўку. Шырока развівалася вінакурэнне.

Аднак адзінкавыя факты прымянення памешчыкамі ў сваіх маёнтках лепшай тэхнікі, наёмнай працы і шматпольных севазваротаў не маглі прывесці да істотных змен у арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Эканамічнае развіццё ў першай палове XIX ст. яскрава сведчыла, што спалучэнне прыгоннай працы з патрабаваннямі ўнутранага і знешняга рынкаў магло прынесці толькі часовыя прыбыткі. З цягам часу станавілася відавочным адначасовае збяднение як панскай, так і сялянскай гаспадарак. Гэта адбывалася з прычыны таго, што працаваць на ўласным надзеле пры паншчыне ў 12 дзён у тыдзень (6 мужчынскіх і 6 жаночых) у сялян не было часу, а праца на панскім ворыве была прымусовай і не выклікала ў селяніна зацікаўленасці ў яе выніках. Такім чынам, эканамічныя магчымасці феадальна-прыгонніцкай сістэмы былі вычарпаны, а формы яе арганізацыі і спосабы вядзення гаспадаркі не маглі канкурыраваць з капіталістычным спосабам вытворчасці.

Рэформа П.Д. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы. Ва ўмовах крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы ўрад Мікалая I вымушаны быў шукаць выйсце з існуючага становішча. У 1837–1841 г. у дзяржаўных уладаннях Беларусі быў праведзены шэраг мерапрыемстваў, якія ўвайшлі ў гісторыю пад назвай *рэформы Кісялёва.* Граф П.Д. Кісялёў быў міністрам дзяржаўных маёмасцяў, і распрацаваная ім рэформа тычылася толькі дзяржаўных сялян, якія складалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пятую частку ўсяго сельскага насельніцтва Беларусі. *Мэтай пераўтварэнняў* было павелічэнне дзяржаўных даходаў і спыненне працэсу збяднення сялянства.

Сярод асноўных мерапрыемстваў рэформы можна вылучыць наступныя:

. 1) ***змена кіравання дзяржаўнай вёскай.*** Была ўсталявана трохярусная сістэма: губерня – акруга – сельскае ўпраўленне. Губернскія органы (палаты *дзяржаўных маёмасцяў*) адказвалі за правядзенне рэвізій, ахоўвалі грамадскі парадак, вырашалі пытанні харчовай і медыцынскай дапамогі. Адміністрацыя акругі займалася арганізацыяй сельскіх грамад, а сельскія ўпраўленні (сельскія *сходы і старосты)* праводзілі сялянскае землеўладкаванне, размеркаванне і збор падаткаў;

. 2) ***правядзенне люстрацыі,*** падчас якой складаліся інвентары з падрабязным апісаннем усіх дзяржаўных маёнткаў і вызначэннем павіннасцей сялян у залежнасці ад іх гаспадарчага становішча;

. 3) ***спыненне здачы дзяржаўных зямель у арэнду*** прыватным уласнікам, паколькі апошнія не дбалі аб захаванні гаспадарчага патэнцыялу ўладанняў, а клапаціліся толькі пра ўласную выгаду;

. 4) ***ліквідацыя фальваркаў.*** Гэтае мерапрыемства было адным з самых эфектыўных, паколькі з ліквідацыяй фальваркаў адмянялася паншчына, сяляне пераводзіліся на чынш, што садзейнічала павелічэнню іх зацікаўленасці ў выніках сваёй працы. Да таго ж, была ўсталявана сярэдняя норма надзела на рэвізскую (мужчынскую) душу;

. 5) ***палітыка «апякунства»,*** якая прадугледжвала стварэнне ў вёсках хлебных магазінаў, прыходскіх школ для навучання сялянскіх дзяцей, наяўнасць у вёсках фельчараў, а таксама правядзенне розных аграномічных мерапрыемстваў, добраўпарадкаванне сялянскіх сядзібаў, развіццё сістэмы страхавання і інш.

Як бачна, рэформа П.Д. Кісялёва ў многім была падобнай на рэформу А. Тызенгаўза ў каралеўскіх сталовых эканоміях ВКЛ: тая ж мэта – павелічэнне даходаў скарбу, люстрацыя дзяржаўнай маёмасці, спыненне здачы дзяржаўных зямель у арэнду і ўвядзенне кіравання імі дзяржаўнай адміністрацыяй пры адначасовым павелічэнні ролі сялянскай абшчыны, стварэнне магазінаў, школ, наяўнасць фельчараў, удасканаленне форм і метадаў вядзення сельскай гаспадаркі – усё гэта мела месца ў дзяржаўных уладаннях на землях ВКЛ у другой палове XVIII ст. Але ў рэформах мелася адно вельмі значнае адрозненне: калі А. Тызенгаўз для павелічэння

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

прыбыткаў скарбу аднавіў у эканоміях фальваркі і паншчыну, то ліквідацыя фальваркаў П.Д. Кісялёвым і перавод сялян на чынш з'явіліся яскравым сведчаннем разумення міністрам дзяржаўных маёмасцяў вычарпанасці магчымасцяў феадальна-прыгонніцкай сістэмы і немагчымасці прагрэсіўнага развіцця сельскай гаспадаркі пры захаванні прымусовай працы асноўнага вытворцы. Калі ў другой палове XVIII ст. сяляне не прынялі рэформу А. Тызенгаўза і адказалі на яе масавымі ўцёкамі з каралеўскіх эканомій, то рэформа П.Д. Кісялёва не выклікала сялянскіх пратэстаў, а, наадварот, прывяла да пэўнага павелічэння надзелаў дзяржаўных сялян (у беларускіх губернях у сярэднім на 45 %), памяншэння іх павіннасцей (у сярэднім на 56 %), прадстаўлення сялянам пэўнай эканамічнай свабоды, што, тым не менш, спрыяла павелічэнню ўраджайнасці і дзяржаўных даходаў.

Інвентарная рэформа. Становішча насельніцтва ў прыватнаўласніцкіх маёнтках таксама выклікала занепакоенасць уладаў. Рэформа П.Д. Кісялёва не стала прыкладам для памешчыкаў. Кансерватыўныя памешчыкі працягвалі весці гаспадарку старым «дзедаўскім» спосабам і нічога не хацелі мяняць. У 40-я г. XIX ст. Мікалай I некалькі разоў ствараў сакрэтныя камітэты з мэтай распрацоўкі мерапрыемстваў па сялянскаму пытанню, але, баючыся страціць падтрымку дваранства, на рашучыя меры, якія б закраналі асновы феадальна-прыгонніцкай сістэмы, царскі ўрад не ішоў.

Становішча сялян у прыватнаўласніцкіх маёнтках было вельмі цяжкім: вялікі памер паншчыны пры ўстанаўленні так званых *урокаў* – нормаў дзённага выпрацоўкі, вялікія дадатковыя павіннасці (будаўніцтва ў панскім фальварку, дарожныя работы, вартавыя абавязкі), *згоны* – прыцягненне сялян да тэрміновых сельскагаспадарчых работ, акрамя паншчыны, праца сялян у падрадчыкаў на кантрактных умовах на сплаўных і будаўнічых работах і інш. Сяляне часта не ведалі дакладна ўсіх сваіх павіннасцей і выконвалі іх па загаду ўласніка. Усё гэта выклікала сацыяльныя пратэсты сялян, якія праяўляліся, у першую чаргу, у масавых уцёках з маёнткаў.

З мэтай рэгулявання адносін паміж памешчыкамі і сялянамі і зняцця сацыяльнай напружанасці ў прыватнаўласніцкай вёсцы П.Д. Кісялёў у 1840 г. прапанаваў увесці на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны абавязковыя *інвентары,* у якіх былі б зафіксаваны памеры сялянскіх надзелаў і вызначаны дакладныя нормы павіннасцяў. Нягледзячы на тое, што прапанаванае мерапрыемства, якое стала вядома як *інвентарная рэформа,* не закранала асноў феадальна-прыгонніцкай сістэмы, але выклікала рэзкае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

непрыняцце з боку памешчыкаў. Складанне інвентароў, якое было ініцыявана дзяржавай, прыватныя ўласнікі расцанілі як умяшальніцтва ўрада ў іх асабістыя справы і наступленне на іх правы. «У сваіх маёнтках робім, што хочам» — такі быў адказ памешчыкаў на рэформу. Інвентарная рэформа ў памешчыцкай вёсцы правалілася, а крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы паглыбляўся.

Прамысловасць і гарады ў першай палове XIX ст. Прамысловасць у сваім развіцці праходзіць тры стадыі: 1) рамесная вытворчасць; 2) мануфактура; 3) фабрычна-заводская прамысловасць. У першай палове XIX ст. аснову прамысловасці Беларусі складала рамесная і мануфактурная вытворчасць. Значную ролю адыгрывала *вотчынная прамысловасць* памешчыкаў. Як правіла, вотчынныя мануфактуры перапрацоўвалі мясцовую сыравіну і былі заснаваны на бясплатнай працы прыгонных сялян. Памешчыкі ў пачатку XIX ст. з'яўляліся галоўнымі ўласнікамі капіталу, і менавіта ў іх уладаннях былі заснаваны першыя на землях Беларусі прадпрыемствы фабрычнага тыпу: у 20-я г. XIX ст. памешчык Пуслоўскі пабудаваў у мястэчках Хомск (Кобрынскі павет) і Косава (Слонімскі павет) дзве суконныя фабрыкі, на якіх выкарыстоўваліся паравыя рухавікі.

У гарадах і мястэчках былі распаўсюджаны пераважна рамесныя майстэрні, але змены ў іх арганізацыі сведчылі аб пачатку фарміравання капіталістычных адносін: былі ліквідаваны самастойнасць і замкнутасць цэхаў, узрасла колькасць рамесных спецыяльнасцяў. Пры гэтым гарадская прамысловасць на пачатку XIX ст. не магла канкурыраваць з вотчыннай, паколькі выдаткі на яе арганізацыю былі значна большымі з-за неабходнасці аплочваць зямельныя ўчасткі, закупку сыравіны і працу наёмных рабочых. Існавала і яшчэ адна перашкода на шляху эфектыўнага развіцця гарадской прамысловасці — наяўнасць феадальна- прыгонніцкай сістэмы рабіла немагчымым стварэнне рынку свабоднай рабочай сілы. Таму са 140 мануфактур на землях Беларусі ў 1860 г. купцам і мяшчанам належалі толькі 3, а астатнія – памешчыкам.

У другой чвэрці XIX ст. на тэрыторыі Беларусі назіраўся рост гарадоў і колькасці гарадскога насельніцтва. Працэс урбанізацыі ў гэты час быў звязаны не з развіццём прамысловасці і гандлю, а ў першую чаргу з існаваннем «мяжы яўрэйскай аселасці» і перасяленнем яўрэяў з сельскай мясцовасці ў гарады і мястэчкі, прычым колькасць апошніх у першай палове XIX ст. значна павялічылася. Гэта тлумачылася тым, што памешчыкі сталі

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

актыўна дабівацца пераводу сваіх буйных вёсак у разрад мястэчак, паколькі ў такім выпадку яны атрымлівалі права адкрываць карчмы для продажу гарэлкі, што пры распаўсюджанні вінакурэння значна павялічвала прыбытковасць іх маёнткаў.

Паступова таварна-грашовыя адносіны ўсё больш уваходзілі ў жыццё насельніцтва. Для развіцця гандлю ў першай палове XIX ст. надавалася ўвага паляпшэнню шляхоў зносін: будаваліся паштовыя тракты, рэканструяваліся водныя каналы (Аўгустоўскі, Бярэзінскі, канал Агінскага і інш.). Важную ролю ў пашырэнні гандлю адыгрывалі кірмашы, якія праводзіліся ў час рэлігійных святаў. У Беларусі дзейнічала каля 270 кірмашоў, найбольш вядомымі з якіх былі *Кантрактавы* кірмаш у Мінску, *Троіцкі* ў Гомелі, *Зэльвенскі* і *Свіслацкі* ў Гродзенскай губерні, *Любавіцкі* – у Магілёўскай, *Асвейскі* і *Бешанковіцкі* – у Віцебскай. Але з цягам часу павялічвалася роля стацыянарнага гандлю ў крамах гарадоў і мястэчак.

Такім чынам, у сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі першая палова XIX ст. характарызавалася крызісам феадальна-прыгонніцкай сістэмы, які выявіўся ў памяншэнні даходаў уласнікаў зямлі, павелічэнні павіннаснага ўціску сялян, што таксама з'яўлялася вялікай перашкодай на шляху развіцця гарадской прамысловасці.

Латинское духовенство с помещиками делалось смелее и смелее. Оно вредило наветами и внушениями. Оно совращало униатов и келейно и даже устраиваемыми для сего миссиями. Оно строило своевольно церкви и часовни, где надеялось повредить униатам. Например, управлявший виленскою епархиею Микуцкий письменно опубликовал выдуманное им высочайшее повеление, якобы совращенным униатам дозволено оставаться в латинстве. Этот циркуляр велено вымарать из церковных книг; запрещено производить миссии; запрещено строить латинские часовни без ведома униатского духовного начальства. Принимаемы были при всяком случае и другие меры; но многое оставалось без действия, а многое ускользало от самого бдительного внимания, так что все-же оставалось от латинян много

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вредных последствий. Совершенное их обуздание было невозможно, особенно по нерадению и недоброжелательству местных гражданских чиновников, принадлежащих по большей части к латинскому исповеданию.

… Наущаемые латинами и ободряемые потворством гражданских начальств, неблагонамеренные или колеблющиеся еще духовные из униатов тоже становились смелее и дерзновеннее, особенно по Белорусской епархии. Здесь многие священики выходили прямо из повиновения преосвященному Василию, так что в ноябре месяце воспоследовало высочайшее повеление, чтобы строптивых священников отправлять в великороссийские монастыри…

Все прописанное выше не могло меня не тревожить. Я настаивал неоднократно, чтобы положить конец этим волнениям и их неблагоприятным последствиям, решительным общим воссоединением униатов. Наконец, в 1 день декабря 1838 года, подал я записку, прилагаемую при сем. В ней изложено живо настоящее положение дела и способны порешить окончательно.

Эта записка побудила наконец правительство к решительным окончательным мерам по униатскому делу. Приступаем к достопамятному 1839 году.

Положено отправиться мне в Полоцк … Между тем, по вышеупомянутым проектам заготовлены на бело акт о возсоединении униатов и два прошения о сем государю императору. Акт отправлен по почте в Жировицы при письме моем к преосвященному Антонию от 24 января для подписи тамошним духовенством; просьбы взял я с собою в Полоцк.

В Полоцке я имел много хлопот с тамошним заблудшим духовенством – но об этом после. Главное дело прошло совершенно благополучно.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Акт и просьбы подписаны 12 февраля в неделю православия – первый двадцатью четырьмя начальствующими духовными, последние только епископами.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі: у 3 т. / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі; пад рэд. Н.М. Нікольскага [і інш.]. – Мінск: Выд-ва Акад. навук БССР, 1940. – Т. 2: 1772–1903 гг. – С. 315–316.

Указ Сената аб назвах беларуска-літоўскіх губерняў ад 30.12.1842

Правительствующий Сенат слушали предложение управляющего министерством Юстиции, что управляющий делами Комитета Министров, по поручению оного отношением от 26 минувшего июня, сообщил ему, что по случаю внесения по высочайшему предписанию проекта указа, в котором упоминались губернии Белорусские и Литовские под сими наименованиями, государь император, зачеркнув название Белорусских и Литовских, изволил приказать переписать указ с поименованием губерний, каждой отдельно Витебскою, Могилевскою, Виленскою и Гродненскою; при чем последовало собственноручное высочайшее повеление: «*Правила сего держаться и впредь, никогда иначе не прописывая, как поименно губернии*»[1]). О таковом высочайшем повелении он управляющий министерством Юстиции предлагает Правительствующему Сенату.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі: у 3 т. / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі; пад рэд. Н.М. Нікольскага [і інш.]. – Мінск: Выд-ва Акад. навук БССР, 1940. – Т. 2: 1772–1903 гг. – С. 369.

Рашэнне Камітэта міністраў аб закрыцці Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі ад 30.12.1842

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Министр Народного Просвещения сообщил ему—министру Юстиции, что государь император, по положению Комитета Министров, вследствие представления его, о мерах к окончательному закрытию Виленской Медико-Хирургической Академии, в 30 день декабря высочайше повелеть соизволил, между прочим: 1) означенную Академию, взамен которой учрежден медицинский факультет при университете св. Владимира, упразднить с 1 августа 1842 года. 2) При упразднении оной учредить, под ведением попечителя Белорусского учебного округа, временный комитет, из чиновников этой Академии, для окончания всех дел оной.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі: у 3 т. / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі; пад рэд. Н.М. Нікольскага [і інш.]. – Мінск: Выд-ва Акад. навук БССР, 1940. – Т. 2: 1772–1903 гг. – С. 369.

Рэскрыпт цара Аляксандра II на імя Віленскага генерал-губернатара У. Назімава аб падрыхтоўцы рэформы 1861 г. у Беларусі, арганізацыі губернскіх камітэтаў і Віленскай камісіі ад 20.11.1857

Виленскому Военному, Гродненскому и Ковенскому генерал-губернатору.

В губерниях: Ковенской, Виленской и Гродненской были учрежденье особые Комитеты из предводителей дворянства и других помещиков, для рассмотрения существующих там инвентарных правил. Ныне министр Внутренних дел довел до моего сведения о благих намерениях, изъявленных сими Комитетами относительно помещичьих крестьян означенных 3-х губерний.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Одобряя вполне намерения сих представителей дворянства Ковенской, Виленской и Гродненской губ., как соответствующих моим видам и желаниям, я разрешаю дворянскому сословию оных приступить теперь же к составлению проектов, на основании коих предположения Комитетов могут быть приведены в действительное исполнение, но не иначе, как постепенно, дабы не нару шить существующего ныне хозяйственного устройства помещичьих имений.

Для сего повелеваю:

1) Открыть теперь же в губерниях Ковенской, Виленской и Гродненской, по одному в каждой, приуготовительному Комитету, а потом, для всех 3-х губерний вместе одну общую Комиссию в г. Вильне.

2) Каждому Губернскому Комитету состоять под председательством;

губернского предводителя дворянства из следующих членов:

а) по одному от каждого уезда губернии, выбранному из среды себя дворянами, владеющими в том уезде населенными имениями и

б) двух опытных помещиков той же губернии по непосредственному назначению начальника оной и

3) Общей Комиссии состоять из следующих лиц: а) двух членов каждого из 3-х губернских Комитетов по их выбору; б) одного опытного помещика из каждой губернии по вашему назначению и в) одного члена от министерства Внутренних дел. Председателем комиссии представляется вам назначить одного из ее членов, принадлежащих к местному дворянству.

Губернские Комитеты, по открытии их, должны приступить к составлению по каждой губернии, в соответственность собственному вызову представителей дворянства, подробного проекта об устройстве и улучшении

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

быта помещичьих крестьян оной, имея при этом в виду следующие главные основания:

1) Помещикам сохраняется право собственности на всю землю но крестьянам оставляется их усадебная оседлость, которую они в течение определенного времени приобретают в свою собственность посредством выкупа; сверх того предоставляется в пользование крестьян надлежащее, по местным удобствам, для обеспечения их быта и для выполнения их обязанностей пред правительством и помещиком, количество земли, за которое они или платят оброк или отбывают работу помещику.

2) Крестьяне должны быть распределены на сельские общества; помещикам же предоставляется вотчинная полиция и

3) При устройстве будущих отношений помещиков и крестьян должна быть надлежащим образом обеспечена исправная уплата государственных и земских податей и денежных сборов.

Развитие сих оснований и применение их к местным обстоятельствам каждой из 3-х означенных губерний предоставляется Губернским Комитетам. Министр Внутренних дел сообщит вам свои соображения, могущие служить пособием Комитетам при их занятиях.

Комитеты сии, окончив свой труд, должны представить оный в общую комиссию. Комиссия, обсудив и рассмотрев все предположения Губернских Комитетов, а также сообразив их с изложенными выше основаниями, должна постановить окончательное по всему делу заключение и составить проект общего для всех 3-х губерний положения с нужными, по каждой, изъятиями или особыми правилами.

Поручая вам главное наблюдение и направление сего важного дела вообще во вверенных вам Ковенской, Виленской и Гродненской губерниях, я предоставляю вам дать, как Губернским Комитетам сих 3-х губерний, так и

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

общей Комиссии, нужные наставления для успешного производства и окончания возлагаемых на них занятий. Начальники губерний должны содействовать вам в исполнении сей обязанности. Составленный общею комиссиею проект вы имеете с своим мнением препроводить к министру Внутренних дел, для представления на мое усмотрение.

Открывая таким образом дворянскому сословию Ковенской, Виленской и Гродненской губерний средства привести благие его намерения в действие, на указанных мною началах, я надеюсь, что дворянство вполне оправдает доверие, мною оказываемое сему сословию призванием его к участию в сем важном деле, и что при помощи божией и при просвещенном содействии дворян, дело сие будет кончено с надлежащим успехом.

Вы и начальники вверенных вам губерний обязаны строго наблюдать, чтобы крестьяне, оставаясь в полном повиновении помещикам, не внимали никаким злонамеренным внушениям и лживым толкам.

Пребываю вам навсегда благосклонный.

На подлинном, собственною его и. в. рукою подписано:

«Александр»

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі: у 3 т. / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі; пад рэд. Н.М. Нікольскага [і інш.]. – Мінск: Выд-ва Акад. навук БССР, 1940. – Т. 2: 1772–1903 гг. – С. 379–380.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пытанні да семінарскіх заняткаў

Тэма. Буржуазныя рэформы. Асаблівасці палітыкі царызму ў Беларусі ў 60 – 90-я гг. XIX ст.

План семінара

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЛЕКЦЫЯ-ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

ТЭМА: ПАЛІТЫЧНЫ КРЫЗІС РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ. ДАЛУЧЭННЕ БЕЛАРУСІ ДА РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ.

***Асноўныя пытанні*:**

1. Паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі.
2. Ход паўстання на Беларусі.
3. Трэці падзел Рэчы Паспалітай (1795 г.) і ліквідацыя Рэчы Паспалітай як самастойнай дзяржавы.
4. Гістарыяграфія пытання аб далучэнні Беларусі да Расійскай імперыі.

Пытанні для абмеркавання:

1. Назавіце прычыны, мэты і ўдзельнікаў паўстання Касцюшкі.
2. Як разгортваліся падзеі 1794 г. на Беларусі?
3. Што перашкодзіла поспеху паўстання? Ці мажлівым ён быў наогул?
4. Адносіны памешчыкаў і сялян да паўстання (Паланецкі ўніверсал і неадназначныя адносіны да яго памешчыкаў і сялян).
5. Складзіце паведамленне “Тадэвуш Касцюшка – знакавая асоба паўстання”.
6. Якія наступствы мелі падзей 1794 г. для Усходняй Еўропы?
2. Хто, на вашу думку, галоўны вінаўнік пагібелі Рэчы Паспалітай?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1.Прычыны паўстання. Унутранае становішча ў Рэчы Паспалітай накануне паўстання.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) працягвалася бязлітасная барацьба паміж рознымі групоўкамі феадалаў. Шляхецка-

магнацкая арыстакратыя выступіла супраць канстытуцыі **3 мая 1791 г.,** уступіла ў змову з суседнімі краінамі і рыхтавала новы падзел Рэчы Паспалітай. **У студзені 1793 г.** Расія і Прусія падпісалі дагавор аб другім падзеле Рэчы Паспалітай, па якому Прусія захапіла Гданьск, Тарунь і Вялікую Польшчу з Познанню. Да Расіі адышлі правабярэжная Украіна, а таксама цэнтральная частка Беларусі з Мінскам, Барысавым, Бабруйскам, Рэчыцай, Слуцкам, Наваградкам, Пінскам, Мозырам.

Стала зразумелым, што ад канчатковага падзелу Рэчы Паспалітай паміж Расійскай імперыяй, Прусіяй і Аўстрыяй можа выратаваць толькі рашучае супрацьстаянне гэтым сілам скансалідаванага грамадства. Але такога не адбылося. Хоць паўстанне 1794 г., на чале якога стаў прадстаўнік старадаўняга беларускага шляхецкага роду Андрэй-Тадэвуш Бенавентура Касцюшка, давала для гэтага апошні шанец.

2. Андрэй-Тадэвуш Банавентура Касцюшка

Андрэй-Тадэвуш Бенавентура Касцюшка нарадзіўся ў небагатай сям'і беларускага шляхціца, фамільны маёнтак якога знаходзіўся ў вёсцы Сяхновічы Кобрынскага павета (у цяперашні час гэта Жабінкаўскі раён Брэсцкай вобласці). Дакладная дата яго нараджэння невядома, выказана меркаванне, што ён нарадзіўся 4 лютага 1746 г., аднак больш праўдападобным трэба лічыць, што нарадзіўся ён 30 лістапада 1745 г. Ёсць падстава меркаваць, што спачатку яго хрысцілі ў праваслаўнай царкве і назвалі Андрэем у гонар апостала Андрэя Першазванага, свята якога прыпадае на 30 лістапада. Вядома, што дзяцей, раней хрышчаных у цэрквах, часта паўторна хрысцілі ў касцёлах або проста складалі фіктыўныя каталіцкія метрыкі. Неабходна адзначыць, што на працягу ўсяго свайго жыцця Касцюшка быў абыякавы ў дачыненні да рэлігійных пытанняў, нягледзячы на тое, што навучаўся ў каталіцкай канфесіянальнай школе.

Імкнучыся сказіць беларускае паходжанне Касцюшкі, нават сучасная Wielka Encyklopedia Powszechna паведамляе, што ён нібыта нарадзіўся на Валыні, якая з 1569 г. была далучана да Польшчы. Сам жа Касцюшка называў сябе літвінам, г.зн. так, як называлі сябе ў той час жыхары Беларусі.

Разныя былі ўказанні і аб месцы яго нараджэння. На думку адных біёграфаў ён нарадзіўся ў вёсцы Сяхновічы, што пацвярджаецца надпісам на медалі, выбраленым у Парыжы ў 1818 г. Другія ўказваюць, што ён нарадзіўся ў маёнтку Марачоўшчына каля мястэчка Косава (цяпер Івацэвіцкі раён

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Брэсцкай вобласці). Аднак у абодвух выпадках размова ідзе аб Беларусі, а не аб Валыні ці Польшчы. У гістарычных дакументах прозвішча Касцюшка сустракаецца з 1458 г.

3. Падрыхтоўка да паўстання. Асноўныя цэнтры

Напярэдадні паўстання, на працягу ўсяго 1793 – пачатку 1794 гг. вялася яго актыўная падрыхтоўка. Падрыхтоўкай паўстання кіравала група патрыётаў, вымушаных пакінуць краіну і выехаць у Лейпцыг і Дрэздэн. Сярод іх, акрамя Т. Касцюшкі, былі Г. Калентай, І. Патоцкі і іншыя патрыёты. На тэрыторыі Рэчы Паспалітай дзейнічалі тайныя саюзы і таварыствы прыхільнікаў паўстання на чале з І. Дзялінскім, Я. Ясінскім і іншымі.

4. Пачатак паўстання. Кракаўскі акт

24 сакавіка 1794 г. паўстанне ўспыхнула ў Кракаве. У ім прынялі ўдзел шляхта, мяшчане і некаторая частка сялян. На чале паўстання стаў генерал-лейтэнант Тадэвуш Касцюшка, які быў абвешчаны вышэйшыі і адзіным начальнікам узброеных сіл і кіраўніком усяго паўстання. У гэты ж дзень быў абвешчаны Акт паўстання грамадзян, жыхароў Кракаўскага ваяводства, і Касцюшка прынёс прысягу, у якой абавязаўся даверанай яму ўлады не ўжываць у чыіх-небудзь асабістых інтарэсах, а толькі для абароны цэласнасці граніц,вяртання самаўладдзя народа, усталявання ўсеагульнай свабоды.

Акт паўстання пачынаўся з выкрыцця подласці і ашуканства царыцы Кацярыны II і прускага караля Фрыдрыха Вільгельма. У Акце паўстання Касцюшка правільна ўказаў, што галоўнай мэтай Кацярыны II і Фрыдрыха Вільгельма было жаданне "распаўсюдзіць панаванне тыраніі" і падаўленне свабоды не толькі ў сваіх дзяржавах, але і ў суседніх народаў. Акт паўстання яшчэ раз выкрыў перад усім светам паказны лібералізм расійскай імператрыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Палітычнае кіраўніцтва паўстаннем (органы ўлады, упраўленні, суды). Барацьба ўнутры кіраўніцтва

Палітычнае кіраўніцтва паўстаннем у адпаведнасці з Актам ускладалася на **Вышэйшую нацыянальную раду**. У якасці надзвычайных мясцовых органаў ствараліся **камісіі кіравання ў ваяводствах**, якія ў сваю чаргу стваралі дазорныя ўпраўленні. Кожнае **дазорнае ўпраўленне ахоплівала 1000-1200 сялянскіх гаспадарак**. Ствараліся новыя **рэвалюцыйныя суды**, якія павінны былі разглядаць крымінальныя справы аб злачынствах, накіраваных супраць паўстання.

Створаныя новыя органы ўлады, упраўленні і суды не скасавалі аднак стары дзяржаўны апарат, не была знішчана і манархія.

Пасля ўзброенага паўстання **ў Варшаве**, якое адбылося **17-18 красавіка 1794 г.**, была створана ў канцы мая **Галоўная нацыянальная рада**. У яе склад уваходзілі **8 саветнікаў** і **32 члены рады**, але галоўная роля належала **Касцюшку** як **начальніку ўзброеных сіл**. У радзе ўвесь час ішла барацьба паміж правымі рэфарматарамі і рэвалюцыйна настроенымі дзеячамі (якабінцамі), паслядоўнікамі французскіх рэвалюцыянераў.

(Выданне Акта паўстання мела выключна важнае значэнне для мабілізацыі ўсіх прагрэсіўных сіл на барацьбу як з унутранай рэакцыяй, так і з замежнымі захопнікамі. Гэта Акт абавязваў Касцюшку і Вышэйшую нацыянальную раду выпускаць як мага часцей пракламацыі і звароты да народу, паведамляць яму аб сапраўдным становішчы спраў. Гэтым былі засведчаны дэмакратычныя прынцыпы паўстання і імкненне прыцягнуць да ўдзелу ў ім самыя шырокія масы народа).

6. Ідэалагічная падрыхтоўка паўстання (звароты Касцюшкі “Да арміі”, “Да грамадзян”, “Да духавенства”, “Да жанчын”)

У першы ж дзень паўстання Касцюшка звярнуўся з адозвамі “Да арміі”, “Да грамадзян”, “Да духавенства”, “Да жанчын”. Кожная з гэтых адозваў глыбока эмацыянальна і пераканаўча заклікае стаць на абарону свабоды і Айчыны. Так, напрыклад, у адозве “Да арміі” гаварылася: “Будзем жа адзіным калектывам з грамадзянамі, згуртуемся цясней, злучым сэрцы і сродкі ўсіх жыхароў нашай зямлі… Калегі! Ідзіце са мной! Чакае Вас слава

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і асалода задавальнення быць вызваліцелямі Айчыны… Бяру разам з Вамі лозунг “Смерць або перамога!” У звароце “Да грамадзян” Касцюшка ўказваў, што, каб зрабіць першы крок да вызвалення, неабходна адважыцца быць свабодным, а каб атрымаць перамогу, трэба быць упэўненым ва ўласных сілах. У звароце да духавенства абвяшчалася свабода для ўсіх веравучэнцаў. Аднак заўважым, што такое рашэнне не магло задаволіць каталіцкае духавенства, якое заўсёды выступала супраць іншых рэлігійных вучэнняў і патрабавала сабе выключных прывілеяў і пераваг. У звароце “Да жанчын” яны заклікаліся актыўна падтрымліваць сваіх братоў, сыноў і мужоў, якія сталі на абарону сваіх правоў і свабод.

Рухальнымі сіламі нацыянальна-вызваленчага руху, які пачаўся ў краіне, былі:

1. гараджане
2. дробная буржуазія
3. гарадская інтэлігенцыя
4. прыгонныя сяляне
5. малазямельная шляхта.

1. *Аднак палітычнае кіраўніцтва паўстаннем у значнай ступені знаходзілася ў руках прадстаўнікоў шляхецка-буржуазнага блоку, якія імкнуліся не дапусціць сацыяльнай рэвалюцыі.*

2. Каб прыцягнуць сялян да паўстання, Касцюшка лічыў неабходным адмену прыгоннага права, таму Канстытуцыя 3 мая, якая захоўвала саслоўную няроўнасць і прыгонную залежнасць сялян, не была яго ідэалам, у сувязі з чым Акт паўстання не закранаў пытанні аб аднаўленні Канстытуцыі. Канчатковае вызначэнне дзяржаўнага і грамадзянскага ладу Акт адносіў да часу заканчэння рэвалюцыйнай вайны.

7. Пачатак ваенных дзеянняў. Паўстанне ў Варшаве

У пачатку красавіка 1794 г. Касцюшка меў у сваім распараджэнні 1100 салдат і 2000 сялян з косамі і пікамі. **4 красавіка** адбылася першая буйная бітва паміж паўстанцкай арміяй і царскімі войскамі пры вёсцы Радлавіцы, якая закончылася перамогай паўстанцаў. Перамога пад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Радлавіцамі мела важнае значэнне для далейшага развіцця паўстання, якое пашыралася на Сандамірскае і Люблінскае ваяводствы і Холмскую землю. **17-18 красавіка** паўсталі гарадскія масы ў Варшаве. **19 красавіка** быў аб'яўлены Акт Мазавецкага ваяводства аб яго далучэнні да паўстання пад кіраўніцтвам Касцюшкі.

З самога пачатку паўстання ў Варшаве пачалася барацьба за ўладу ў горадзе. Была створана **Часовая замяшчальная Рада**. На чале Рады стаў прадстаўнік шляхецка-буржуазнага блоку Закшэўскі, ваенным камендантам быў прызначаны прыхільнік каралеўскай улады генерал Станіслаў Макраноўскі, які спрабаваў засцерагчы ад пакарання здраднікаў-таргавічан. Таму Часовая замяшчальная Рада з першых жа дзён паўстання ў Варшаве не карысталася даверам у бедных слаёў насельніцтва і асабліва ў рэвалюцыйна настроеных якабінцаў.

8. Ход паўстання на Літве (Шавельскі акт) і Беларусі (Віленскі акт).

16 красавіка выбухнула паўстанне ў Шаўлях на Жмудзі (цяпер Шаўляй у Літве). Але частка размешчанага там войска на чале з генералам Антонам Хлявінскім займала нерашучую пазіцыю. Пад пагрозай арышту генерал Хлявінскі падпісаў Акт паўстання. Згодна з Шавельскім актам (16 красавіка 1794 г.) да паўстання далучалася Жмудзь.

У ноч з 22 на 23 красавіка па распрацаванаму плану ў Вільні быў нечакана атакаваны і разбіты расійскі гарнізон. Кіраваў аперацыяй **Я. Ясінскі**. Улада ў горадзе перайшла ў рукі паўстанцаў. 24 красавіка быў абвешчаны Віленскі Акт паўстання, які заклікаў не толькі да набыцця "вольнасці", але і "роўнасці грамадзянскай".

***Ствараецца і пачынае дзейнічаць вышэйшы для ўсяго ВКЛ орган па кіраўніцтву паўстаннем* – "Найвышэйшая Літоўская Рада"** разам з падпарадкаванымі ёй "**дэпутацыямі**" (аддзеламі): **публічнай бяспекі, забеспячэння вайсковых патрэб і скарбовай**. Пачынае дзейнічаць і *Крымінальны суд. Менавіта па яго рашэнні 25 красавіка быў павешаны на гарадской плошчы апошні гетман ВКЛ Сымон Касакоўскі.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Камандуючым узброенымі сіламі паўстанцаў у ВКЛ быў прызначаны 33-гадовы палкоўнік **Я. Ясінскі**. Склад “Літоўскай Рады” налічваў **29 чалавек**. Акрамя таго, ад ваяводстваў, паветаў і гарадоў Княства ў яе ўвайшлі яшчэ **37 прадстаўнікоў**. Гэта стварала магчымасць з цягам часу ператварыць Раду ў свайго роду **правінцыйны сейм ВКЛ**.

13 мая Я. Ясінскаму было прысвоена Т. Касцюшкам званне генерал-лейтэнанта. Адначасова кіраванне паўстанцкімі сіламі было выведзена з-пад улады адной асобы. Войска было падзелена на тры часткі з трыма камандуючымі: Я. Ясінскім, А. Хлявінскім і Ф. Сапегам, якія павінны былі дзейнічаць скардыянавана. Такім чынам, з аднаго боку ішоў працэс цэнтралізацыі кіраўніцтва паўстаннем у межах Рэчы Паспалітай, а з другога – дэцэнтралізавалася кіраўніцтва войскам у ВКЛ.

У кіраўніцтве паўстаннем “на Літве”, назіраюцца дзве плыні. Адна з іх, радыкальная альбо “якабінская” на чале з **Я. Ясінскім**, і другая – умяркаваная, прадстаўленая **магнацтвам і заможнай шляхтай**. Першыя імкнуліся да як мага большых рэвалюцыйных змен у грамадстве ў духу французскай рэвалюцыі.

Такі падыход да мэтаў паўстання не мог падабацца “умяркаваным”. Касцюшка быў вымушаны пад нацiскам правых адхіліць Я. Ясінскага ад кіраўніцтва Вышэйшай Радай у Вільні, што ў канчатковым выніку прывяло да аслаблення ўсяго рэвалюцыйнага руху на Беларусі і ў Літве.

Чаму Касцюшка не падтрымаў сваіх найбольш рэвалюцыйных прыхільнікаў? Чаму адразу ж не адмяніў прыгоннага права і не адхіліў ад палітычнага кіраўніцтва паўстаннем прадстаўнікоў шляхецка-буржуазнага блоку?

Ён не зрабіў гэта, бо ўлічваў рэальныя суадносіны сіл і імкнуўся прыцягнуць на бок паўстання не толькі шырокія пласты працоўнага сялянства і гарадскіх нізоў, але вымушаны быў таксама лічыцца з тым, што значную частку ўзброеных сіл складала шляхта, а гарадскія рамеснікі і дробная буржуазія складалі невялікую частку насельніцтва. Прыгонныя сяляне не маглі быць галоўнай сілай паўстання. Таму Касцюшка быў вымушаны лавіраваць паміж правымі рэфарматарамі і левымі рэвалюцыянерамі, да таго павінен быў улічваць, што для барацьбы супраць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

унутранай конррэвалюцыі і замежных інтэрвентаў неабходна было згуртаванне ўсіх сіл, здольных падтрымаць паўстанне.

9. Паланецкі ўніверсал Касцюшкі

7 мая 1794 г. Касцюшка выдаў Паланецкі ўніверсал, якім абвешчалася апека ўрада над сялянамі, сяляне аб'яўляліся асабіста вольнымі, г.зн. адмянялася прыгоннае права, але без зямлі, пайсці ад памешчыка сялянін мог толькі пры ўмове выплаты даўгоў і дзяржаўных падаткаў, а таксама паставіўшы ў вядомасць Камісію упраўлення аб тым, куды ён перасяляецца; устанаўліваліся пэўныя ільготы ў адбыванні паншчыны. Спецыяльнымі артыкуламі ўніверсала Касцюшка папярэджваў, што нарушэнне гэтых пастаноў памешчыкамі будзе карацца судом як процідзеянне мэтам паўстання.

Паланецкі ўніверсал не адмяніў поўнасцю прыгоннага права і не ліквідаваў феадальнай эксплуатацыі, але дазваляў сялянам ісці ад памешчыкаў, што было таксама ў інтарэсах буржуазіі, якая зараджалася. Гэты акт быў безумоўна прагрэсіўным, хоць і палавінчатым. Ён аслабляў эканамічны стан памешчыцкіх маёнткаў, абмяжоўваў паншчыну і падрываў значэнне шляхецкіх прывілеяў. Таму памешчыкі ўсяляк затрымлівалі апавяшчэнне ўніверсала і, баючыся сацыяльнай рэвалюцыі, часта ішлі на змову з замежнымі войскамі. Многія палажэнні ўніверсала не выконваліся на месцах і засталіся толькі на паперы. Супраць ажыццяўлення палажэнняў Паланецкага ўніверсала выступілі вярхі каталіцкага духавенства.

(Пасля бітвы пад Радлавіцамі, у якой удзельнічалі 2000 апалчэнцаў з сялян, Касцюшка ўзнагародзіў тых, хто найбольш вызначыўся, а Войцэха Барташа ўзвёў у чын афіцэра і назваў яго Барташам Главацкім, тым самым прысвоіў яму шляхецкую годнасць. Сам жа Касцюшка апрануў сялянскую світку. Гэтыя дзеянні спрыялі павышэнню аўтарытэту Касцюшкі сярод людзей.

Усе, хто асабіста быў знаёмы з Касцюшкам, падкрэслівалі яго ваенны талент, высокую адукаванасць, нястомную энергію і прастату. Так, падскарбій Вялікага Княства Літоўскага, удзельнік паўстання, кампазітар

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Міхал Клеафас Агінскі пісаў, што Тадэвуш Касцюшка "карыстаўся вялікай пашанай усёй Еўропы, быў гразой для ворагаў і бажаством для народа; узвышаны да рангу Начальніка, не ведаў іншага гонару як служыць Айчыне і змагацца за яе, заўсёды сціпла сябе паводзіў…", не насіў ніякіх знакаў вышэйшай улады, хадзіў у сурдуде з дрэннага шэрага сукна і сталаваўся так, як звычайны афіцэр". Гэтая характарыстыка Касцюшкі, дадзеная яго земляком, не выклікае сумніву ў яе аб'ектыўнасці, бо пацвярджаецца іншымі гістарычнымі дакументамі.)

Успрыняўшы вучэнне французскіх рэвалюцыйных і радыкальных пісьменнікаў, філосафаў і публіцыстаў, а таксама амерыканскіх буржуазных прагрэсіўных дзеячаў, Касцюшка выпрацаваў **самастойную дзяржаўна-прававую канцэпцыю палітычнага і грамадскага развіцця Рэчы Паспалітай**. Ідэалам грамадскага ладу ён лічыў грамадства, якое складаецца **з вольных сялян – уласнікаў зямлі**, рамеснікаў, купцоў пры захаванні памешчыцкага землеўладання, заснаванага на вольным найме рабочай сілы. Лепшую форму дзяржаўнага кіравання ён бачыў у **рэспубліцы**, тэарэтычныя асновы якой спрабаваў выкласці ў Паланецкім універсале. Аднак ажыццявіць гэтыя ідэі яму не ўдалося.

10. Ваенная і палітычная сітуацыя на пачатку чэрвеня. Баявыя дзеянні ў ліпені-верасні 1794 г.

Ваенная і палітычная сітуацыя складвалася не на карысць паўстання.

На пачатку чэрвеня аб'яднаныя руска-прускія войскі (24 тысячы чалавек) у бітве каля мястэчка **Шчакаціны** прымусілі армію Касцюшкі (12 тысяч чалавек) адступіць. **15 чэрвеня** прускія войскі занялі **Кракаў**, а Касцюшка вымушаны быў адступіць **да Варшавы**. **У сярэдзіне ліпеня** да **Варшавы** падыйшлі прускія войскі і рускі корпус пад камандаваннем Ферзена. Аднак гераізм абаронцаў Варшавы і ўмелыя дзеянні Касцюшкі **ў жніўні-верасні 1794 г**. прымусілі гэтыя войскі адыйсці ад Варшавы.

Аднак неўзабаве становішча паўстанцаў значна пагоршылася, бо **Аўстрыя** пашырыла тэрыторыю сваёй акупацыі, тым самым наносячы ўдар з поўдня.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

8 жніўня рускі пасол **ў Стамбуле** атрымаў абяцанне Турцыі захаваць мір з Расіяй, што дазволіла Кацярыне II перакінуць з турэцкай граніцы на тэрыторыю Рэчы Паспалітай корпус пад камандваннем А.В. Суворава. *Нечаканае з'яўленне ў верасні новага корпуса на тэрыторыі Заходняй Беларусі паставіла ў крытычнае становішча дывізію паўстанцаў пад камандваннем генерала Серакоўскага.* Корпус Ферзена пачаў наступленне з паўднёвага захаду, супраць яго Касцюшка выставіў дывізію Ю. Серакоўскага і некаторую колькасць свайго рэзерву. На дапамогу яму павінна была падыйсці пад камандваннем генерала Панінскага, але ён загаду Касцюшкі не выканаў і да месца бітвы гэтая дывізія не падышла.

Найбольш буйнымі рэйдамі на тэрыторыі Беларусі І-га і ІІ-га падзелаў былі выправы атрадаў паўстанцаў пад кіраўніцтвам **М.К. Агінскага** (на Дынабург) і **С. Грабоўскага** (на Меншчыну) **у жніўні 1794 г**. Атрад М. Агінскага налічваў каля 2,5 тысяч чалавек, з іх да 1 тысячы конных. Пяхоты было каля 1,5 тысячы чалавек, з якіх толькі 300 чалавек мелі стрэльбы. Астатнія 1200 чалавек былі ўзброены толькі пікамі і косамі. Гэта пераважна былі сяляне. *Пакінуўшы ў Дусятах асноўную частку свайго атраду, М. Агінскі з трымястамі найбольш падрыхтаванымі і ўзброенымі паўстанцамі накіраваўся да Дынабургу. Але ўзяць горад не ўдалося. Было толькі спалена яго прадмесце.*

Атрад С. Грабоўскага пры ўваходзе на Меншчыну налічваў крыху болей 2 тысяч чалавек. Адной з галоўных мэт рэйду **С. Грабоўскага** было адцягненне сілаў ворага на сябе ад Вільні і Гародні. Адначасова псаваліся камунікацыі, разбураліся масты, рабіліся засекі на дарогах. Атрад С. Грабоўскага таксама быў недастаткова ўзброены і падрыхтаваны. *Абмінуўшы Менск, атрад рушыў праз Пухавічы на Бабруйск. Там быў знішчаны невялікі гарнізон. Але супрацьстаяць вялікім сілам расійскага войска атрад С. Грабоўскага доўга не мог і вымушаны быў павярнуць назад. 26 жніўня пад Любанню ён быў разбіты. А сам С. Грабоўскі трапіў у палон. Толькі невялікая частка яго атраду здолела выратавацца.*

11. Бітва пад Мацяёвіцамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

10 кастрычніка адбылася бітва пад Мацяёвіцамі, пераломная бітва паўстання. Калоне, якую вёў Касцюшка на Варшаву, перакрыў шлях корпус Ферзена. Бой цягнуўся амаль поўны дзень. Гарматны агонь рускіх рассеяў конніцу, у сутычках з пяхотай палеглі касінеры, кіраваць боем стала немагчыма, было відавочна, што рускія перамагаюць.

Касцюшка ў роспачы ездзіў па полі бітвы сярод параненых і палеглых, нібы шукаючы сваю кулю сярод мноства тых, што пасвіствалі навокал. Выпадкова нарваўся на купку казакаў. Падсечаны куляй конь паваліўся, Касцюшка выляцеў з сядла і, не жадаючы ганьбы палону, уставіў дула пісталета ў рот і спусціў курок.

На бяду, ці на дабро? Бог ведае! Асечка. Набеглі казакі, адзін стрэліў, другі з каня ўдарыў Касцюшку пікай. Неяк апынуўся сярод казакаў гусарскі карнет Фёдар Лысенка: распалены боем, ён ударыў бяззбройнага паўстанца палашом па галаве – пашкодзіў чэрап. Касцюшка страціў прытомнасць. Казакі знялі з яго боты, з кішэні выцягнулі залаты гадзіннік, з пальцаў сцягнулі некалькі пярсцёнкаў з надпісам "Айчына – абаронцу свайму", якімі Касцюшка ўзнагароджваў замест медалёў.

Побач ляжаў польскі драгун, які прыкінуўся забітым. Але бачачы, як рабуюць Касцюшку, як заліла ягоны твар кроў, ён не стрымаў і стаў крычаць: "Начальніка забілі! Касцюшку!" Казакі збянтэжыліся, пачалі крычаць Касцюшку ў вуха, каб прывесці да прытомнасці, аблілі вадой, і Касцюшка апрытомнеў. Тады адзін спытаў: "Ты – Касцюшка?" Той шэптам вымавіў: "Так. Вады…" Захоп кіраўніка паўстання шмат што абяцаў казакам, узрадаваныя, яны панесліся дакладваць па камандзе. Пад'ехалі афіцэры, знайшлі нейкую падводу. Касцюшку паклалі на голыя дошкі. Падводу трэсла на няроўным полі, галава параненага білася аб дошкі. Трэба аддаць належнае казакам: нехта разважлівы з іх сказаў: "Хоць ён і вораг, але ўсё ж і ён чалавек". Казакі надзелі на пікі шынелі і на такіх насілках панеслі палоннага да генералаў.

Па загаду Кацярыны Касцюшку павезлі ў Пецярбург; баючыся нападу паўстанцаў, маршрут абралі кружны – праз Украіну, потым праз Гомель, Магілёў, Шклоў, Оршу, Віцебск, Ноўгарад. У Пецярбурзе начальнік паўстання апынуўся ў Петрапаўлаўскай крэпасці, дзе пад пільным наглядам правёў два гады.Той факт, што Касцюшка апынуўся ў палоне, адмоўна паўплываў на ход паўстання і прадвызначыў зыход усёй барацьбы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

12. Канец паўстання і яго вынікі.

Начальнікам узброеных сіл **12 кастрычніка 1794 г**. Вышэйшы савет прызначыў замест Касцюшкі яго земляка **Тамаша Ваўжэцкага**, аднак ні яго аўтарытэт, ні ваенныя здольнасці не давалі яму магчымасці параўнацца з Касцюшкам. **4 лістапада** войскі пад камандваннем А. Суворава авалодалі ўмацаваным прыгарадам Варшавы Прагай, пасля чаго кароль Рэчы Паспалітай і яго паплечнікі далі згоду на капітуляцыю Варшавы.

Паўстанне 1794 г. на Беларусі пратрымалася крыху болей 5 месяцаў**.** Але яно змагло адцягнуць на сябе значныя сілы расійскіх войскаў. Гэта не дазволіла адразу кінуць іх супраць атрадаў Т. Касцюшкі.

Адной з **прычын паражэння** паўстання Т. Касцюшкі з'яўлялася

1. адсутнасць адзінага камандавання, належнага ўзаемадзеяння ў паўстанцкім войску, няздольнасць вайсковага кіраўніцтва.
2. Але галоўнай прычынай, якая прывяла да паражэння паўстання, бачыцца палавінчатасць аб'яўленых рэформаў, пастаянная аглядка на шляхецтва, якое не хацела дапускаць рэвалюцыйнага выступлення сялянства і мяшчанства.

(Выдадзены 7 мая 1794 г. Т. Касцюшкам знакаміты "Паланецкі ўніверсал" стварaў падставу для аблягчэння становішча сялянства ў Рэчы Паспалітай. Гэтым універсалам усім прыгонным сялянам надавалася ўласная свабода, прызнавалася спадчыннае права карыстання зямлёй, якую яны абраблялі, значна аблегчваліся павіннасці. Але, каб канчаткова не адштурхнуць ад паўстання шляхту, Т. Касцюшка вымушаны быў улічваць і яе інтарэсы. Прыгон не быў скасаваны. Гэта не дазволіла перарасці паўстанню ва ўсенародны рух, а таксама спарадзіла раскол у лагеры паўстанцаў. Такія акалічнасці спрыялі рускаму войску на чале з Суворавым і Ферзенам атрымаць шэраг перамог і задушыць паўстанне. Былі і іншыя прычыны, што прывялі да паражэння).

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

3. Пачынаючы паўстанне, Касцюшка і іншыя кіраўнікі спадзяваліся, што Аўстрыя, Прусія і Расія не змогуць накіраваць значныя сілы супраць паўстання з-за ўцягнення іх у барацьбу з Турцыяй і Францыяй.

Аднак кіраўнікі Прусіі і Аўстрыі аслабілі націск на рэвалюцыйную Францыю і сканцэнтравалі значныя сілы супраць Рэчы Паспалітай, не даўшы магчымасць тут нацыянальна-вызваленчаму руху перарасці ў аграрную рэвалюцыю, здольную змесці феадальны лад.

Хоць паўстанне і пацярпела паражэнне, аднак яго значэнне ў гісторыі Еўропы велізарнае.

Ф. Энгельс пісаў: “Пакуль грабёж Польшчы адцягваў таксама сілы кааліцыі 1792-1794 гг., аслабляючы яе наступальную магутнасць супраць Францыі, апошняя за гэты час настолькі ўзмацнела, што зусім самастойна атрымала перамогу. Польшча заняпала, але яе супраціўленне выратавала французскую рэвалюцыю, а разам з французскай рэвалюцыяй пачаўся рух, супраць якога бяссільны і царызм”. Ідэі вызваленчага антыфеадальнага дэмакратычнага руху пачалі распаўсюджвацца ў Аўстрыі, Прусіі і Расіі.

24 сакавіка 2007 г. споўнілася 200 гадоў з дня пачатку (24 сакавіка – 16 лістапада 1794 г.) паўстання ў Польшчы, на Беларусі і ў Літве пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі.

13. Трэці падзел Рэчы Паспалітай (1795 г.) і ліквідацыя Рэчы Паспалітай як самастойнай дзяржавы.

Паражэнне паўстання 1794 г. паслужыла зачэпкай для канчатковага падзелу Рэчы Паспалітай **паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй**.

“Тры каранаваныя злодзеі падзялілі паміж сабой дабычу – Польшчу па таму ж самаму праву, па якому разбойнікі з вялікай дарогі дзеляць паміж сабою кашалёк бяззбройнага падарожніка”. Так характарызаваў Ф. Энгельс тры падзелы Рэчы Паспалітай Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй у 1772, 1793 і 1795 гг. Энгельса паўтарыў У. Ленін: “Курляндыю і Польшчу яны сумесна дзялілі, гэтыя тры каранаваныя разбойнікі. Яны дзялілі сто гадоў, яны рвалі па жывому мясу, і рускі разбойнік урваў больш, таму што быў у той час мацнейшы”.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУ

У выніку трэцяга падзелу **Аўстрыя** захапіла Малую Польшчу з Люблінам. Астатнія польскія землі, у тым ліку і Варшаву, захапіла **Прусія**. **Расія** далучыла Літву, заходнюю частку Беларусі і Заходнюю Валынь.

Такім чынам, у выніку трох падзелаў Рэч Паспалітая як дзяржава перастала існаваць.

(Пазбаўленне дзяржаўнасці народаў Рэчы Паспалітай з'яўляецца актам рэакцыйным. Гісторычную адказнасць за гэта нясуць як феадальныя манархі Прусіі, Аўстрыі і Расіі, так і арыстакратыя Рэчы Паспалітай. У пагоні за багаццем, уладай, барацьбе паміж сабой яны звярталіся за падтрымкай (грашовай або войскамі) да суседніх дзяржаў, выступалі супраць рэформ, за захаванне залатой вольнасці. Адзін з самых багатых людзей Рэчы Паспалітай, нясвіжскі ардынат караль Радзівіл, якому належала каля 5 тысяч вёсак, больш тысячы гарадоў і мястэчак, неаднаразова змагаўся супраць Расіі, але не адмаўляўся ад грошай Расіі і выступаў на яе баку. Расія, Аўстрыя і Прусія скарысталі права моцнага суседа супраць слабейшага. Але, успомнім, што і Рэч Паспалітая не цуралася такіх метадаў, калі была моцнай дзяржавай і неаднаразовак ў пачатку XVII ст. спрабавала захапіць маскоўскі трон, пасадзіўшы на яго спачатку Лжэдзімітрыя I, а потым Лжэдзімітрыя II. І ніхто не цікавіўся народамі, якія жылі на гэтай зямлі і ў выніку ваенных дзеянняў пераходзілі ад адной дзяржавы да другой).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

14. Паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі – трагічная старонка нашай гісторыі.

Доўга і ўпарта нас прывучалі да таго, што гэта выключна польскае паўстанне. Аднак полымем касцюшкаўскага паўстання былі ахоплены не толькі этнічна польскія землі, але і значная тэрыторыя Беларусі, сучаснай Летувы і частка Латвіі.

Чым жа было гэта паўстанне для беларусаў?

Якое месца яно павінна заняць у нашай гісторыі, з якой былі вырваны цэлыя звенні?

(*Мы да часу стрымана ганарыліся адным з пачынальнікаў нашай цяперашняй незалежнасці К. Каліноўскім. Але ў кожнай з'явы і падзеі свае карані. Нездарма, заклікаючы да змагання за волю беларускіх сялян, К. Каліноўскі звяртаўся на старонках "Мужыцкай праўды" не да каго іншага, а да вобраза Т. Касцюшкі.*

Упамінаючы паўстанне 1794 г. і славуты "Паланецкі ўніверсал", ён пісаў: "Ачунялі то былі мужыкі, угледзелі што кепско, дай давай бунтавацiся пад Касцюшкаю, а Касцюшко то каже: калі мужыкі хочуць ужэ самі бараніць сваю зямлю, так нехай жэ не служаць паншчыны, да і не плацяць у казну аброку за землю. От гэто так справядлівасць! – Но што ж калі Маскаль спыніў Маніхвест Касцюшкі каб не пабунтаваў усіх мужыкоў. Для таго то і пабілі Маскале Касцюшку, бо каб мужыкі ўсе разам былі ўзбунтаваліся і ўхапілі за сякеры, нажы і косы, так бы Маскаль мусіў бы без паўстання і мы на век вякоў ужэ былі б вольныя". Мы з усёю ўпэўненасцю можам сказаць, што без паўстання Т. Касцюшкі ў 1794 г. на Беларусі не было б і сялянскай вайны 1863 г. пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага.

Два вялікіх сыны беларускай зямлі, звязаныя паміж сабою не толькі адзінствам паходжання ад яе жыватворных глыбінь, але і жаданнем даць волю, дабіцца праўды і незалежнасці для яе народу).

Паўстанне 1794 г. для лепшых прадстаўнікоў беларускага народу дало накірунак выпрацоўкі ўласнай нацыянальнай самасвядомасці; а менавіта тое, што падтрымка і дапамога іншым народам у змаганні з тыраніяй і захопамі не выключае, а заўжды ставіць на першае месца змаганне за лепшую долю сваёй Бацькаўшчыны. Паўстанне 1794 г. і было, калі можна так сказаць, ўсведамленнем гэтай ісціны. І не толькі беларусамі, але і ўсімі народамі, якія спрадвеку жылі на гэтых землях.

15. Да пытання аб удзеле народаў Рэчы Паспалітай у паўстанні 1794 г.:

Татары: *У артыкуле "Во многом общая судьба" доктар гістарычных навук Э.Г. Іоффе адзначае, што: "*У гісторыі Рэчы Паспалітай можна знайсці прыклады сумеснай барацьбы татараў і яўрэяў пад аднымі і тымі ж

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

знамёнамі. Гэта адбылося ў час паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі”.

Сярод актыўных удзельнікаў паўстання знаходзім нямала **татараў**. Гэта паручнік Аляксандр Ахматовіч, камандзір палка Якуб Азюлевіч, камандзіры карпусоў генералы Юзаф Беляк і Мустафа Ахматовіч, камандзір палка Аляксандр Улан. Мужнасць і гераізм праяўлялі татарскія коннікі з палка Азюлевіча і часці генерала Зайёнчыка пры абароне Варшавы.

Мужнасць і гераізм пад час паўстання праявіў у 1794 г. **яўрэйскі полк** пад камандваннем палкоўніка Берэка Ёселевіча

Раю прачытаць вам гэты артыкул, а таксама іншыя матэрыялы.

Імя Касцюшкі нададзена ў нас вуліцам у Смаргоні і ў вёсцы Леніна Горацкага раёна, а вёска Трагубава таго ж раёна перайменавана ў Касцюшкава.

Памяць пра Якуба Ясінскага ніяк не матэрыялізаваная. *Не знайшлі вартым нашыя ўлады нават які завулак у Солах прысвяціць якабінцу і генералу беларускіх касінераў.*

(Закрыў гэтыя постаці цень А.В. Суворава, карныя подзвігі якога на Беларусі ўшанаваны назвамі вуліц у 35 нашых гарадах, 24 мястэчках, маем мы нават 23 калгасы і піянерскую дружыну Струменскай школы імя графа Рымнікскага, князя Італійскага, прынца Сардзінскага, душыцеля паўстання 1794 г., генералісімуса Суворава. Пастаўлены яму і два помнікі ў Кобрынскім раёне...).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тадэвуш Касцюшка – гістарычная асоба не толькі славянскага, але і сусветнага значэння. Змагар супраць усіх формаў каланіялізму. Герой вызваленчай вайны Злучаных Штатаў Амерыкі ў 1776-1783 гг.

Пра яго ўзнёсла напісалі расійскія гісторыкі, і гэта зафіксавана ў расійскіх савецкіх энцыклапедыях (шкада, што ў нашай шматтомнай гісторыі Беларусі не знайшлося месца. На радзіме Касцюшкі, на Беларусі выдадзена толькі адна невялічкая кніга Я. Юхо "За вольнасць вашу і нашу". Гэтага яўна мала.

Помнікі Тадэвушу Касцюшку ёсць не толькі ў Польшчы і ЗША. У Аўстраліі яго імем названа самая высокая гара.

Няхай жа і наш беларускі юбілей паўстання 1794 г. стане этапам нашага дзяржаўнага адраджэння. Няхай Расія славіць сваіх герояў, а Беларусь – сваіх.

У заключэнне хачу сказаць, што для шматпакутнай Беларусі паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі было рэальным шанцам пачаць адраджэнне сваёй дзяржаўнасці і культуры ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. Яго паражэнне прычынілася да таго, што даводзіцца будаваць беларускую дзяржаву сёння праз 200 гадоў, калі бальшавіцкая дэспатыя паставіла наш народ ля бездані гістарычнага нябыту.

Наступствы падзелаў.

Асноўная маса насельніцтва – сяляне і мяшчане Беларусі – індэферэнтна ўспрынялі распад Рэчы Паспалітай. Жыццё ў гэтай няшчастнай, прагніўшай дзяржаве не давала спадзяванняў на нейкія змены. Новыя ж гаспадары, новыя парадкі заўсёды неслі ў сябе надзеі на лепшую будучыню. Іншая справа, што надзеі тыя не спраўджваліся.

У беларускіх землях, далучаных да Расійскай імперыі, было ўведзена такое ж кіраванне, як і ў Расіі. У пачатку XIX ст. Беларусь з насельніцтвам больш 3 млн. чалавек склала Віцебскую, Магілёўскую, Мінскую, Гродзенскую і Віленскую губерні.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

З уваходам Беларусі ў склад Расіі прадукцыйныя сілы Беларусі атрымалі ўвогуле больш спрыяльныя ўмовы для свайго развіцця. Безумоўна, што эканамічная прастора Расіі была значна большай, чым Рэчы Паспалітай. Да таго ж Расійская імперыя была моцнай у ваенных адносінах дзяржавай і магла сябе абараніць. У такіх умовах складаліся спрыяльныя перадумовы для эканамічнага развіцця Беларусі, фарміравання тут капіталістычных адносін.

У цэлым уключэнне ў Расійскую імперыю, мела станоўчае значэнне для эканамічнага развіцця Беларусі, для гістарычнага лёсу яе народа, але памылкай было б перабольшваць значэнне гэтай складанай гістарычнай падзеі. І тут трэба мець на ўвазе наступнае.

Па-першае, у выніку далучэння да царскай Расіі Беларусь пападала пад больш цяжкі гнёт расійскай манархіі. Яна не мела ніякай самастойнасці ні ў палітычных, ні ў эканамічных, ні ў культурна-нацыянальных пытаннях. Па сутнасці Беларусь была каланіяльным уладаннем рускага цара.

Па-другое, становішча народных мас, у першую чаргу сялянства, пагоршылася. Вось што піша аб жыцці і працы беларускага сялянства ў гэты ча судзельнік дзекабрысцкага руху У. Тургенеў: “Адно з самых абуральных злоўжыванняхх прымячаецца ў беларускіх правінцыях, дзе сяляне так няшчасны, што выклікалі спачуванне нават рускіх прыгонных”. Вядомы беларускі гісторык, прафесар І. Ігнатоўскі пісаў, што “у Рэчы Паспалітай працоўныя масы Беларусі былі рабочым “быдлам”, а ў царскай Расіі яны зрабіліся рабочым “скатом”.

Па-трэцяе, становішча гараджан таксама пагоршылася. Магдэбургскае права, хаця і было прызнана за беларускімі гарадамі, але фактычна самакіравання ў гарадах не было. Капцы плацілі падаткі з капіталу, а мяшчане былі абложаны агульным падушным падаткам і ў адносінах адбывання вайсковай павіннасці прыроўнены да сялян. Яўрэйскае насельніцтва было абмежавана ў правах. Пачала ўстанаўлівацца “мяжа яўрэйскай аседласці”.

Па-чацвёртае, пасля далучэння да Расіі Беларусь павінна была ўносіць у царскую казну большыя падаткі, чым у складзе Рэчы Паспалітай. Па падліках І. Ігнатоўскага яны ўзраслі амаль у 6 разоў і склалі больш 1 млн. руб. у год.

Па-пятае, у Расійскай імперыі беларуская культура апынулася ў крытычным стане. У складзе Рэчы Паспалітай культуру беларусаў трэба

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

было бараніць ад палітыкі асіміляцыі польскіх паноў і засілля каталіцкай царквы, а ў складзе Расійскай дзяржавы – з двух бакоў: па-ранейшаму ад каланізатарскіх дзеянняў польскіх памешчыкаў і каталіцкага духавенства (а іх стрымліваючае ўздзеянне на развіццё культуры Беларусі захоўвалася яшчэ доўга пасля далучэння да Расіі), і ад нацыянальна-культурнай асіміляцыі царскай Расіі, бо афіцыйныя ўлады імперыі не лічылі беларусаў за самастойны этнас і прымалі вялікія намаганні прыглушыць самасвядомасць беларускага народа.

Як відаць, у нас няма падставы ідэалізаваць уключэнне Беларусі ў склад Расійскай імперыі. Аднак, зыходзячы з аб'ектыўных пазіцый, трэба адзначыць, што ў цэлым уключэнне Беларусі ў склад Расіі ў той час і ў тых гістарычных умовах садзейнічала складванню больш спрыяльных умоў для развіцця эканомікі і фарміравання капіталістычных адносін, чым раней.

ХАРАКТАРЫСТЫКА ПАЎСТАННЯ

Падзеі, звязаныя з паўстаннем Т. Касцюшкі на Беларусі, ахопліваюць час з красавіка па канец верасня. Для першага перыяду (красавік-чэрвень) характэрныя найбольш актыўныя дзеянні паўстанцаў і, наадварот, нерашучасць і асцярожнасць у дзеяннях расійскага войска. Гэта было выклікана поспехамі паўстанцаў і перамогай Т. Касцюшкі пад Радлавіцамі (4 красавіка), поспехам паўстання ў Варшаве (18 красавіка) і ў Вільні. У гэты перыяд расійскія войскі, пазбаўленыя агульнага плану дзеянняў, атачоныя з усіх бакоў паўстанцамі ў чужым краі, манеўруючы, адступалі. Так, атрад князя Цыцыянава 9 мая пакідае Гародню і адыходзіць у напрамку Нясвіжа. Урэшце расійскія войскі займаюць пазіцыю прыкладна ўздоўж мяжы падзелу Рэчы Паспалітай 1793 г.

А ў Гародню 14 мая перабіраецца павятовая "парадкавая камісія", утвораная 9 мая ў Саколцы. Яна пачынае актыўную працу па фарміраванні паўстанцкага войска. На 7 чэрвеня ў гарадзенскім павеце было мабілізавана на паўстанне да 5 тысяч "рэкрутаў".

9 мая ў Бярэсці утвараецца ваяводская "парадкавая камісія", афіцыйна ўхваляецца рашэнне аб далучэнні ваяводства да паўстання. У склад берасцэйскай камісіі ўвайшло 8 чалавек праваслаўнага веравызнання, з якіх ігумен Грыгароўскі праз некаторы час стаў нават яе старшынёй (рэч дагэтуль

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нечуваная ў Рэчы Паспалітай). 15 мая Т. Касцюшка звярнуўся да сваіх землякоў са спецыяльнай адозвай. Ён вітаў іх далучэнне да Кракаўскага Акту. Асабліва адзначыў годны падтрымкі і распаўсюджвання прыклад рэлігійнай талерантнасці і супрацоўніцтва з праваслаўным насельніцтвам.

Найбольш небяспечным для расійскага войска бачылася магчымасць пашырэння паўстання на той тэрыторыі Беларусі, якая была далучана да Расіі паводле І-га і ІІ-га падзелаў. На тое былі свае падставы. Панічныя рапарты з Нясвіжа да імператрыцы дасылае генерал-губернатар “мінскі, ізяслаўскі і брацлаўскі” Туталмін. Ён не перастае дамагацца ў князя М. Рапніна, прызначанага рэскрыптам Кацярыны ІІ ад 22 красавіка 1794 г. камандуючым расійскім войскам на тэрыторыі ВКЛ, узмацнення мяжы ІІ-га падзелу больш значнымі вайсковымі сіламі. Адначасова паведамляе аб падазроных з’ездах шляхты, пашырэнні паўстанцкай агітацыі і збіранні зброі нават сялянамі. Пачынаецца тэрміновае ўмацаванне фартафікацыйных збудаванняў у Нясвіжы. Сучаснікі адзначаюць атмасферу агульнай панікі сярод адміністрацыі ў Менску. Былі зроблены захады да магчымага пераводу ў Слуцк у выпадку небяспекі менскіх кас і архіваў. Справа даходзіла да таго, што ад афіцэраў, якія прыбывалі з ахопленых паўстаннем тэрыторый Рэчы Паспалітай, пад прысягай патрабавалі, каб маўчалі аб усім, што там адбываецца.

1 чэрвеня Я. Ясінскі выдае загад павятовым органам кіравання паўстаннем аб утварэнні 300 асабовых конных атрадаў з усіх прыдатных трымаць зброю людзей. Гэтыя атрады павінны былі, перайшоўшы межы другога падзелу, распачаць партызанскія дзеянні ў тыле расійскага войска. Для лепшай арганізацыі гэтай справы Ясінскім была складзена спецыяльная “Інструкцыя для ўваходзячых у кардон расійскі”. Апрача арганізацыйных вайсковых пытаннях у “Інструкцыі” асаблівая ўвага звярталася на ўздзеянне на мясцовае насельніцтва, каб “заахвочваць шляхту і люд” да паўстання. Гэтая ініцыятыва была ўхвалена Т. Касцюшкам, які сам праз два тыдні выдаў аналагічны ўніверсал.

Паступова ініцыятыва пераходзіць у рукі праціўніка. 26 чэрвеня Я. Ясінскі не здолеў перамагчы ў бітве пад в. Солы аб’яднаных расійскіх сіл пад кіраўніцтвам генерала М. Зубава і брыгадзіра Бенігсена. Пасля чаго Ясінскі ад’язджае ў Варшаву. З гэтага часу расійскія войскі пераходзяць да наступальных дзеянняў. Да таго ж прызнаны Т. Касцюшкам 4 чэрвеня галоўнакамандуючым усімі ўзброенымі сіламі паўстання ў ВКЛ Міхал Вяльгорскі зусім не адпавядаў гэтай пасадзе і нічым сябе не праявіў (3-5 жніўня ў сувязі з хваробай М. Вяльгорскага яго замяшчае С. Макраноўскі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэрыторыя паўстання на Беларусі пачынае звужацца. На сярэдзіну ліпеня расійскія войскі кантралявалі ўсё Наваградскае ваяводства і частку Берасцейскага.

19 ліпеня спроба расійцаў захапіць Вільню заканчваецца няўдачай. Але з таго часу яны ўжо не пакідаюць яе ваколіц. 12 жніўня расійскія войскі канчаткова займаюць Вільню. У верасні на тэрыторыю паўднёвых паветаў Беларусі ўваходзяць атрады Суворава. Спачатку пад в. Крупчыцы каля Кобрына і канчаткова пад Бярэсцем яны разбіваюць “корпус” Серакоўскага, складзены з “каронных” і “літоўскіх” атрадаў.

Даўжэй паўстанне пратрымліваецца каля Гародні. Сюды ў рэшце рэшт перабіраецца і “Цэнтральная Дэпутацыя ВКЛ” – новы орган па кіраўніцтву паўстаннем, які ў пачатку чэрвеня прыйшоў на замену “Літоўскай Радзе”. Сюды ж на адзін дзень, 30 верасня паспявае прыехаць Т. Касцюшка (адзіны раз за ўвесь час паўстання на тэрыторыі Беларусі). Але і Гародню па загаду Т. Касцюшкі з 1 кастрычніка пакідаюць паўстанцы. Рэшткі паўстанцкага войска ВКЛ праз Саколку і Беласток адступаюць да Варшавы. Там, пры абароне варшаўскага прадмесця, Прагі, гіне Я. Ясінскі.

СЕМІНАР-КАНФЕРЭНЦЫЯ

“Тадэвуш Касцюшка і яго час”

Пытання для разгляду:

1. Прычыны паўстання. Унутранае становішча ў Рэчы Паспалітай накануне паўстання.
2. Андрэй-Тадэвуш Банавентура Касцюшка. Біяграфія.
3. Падрыхтоўка да паўстання. Асноўныя цэнтры.
4. Пачатак паўстання. Кракаўскі акт.
5. Палітычнае кіраўніцтва паўстаннем (органы ўлады, упраўленні, суды). Барацьба ўнутры кіраўніцтва. Асноўныя плыні ў паўстанні. Я. Ясінскі.
6. Ідэалагічная падрыхтоўка паўстання (звароты Касцюшкі “Да арміі”, “Да грамадзян”, “Да духавенства”, “Да жанчын”).
7. Пачатак ваенных дзеянняў. Паўстанне ў Варшаве.
8. Ход паўстання на Літве (Шавельскі акт) і Беларусі (Віленскі акт).
9. Паланецкі ўніверсал Касцюшкі.
10. Ваенная і палітычная сітуацыя на пачатку чэрвення. Баявы дзянні ў ліпені-верасні 1794 года.
11. Бітва пад Мацяёвіцамі. Захоп у палон Касцюшкі.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

12. Канец паўстання і яго вынікі.
13.Трэці падзел Рэчы Паспалітай (1795 г.) і ліквідацыя Рэчы Паспалітай як самастойнай дзяржавы.
14.Паўстанне 1794 года пад кіраўніцтвам Касцюшкі – трагічная старонка нашай гісторыі.

КРУГЛЫ СТОЛ:

Пытанні для абмеркавання:

1. Дуалізм у кіранаўніцтве як адна з прычын паражэння паўстання.
2. Адносіны памешчыкаў і сялян да паўстання (Паланецкі ўніверсал і неадназначныя адносіны да яго памешчыкаў і сялян).
3. Тадэвуш Касцюшка – знакавая асоба паўстання (уласная характарыстыка).
4. Асноўныя прычыны паражэння.
5. Наступствы падзей 1794 г. для Усходняй Еўропы.
6. Хто, на вашу думку, галоўны вінаўнік пагібелі Рэчы Паспалітай?

Рэгламент для даклада – 5-7 хвілін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

КАНТРОЛЬНЫ БЛОК

ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНА

ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ 1648 – 1861 гг.

1. Айчынная і замежная гістарыяграфія ваенных падзей у Беларусі (1648-1651 гг.)
2. Перадумовы сацыяльнага выбуху. Баявыя дзеянні казацка-сялянскіх атрадаў на поўдні і паўднёвым Захадзе Беларусі. Характар вайны.

3. Белацаркоўскі дагавор 1651 г. Вывад казацкіх загонаў з Беларусі на Украіну. Прычыны паражэння сялянства і гарадкога плебса.
4. Узмацненне каталіцкай рэакцыі і паланізацыя ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст.
5. Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай (1654-1667 гг.). Гістарыяграфія пытання.
6. Галоўныя прычыны і пачатак руска-польскай вайны (1654-1667 гг.).
7. Асноўныя этапы ваенных дзеянняў на беларускіх землях. Контрнаступ Януша Раздзівіла. Асада Магілёва. Кейданская унія. Падзенне Вільні.
8. Палітыка маскоўскага ўрада на беларускіх землях пад час руска-польскай вайны. Канфісійнае пытанне. Дэпартацыя насельніцтва Беларусі ў Расію.
9. Рух народнага супраціву. Антыфеадальны характар народных паўстанняў на Беларусі 1654-1667 гг.).
10. Андрусава: вынікі вайны 1654-1667 гг.
11. Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай. Афармленне ідэалагічнай дактрыны “залатая вольнасць”, складванне комплекса прывелеяў шляхты ў канцы XVI ст.
12. Грамадзянская вайна канца XVII – пач. XVIII ст.
13. Галоўныя прычыны і пачатак Паўночнай вайны.
14. Рускія і шведскія войскі на землях Беларусі. Канфесійная палітыка Пятра I.
15. Бітва 1708 г. пад Лясной. Вынікі Паўночнай вайны для Беларусі і для Рэчы Паспалітай. “Нямы” сойм.
16. Галоўныя перыяды ў гаспадарчым развіцці Беларусі ў другой палове XVII-XVIII ст. Асноўныя групы сялянскіх павіннасцей, іх эвалюцыя.
17. Паўстанне сялян пад кіраўніцтвам В.Вашчылы ў Крычаўскім старостве. Паўстанне на Каменшчыне. Параўнальная характарыстыка.
18. Новыя рысы ў развіцці гарадоў і мястэчак у пач. XVIII ст. Сацыяльная барацьба гараджан.
19. Абвастрэнне палітычнага крызіса ў сярэдзіне XVIII ст. Барацьба магнацкіх груповак. Соймы 1766-1668 гг. Пытанне аб дысідэнтах. Таруньская, Радамская, Слуцкая, Барская канфедэрацыі.
20. Далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі (1772-1795 гг.). Гістарыяграфія пытання.
21. Палітычнае становішча Рэчы Паспалітай напярэдадні першага падзелу. Першы падзел Рэчы Паспалітай.
22. Тэрытарыяльныя і сацыяльна-эканамічныя рэформы Кацярыны II на далучаных паводле першага падзелу беларускіх землях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ажыўленне эканомікі і ўзрастанне дынамікі яе развіцця. Палітыка ў адносінах да гарадоў.

23. Унутраныя рэформы ў Рэчы Паспалітай пасля першага падзелу. Чатырохгадовы сейм. Таргавіцкія канфедэраты. Другі падзел Рэчы Паспалітай.
24. Паўстанне пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі. Якуб Ясінскі. Ход паўстання на Беларусі. Прычыны паражэння. Месца паўстання у айчыннай і сусветнай гісторыі.
25. Трэці падзел Рэчы Паспалітай і галоўныя прычыны распаду дзяржавы.
26. Дзяржаўная палітыка ў адносінах да шляхты, гараджан, сялян, каталіцкай і ўніяцкай царквы на далучаных беларускіх землях..
27. Эканамічная палітыка царызму на далучаных землях (канец XVIII-пачатак XIX ст.) Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Органы ўлады і кіравання.
28. Беларусь у вайне 1812 года. Прычыны и характар вайны. Ход ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі летам 1812 года.
29. Становішча Беларусі ў час вайны. Адносіны насельніцтва да ваюючых бакоў.
30. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі восенню 1812 г. і вынікі вайны для Беларусі.
31. Грамадска-палітычны рух на Беларусі ў пачатку XIX ст. Уплыў на Беларусь грамадска-палітычных падзей у Расіі і нацыянальна-вызваленчага руху ў Польшчы. Віленская асацыяцыя. Стварэнне і дзейнасць тайных таварыстваў. Дзекабрысты.
32. Паўстанне 1830-1831 гг.
33. Грамадска-палітычны рух пасля падаўлення паўстання 1830-1831 гг. Палітыка ўрада на беларускіх землях пасля паўстання 1830-1831 гг.
34. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў першай палове XIX ст. Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Рэформы П.Кісялёва.
35. Музыка і тэатр на Беларусі ў другой палове XVII-XVIIIстст.
36. Выяўленчае мастацтва і скульптура Беларусі ў другой палове XVII-XVIIIстст.
37. Дойлідства і горадабудаванне на Беларусі ў другой палове XVII-XVIIIстст.
38. Грамадска-палітычная думка на Беларусі ў другой палове XVII—XVIII стст.
39. Адукацыя ў другой палове XVII-XVIII стст. Дзейнасць каталіцкіх ардэноў.
40. Палітыка царызму ў адносінах да адукацыі і беларускай культуры ў канцы XVIII - першай палове XIX ст.
41. Грамадска-палітычная думка ў першай палове XIX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

42. Рост гарадоў і мястэчак Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Колькасны, саслоўны і нацыянальна-канфесійны склад гарадскога насельніцтва.
43. Развіццё навуковых даследаванняў на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Узмацненне цікавасці да гісторыі, быту і культуры Беларусі.
44. Беларуская літаратура ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.
45. Музычная і тэатральная творчасць на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Нясвіжскі тэатр XVIII ст.
46. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.
47. Архітэктура і скульптура на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

СУПРАВАДЖАЛЬНЫ БЛОК

Гласарый

“Станаўленне буржуазнага грамадства ў Беларусі. Фарміраванне беларускай нацыі (1861 – 1900 гг.)”

Буржуазныя рэформы і іх значэнне для развіцця Беларусі

Гістарыяграфія і крыніцы па праблемах капіталістычнага развіцця Беларусі. Адмена прыгоннага права. Ініцыятыва дваранскіх камітэтаў Віленскай, Гродзенскай і ковенскай губерняў і пачатак падрыхтоўкі рэформы.Маніфест і “Палажэнні” 19 лютага 1861 г. Спецыфіка мясцовых “Палажэнняў” для Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губерняў.

Новы парадак кіравання сялянамі. Правы сялян. Умовы надзялення іх зямлёю. “Часоваабавязанае становішча”. Уздым сялянскага руху. Змены ў рэалізацыі рэформы, звязаныя з паўстаннем 1863 г. Рэформы аграрных адносіндзяржаўных сялян і іншых катэгорый сельскага насельніцтва. Вынікі і значэнне сялянска-аграрных рэформ.

Ваенная, земская, судовая, гарадская, цэнзурная, школьная рэформы. Буржуазная сутнасць рэформ, іх непаслядоўнасць і абмежаванасць. Выключэнне з агульнага заканадаўства і дадатковыя абмежаванні, што датычыліся тэрыторыі Беларусі і Літвы. Іх прычыны. Увядзенне інстытута земскіх начальнікаў і адміністрацыйнага земства.

Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі ў другой палове XIX ст.

Развіццё сельскай гаспадаркі. Цяжкасці перабудовы гаспадаркі на капіталістычны лад. Кабальныя адработкі. Паглыбленне крызісу памешчыцкай гаспадаркі. Скарачэнне дваранскага землеўладання і рост

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бессаслоўнай зямельнай уласнасці. Асаблівасці гэтага прафэсу ў Беларусі. Аграрны крызіс 80-х гадоў і яго ўплыў на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі. Галоўныя накірункі спецыялізацыі.

Транспарт, гандаль і крэдыт. Будаўніцтва чыгунак. Важнейшыя чыгуначныя лініі ў Беларусі. Іх уплыў на развіццё сельскай гаспадаркі і гандлю. Дзейнасць Дзяржаўнага, Сялянскага, Дваранскага і іншых банкаў у Беларусі. Абмежаванне ў адносінах да памешчыкаў "польскага паходжання".

Развіццё прамысловасці і рост гарадоў.Спецыялізацыя беларускай прамысловасці. Яе галіновая структура. Высокая ўдзельная вага дробнай вытворчасці. Замаруджаныя тэмпы пераходу да машыннай вытворчасці (фабрыкі). Прамысловае развіццё гарадоў і мястэчак. Прамысловасць у сельскай мясцовасці.

Вызваленчая барацьба

Паўстанне 1863- 1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. Рэвалюцыйныя дэмакраты і шляхецкія рэвалюцыянеры. К. Каліноўскі. Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК). "Чырвоныя" і "белыя". Праграма памяркоўных "чырвоных" і К. Каліноўскага. "Мужыцкая праўда". Узаемаадносіны ЛПК і Варшаўскага Цэнтральнага камітэта. Кантррэвалюцыйны пераварот у Вільні. Пратэст К. Каліноўскага. Рэакцыя на паўстанне ў Расіі. Партызанская тактыка паўстанцаў. Асаблівасці паўстання ў Заходняй і Усходняй Беларусі. "Мураўёўшчына" як праяўленне царска-дваранскай рэакцыі ў Беларусі. М. М. Мураўёў і яго дзейнасць у краі. Вяртанне К. Каліноўскага да кіраўніцтва паўстанне. Падаўленне паўстання. "Лісты з-пад шыбеніцы" К. Каліноўскага. Вынікі і значэнне паўстання.

Сялянскі і рабочы рух. Народніцкія гурткі. Пачатак прапаганды марксізму. Становішча сялян. Формы і дынаміка сялянскага руху і барацьбы рабочых. Сацыяльнае аблічча ўдзельнікаў рабочага руху, іх патрабаванні. Ідэалогія і практыка народнікаў. М. Судзілоўскі, С. Кавалік, Р. Ісаеў, І. Грынявіцкі, Г. Гельфман. Народніцкія гурткі ў Беларусі. Характар і асаблівасці народніцтва 80 – 90-х гадоў у Беларусі. Ідэйна-арганізацыйны крызіс народніцтва. Пачатак прапаганды марксізму ў Беларусі. Першыя сацыял-дэмакратычныя гурткі. Э. Абрамовіч, І. Гурвіч, В. Сяліцкі, С. Трусевіч.

РЕПОЗІТОРЫЙ БГПУ

Утварэнне рабочых саюзаў. І з’езд РСДРП. Пераход сацыял-дэмакратаў да масавай агітацыі.”Віленская праграма”. А. Крэмер, Ю. Мартаў, Я. Спонці. Статачныя касы. Мінская, Віцебская, Гродзенская , Брэсцкая і іншыя рабочыя арганізацыі. Утварэнне “Рабочага саюза Літвы” і Бунда. “Рабочая партыя палітычнага вызвалення Расіі”.

Утварэнне сацыял-дэмакратыі каралеўства Польскага і Літвы. Уздым рабочага руху ў другой палове 90-х гадоў. Асноўныя патрабаванні рабочых. Першыя палітычныя выступленні рабочых.

Фарміраванне беларускай нацыі.

Культура Беларусі ў 60 – 90 гг.

Гістарыяграфія пытання. Аналіз крыніц. Гістарычныя ўмовы развіцця беларускай культуры ў другой палове XIX ст. і ўтварэнне беларускай нацыі. Этнічная тэрыторыя беларусаў, нацыянальны склад насельніцтва па губернях і паветах. Асаблівасці саслоўнага і рэлігійнага складу, заняткаў беларускага, рускага, польскага, яўрэйскага і татарскага насельніцтва Беларусі, яго размяшчэнне ў гарадах і сельскай мясцовасці. Каланіяльная, русіфікатарская палітыка царызму на тэрыторыі Беларусі ў сацыяльна-эканамічным, палітычным і культурным жыцці. Абмежавальныя законы ў адносінах да польскага, яўрэйскага насельніцтва Беларусі. Развіццё капіталістычнага рынку. Пераўтварэнне рабочай сілы ў тавар. Распад саслоўнай структуры. Фарміраванне і нацыянальны склад пралетарыяту і буржуазіі. Слабасць эканамічных пазіцый беларускай нацыянальнай бкржуазіі як вызначальны фактар яе адносін да палітыкі царызму і беларускага нацыянальнага руху. Фарміраванне агульных нацыянальных прыкмет.

Этнічная і нацыянальная самасвядомасць. Станаўленне беларускай літаратурнай мовы. Развіццё мастацкай літаратуры. Творчасць Ф. Багушэвіча, А. Гурыновіча, Я. Лучыны, К. Каганца і інш. Беларускае пытанне ў паўстанні 1863 г. Пазіцыя К. Каліноўскага. Тэарэтычныя распрацоўкі беларускага нацыянальнага пытання. Газета “Мінскі лісток”. Студэнцкія арганізацыі ў Маскве і Пецярбургу. Брашура “Дзядзька Антон”. Рост легальных публікацый на беларускай мове ў 90-ыя гады. Асаблівасці нацыянальна-культурнага руху.

Асвета. Пачатковая і сярэдняя адукацыя. Тыпы і колькасць школ. Афіцыйны друк. Прапаганда ідэалогіі “заходнерусізму”. Беларускі фальклор.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Быт і матэрыяльная культура, звычаі, абрады, мараль народаў Беларусі. Этнаграфічныя і гістарычныя даследаванні. Музыка і тэатр.

Градабудаўніцтва і архітэктура. Змяненне выгляду беларускіх гарадоў. Сядзібная архітэктура: панаванне эклектызму. Імітацыя старадаўніх феадальных рэзідэнцый. Канец сядзібнага будаўніцтва.

Жывапіс. Творчая дзейнасць мастакоў Расіі, Польшчы, Літвы, Украіны ў Беларусі, іх уплыў на развіццё выяўленчага мастацтва. Вядучая роля гістарычнага жанру: К. Альхімовіч – найбольш вядомы гістарычны жывапісец Беларусі. Развіццё бытавога жанру, краявіду і партрэта. Творчая дзейнасць Н. Сільвановіча, У. Дмахоўскага, Б. Русецкага, А. Ромера і інш. А. Гараўскі – найбольш яскравы прадстаўнік пейзажнага жывапісу другой паловы XIX ст. Творчасць яго брата І. Гараўскага. Уплыў прадстаўнікоў рускага перадвіжніцтва В. Пярова і І. Крамскога на творчасць беларускіх мастакоў.

Графіка. Падзеі паўстання 1863 – 1864 гг. у творчасці А. Андрыёлі, А. Гротгера. Ф. Дмахоўскі – аўтар малюнкаў-гербаў беларускіх гарадоў і літаграфічных партрэтаў беларуска-літоўскіх князёў. Адлюстраванне жыцця і побыту беларускіх сялян у творчасці А. Ромера і М. Мікешына. Шматнацыянальны характар культуры ў Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вучэбны блок

Буржуазные рэформы другой половы XIX ст.

Прыкладны план

1. **Становішча і падрыхтоўка да адмены прыгоннага права**
2. **Ажыццяўленне адмены прыгоннага права ў Беларусі**
3. **Рэформы для дзяржаўных сялян, вольных людзей і інш. Катэгорый сялянства**
4. **Рэформы 60 – 70 гг. XIX ст. у Беларусі**
5. **Контррэформы ў 80 – 90 гг. XIX ст.**

Адмену прыгоннага права ў Расіі абумовілі дзве галоўныя прычыны: існаванне прыгонніцтва стрымлівала эканамічнае развіццё дзяржавы; узрастанне_антыпрыгонніцкага руху, перш за ўсё сярод сялянства, пагражала моцным сацыяльным выбухам. Ва ўрадавых колах у рэшце рэшт зразумелі, што час адмены прыгоннага права наспеў і гэта лепш зрабіць «зверху». Рэформу вы-рашана было пачаць з заходніх губерняў. 20 лістапада1857 г. Аляксандр II падпісаў і накіраваў рэскрыпт (прадпісанне) на імя У. І. Назімава аб заснаванні ў Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай губернях з прадстаўнікоў мясцовых памешчыкаў трох__губернскіх камітэтаў і адной агульнай камісіі ў Вільні для падрыхтоўкі мясцовых праектаў паляпшэння быту намешчыцкіх сялян. Крыху назней падобныя камітэты былі створаны і ў іншых губернях Расіі.

19лютага1861г.Аляксандр II зацвердзіў заканадаўчыя акты (усяго іх бы-ло17),якія тычыліся адмены прыгоннага права, і звярнуўся да народа з “Маніфес- там».У адпаведнасці з «Маніфестам» селянін адразу атрымліваў асабістую свабоду і шэраг грамадзянскіх правоў: ад свайго імя заключаць розныя грамадскія і маёмасныя пагадненні, адчыняць гандлёвыя і прамысловыя прадпрыемствы, пераходзіць у іншыя саслоўі. Агульныя «Палажэнні» ўводзілі новую сістэму кіравання вёскай. Сяляне**,** якія жылі на зямлі аднаго памешчыка, складалі сельскую грамаду (абшчыну). На сходзе сельскай абшчыны выбіраўся староста. Некалькі сельскіх абшчын, якія адносіліся да аднаго царкоўнага прыходу, стааралі воласць. На валасным сходзе сельскія старасты і ўпаўнаважаныя

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

ад кожных 10 двароў выбіралі валасное праўленне, валаснога старшыню і суддзю. Сельскія і валасныя праўленні займаліся раскладкай і зборам падаткаў, выконвалі распараджэнні мясцовых улад, рэгулявалі пазямельныя адносіны сялян, сачылі за парадкам у вёсцы. За своечасовае выкананне ўсіх павіннасцей сяляне неслі адказнасць на аснове кругавой арукі, а валасны суд дзейнічаў паводле норм і традыцый звычаёвага права.

Для непасрэднага правядзення рэформы на месцах ствараліся спецыяльныя органы - па-вятовыя міравыя з'езды і губернскія па сялянскіх справах установы. Кантроль за дзейна- сцю гэтых органаў неслі губернатары. Першай інстанцыяй па ўрэгуляванню адносін паміж сялянамі і памешчыкамі з'яўляліся міравыя пасрэднікі, якія прызначаліся з мясцовых дваран. Асноуным абавязкам міравых пасрэднікаў было садзейнічанне складанню ўсстаўных грамат - нарматыўных актаў, дзе вызначаліся пазямельныя адносіны сялян і памешчыкаў. На складанне і падпісанне ўстаўных грамат адводзілася два гады.

Пазямельнае ўладкаванне сялян Беларусі ажыццяўлялася на аснове двух мясцовых «Палажэнняў». У Магілёўскай і Віцебскай губернях, дзе захавалася абшчыннае землекарыстанне, устанаўліваліся вышэйшыя (ад 4 да 5,5 дзесяціны) і ніжэйшыя (ад 1 да 2 дзесяцін) памеры сялянскіх надзелаў. Калі да рэформы ў селяніна зямлі было звыш вышэйшай нормы, то памешчык меў права адрэзаць лішак на сваю карысць. У_Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губернях існавала падвор'нае землекарыстанне. Тут сялянам пакідаўся іх дарэформённы надзел. Адрэзкі дазвалялася рабіць, калі ў памешчыка заставалася меней за '/з усёй зямлі, але сялянскі надзел не мог быць скарочаны больш чым на 1/6 частку. Да правядзення_выкупной аперацыі сяляне лічыліся часоваабавязанымі і за карыстанне атрыманай зямлёй павінны былі адбываць паншчыну або плаціць памешчыку аброк.

Свой палявы надзел зямлі сяляне выкупалі ва ўласнасць. Правілы выкупной аперацыі былі аднолькавыя для ўсёй Расіі. Выкупная сума вызначалася_праз 6 - працэнтную капіталізацыю гадавога аброку. Напрыклад. калі аброк з сялянскага надзелу складаў 6 р. у год, то агульная сума, якую селяніну трэба было заплаціць, складала 100 р. (6 р.— 6 %, 100 % — 100 р.). Ад_20 да 25 % гэтай сумы сяляне плацілі непасрэдна памешчыку. Астатнюю частку памешчыкі атрымлівалі ад дзяржавы ў выглядзе каштоўных папер, якія можна было прадаваць ці закладваць. У выніку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

такой аперацыі сяляне станавіліся даўжнікамі дзяржавы і на працягу 49 гадоў павінны былі выплачваць выкупныя плацяжы разам з працэнтамі за пазыку. Такім чынам, агульная сума, якую сялян прымушалі заплаціць за зямлю, значна перавышала рыначны кошт гэтай зямлі (у Беларусі — у 3—4 разы). Атрымлівалася, што сяляне выкупалі не толькі зямлю, але і кампенсавалі памешчыкам страту іх уласнасці над асобай селяніна.

Істотныя змены ў ажыццяўленне сялянскай рэформы на Беларусі ўнесла паўстанне 1863—1864 гг.: спынялася часоваабавязанае становішча сялян і ўводзіўся абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў; выкупныя плацяжы зніжаліся на 20 %; былі створаны павятовыя камісіі для праверкі і выпраўлення ўстаўных грамат; абеззямеленым у 1846—1856 гг. сялянам выдаваўся 3-дзесяцінны сямейны надзел і ў поўным аб'ёме вярталася зямля, адабраная з 1857 г.; у адпаведнасці з законам 1867 г. дзяржаўныя сяляне на Беларусі пераводзіліся з аброку на выкуп і станавіліся ўладальнікамі сваіх надзелаў.

Інакш складваўся лёс дзяржаўных сялян, большасць якіх пражывала ў Гродзенскай і Віленскай губернях. У 1857 – 1862 гг. на свабодных і адабраных у дзяржаўных сялян землях былі створаны фермы. Янны аддаваліся прыватным асобам у арэнду за вызначаную плату. Адначасова памер аброку за карыстанне зямлёй павышаўся амаль на ¼. Гэта выклікала незадавальненне, што абумовіла больш актыўны ў параўнанні з памешчыцкімі сялянамі удзел у паўстанні 1863 – 1864 гг. Таму ў 1867 г. уступіў у сілу асобны зыкон для дзяржаўных сялян. Па ім аброк, які яны плацілі за зямлю, павялічваўся на 10 % і ператвараўся ў абавязковыя выкупныя плацяжы. Дзяржаўныя сяляне пераводзіліся ў разрад зямельных уласнікаў. У выніку зямельныя надзелы дзяржаўных сялян перавысілі надзелы памешчыцкіх на 17 – 37 %. Аграрныя рэформы для вольных людзей, аднадворцаў, стараверaў і інш. праводзіліся пасля адмены прыгону. Гэта паўплывала на умовы іх вызвалення. Урад падтрымаў памешчыкаў. Умовы вызвалення гэтых катэгорый сялян аказаліся значна горшымі, чым памешчыцкіх і дзяржаўных.

Рэформа 1861 г. выклікала расчараванне сялян. В 1861 г. адбылося каля 400 сялянскіх хваляванняў. Сяляне сарвалі двухгадовы тэрмін падпісання устаўных грамат. На 1 студзеня 2863 г. амаль 4/5 гэтых грамат было не падпісана. Адмена прыгону з’явілася як бы мяжой паміж дзювума эпохамі: феадалізмам і капіталізмам. Прыгонные

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сяляне атрымалі асабістую свабоду. Вызваленне памешчыцкіх сялян з-пад прыгону стварыла неабходны для развіцця капіталістычнай вытворчасці рынак наёмнай рабочай сілы, аднак рэформа была палавінчатай, яна пакінула шматлікія прыгонніцкія пражыткі, у першую чаргу памешчыцкае землеўладанне (дваранскае землеўладанне – 50,3 %; сялянскія надзелы – 33,4 %).

Буржуазныя рэформы 60—70-х гг. і контррэформы контррэформы 80— 90-х гг.

Рэформа 1861 г. ліквідавала галоўную перашкоду, што стрымлівала развіццё капіталізму ў Расіі,- прыгоннае_права. Аднак гэтага было недастаткова. Каб рухацца да сапраўды буржуазнага грамадства, Расіі былі патрэбны іншыя рэформы дзяржаўна-палітычнага ладу. У 60—70-я гг. урад Аляксандра II прыняў шэраг пастаноў аб правядзенні такіх рэформ: земскай, судовай, гарадской, ваеннай, у галіне народнай адукацыі і друку.

Самай радыкальнай была судовая рэформа (20 лістапада 1864 г.). Новы суд будаваўся на бессаслоўных прынцыпах. Былі абвешчаны нязменнасць суддзяў, незалежнасць суда ад адміністрацыі, вусны характар, спаборнасць і галоснасць судовага працэсу. Пры разглядзе крымінальных спраў прадугледжваўся удзел у судовым працэсе прысяжных. засядацеляў, ствараўся інстытут прысяжных павераных (адвакатаў). Папярэдняе следства забіралася ад паліцыі і перадавалася судовым следчым. Значна скарачалася сістэма судаводства. На Беларусі судовая рэформа пачалася толькі ў 1872 г. з увядзення міравых судоў. Аднак міравыя суддзі тут не выбіраліся, як прадугледжвалася законам, а назначаліся міністрам юстыцыі. Акруговыя суды, прысяжныя засядацелі і прысяжныя павераныя з'явіліся ў заходніх губернях толькі ў 1882 г. Спіс прысяжных засядацеляў таксама зацвярджаўся уладамі. Усё гэта было вынікам паўстання 1863—1864 гг.— самадзяржаўе не давярала польскім памешчыкам, якія пераважалі ў краі. Земская рэформа, прынятая 1 студзеня 1864 г., нрадугледжвала стварэнне ў паветах і губернях выбарных устаноў (земстваў) для кіраўніцтва мясцовай гаспадаркай, народнай адукацыяй, медыцынскім абслугоўваннем насельніцтва і іншымі справамі непалітычнага характару. Але ў Беларусі ў сувязі з падзеямі 1863—1864 гг. уводзіць выбарныя ўстановы ўрад не адважыўся.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Са спазненнем на 5 гадоў у Беларусі была праведзена гарадская рэформа (прынята ў 1870 г., а пачалася ў 1875 г.). Яна абвяшчала прынцып усесаслоўнасці пры выбарах органаў гарадскога самакіравання — гарадской думы і гарадской управы. Але высокі маёмасны цэнз выключаў з удзелу ў выбарах большую частку жыхароў горада і даваў уладу купцам, прадпрымальнікам, уладальнікам нерухомасці.

Ваенная рэформа пачалася ў 1862 г., калі былі ўтвораны 15 ваенных акруг (у тым ліку і Віленская, у якую ўвайшлі ўсе беларускія губерні) і скарочаны тэрмін службы да 7—8 гадоў.

У 1874 г. з увядзеннем усеагульнай воінскай павіннасці ў Расіі былі рэалізаваны буржуазныя прынцыпы камплектавання арміі. Усе мужчыны з 20-гадовага ўзросту павінны былі служыць у войску (выключэнне рабілася толькі для карэннага насельніцтва Сярэдняй Азіі, Казахстана, Сібіры і Поўначы). Тэрмін службы паніжаўся да 6 гадоў у сухапутных войсках і 7 — на флоце. Уводзіліся ільготы для людзей, якія мелі адукацыю. Тыя, хто скончыў вышэйшыя навучальныя ўстановы, служылі 6 месяцаў, гімназіі — 1,5 года, гарадскія вучылішчы — 3 гады, пачатковыя школы — 4 гады.

Буржуазны характар насілі таксама школьная (1864 г.) і цэнзурная (1865 г.) рэформы. Школа абвяшчалася ўсесаслоўнай, павялічвалася колькасць пачатковых школ, уводзілася пераемнасць розных ступеняў навучання. Новы цэнзурны статут значна пашыраў магчымасці друку.

Пасля забойства нарадавольцамі імператара Аляксандра II у 1881 г. ва ўнутранай палітыцы Расіі адбыліся значныя змены. 80 -90-я гг. увайшлі ў гісторыю як перыяд контррэформаў.

Першымі ахвярамі сталі друк і школа. У 1882 г. быў устаноўлены жорсткі адміністрацыйны нагляд за газетамі і часопісамі У 80-я гг. урадам прымаецца шэраг пастаноў, якія ўводзілі шмат абмежаванняў у сістэму адукацыі. У 1882 г. - было зацверджана новае «Гарадское палажэнне», якое рэзка павышала маёмасны цэнз пры выбарах органаў гарадскога самакіравання і ўзмацняла над ім кантроль з боку ўрадавай адміністрацыі. Становішча ў Беларусі ўскладнялася яшчэ і тым, што тут дзейнічалі розныя абмежаванні ў дачыненні да польскага (каталіцкага) і яўрэйскага (іудзейскага) насельніцтва. У 1865 г. паля-кам дазвалялася мець маёнткі толькі па

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спадчыне. Польскія памешчыкі пазбаўляліся магчымасці карыстацца льготнымі пазыкамі Дваранскага банка. З канца XVIII ст. Беларусь уваходзіла ў «мяжу яўрэйскай аселасці». Яўрэям было забаронена сяліцца за межамі гарадоў і мястэчак, арандаваць і купляць зямлю. У пачатку 90-х гг. у Беларусь была выселена значная колькасць яўрэяў з гарадоў Цэнтральнай Расіі, у выніку чаго была створана штучная перанаселенасць беларускіх гарадоў. Яўрэяў не прымалі на работу ў дзяржаўныя ўстановы, паліцыю, на афіцэрскія пасады ў арміі, на чыгуначны транспарт. Існавала працэнтная норма прыёму яўрэяў у сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы.

У сістэме народнай асветы насаджаліся царкоўна-прыходскія школы і школы граматы, падпарадкаваныя праваслаўнаму духавенству. Цыркулярам міністра асветы (1887 г.) забаранялася прымаць у гімназіі дзяцей кухарак, прачак, дробных гандляроў і інш..

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РАЗВІЦЦЁ КАПІТАЛІЗМУ Ў ЭКАНОМІЦЫ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

Прыкладны план

1. **Сельская гаспадарка Беларусі ў 60—90-х гг. XIX ст.**

2. **Развіццё прамысловасці, гандлю, фінансаў, транспарту. Гарады і мястэчкі.**

Рэформа 1861 г., праведзеная ў інтарэсах памешчыкаў, абумовіла «прускі» варыянт развіцця

аграрнага капіталізму ў Расіі. У Беларусі яго рысы былі яшчэ больш выразныя, таму што тут памешчыцкае землеўладанне не толькі пераважала, але| мела, па сутнасці, латыфундыяльны характар. Буйныя памешчыкі валодалі дзесяткамі і сотнямі тысяч дзесяцін зямлі, а сялянскія надзелы складалі ў сярэднім ад 2 да 5 дзесяцін на мужчынскую душу.

Пераход да капіталістычнага земляробства ў Беларусі адбываўся паступова. На змену прыгонніцтву спачатку прыйшла змешаная_сістэма гаспадаркі**,** у якой перапляталіся феадальныя і капіталістычныя формы гаспадарання. Феадальныя рысы ў сельскай гаспадарцы праяўляліся ў выглядзе адпрацовак. Адпрацовачная сістэма была найбольш распаўсюджана ў Віцебскай і Магілёўскай губернях. Яе сутнасць заключалася ў апрацоўцы памешчыцкай зямлі інвентаром сялян, якія атрымлівалі за гэта ад памешчыка зямельныя ўгоддзі ў арэнду. У Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях памешчыкі шырока выкарыстоўвалі працу наёмных рабочых (гадавых, тэрміновых, падзённых), якія апрацоўвалі зямлю інвентаром уладальніка. Гэта была ўжо капіталістычная форма гаспадарання. Аднак і тут адпрацоўкі займалі значнае месца.

Пасля рэформы 1861 г. сельская гаспадарка Беларусі ўсё шырэй уцягвалася ў рыначныя сувязі. Развіццё капіталізму ў Беларусі адбывалася пад непасрэдным уплывам агульнарасій-скага рынку. Беларусь заставалася галоўным чынам сельскагаспадарчым раёнам, аднак па ўзроўню развіцця каніталізму ў сельскай гаспадарцы яна ішла наперадзе многіх раёнаў Расіі. Хутчэй складваліся капіталістычныя адносіны ў Віленскай, І родзенскай і Мінскай губернях, дзе пераважала

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

падвсрнае землекарыстанне. Гэтыя губерні знаходзіліся ў больш спрыяльным становішчы ў параўнанні і Віцебскай і Магілёўскай адносна рынку збыту сельскагаскагаспадарчай прадукцыі. Ў выніку малазямелля сялян таварная вытворчасць іх гаспадарак была вельмі нізкай, таму асноўнымі пастаўшчыкамі таварнай прадукцыі ў Беларусі былі памешчыкі. Шмат памешчыцкіх гаспадарак, асабліва на захадзе і ў цэнтры Беларусі перайшло на капіталістычны шлях развіцця, у іх адкрываліся вінакурныя, цагельныя, смалакурныя заводы, млыны, лесапільні. Разам з тым многія памешчыкі самі не вялі гаспадарку, а здавалі зямлю ў арэнду.

Аб развіцці капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі можа сведчыць паступовая спецыялізацыя сельскагаспадпрчай вытворчасці. У першыя два дзесяцігоддзі пасля рэформы важней-шнй галіной гандлёвага земляробства заставалася вытворчасць збожжа. Аднак у выніку сусветнага аграрнага крызісу 80— 90 х гг. цэны на яго рэзка пнанізіліся (толькі за 80-я гг. больш чым у 2 разы). Гэта прымусіла беларускіх памешчыкаў пераходзіць на вытворчасць такіх прадуктаў, якія давалі большы прыбытак.

У 90-я гг. галоўнай спецыялізаванай галіной у сельскай і гаспадарцы Беларусі стала малочная жывёлагадоўдя. 3 1883 да I900г. колькасць буйной рагатай жывёлы ў памешчыцкіх гаспадарках Беларусі выросла амаль удвая. Дзякуючы вялікаму попыту малочныя прадукты мелі пастаянны збыт у Цэнтральнай Расіі, Польшчы, Прыбалтыцы. Важным відам гандлёвага прадпрымальніцтва ў памешчыцкіх гаспадарках Беларусі было вінвкурэнне. З сярэдзіны 60-х гг. у памешчыцкіх гаспадарках інтэнсіўна развівдлася свінагадоўля. У Мінскай і Гродзенскай губернях значнага развіцця дасягнула танкарунная авечкагадоўля. Спецыялізацыя памешчыцкай гаспадаркі і павелічэнне яе рыначных сувязей асабліва выразна праявілася ў пашырэнні вытворчасці тэхнічных культур. Сярод іх першае месца займала бульба._Плошча пад яе за 1881 —1899 гг. узросла ў 2,5 раза. Другое месца займаў лён, за гэты ж час плошча пад лён павялічылася на 48,5 %. Яго вытворчасць, асабліва ў Віцебскай губерні, мела пераважна гандлёвы характар. Значнае месца ў канцы XIX ст. у беларускіх губернях займала прамысловае садоўніцтва і агародніцтва. Беларусь разам сз прыбалтыйскімі губерніямі стала раёнам, які спецыялізаваўся на вытворчасці малочных прадуктаў. Важным відам капіталістычнага прадпрымальніцтва стала вінакурэнне. Пасевы бульбы выраслі больш

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

як утрая. У пачатку XX ст. на Беларусь прыпадала амаль 17 % усёй плошчы, занятай бульбай у еўрапейскай частцы Расіі. У Мінскай, Гродзенскай, Віленскай губернях было пашырана бульбаводства. У Віцебскай і на паўночным усходзе Віленскай губерні спецыялізаваліся на вырошчванні льну. На Магілёўшчыне вырошчвалі каноплі. У Гродзенскай і Мінскай губернях у 60 – 80 гг. развівалася танкарунная авечкагадоўля.

Разам з тым да пачатку XX ст. перабудова сельскай гаспадаркі Беларусі на капіталістычны лад яшчэ далёка не завяршылася. 3-за перавагі памешчыцкай уласнасці тут не склалася развітая сялянская заможная гаспадарка. У канцы XIX ст. сярод сялян беднякоў было 61 %, сераднякоў — 28%, заможных сялян — толькі 11%.

Прамысловасць Беларусі развівалася ў цеснай сувязі з агульнарасійскай, але мела і свае асаблівасці. Характэрнай рысай прамысловага развіцця Беларусі ў другой палове XIX ст., разам з адносна хуткім ростам фабрычнай індустрыі, было распаўсюджанне дробнай вытворчаеці і мануфактур, пераважна невялікіх фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў. Пасля рэформы 1861г. паскараецла рост і павялічваецца аб'ём прадукцыі рамеснай і мануфактурнай вытворчасці. Рамесныя прадпрыемствы былі заснаваны на ручной працы. Перш за ўсё гэта былі промыслы, якія выкарыстоўвалі мясцовую сыравіну: сталярны, ганчарны, кушнерскі, шавецкі, ткацкі. Рамесная вытворчасць канцэнтравалася ў гарадах і мястэчках. У пачатку XX ст. рамяство давала 37,8_%_прадукцыі ўсёй прамысловасці Беларусі. Мануфактуры ўзнікалі з сялянскіх промыслаў і гарадскога рамяства. Тут выкарыстоўвалася ручная праца, але існаваў яе падзел па спецыяльнасцях. У канцы XIX ст. мануфактуры пераважалі ў гарбарнай, ганчарнай, цагельнай, суконнай, шкляной і тытунёвай вытворчасці і давалі 15,4 % валавой прамысловай прадукцыі Беларусі.

Нягледзячы на вялікую долю рамеснай і мануфактурнай нытворчасці, на працягу другой паловы XIX ст. у прамысловасці Беларусі ішоў працэс пераходу ад ручной працы да ма-шыннай. Рамяство і мануфактуру паступова выцясняе капіталістычная фабрыка. Калі ў 1860 г. на Беларусі дзёйнічала толькі 76 фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў, то ў 1900 г. іх было ўжс 1137. У канцы стагоддзя фабрычна-заводская прамысловасць давала 46,8 % валавога прадукту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Самым буйным прадпрвемствам было тытунёвая фабрыка Шарашэўскага, заснаваная ў 1862 г. (1400 – 1500 рабочых). У 1900 г. 2/3 фабрык і заводаў знаходзіліся ў мястэчках і маёнтках.

Значна адставала Беларусь ад РасіI па ўзроўню канцэнтрацыі вытворчасці. Дробныя прадпрыемствы (да 50 рабочых) складалі ў Беларусі 85.5 % усіх фабрык і заводаў. Сярэдні намер прадпрыемствау Беларусі быў у 2,3 раза менш, чым 50 увогуле па Расіі. У Беларусі з-за адсутнасці неабходнай сыравіны вельмі марудна развівалася цяжкая прамысловасць. Пераважнае значэнне тут атрымалі галіны вытворчасці, звязаныя з перапапрацоўкай мясцовай сыравіны. Сярод іх вядучая роля належыла вінакурэнню і лясной прамысловасці. Беларусь была адным з галоўных раёнаў вінакўрэння ў Расіі. Тут у 1890 г. дзейнічала 18% усіх вінакурных заводаў краіны, а іх валавая прадукцыя ў 1900 г. складала 23,5 % усёй прадукцыі прамысловасці Беларусі. Лесапільная прамысловасць стаяла на другім месцы пасля вінакурэння. Аднак фабрычна-заводскія прадпрыемствы занялі тут пануючае становішча толькі ў 90-х гг. Значнае развіццё ў Беларусі атрымалі запалкавая і папярова-кардонная вытворчасць. К пачатку XX ст. беларускія прадпрыемствы давалі 24 % агульнарасійскай вытворчасці дубовых шпал, амаль 24 % - фанеры, да 49 % запалкавай саломкі. Найбуйнейшыя запалкавыя фабрыкі меліся у Пінску, Мазыры, Бабруйску, Барысаве. Папярова-карданная прамысловасць у асноўным размяшчалася ў Магілёўскай і Віцебскай губернях. Найбуйнейшай у галіне была Добрушская папяровая фабрыка, найбуйнейшым са шклозаводаў быў завод “Нёман” у Лідскім павеце. К пачатку XX ст. шклопрадпрыемствы Беларусі давалі 55 % аконнага шкла, якое выраблялася ў Расіі.

Вельмі шмат было ў Беларусі прадпрыемстваў, звязанных з перапрацоўкай сельскагаспадарчай сыравіны: мукамольна-крупяных, крухмальна-патачных, маслабойных, піваварных, тэкстыльных, ільно- і пенькаапрпцоўчых, гарбарных. У другой палове XIX ст. хуткі рост гарадоў і развіццё прамысловага будаўніцтва выклікалі патрэбу ў вялікай колькасці будаўнічых матэрыялаў. У Беларусі атрымала

развіццё, у першую чаргу, вытворчасць цэглы. Існавалі таксама кафляныя заводы і шклозаводы.

Прамысловасць Беларусі пасля рэформы 1861 г. развівалася нераўнамерна. У 80—90-я гг. у Беларусі было ўведзена ў дзеянне

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў у 4 разы больш, чым за папярэднія 20 гадоў.

Значнаму павелічэнню тэмпаў развіцця прамысловасці Беларусі спрыяла стварэнне густой сеткі чыгуначных дарог. Увогуле даўжыня чыгуначнай сеткі ў Беларусі з 1867 да

1904 г. выросла ў 12 разоў. Чыгункі звязалі Беларусь з галоўнымі індустрыяльнымі

цэнтрамі Пецярбургам, Масквой, Кіевам, Варшавай, прыбалтыйскімі гарадамі. Важную ролю ў эканоміцы Беларусі адыгрываў рачны транспарт.У 1898 г. у Віцебску, раней, чым у Маскве і Пецярбургу, быў пушчаны электрычны трамвай. С пачатку XX ст. у якасці грамадскага транспарту выкарыстоўваецца аўтамабіль. У пачатку XX ст. у Мінску было 6 аўтамабіляў – таксі.

У сярэдзіне XIX ст. налічвалася 42 гарады, доля гараджан складала 10 % ад усяго насельніцтва Беларусі. На працягу др. пал. XIX ст. колькасць гараджан выросла ў 2,2 раза і склала ў 1897 г. 655 тыс. чалавек. У канцы стагоддзя толькі два гарады Мінск і Віцебск мелі ад 50 да 100 тыс. чалавек. У значныя прамысловыя цэнтры ператварыліся Мінск, Гомель, Віцебск, Гродна, Брэст і інш. Рост гарадоў суправаджаўся зменай іх сацыяльнай структуры. Да канца XIX ст. сярод гараджан вылучаліся буржуазія і наёмныя рабочыя. Сярод гараджан 53,5 % складалі яўрэі, 17,7 – русскія, 14,5 – беларусы, 11,6 % - палякі. У 1875 г. га заходнія губерні пашырылася гарадская рэформа, па якой у 32 гарадах Беларусі ўводзіліся новыя органы самакіравання – гарадскія думы. Яны выбіраліся на 4 гады згодна з іаёмасным цэнзам. У канцы стагоддзя ў Беларусі налічвалася каля 320 мястэчак, дзе пражывала 680 тыс. чалавек.

Пераважалі дробныя мястэчкі – да 2 тыс. жыхароў, 100 мястэчак мелі насельніцтва ад 2 да 5 тыс.. Паступова страчвалі сваю ролю кірмашы, на змену ім прыходзіў гандаль праз крамы. На яго долю у канцы стагоддзя прыпадала 95 % унутранага гандлёвага абароту гарадоў.Галоўным таварам быў лес, с/г прадукцыя. У 1873 г. Быў створаны першы прыватны Мінскі камерцыйны банк. З 80 – х гадоў пачалі дзейнічаць аддзяленні Дзяржаўнага, Сялянскага пазямельнага, Арлоўскага, Паўднёвага камерцыйных банкаў і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паўстанне 1863 – 1864 гг. ў Польшчы, Літве і Беларусі

1. Прадумовы і падрыхтоўка паўстання

2. Пачатак і ход паўстання ў Літве і Беларусі

3. Падаўленне паўстання, яго вынікі

4. Палітыка царызма ў Беларусі пасля падаўлення паўстання

У шматнацыянальных заходніх губернях Расійскай імперыі амаль самым вострым было польскае пытанне. З часоў падзелу Рэчы Паспалітай польскі патрыятычны рух не даваў спакою расійскім уладам, якія то бізуном, то пернікам спрабавалі ўлагодзіць палякаў. Польскі патрыятычны лагер падзяліўся на дэмакратаў, якія выступалі за паўстанне, і ліберaлаў — прыхільнікаў мірных сродкаў барацьбы.

Тыя, хто быў за паўстанне, атрымалі назву «чырвоныя». Фактычна яны ўяўлялі сабой шырокі і разнастайны дэмакратычны блок, у які ўваходзілі дробная і беззямельная шляхта, афіцэры, дробная гарадская буржуазія, інтэлігенцыя, студэнцтва. Сярод «чырвоных» не было адзінства наконт метадаў дасягнення сваіх мэт. Яны падзяляліся на правых—памяркоўных і левых— прадстаўнікоў рэвалюцыйна-дэмакратычных колаў. Першыя рабілі стаўку на шляхту і асцерагаліся шырокага сялянскага руху. Яны прызнавалі роўнасць нацыянальных правоў беларусаў, літоўцаў, украінцаў з палякамі, але выступалі за адзіную незалежную Польшчу ў межах 1772 г. Правыя прадугледжвалі надзяленне сялян

зямлёй за кошт яе частковай канфіскацыі ў памешчыкаў пры абавязковай грашовай кампенсацыі. Левыя разлічвалі на сялянскую рэвалюцыю. Поспех паўстання, на іх думку, быў гарантаваны толькі ў саюзе і адзінстве дзеянняў з расійскімі рэвалюцыянерамі. Яны прызнавалі права на нацыянальнае самавызначэнне літоўцаў, украінцаў і беларусаў. Аграрнае пытанне планавалася вырашыць шляхам ліквідацыі памешчыцкага землеўладання.

Працiўнікаў паўстання называлі «белымі». Гэта былі пераважна памешчыкі, сярэдняя буржуазія, частка інтэлігенцыі. «Белыя» не жадалі ніякіх сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, катэгарычна адмаўлялі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

права на нацыянальна-палітычнае самавызначэнне літоўцаў, украінцаў і беларусаў. Дабіцца аднаўлення Польшчы ў межах 1772 г. яны хацелі, выкарыстоўваючы націск заходнееўрапейскіх краін на расійскія ўлады. Такія ж палітычныя плыні сфарміраваліся і існавалі не толькі ў Польшчы, але і на тэрыторыі Беларусі і Літвы.

Восенню 1861 г. у Варшаве з разнастайных рэвалюцыйных груповак быў арганізаваны паўстанцкі гарадскі камітэт, перайменаваны ў 1862 г. у цэнтральны нацыянальны камітэт (ЦНК). Камітэт здолеў наладзіць шырока разгалінаваную агульнапольскую арганізацыю. Рэвалюцыйныя сілы Варшавы ўзна.чаліў прадстаўнік левага _крыла «чырвоных» Яраслаў Дамброўскі. З мэтай падрыхтоўкі паўстання ў Беларусі і Літве ўлетку 1862 г. у Вільні быў створаны Літоўскі правінцыяльны камітзт (ЛПК).

«Левых» у Беларусі ўзначальваў Канстанцін Каліноўскі (1838—1864). Ён паходзіў з сям'і збяднелага шляхціца Гродзенскай губерні, скончыў Пецярбургскі універсітэт, актыўна ўдзельнічаў у тайным гуртку польскага рэвалюцыянера З. Серакоўскага. Вярнуўшыся ў 1861 г. на радзіму, К. Каліноўскі пры дапамозе В. Урублеўскага стварыў у Гродне нелегальную рэвалюцыйную арганізацыю з разначыннай інтэлігенцыі, якая мела сувязь з арганізацыямі Вільні, Масквы, Пецярбурга. У 1862—1863 гг. ён разам з

В. Урублеўскім і Ф. Ражанскім выдаў 7 нумароў падпольнай рэвалюцыйнай газеты на беларускай мове «Мужыцкая праўда» (друкавалася лацінкай). Газета была прасякнута рэвалюцыйна-дэмакратычнымі ідэямі, заклікала беларускі народ да ўзброенай барацьбы супраць самадзяржаўя і паноў, ідэалізавала мінулае беларускага народа, паказвала агульнае ў жыцці і марах беларускага і польскага сялянства, заклікала беларускіх сялян падтрымаць польскі нацыянальна-вызваленчы рух, брала пад абарону уніяцкую царкву і заклікала да барацьбы з праваслаўем. Пачынаючы выданне «Мужыцкай праўды», Каліноўскі і яго сябры, выхаваныя на ідэях Герцэна, Дабралюбава і Чарнышэўскага, мелі на мэце перш за ўсё прыцягненне да паўстання сялян, якіх яны лічылі галоўнай рэвалюцыйнай сілай. А каб сяляне лепш зразумелі іх, і была выкарыстана беларуская мова.

Падрыхтоўка да паўстання яшчэ не была завершана, калі ў канцы 1862 г. стала вядома пра намер расійскага ўрада правесці ў Польшчы масавы рэкруцкі набор. Набору падлягалі якраз тыя групы насельніцтва, з якіх вербаваліся члены будучых паўстанцкіх атрадаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гэта паведамленне прымусіла ЦНК прызначыць паўстанне на студзень 1863 г. 22 студзеня 1863 г. ЦНК абвясціў сябе Часовым нацыянальным ўрадам і заклікаў паўстанцкія атрады да нападзення на расійскія войскі ў правінцыяльных гарнізонах. У маніфесце і двух аграрных дэкрэтах Часовага нацыянальнага урада была выкладзена праграма паўстання: Польшча абвяшчалася незалежнай краінай з роўнымі правамі усіх яе грамадзян перад законам, дазвалялася дзейнасць уніяцкай царквы, планавалася перадаць сялянам іх зямельныя надзелы ў поўнае ўладанне, а памешчыкам выплаціць кампенсацыю з дзяржаўнай казны, пасля перамогі было паабяцана надзяліць зямлёй беззямельных удзельнікаў паўстання. Спецыяльны зварот да насельніцтва Беларусі і Літвы заклікаў надтрымаць паўстанне ў Польшчы, але ў ім нічога не гаварылася аб нацыянальна-палітычным самавызначэнні гэтых тэрыторый.

Падзеі ў Варшаве былі нечаканымі для ЛПК, але ён вырашыў падтрымаць польскіх паўстанцаў. ЛПК, перайменаваны ў Часовы ўрад Літвы і Беларусі на чале з

К. Каліноўскім, 1 лютага 1863 г. звярнуўся да насельніцтва Беларусі і Літвы з маніфестам, у якім заклікаў падтрымаць наўстанне ў Польшчы. Каб не парушаць адзінства дзеянняў, ЛПК. вымушаны быў падтрымаць у сваім маніфесце і праграму паўстання, прынятую ў Варшаве.

У студзені — лютым 1863 г. у Беларусі з'явіліся першыя паўстанцкія атрады, якія прыйшлі з Польшчы. Мясцовыя атрады пачалі дзейнічаць у сакавіку— красавіку і былі падначалены Вільні. Яны складаліся з дробнай шляхты, афіцэраў, рамеснікаў, студэнтаў, гімназістаў старэйшых класаў, сялян. Аднак адзінага плана баявых дзеянняў у паўстанцаў не было. Асобныя спробы ўзаемадзеяння паўстанцкіх атрадаў заканчваліся беспаспяхова. Многія з іх былі разбіты ў самым пачатку фарміравання. Паўстанцам не ўдалося авалодаць якімі-небудзь значнымі стратэгічнымі пунктамі. Толькі атрад

Л. Звяждоўскага пры падтрымцы студэнтаў Горы-Горацкага земляробчага інстытута ў красавіку 1863 г. на кароткі тэрмін здолеў захапіць павятовы горад Горкі (Магілёўская губерня). Найбольш актыўна паўстанцы дзейнічалі ў Гродзенскай губерні, дзе ваяводскім камісарам быў К. Каліноўскі.

Паўстанне 1863—1864 гг. адбывалася ва ўмовах нравядзення аграрнай рэформы ў Расіі. Самыя радыкальныя з кіраўнікоў паўстанцкіх атрадаў —

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

В. Урублеўскі, Ф. Ражанскі, М. Чарняк, З. Серакоўскі, А. Мацкявічус, А. Трусаў, Л. Звяждоўскі — спадзяваліся на незадаволенасць сялян умовамі рэформы і імкнуліся прыцягнуць да ўдзелу ў паўстанні як мага больш сялян. Левыя «чырвоныя» ў ЛПК, асабліва К. Каліноўскі, планавалі распаўсюдзіць наўстанне на прыбалтыйскія і расійскія губерні. Але планы рэвалюцыянераў не ажыццявіліся. Сялян сярод паўстанцаў было няшмат, асабліва ва ўсходніх губернях Беларусі: у Віцебскай —- 7 %, Магілёускай — 13 %, Мінскай — 20 %. Толькі ў Віленскай і Гродзенскай губернях сяляне складалі больш за чвэрць паўстанцаў — адпаведна 27 і 33 %. Для сялян Беларусі былі незразумелымі лозунг варшаўскага ЦНК аб адраджэнні Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Не змагла іх задаволіць і вельмі абмежаваная аграрная праграма паўстанцаў.

Значнай перашкодай распаўсюджанню паўстання з'явілася далучэнне да паўстанцаў «белых». Больш таго, паступова яны ўзялі кіраўніцтва паўстаннем у свае рукі. Спадзеючыся на англа-французскае выступленне супраць Расіі, «белыя» жадалі толькі пратрымацца некаторы час і ўсяляк перашкаджалі перарастанню баявых дзеянняў асобных паўстанцкіх атрадаў у народную сялянскую вайну. У сакавіку 1863 г. па загаду Часовага нацыянальнага ўрада ў Варшаве Віленскі Часовы ўрад Літвы і Беларусі быў распушчаны і створаны Аддзел кіраўніцтва **правінцыяміі Літвы, у які ўвайшлі «белыя». Аддзел узначаліў ковенскі** памешчык Якуб Гейштар. К.Каліноўскі спрабаваў супраціўляцца, але, каб не ўносіць раскол у рады паўстанцаў, вымушан быў падпарадкавацца.

Спадзяванні «белых» на падтрымку Англіі і Францыі не спраўдзіліся. Гэтыя дзяржавы асабліва не жадалі ды і не мелі неабходных сіл, каб ваяваць з Расіяй з-за Польшчы, а іх дылламатычныя захады Пецярбург рашуча адхіліў. Ужо ў маі 1863 г. паўстанне ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях было падаўлена, а летам расійскае камандаванне накіравала буйныя вайсковыя сілы ў Польшчу. Поспеху ў барацьбе з паўстаннем расійскія ўлады дасягнулі не толькі дзякуючы вайсковай сіле. У маі 1863 г. Віленскім генерал-губернатарам быў назначаны М. М. Мураўёў. Гэта быў энергічны дзяржаўны дзеяч, які з веданнем справы рабіў тое, да чаго быў закліканы. У Вільню ён прыехаў з планам дзеянняў і неабмежаванымі паўнамоцтвамі**.** Галоўную ўвагу ён звярнуў на цывільнае кіраванне, маючы на мэце знайсці ў краі тыя элементы, на якія рускія ўлады маглі б абаперціся. Перш за ўсё гэта было беларускае сялянства. М. М. Мураўёў дабіўся, каб у краі не толькі выконваліся нормы «Палажэнняў»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1861 г., але і значнага іх паслаблення: было ліквідавана «часоваабавязаннае» становішча сялян і ўведзены абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў, у поўным аб'ёме вярталася зямля, адабраная з 1857 г. (“адрэзкі»), на 20% зменшаны выкупныя плацяжы, беззямельныя сялянскія сем'і надзяляліся 3 дзесяці*на*мі зямлі. Больш таго, сялянам перадавалася зямля ўдзельнікаў паўстання. М. Мураўёў абавязаў сельскія таварыствы наглядаць за мясцовай шляхтай, арганізаваў спецыяльныя сялянскія каравулы, якія павінны былі весці барацьбу з паўстанцамі; разгарнулася шырокая антыпаўстанцкая і антыпольская агітацыя. Усе гэтыя меры звужвалі раёны дзеянняў паўстанцаў і адштурхоўвалі ад іх сялян.

М. М. Мураўёў таксама зрабіў захады для замены польскіх чыноўнікаў расійскімі (праваслаўнымі), зачыняў каталіцкія кляштары і касцёлы, спрабаваў узмацніць значэнне праваслаўнага духавенства і падняць яго матэрыяльны дабрабыт. У навучальных і грамадскіх установах была ўведзена руская мова як абавязковая, забаронена выкладанне польскай мовы ў сельскіх школах, зачыняліся польскія бібліятэкі. М. М. Мураўёў быў першым з дзяржаўных дзеячаў Расіі, хто ўзняў пытанне аб пастаноўцы шырокай народнай адукацыі ў краі, прычым на «местном наречии», пад якім ён, безумоўна, разумеў беларускую мову.

Прадчуваючы хуткае паражэнне паўстання, «белыя» пачалі накідаць свае пасады ў .кіраўніцтве. Да ўлады ізноў прыйшлі «чырвоныя». У чэрвені 1863 г. у Вільню вярнуўся К. Каліноўскі, а ў ліпені ён стаў старшынёй Віленскага аддзела. Да канца лета ў руках К. Каліноўскага сканцэнтравалася ўсё кіраўніцтва паўстанцкімі атрадамі на тэрыторыі Літвы і Беларусі. Аднак выратаваць паўстанне ўжо не ўдалося. Мясцовыя памешчыкі канчаткова адышлі ад паўстання. 28 жніўня Польскі нацыянальны ўрад загадаў спыніць ваенныя дзеянні. У верасні 1863 г. узброеныя паўстанцкія атрады ў заходніх губернях Беларусі і Літве былі разбіты, а летам 18б4г. ліквідавана апошняя рэвалюцыйная арганізацыя ў Навагрудскім павеце. У Польшчы некаторыя паўстанцкія атрады дзейнічалі яшчэ да восені 1864 г., але таксама былі разбіты. К. Каліноўскі быў арыштаваны ў студзені 1864 г. і 22 сакавіка таго ж года павешаны на Лукішскай плошчы.ў Вільні. У сваю апошнюю хвіліну жыцця, К. Каліноўскі, стоячы пад шыбеніцай калі яму абвясцілі судовы прыгавор, у якім назвалі дваранінам заявіў: “У нас няма дваран – усе роўныя”. К. Каліноўскаму ўдалося перадаць з турмы на волю тры развітальныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Пісьмы з-пад шыбеніцы”, якія ўяўляюць сабой духоўны запавет К. Каліноўскага беларускаму народу: “... Народзе... целай грамадой ідзі ваяваці за сваё чалавечае і народнае права, за сваю зямлю родную.” К. Каліноўскім так сама была сфармулявана ідэя дэмакратычнай народнай дзяржавы:

“... Не народ зроблены для ўрада, а ўрад для народа”. Увогуле за ўдзел у паўстанні 128 чалавек былі пакараны смерцю, 853 — сасланы на катаргу, каля 12,5 тыс. выселены, у тым ліку 504 — у Сібір.

"Рэвалюцыянеры ўсіх краін сачылі за барацьбой палякаў з глыбокім спачуваннем. Рэвалюцыйныя дэмакраты ў Расіі, прадстаўнікі расійскай палітычнай эміграцыі лічылі справу Польшчы сваёй кроўнай справай. У абарону паўстанцаў выступіў «Колокол» А. Герцэна. М. Бакунін апублікаваў адозву «Да рускага, польскага і да ўсіх славянскіх народаў», дзе заклікаў падтрымаць польскіх патрыётаў. Нямала расійскіх рэвалюцыянераў змагалася ў радах паўстанцаў. У заходнееўрапейскай прэсе распаўсюджвалася інфармацыя аб ходзе паўстання, збіралася і накіроўвалася ў Польшчу зброя, з эмігрантаў вербаваліся добраахвотнікі. З дапамогай цэнтра «Маладая Еўропа» і асабіста Д. Гарыбальдзі рыхтаваліся палітычныя і ваенныя кіраўнікі паўстанцаў. Пры непасрэдным удзеле К. Маркса і Ф. Энгельса, якія лічылі польскае пытанне важнай састаўной часткай еўрапейскай рэвалюцыі, арганізоўваліся акцыі салідарнасці заходнееўрапейскіх рабочых з польскім народам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Грамадска-палітычны рух ў Беларусі

(60-я гг. XIX — першыя гады XX ст.)

1. Сялянскі і народніцкі рух

2. Рабочы рух у другой палове XIX ст.

3. Утварэнне і дзейнасць сацыял-дэмакратычных арганізацый і палітычных партый

Пасля падаўлення паўстання 1863—1864 гг. у Беларусі адбыўся рэзкі спад сялянскіх выступленняў, і на працягу наступных 40 гадоў сялянскі рух ніколі не дасягаў таго ўзроўню, які назіраўся на рубяжы 50—60-х гг., у час падрыхтоўкі і правядзення рэформы 1861 г. Хваляванні сялян былі паасобнымі і неарганізаванымі. Арганізаваны рэвалюцыйны рух у Беларусі пачаў адраджацца толькі ў сярэдзіне 70-х гг. У 80 – 90 гг. XIX ст побач с традыцыйнымі канфліктамі сялян з памешчыкамі з'яўляюцца новыя – паміж сялянскай буржуазіяй і беднатой. Своеасаблівай формай барацьбы тых гадоў з'явіўся масавы рух сялян, асабліва Магілёўскай і Віцебскай губерняў за перасяленне на свабодныя землі ў Сібір і паўднёва – расійскія рэгіёны. У канцы 90-х гг. узмацнілася супраціўленне сялян спробам выканання судовых рашэнняў і пастаноў улад, звязаных з апісаннем і продажам іх рухомай маёмасці. Усяго ў 1864 – 1900 гг. у Беларусі ўлічана 978 выступленняў сялян. Большасць з іх (ад 50 да 69 %) была звязана з барацьбой за зямлю. У той час самым радыкальным напрамкам апазіцыйнай грамадскай думкі ў Расіі было народніцтва. Ідэалагічна яно грунтавалася на тэорыі сялянскага сацыялізму, заснавалынікам1 якой былі Герцэн і Чарнышэўскі. Народнікі верылі ў асаблівы шлях развіцця Расіі. Ім не падабаўся капіталізм, які суправаджаўся пралетарызацыяй дробных уласнікаў. Народнікі спадзяваліся, што Расія

мае магчымасць пазбегнуць капіталістычнай стадыі і, абапіраючыся на сялянскую абшчыну перайсці адразу да сацыялізму. Сваіх прыхільнікаў народніцтва знайшло перш за ўсё сярод разначыннай інтэлігенцыі.

Народніцкі рух у Беларусі быў ідэйна і арганізацыйна звязаны з агульнарасійскім. Сярод вядомых расійскіх народнікаў 70-х гг. былі ўраджэнцы Беларусі —

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

М. Судзілоўскі, С. Кавалік, І. Грынявіцкі, Р. Ісаеў, К. Брэшка-Брэшкоўская, А. Бонч-Асмалоўскі. У другой палове 70-х — пачатку 80-х гг. у Мінску, Магілёве, Гродне, Віцебску, Пінску, Оршы, Слуцку і іншых гарадах Беларусі дзейнічалі народніцкія гурткі. Калі летам 1879 г. пецярбургская арганізацыя «Зямля і воля раскалолася на «Народную волю" і «Чорны перадзел", большасць народнікаў у Беларусі падтрымала апошнюю, якая прытрымлівалася старой прапагандысцкай—тактыкі. У 1879 і 1880 гг. у Беларусь двойчы прыязджаў лідэр «Чорнага перадзелу" Г. В. Пляханаў. У Мінску была арганізавана цэнтральная падпольная друкарня «Чорнага перадзелу», якая ў пачатку 188І г. выпусціла тры нумары газеты «Черный передел», столькі ж нумароў газеты для рабочых «Зерно» і дзве пракламацыі. Між тым «Чорны перадзел» праіснаваў нядоўга, у 1882 г. арганізацыя раскалолася. Яе былыя прыхільнікі пачалі пераходзіць на пазіцыі «Народнай волі». У сваёй дзейнасці нарадавольцы рабілі стаўку на індывідуальны палітычны тэрор супраць прадстаўнікоў улады. 1 сакавіка 1881 г. пасля некалькіх няўдалых спроб яны забілі Аляксандра ІІ. Бомбу ў цара кінуў ураджэнец Мінскай губерні І. Грынявіцкі. Кіраўнікі «Народнай волі» спадзяваліся, што забойства цара з'явіцца сігналам да народнага паўстання ў Расіі. Аднак ніякага паўстання не адбылося, а рэпрэсіі супраць рэвалюцыянераў у хуткім часе прывялі да знішчэння цэнтральных і многіх правінцыяльных арганізацый «Народнай волі».

Народнікі ў Беларусі спрабавалі аб'яднацца ў адзіную арганізацыю. У пачатку 1882 г.у Вільні была створана *«Паўночна-заходняя арганізацыя «Народнай волі»*. Праўда, праіснавала яна нядоўга. Ужо ў канцы года паліцыі ўдалося раскрыць і арыштаваць членаў цэнтральнай групы. У Беларусі засталіся дзейнічаць толькі асобныя гурткі ў Гродне, Мінску, Віцебску, Пінску, Магілёве, Горках.

У першай палове 80-х гг. у Пецярбургу існавалі студэнцкія гурткі нарадавольніцкага і ліберальна-асветніцкага накірункаў, удзельнікамі якіх былі выхадцы з Беларусі. Падпольна яны выдалі некалькі публіцыстычных твораў, напісаных на рускай мове. У 1884 г. члены групы *«Гоман»* (А. Марчанка, Х. Ратнер і інш.) выступілі з ініцыятывай аб'яднання ўсіх народніцкіх гурткоў Беларусі. Імі было выдадзена два нумары гектаграфічнага часопіса «Гомон». Гоманаўцы аб'явілі сябе «Беларускай сацыяльна-рэвалюцыйнай групай». Іх ідэалам была вольная ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту Расія, пабудаваная на аснове

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

федэрацыі самакіравальных абласцей. Яны мелі сувязі з народніцкімі гурткамі Мінска, Віцебска, Магілёва, але аб'яднаць усіх рэвалюцыйных народнікаў Беларусі ў той час не былі здольны.

У другой палове 80-х — 90-я гг. пануючым накірункам у народніцтве становіцца ліберальны. Ліберальныя народнікі адмовіліся ад рэвалюцыйных метадаў барацьбы і галоўную ўвагу звярнулі на рэфармаванне зямельнага заканадаўства з мэтай павялічыць сялянскае землеўладанне і захаваць абшчыну ў вёсцы. Гэтым яны спадзяваліся вырашыць аграрную праблему.

Разам з тым беларускія ліберальныя народнікі цікавіліся гісторыяй і культурай свайго краю, спрыялі развіццю нацыянальнай нядомасці беларусаў.

Пасля рэформы 1861 г. у Беларусі значна паскорыўся працэс фарміравання класа наёмных рабочых. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх губерняў — адсутнасць буйных і перавага дробных рамесных прадпрыемстваў з невялікай колькасцю працуючых на іх рабочых, сялянскае малазямелле і мноства яўрэйскай беднаты ў горадзе — стваралі лішак рабочай сілы і пашыралі магчымасці эксплуатацыі пралетарыяту. Так, заработная плата беларускіх рабочых у параўнанні з агульнарасійскімі паказчыкамі канца XIX — пачатку і. была амаль на '/з ніжэй. У першыя два дзесяцігоддзі пасля адмены прыгонніцтва ўмовы працы рабочых ніяк нерэгламентаваліся, адсутнічала ўсялякая сацыяльная абарона. Па няпоўных даных у 70 –першай палове 90-х гг. адбылося 23 забастоўкі і хваляванні. Найбольш буйныя – на цагельным заводзе ў Брэсцкай крэпасці (1873), слясарна-кавальскіх майстэрнях Маскоўска – Брэсцкай чыгункі (1876), на будаўніцтве чыгуначных дарог Вільня – Баранавічы, Лібава – Роменскай у Гомелі (1886, 1894), трыкатажных майстэрнях Смаргоні (1895). Тым не менш выступленняў рабочых на Беларусі было няшмат. Толькі ў 90-х гг. назіраецца ўздым стачачнай барацьбы, якая была накіравана на паляпшэнне матэрыяльнага становішча рабочых. Паступова рабочы рух набывае ўсё большую арганізаванасць і ў канцы XIX ст. вылучаецца ў самастойную плынь. Безумоўнымі прыкметамі з’яўлення рабочага пытання ў краіне было рабочае заканадаўства 80 – 90-х гг., якое абмяжоўвала выкарыстанне дзяцячай і жаночай працы (1882, 1885), памеры штрафу (1886), увядзенне фабрычнай інспекцыі (1882) і г.д. У гэты ж час ідэалогія народніцтва пачынае саступаць месца марксізму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Першае знаёмства з марксісцкай літаратурай адбылося яшчэ ў гуртках народнікаў. Узнікненне самастойнага сацыял-дэмакратычнага руху ў Беларусі звязана з дзейнасцю польскай партыі «Пралетарыят» (утварылася ў 1882 г.) і асаблі-ва пляханаўскай групы_”Вызваленне працы» (утворана ў 1883 г. у Швейцарыі). У другой палове 80-х — пачатку 90-х гг. у некаторых гарадах Беларусі былі арганізаваны гурткі, у якіх вывучаліся працы К. Маркса, Ф. Энгельса і іх паслядоўнікаў. Першыя марксісцкія гурткі ў Беларусі былі нешматлікія і амаль не звязаныя з масавым рабочым рухам.

Прыблізна з сярэдзіны 90-х гг. сацыял-дэмакраты пачынаюць наладжваць прапаганду ідэй сацыялізму ў рабочым асяроддзі. Так, у Мінску ў_ гэты час аформіліся дзве сацыял-дэмакратычныя групы. Адну ўзначальвалі_Я. Гурвіч і П. Берман. Яны разгарнулі агітацыю сярод яўрэйскіх рабочых дробна-капіталістычнай і рамеснай вытворчасці. Другая група пад кіраўніцтвам С. Трусевіча вяла прапаганду на буйных прадпрыемыствах Мінска. У красавіку 1896 г. С. Трусевіч удзельнічаў рабоце ўстаноўчага з'езда *Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі* (ЛСДП) у Вільні, але не пагадзіўся з яе сепаратызмам і ў маі 1896 г. стварыў *Рабочы саюз Літвы* (РСЛ), які аб'яднаў інтернацыянальныя рабочыя арганізацыі Вільні, Мінска і Смаргоні.

У другой палове 90-х гг. сярод сацыял-дэмакратаў шматнанацыянальных заходніх губерняў пераважала тэндэнцыя да стварэння рабочых арганізацый па нацыянальнай прыкмеце. Такую пазіцыю заняла ЛСДП. Узаемадзеянне з расійскім пралетарыятам адмаўляла *Польская сацыялістычная партыя* (ППС).

У верасні 1897 г. на з'ездзе яўрэйскіх сацыял-дэмакратычных арганізацый, што праходзіў у Вільні, утва|рыўся Бунд— *Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы* і *Расіі.* Яго лідэрам стаў А. Крэмер. Бунд лічыў, што абараніць інтарэсы яўрэйскіх рабочых, можа толькі іх нацыянальная арганізацыя. Аднак з пазіцыяй Бунда пагадзіліся не ўсе рабочыя яўрэйскія арганізацыі. Праціўнікі Бунда стварылі ў Мінску__Рабочую партыю палітычнага вызвалення Расіі (РППВР). Яе кіраўнікамі сталі Л. Радзівонава-Клячко, Р. Гершуні, К. Брэшка-Брэшкоўская, А. Бонч-Асмалоўскі. Гэтая група стаяла на інтэрнацыянальных пазіцыях, але схілялася да тэрарыстычных метадаў барацьбы з самадзяржаўем.

На аснове масавай сацыялістычнай агітацыі ў другой палове 90-х гг. назіраецца значны ўздым стачачнай барацьбы рабочых. Разам з тым у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Расіі ствараюцца буйныя гарадскія і рэгіянальныя сацыял-дэмакратычныя арганізацыі. Усё гэта выклікала неабходнасць аб'яднання сацыял-дэмакратаў у адзіную партыю. Ініцыятарам аб'яднальнага працэсу стаў створаны У. І. Леніным у 1895 г. пецярбургскі «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа". 1 – 3 сакавіка 1898г. у Мінску прайшоў з'езд прадстаўнікоў пецярбургскага, маскоўскага, кіеўскага і екаця-рынаслаўскага «Саюзаў барацьбы», кіеўскай «Рабочай газеты» і Бунда. З'езд прыняў рашэнне аб аб'яднанні прадстаўленых на ім арганізацый у *Расійскую сацыял-дэмакратычную рабочую партыю* (РСДРП) і выбраў ЦК партыі. Бунд увайшоў у РСДРП на правах аўтаноміі ў вырашэнні мясцовых' спраў.

Хутка пасля 1 з'езда РСДРП яе ЦК. быў арыштаваны. Сярод сацыял-дэмакратаў абвастрылася барацьба паміж прыхільнікамі рэвалюцыйнага і рэфармісцкага накірункаў. Цэнтрам згуртавання рэвалюцыйных сацыял-дэмакратаў стала газета «Іскра», якая пачала ідэйную барацьбу з эканамізмам. Прыхільнікі эканамізму адмаўлялі палітычную барацьбу пралетарыяту і лічылі, што змагацца трэба толькі за паляпшэнне эканамічных умоў жыцця працоўных.

Летам 1903 г. за мяжой_адбыўся II з'езд РСДРП. Ён прыняў праграму РСДРП, распрацаваную іскраўцамі. У праграме абвяшчалася канчатковая мэта — пралетарская рэвалюцыя, заваяванне дыктатуры пралетарыяту і пабудова сацыялізму. Бліжэйшай палітычнай задачай партыя ставіла звяржэнне самадзяржаўя і ўстанаўленне дэмакратычнай рэспублікі. Пры абмеркаванні статута РСДРП і выбарах у кіруючыя органы партыі большасць іскраўцаў пад кіраўніцтвам У. І. Леніна выступіла за стварэнне строга цэнтралізаванай і законспіраванай партыі. У выніку адбыўся раскол РСДРП. З гэтага часу рэвалюцыйную частку расійскіх сацыял-дэмакратаў пачалі называць бальшавікамі, а прыхільнікаў рэфармісцкага накірунку

меншавікамі.

На тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст. дзейнічалі невялікія грыпы *Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы 1СДКПіЛ),* створанай у 1900 г.на з'ездзе прадстаўнікоў РСЛ і сацыял-дэмакратаў Польшчы. Яе кіраўнікамі былі Ф. Дзяржынскі і С. Трусевіч. СДКПіЛ падзяляла ідэі рэвалюцыйнай палітычнай барацьбы пралетарыяту і імкнулася да аб'яднання РСДРП.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У 1902 г. прыхільнікі ідэй, народнідніцтва стварылі Партыю сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў). Да яе далучыліся члены разгромленай РППВР, адзіны існуючы цэнтр якой заставаўся ў Мінску. Эсэры выступілі за пабудову сацыялізму, заснаванага на аснове сацыялізацыі зямлі, ураўняльнага землекарыстання і кааперацыі. Яна мела на мэце звяржэнне самадзяржаўя, знішчэнне .памешчыцкага землеўладання і ўстанаўленне ў Расіі федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі. Галоўным сродкам барацьбы эсэры лічылі індывідуальны палітычны тэрор. Лідэрам эсэраў быў мінскі рэвалюцыянер Р. Гершуні.

. На рубяжы XIX—XX стст. з агульнадэмакратычнага руху вылучаецца беларуская нацыянальная плынь. Яшчэ ў канцы 90-х гг. XIX ст. сярод мінскіх навучэнцаў браты І. і А. Луцкевічы арганізавалі гурток, які меў па мэце вывучэнне Беларусі. Калі ў 1902 браты Луцкевічы пераехалі вучыцца ў Пецярбург, яны стварылі там легальны студэнцкі “Гурток беларускай народнай асветы”, які працягваў пачатую у Мінску дзейнасць. У канцы 1902 — пачатку 1903 г. з нацыянальна-культурных гурткоў Мінска, Вільні і Пецярбурга афармілася *Беларуская рэвалюцыйная грамада* (БРГ). Сярод яе стваральнікаў і кіраўнікоў былі І. і А. Луцкевічы, А. Пашкевіч (Цётка), К. Кастравіцкі, А. Бурбіс і інш.

На першым з’ездзе ў 1903 г. БРГ прыняла праграму, дзе называла сябе “Сацыяльна-палітычнай арганізацыяй беларускага працоўнага народа”. Тэарэтычна погляды членаў БРГ спалучалі ідэі рэвалюцыйнага дэмакратызму і народніцтва. БРГ выступала за звяржэнне самадзяржаўя, знішчэнне кпіталізму і ўсталяванне дэмакратычнага ладу, прызнавала правы народаў Расіі на аўтаномію, прадугледжвала знішчэнне прыватнай зямельнай уласнасці і ўвядзенне ураўняльнага землекарыстання без эксплуатацыі чужой працы. Пазней БРГ была пераіменавана ў Беларускую сацыялістычную грамаду (БСГ)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Фарміраванне беларускай нацыі

1. **Гістарычныя ўмовы і асаблівасці ўтварэння беларускай нацыі**
2. **Палітыка царызму ў Беларусі па нацыянальнаму пытанню**
3. **Тэрыторыя і насельніцтва Беларусі. Агульнасць гаспадарчага жыцця.**
4. **Станаўленне новай беларускай літаратурнай мовы.**
5. **Нацыянальны рух. Роля газеты “Наша ніва” у развіцці нацыянальнай самасвядомасці**

Працэс фарміравання беларускай нацыі вызначаўся асаблівасцямі і характарам сацыяльна-эканамічнага развіцця, кірункам палітыкі расійскага ўрада ў Беларусі, традыцыйнымі рысамі нацыянальна-культурнага развіцця і інш. Праз шэраг складаных этапаў у сваёй эвалюцыі этнагенез беларусаў у XIX ст., асабліва ў яго апошнія дзесяцігоддзі і на пачатку XX ст., значна паскорыўся і выйшаў на стадыю фарміравання нацыі. Існаванне апошняй адзначалася наяўнасцю наступных рыс: агульнасцю тэрыторыі і эканамічнага жыцця, супольных рыс нацыянальнага характару, культуры і літаратурнай мовы.

Асноўная тэрыторыя беларусаў уваходзіла ў межы пяці іуберняў: Віленскай, Гродзенскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай. Колькасць насельніцтва, паводле перапісу 1897 г., у сучасных межах Беларусі складала 6 млн 387 тыс. чалавек. Удзельная вага прадстаўнікоў карэннай нацыянальнасці перавышала 73 %. Значнай доля беларусаў была (па даных перапісу 1897 г. аб роднай мове) у Веліжскім (87,5 %), Невельскім (84,0 %), Себежскім (47,1 %) паветах Віцебскай губерні, Сакольскім (83,9 %) павеце Гродзенскай губерні, Красненскім (90,0 %) павеце Смаленскай губерні, Сураж-скім (каля 70 %) павеце Чарнігаўскай губерні і некаторых іншых, што знаходзяцца па-за межамі тэрыторыі сучаснай беларускай дзяржавьк Каля 90 % прадстаўнікоў беларускага этнасу жылі ў сельскай мясцовасці. Прыкладна 40 — 50 % гарадскога і местачковага насельніцтва складалі яўрэі, што з'явілася вынікам існавання ў межах 10 заходніх губерняў Расійскай імперыі рысы аседласці яўрэяў; каля 20 % гараджан былі рускімі, беларусы сярод гараджан складалі 17,1 %.

Паскарэнне пасля рэформы 1861 г. тэмпаў эканамічнага развіцця, пашырэнне капіталістычнага прадпрымальніцтваў прамысловасці,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паступовая, хаця і павольная, пераарыентацыя памешчыцкіх гаспадарак на рынак, павелічэнне бессаслоўнага землеўладання, развіццё гандлю і шляхоў зносін, інтэнсіўнае чыгуначнае будаўніцтва спры-ялі стварэнню на тэрыторыі Беларусі адзінага эканамічнага рэгіёну і станаўленню беларускай нацыі. Аднак апошні працэс стрымліваўся агульным кірункам палітыкі ўрада.

Пасля падаўлення паўстання 1863 г. царызм канчаткова пазбавіўся ілюзій наконт польскіх культурна-палітычных уплываў на тэрыторыі Беларусі і перайшоў на шлях інтэнсіўнай русіфікацыі. Пачатак гэтай палітыкі быў закладзены крывавым катам паўстання і ў той жа час таленавітым дзяржаўным дзеячам М.М.Мураўёвым. Асновай палітыкі стгала стварэнне яе сацыяльнай базы — пашырэнне расійскага землеўласніцтва, продаж зямлі на льготных умовах запрошаным на службу ў беларускія губерні расійскім чыноўнікам. Спрыяльнай глебай для русіфікацыі ў афіцыйных колах лічылася таксама шматлікае беларускае праваслаўнае сялянства. У сувязі з гэтым становіцца зразумелым стрымліванне эміграцыі сялянсгва Беларусі ў другой палове XIX ст. у Сібір і за межы Расійскай імперыі ў пошуках зямлі і працы, а таксама абмежаванні ў набыцці зямлі асобамі польскай і яўрэйскай нацыянальнасці. Школа цалкам была пераведзена на рускую мову навучання. Вышэйшыя навучальныя ўстановы і беларускамоўны друк адсутнічалі. Выкарыстанне беларускай мовы не дапускалася ні ў школе, ні ў дзяржаўных установах, ні ў друку, за выключэннем толькі этнаграфічных публікацый. Прычым і настаўнік, і праваслаўны святар, і дзяржаўны чыноўнік, і афіцыйная газега настойліва і паслядоўна даказвалі беларусам, што яны — рускія і не маюць ніякіх адрозненняў, акрамя лакальна-дыялектных. Адпаведным чынам пісалася і беларуская гісто-рыя. У гэтым кірунку вельмі дарэчы сталася ідэалогія "западнорусснзма". Асноўныя пасгулаты гэтай школы былі распрацаваны ў сярэдзіне XIX сг. І.Сямашкам, М.Каяловічам, а таксама знайшлі адлюстраванне на старонках часопіса "Вестннк Западной Росснн", які выдаваўся ў 60 — 70-я гг. мінулага стагоддзя К.Гаворскім. Сярод прыхільнікаў гэтай ідэалогіі вылучаліся дзве плыпі: ліберальная і кансерватыўная. Агульным для іх было адмаўленне самастойнасці беларускага этнасу, але прадстаўнікі першай у адрозненне ад другой дапускалі самакаштоўнасць беларускай культуры і магчымасць яе вывучэння для ўзбагачэння велікарускай. Ліберады-"западнорусспы" зрабілі шмат для даследавання нацыянальнай спадчыны беларусаў і аднымі з першых звярнулі ўвагу ўрадавых колаў і сталічнага грамадства на тое, што Беларусь насуперак доўга панаваўшаму ў той час меркаванню не з'яўляецца часткай Польшчы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Станаўленне буржуазнага грамадства ў другой палове XIX і пачатку XX ст. мела ў Беларусі шэраг спецыфічных рыс. Забарона яўрэям сяліцца па-за межамі гарадоў і мясгэчак, эканамічная слабасць гарадоў, немагчымасць знайсці ў іх працу для вялікай колькасці беззямельных і малазямельных сялян, стрымліванне разлажэння памешчыцкага землеўладання адмоўна адбіліся на ўтварэнні класаў буржуазнага грамадства, дэфармавалі нацыянальны склад гарадскога насельніцтва і ў канчатковым выніку стрымлівалі фарміраванне беларускай нацыі. Пры гэтым беларуская нацыянальная буржуазія знаходзілася яшчэ на стадыі станаўлення і ўяўляла сабой найбольш слабую праслойку мясцовай шматнацыянальнай буржуазіі. Асноўныя капіталы края знаходзіліся ў руках польскіх і рускіх памешчыкаў, яўрэйскіх купцоў. Беларуская аграрная буржуазія, падзеленая на праваслаўных і каталікоў, да канца не ўсвядоміла свайго нацыянальнага адзінства і часта абыякава ставілася ла беларускага нацыянальнага руху. Наогул, падзел беларускага этнасу на каталікоў і праваслаўных таксама адмоўна адбіўся на фарміраванні беларускай нацыі. Слабасць нацыянальнай буржуазіі і дваранства стала прычынай павольнага сталення нацыянальнай інтэлігенцыі. Эліта беларускага грамадства фактычна не дарасла да асэнсавання сваіх асобных ад расійскай рэчаіснасці ці польскай ідэі дзяржаўна-палітычных ідэалаў і не бачыла неабходнасці ў іх абгрунтаванні з боку інтэлігенцыі. Адна з асаблівасцяў беларуская інтэлігенцыі – страта пераемнасці паміж рознымі яе пакаленнямі з-за прычын перш за ўсё палітычнага характару. У першай паловы XIX ст. інтэлектуальнае жыццё Беларусі пераважна развівалася пад уплывам польскай культуры, але гэта не перашкодзіла з’яўленню інтэлігентаў, якім быў уласцівы “краёвы”, беларускі па сутнасці, патрыятызм прафесараў Віленскага універсітэта М. Баброўскага, І. Даніловіча, філаматаў Я. Чачота, Т. Зана і інш. У сяр. XIX ст. пашыраецца ўплыў беларускай ліберальнай думкі, прадстаўленай гурткамі А. Кіркора ў Вільні, В. Дуніна – Марцінкевіча ў Мінску і інш. Асобныя творы на беларускай мове ў гэты час стварылі Я. Баршчэўскі, У. Сыракомля і інш. Беларуская мова стала асноўнай ў творчасці В. Дуніна – Марцінкевіча. Творчасць і погляды гэтага кола інтэлігенцыі не заўсёды мелі акрэслены нацыянальны змест, але садзейнічалі развіццю нацыянальнай культуры і самасвядомасці. Сярод дэмакратычнай інтэлігенцыі 60-х гг. XIX ст. сфарміравалася невялікая група, для якой зразумелым было ўяўленне аб тым, што Беларусь мае ўсе ўмовы для самастойнага развіцця. Лідэрам гэтай групы быў К. Каліноўскі, погляды якога знайшлі адлюстраванне на старонках “Мужыцкай праўды” і ў “Лістах з-пад шыбеніцы”. Станаўленне беларускай інтэлігенцыі было звязана з узнікненнем і развіццём нацыянальнага руху.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вялікае значэнне для абуджэння нацыянальнай самасвядомасці мела дзейнасць фальклярыстаў, гісторыкаў, этнографаў і г. д. У др. палове XIX ст. - пачт XX ст. з’явіліся грунтоўныя працы

І. Насовіча, Е. Раманава, Я. Карскага і інш. У трохтомнай працы “Беларусы” Я. Карскага засведчана самастойнасць беларускага этнасу.

На працягу апошніх дзесяцігоддзяў XIX ст. тэрмін “Беларусь” замацаваўся за ўсёй этнічнай тэрыторыяй беларусаў. Аднак саманазва беларусаў не набыла яшчэ выразнага агульна-нацыянальнага зместу. Частка насельніцтва Беларусі называла сябе “тутэйшыя”. У некаторых мясцовасцях існавалі рэгіянальныя назвы: “палешукі”, “пінчукі” і інш. Па даных перапісу

1897 г. аб роднай мове, 51,8 % колькасці спадчыннага дваранства прызнавалі сябе беларусамі. З ліку асабістых дваран (чыноўніцтва) 25,9 % назвалі сваёй роднай мовай беларускую. Роднай прызнавалі беларускую мову 20 % урачоў, 60 % настаўнікаў і г. д. Сялянства, пралетарыят пераважна складаліся з прадстаўнікоў карэннага этнасу.

У XIX – пач. XX ст. прадоўжылася станаўленне беларускай літаратурнай мовы. Яе фарміраванне пераважна адбывалася ў жанры мастацкай літаратуры і публіцыстыкі. Гэта не дазваляла ўсебакова развіваць яе слоўнік, у якім, акрамя слоў, звязаных з паняццямі штодзённага побыту, іншыя пласты лексікі былі развіты слаба. Не далі вынікаў спробы скласці граматыку і правапіс беларускай мовы. Граматыкі П. Шпілеўскага 1846 г. і К. Нядзвецкага

1854 г. засталіся ў рукапісах. У 1862 г. маршалак мінскі А. Аскерка выдаў беларускі лемантар (Буквар). Пры друкаванні беларускіх выданняў пераважна выкарыстоўвалася лацініка. Гэтай графікай былі надрукаваны творы В.Дуніна-Марцінкевіча, Ф.Багушэвіча, газета "Мужыцкая праўда", гутарка "Дзядзька Антон..." і інш. У канцы XIX ст. лацінку паступова пачала выцясняць кірыліца. Пасля ўвядзення закона аб свабодзе друку ў 1905 г. і з'яўлення беларускіх легальных выданняў, асабліва "Нашай нівы", фарміраванне літаратурнай мовы, выпрацоўка яе навуковай тэрміналогіі пайшлі хутчэй.

Працэс сталення нацыі праявіўся ў нацыянальным руху. Беларускі рух узрастаў паміж спрэчкамі расійскіх і польскіх шавіністаў за панаванне на тэрыторыі края. У 80-я гг. XIX ст. у Пецярбургу дзейнічаў беларускі народніцкі гурток "Гоман", які выдаў два нумары аднайменнага гектаграфічнага часопіса (1884). У публікацыях на яго старонках ("Лісты аб Беларусі", "Пасланне да землякоў-беларусаў") дадзена тэарэтычнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

абгрунтаванне існавання самастойнага беларускага этнасу, вылучаны задачы перад інтэлігенцыяй па пашы-рэнні нацыянальнай самасвядомасці. Дачыненне да гэтага выдання мелі студэнты — ураджэнцы Беларусі А.Марчанка, Х.Ратнер і інш. На пачатку 90-х гг. XIX ст. у Маскве і Пецярбургу дзейнічалі арганізацыі беларускага сгудэнцтва пад кіраўніцтвам А.Гурыновіча, М.Абрамовіча і інш. У 1902 - 1903 гг. у Пецярбургу ўзніклі нацыянальныя арганізацыі В.Іваноўскага, братоў

А. і І.Луцкевічаў, якія сталі пачаткам утварэння першай беларускай сталай палітычнай партыі — Беларускай сацыялістычнай фамады. Глыбокія якасныя змены ў нацыянальным руху адбыліся ў час рэвалюцыі 1905 - 1907 гг. Са з'яўленнем беларускамоўнага друку (газеты "Наша доля", "Наша ніва" і інш.), пашырэннем прафесійных, гамадска-культурных аб'яднанняў і гурткоў (Беларускі настаўніцкі саюз, Гродзенскі гурток беларускай моладзі, Беларускі музычна-драматычны гурток і г.д.), заснаваннем выдавецкіх суполак, нацыянальных тэатральных калектываў узраслі розныя формы і кірункі нацыянальнага руху. Пасля паражэння рэвалюцыі асяродкам патрыятычных сіл стала газета "Наша ніва". Пад яе ўплывам зарадзіўся беларускі нацыянальна-рэлігійны рух (дзейнасць святароў В.Гадлеўскага, А.Абрамовіча і інш.), выросла цэлая плеяда пісьменнікаў (Я.Купала, Я.Колас, М.Багдановіч, Ц.Гартны, М.Гарэцкі, З.Бядуля, Б.Тарашкевіч і інш.).

З працэсамі фарміравання беларускай нацыі непарыўна звязаны таксама і развіццё культуры Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст., яго характар, кірунак і перш за ўсё месца ў ім нацыянальнай плыні. Наяўнасць і багацце нацыянальнай культуры — паказчык – паказчык стану нацыі. Наогул, нягледзячы на неспрыяльныя дзяржаўна-палітычныя ўмовы, спецыфічную этнасацыяльную сітуацыю, фарміраванне беларускай нацыі на пачатку XX ст. у агульных абрысах завяршылася.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Культура Беларусі ў 60—90-я гг. XIX ст.

1. **Адукацыя і навука ў другой палове XIX ст.**
2. **Беларуская літаратура ў другой палове XIX ст.**
3. **Музычная і тэатральная творчасць.**
4. **Выяўленчае мастацтва і архітэктура.**

Культура Беларусі 60 —90-х гг. развівалася ва ўмовах сцвярджэння і панавання капіталістычных адносін.

Нягледзячы на каланіяльную палітыку расійскага самаўладства, у гэты час пачала фарміравацца беларуская нацыянальная інтэлігенцыя, якая вывучала і стварала нацыянальную культуру, выступала ў якасці ідэолага нацыянальнага руху. Прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі тэарэтычна абгрунтавалі існаванне самастойнага беларускага этнасу і абвясцілі яго права на роўнасць з іншымі народамі, на палітычнае самавызначэнне свайго лёсу.

Пад уплывам грамадскага руху 60-х гг. царскі ўрад быў вымушаны правесці некаторыя рэформы ў галіне асветы, але іх вынікі на Беларусі былі значна меншыя, чым у цэнтральных губернях Расіі. Паражэнне паўстання 1863 — 1864 гг. прывяло да ўзмацнення рэакцыі і нацыянальнага прыгнёту. У 1864 г. быў закрыты Горы-Горацкі земляробчы інстытут, Навагрудская гімназія, Свіслацкая і Навагрудская прагімназіі. Выкладанне на беларускай і польскай мовах забаранялася. Агульны ўзровень народнай асветы заставаўся нізкім. Пачатковых школ было вельмі мала, сярэднія існавалі толькі ў найбольш буйных гарадах.

У пачатку парэформеннага перыяду на Беларусі існаваў толькі афіцыйны друк. Беларуская кніга ў гэты час выдавалася пераважна за мяжой. У кожнай губерні выдавалася газета "Губернскіе ведомости". З 1886 г. выдавалася першая на Беларусі легальная неафіцыйная грамадска-палітычная літаратурная газета "Мннскнй лнсток", якая адыграла пэўную ролю ў развіцці нацыянальнай самасвядомасці. Разам з гістарычнымі і этнаграфічнымі даследаваннямі і фальклорнымі запісамі М.Доўнар-Запольскага, І. Янчука, А.Багдановіча і іншых вучоных на яе старонках змяшчаліся мастацкія творы на беларускай мове Я.Лучыны, К.Кагангца і інш.

У 60 — 90-я гг. XIX ст. пашыралася ўсебаковае вывучэнне Беларусі. Шэрагам вучоных былі створаны буйныя працы па гісторыі Беларусі. М.Доўнар-Запольскі, М.Уладзімірскі-Буданаў, М.Любаўскі і інш. сабралі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

апублікавалі вялікі фактычны матэрыял, які выклікаў сярод інтэлігенцыі цікавасць да вывучэння гісторыі свайго народа. Навукоўцы цікавіліся беларускай народнай культурай — песнямі, казкамі, легендамі. Этнографы Л Кіркор, М.Нікіфароўскі, М.Федароўскі, Е.Раманаў, П. Шэйн і інш. у сваіх грунтоўных даследчых працах сцвярджалі, што мова і культура беларускага народа працягваюць свой гістарычны працэс. У 1870 г. выйшаў першы беларуска-рускі слоўнік І.Насовіча. У гэты час началася навуковая праца Я.Ф.Карскага.

Важную ролю ў духоўным жыцці беларускага народа адыгрываў фальклор. У вусна-паэтычнай творчасці адбылося станаўленне новых жанраў, узбагачэнне тэматыкі, ідэйнага зместу, мастацкіх сродкаў.

Капіталістычнае развіццё вёскі выклікала з'яўленне іювых тэм фальклору, Гэты працэс знайшоў шырокае .ідлюстраванне ва ўзнікненні адпаведнага цыкла казак, песень, прыказак, частушак-прыпевак. Вялікім мастацкім густам вылучаліся творы беларускіх народных майстроў.

Беларуская літаратура другой паловы XIX ст. развівалася падспудна, пад забаронай, у неспрыяльнай атмасферы. Рэпрэсіі ў дачыненні да ўдзельнікаў паўстання 1863 г., фактычная забарона беларускага друку, жорсткі русіфікатарскі курс палітыкі царызму прывялі да таго, што многае з творчай спадчыны выдатных беларускіх пісьменнікаў загінула.

Асновай развіцця беларускай літаратуры гэтага перыяду быў паступовы рост сацыяльнай і нацыянальнай самасвядомасці народа. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцяў у краіне напярэдадні і ў перыяд рэформы 1861 г., развіццё капіталізму і з'яўленне на арэне палітычнай барлцьбы пралетарыяту, уплыў перадавой грамадскай думкі стварылі глебу для развіцця беларускай літаратуры дэмакратычнага напрамку.

Вядомым прадстаўніком дэмакратычнай культуры беларускага народа ў другой палове

XIX ст. з'яўляўся кіраўнік паўстання 1863 — 1864 гг. на Беларусі і ў Літве, рэвалюцыянер-дэмакрат, мысліцель і публіцыст К.Каліноўскі (1838 — 1864). У сваіх пракламацыях і газеце "Мужыцкая праўда" ён у даходлівай форме выкрываў грабежніцкі характар рэформы 1861 г., палітыку царызму на беларускіх землях, заклікаў сялян да ўзброенага паўстання за зямлю і волю, за чалавечыя правы. Нацыянальныя пачуцці К.Каліноўскага найболып поўна выявіліся ў творы рэвалюцыйнай публіцыстыкі "Лісты з-пад шыбеніцы", напісаным перад пакараннем смерцю ў Віленскай турме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ф.К.Багушэвіч (1840 —1900) — пісьменнік сацыяльнага пафасу, паэт, публіцыст і перакладчык, першым у беларускай літаратуры выступіў як паслядоўны выразнік поглядаў і інтарэсаў працоўных мас, сялянсгва. Удзельнік паўстання 1863 — 1864 гг., пачынальнік крытычнага рэалізму, патрыёт сваёй радзімы Ф.Багушэвіч выступіў у абарону беларускага народа і яго мовы, якой пагарджалі і якую зневажалі як царскія сатрапы, так і польскія паны. У прадмове да зборніка "Дудка беларуская" Багушэвіч заяўляў: "Я шмат дзе бываў, шмат чаго бачыў і чытаў, пераканаўся, што мова наша ёсць такая ж чалавечая і вартая, як французская, або нямецкая, або якая-небудзь іншая".

У вершах "Мая дудка", "Дурны мужык, як варона" і інш. Багушэвіч гаворыць аб сваім прызначэнні спяваць аб горы і пакутах беларускага сялянства. Творы Ф.Багушэвіча прасякнуты пратэстамі супраць прыгонніцкіх парадкаў, аграблення сялян рэформай 1861 г., бяспраўя і прыніжэння селяніна-працаўніка з боку царскай бюракратыі.

Спадчына пісьменніка вельмі багатая і разнастайная ў жанравых адносінах: паэма ("Кепска будзе!"), вершаванае апавяданне ("У астрозе"), публіцыстычны маналог ("Мая дудка"), філасофскі роздум ("Праўда", "Думка", байка "Воўк і авечка" і інш.). Ва ўмовах царызму Ф.Багушэвіч не мог друкаваць свае творы ў Расіі. Таму свой першы зборнік вершаў "Дудка беларуская" ён надрукаваў у 1891 г. ў Кракаве, другі зборнік "Смык беларускі" — у 1894 г. у Познані пад псеўданімамі Мацей Бурачок і Сымон Рэўка з-пад Барысава. Творы Ф.Багушэвіча абудзілі да творчай дзейнасці на карысць свайму народу новае пакаленне нацыянальнай інтэлігенцыі.

Паслядоўнікамі Ф.К.Багушэвіча, якія адыгралі значную ролю ў развіцці беларускай прагрэсіўнай літаратуры другой паловы XIX ст., былі паэты-дэмакраты Янка Лучына (1851 - 1897) і Адам Гурыновіч (1869 - 1894).

Я.Лучына (сапраўднае імя — Іван Неслухоўскі) пісаў на беларускай, рускай, польскай мовах. Найбольш вядомым яго і творам з'яўляецца верш "Роднай старонцы", у якім ён выражае сваю любоў да Радзімы, да свайго беларускага народа. Тэматычна паэзія Я.Лучыны звязана пераважна з жыццём бсларускай вёскі. З яго паэзіі бярэ вытокі беларуская філасофская лірыка. Творчасць Я.Лучыны выяўляла розныя ўзроўні мастацкага асэнсавання беларускай рэчаіснасці, але была мэтанакіраванай у дэмакратьгчным сцвярджэнні грамадскага ідэалу свайго часу. Адсутнасць магчымасці для публікацыі беларускіх твораў, вядома, адмоўна адбілася на раскрыцці яго таленту як нацыянальнага паэта. Толькі праз 6 гадоў пасля смерці Я.Лучыны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гурток беларускіх студэнтаў выдаў у Пецярбургу зборнік яго беларускамоўных вершаў пад назвай "Вязанка".

Паэзія А.Гурыновіча — мастацкае адлюстраванне сацыяльна-палітычных працэсаў парэформеннага часу. Вызначаючы задачы літаратуры, А.Гурыновіч сцвярджаў, што яна павінна "будзіць у сэрцы думкі аб лепшай долі, якой мы не зналі дагэтуль ніколі". Паэт верыў у карэнныя змены ў лёсе свайго народа, ён пісаў:

Да не будзе так

Векі вечныя,

А прыдуць неяк

Часы лепшыя.

Сваёй творчасцю А.Гурыновіч услед за Ф.Багушэвічам і Я.Лучынай замацаваў у беларускай паэзіі пазіцыі рэалізму і народнасці, падрыхтаваў глебу для яе далейшага ідэйна-эстэтычнага развіцця.

Я.Лучына і А.Гурыновіч былі таксама таленавітымі перакладчыкамі і фальклярыстамі.

Значны след у беларускай літаратуры канца XIX ст. пакінулі такія пісьменнікі, як Альгерд Абуховіч (1840 — 1898), Фелікс Тапчэўскі (каля 1838 — 1892), Аляксандр Ельскі (1834 - 1916), Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі) (1869-1922) і інш.

У 90-я гг. XIX ст. пачалі свой творчы шлях такія буйныя беларускія пісьменнікі, як Карусь Каганец (Казімір Кастравіцкі) (1868 — 1918), Цётка (Элаіза Паш-кевіч) (1876-1916).

У сваіх лепшых творах гэтага часу беларуская літаратура выявіла шэраг фенаменальных рыс, якія забяспечылі ёй эстэтычную вартасць.

Беларуская літаратура дэмакратычнага напрамку ў гэты час узбагацілася шэрагам новых ананімных твораў -вершаў, так званых гутарак, якія ярка адлюстроўвалі рэвалюцыйна-дэмакратычны настрой беларускага сялянства. Узорамі такіх твораў з'яўляюцца "Дзядзька Антон, або Гутарка аб усім, што баліць, а чаму баліць — не ведаем", “Гутарка Паўлюка", "Гутарка пана з селянінам" і інш. Большасць гэтых твораў, відавочна, паходзіць з сялянскага асяроддзя, яны востраса цыяльныя, з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выявай народнага погляду на сацыяльны свет, народнага гумару. Напісаны гэтыя творы жывой народнай мовай, у рэалістычнай манеры.

У другой палове XIX ст. на Беларусі развіваліся розныя формы народнага тэатра (народная драма, батлейка). Пачаў фарміравацца беларускі прафесійны тэатр. Яго ўзнікненне звязана з дзейнасцю выдатнага прадстаўніка беларускай літаратуры XIX ст. паэта, драматурга і тэатральнага дзеяча В.Дуніна-Марцінкевіча. Гэты тэатр наследаваў народныя традыцыі мастацтва, вызначаўся дэмакратызмам, абуджаў нацыянальную самасвядомасць у гледачоў, пакінуў прыкметны след у гісторыі беларускага сцэнічнага мастацтва, садзейнічаў яго станаўленню і развіццю.

Спрыяльны ўплыў на развіццё беларускай культуры і беларускага тэатральнага мастацтва аказала культура рускага, польскага і ўкраінскага народа.

У перыяд з 70-х па 90-я гг. XIX ст. мінскім гледачам былі паказаны лепшыя творы рускай і сусветнай класікі. У буйнейшых гарадах Беларусі гастралявалі тэатральныя калектывы, у склад якіх уваходзілі вядомыя майстры рускай сцэны М.Савіна, У.Давыдаў, К.Варламаў і інш.

У 90-я гг. на гастролях у Мінску знаходзіліся трупа маскоўскага Малога тэатра на чале з А..Яблачкінай і А.Южынай, Пецярбургская оперная трупа, якую ўзначальваў Я.Ізмайлаў, украінская трупа М.Старыцкага.

5 чэрвеня 1890 гг. быў урачыста адкрыты мінскі гарадскі тэатр (архітэктары К.УвядзенскІ і К.Казлоўскі). Месца для будаўніцтва было выбрана ў Аляксандраўскім скверы. Зараз гэта будынак тэатра імя Я.Купалы. Тэатр зрабіўся часткай гарадской культуры.

У 1898 г. узнікла прагрэсіўная культурна-асветніцкая арганізацыя "Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў", якая мела чатыры секцыі: літаратурную, драматычную, мастацкую і музычную. Гэтае таварыства з'яўлялася аб'яднаннем перадавой радыкальнай інтэлігенцыі і неўзабаве стала цэнтрам літаратурнага і тэатральна-музычнага жыцця Мінска.

У другой палове XIX ст. актывізавалася музычнае жыццё Беларусі. Ужо з 60-х гг. XIX ст. пачаліся частыя гастролі вядомых музычных і оперных калектываў, што дало беларусам магчымасць пазнаёміцца з лепшымі творамі айчынных і замежных кампазітараў. З вялікім поспехам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на Беларусі выступаў вядомы рускі хор Д.Славінскага, які папулярызаваў і беларускую народную песню.

У канцы XIX ст. на Беларусі з вялікім поспехам гастралявалі выдатныя выканаўцы — спевакі Л.Собінаў, М.Фігнер, Ф.Шаляпін, А.Мазіні, піяністы і кампазітары С.Рахманінаў, Л.Скрабін, А.Зілоці і іншыя славутыя артысты.

У 1892 і 1894 гг. у Мінску гастралявала руская оперная трупа пад кіраўніцтвам І.Шумана.

Параўнаўча высокая музычная культура тлумачылася грунтоўнай музычнай падрыхтоўкай, якую атрымлівала тады моладзь у навучальных установах. У праграмах семінарый, гімназій ёй надавалася значная ўвага. Існавалі і навучальныя ўстановы, што выпусцілі прафесійных музыкантаў. У 1871 гг. пры касцёле Святога Роха было створана Мінскае музычнае вучылішча арганістаў, адзінае такога тыпу на Беларусі.

Вялікае значэнне набыла дзейнасць музычных таварыстваў, якія наладжвалі публічныя канцэрты і музычныя вячоры, лекцыі аб жыцці і творчасці вядомых кампазітараў і выканаўцаў, адкрывалі музычныя навучальныя ўстановы і бібліятэкі.

У выяўленчым мастацтве другой паловы XIX ст. асноўнае месца займаў рэалізм. У беларускім жывапісе ў гэты час на першы план выходзіць гістарычны жанр. Адным з найбольш вядомых гістарычных жывапісцаў Беларусі другой паловы XIX ст. лічыцца К.Э.Альхімовіч (1840 — 1916**).** Ён стварыў палотны "Хрысціянскія пакутнікі", "Пахаванне Гедыміна", "Пасля бітвы", "Смерць Глінскага ў турме" і інш., якія сведчаць пра выдатнае веданне мастаком гісторыі роднага края. Плённа працаваў мастак і ў бытавым жанры, паказваючы жыццё і побыт сялян і дробнапамеснай шляхты. К.Альхімовіч шмат працаваў і як графік. У тэхніцы літаграфіі ім выкананы шматлікія ілюстрацыі да твораў А.Міцкевіча.

Да гістарычнага жанру непасрэдна прымыкаў бытавы. У гэтым жанры найбольш поўна выявіліся сацыяльныя сімпатыі жывапісцаў. У жывапісе, як і ў творах літаратуры, з'яўляецца вобраз селяніна-бедняка. Праз паказ галечы і разбурэння беларускага сялянства мастакі імкнуліся выклікаць спачуванне да простага народа і гэтым самым садзейнічаць абуджэнню самасвядомасці шырокіх працоўных мас. Вядомым майстрам бытавога жанру быў мастак Н.Ю.Сілівановіч (1830 — 1918). Ён напісаў карціны "Дзеці ў двары", "У школу", '"Пастух са Свянцяншчыны", "Салдат з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

хлопчыкам" і інш. Н.Сілівановіч зрабіў таксама шэраг манументальных роспісаў, мазаік, партрэтаў, пейзажаў.

Найбольш інтэнсіўна працэс дэмакратызацыі адбываўся ў жанры пейзажу. Пейзажысты імкнуліся адлюстраваць прыроду роднага края. Яны выбіралі мілыя іх сэрцу куткі беларускай зямлі, імкнуліся тым самым зрабіць сваё мастацтва блізкім і зразумелым простаму народу. Выдатным майстрам беларускага пейзажу быў мастак А.Гараўскі (1833 — 1900). Ён адлюстраваў родныя мясціны ў карцінах "Вечар у Мінскай губерні", "На радзіме", "Бераг ракі Свіслач" і інш. А.Гараўскі быў таксама выдатным партрэтыстам, імкнуўся ў сваіх творах раскрыць сацыяльны і псіхалагічны стан героя-сучасніка.

Адной з адметных рыс гісторыі беларускага жывапісу другой паловы XIX ст. з'яўляецца ўмацаванне сувязяў прагрэсіўных беларускіх мастакоў з мастакамі іншых брацкіх народаў. Многія славутыя мастакі Расіі, Польшчы, Літвы і Украіны доўга жылі і працавалі на Беларусі. Вялікі рускі мастак І.Я.Рэпін на працягу шэрага гадоў жыў недалёка ад Віцебска, у Здраўневе. Тут ён напісаў свае славутыя творы — кампазіцыйны партрэт "Беларус", "Во-сеньскі букет" (партрэт дачкі Веры) і інш. Па эцюдах, напісаных у Белавежскай пушчы, стварaў свае лепшыя карціны рускі пейзажыст І.І.Шышкін.

У другой палове XIX ст. адбыліся станоўчыя змены ў архітэктуры Беларусі. Галоўнае значэнне пачалі набываць грамадзянскае будаўніцтва і прамысловая архітэктура. Хутка развівалася будаўнічая тэхніка, выкарыстоўваліся новыя будаўнічыя матэрыялы. У цэнтральных раёнах з'явіліся асабнякі буржуазіі і шматпавярховыя будынкі фінансавых і гандлёва-прамысловых устаноў. У перыяд 1860 — 1890 гг. у архітэктуры Беларусі панаваў эклектызм (спалучэнне разнастайных мастацкіх элементаў у архітэктурных формах фасадаў і інтэр'ераў — старажытнарускага дойлідства, готыкі, барока, класіцызму).

Такім чынам, нягледзячы на вялікадзяржаўную палітыку царызму, развіццё беларускай культуры ў другой палове XIX ст. характарызавалася значнымі поспехамі і дасягненнямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Выдержки из документов

Хрестоматия по истории Белоруссии с дрвн. времён до 1917 г.

Сост. А. Игнатенко, В. Сидорцов. Мн. 1977

1.

1857 г. ноября 20. – Высочайший рескрипт генерал – губернатору Назимову о подготовке к введению новых инвентарных правил

Одобряя намерения представителей дворянства… Виленской и Гродненской губерний …, приступить к составлению проектов, на основании которых предложения комитетов могут быть приведены в действительное исполнение …

Для сего повелеваю:

1. Открыть … в губерниях Ковенской, Виленской и Гродненской по одному в каждой приготовительному комитету, а потом для всех трёх губерний вместе одну общую комиссию в Вильне.

3. Губернские комитеты по открытии их должны приступить к составлению подробного проекта об устройстве в улучшении быта помещичьих крестьян, имея … следующие главные основания.

1. Помещикам сохраняется право собственности на землю, но крестьянам оставляется их усадебная оседлость, которую они в течение времени приобретают в свою собственность посредством выкупа …

2. Крестьяне должны быть распределены на сельские общества, помещикам же предоставляется вотчинная полиция …

… Вы и начальники вверенных вам губерний обязаны строго наблюдать, чтобы крестьяне, оставаясь в полном повиновении помещикам, не внимали злонамеренным внушениям и лживым толкам.

Александр

2

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1861 г. февраля 19. – из местного Положения о поземельном устройстве крестьян

… 11. К первой полосе принадлежат губернии: … Витебская, Могилёвская …

16. В полосах первой … для определения количества мирской земли …, устанавливается по каждой местности два размера наделов на душу: высший и низший.

18. Если нынешний крестьянский надел превышает высший размер надела …, то помещику предоставляется отрезать сей излишек в своё распоряжение.

19. Если нынешний крестьянский надел менее низшего размера надела …, то помещику предоставляется или прирезать недостающее количество земли, или понизить повинности крестьян соразмерно количеству земли, недостающему против низшего размера надела …

168. За установленные Положением … душевые наделы, определяется высший «душевой» оброк в размерах: … в губерниях Витебской … Могилёвской … 8 руб. …

189. За высший … душевой надел назначается во всех трёх полосах 40 мужских и 30 женских рабочих дней в год.

3

1861 г. февраля 19. – водворённых на помещичьих землях в губерниях:

Виленской, Гродненской …, Минской и части Витебской.

…3. С обнародованием настоящего положения оставляются в постоянном пользовании временнообязанных крестьян «повинности в пользу владельцев все те усадебные и полевые земли и угодья, коими крестьяне пользовались до утверждения Положения, за исключением случаев, указанных в нижеследующих трёх статьях (ст. 4, 5, 6)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

11. Крестьянам оставляется тот водопой для скота, которым они пользовались. Если водопой этот был общим у помещика с крестьянами, то он остаётся в общем пользовании. От помещика зависит взамен общего, отвести крестьянам особый водопой …, по добровольному соглашению с ними, или, буде соглашения не последует, с разрешения мирового посредника… Господские леса остаются в … распоряжении помещика, хотя бы крестьянам отведены были в оных покосы; но в последнем случае, крестьяне, впредь до разграничения к одним местам угодий крестьянских от фольварковых, сохраняют право производить в сих лесах покос.

71. Земля, отведенная на основании уставной грамоты в крестьянский надел, остаётся за установленные повинности в постоянном пользовании…

76. Хотя право на охоту принадлежит помещику в пределах всего имения, однако крестьянам не возбраняется на мирской земле истреблять хищных или вредных … птиц и зверей…

84. Не дозволяется одному крестьянину содержать более трёх участков в пределах одного сельского общества …

88. В течение первых 9 лет со времени утверждения Положения каждый крестьянин обязывается держать в своём пользовании состоящий за ним подворный участок за установленные в пользу помещика повинности …

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4

1861 г. апреля 21. – Из доклада министра внутренних дел С. С. Ланского о проведении крестьянской реформы – волнений крестьян Виленской губ.

… Возникшие беспорядки в некоторых имениях Виленской губернии … (всего в 10 имениях) … были прекращены в большей части имений мерами вразумления. В некоторых имениях главные зачинщики арестованы, другие подвергнуты полицейскому наказанию… Более

упорное неповиновение, с сопротивлением власти было оказано крестьянами имений графини Замойской, помещика Милевского… Кроме отказа от исполнения повинностей, крестьяне собирались большими толпами и … в числе 2 тыч. человек расположились табором на площади местечка Ивья. Член Виленского губернского присутствия…, Умястовский, после неоднократных убеждений решился арестовать главных зачинщиков. От действия нескольких конных жандармов и частию пехоты, несколько крестьян получили сильные ушибы, - один из раненых 60-летний старик, вскоре потом умер. По арестовании зачинщиков остальные крестьяне изъявили покорность…

5

1861 г. – Из отчёта III отделения о крестьянском движении после опубликования манифеста – волнениях крестьян Виленской, Гродненской … губерниях

…В западных губерниях волнения крестьян начали проявляться после обнародования новых Положений от недостаточного понимания их, превратного объяснения нанятыми чтецами или применения местных Положений великороссийских и малороссийских губерний. Крестьяне приносили жалобы на обременениеих инвентарными повинностями, самовольно уменьшали или отказывались от барщины, равно от добавочных поголовных работ, называемых сгонами…, а в некоторых случаях упорно сопротивлялись властям…

Наиболее замечательные случаи неповиновений …, были следующие:… в Ошмянском уезде, …в разных имениях Виленского, Свентянского и Дисненского уездов…. В Брестском, Слонимском, Кобринском уездах в 38 имениях крестьяне отказались от повинностей и послушания местным властям. В эти уезды был командирован губернский штаб-офицер корпуса жандармов, который при содействии воинских команд прекратил волнения наказанием наиболее упорных крестьян и арестованием открытых подстрекателей к беспорядку.

6

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1863 г. – Из обзора МВД об обнародовании манифеста –

крестьянских волнениях с 1 января 1861 г. по 19 февраля 1863 г.

… Март прошёл спокойно, но с апреля месяца начались и шли, постоянно возрастая в числе, донесения из разных губерний о возникающих между крестьянами недоразумениях и волнениях… В том же апреле месяце было сообщено о волнениях крестьян Виленской губ. в уездах: Виленском, Ошмянском, Лидском…, в Гродненской – в уездах: Брестском, Пружанском, Кобринском… и в Инфляндских уездах Витебской губ.

… Все описанные беспорядки были подавлены в самом начале их, долее других волнения продолжались в Инфляндских уездах Витебской губ….В три месяца первой и в шесть – второй половины 1861 г. возникали беспорядки во многих других губерниях, но большею частью ограничивались одним имением и прекращались или посредством убеждений, или посредством полицейских мер, иногда с содействием военной силы, иногда без содействия.

Всех волнений и беспорядков в 1861 г. было: в первые после обнародования Положений три месяца (с апреля по июль) …647; затем в остальные шесть месяцев 137. Итого 784.

Во весь 1862 г. не было ни одного случая волнения, для прекращения которого потребовалось бы употребление силы оружия. Всех волнений и беспорядков в 1862 г. было: в первой половине … 300, во второй … 88. Итого …388. …А с 1 января до 19 февраля 1863 г. в министерстве не получено ни одного донесения о беспорядках… Число введённых в действие уставных грамот было: в первые 3 месяца 1862 г. …4278, во вторые 3 месяца … 13427.

7

1863 г. января 20. - Манифест польского правительства и временного провинциального правительства Литвы и Белоруссии о наделении крестьян землёй

…1. С сего дня все крестьяне … свободны, как потомственная шляхта.

2. Польское правительство передаёт крестьянам навечно без выкупа и платежей землю, которой они до сих пор владели, а все законы русского правительства отменяют, ибо это земля польская, а не русская.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Беларусь з’яўляецца шматнацыянальнай краінай, дзе пражывае 137 нацыянальнасцей і этнічных груп. Значную частку сярод іх займаюць яўрэі, татары, латышы і інш. На ўсіх этапах гістарычнага развіцця яны прымалі актыўны ўдзел у сацыяльна-эканамічным, грамадскім, культурным і навуковым жыцці краіны. Вывучэнне гісторыі Беларусі, на наш погляд, немагчыма без больш глыбокага астасавання гісторыі іншых народаў, якія пражываюць у рэспубліцы.

Мэтай семінара з’яўляецца паглыбленае вывучэнне гісторыі яўрэйскага, татарскага, латышскага і іншых народаў, якія насяляюць нашу краіну, іх побыту, традыцый, матэрыяльнай, духоўнай культуры і г.д.

Прыкладныя пытанні, якія магчыма абмеркаваць у час правядзення спецсемінара:

1. Гісторыя з’яўлення яўрэяў на землях Беларусі.
2. Становішча яўрэйскана насельніцтва ў Рэчы Паспалітай.
3. Адносіны самаўладдзя да яўрэяў пасля падзелаў Рэчы Паспалітай.
4. Удзел яўрэяў у сацыяльна-эканамічным жыцці Беларусі (апошняя чвэрць XVIII – XIX ст.).
5. Традыцыйная яўрэйская адукацыя.
6. Рэлігійнае жыццё яўрэйскага насельніцтва.
7. Структура і дзейнасць кагалаў.
8. Матэрыяльная і духоўная культура яўрэйскага насельніцтва.
9. Яўрэйскія грамадскія арганізацыі ў канцы XIX – пачатку XX ст.
10. Жыццёвы ўклад яўрэяў. Дабрачыннасць.
11. Удзел яўрэяў у грамадскім, навуковым і культурным жыцці.
12. Яўрэі ў рабочым і рэвалюцыйным руху.
13. Землі Латгаліі да ўваходжання ў склад расійскай імперыі.
14. Сацыяльна-эканамічнае становішча латышскіх паветаў у складзе Віцебскай губерні.
15. Этна-культурныя і бытавыя асаблівасці жыцця у Беларусі.
16. Жыццёвы ўклад, побыт, традыцыі латышскага насельніцтва.
17. Асвета і адукацыя ў латышскіх паветах Віцебскай губерні.
18. Перасяленчы рух латышоў на беларускіх землях.
19. Латышы ў грамадска-палітычным, рабочым і рэвалюцыйным руху ў другой палове XIX – пачатку XX ст.
20. Гісторыя з’яўлення татар на землях Беларусі.
21. Татары ў час ВКЛ.
22. Татары ў Рэчы Паспалітай.
23. Культура татарскага народа ў XIX – пачатку XX ст.
24. Удзел татарскага насельніцтва ў сацыяльна-эканамічным жыцці Беларусі.
25. Матэрыяльная і духоўная культура татар.
26. Матэрыяльная і духоўная культура татар.
27. Побыт, жыццёвы ўклад і традыцыі татарскага насельніцтва.
28. Удзел татар у грамадскім, культурным і навуковым жыцці Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура

1. Анішчанка Я. Падрыхтоўка да ўвядзення рысы аседласці на Беларусі (1781-1793) // Весці АН Беларусі. Сер. грам. нав.. 1993, № 1.
2. Адкуль паявіліся ў нас татары? 100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі. Мн., 1993.
3. Брокгауз и Эфрон. Евреи: Энциклопедия. Спб., 1906.
4. Вассерман Г. Лекции по иудаизму для начинающих. Вильнюс, 1990.
5. Гессен Ю. История еврейского народа. М., 1993.
6. Дубнов С. Судьба евреев в России. Спб., 1906.
7. Думін С., Канапацкі І. Беларускія татары: мінулае і сучаснае. Мн., 1993.
8. Іофе І. Калі пасяліліся на Беларусі габрэі. 100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі. Мн., 1993.
9. Иоффе Э. Страницы истории евреев Беларуси. Мн., 1996.
10. Кандэль Ф. Очерки времен и событий. Из истории российского еврейства. К. I-III. Израиль, 1988, 1990, 1993.
11. Іофе І. Калі пасяліліся на Беларусі габрэі. 100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі. Мн., 1993.
12. Лакотка А. Мячэці Беларусі // Культура. 1993.
13. Литература по истории и культуре евреев Беларуси (1990-1997). Библиографический список. Евреи Беларуси. Мн., 1997.
14. Прейгер Д., Телушкин Д. Восемь вопросов об иудаизме.
15. Скир А. Еврейская духовная культура в Беларуси. Мн., 1995.
16. Славутыя імёны бацькаўшчыны. Мн., 2000.
17. Станкевіч Я. Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом. Мн., 1991.
18. Соболевская О. Культурная жизнь гродненского еврейского общества в XIX веке. Евреи Беларуси. В. 1. Мн., 1997.
19. Тугай У. Латышскі этнас у сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Беларусі. Мн., 2003.
20. Тугай У. Латышы на Беларусі. Мн., 1999.
21. Ціток В. Татары. Этн. Бел.: Энц. Мн., 1989.
22. Шкуцько Л.Л. Яўрэі Мінскай губерні ў канцы XVIII – XIX ст. Мн., 1995.
23. Шкуцько Л.Л. Некаторыя аспекты ўдзелу яўрэяў у сацыяльна-эканамічным жыцці Магілёўскай губерні. Мн., 1994.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Кантрольны блок

Пытанні да экзамена

1. Гістарыяграфія па праблемам буржуазных рэформ другой паловы XIX ст.
2. Становішча ў сельскай гаспадарцы Беларусі ў канцы 40-ых – 50-ыя гады XIX ст.
3. Сутнасць і асаблівасці адмены прыгоннага права ў Беларусі.
4. Рэфармаванне дзяржаўнай вёскі і іншых катэгорый сялянскага насельніцтва.
5. Палітыка царызму ў сацыяльна-эканамічнай сферы ў 60-ыя–70-ыя гады XIX ст.
6. Вынікі і значэнне рэформы 1861 г.
7. Буржуазныя рэформы 60-ых–70-ых гадоў XIX ст. і асаблівасці іх правядзення ў Беларусі.
8. Судовая рэформа і асаблівасці яе правядзення ў Беларусі.
9. Гарадская рэформа і асаблівасці яе правядзення ў Беларусі.
10. Школьная і цэнзурная рэформы ў другой палове XIX ст. на тэрыторыі Беларусі.
11. Сутнасць контррэформ у 80-ыя–90-ыя гады XIX ст.
12. Развіццё капіталістычных адносін у вёсцы пасля адмены прыгоннага права.
13. Аграрны крызіс 80-ых гадоў XIX ст. і яго ўплыў на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі. Галоўныя накірункі спецыялізацыі.
14. Рост буржуазнага землеўладання ў Беларусі ў другой палове XIX ст.
15. Гістарыяграфія і крыніцы па праблеме развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі ў другой палове XIX ст.
16. Гістарыяграфія і крыніцы па праблеме развіцця прамысловасці ў другой палове XIX ст.
17. Асаблівасці развіцця прамысловасці Беларусі ў другой палове XIX ст.
18. Станаўленне фабрычна-заводскай вытворчасці Беларусі ў другой палове XIX ст.
19. Спецыялізацыя прамысловасці Беларусі ў другой палове XIX ст., стварэнне першых манапалістычных аб’яднанняў.
20. Фарміраванне гандлёва-прамысловай буржуазіі і прамысловага пралетарыяту ў другой палове XIX ст.
21. Чыгуначны, рачны, гарадскі грамадскі транспарт, сродкі сувязі ў другой палове XIX ст.
22. Станаўленне і развіццё банкаўска-крэдытнай сістэмы Беларусі ў другой палове XIX ст.
23. Гарады Беларусі ў другой палове XIX ст. Змены ў складзе гарадскога насельніцтва.
24. Мястэчкі Беларусі ў другой палове XIX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

25. Развіццё ўнутранага і знешняга гандлю Беларусі ў другой палове XIX ст.
26. Становішча сялянства Беларусі пасля правядзення рэформы 1861 г.
27. Сялянскі рух ў Беларусі ў 60-ыя–70-ыя гады XIX ст.
28. Сутнасць і асаблівасці сялянскага руху ў 80-ыя–90-ыя гады XIX ст.
29. Гістарыяграфія і крыніцы па праблеме паўстання 1863–1864 гг.
30. Прычыны і мэты паўстання 1863–1864 гг.
31. К. Каліноўскі – рэвалюцыянер-дэмакрат, яго ідэйна-палітычныя пазіцыі.
32. Газета “Мужыцкая праўда”, яе ідэйны змест.
33. Плыні нацыянальна-вызваленчага руху ў 60-ыя гады XIX ст.
34. Пачатак і ход паўстання 1863–1864 гг. на тэрыторыі Літвы і Беларусі.
35. Падаўленне і вынікі паўстання 1863–1864 гг.
36. Меры генерал-губернатара М. Мураўёва па падаўленню паўстання 1863–1864 гг.
37. Палітыка самадзяржаўя на беларускіх землях пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг.
38. Знакамітыя беларусы – удзельнікі паўстання 1863–1864 гг. (Ч. Чэрскі, К. Альхімовіч і інш.).
39. Народніцтва ў Беларусі. Эвалюцыя народніцтва ў 70-ыя–90-ыя гады.
40. Стварэнне і дзейнасць групы “Гоман”.
41. Народніцтва Беларусі ў другой палове 80-ых–90-ыя гады XIX ст. “Рабочая партыя вызвалення Расіі”.
42. Становішча рабочых Беларусі ў другой палове XIX ст.
43. Рабочы рух у Беларусі ў другой палове XIX ст., яго змест і асноўныя формы. Першыя сацыял-дэмакратычныя гурткі.
44. Сацыял-дэмакратычны рух у Беларусі ў 80-ыя–90-ыя гады XIX ст.
45. “Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага”, утварэнне і дзейнасць “Рабочага Саюза Літвы”.
46. БУНД – Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі, яго праграма і дзейнасць.
47. І з’езд РСДРП і абвяшчэнне сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі.
48. Гістарычныя ўмовы ўтварэння беларускай нацыі. Палітыка царызму ў Беларусі па нацыянальным пытанні. Роля канфесійнага пытання.
49. Тэорыя “Заходнерусізму” і яе паслядоўнікі ў Беларусі.
50. Палітыка царызму ў Беларусі ў галіне культуры ў другой палове XIX ст.
51. Адукацыя ў Беларусі ў другой палове XIX ст.
52. Навукова-этнаграфічныя і гістарычныя даследаванні ў другой палове XIX ст.
53. Беларуская літаратура ў другой палове XIX ст.
54. Беларускі жывапіс у другой палове XIX ст.
55. Тэатральнае мастацтва Беларусі ў другой палове XIX ст.
56. Музычнае мастацтва ў другой палове XIX ст.
57. Горадабудаўніцтва і архітэктура Беларусі ў другой палове XIX ст.
58. Перыядычны друк і кнігадрукаванне ў Беларусі ў другой палове XIX ст.
59. Беларуская графіка і скульптура ў другой палове XIX ст. (М. Андрыелі, А. Каменскі, Р. Слізень і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

60. Духоўная культура беларусаў у другой палове XIX ст. (святы, абрады і інш.).

«История Беларуси 1900-1914 гг.»

Змест вучэбнага матэрыялу

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў пачатку XX ст.

Гістарыяграфія развіцця эканомікі Беларусі ў пачатку XX ст. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Феадальна-прыгонніцкія перажыткі. Эміграцыя. Перапляценне капіталістычных і прыгонніцкіх формаў эксплуатацыі. Сацыяльныя і нацыянальныя працэсы ў Беларусі да рэвалюцыі 1905-1907 гг.Сацыяльная структура насельніцтва. Эканамічны крызіс.

Развіццё прамысловасці. Эканамічны крызіс 1900-1903 гг. Структура і характар прамысловасці ў пачакту XX ст. Пранікненне буйнога капіталу. Павелічэнне колькасці рабочага класу.

Эканамічнае развіццё Беларускіх губерняў у пачатку XX ст.

Галіновая структура прамысловасці. Спецыфіка развіцця прамысловасці ў Беларускіх губернях. Спецыялізацыя прамысловасці. Прамысловыя таварыствы і іх роля ва ўмацаванні цэнтралізацыі капіталу ў прамысловасці. Развіццё шляхоў зносін. Будаўніцтва чыгунак. Рост гарадоў. Павелічэнне колькасці рабочага класу. Нацыянальны і сацыяльны склад рабочага класу Беларусі і яго становішча. Уздым рабочага руху. Першыя палітычныя выступленні рабочых.

Рост буржуазнага землеўладання ў Беларусі. Фарміраванне аграрнай буржуазіі. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі. Формы і характар сялянскай барацьбы. Міграцыя і эміграцыя насельніцтва.

Утварэнне палітычных партый і арганізацый. Характар іх дзейнасці на Беларусі напярэдадні і ў перыяд першай Расійскай рэвалюцыі.

Народніцкія гурткі ў Беларусі. Характар і асаблівасці народніцва ў Беларусі. Крызіс народніцва. Група “Гоман”. Пачатак прапаганды марксізму. Першыя сацыял-дэмакратычныя гурткі. Э. Абрамовіч, І. Гурвіч. Утварэнне рабочых саюзаў. І з’езд РСДРП. Утварэнне рабочага саюза і Бунда. Утварэнне сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы. Узнікнне і праграмныя палажэні Беларускай сацыялістычнай грамады. Пазіцыі партый і арганізацый ў пярыяд першай расійскай рэвалюцыі.

Палітычныя партыі ў Беларусі на пярэдадні рэвалюцыі 1905 -1907гг.

Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцяў і нацыянальнага пытання. Уплыў эканамічнага крызісу. “Паліцэйскі сацыялізм”. Яўрэйская незалежная рабочая партыя. Сіянісцкі рух на Беларусі. Арганізацыя партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў і Польскай партыі сацыялістычнай на Літве іх дзейнасць і праграмныя палажэнні. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух. Утварэнне Беларускай сацыялістычнай грамады. Яе праграма і дзейнасць у 1903-1904 гг.

Рэвалюцыя 1905 – 1907 гг. у Беларусі.

Гістарыяграфія пытання. Прычыны і пачатак рэвалюцыі. рэвалюцыйны рух у студзені-верасні 1905 г. Студзеньскі рух салідарнасці рабочых Беларусі з рабочымі Пецярбурга. Вяснова-летні ўздым палітычных выступленняў і эканамічнай барацьбы рабочых. Сялянскія выступленні. Салдацкія выступленні. Адносіны палітычных партый, насельніцтва Беларусі да ўказа аб скліканні Булыгінскай думы.

Беларусь у пярыяд найвышэйшага ўздыма рэвалюцыі. кастрычніцкая палітычная стачка ў гарадах і мястэчках Беларусі. Вядучая роля чыгуначнікаў. Кааліцыйныя саветы і камітэты, іх партыйны склад, адрозненні ад Саветаў рабочых дэпутатаў. Маніфест 17 кастрычніка. Уздым сялянскага і салдацкага руху. Снежаньская палітычная стачка ў Беларусі. Выступленні ў Гомелі,Баранавічах і ў іншых гарадах. Звужэнне рабочага руху ў параўнанні з кастрычнікам. Падаўленне снежаньскіх выступленняў. Адступленне рэвалюцыіі. Прычыны паражэння рэвалюцыі.

Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі.

Дэпутаты Беларусі ў I і II Дзяржаўных думах. Новы выбарчы закон ад 11 снежня 1905 г. і адносіны да яго палітычных партый і арганізацый, рабочых і сялян. Прычыны правалу байкоту выбараў. Сацыяльна-класавы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

партыйны склад дэпутатаў I Дзяржаўнай думы ад 5 заходніх губерняў, змены ў партыйна-палітычных пазіцыях у ходзе думскай барацьбы. Першаснае значэнне аграрнага пытання. Адносіны кадэтаў і левых, дэмакратычных партый да роспуску I Дзяржаўнай думы. Выбары ў II Дзяржаўную думу. Змены ў тактыцы левых партый. Левы блок. Перамога на выбарах у II Дзяржаўную думу ад 5 заходніх губерняў рускіх і польскіх шавіністычна-клерыкальных груповак.

Рэвалюцыйныя падзеі 1905 -1907 гг. на Беларусі.

Наспяванне рэвалюцыйнай сітуацыі. Сацыяльныя і нацыянальныя супярэчнасці. Тры лагеры ў грамадска-палітычным руху. Пачатак рэвалюцыі. вызваленчы рух у студзені-верасні 1905г. уздым палітычных выступленняў і эканамічная барацьба рабочыхю уплыў рабочага руху на сялянства. Новыя формы сялянскага руху. Кастрычніцкая і снежаньская палітычныя стачкі. Маніфест 17 кастрычніка і рэпрэсіі царызму. Курлаўскі растрэл у Мінску.дыферэнцыяцыя грамадска-палітычных сіл. “Саюз рускага народа” і “Саюз 17 кастрычніка”. Характар іх дзейнасці ў Беларусі. Буржуазна-ліберальны рух і яго асаблівасці ў заходніх губернях. Змены ва ўмовах і характары дзейнасці дэмакратычных партый і прафесійных саюзах. Дэпутаты ад Беларусі ў I і II Дзяржаўных думах. Колькасць і сацыяльны склад.

Беларускі нацыянальны рух (1901 – 1914 гг.).

Гістарыяграфія пытання. Стварэнне Беларускай сацыялістычнай грамады. Яе праграмныя палажэнні і дзейнасць на пярэдадні рэвалюцыі. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у пярыяд рэвалюцыі 1905-1907 гг. Роля БСГ у развіцці беларускага нацыянальнага руху. Дзейнасць Беларускай сацыялістычнай грамады, яе лозунгі і патрабаванні ў 1905 г. II з’езд БСГ. Рэвалюцыйна-дэмакратычны характар газеты “Наша доля” (снежань 1906 г.). пазіцыт “Нашай нівы” падчас выбараў у II Дзяржаўную думу. Агульная характырыстыка дзейнасці БСГ у перыяд рэвалюцыі. Утварэнне польскіх нацыянальных партый. Іх праграмы і адносіны да рэвалюцыі 1905-1907 гг.

Сталыпінская аграрная рэформа.

Перадумовы правядзення рэформы. Прычыны і мэты аграрнай рэформы. Разбурэнне сялянскай абшчыны. Распаўсюджванне хутарской сістэмы землекарыстання. Перасяленчая палітыка. Вынікі і значэнне аграрнай рэформы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Развіццё прамысловасці. Прамысловы ўздым. Рост акцыянернага капіталу і далейшая спецыялізацыя прамысловасці, развіццё профільных галін. Асаблівасці прамысловасці Беларусі: высокая ўдзельная вага дробнакапіталістычнай і рамесна-саматужнай вытворчасці, пераважнае размеркаванне прадпрыемстваў фабрычна-завадскога і мануфактурнага тыпаў у сельскай мясцовасці, адсутнасць буйных прамысловых цэнтраў і інш. Прычыны гэтых асаблівасцей.

Сталыпінскія рэформы ў Беларусі і іх вынікі.

Гістарыяграфія пытання. Аграрная рэформа і развіццё сельскай гаспадаркі. Дваранскае і надзельнае сялянскае землеўладанне як аснова феадальна-прыгонніцкіх перажыткаў і тормаз прагрэсіўнага развіцця краіны. Мэты сталыпінскай аграрнай рэформы. Разбурэнне абшчыны, насаджэнне хутароў. Прапаганда хутарской гаспадаркі. Асаблівасці правядзенне рэформы у Беларусі. Спецыялізацыя гаспадаркі і рост вытворчасці. Узмацненне сацыяльна-класавай дыферэнцыяцыі сялянства. Прычыны і мэты земскай рэформы ў заходніх губернях. Яе асаблівасці. Значэнне ўвядзення выбарных земстваў ў Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях. Вынікі рэформы і яе значэнне. Асаблівасці развіцця прамысловасці Беларусі ў 1908-1914 гг.

Беларусь у трэцячэрвеньскі перыяд.

Грамадскі рух у пярыяд наступлення рэакцыі. Выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г. і яго асаблівасці ў Беларусі. Трэцячэрвеньская палітычная сістэма. Рэзкае аслабленне рэвалюцыйгых партый. Спецыфіка ліберальнага руху ў Беларусі. Палітычныя пазіцыі ўрадавых партый і арганізацый. Выбары ў III Дзяржаўную думу. Пазіцыі дэпутатаў ў думе па аграрнаму і нацыянальнаму пытаннях.

Трэцячэрвеньскі перыяд (1907 – 1912 гг.).

Адступленне рэвалюцыі. Выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г. Выбары і дзейнасць дэпутатаў ад Беларусі ў III і IV Дзяржаўных думах. Грамадска-палітычны рух пад час выбараў у IV Дзяржаўную думу. Утварэнне прагрэсіўнага блока. Беларускі нацыянальны вызваленчы рух у 1907 – 1914 гг. Гуртаванне беларускіх нацыянальных дзеячоў вакол “Нашай нівы”. Шавінізм у рангу дзяржаўнай палітыкі, барацьба з беларускім адраджэннем.ідэалогія іпрактыка “западна-русізма” Палітычны застой.

Беларусь у гады Першай сусветнай вайны (1914 – 1916 гг.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пачатак вайны. Увядзенне ваеннага становішча ў беларускіх губернях. Мабілізацыйныя прадпрыемствы. Адносіны да вайны розных слаёў насельніцтва, палітычных і грамадскіх арганізацый, газеты “Наша ніва”.

Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў 1915-1916 гг. Захоп немцамі Заходняй Беларусі. Нямецкі акупацыйны рэжым. Беларускія землі ў складзе Обэр Ост. Палітыка нямецкай адміністрацыі ў адносінах да беларусаў. Дзейнасць “Беларускага камітэта дапамогі ахвярам вайны” на тэрыторыі, акупаванай немцамі. Беларускае школьніцтва, культурна-асветніцкая справа ва ўмовах нямецкай акупацыі 1915-1916 гг.

Становішча на беларускіх землях у складзе Расійскай дзяржавы пад час першай сусветнай вайны. Умовы існавання насельніцтва. Ваенныя павіннасці. Мілітарызацыя прамысловасці і транспарту. Заняпад сельскай гаспадаркі. Харчовы крызіс.змены ў складзе насельніцтва. Размяшчэнне войскаў і органаў іх кіравання. Бежанства ў Беларусі. Колькасць і склад бежанцаў, умовы іх існавання. Палітыка ўрада ў адносінах да бежанцаў. Стварэнне “камітэтаў дапамогі ахвярам вайны” і іх дзейнасць.

Беларускі народны камітэт і Цэнтральны саюз беларускіх нацыянальных грамадскіх арганізацый. Стварэнне Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай групы. Заснаванне “Канфедэрацыі Вялікага княства літоўскага”.

Культура Беларусі ў пачатку XX ст. (1901 – 1914 гг.).

Палітыка царызму ў Беларусі ў галіне культуры. Асвета. Пачатковая і сярэдняя адукацыя. Тыпы і колькасць школ. Афіцыйны друк. Беларускі фальклор. Быт і матэрыяльная культура. Этнаграфічныя і гістарычныя даследванні. Градабудаўніцтва і архітэктура. Навуковыя даследванні мовы, этнаграфіі і гісторыі Беларусі. Я. Карскі, М. Федараў, Е. Раманаў, М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі, Я. Лёсік.

Зрухі ў развіцці беларускай мастацкай літаратуры, нацыянальнай драматургіі, літаратурнай крытыкі і публітыстыкі. Я. Колас, Я. Купала, М. Багдановіч, Цётка, К. Каганец, Ц. Гартны, З. Бядуля. Развіцц1ё перыядычнага друку і кнігадрукавання. Беларускія газеты “Дзяньніца”, “Гоман”, “Грамада” і інш. Беларускія выдавецтвы “Загляне сонца ў наша ваконца”, “Наша Ніва”, “Саха”. “Наша хата”, “Беларус”.

Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. “Беларускія вечарынкі”, першая беларуская трупа І. Буйніцкага. Культурна-асветніцкія таварыствы і драматычныя гурткі ў гарадах і мястэчках Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Жывапіс. Пераважнае развіццё жанру краявіду. Г. Вейсенгоф, С. Жукоўскі, В. Бялыніцкі-Біруля. Развіццё бытавога жанру. Уклад у яго развіццё Ю. Пэна. Партрэты работы Я. Кругера, Л. Альпяровіча. Разнастайнасць ісупярэчлівасць выяўленчага мастацтва ў рэвалюцыйны час. М. Шагал, К. Малевіч, М. Філіповіч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура асноўная.

1. Гісторыя Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. у дакументах і матэрыялах. Хрэстаматыя / уклад., навук. рэд. А. Ф. Смалянчук. – Вільня: ЕГУ, 2007. – 302 с.
2. Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму: вучэб. Дапам. У 5 ч. / склад. А. П. Жытко [і інш.]; пад агул. рэд. А. П. Жытко. – Мінск: БДПУ, 2005 – 2011. – Ч. 1-5.
3. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т.4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.). – Мінск, 2005 г.
4. Гісторыя беларускага мастацтва. – Мінск, 1989. – Т. 3.
5. Гісторыя беларускага тэатра. – Мінск, 1985. – Т. 2.
6. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. / рэдкал.: І.М. Ігнаценка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972-1975. – Т. 2.
7. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён. У 3 т. – Мінск, 2002.- Т. 2.
8. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2 . 1772 – 1903 / пад рэд. Н.М. Нікольскага. – Мінск, 1940.
9. Документы и материалы по истории Белоруссии (1900 - 1917). Т. 3. / под. ред. В.Н. Перцева. – Минск, 1953.
10. Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі. – Мінск, 1994.
11. Забаўскі, М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1907 -1917). / М. М. Забаўскі. – Мінск. 1999.
12. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 т. Т.1. – Мінск. 1994.
13. Туронак, Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. / Ю. Туронак . – Мінск. 1993.
14. Эканамічная гісторыя Беларусі: курс лекцый / пад агул. рэд. В.І. Галубовіча. – Мінск: Фірма “Экаперспектыва”, 1993. – 287 с.
15. Экономика Белоруссии в эпоху империализма. 1900-1917 / под ред. Г.Т. Ковалевского [и др.]. – Минск: Изд-во Акад.наук БССР, 1963. – 422 с.

Літаратура дадатковая.

15. Аврех, А.Я. П.А. Столыпин и судьбы реформ в России. / А.Я. Аврех. – М. 1991.
16. Бич, М.О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861 – 1904 гг. / М.О. Бич. – Минск: Наука и техника, 1983.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

17. Воранава, А.І. Рабочы рух у Беларусі напярэдадні і ў перыяд рэвалюцыі 1905-1907 гг. / А.І. Воранава. – Мінск: Выд-ва Акад. навук БССР, 1960. – 235 с.
18. Жытко, А.П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861-1914 гг. / А.П. Жытко. – Мінск: БГПУ. 2003. – 233 с.
19. Забаўскі, М.М. Буржуазныя рэформы ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.: вучэб.-метад. дапаможнік / М.М. Забаўскі, А.Ф. Рацько. – Мінск: БДПУ, 2004. – 64 с.
20. Зайцева, Л.И. Аграрная реформа П.А. Столыпина в документах и публикациях конца XIX — начала XX века. / Л.И. Зайцева. – М., 1995.
21. Зырянов, П.Н. Петр Столыпин. Политический портрет, М. 1992.
22. Палітычныя партыі Беларусі.- Мінск, 1994.
23. Революционное движение в Белоруссии. 1905 -1907 гг. : Документы и материалы. – Минск, 1995.
24. Смалянчук, А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. / А. Ф. Смалянчук. – Санкт-Петербург, 2004.
25. Снапкоўская, С.В. Шляхі развіцця школы на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. / С. В. Снапкоўская. – Мінск, 1997.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэматыка практычных заняткаў.

Тэма I: Эканамічнае развіццё Беларускіх губерняў у пачатку XX ст.

1. Развіццё прамысловасці і гандлю. Транспарт і шляхі зносін.
2. Сацыяльнае становішча рабочых: колькасць, склад, умовы працы.
3. Эканамічная і палітычная барацьба рабочых.
4. Памешчыцкае і сялянскае землеўладанне.
5. Формы сялянскіх выступленняў.
6. Разлажэнне сялянства на мяжы XX ст.

Тэма II: Палітычныя партыі ў Беларусі на пярэдадні рэвалюцыі 1905 - 1907 гг.

1. “Паліцэйскі сацыялізм”. Дзейнасць Зубатава 1901 – 1903 гг.
2. Дзейнасць партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў.
3. ППС на Літве 1902 – 1903 гг.
4. Утварэнне і дзейнасць Беларускай сацыялістычнай грамады 1902 – 1904 гг.

Тэма III: Рэвалюцыйныя падзеі 1905 -1907 гг. на Беларусі. (4 г.)

1. Гістарыяграфія пытання.
2. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей і нацыянальнага пытання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Тры лагеры ў грамадска-палітычным руху.
4. Пачатак рэвалюцыі. Вызваленчы рух у студзенні – верасні 1905 г.
5. Кастрычніцкая і снежаньская палітычныя стачкі.
6. Маніфест 17 кастрычніка. Адносіны да маніфеста палітычных партый.
7. Дыферэнцыяцыя грамадска-палітычных сіл.
8. Выбары і дзейнасць дэпутатаў ад Беларусі ў I Дзяржаўнай думе Расіі.
9. II Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі. Адступленне рэвалюцыі.

Тэма IV Беларускі нацыянальны рух (1901 – 1914 гг.).

1. Нацыянальна-вызваленчы рух у пачатку XX ст.
2. Нацыянальна-вызваленчы рух у гады рэвалюцыі (1905 -1907 гг.).
3. Польскі нацыянальны рух.

Тэма: V Сталыпінскія рэформы ў Беларусі і іх вынікі.

1. Гістарыяграфія пытання.
2. Палітычныя і ідэалагічныя ўмовы правядзення рэформы.
3. Асаблівасці эканамічнай сітуацыі пяці заходніх губерняў.
4. Скасаванне абшчыны пераход надзельнай зямлі ва ўласнасць сялян.
5. Арганізацыя перасялення сялян ў азіацкую частку Расіі. Адыходніцтва.
6. Земская рэформа на Беларусі.
7. Вынікі рэформ для Беларусі.
8. Развіццё прамысловасці ў Беларусі 1908 – 1914 гг.

Тэма VI Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў сувязі з увядзеннем земстваў.

1. Прычыны і мэты земскай рэформы ў Заходніх губернях.
2. Значэнне ўвядзення выбарных земстваў у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях.
3. Грамадска-палітычны рух у час выбараў у IV Думу.

Тэма VII Развіццё культуры ў пачатку XX ст.

1. Развіццё літаратуры і мастацтва.
2. Стварэнне беларускага друку і беларускіх выдавецтваў.
3. Беларускі тэатр у пачатку XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Навука і навуковыя даследванні.
5. Архітэктара Беларусі ў пачатку XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ.

1. Стан гарадоў Беларусі ў пачатку XX ст.

2. Маніфест 17 кастрычніка і Беларусь.
3. Курлаўскі расстрэл.
4. Адносіны БСГ і газеты “Наша ніва” да Расійскай Думы першага і другога склікання.
5. БСГ у час рэвалюцыі 1905 -1907 гг.
6. Нацыянальнае пытанне ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі ў 1907 – 1914 гг.
7. Адносіны да сталыпінскіх рэформ палітычных партый і груп у Беларусі.
8. П. А. Сталыпін.
9. Спецыфіка ліберальнага руху ў Беларусі.
10. Партыі народніцкага тыпу ў 1907 – 1914 гг.
11. Газета “Наша ніва” – цэнтр нацыянальнага адраджэнскага руху.
12. Жыццё і творчасць М. Багдановіча, Цёткі, Я. Коласа на пачатку XX ст.
13. Беларуская нацыянальная драматургія.
14. Я. Карскі і яго праца “Беларусы”.
15. Бежанства з тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНА

Гісторыя Беларусі (1900 – 1914 гг.).

1. Гістарыяграфія праблемы развіцця эканомікі Беларусі ў пачатку XX ст.
2. Развіццё прамысловасці ў пачатку XX ст.
3. Становішча рабочага класа (1900 -1908 гг).
4. Сельская гаспадарка у пачатку XX ст.
5. Нацыянальны і сацыяльны састаў рабочага класа.
6. Колькасць і сацыяльная структура насельніцтва Беларусі у пачатку XX ст.
7. Перадумовы ўзнікнення палітычных партый і асаблівасці станаўлення апошніх на Беларусі.
8. Пачаткак дзейнасці агульнарасійскіх партый і груповак.
9. Узнікненне беларускіх партый і арганізацый.
10. Нацыянальна-вызваленчы рух у пачатку XX ст.
11. Пазіцыі партый і арганізацый у перыяд уздыму першай Расійскай рэвалюцыі.
12. Гістарыяграфія рэвалюцыі 1905-1907 гг.
13. “Паліцэйскі сацыялізм”. ЯНРП.
14. Тры лагеры ў грамадска-палітычнум руху.
15. Утварэнне Беларускай сацыялістычнай грамады.
16. Бундаўскія арганізацыі у Беларусі 1900 – 1904 гг.
17. Узнікненне і дзейнасць арганізацый РСДРП на Беларусі.
18. Прычыны і пачатак рэвалюцыі.
19. Рэвалюцыйныя падзеі на Беларусі вясной – летам 1905 г.
20. Булыгінская Дума.
21. Кастрычніцкая палітычная стачка.
22. Маніфест 17 кастрычніка. Курлаўскі растрэл.
23. Ліберальна- дэмакратычныя партыі на Беларусі.
24. Арганізацыі манархічных партый на Беларусі.
25. Снежаньскія падзеі 1905 г. у Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

26. Нацыянальна-вызваленчы рух у гады рэвалюцыі 1905 – 1907 гг.
27. Польскі нацыянальны рух.
28. Прычыны паражэння і вынікі рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. для Беларусі.
29. Выбары ў I Думу ў заходніх губернях.
30. Выбарчая кампанія ў II Дзяржаўную думу.
31. Гістарыяграфія пытання сталыпінскія рэформы ў Беларусі.
32. Неабходнасць правядзення сталыпінскай рэформы.
33. Скасаванне абшчыны. Пераход надзельнай зямлі ва ўласнасць сялян.
34. Перасяленчая палітыка. Адыходніцтва.
35. Прамысловае развіццё Беларусі ў 1908 – 1913 гг.
36. Вынікі і значэнне аграрнай рэформы П.А. Сталыпіна.
37. Значэнне ўвядзення земстваў у Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай губернях.
38. Сутнасць трэцячэрвеньскай выбарчай сістэмы.
39. Выбары ў III Дзяржаўную думу ад заходніх губерняў і іх вынікі.
40. Дэтутаты ад Беларусі ў IV Дзяржаўнай думе.
41. Палітычны застой (1912 – 1914 гг.).
42. Шавінізм у рангу дзяржаўнай палітыкі.
43. Пачатак Першай сусветнай вайны і стаўленне да яе на Беларусі.
44. Ваенныя падзеі на тэрыторыі Беларусі ў 1915 – 1916 гг.
45. Змены ў сацыяльна-эканамічным становішчы Беларусі з пачаткам Першай сусветнай вайны.
46. Рабочы, сялянскі і салдацкі рух на Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны.
47. Бежанства з тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны.
48. нацыянальная палітыка нямецкіх акупацыйных улад на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны.
49. Сацыяльна-эканамічнае становішча беларускіх зямель пад нямецкай акупацыяй у гады Першай сусветнай вайны.
50. Адукацыя на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны.
51. Беларускі нацыянальны рух на акупаванай тэрыторыі ў гады Першай сусветнай вайны.
52. Палітыка царызму ў Беларусі ў галіне культуры.
53. Развіццё літаратуры ў пачатку XX ст.
54. Мастацтва ў пачатку XX ст.
55. Стварэнне беларускага друку і беларускіх выдавецтваў.
56. Беларускі тэатр у пачатку XX ст.
57. Адукацыя ў Беларусі ў пачатку XX ст.
58. Навука і навуковыя даследванні ў пачатку XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

59.Газета “Наша ніва”- цэнтр беларускага адраджэнцкага руха.
60.Дзейнасць суполкі “Загляне сонца ў наша аконца”.

ВУЧЭБНЫ БЛОК
КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ

Лекцыя 1: ***Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў 1900-1904 гг.***

Ключавыя паняцці: капіталізм, імперыялізм, эканамічны крызіс, сельская гаспадарка, спецыялізацыя, прамысловасць, манаполія, акцыянернае таварыства, нацыянальны склад, сацыяльная структура, прамысловая буржуазія, сельская буржуазія, міграцыя, эміграцыя.

План

1. Гістарыяграфія праблемы развіцця эканомікі Беларусі ў пачатку XX ст.
2. Развіццё капіталізму у сельскай гаспадарцы. Сацыяльныя і нацыянальныя працэсы у Беларусі.
3. Развіццё прамысловасці, яе структура.
4. Нацыянальны і сацыяльны склад рабочага класа, яго становішча.

Канспект лекцыі.

1.***Гістарыяграфія праблемы развіцця эканомікі Беларусі ў пачатку XX ст.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гістарыяграфічная спадчына па гісторыі Беларусі пачатку XX ст. даволі багатая. Важнейшыя праблемы, якія цікавілі даследчыкаў раней і застаюцца ў полі зроку сучасных гісторыкаў, гэта палітыка царызму на тэрыторыі Беларусі, сацыяльна-эканамічнае становішча, развіццё культуры, фарміраванне класаў буржуазнага грамадства, Беларусь у гады першай сусветнай вайны і інш.

Гісторыя Беларусі, як і гісторы іншых краін, вывучаецца на падставе разнастайных гістарычных крыніц: пісьмовых, рэчавых, этнаграфічных, моўных, фальклорных, кіна-, фота-, фонадакументаў. Найбольшае значэнне з іх, безумоўна, маюць пісьмовыя крыніцы. Яны складаюць фундамент гістарычных даследванняў і з'яўляюцца асновай гістарычнай навукі.

Пісьмовыя крыніцы па гісторыі Беларусі пачатку XX ст. вельмі шматлікі і разнастайны. У адрозненні ад папярэдніх перыядаў яны больш разнапланавы і багатыя. Спынімся на характырыстыцы асноўных груп: матэрыялы заканадаўства, афіцыйныя справаводства, дакументы палітычных партый і арганізацый, эканамічна-геаграфічныя і гаспадарчыя апісанні, статыстычныя матэрыялы, эпісталярныя і мемуарныя крыніцы, тагачасная літаратура і перыядычны друк.

Помнікі заканадаўства пачатку XX ст. прадстаўленны законамі, маніфестамі, палажэннямі, указамі, рэскрыптамі расійскага ўрада і дазваляюць прасачыць палітыку самадзяржаўя на Беларусі. Асноўнай публікацыяй крыніц падобнага роду з'яўляецца "Поўны збор законаў Расійскай імперыі" (ПЗЗ).

Аб'ёмную і цікавую групу дакументаў складаюць матэрыялы справаводства цэнтральных і мясцовых органаў дзяржаўнай улады Расійскай імперыі (міністэрстваў, Сінода, канцэлярый губернатараў і інш.), судова-следчых устаноў, а таксама банкаў, прыватных прадпрыемсв і г.д. Тут фіксавалася пераважная большасць падзей эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця Беларусі разглядаемага перыяду. Сёння матэрыялы справаводства знаходзяцца ў буйных архіўных сховішчах Мінска, Гродна, Вільнюса, Масквы і Санкт-Пецярбурга.

Абшырны матэрыял аб падзеях эканамічнага і сацыяльнага жыцця, генеалогіі, культуры даюць матэрыялы шляхецкага самакіравання, архівы дзеячоў культуры, навучальных устаноў. Звесткі аб палітыных працэсах і падзеях, сацыяльных канфліктах, вызваленчым руху на тэрыторыі Беларусі ўтрымліваюць дакументы аб дзейнасці палітычных партый, розных нелегальных арганізацый (напрыклад, комплекс дакументаў РСДРП і іншых палітычных партый і грамадска-палітычных арганізацый Беларусі). Гэтыя матэрыялы маль не апрацаваны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асноўную групу дакументаў, якія адлюстроўваюць гісторыю Беларусі акрэсленнага перыяду, прадстаўляе комплекс эканамічна-геаграфічных і гаспадарчых апісанняў пачатку XX ст. (ваенна-тапаграфічныя апісанні).

Вялікае значэнне маюць, таксама статыстычныя матэрыялы. Яны складаюць аснову для характырыстыкі сацыяльна-эканамічных, дэмаграфічных і культурных працэсаў. Цікавыя і каштоўныя звесткі аб гэтых працэсах утрымліваюць статыстычныя зборнікі, якія выдаваліся ў Расіі рознымі дзяржаўнымі ўстановамі. Гэта – ваенна-статыстычныя агляды Расійскай імперыі, статыстыкі землеўадання (“Статыстыка землеўладання ў 1905 г.”), статыстычныя зборнікі па стану асветы “Статыстычныя звесткі аб пачатковай адукацыі ў Расійскай імперыі (1900-1902)”, адрас-календары, агляд губерняў. Гэтыя матэрыялы дазваляюць рознабакова і адносна аб’ектыўна ахарактарызаваць сацыяльна-дэмаграфічную, прафесійную і саслоўную структуру насельніцтва Беларусі, прааналізаваць вынікі нацыянальнай палітыкі царызму і эвалюцыі сацыяльна-эканамічных працэсаў, якія адбываліся на яе тэрыторыі ў пачатку XX ст.

У пачатку XX ст. з’явілася вялікая колькасць крыніц асабістага характару – мемуары, дзённікі, нататкі, лісты. Мемуарная літаратура адлюстроўвае шырокі спектр сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага, рэлігійнага і культурнага жыцця Беларусі (напрыклад, мемуары П. Курлава, А. Луцкевіча і інш.).

Асобную і істотную групу крыніц складаюць матэрыялы перыядычнага друку пачатку XX ст. У гэты час павялічылася колькасць дзяржаўных і прыватных перыядычных выданняў, з’явіўся беларускамоўны легальны друк, матэрыялы якога дазваляюць узнаць многія старонкі гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху, жыцця рабочых, сялян і інш. (“Наша ніва”, “Наша доля”, “Мінскі лісток”).

Вывучэнне сацыяльна-эканамічных праблем заўсёды з’яўлялася адным з вядучых напрамкаў гістарыяграфіі. Але разгляд эканамічнага мінулага Беларусі як асобнай тэрыторыі пачаўся толькі ў савецкі час. Нягледзячы на ідэалагічныя абмежаванні беларуская савецкая гістарыяграфія налічвае некалькі даволі грунтоўных калектыўных і манаграфічных прац. Першым значным даследваннем абагульняючага характару стала манаграфія М. Доўнара-Запольскага “Народное хозяйство Белоруссии в 1861 – 1914 гг.” У ёй вучоны зрабіў спробу навукова абгрунтаваць свой ранейшы тэзіс аб эканамічнай сваеасаблівасці беларускіх губерняў Беларусі ў пачатку XX ст. Прынцыпова важнай з’яўляецца выснова аўтара адносна характырыстыкі другой паловы XIX – пачатку XX ст., як аб часе індустрыалізацыіі беларускіх зямель.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Агульным для работ, у якіх закранаюцца пытанні эканамічнай гісторыі Беларусі, з'яўляецца ўстанаўленне непарыўнай сувязі паміж развіццём рыначных, капіталістычных адносін і эвалюцыяй грамадства. Прамысловае развіццё Беларусі асветляецца ў працах Д.А. Дудкова "Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.", М.Ф. Болбаса. Гэта тэма закранута таксама ў манаграфіях, прысвечанных гісторыі пралетарыята Беларусі.

Гісторыя рабочага класа была адной з вядучых тэм у беларускай гістарыяграфіі XX ст. У 20-80-я гг. убачылі свет дзесяткі манаграфій, шмат артукулаў, у якіх разглядаліся розныя аспекты гэтай праблемы. У іх аўтары паказалі перадумовы і ўмовы фарміравання пралетарыяту, яго структуру і склад, прававое і эканамічнае становішча. У даследваннях прыводзяцца статыстычныя паказчыкі, якія характырызуюць дынаміку і размах асноўных формаў рабочага руху. Ватра заўважыць, што амаль да сярэдзіны 80-х гг. XX ст. эканамічная і палітычная барацьба рабочых Беларусі асвятлялася пераважна пры дапамозе ілюстрацыйна-апісальнага метаду. Апрача таго, вузкае кола выкарыстаных крыніц не дазваляла іх аўтарам даць поўную карціну рабочага руху Беларусі на рубяжы XIX – XX ст. Гэтыя недахопы ў значнай ступені былі пераадолены ў даследваннях М.О. Біча "Рабочее движение в Белоруссии в 1861-1904 гг.", Э.М.Савіцкага "Рабочее движение в Белоруссии (июль 1907 – февраль 1917 г.)", у абагульняючым выданні па гісторыіі рабочага класа Беларусі "История рабочего класса Белорусской ССР" у 4 тамах. Том 1 "Рабочий класс Белоруссии в период капитализма". Аўтары фактычна нанова, па першакрыніцах даследвалі рабочы рух ад рэформы 1861 г. да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Пры асвятленні многіх пытанняў яны шырока выкарысталі розныя статыстычныя выданні і перыядычны друк канца XIX – пачатку XX ст., а таксама новыя архіўныя матэрыялы.

Прыкметнае месца ў работах гісторыкай XX ст. займала асвятленне ідэйна-арганізацыйнага росту рабочага руху пад уплывам распаўсюджвання марксізму, дзейнасці сацыял-дэмакратычных арганізацый, а таксама рэвалюцыйнай сувязі рабочых Беларусі і Расіі. Адзначым такія працы: А.І. Воранава "Рабочы рух у Беларусі напярэдадні і ў перыяд рэвалюцыі 1905-1907 гг.", Т.Е. Саладкоў "Борьба трудяшихся Белоруссии против царизма", М.О. Біч "Развитие социал-демократического движения в Белоруссии в 1883-1903 гг.", В.Г. Філякоў "Революционные связи рабочих Белоруссии и России в конце XIX – начале XX в. (1895 – 1907 гг.)".

Савецкая гістарыяграфія шмат дзесяцігодзяў зыходзіла з тэзісу аб каланіяльным становішчы Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. Цалкам у рэчышчы такіх поглядаў напісана кніга І.І. Саладкова "Социально-экономическое положение Белоруссии до Великой Октябрьской социалистической революции

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(конец XIX – начало XX в.)” і калектыўнай манаграфіі “Экономика Белоруссии в эпоху империализма”. І толькі ў 1965 г. В.В. Цімашэнка змагла даць прынцыпова іншы адказ на гэта складанае пытанне. У апошняе дзесяцігодзе з’явіліся новыя доказы эканамічнай самадастатковасці Беларусі, аб гэтым гаворыца ў артыкулах А.Л. Кіштымава.

Важныя сацыяльна-эканамічныя аспекты станаўлення капіталістычнага ладу ў беларускай вёсцы, развіццё сельскагаспадарчага рынку, змены ў структуре землеўладання і землекарыстання, формы і роля феадальна-прыгонніцкіх перажыткаў, сацыяльнае разлажэнне сялянства, фарміраванне класаў аграрнай буржуазіі і сельскагаспадарчага пралетарыяту даследванны ў кнігах Д.А. Дудкова “Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў другой палове XIX і пачатку XX стагоддзя”, Л.П. Ліпінскага “Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии”, Х.Ю. Бейлькіна “Сельскохозяйственный рынок Белоруссии. 1861-1914 гг.”.

Праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускай парэформеннай вёскі з’явіліся прадметам даследванняў В.П. Панюціча. У яго працах асвятляюцца пазямельная палітыка царскага ўрада, прадукцыйныя сілы сельскай гаспадаркі, дыферэнцыяцыя сялянства, выкарыстанне наёмнай працы ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Вывучаюцца дэмаграфія сялянскага насельніцтва, аграрнае перасяленне. Адыходніцтва, сацыяльная арганізацыя сялян, сямейныя падзелы. Працы: “Из истории формирования пролетариата Белоруссии. 1861-1914 гг.”, “Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861-1900 гг.”, “Наемный труд в сельском хозяйстве Белоруссии. 1861-1914 гг.”.

Вялікую ўвагу гсторыкаў прыцягвалі хваляванні сялян. Адным з першых даследчыкаў сялянскага руху Беларусі быў У.І. Пічэта “Крестьянское и рабочее движение в Белоруссии в эпоху 1905 года”, “Крестьянское движение в Белоруссии в 1905 году”. У пачатку 30-х гадоў даследванне гэтай тэмы працягваў К.І. Кернажыцкі “Да гісторыі аграрнага руху на беларусі перад імперыялістычнай вайной”.

У 50-80-я гг. тэматыка сялянскага руху выйшла на адно з першых месцаў у беларукай гістарыяграфіі. Асаблівай увагі сярод іх заслугоўвае кніга К. Шабуні “Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905 1907 гг.”.

Апошняя абагульняючая праца па гісторыі сялянства Беларусі была выдадзена ў 2002 годзе “Гісторыя сялянства Беларусі” 3 томах, том 2 “Ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г.”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. *Развіццё капіталізму у сельскай гаспадарцы. Сацыяльныя і нацыянальныя працэсы у Беларусі.*

У пачатку XX ст. сельская гаспадарка Беларусі пад уплывам попыту рынку рабілася ўсё больш гандлёвай, капіталістычнай. Землеўладанне у пачатку XX ст. мела паўпрыгонніцкі характар.

Дваранскае землеўладанне паменшылася на 906,5 тыс. дзесяцін, а яго ўдзельная вага ў агульнай плошчы – на 9,3 %. Скарачэнне дваранскага землеўладання ішло хутчэй у раёнах змешаннага вядзення памешчыцкай гаспадаркі. У Віцебскай губерні дваране страцілі 33,1 %, а ў Магілёўскай – 32,5 % зямлі.

Рознасаслоўнае (недваранскае) прыватнае землеўладанне павялічылася ў 3,5 раза, а ўдзельная вага яго ў агульнай плошчы – з 5,1 да 16 %. Асабліва хутка расло прыватнае землеўладанне сялян. Плошча ненадзельных, купчых зямель у сялян павялічылася да 1613,5 тыс., або ў 8 разоў.

Нягледзячы на скарачэнне дваранскага землеўладання і значны рост разнасаслоўнай буржуазнай зямельнай уласнасці, на пачатку XX ст. асноўнымі ўласнікамі зямлі з'яўляліся дваране. Ім належыла 41 % усіх зямель Беларусі. Найбольш вылікім буйнапамеснае землеўладанне было ў Мінскай губерні. Тут маёнткам звыш 500 дзесяцін належыла 52 % усёй зямлі. У Віленскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях такія памешчыкі мелі да 31 % усёй зямлі. Менш буйных маёнткаў было толькі ў Гродзенскай губерні, хоць яны займалі 23 % усёй зямельнай плошчы.

Сярэдніх і дробных уладанняў было параўнальна нямнога. Уладанняў ад 100 да 500 дзесяцін налічвалася 10,1 %. Ім належала 1,2 млн. дзесяцін, што складала 6,5 % усіх зямель.

Большасць прыватных асабістых уладанняў (30754) былі памерам да 20 дзесяцін зямлі. Такім чынам, памешчыкам, якія ўладалі маёнткамі (звыш 100 дзесяцін), належыла 46,1 % усёй зямлі.

Асноўным відам сялянскага змлеўладання былі надзельныя землі, якія складалі 33.2 % усіх зямель Беларусі. Сялянскіх двароў у пачатку XX ст. было каля 660 тыс. З іх 590,5 тыс. мелі надзельныя землі, астатнія (70 тыс) былі альбо беззамельнымі, альбо ў нямногіх выпадках мелі купчую зямлю.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Пераважная большасць сялян уладала дробнымі ўчасткамі надзельнай зямлі. 42,6 % належалі надзелы да 8 дзесяцін, уключаючы поле, сенажаць і іншыя ўгодзі. У Магілёўскай губерні такіх двароў было 51 %, у Мінскай – 55,5 %.

На Беларусі пераважала буйное латыфундыяльнае землеўладанне. Памесці памерам звыш 500 дзесяцін на ўладальніка складалі ў 1905 г. 5,4% усіх уладанняў. На іх долю прыпадала 77% памешчыцкай зямельнай уласнасці, ці 39,4% усёй плошчы. Наогул, у руках памешчыкаў знаходзілася каля паловы ўсёй зямлі. У той жа час сялянне, якія складалі пераважную большасць насельніцтва (74,3%), мелі ў сваім распараджэнні 39,6% усёй зямельнай плошчы. З развіццём капіталізму, ростам насельніцтва і павелічэннем колькасці гаспадарак змяншалася забяспечанасць сялян зямлёй. Да 1905 г. у сярэднім на адзін сялянскі двор прыходзілася 10,2 дзесяціны.(*каб задаволіць свае патрэбы патрэбна 15 дзесяцін*). Малазямелле вымушала сялян на кабальных умовах арэндаваць памешчыцкія землі і браць пазыкі. За усё гэта яны разлічваліся адпрацоўкамі ў панскіх гаспадарках.

Астатняя зямля размяркоўвалася паміж гандлярамі, мяшчанамі, духавенствам, замежнымі і іншымі прыватнымі ўласнікамі.

У пачатку XX ст. вялікае распаўсюджванне атрымала здача зямлі ў арэнду. Нізкая даходнасць памешчыцкіх гаспадарак прымушала іх уладальнікуў звяртацца да здачы ў арэнду ўсёй зямлі ці часткі яе. У гэты час сялянне арэндавалі ў памешчыкаў 1/10 частку ворнай зямлі, каля ¼ сенажаццяў і пушчаў. Гэта арэнда насіла паўпрыгонніцкі характар. Разам з сялянамі арэндавала панскую землю мноства збяднелай беззямельнай і малазямельнай шляхты, мяшчане. Яўрэйскае насельніцтва Беларусі ажыццяўляла арэнду панскіх зямельных угодзяў з парушэннем заканадаўства, нярэдка праз падстаўных асоб, падкупаючы мясцовую адміністрацыю. Некаторыя з арэндатараў пад выглядам доўгатэрміновай арэнды фактычна куплялі маёнткі.

Капіталістычнае развіццё сельскай гаспадаркі ў даны перыяд ішло ў складаных, супярэчлівых сацыяльна-эканамічных умовах. Усувязі з пераходам ад апрацовачнай да вольнанаёмнай сістэмы ўзмацняўся тэхнічны прагрэс у земляробстве. У памешчыцкіх маёнтках усё шырэй выкарыстоўваліся палепшаныя сельскагаспадарчыя прылады працы і машыны – сеялкі, жняяркі, касілкі, малатарні. Яны ў асноўным выкарыстоўваліся ў Мінскай і Віленскай губернях, у Магілёўскай і Віцебскай губернях у большасці маёнткаў зямля апрацоўвалася сохамі і драўлянымі плугамі. Толькі буйныя гаспадаркі выкарыстоўвалі сеялкі, жнеяркі, малацілкі і веялкі. У 17-41 % заможных і сярэлніх сялянскіх гаспадарках таксама пашыралася выкарыстанне больш

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дасканалых сельскагаспадарчых прылад працы. Але пераважная большасць сялян абыходзілася драўлянай бараной і сахой.

Рост капіталізму прымушаў памешчыкаў і заможніх сялян удасканальваць сістэму земляробства, пераходзіць да шматпольнага севазвароту, выкарыстоўваць агранамію, штучныя ўгнаенні і г.д. усё гэта стрыяла павелічэнню пасяўных плошчаў на Беларусі. У 1900 г. яны складалі 3756,5 дзесяцін, у 1905 г. – 3844,7 тыс. дзесяцін. За 5 гадоў пасяўныя плошчы узраслі на 12,3 %. Але пераважня большасць сялян з-за малазямелля абмяжоўвалася трохпольнай сістэмай севазвароту. Феадальныя перажыткі ў зямельных адносінах тармазілі развіццё капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы.

У пачатку XX ст. выразна выяўляліся працэсы інтэнсіфікацыі і спецыялізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Хутка пашыраліся пасевы тэхнічных і кармавых культур. Параўнальна шырокае распаўсюджванне атрымала травасеянне. У 1901 г. кармавымі травамі было занята 127,8 тыс. дзесяцін прыватнаўладальніцкіх зямель, што складала 6,6 % усёй пасяўной плошчы. Пасевы льну і канапель не пашыраіся. Пад імі было занята 27,4 тыс. дзесяцін у 1907 г. Удзельная вага льну ў агульнай пасяўной плошчы заставалася амальнязменнай (1,9 – 2 %).

Пасевы збожжавых культур павялічваліся абсалютна, але іх ўдзельная вага ў агульнай пасяўной плошчы змяншалася ў 1904 г. састоўляла 58,7 % усёй пасяўной плошчы.

Памешчыцкая гаспадарка ўсё больш спецыялізавалася на вырошчванні бульбы і кармавых культур. Бульба, кармавыя травы і авёс займалі ў пачатку XX ст. каля 40 % ўсёй пасяўной плошчы.

Такая спецыялізацыя была звязана з хуткім развіццём малочнай жывёлагадоўлі, а таксама вінакурства. Дзяржава забяспечвала памешчыкам выгадны збыт спірту ў казну. Таму яны ўзмоцненна развівалі вінакурства, адыходы якога выкарыстоўвалі на корм жывёле. Калі ў 1901-1902 гг. на тэрыторыі 5 заходніх губерняў дзейнічала 484 вінакурныя заводы, на якіх перапрацоўвалася 22,7 млн. пудоў бульбы, то ў 1905-1906 гг. колькасць заводаў павялічылася да 586, а колькасць перапрацаванай бульбы – да 30 млн. пудоў, што складала каля 30 % яго валавага збору.

Хуткае пашырэнне пасеваў кармавых культур і вінакурства стварылі спрыяльныя ўмовы для развіцця малочнай жывёлагадоўлі, якая ў пачатку XX ст. стала вядучай галіной памешчыцкай гаспадаркі Беларусі. Малочная прадукы карысталіся сталым попытам як на мясцовым рынку, так і Маскве, Варшаве і інш. гарадах. Памешчыкі павялічвалі і паляпшалі статак малочнай жывёлы. На пачатку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

XX ст. у заходніх губернях была выведзена мясцовая высокапрадукцыйная парода кароў – літоўска-беларуская.

Уладальнікі буйных маёнткаў наладжвалі ў сябе прамысловую вытворчасць масла і сыру. Хоць поўнага ўліку такіх прадпрыемстваў не рабілася, але даныя па асобных паветах і губернях сведчаць, што масларобчыя і сыраварныя заводы былі распаўсюджаны асабліва ў заходніх паветах Беларусі.

Акрамя малочнай гаспадаркі, значнае развіццё атрымала свінагадоўля. У многіх гаспадарках разводзіліся палепшаныя пароды свіней. У памешчыцкіх гаспадарках Беларусі разводзілася вялікая колькасць птушак, пашыралася садоўніцтва каля гарадоў і чыгуначных станцый.

Такім чынам, капіталізм у памешчыцкай гаспадарцы Беларусі развіваўся перш за ўсё ў жывелагадоўлі, надаўшы ёй малочны напрамак. Гандлёвая малочная жывёлагадоўля ў тых маёнтках, дзе яна атрымала развіццё, прыстасоўвала да сваіх патрэб іншыя галіны гаспадаркі: выклікала пашырэнне пасеваў кармавых траў, бульбы, стымулявала пераход да шматпольных севазваротаў, выкарыстанне штучных угнаенняў. Разам з тым інтэнсіфікацыя памешчыцкай гаспадаркі выклікала ўсё большы попыт на рабочую сілу.

Аднак каля палавіны памешчыцкіх гаспадарак шырока выкарыстоўвалі розныя адроботкі, былі слаба аснашчаны тэхнічна, атрымлівалі нізкія ўраджаі. У той ці іншай меры ўжывалася адработачная сістэма і ў капіталізаваных маёнтках.

Капіталістычныя адносіны ўсё глыбей пранікалі ў сялянскую гаспадарку. На пачатку XX ст. працэс класавага расслаення сялянства Беларусі яшчэ больш паглыбіўся. Надзельная зямля ўсё ж у пачатку XX ст. была размеркавана паміж сялянскімі дварамі нераўнамерна.

Амаль 2/3 сялянскіх двароў (63,1 %) мелі да 10 дзесяцін. У той час 7,8 % гаспадарак мелі па 20 дзесяцін і болей кожная. Частка вясковай беднаты, не маючы магчымасць весці сваю гаспадарку, фактычна не карысталася надзельнай зямлёй і здавала яе ў арэнду заможным суседзям.

Развіццё капіталізму ў земляробстве прыходзіла ў супярэчнасць з паўфеадальнымі формамі надзельнага землеўладання і патрабавала яго ліквідацыі, новага размеркавання зямлі.

Жывёла размеркоўвалася паміж сялянамі таксама не раўнамерна. У Віцебскай губерні 67 % двароў беднаты належала 47,9 % жывёлы ўсіх відаў – па 2,9 галавы на двор. 14 % заможных двароў мелі 28,1 % жывёлы, якая была ў сялян, у сярэднім па 10 галоў на гаспадарку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пятую частку сялян складалі бясконныя. Па сутнасці гэта была пралетарызаваная частка вёскі. Гаспадаркі, у якіх было па адным кані, складалі 42,9 % усіх сялянскіх двароў, хоць ім належала толькі 29,1 % коней. Двухконных двароў (сярэдняе сялянства) налічвалася 23,3 %. Ім належыла 31,6 % коней. Сяляне з трыма і больш канямі, як правіла былі заможнымі і багатымі гаспадаркамі. Складаючы шостую частку сялянскіх двароў, яны мелі дзве пятых усіх коней.

На аснове аналізу размеркавання коней, зямлі і іншых сродкаў вытворчасці па сацыяльных групах сяляне Беларусі ў пачатку XX ст. размяркоўваліся наступным чынам: беднота складала прыблізна 61 %, сярэдняе сялянства – 29 %, заможняе сялянства – 10 %.

У гаспадарках заможніх сялян усё шырэй выкарыстоўваліся ўдасканаленыя сельскагаспадарчыя прылады і машыны – малацілкі, веялкі. Жалезныя плугі мелі не толькі заможныя, але і частка сярэдніх сялянскіх гаспадарак.

З вышэй сказанага магчыма зрабіць выснову, што ў пачатку XX ст. у вёсцы развіваліся капіталістычныя адносіны. Аднак буржуазныя адносіны і капіталістычныя супярэчнасці тут цесна перапляталіся з паўпрыгонніцкім прыгнётам памешчыкаў і шматлікімі рэшткамі феадалізму. Адным з перажыткаў прыгонніцтва ў вёсцы былі адработкі, якія клаліся перш за ўсё на беднату і сярэдняе сялянства. Буйным перажыткам у аграрных адносінах у Беларусі былі сервітуты ..... Так сама перажыткам прыгонніцтва была і сялянская абшчына, найбольш пашыраная галоўным чынам у Магілёўскай губерні (80,5 % сялянскіх двароў і 79,2 % надзельнай зямлі) і Віцебскай губерні (63,5 % двароў і 43,1 % надзельнай зямлі). Зямля лічылася ўласнасцю абшчыны і не магла быць перададзена сялянамі другой асобе. Кругавая парука пры выплаце падаткаў і абдыцці павіннасцей, яшчэ больш узмацняла прымацаванне сялян да зямлі. Таму абшчына садзейнічала захаванню адработкаў і росту аграрнага перанасялення ў вёсцы. Цераспалосіца ўскладняла вядзенне сялянскай гаспадаркі.

Прыгнёт сялян павялічваўся з-за шматлікіх падаткаў і павіннасцей, якія па сутнасці справы мелі прыгонніцкі характар. Сярод іх першае месца займалі выкупныя плацяжы. Сяляне пяці заходніх губерняў у пачатку XX ст. штогод уносілі ў сярэднім 5,2 млн. руб. выкупных плацяжоў. Найбольш высокімі былі выкупныя плацяжа ў Магілёўскай і Віцебскай губернях.

Другім буйным падаткам, які плацілі толькі сяляне, быў збор, які прызначаўся для ўтрымання валасного праўлення і суда, цэркаў, мясцовых дарог і інш. Акрамя таго, сялянне выконвалі і натуральныя павіннасці: дарожную, падводную, паліцэйскую, харчовы падатак і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Усе грашовыя падаткі і натуральныя павіннасці сялян заходніх губерняў не пачатку XX ст. складалі ў сярэднім 2 руб. 17 кап. з дзесяціны.

Такім чынам, у пачатку XX ст. сяляне заставаліся падатковым саслоўем. Асабістыя і маёмасныя правы сялян былі абмежаваны. Сяляне не мелісвободнага выхаду з абшчыны або сельскай грамады, быў абмежаваны пераход у іншыя саслоўі.

Бяспраўнасць сялян, прыкаванасці іх да надзелу і прыгонніцкія падаткі дапаўнялі і замацоўвалі адработачную сістэму, памешчыцкі прыгнёт сялянства.

У выніку пагаршэння становішча вясковай беднаты, прыгнёту памешчыкаў і рэшткаў прыгонніцтва гаспадарка асноўнай масы сяленства знаходзілася ў стане заняпаду і разарэння. Многія тысячы сялян былі вымушаны пакідаць межы свайго краю. Частка сялян эміграваля за мяжу, асабліва з Віленскай і Гродзенскай губерняў, многія перасяліліся ў Сібір. Асабліва шмат сялян пакідала Беларусь у першыя гады XX ст., пры гэтым найбольшай была колькасць перасяленцаў з Магілёўскай і Віцебскай губерняў, дзе былі шырэй распаўсюджаны адработкі і іншыя рэшткі прыгонніцтва.

Такім чынам, прыгнёт памешчыкаў і шматлікіх рэшткаў прыгонніцтва ў пачатку XX ст. быў яшчэ настолькі вялікі, што выклікаў вострыя класавыя супярэчнасці паміж сялянамі і памешчыкамі.

3. ***Развіццё прамысловасці, яе структура.***

У пачатку XX ст. на Беларусі, як і ва ўсёй краіне, распачаўся эканамічны крызіс (1900 - 1903 гг.). Перш за ўсё ён захапіў гандаль лесам, цесна звязаны з рускім і замежным рынкам. Дрэваапрацоўчая прамысловасць, якая пастаўляла матэрыялы чыгункам, у 1900 г. ад крызісу пацярпела менш, хоць тэмпы яе развіцця значна замарудзіліся. Зменьшыўся аб’ём вытворчасці ў металаапрацоўчай прамысловасці. Аб’ём вытворчасці скараціўся ніжэй за ўзровень 1900 г. прыкладна на 10 %.

Некаторае ажыўленне ў прамысловасці Беларусі адбылося з другой паловы 1902 г. А ў 1903 г. агульны аб’ём яе прадукцыі перавысіў узровень 1900 г. на 9,4 %.

Аднак Руска-японская вайна паралізавала ажыўленне, якое пачалося ў 1903 г. У прамысловасці Беларусі пачалася глубокая эканамічная дэпрэсія. На рынку утварыліся лішкі тавараў. Многія фабрыкі і заводы закрыліся або працавалі з няпоўнай нагрузкай. У параўнанні з 1903 г. зменьшылася колькасць рабочых і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

скараціўся аб’ём вытворчасці. Больш моцна скарацілася вытворчасць будаўнічых матэрыялаў, шкляная і лясная прамысловасць.

З 1904 г. у прамысловасці Беларусі наступіла глыбокая эканамічная дэпрэсія, якая працягвалася да 1907 г., хаця ў 1906 г. назіралася некаторае ажыўленне: пашырыўся крыдыт, павялічыліся ўклады ў банкі і ашчадныя касы, а таксама лік дазволаў на адкрыццё новых прадпрымстваў, павысіліся затраты на пераабсталяванне. Аднак ажыўленне было непрацяглае, яно натыкнулася на вузкі рынак збыту, на пакупную здольнасць вёскі.

Пераадоленне крызісу і дэпрэсіі ў прамысловасці пачалося на Беларусі з 1908 г. Аб’ём прамысловай вытворчасці ў гэтым годзе перавысіў узровень 1900 г. на 8 %. Вага буйных фабрычна-завадскіх прадпрыемстваў у валавой прадукцыі прамысловасці павялічылася з 33 % у 1900 г. да 41,7 % у 1908 г.

У гады крызіса і дэпрэсіі адбыўся працэс выцяснення дробных прадпрыемстваў буйнымі капіталістычнымі фабрычна-завадскімі прадпрыемствамі. Тым не меньш на Беларусі пераважала дробная фабрычная і саматужна-рамесная вытворчасць, дзе ў 1908 г. было занята амаль 4/5 усіх рабочых і выпрацоўвалася 58,3 % усёй прамысловай прадукцыі. Дробная вытворчасць пераважна знаходзілся ў эканамічнай залежнасці ад буйнога капіталу.

У канцы XIX ст. на Беларусі склаліся асноўныя галіны апрацоўчай прамысловасці і вызначылася яе спецыялізацыя ў эканоміцы Расіі. Нераўнамернасць развіцця, якая абвастрылася пад уплывам манапалістычнага капіталу , і крызіс выклікалі некаторыя змены ў галіновай структуры прамысловасці Беларусі на пачатку XX ст. Пакуль прамысловасць атрымлівала ад гандлю лесам высокія прыбыткі, яна мала цікавілася яе перапрацоўкай. Толькі нямногія з іх мелі лесапільныя заводы. Лес сплаўлялся з Беларусі па Дняпры. Экспартаваны ў Германію лес перапрацоўваўся на заводах Усходняй Прусіі. Эканамічны крызіс прымусіў купцоў лесам будаваць заводы па перапрацоўцы драўніны на месцы. Асабліва ў гады крызісу развівалася паглыбленная перапрацоўка драўніны – фанерная і папяровая вытворчасць.

У 1900-1908 гг. былі адкрыты – лесапільны завод у Бабруйску (194 рабочых), лесапільна-фанерны завод у Нова-Барысаве (130 рабочых), такі ж завод у маёнтку Дуброўка Мазырскага павета, лесапільна-бандарны завод у маёнтку Дзяніскавічы Слуцкага павета (148 рабочых) і інш. Папяровая прамысловасць на Беларусі склалася ўжо ў канцы XIX ст. Яна належыла да ліку галін з высокім узроўнем канцэнтрацыі. Больш палавіны (55%) фабрык мела 500 і более рабочых. Найбуйнейшая была Добрушская папяровая фабрыка. Аднак новых фабрык

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

будавалася мала. У 1902 г. адкрылася ў Нова-Барысаве кардонна-папяровая фабрыка “Папірус”.

Параўнальна буйныя акцыянерныя і прыватныя капіталы былі сканцэнтраваны ў запалкавай прамысловасці Беларусі. У 1901 г. увайшла ў строй Нова-Барысаўская, а ў 1908 г. Рэчыцкая запалкавыя фабрыкі. Крызіс паскорыў аб’яднанне буйных фабрыкантаў у сіндыкаты . Створаны ў канцы 1905 г. так званы Заходні камітэт пры Мінскім адзяленні Паўночнага банка ўзяў у свае рукі збыт прадукцыі па адзіных манапольных цэнах. Пасля арганізацыі Усходняга камітэта ў Маскве адбылося аб’яднане абодвух камітэтаў.

Прыток новых акцыянерных капіталаў, пабудова новых аснашчаных сучаснай тэхнікай лесапільна-фанерных заводаў забяспечывалі хуткае павелічэнне вытворчасці дрэваапрацоўчай прамыслвасці, удзельная вага якой павялічылася з 1900 да 1908 г. з 16,6 да 23,6 %. Дрэваапрацоўчая вытворчасць адыграла вялікую ролю ў вытворчасці пілованых матэрыялаў, клеенай фанеры, запалак, паперы і кардону. Гэтая прадукцыя перавышала патрэбы краю і вывозілася ў іншыя раёны краіны.

У канцы XIX ст. пачалося пранікненне буйнога капіталу ў лесахімічную прамысловасць. У 1900 г. рускае акцыянернае таварыства “Шэрынг” пабудавала аснашчаны новым абсталяваннем найбуйнейшы ў Расіі Выдрыцкі завод сухой перагонкі драўніны. Гандлевы дом “П. і І. Данішэўскі”, які меў свае прадстаўніцтвы ў Берліне, Лондане, Мінску, таксама пабудаваў завод сухой перагонкі драўніны. Лесахімічная вытворчасць Беларусі давала 18 % прадукцыі ўсёй Расіі.

На пачатку XX ст. істотных змен у шкляной прамысловасці не адбылося. Прыток сюды новых капіталаў быў нязначны. Эканамічны крызіс 1900-1903 гг. і дэпрэсія асабліва моцна адбіліся на вытворчасці аконнага шкла. У крыху лепшым становішчы знаходзіліся прадпрыемствы, якія выпускалі бутэлькі і аптэкарскі посуд. Гэтая прадукцыя мела больш устойлівы збыт. З 1900 па 1908 г. вытворчасць шкляной прамысловасці павялічылася на 12,5 %. Удзельная вага ў агульным аб’ёме прамысловасці знізілася.

Металаапрацоўчая прамысловасць на Беларусі была прадстаўлена, з аднаго боку, параўнальна невялікімі прыватнаўласніцкімі прадпрыемствамі, якія выраблялі цвікі, дрот, нескладаныя сельскагаспадарчыя прылады і абсталяванне для мясцовай прамысловасці, з другога боку – буйнымі рамонтнымі чыгуначнымі майстэрнямі, у якіх было занята 33 % рабочых гэтай галіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Эканамічны крызіс амаль не закрануў паравозавагонарамонтныя прадпрыемствы. Разам з тым аб'ём іх вытворчасці павялічваўся марудна і яе доля ў прамысловасці Беларусі паменшылася з 10,6 % у 1900 г. да 9 % у 1908 г.

Прамысловасць будаўнічых матэрыялаў была прадстаўлена невялікімі заводамі па вытворчасці цэглы, чарапіцы, кафлі, бетонных плітаў для тратуараў. На іх было занята каля 2 тыс. чалавек, г. зн. 6 % усіх рабочых буйной прамысловасці Беларусі ў 1900 г. У агульным аб'ёме прадукцыі яе удзельная вага складала 2,8 %.

Істотныя змены на пачатку XX ст. адбыліся ў тэкстыльнай прамысловасці. Наяўнасць сыравіны і таннай рабочай сілы садзейнічала таму, што ў гэтую галіну з пачатку XX ст. пачаў узмоцненна пранікаць буйны, пераважна замежны, капітал. У 1900-1908 гг. было пабудавана восем фабрык, якія давалі тры чверці прадукцыі тэкстыльнай прамысловасці Беларусі.

Параўнальна вялікае развіццё атрымала харчовая прамысловасць. Яна займала ў агульнай прамысловай вытворчасці Беларусі ў 1900 г. 49,7 % . больш энтэнсіўна развівалася вінакурная, якая была сканцэнтравана ў руках памешчыкаў. Значную частку спірту купляла казна па выгадных для памешчыкаў цэнах. Таму крызіс не меў значнага ўплыву на развіцё гэтай галіны. Колькасць заводаў павялічылася з 470 у 1900 г. да 603 у 1908 г.

Такім чынам, у 1900 – 1908 гг. найбольш хутка развівалася лесапільна-фанерная, запалкавая, тэкстыльная, папяровая і лесахімічная галіны, у якіх панаваў буйны капітал, зязаны з банкаўскім. Удзельная вага гэтых галін прамысловасці Беларусі павялічылася. Інтэнсіўна развівалася вінакурства ў памешчыцкіх маёнтках, на долю якога прыходзілася 28-29 % усёй прадукцыі. Развіццё астатніх галін прамысловасці, у якіх пераважаў дробны капітал, адбывалася марудна. Іх роля ў прамысловасці Беларусі знізілася.

Эканамічны крызіс паскорыў працэс цэнтралізацыі і канцэнтрацыі капіталу. З пачатку XX ст. павялічыліся ўкладанні ў эканоміку Беларусі капіталаў з іншых раёнаў краіны і з-за рубяжа. Гэта выявілася ў пашырэнні дзейнасці банкаў, у павелічэнні ліку прамысловых прадпрыемстваў, якія належылі акцыянерным таварыствам. У 1908 г. на Беларусі было 17 фабрык і заводаў, якія належылі акцыянерным таварыствам ....., 13 з іх было адкрыта ў перыяд з 1900 па 1908 г. Найбольш буйнейшым з іх былі ў Віцебску льнопрадзільная фабрыка "Дзвіна" (Руска-Бельгійскае таварыства), трамвай і электрычная станцыя (Бельгійскае акцыянернае таварыства). Рускае акцыянернае таварыства карданажна-папяровай вытворчасці ў 1905 г. набыло Шклоўскую папяровую фабрыку. Акцыянернае таварыства "Шэрынг" пабудавала буйны завод сухой пераганкі дрэва ў Выдрыцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аршанскага павета, акцыянернае таварыства па вырабу крахмалу “Прасвет” адкрыла крухмальны завод у Мінску; акцыянернае таварыства “Заходняя Дзвіна” пабудавала шкляны завод “Ноўка” у Віцебскай губерні.

Пры непасрэдным удзеле банкаў акцыянерныя таварыствы на Беларусі ствараліся і па ініцыятыве мясцовых заводчыкаў і фабрыкантаў: два ў запалкавай прамысловасці – “Прагрэс-Вулкан” у Пінску і “Маланка” ў Мазыры, утварылася акцыянернае таварыства тытунёвай фабрыкі “Нёман”.

Значную ролю ва ўмацаванні капіталу ў прамысловасці Беларусі адыгралі таварыствы . Іх было каля 40. большасць узнікла ў пачатку XX ст. да ліку найбольш буйных належалі таварыствы мінскіх машынабудаўнічых заводаў Якабсона, Ліўшыца, машынабудаўнічы завод і тэхнічная кантора “Тэхнолаг” у Мінску.

Мабілізацыя капіталаў шляхам заснавання акцыянерных таварыстваў і кампаній, выкарыстанне іх капіталаў для арганізацыі новых буйных прадпрыемстваў і пашырэння дзеючых садзейнічала росту канцэнтрацыі цэнзавай прамысловасці Беларусі.

У гарадах выраблялася каля 31% прамысловай прадукцыі. Пераважная колькасць прадпрыемстваў размяшчалася ў мястэчках і маёнтках. Некаторыя мястэчкі ператварыліся ў прыкметныя прамысловыя цэнтры рэгіянальнага значэння (Смаргонь, Дуброўна і інш.).

З 1900 да 1908 г. удзельная вага рабочых на прадпрыемствах, якія мелі звыш 100 чалавек, павысілася з 48,6 да 51,7 %, у тым ліку на прадпрыемствах, якія налічвалі звыш 1000 рабочых, – з 8 да 12,8 %. У той жа час удзельная вага рабочых на прадпрыемствах з колькацю 500-1000 рабочых паменшылася. Круху павялічылася значэнне дробных прадпрыемстваў (да 30 чалавек) у выніку павелічэння колькасці памешчыцкіх вінакурных заводаў, якія карысталіся падтрымкай самадзяржаўя. Разам з тым узровень канцэнтрацыі ў прамысловасці Беларусі быў значна ніжэйшы, чым ва ўсёй Расіі. У 1908 г. на прадпрыемствах з калькасцю рабочых да 100 чалавек па краіне ў цэлым было занята 14,2 % рабочых, а на Беларусі – 48,3 %. У значнай меры гэта тлумачыцца адрозненнем галіновай структуры прамысловасці. На Беларусі пераважала дрэваапрацоўчая, лёгкая і харчовая прамысловасць, якая была прадстаўлена невялікімі прадпрыемствамі. Галіны ж цяжкай прамысловасці, дзе панавалі буйныя прадпрыемствы, былі размешчаны ў іншых раёнах Расійскай імперыі.

Развіццё прамысловасці суправаджалася павелічэннем колькасці рабочага класа. На пачатку XX ст. у Беларусі склаўся даволі шматлікі клас наёмных рабочых. У 1908 г. колькасць рабочых ваўсёй прамысловасці дасягала 116 тыс.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чалавек. У параўнанні з 1900 г. яна павялічылася на 18,2 %. Асабліва хутка павялічвалася колькасць рабочых у буйной прамысловасці, у тым ліку ў дрэваапрацоўчай. Апрача таго, каля 100 тыс. сялян было занята на лесанарыхтоўках. Нацыянальны склад рабочых быў стракатым і складаўся з беларусаў (17%), рускіх (10%), палякаў (10,2%), яўрэяў (60%) *як вы думаеце чаму яўрэяў больш?* (Мяжа яўрэйскай аселасці, забарона займаццасельскай гаспадаркай). Рабочы клас папаўняўся разарыўшыміся рамеснікамі, мяшчанамі, збяднелымі сялянамі.

Сярод рабочых было шмат жанчын, дзяцей і падлеткаў. У 1906 г. на заводах, якія былі падпарадкаваны нагляду фабрычнай інспекцыі, у пяці заходніх губернях яны складалі 45,6 % усіх рабочых. Асабліва шырока праца дзяцей выкарыстоўвалася ў запалкавай, тытунёвай і шкляной прамысловасц

Значнае аграрнае перанасяленне, вялікая колькасць яўрэйскай беднаты ў гарадах і мястэчках ставілі рабочых Беларусі ў вельмі цяжкія ўмовы. Нягледзячы на закон аб 11,5-гадзінным рабочым дні, на большасці прадпрыемстваў Беларусі ён фактычна быў больш доўгім. Машаністы і качагары, напрыклад, працавалі па 13 гадзін.

За сваю працу рабочыя атрымлівалі мізэрную заработную плату. Іх сярэдні заробак на беларусі ў 1900 г. быў на 28,7 % ніжэйшы, чым па Расіі ў цэлым. Яшчэ меньш зараблялі жанчыны. Сістэма штрафаў, якая дзейнічала на прадпрыемствах, яшчэ больш зніжала і без таго нізкую заработную плату рабочых. На матэрыяльным становішчы рабочых адбівалася і тое, што ім замест грошай часта выдавалі квітанцыі на атрыманне прадуктаў у гаспадарчай краме па завышаных цэнах.

Амаль поўная адсутнасць тэхнікі бяспекі, ператамленне былі прычынамі масавага вытворчага траўматызму. Нягледзячы на тое, што ў 1903 г. быў прыняты закон аб прадастаўленні рабочым дапамогі пры няшчасным выпадку на прадпрыемстве, фіксаваліся ў афіцыйных зводках толькі тыя нышчасныя выпадкі, якія кончаліся абсалютнай стратай працаздольнасці або смерцю рабочага. Дапамогу рабочым, якія страцілі працаздольнасць, прадпрыемцы плацілі са штрафных грошай. Пасля хваробы рабочага на фабрыку больш не прымалі, таму што на яго месцы працаваў ужо другі рабочы.

Адначасова з фарміраваннем рабочага класа фарміравалася і прамысловая буржуазія. Гандлёва-прамысловая буржуазія ў краі была прадстаўлена яўрэйскімі купцамі і прамыслоўцамі. Беларуская нацыянальная буржуазія фарміравалася на аснове заможнай праслойкі вясковага насельніцтва. На аснове перапісу 1897 г. да

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дробнай буржуазіі адносілася 103 тыс. чалавек, да сярэдняй – 47 тыс., да буйной – 33 тыс.

Такім чынам, у пачатку XX ст. назіраўся прамысловы ўздым, канцэнтрацыя вытворчасці і капіталу, узнікненне манапалістычных аб'яднанняў. Але ж разам з развіццём фабрычна-завадской прамысловасці тут у даволі значных памерах захоўвалася дробная вытворчасць.

4. *Нацыянальны і сацыяльны склад рабочага класа, яго становішча.*

Аб нацыянальным складзе насельніцтва Беларусі пачатку XX ст. звесткі вельмі ўмоўныя, бо, як правіла, нацыянальная прыналежнасць вызначалася як веравызнанне чалавека, ці па мове, на якой ён размаўляў.

Згодна з перапісам 1897 г. беларусы складалі – 63,5 %, яўрэі – 14%, палякі – 4,97 %, рускія – 5,78 %, украінцы – 4,42 %, літоўцы – 3,39 %, латышы – 3,2 %, татары , немцы і інш. – менш за 1 %.

Характэрнай асаблівасцю беларускага этнасу было тое, што больш за 90 % беларусаў пражывала ў сельскай мясцовасці, працавала на зямлі. Адметным было і тое, што беларусы былі падзелены па веравызнанню на праваслаўных і католікаў. Праваслаўнымі былі больш за 81 % беларусаў.

Сацыяльная структура насельніцтва беларусі пачатку XX ст. была разнастайнай і даволі складанай. У беларускім грамадстве можна вызначыць некалькі сацыяльных груп насельніцтва: дваранства, буржуазія, інтэлігенцыя, сялянства, рабочыя.

У сацыяльнай структуры беларускага грамадства значнач роля адводзілася дваранству, якое было апорай дзяржаўнай улады.

Працэс фарміравання прамысловай буржуазіі пачаўся яшчэ ў дарэформенны перыяд.

Інтэлігенцыя на беларусі не была шматлікай. Да яе можна аднесці не толькі дзеячоў культуры, вучоных, работнікаў адукацыі, медыцыны, але і чыноўнікаў , служачых, ваенных, духавенства. Агульную характырыстыку тагачаснай інтэлігенцыі даць вельмі складана, бо яна была неаднолькавай па свайу адукацыйнаму і прафесійнаму ўзроўню, матэрыяльнаму дабрабыту і палітычных поглядах.

Што датычыца нацыянальнай беларускай інтэлігенцыі, то яна была нешматліка і недастаткова арганізавана.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Значны ўплыў у грамадстве ела духавенства.

Рабочы клас, як самастойная сацыяльная група ўзнік яшчэ ў другой палове XVIII ст. Найбольш масавай сацыяльнай базай пралетарыяту з'яўлялася бяднейшае сялянства.

Сялянства было найбольш значным класам беларускага грамадства. У гэты час расла колькасць бедных і адносна заможніх гаспадарак.

Такая сацыяльная структура беларускага грамадства ў пачатку XX ст. была базай для развіцця грамадска палітычных працэсаў, якія адлюстроўвалі нарастанне супярэчнасцей, прывялі да спроб рэвалюцыйным шляхам вырашыць існаваўшыя сацыяльна-эканамічныя праблемы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лекцыя 2: ***Утварэнне палітычных партый і арганізацый. Характар іх дзейнасці на Беларусі напярэдадні і ў перыяд першай Расійскай рэвалюцыі.***

Ключавыя паняцці: партыя, рэвалюцыя, РСДРП, Бунд, БСГ, ПСР, ППС на Літве, Кадэты, Саюз 17 кастрычніка, Саюз рускага народа.

План.

1. Перадумовы ўзнікнення палітычных партый і асаблівасці станаўлення апошніх на Беларусі.
2. Пачаткак дзейнасці агульнарасійскіх партый і груповак.
3. Узнікненне беларускіх партый і арганізацый.
4. Пазіцыі партый і арганізацый у перыяд уздыму першай Расійскай рэвалюцыі.

Канспект лекцыі.

1. Перадумовы ўзнікнення палітычных партый і асаблівасці станаўлення апошніх на Беларусі.

Слова партыя лацінскага паходжання і мае значэнне "частка больш буйнай супольнасці". Прататыпы сучасных палітычных партый узніклі ў перыяд ранніх

буржуазных рэвалюцый, калі буржуазія, што ўзначальвала тыя рэвалюцыі, утварала свае аб'яднанні або групоўкі ў якасці інструмента барацьбы з феадалізмам. Партыі з'явіліс як вынік усеагульнага выбарчага права і развіцця прадстаўнічай формы кіравання, патрэбнасці разных груп грамадзян у арганізацыйным аб'яднанні для абароны і выражэння сваіх інтарэсаў і барацьбы за ўладу і прывялі да фарміравання такога палітычнага інстытута, як партыя.

Адзначанае вышэй можна аднесці і да агульных прычын узнікнення палітычных партый у Расіі і Беларусі, аднак тут меліся і свае асаблівасці. Каб іх зразумець, трэба ўлічваць наступны момант: у сучаснай літаратуры паняцце "палітычная партыя" мае наступную інтэрпрэтацыю – гэта супольнасць людзей, што аб'яднаны арганізацыйна і ідэалагічна, якая выражае інтарэсы пэўнага класа, сацыяльнага слоя (слаёў) або грамадскай групы і ставіць мэту іх рэалізацыі шляхам заваёвы дзяржаўнай улады або ўдзелу ў яе ажыццяўленні.

Аднак працэс утварэння палітычных партый у Беларусі меў свае асаблівасці. Па-першае неабходна ўлічваць маруднае станаўленне буржуазнага грамадства, адсутнасць дэмакратычных свабод, наяўнасць феадальна-прыгонніцкіх перажыткаў. Гэта абумовіла ўтварэнне ў першую чаргу рэвалюцыйна-апазіцыйных нелегальных партый і груповак радыкальнага кшталту (народніцтва, сацыял-дэмакратызм). Нягледзячы на розныя праграмы і абвешчаныя мэты, дзейнасць гэтых партый аб'яктыўна спрыяла пазбаўленню краіны ад феадальных рэшткаў, развіццю рынкавых адносін. А партыі ўлады ці лаяльна накіраваных да ўлады сталі ўзнікаць тады, калі рэвалюцыйна-апазіцыйныя ўжо вызначыліся на палітычнай арэне. Па-другое, на фарміраванне і дзейнасць палітычных партый у Беларусі паўплывала канкурэнтная барацьба паміж рускім, польскім і яўрэйскім капіталам, палітычнымі элітамі Расіі і Польшчы. Польская і яўрэйская буржуазія, дамагаючыся панавання ў заходніх губернях Расіі, у некаторых момантах і да пэўных межаў падтрымлівала апазіцыйныя самадзяржаўю партыі і групоўкі.

Адмена прыгоннага права, рэформы 60-70 гг. XIX ст. садзейнічалі развіццю сацыяльна-эканамічных адносін, станаўленню буржуазнага грамадства, хуткай класавай дыферэнцыяцыі насельніцтва і станаўленню новай сацыяльнай структуры. Усё гэта абумовіла таксама асаблівасці ўтварэння палітычных партый на беларусі.

Развіццё капіталістычных адносін абумовіла фарміраванне двух класаў – буржуазіі і пралетарыяту. Буйная буржуазія найпер фарміравалася з асяродзя купцоў і памешчыкаў прамыслоўцаў. Гандлёва-прамысловая буржуазія ў Беларусі была ў асноўным прадстаўлена купцамі і прамыслоўцамі. Яўрэйская буржуазія з'яўлялася ўласнікам больш чым паловы фабрык і заводаў. Беларуская нацыянальная буржуазія фарміравалася на аснове заможнай праслойкі вясковага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

насельніцтва. Сярод вясковай беларускай буржуазіі было нямала патомнай шляхты.

У парэформены перыяд значна павялічылася колькасць рабочага класа. У пачатку XX ст. У прамысловасці беларусі працавала 237 тыс. рабочых. Яўрэйскія рабочыя пераважалі ў сферы дробнакапіталістычнай і рамеснай прамысловасці, гандлю і бытавога абслугоўвання. Ядро прамысловага пралетарыяту, яго вядучая параўнальна нешматлікая частка –фабрычна-завадскія і чыгуначныя рабочыя – у 5 заходніх губернях на ¾ складаліся з хрысціян, пераважна беларусаў. Сельскагаспадарчыя рабочыя ў пераважнай большасці былі беларусамі.

Істотную ролю ў фарміраванні плітычных партый адыгрывала інтэлігенцыя, якая была неаднароднай. Згодна з вынікамі першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г., да інтэлігенцыі Беларусі можна аднесці наступныя катэгорыі: чыноўнікі адміністрацыі, суда і паліцыі; асобы якія былі на грамадскай, саслоўнай і дабрачыннай службе; асобы якія займаліся прыватнай юрыдычнай практыкай, вучэбнай і выхаваўчай, навуковай і творчай дзейнасцю, духавенства розных рэлігійных канфесій, а таксама афіцэрства вайсковых згуртаванняў. Такім чынам да інтэлігенцыі можна аднесці 0,69 % усяго насельніцтва. Гэта тлумачыцца тым, што у беларускіх губернях адсутнічалі буйныя прамысловыя прадпрыемствы, вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Нацыянальны склад інтэлігенцыі быў наступны: рускіх – 5,97 %, беларусаў – 65,61 %, украінцаў – 4,59%, палякаў – 6,15 %, яўрэяў – 14,59 %, іншых нацыянальнасцей – 3,93 %.

Грамадска-палітычныя працэсы, якія назіраліся на Беларусі ў пачатку XX ст., сацыяльная напружанасць, імкненне кожнага класа, сацыяльнай групы абараняць свае інтарэсы на палітычнай арэне падштурхнулі да ўтварэння розных палітычных партый і арганізацый. Гэты складаны працэс меў шмат асаблівасцей, як было адзначана, зыходзячы са стракатасці сацыяльнага і нацыянальнага складу насельніцтва Беларусі.

Палітычныя партыі і групоўкі Беларусі ў пачатку XX ст. можна класіфікаваць наступным чынам:

1. манархічныя (урадавыя);
2. буржуазна-ліберальныя;
3. сацыял-дэмакратычныя;
4. неанародніцкія.

Сярод іх вызначаюцца таксама агульнарасійскія і нацыянальныя партыі і групоўкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Пачаткак дзейнасці агульнарасійскіх партый і груповак

Вызначальную ролю ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі ў пачатку XX ст. адыгралі агульнарасійскія партыі і групоўкі. Аднак канчаткова некаторыя аформіліся толькі ў перыяд першай расійскай рэвалюцыі. Арганізацыі манархічнага напрамку напярэдадні першай расійскай рэвалюцыі былі вельмі слабыя і ўяўлялі сабой зародкі будучых мясцовых гурткоў, якія пазней увайшлі ў "Саюз рускага народа", што ўзнік у 1905 г. Сярод іх трэба адзначыць утворануюў канцы 1900 г. У Пецярбургу дваранскую арганізацыю "Русское собрание". Яе дзейнасць грунтавалась на старых ідэях афіцыйнай палітыкі: праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць. У 1904 г. аддзяленні арганізацыі "Руское собрание" узнікаюць у Вільні, Варшаве і іншых гарадах. Яны з'явіліся першымі арганізацыйнымі цэнтрамі будучых манархічных партый. Асноўнымі палітычнымі мэтамі гэтых партый і арганізацый бало захаванне самадзяржаўнага ладу.

Больш прыкметны на Беларусі быў буржуазна-ліберальны рух. Але ліберальная плынь спачатку і тут не мела легальных апорных падмуркаў у выглядзе земстваў, бо царызм доўгі час не дазваляў іх ствараць, баючыся, што яны стануць цэнтрамі палітычнай апазіцыі польскіх памешчыкаў. Погляды ліберальна-памешчыцкай апазіцыі ў гэты час былі шырока выказаны ў мясцовых камітэтах "Асобнай нарады аб патрэбах сельскагаспадарчый прамысловасці", арганізаванай у 1902 г. на чале з С. Вітэ, які займаў у той час пасаду міністра фінансаў Расіі. Мясцовыя памешчыкі патрабавалі ўраўняць сялен у асабістых правах з іншымі саслоўямі, увесці земствы, скасаваць абшчынае землекарыстанне, узмацніць ахову прыватнай зямельнай уласнасці.

Ліберальная гарадская інтэлігенцыя гуртавалася вакол культурна-асветніцкіх таварыстваў. На пачатку XX ст. у Мінску былі створаны "Таварыства прыхільнікаў мастацтва", "Таварыства абароны жанчын". У 1904 г. на Беларусі ўзнікаюць ліберальныя плыні, якія потым склалі мясцовыя арганізацыі партыі народнай свабоды (Кадэты). Галоўнае іх патрабаванне ў той час – канстытуцыйная манархія.

Сярод яўрэскага грамадства на Беларусі на пачатку XX ст. атрымаў пашырэнне сіянісцкі рух. Сама назва *"сіянізм"* паходзіць ад гары Сіён у Іерусаліме, дзе паводле старажытных біблейскіх паданняў, існаваў храм цара Давіда. Сусветная сіяніская арганізацыя была створана ў 1897 г. у Базелі (Швейцарыя). У жніўні 1902 г. з дазволу ўлад у Мінску адбыўся Ўсерасійскі з'езд сіяністаў. Пазней сіянізм на Беларусі ўяўляў моцны палітычны рух, куды ўваходзілі яўрэйскія партыі сіянісцкага і прасіяніскага кшталту. Іх варта падзяліць на два галоўныя тыпы: партыі тэрытарыяльнага і "духоўнага" сіянізму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Да партый тэрытарыяльнага сіянізму трэба аднесці тыя, якія дамагаліся стварыць асобную дзяржаву для яўрэяў на тэрыторыі Палесціны. Яны бачылі ў гэтай дзяржаве “сваеасаблівы нацыянальны цэнтр”. Партыі “духоўнага сіянізму”, падтрымліваючы гэтую ідэю, галоўным лічылі “фарміраванне нацыянальнага асобнага палітычнага яўрэйскага грамадства” ва ўсіх краінах, незалежна ад месца жыхарства.

Галоўны сэнс сіянізму на пачатку XX ст. – ідэя асобнай выключнасці яўрэйскай нацыі, адасабленне яўрэяў ад неяўрэяў, забеспячэнне паннавання яўрэйскай буржуазіі ва ўсім свеце. Крыху пазней былі створаны партыі “сацыялістычнага” сіянізму – “Паалей-Цыён” (Рабочыя сіёна) 1905 г., Сацыялістычная яўрэйская рабочая партыя (1906 г.), якія мелі свае карані ад груп “Адраджэння”. Напрыклад, пабтрымліваючя ідэю ўтварэння “дзяржавы яўрэйскага пралетарыяту ў Палесціне”, партыя “Паалей-Цыён” дамагалася таксама нацыянальна-палітычных аўтаномій з усеабдымнай эканамічнай, культурнай і фінансавай кампітэнцыяй ва ўсіх унутраных нацыянальных справах для тых народнасцей, інтарэсы якіх не могуць быць, не яе думку, дастаткова задаволены тэрытарыяльнай аўтаноміяй.

З 80-х гг. XX ст. набываюць моц сацыял-дэмакратычныя плыні, якія пачалі саю дзейнасць з прапаганды марксізму. Яго прыхільнікі верылі ў непазбежнасць гібелі капіталістычнага ладу, лічылі пралетарыят галоўным рэвалюцыйным атрадам, увасабленне дыктатуры якога вызначыць шлях да перамогі сацыялістычнага грамадства. Але ўжо тады было відавочна, што марксізм не вельмі ўлічваў інтарэсы сялянства.

Не Беларусі першы сацыял-дэмакратычны гурток быў утвораны студэнтам Э.Абрамовічам у Мінску летам 1884 г. Некаторыя сацыял-дэмакраты Беларусі неўзабаве пачалі разумець неабходнасць пераходу ад прапаганды марксізму ў вузкіх, заканспіраваных гуртках да агітацыі сярод рабочых мас на аснове блізкіх, жыццёва важных для іх патрабаванняў – скарачэнне рабочага дня, павелічэнне заработнай платы, паляпшэнне ўмоў працы. У канцы 80-х – пачатку 90-х гг. сацыял-дэмакратычныя гурткі ўтварыліся ў Вільне, Гродна, Віцебску. Гомелі, Смаргоні.

Актыўна дзейнічала ў Мінску сацыял-дэмакратычная група на чале з С. Трусевічам. У красавіку ён удзельнічаў у рабоце ўстаноўчага з’езда Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі (ЛСДП) у Вільні, на якім прадстаўлял створаныя ім сацыял-дэмакратычныя гурткі Мінска, Вільні і Смаргоні. Аднак ён пакінуў з’езд, т.к. большасць з’езда заняла сепаратысцкія пазіцыі і ў маі 1896 г. ён стварыў Рабочы саюз Літвы (РСЛ). Насуперак сепаратузму кіраўніцтва ЛСДП, якое адмаўлялася ад узаемадзеяння з расійскім пралетарыятам, праграма РСЛ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

абвяшчала, што барацьба з дэспатызмам можа быць паспяховай толькі пры аб'яднанні ўсіх сацыял-дэмакратычных груп.

У верасні 1897 г. у Вільні абдыўся з'езд прадстаўнікоў яўрэйскіх, на сацыял-дэмакратычных арганізацый Вільні, Мінска, Віцебска, Беластока і Варшавы якім утварыўся *Бунд* – Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі. Ён падтрымліваў сіянісцкую ідэю асобнай выключнасці яўрэскай нацыі і лічыў сябе выключна адзіным прадстаўніком, выразнікам інтарэсаў яўрэйскага пралетарыяту. Бундаўскія ідэі мелі пэўны ўплыў на сацыял-дэмакратычныя арганізацыі Беларусі.

Прыкметны рост рабочага руху ў Расііу сувязі з масавай агітацыяй сацыял-дэмакратаў, утварэнне на гэтай аснове буйных агульнагарадскіх сацыял-дэмакратычных арганізацый паставілі на чаргу пытанне аб аб'яднанні іх у партыю. З гэтай мэтай у Мінску ў пачатку сакавіка 1898 г. быў скліканы з'езд прадстаўнікоў пецярбургскага, маскоўскага, кіеўскага і екацярынаслаўскага "Саюзаў барацьбы", кіеўскай "Рабочай газеты" і Бунда. З'езд прыняў рашэнне аб аб'яднанні прадстаўленных на ім арганізацый у Расійскую сацыял-дэмакратычную рабочую партыю, выбраў Цэнтральны камітэт з трох чалавек, прызнаў "Рабочую газету" афіцыйным органам РСДРП. Бунд, як і іншыя арганізацыі, уступіў у партыю на правах аўтаноміі ў мясцовых справах. Самастойныя рашэнні ён мог прымаць толькі па пытаннях, якія датычыліся яўрэйскага пралетарыяту.

У той жа час сярод сацыял-дэмакратаў узмацнілася барацьба паміж прыхільнікамі рэфармісцкага і рэвалюцыйнага накірункаў. З канца 1900 г. цэнтрам згуртавання рэвалюцыйных сацыял-дэмакратаў стала газета "Іскра", якая выдавалася за мяжой Плеханавым і Леніным. Галоўную сваю задачу рэдакцыя "Іскра" бачыла ў выхаванні палітычнай свядомасці пралетарыяту і ў падрыхтоўцы стварэння ў Расіі інтэрнацыянальнай рэвалюцыйнай марксісцкай партыі. У 1903 г. спачатку ў Бруселі, затым у Лондане адбыўся II з'езд РСДРП, які прыняў Першую праграму партыі. Канчатковай мэтай сацыял-дэмакратаў абвяшчалася пабудова сацыялістычнага грамадства праз пралетарскую рэвалюцыю і заваяванне дыктатуры пралетарыяту. Найбліжэйшай мэтай партыя ставіла звяржэнне царскага самадзяржаўя і ўстанаўленне дэмакратычнай рэспублікі сіламі пралетарыяту, сялянства і іншых працоўных розных нацыянальнасцей. Па нацыянальным пытанні з'езд абвясціў права ўсіх нацый на самавызначэнне. Большасць расійскіх сацыял-дэмакратаў не лічыла абавязковым аддзяленне нацыі. Яны былі прыхільнікамі цэнтралізаванай шматнацыянальнай дзяржавы. На іх думку, вырашэнне нацыянальных праблем павінна было падпарадкоўвацца мэтам класавай барацьбы пралетарыяту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З’езд раскалоўся на дзве фракцыі – бальшавікоў і меньшавікоў, якія мелі спачатку розныя погляды на тактычныя і арганізацыйныя пытанні. А потым яня склалі два накірункі, фактычна, дзве пвртыі ў расійскай сацыял-дэмакратыі.

У канцы 1903 г. групы РСДРП узніклі ў Мінску. Гомелі, Бабруйску, Магілёве, Мазыры, Брэсце і іншых гарадах і мястэчках Беларусі. Для кіраўніцтва сацыял-дэмакратычнымі арганізацыямі на Беларусі ЦК РСДРП стварыў у 1904 г. Палескі камітэт і Паўночна-Заходні камітэт. Бальшавікі і меншавікі ўваходзілі разам у адзіныя сацыял-дэмакратычныя арганізцыі.

Значны ўплыў на развіццё грамадска-палітычнага руху на Беларусі аказалі неанародніцкія арганізацыі і партыі, г. зн. тыя, якія таксама ставілі сацыялістычныя мэты, але трымалі арыенцір галоўным чынам на сялянства і разначынную інтэлігенцыю. У той час яны імкнуліся адмовіцца ад старых народніцкіх ідэй, якія мелі анархісцкае адценне і прызнавалі, што капіталізм у Расіі з’яўляецца заняпадам і рэгрэсам.

У 1899 г. Гершуні і Радзіёнавай-Клячко была створана Рабочая партыя палітычнага вызвалення Расіі. Яна ставіла сваёй мэтай звяржэнне царызму і заваёву палітычных свабод. Асноўнымі сродкамі барацьбы з царызмам лічыла тэрор. Пасля паліцэйскіх рэпрэсій (1901 г.) шмат яе былых членаў увайшло ў арганізацыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, якія ў студзені 1902 г. абвясцілі сябе самастоўнай партыяйю групы сацыялістаў-рэвалюцыянераў гуртаваліся вакол часопіса “Революционная Россия”. Аднак першы з’езд расійскіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў абдыўся толькі ў канцы 1905 – пач. 1906 г.

Праграма эсэраў мела антыкапіталістычную накіраванасць. Эсэры бачылі сацыялізм як згуртаванне самакіравальных вытворчых асацыяцый у прамысловасці і сельскай гаспадарцы, шырокай сеткі розных тыпаў кааперацыі. Дасягненне сацыялізму яны звязвалі са звяржэннем царызму і ўстанаўленнем народаўладдзя. У аграрным пытанні эсэры патрабавалі пераходу ўсёй зямлі ў агульнанародны набытак без выкупу на правах параўнальнага землекарыстання для сялянства. Больш за тое, зямля не павінна прадавацца і купляцца. Па нацыянальнаму пытанню эсэры выступалі за “безумоўнае права нацыянальнасцей на самавызначэнне”, федэратыўныя адносіны паміж імі, увядзенне роднай мовы ва ўсе мясцовыя, грамадскія і дзяржаўныя ўстановы, а на тэрыторыях са змешаным насельніцтвам – за права кожнай нацыянальнасці на прапарцыянальную сваёй колькасці частку бюджэта, які прызначаны на культурна-асветніцкія мэты. У канцы 1903 – пачатку 1904 гг. эсэраўскія арганізацыі ўтварыліся ў асобных гарадах Беларусі. У красавіку 1904 г. была створана Паўночна-Заходняя абласная арганізацыя сацыялістаў рэвалюцыянераў, у якую вайшлі Беластоцкая арганізацыя, Віленская, Віцебская, Гомельская,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дзвінская групы, Смаленскі, Бранскі і Мінскі камітэты. Галоўнымі кіраўнікамі з'яўляліся Ратнер, Біцэнка, Антосева. Эсэры на тэрыторыі Беларусі ў той час займаліся распаўсюджваннем лістовак і арганізацыяй адзіночных тэрарыстычных актаў супраць паліцэйскіх чыноў.

Такім чынам, арганізацыі агульнарасійскіх партый на пачатак XX ст. толькі складаоіся. Іх колькасць была не вялікая і фактычна яны з'яўляліся своеасаблівымі гурткамі разначыннай інтэлігенцыі, чыноўнікаў, служачых, навучэнцаў. Трэба адзначыць, што гэтыя арганізацыі не вельмі ўлічвалі абставіны Беларусі. Назва "Беларусь" не выкарыстоўвалася не толькі ў дакументах гэтых арганізацый, але нават і ў назвах рэгіянальных камітэтаў.

3. *Узнікненне беларускіх партый і арганізацый.*

Пачатак XX ст. быў адзначаны ўздымам беларускага нацыянальнага руху. Аднак слабасць беларускай буржуазіі, якая не вытрымлівала канкурэнцыі з моцнай яўрэйскай, польскай, рускай не дазволіла беларускаму нацыянальна-вызваленчаму руху, моц якога залежала ад падтрымкі з боку сваіх нацыянальсвядомых прадпрымальнікаў, аказаць рашучы ўплыў на развіццё грамадска-палітычных працэсаў на Беларусі.

Асаблівасці Беларусі, перш за ўсё яе многанацыянальных гарадоў, дзе беларусы не складалі большасці насельніцтва, закдючаліся і ў тым, што пошукі шляхоў да грамадскага прагрэсу ўсё больш набывалі сацыяльна-палітычную накіраванасць. Але ўлічваючы тое, што пераважная частка ўсяго беларускага насельніцтва – сяляне, развіццё нацыянальнага руху пайшло пад адзнакай неанародніцкіх ідэй "сялянскага сацыялізму".

Тэма сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення загучала ў беларускіх народнікаў, дзеячоў групы "Гоман", якая ўзнікла ў 1884 г. Яна абгрунтавала сам факт існавання беларускай нацыі як самастойнай супольнасці людзей, яе права на сваю нацыянальную дзяржаўнасць і развіццё сваёй нацыянальнай культуры. Група "Гоман" адна з першых сярод народніцкіх груповак узняла пытанне пра федэралізм, як форму саюза паміж асобнымі часткамі дзяржавы або нацыямі, што ўваходзілі ў яе склад.

Беларуская ідэя фарміравалася шляхам пакутлівых пошукаў інтэлігентаў, якія былі звязаны з сялянствам, ва ўмовах канкурэнтнай барацьбы, як адзначалася вышэй, паміж расійскім і польскім капіталамі. Ва ўмовах адсутнасці ў беларусаў самастойных форм палітычнага і эканамічнага жыцця важным аб'яднальным фактарам у абуджэнні нацыянальнай самасвядомасці ставілася беларуская нацыянальная культура. Вось чаму беларуская ідэя, лунала ў паветры ў XIX ст. атрымала ў пачатку XX стагоддзя гучанне ідэі нацыянальнага Адраджэння. Яна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

была звязана з аднаўленнем незалежнага ад Польшчы Вялікага княства Літоўскага, вяртаннем дзяржаўнага статусу беларускай мовы, уніяцтва як нацыянальнай рэлігіі.

Апазіцыйнасць польскіх сацыялістаў да расійскага самадзяржаўя прывабіла многіх беларускіх дзеячаў, якія пачыналі сваю культурна-асветніцкую і палітычную дзейнасць. Тым больш, што яшчэ ў канцы 90-х гг. XIX ст. адной з буйных нелнгальных арганізацый у царскай Расіі стала Польская сацыялістычная партыя (ППС). Галоўным у праграме гэтай партыі і было патрабаванне незалежнасці Польшчы ў межах 1772 г. ППС выказала намер стварыць разам з літоўскімі, беларускімі і ўкраінскімі арганізацыямі “аб’яднаную палітычную сілу з мэтай звяржэння прыгнёту ў краі”. Аднак беларускіх дзеячаў не здавальняў праграмны пункт па нацыянальнаму пытанню, які адмаўлял фактычнаправа Беларусі на самастоўнасць і дэкларваў яе ўваходжанне ў федэратыўную Рэч Паспалітую.

Паступова культурна-асветніцкія тэндэнцыі ў беларускім руху пачынаюць пераўтварацца ў палітычныя. У канцы XIX ст. ствараюцца гурткі “Беларускай народнай асветы”, арганізаваныя студэнтамі-беларусамі ў Маскве і Пецярбургу. У іх праграмах прадугледжвалася “выданне і распаўсюджванне беларускай нацыянальнаў школы лдя народа”. Такую ж мэту ставілі і культурна-асветніцкія гурткі, што былі створаны беларускімі студэнтамі ў Вільні, Гродне і Мінску.

На аснове культурна-асветніцкіх гурткоў зімой 1901-1902 гг. у Пецярбургу ствараецца арганізацыя пад назвай Беларуская рэвалюцыйная партыя, якая таксама ставіла культурна-асветніцкія мэты. Аднак ў нутры палітычнай партыі вызначалася плынь на чале з братамі Луцкевічамі, якія імкнуліся нейкім чынам дыстанцыравацца ад польскага ўплыву. Так была ўтворана не раней 1903 г. Беларуская рэвалюцыйная грамада. Аднак новая партыя была арыентавана на некаторыя праграмныя пункты ППС.

Пасля таго яг да БРГ далучылася група Ігнатоўскага, партыя змыніла саю назву і стала называцца “Беларуская сацыялістычная грамада”. Як свелчаць некаторыя даследчыкі, адбылася гэта падзея не раней як у кастрычніку 1904 г. арганізатарамі і кіраўнікамі партыі былі браты Луцкевічы, В.Ластоўскі, К.Кастравіцкі (К.Каганец), Ф. Стацкевіч, Ф.Умястоўскі, А.Бурбіс, В.Іваноўскі, А.Пашкевіч (Цётка), А.Уласаў і іншыя.

Адразу БСГ заявіла пра сябе як партыя сацыялістычнай арыентацыі. Аднак ў праграме БСГ не праводзілася прынцыповаў розніцы паміж пралетарыятам, сялянамі і іншымі групамі працоўных. Як і эсэры, БСГ аб’яднала іх у адну сацыяльную катэгорыю – працоўны народ і ў роўнай ступені імкнулася знайсці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

апору ў рабочым класе, сялянстве, інтэлігенцыі. Партыя паставіла дабівацца краёвай аўтаноміі Беларусі з сеймам у Вільні, культурна-нацыянальнай аўтаноміі для нацыянальных меншасцей і выраша распрацаваць зямельную праграму на аснове канфіскацыі без выкупу маёнткаў паноў, казённых і іншых зямель. Сваю дзейнасць БСГ пачала з друкаванага беларускага слова. Першым выданнем з'явілася пракламацыя "Брацця мужыкі", выдадзенная ў сувязі з пачаткам руска-японскай вайны.

У пачатку XX ст. у Беларусі дзейнічалі таксама групы сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы (СДКП і Л). Яна была створана ў 1900 г. у Мінску. На чале яе стаялі Ф.Е. Дзяржынскі і С. Трусевіч. Партыя імкнулася да цеснага саюза з расійскім рэвалюцыйным рухам, стаяла на інтэрнацыянальных пазіцыях, вяла барацьбу з сепаратызмам ППС, узаемадзейнічала з Бундам. У красавіку 1906 г. на правах аўтаномнай арганізацыі ўступіла ў РСДРП.

Такім чынам, асноўныя палітычныя партыі і арганізацыі Беларусі напярэдадні першай расійскай рэвалюцыі знаходзіліся ў стане афармлення, пошукаў у вызначэнні сваіх палітычных пазіцый. Найбольш актыўна заявілі пра сябе расійскія сацыял-дэмакраты, Бунд, эсэры. Што датычыцца беларускага нацыянальнага руху, то ён рабіў першыя крокі на хвалі культурна-асветніцкіх і неанародніцкіх ідэй.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

4. ***Пазіцыі партый і арганізацый у перыяд уздыму першай Расійскай рэвалюцыі.***

Прычыны першай расійскай рэвалюцыі мелі свае карані ў супярэчнасцях усерасійскага грамадства: наяўнасць рэшткаў феадальна-прыгонніцкай сістэмы, адсутнасць палітычных свабод, жорсткая эксплуатацыі рабочых прадпрымальнікамі, няздольнасці царскай улады вырашыць шэраг сацыяльных і нацыянальных праблем, забяспечыць агульны прагрэс краіны. Усе гэтыя крызісныя рысы былі паглыблены няўдалай руска-японскай вайной, дзе руская армія пацярпела паражэнні. Па свайму характару і накіраванасці першая расійская рэвалюцыя была буржуазна-дэмакратыянай.

Падзеі 9 студзеня 1905 г. у Пецярбургу, калі царскі ўрад расстраляў мірнае шэсце рабочых, выклікала вялікае абурэнне ва ўсёй краіне, у тым ліку і на Беларусі. Палітычныя стачкі пратэсту, дэманстрацыі і мітынгі супраць карных захадаў урада абдыліся больш як у 20 гарадах Беларусі.

Першая расійская рэвалюцыя, якая пачылася, патрабавала ад усіх палітычных партый і груповак удакладніць свае погляды і пазіцыі, выпрацаваць тактыку.

Манархісцкія арганізацыі выступалі ў абарону захавання і ўмацавання самадзяржаўнай улады. Нічога дзіўнага тут няма, бо яны спачатку складаліся з дваран і ўрадавых чыноўнікаў.

Ліберальныя плыні спачатку проста крытыкавалі “бюракратычны рэжым” улады. Яны патрабавалі рэформаў і склікання царом прадстаўнічай установы. На паседжанні Мінскай гарадской думы ў студзені 1905 г. была прынята рэзалюцыя з патрабаваннем палітычных свабод. Ліберальныя плыні падтрымлівалі ідэі канстытуцыйнай манархіі.

Яўрэйскія ліберальныя дзеячы, пагаджаючыся з агульнарасійскімі, выступалі разам з тым: з патрабаваннем увядзення раўнапраўя яўрэяў. У канцы сакавіка 1905 г. у Вільні адбыўся з’езд прадстаўнікоў яўрэйскіх прадпрымальнікаў і інтэлігенцыі, на якім быў арганізаваны “Саюз дасягнення раўнапраўя яўрэяў у Расіі”, які фактычна заняў сіянісцкія пазіцыі.

Іншага пункту гледжання прытрымліваліся партыі сацыялістычнага выбару (сацыял-дэмакраты, Бунд, сацыялісты-рэвалюцыянеры, БСГ). Але сярод іх не было адзінства. Частка сацыялістаў імела ўхілы на бок лібералаў, больш умераныя меншавікі выступалі за скасаванне самадзяржаўя, але дапускалі ў пэўным сэнсе канстытуцыйную манархію. Найлепшым вынікам рэвалюцыі яны лічылі скліканне прадстаўнічай установы, якую можна пераўтварыць ва Устаноўчы Сход. Яны выступалі супраць паўстання, лічылі, што яно можа адбыцца толькі як “паўстанне здзічэлых мас народу”. Такія ж погляды былі характэрны і для бундаўцаў.

Бальшавікі былі не толькі за звяржэнне царскай улады, але і за ўстанаўленне рэвалюцыйна-дэмакратычнай дыктатуры пралетарыяту і сялянства шляхам узброенага паўстання, за развіццё буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную. Аднак на Беларусі меншавікі і бальшавікі знаходзіліся ў адных арганізацыях, і ўявіць сабе, якой стратэгіі і тактыкі прытрымліваліся гэтыя арганізацыі, было давалі цяжка. Але вядома, напрыклад, што на з’езд арганізацый Палескага і Паўночна-Заходняга камітэтаў, якія адбыліся ў маі-чэрвені 1905 г., пераважалі бальшавіцкія рэзалюцыі.

Вельмі рашуча і нават па-экстрэміску выступалі супраць царскіх улад сацыялісты-рэвалюцыянеры. Яны арганізавалі некалькі тэрарыстычных актаў супраць царскіх саноўнікаў і паліцэйскіх, заклікалі да аграрнага і фабрычнага тэрору. Але гэтыя экстрэмісцкія захады не садзейнічалі рэвалюцыйнаму згуртаванню працоўных.

Пашырала сваю актыўнасць Беларуская сацыялістычная грамада. Яна выдала лістоўку пад назвай “Царскае жніво”, дзе сцвярджалася, што спадзяваца на цара

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нельга, а таму “далоў цара, царскі ўрад”. У лістоўцы “Што такое Канстытуцыя?” БСГ патрабавала свабоды слова, друку, склікання канстуцыйнага сходу з прадстаўнікоў народа.

У сакавіку 1905 г. у Мінску адбыўся сялянскі з’езд БСГ. Дэлегаты вырашылі: атрымаць зямлю можна толькі сілай, шляхам аб’яднання з усім сялянствам Расіі і звяржэннем царскага ўрада. Меркавалася паўсюдна на весках стварыць брацтвы ці саюзы. Сялян заклікалі ў час жніва аб’яўляць забастоўкі, патрабаваць часткі ўраджаю, а ў выпадку адмовы захопліваць панскуб маёмасць і дзяліць яе паміж сабой. БСГ патрабавала таксама склікання сейма і для Беларусі.

Летам 1905 г. на Беларусі назіраўся ўздым рабочага і сялянскага руху. Калі ў майскіх палітычных стачках ўдзельнічалі 220 тыс. рабочых, то ў чэрвені-жніўні – 380 тыс. Шмат з іх прайшлі пад лозунгам “Далоў самадзяржаўе!”, “Васьмігадзінны рабочы дзень!”. Адчуваўся ўплыў сярод рабочых сацыял-дэмакратаў, бундаўцаў. Узмацнілся і сялянскі рух. У красавіку-жніўні 1905 г. адбылося 380 сялянскіх выступленняў. Галоўнае пытанне – зямля. Але ў сваёй аснове рух сялян быў стыхійны, а іх палітычныя патрабаванні няяснымі. Вынікі прапаганды эсэраў, грамадаўцаў, сацыял-дэмакратаў у вёсцы былі вельмі слабымі.

У жніўні 1905 г. цар выдаў закон аб скліканні дарадчаў Думы, падрыхтаваны міністрам унутраных спраў Булыгіным. Паводле прынятага закона, удзельнічаць у выбарах не мелі права рабочыя і іншыя асобы наёмнай працы. Лібералы пагадзіліся ўдзельнічаць у выбарах. Але ўсе партыі сацыялістычнай арыентацыі падтрымлівалі байкот Булыгінскай Думы. Заклікаючы байкатаваць Думу, БСГ, напрыклад, выступіла з ідэяй склікання Народнага сходу Літвы і Беларусі ў Вільні.

У кастрычніку 1905 г. краіну ахапіла ўсерасійская стачка. На Беларусі ў выніку стачкі была паралізавана ўся чыгунка. Напалоханы моцным рэвалюцыйным рухам, цар вымушаны быў 17 кастрычніка 1905 г. падпісаць Маніфест, у якім былі абяцаны дэмакратычныя свабоды: недатыкальнасць асобы, скліканне заканадаўчай Думы з удзела ў выбарах усіх саслоўяў насельніцтва. Гэта была маленькая перамога рэвалюцыі. пасля абвяшчэння Маніфеста 17 кастрычніка актывізаваліся праўрадавыя арганізацыі. Перш за ўсё неабходна адмеціць фарміраванне партыі “Союза русского народа” (лістапад 1905 г.). Сутнасць яго праграмы: праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць. Праваслаўе – пануючая вера, цар – гэта вышэйшая праўда, руская народнасць – дзяржаўная народнасць. Галоўнае – захаванне адзінства Расіі, адмаўленне ўсялякай аўтаноміі народам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Манархісты былі супраць Маніфеста 17 кастрычніка, які нейкім чынам абмяжоўваў уладу цара. Але адкрыта выступаць супраць царскага Маніфеста яны не маглі.

Асаблівую увагу прыхілінікі “Союза русского народа” ўдзялілі яўрэйскаму пытанню. Яны выступалі за стварэнне яўрэйскай дзяржавы як месца жыхарства ўсіх яўрэяў, за адмову яўрэям знаходзіцца на дзяржаўных расійскіх пасадах. “Союз” заклікаў рускую буржуаўію змагацца з яўрэйскім і замежнымі капіталамі ў Расіі. Арганізацыі гэтай партыі ў канцы 1905 г. узніклі ў Мінску, Віцебску, Гомелі. Іх з’яўленне было сваеасаблівым адказам на ўзмацненне яўрэйскага капіталу, панаванне яўрэяў-гандляроў, прадпрымальнікаў у эканоміцы заходніх і паўднёва-заходніх губерняў. Праграмы гэтых праўрадавых арганізацый знаходзілі падтрымку не толькі з боку памешчыкаў і саноўнай бюракраціі, але і часткі рабочых і сялян.

“Союза русского народа” і іншыя манархічныя партыі адмаўлялі права беларусаў на сваё самастойнае дзяржаўнае існаванне. Іх ідэолагі разглядаоі Беларусь як частку “Заходняй Расіі”, якая звязана з “адзінай і непадзельнай Расіяй”, і рабілі выснову: беларусы павінны канчаткова зліцца з рускім народам, быць яго непадзельнай часткай.

У канцы 1905 г. была створана партыя “Саюз 17 кастрычніка”, якая без агаворак падтрымлівала царскі ўрод і яго праграму, выкладзеную ў Маніфесце. Партыя асабліва падкрэслівала неабходкасць захавання адзінства Расійскай дзяржавы. Толькі Фінляндыі “Саюз” лічыў магчымасць даць нейкую аўтаномію. Іншым народам адмаўлялася мець аўтаномію, нават у пытаннях культуры і асветы. Прыхільнікі “Саюза” дапускалі таксама магчымасць продажу сялянам дзяржаўных зямель. У манархічным лагеры Беларусі актыўна пачало дзейнічаць таварыства “Крестьянін”, якое ўзнікла ў Вільні ў канцы 1905 г. Спачатку таварыства маскіравала сваю палітычную накіраванасць, заяўляла, што нн падзяляе праграмныя мэты ніводнай з расійскіх партыў, а будзе дамагацца эканамічнага і культурнага развіцця краю. Але ўжо ў пачатку 1906 г. лідэры “Крестьяніна” заявілі, што яны выступаюць супраць ідэй сацыялістаў і чакаюць задавальнення сялянскіх інтарэсаў ад цара. Дзеячы таварыства заклікалі ўмацоўваць асновы самадзяржаўя на Беларусі.

Маніфест 17 кастрычніка віталі ліберады. Аднак яны лічылі, што гэты дакумент не цалкам задавальняе патрабаванні вызваленчага руху. У лістападзе 1905 г. ліберады стварылі Канстытуцыйна-дэмакратычную партыю (кадэтаў). Яна адстойвала канстытуцыйную манархію, выкуп часткі памешчыцкай зямлі сялянамі,свабоду і садзейнічанне прадпрымальніцтву. На Беларусі партыю кадэтаў падтрымлівалі ліберальныя памешчыкі (галоўным чынам польскія і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

акаталічаныя беларускія), расійскія чыноўнікі ібуржуазія (пераважна яўрэйская), бо ў яе праграме былі абяцанне даць аўтаномію Царству Польскаму, (права на самавызначэнне кадэты адмаўлялі), дозвол на ўжыванне ў грамадскім жыцці роднай мовы, грамадзянскае раўнапраўе і г.д. Аднак польска-беларускія памешчыкі не падзялялі аграрнай парграмы кадэтаў. Нягледзячы на гэтыя погляды, у канцы 1905 г. гурткі кадэцкіх партый ўзніклі ў Вільні, Магілёву і Пінску.

Яўрэйская буржуазія таксама вітала Маніфест 17 кастрычніка, спадзяваючыся атрымаць ад яго карысць. Пасля абвяшчэння Маніфеста сіяністы і прыхільнікі прасіянісцкага “Саюза дасягнення раўнапраўя яўрэяў” выступілі з праграмай стварэння ў Расіі экстэрытарыяльнага яўрэйскага самакіравання з прымусовай уладай у сферы нацыянальных зносін. Па агульнапалітычных пытаннях яны падтрымлівалі кадэтаў.

Да ліберальных плыняў схілілася Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі, якая была створана ў канцы 1905 – пачатку 1906 г. віленскім каталіцкім святаром Э.Ропам. партыя патрабавала для Беларусі і Літвы абласнога самакіравання, аўтаноміі з заканадаўчым сеймам для Польшчы. Вырашэнне аграрных і іншых пытанняў звязвала з устанаўленнем мясцовага самакіравання. Адстойвала памешчыцкае землеўладанне, выказвалася за садзейнічанне сялянам у набыцці зямлі. Партыя дзейнічала пераважна ў Віленскай і некаторых паветах Гродзенскай губерні, дзе большасць насельніцтва складалі католікі.

Партыі сацыялістычнага накірунку адмоўна сустрэлі Маніфест 17 кастрычніка. Яны лічылі, што гэта толькі манёўр царызму, што сапраўднага вызвалення не адбудзецца. Пра гэта сведчаць наступныя падзеі. Калі 18 кастрычніка 1905 г. у Мінску ўдзельнікі мітынгу затрабавалі вызваліць 12 вязнаў, то губернатар Курлаў вымушаны быў задаваліць гэтае патрабаванне. Але калі вязні былі ўжо на волі і прынялі ўдзел у мітынгу на Прывакзальнай плошчы, па мітынгуючых пачалася стральба. Невядома, ці стралялі па загаду Курлава, ці гэта была справакаваная акцыя з боку некаторых мітынгуючых, але вынік трагічны: загінула больш за 80 чалавек. Сацыял-дэмакраты, эсэры,БСГ заклікалі салдат пераходзіць на бок працоўных, патрабавалі ад улад пакараць вінаватых у расстрэле.

Эсэры вырашылі правесці ў адказ шэраг тэрарыстычных актаў. Яны спрабавалі зрабіць замах на Курлава, але няўдала. Затое член эсэраўскай арганізацыі Л. Язерская параніла магілёўскага губернатара Клінгеберга. 15 снежня быў паранены памочнік мінскага паліцмайстра Шклярэвіч. Беспаспяховым быў замах Івана Пуліхава 14 студзеня 1906 г. на жыццё Курлава. Бомба так і не ўзарвалася. Эсэраўскі тэрор прынёс шкоду рэвалюцыйнаму руху,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бо садзейнічаў узмацненню рэпрэсій, расколу левых сіл сацыял-дэмакраты асудзілі эсэраўскую тактыку тэрору, але выказалі пажаланне баявога саюзу з эсэрамі ў барацьбе супраць рэпрэсій улад.

У снежні 1905 г. узброенае паўстанне пацярпела паражэнне. На Беларусі паўстанне не адбылося, але назіралася некалькі сутычак рабочых з царскімі вайскоўцамі. Адбыліся стачкі на некаторых прадпрыемствах у падтрымку паўстання.

У канцы снежня 1905 – пачатку 1906 г. абдыўся I з'езд Партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Ён прыняў праграму партыі, у якой былі ўключаны асноўныя палажэнні эсэраўскага сацыялізму. З'езд вырашыў не заклікаць да ўзброеннага паўстання, але падрыхтавацца на выпадак яго стыхійнага ўзнікнення, таксама палічыў узмацніць тэрор.

Лекцыя 3: ***Рэвалюцыя 1905 – 1907 гг. у Беларусі.***

Ключавыя паняцці Ключавыя паняцці

План.

1. Прычыны і пачатак рэвалюцыі.
2. Булыгінская Дума.
3. Кастрычніцкая палітычная стачка.
4. Снежаньскія падзеі 1905 г. у Беларусі.
5. Прычыны паражэння рэвалюцыі.

Канспект лекцыі.

1. ***Прычыны і пачатак рэвалюцыі.***

Прычыны першай расійскай рэвалюцыі мелі свае карані ў супярэчнасцях усерасійскага грамадства: наяўнасць рэшткаў феадальна-прыгонніцкай сістэмы, адсутнасць палітычных свабод, жорсткая эксплуатацыі рабочых прадпрымальнікамі, няздольнасці царскай улады вырашыць шэраг сацыяльных і нацыянальных праблем, забяспечыць агульны прагрэс краіны. Усе гэтыя крызісныя рысы былі паглыблены няўдалай руска-японскай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вайной, дзе руская армія пацярпела паражэнні. Па свайму характару і накіраванасці першая расійская рэвалюцыя была буржуазна-дэмакратыянай. Па формах і метадах барацьбы была пралетарскай. Яе галоўнай рухаючай сілай быў рабочы клас.

Рэвалюцыйныя выступленні на Беларусі ў гады першай рускай рэвалюцыі былі састаўной часткай усерасійскага вызваленчага руху. Разам з тым рэвалюцыйны рух на Беларусі насіў нацыянальна-вызваленчы характар.

Крывавая нядзеля 9 студзеня 1905 г. у Пецярбургу, калі было расстраляна мірнае шэсце рабочых да Зімовага палаца – рэзідэнцыі цара Мікалая II, пабарвала веру рабочых "у добрага цара". Гэтая падзея і стала пачаткам першай рускай рэвалюцыі. забастоўкі салідарнасці ахапілі 11-15 студзеня Мінск. Магілёў, Гомель, Гродна, Смаргонь – усяго 25 гарадоў і мястэчак Беларусі.

У Смаргоні 13-14 студзеня і ў Крынках 17-19 студзеня стачкі суправаджаліся мітынгамі, дэманстрацыямі, маніфестацыямі значнага размаху (яны былі падрыхтаваны мясцовымі сацыял-дэмакратамі разам з прадстаўнікамі Віленскай арганізацыі РСДРП і Беластоцкай арганізацыі СДКПіЛ).

У студзеньскія дні 1905 г. у беларускіх губернях баставала 34 тыс. чалавек. У наступныя месяцы пракацілася хваля эканамічных забастовак, большасці якіх былі пачаты па ініцыяціве і пад кіраўніцтвам арганізацый РСДРП. Рабочы рух змыкаўся з сялянскім. У студзені-сакавіку 1905 г. адбыліся 53 сялянскія выступленні, многія з іх насілі палітычны характар. У сакавіку 1905 г. БСГ арганізавала ў Мінску сялянскі з'езд. Дэлегаты прыйшлі да вываду, што атрымаць зямлю можна толькі шляхам узброенай барацьбы з самадзяржаўем.

Уздым рэвалюцыйнай актыўнасці мас патрабаваў дакладнага кіраўніцтва. Аднак у гэты час пачатак рэвалюцыі на Беларусі ўскладніла адсутнасць адзінства дзеянняў розных палітычных сіл, вопыту барацьбы, што негатыўна адлюстроўвалася на тактыцы дзеянняў.

Кантакты сацыял-дэмакратаў з іншымі партыямі ў перыяд студзеня – сакавіка 1905 г. былі нешматлікі. Гэта было звязана з тым, што працэс партыйнага групавання дробнай буржуазіі яшчэ толькі пачынаўся, іх арганізацыі былі малыя і слабыя.

Найбольш значнай на беларусі была дзейнасць эсэраў. У прыватнасці, у Мінску эсеры прымалі ўдзел у стачках салідарнасці, якія праводзіліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

арганізацыямі РСДРП, распаўсюджвалі літаратуру, давалі канспіратыўныя кватэры. Арганізацыі РСДРП на гэтым этапе стаялі пераважна на бальшавіцкіх пазіцыях.

У такім становішчы вялікае значэнне мелі рашэнні III з'езда РСДРП (красавік 1905 г.), асабліва ў адносінах да нацыянальных арганізацый. З'езд вызначыў стратэгію і тактыку бальшавікоў ва ўмовах пачатку рэвалюцыі, адносіны да іншых партый і аб'яднанняў, выказаўся за аб'яднанне сацыял-дэмакратычных арганізацыя ў адзіную РСДРП пры ўмовах падпарадкавання рашэнням з'езда. Тактыка, распрацаваная з'ездам, дазволіла згуртаваць рэвалюцыйныя сілы з улікам асаблівасцей рэвалюцыі на Беларусі. Рухаючымі сіламі яе былі не толькі пралетарыят і сялянства, як у Расіі, але і ліберальна-дэмакратычная буржуазія, абараняўшая свае вузка нацыянальныя інтарэсы.

Пасля з'езда выступленні рабочых адбываліся нярэдка пад аб'яднаным кіраўніцтвам РСДРП, эсэраў, бундаўцаў, БСГ, хаця Бунд часцей займаў іншую пазіцыю, паколькі прэтандаваў на аднаасобнае лідэрства, а меньшавікі, БСГ па шэрагу прынцыповых пытанняў праяўлялі нерашучасць.

Дзейнасць Беларускай сацыялістычнай грамады ў гады рэвалюцыі мела найважнейшае значэнне для ідэйнай кансалідацыі Беларускага руху. У канцы 1905 г. абдыўся I з'езд партыі, што выявіла яе разыходжанні з эсэрамі. БСГ прапанавала канфіскаваць памешчыцкія, царкоўныя і ўдзельныя землі, аб'яднаць з казеннымі і стварыць нацыянальны зямельны фонд, размеркавальнікам зямлі павінна стаць краявое самакіраванне, незалежнае ў гэтым пытанні ад цэнтральнай расійскай улады. У праграме было выразна зафіксавана, што бліжэйшымі задачамі партыі з'яўляюцца: звяржэнне царызму, аўтаномія Беларусі з мясцовым сеймам у Вільна, 8-гадзіны працоўны дзень, перадача ўсёй зямлі ў грамадскую маёмасць.

Вясной і летам 1905 г. рабочыя на Беларусі падтрымалі расійскі пралетарыят. Гэтымі выступленнямі ў асноўным кіравалі арганізацыі РСДРП. Актыўна прайшлі на Беларусі першамайскія забастоўкі. У чэрвені-ліпені абдыліся палітычныя стачкі і дэманстрацыі ў знак салідарнасці з бастуючымі рабочымі Пецярбурга, Лодзі, Іванава-Вазнясенска. У Мінску 18-19 чэрвеня прайшлі мітынгі з удзелам каля 6 тыс . чалавек, а 28 чэрвеня была аб'яўлена ўсеагульная забастоўка. У гэты ж дзень адбылася дэманстрацыя ўзброеных рабочых, казакі і паліцыя прымянілі зброю. Сур'ёзныя ўзброенныя сутыкненні ў ходзе чэрвеньскіх дэманстрацый адбыліся таксама ў Бабруйску, Барысаве, Віцебску, Гомелі. Забастоўкі і дэманстрацыі пратэсту былі ў Смаргоні, Пінску, Нясвіжы, Ляхавічах, Смілавічах, Капысі, Ашмянах. Усяго

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

палітычным рухам рабочых у красавіку-чэрвені было ахоплена 56 гарадоў і мястэчак колькасць стачачнікаў – 96 тыс., дэманстрантаў – 30 тыс., удзельнікаў масовак і маніфестацый – 94 тыс. чалавек.

Пад уплывам пралетарскай барацьбы шырокі размах набыў сялянскі рух. Улетку і восені 1905 г. на Беларусі зарэгістравана 380 выступленняў (у 32 паветах з 35). Яны адрозніваліся арганізаваннасцю, узмацненнем наступальных формаў барацьбы. Упершыню ў Віцебскай, Віленскай і Мінскай губернях былі створаны сялянскія арганізацыі пад кіраўніцтвам РСДРП. Найбольш актыўна яны дзейнічалі ў Ігуменскім, Гарадокскім і Дзісенскім паветах. У Мінску і Вільна стварылі свае камітэты БСГ, РСДРП. БСГ і эсэры арганізавалі ў вёскі Блонь Ігуменскага павета і мястэчку Пухавічы школы сялянскіх агітатараў, якія потым ўладкоўваліся на працу ў вёсках і пам стваралі сялянскія гурткі.

У адказ на паўстанне на броняносцы “Пацёмкін” пачаліся хваляванні ў арміі: выступілі жаўнеры асобных часцей Магілёўскага, Гродзенскага і Брэст-Літоўскага гарнізонаў, Бабруйскага дысцыплінарнага батальёна. Рэвалюцыйную агітацыю сярод ваенных вялі мясцовыя арганізацыі РСДРП і ПСР.

2. ***Булыгінска дума.***

Напалоханы рэвалюцыя царскі ўрад узмацніў рэпрэсіі. Адначасова з мэтай аслабіць націск рэвалюцыйных сіл, раскалоць дэмакратычны лагер, прыцягнуць на свой бок ліберальную буржуазію Мікалай II апублікаваў 6 жніўня 1905 г. маніфест і закон аб скліканні законадарадчай думы, падрыхтаваны міністрам унутраных спраў Булыгтным. Выбарчая сістэма засноўвалася на саслоўным прынцыпе. Паводле "Палажэння аб выбарах у Дзяржаўную думу" усе выбаршчыкі падзеляліся на 3 курыі (г.зн. разрад выбаршчыкаў, аб'яднаных формай уласнасці ці прыналежнасцю да пэўнага саслоўя): землеўладальніцкую (памешчыцкую), гарадскую (буржуазія) і сялянскую. Кожная курыя павінна была мець сваіх асабістых прадстаўнікоў, агульны сход якіх у кожнай губерні абіраў бы затым дэпутатаў ў Думу. Пры гэтым большасць насельніцтва (рабочыя, жанчыны, асобы маладзей за 25 гадоў, вайскоўцы, навучэнцы і інш.) ад удзелу ў выбарах адхіляліся. Шлях, якім фарміраваліся курыі, забяспечваў большае прадстаўніцтва "класаў уласнікаў".

Царскі “падарунак” народу ў выглядзе законодарадчай Думы не супакоіў ахопленую рэвалюцыяй краіну. Буржуазна-ліберальныя групоўкі ў большасці станоўча аднесліся да ўказу аб Думе, паколькі бачылі ў ёй адзіны сродак

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спыніць рэвалюцыю. Ліберальныя памешчыкі і яўрэская буржуазія пачалі рыхтавацца да выбараў, праводзіць сходы. Прадстаўнікі пануючых класаў незалежна ад нацыянальнасці выказалі гатоўнасць супрацоўнічаць з самадзяржаўем на платформе Думы.

Меншавікі, не адмаўляючыся ад лозунгу Установчага сходу, фактычна падтрымалі згодніцкую пазіцыю лібералаў. Бальшавікі выставілі лозунг актыўнага байкоту Думы і ў сувязі з ім разгарнулі агітацыю з мэтай падрыхтоўкі ўсеагульнай стачкі і ўзброеннага паўстання супраць царызму. Лозунг байкоту падтрымалі практычна ўсе партыі дэмакратычнага лагера, у тым ліку Бунд, ПСР, БСГ, а таксама частка ліберальных саюзаў.

Антыдумская агітацыя пачалася ўжо ў ліпені 1905 г. – пасля неафецыйнай публікацыі булыгінскага законапраекта. Адбыўся мітынг у Гомелі 12 ліпеня, прамала ўдзел 400 рабочых. Мітынг быў арганізаваны бундаўцамі. На мітынге была прынята рэзалюцыя, у якой быў выказаны пратэст супраць Думы і зроблена заява, што не шляхам кампрамісаў і петыцый, а толькі рэвалюцыя прывядзе народ да жаданай мэты – дэмакратычнай рэспублікі. Падобныя рэзалюцыі ў канцы ліпеня былі прыняты на мітынгах рабочых Брэста (4 тыс. чалавек), Смалявіч, Беразіно,Чашнікаў і інш. гарадах.

У жніўні рух пратэсту супраць булыгінскай Думы значна пашырыўся і ўзмацніўся. У шэрагу гарадоў і мястэчках (Віцебску, Мінску, Полацку, Брэсце, Лідзе, Сморгоні, Івянец, Халопенічы, Капыль, Цімкавічы) прайшлі мітынгі і маніфестацыі. Наладжвалі іх прадстаўнікі РСДРП. У шэрагу месцаў яны суправаджаліся вылічнымі маніфестацыямі і дэманстрацыямі.

Такім чынам бачна, што абмежаваная ў сваіх паўнамоцтвах законадарадчая Дзяржаўная дума, урэзаныя выбарчыя правы насельніцтва не маглі ўжо задаволіць грамадства, асабліва яго радыкальныя элементы. Акты 6 жніўня састарэлі яшчэ да таго часу, калі былі падпісаны Мікалаем II.

3. *Кастрычніцкая палітычная стачка.*

Царскаму ўраду не ўдалося супакоіць краіну. Рэвалюцыйны рух нарастаў. У кастрычніку рознымі формамі палітычнай барацьбы было ахоплена 24 гарады і 29 мястэчкаў Беларусі, у забастоўках і дэманстрацыях удзельнічала 153 тыс. чалавек.

У Мінску кастрычніцкую дэманстрацыю пачалі па ініцыяціве групы РСДРП 11 кастрычніка чыгуначнікі. На наступны дзень рашэнне аб яе падтрымцы прынялі мясцовыя камітэты Бунда і эсэры. Стачка ахапіла ўсе прадпрыемствы, зачыніліся магазіны, школы, гімназіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У Смаргоні па закліку кааліцыйнай камісіі 17 кастрычніка спынілася праца на ўсіх прадпрыемствах. Горад фатычна апынуўся ў руках забастоўшчыкаў.такое ж становішча назіралася ў Ашмянах, дзе забастоўка працягвалася каля тыдня. У Мазыры стачка пачалася яшчэ 13 кастрычніка і працягвалася 10 дзён. Быў створаны аб'яднаны рэвалюцыйны камітэт, які фактычна стаў уладай у горадзе. Толькі пры дапамозе паліцыі і ўзброенай сілы мозырскае выступленне было падаўлена.

Царызм быў вымушаны пайсці на палітычныя ўступкі. 17 кастрычніка 1905 г. быў апублікаваны маніфест, які абвясціў палітычныя свабоды. Буржуазія ў знак яго ўхвалення стварыла палітычную партыю – "Саюз 17 кастрычніка". Левыя лібералы таксама арганізаваліся ў канстытуцыйна-дэмакратычную партыю (кадэты).

РСДРП з недаверам паставілася да гэтага дакумента. Па яе ініцыятыве ў шэрагу гарадоў прайшлі мітынгі пратэстаў. У Мінску 18 кастрычніка адбыўся мітынг. Губернатар Курлоў загадаў адкрыць агонь па ўдзельніках мітынгу на Прывакзальнай плошчы, звыш 80 чалавек былі забіты, некалькі соцень паранена.

Крывавая сутычка ў гэты дзень адбылася і ў Смаргоні, дзе было паранена 10 дэманстрантаў, расстрэлы мелі места таксама і ў Віцебску, Полацку. На наступны дзень пасля Курлаўскага растрэла 19 кастрычніка, выйшлі на дэманстрацыю з чырвонымі сцягамі працоўныя Оршы.

У ходзе кастрычніцкай палітычнай стачкі ва ўсіх буйных цэнтрах рэвалюцыйнага руху Расіі ўзніклі новыя масавыя палітычныя арганізацыі – Саветы рабочых дэтутатаў.

На Беларусі стачачныя камітэты, узнікшыя ў перыяд кастрычніцкай стачкі, выконвалі функцыі органаў улады. У Мінску пасля 18 кастрычніка быў арганізаваны кааліцыйны савет. У яго склад ўвайшлі прадстаўнікі ад мінскай групы РСДРП, Любава-Роменскага камітэта Усерасійскага чыгуначнага саюза, Мінскага камітэта эсэраў і Бунда. Савет удзельнічаў як орган рэвалюцыйнай улады ў арганізацыі мітынгаў і дэманстрацый, на працягу 12 дзён кантраляваў работу чыгуначнага вузла, стварыў камісію ўзаемадапамогі і суд гонару, абавязваў фабрыкантаў і заводчыкаў выплачваць рабочым зарплату за дні забастоўкі.

У Віцебску ў кастрычніку 1905 г. таксама была створана кааліцыйная камісія. У яе склад увайшлі прадстаўнікі груп РСДРП і Бунда. Камісія ажыццяўляла функцыі адміністратыўнай улады, арганізоўвала атрады

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

самаабароны. 17 кастрычніка камісія ўзначаліла ўсеагульную стачку, у выніку сутыкнення з паліцыяй былі забітыя і параненыя.

Рэвалюцыйны камітэт быў створаны ў Мазыры, стачачныя камітэты – у Баранавічах, Ваўкавыску, Пінску і Гомелі.

Працягваліся сялянскія хваляванні. У лістападзе зарэгістравана 174 выступленні, у снежні іх колькасць дасягнула 286. У Горыцкім і Клімавіцкім паветах яны набылі характар ўзброеннага паўстання.

4. ***Снежаньскія падзеі 1905 г. у Беларусі*.**

У пачатку снежня 1905 г. царскі ўрад паспрабаваў авалодаць становішчам у краіне. Па яго ўказу былі закрыты некалькі дэмакратычных газет, забаронены Чыгуначна саюз, арыштаваны члены Пецярбургскага Савета рабочых дэпутатаў. У адказ 7 снежня ад імя Савета рабочых дэпутатаў, РСДРП, ПСР і Бунда была выдана адозва “Да ўсяго народа”, якая фактычна заклікала да ўзброеннага паўстання. У Маскве ў тойжа дзень пачалася ўсеагульная палітычная стачка, якая 9 снежня перарасла ў ва ўзброеннае паўстанне.

У адказ на ўзброеннае паўстанне ў Маскве 8 снежня забаставалі чыгуначнікі большасці чыгуначных вузлоў Беларусі. Для кіраўніцтва ў Мінску быў створаны кааліцыйны савет у складзе Мінскай групы РСДРП, мінскага камітэта эсэраў, Бунда і чыгуначнага камітэта Лібава-Роменскай дарогі. 9 снежня стачка набыла набыла ў Мінску ўсеагульны характар. Пачаліся хваляванні сярод ваенных. Мінская група РСДРП заклікала да паўстання, аднак пад уплывам бундаўцаў і меншавікоў стачка была спынена.

У Гомелі палітычнай стачкай кіраваў Палескі камітэт РСДРП. Забастоўшчыкі захапілі ў свае рукі станцыю, тэлеграф, пошту. У Пінску ўсеагульная палітычная стачка дазволіла ўзяць у свае рукі горад і станцыю, але з прычыны нерашучасці бундаўцаў і меншавікоў яна не перарасла ва ўзброенае паўстанне. Бальшавікоў падтрымалі толькі эсэры.

Снежаньская палітычная стачка праходзіла больш арганізавана, але абарончая тактыка прадвызначыла яе паражэнне. 18 снежня кааліцыйны савет у Мінску быў арыштаваны. Хутка на Беларусі з’явілася карная экспедыцыя генерала Арлова, якая падавіла выступленні ў Пінску, Гомелі, Лунінцы, Баранавічах.

Снежаньская палітычная стачка на Беларусі ахапіла 17 гарадоў і мястэчак, а з улікам дэманстрацый, мітынгаў, сутыкненняў з паліцыяй і войскам – 28 гарадоў і мястэчак. У стачках удзельнічалі каля 44 тыс. чалавек.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Па накалу і напружанасці барацьбы сітуацыя ў некаторых гарадах была блізкай да ўзброеннага паўстання, аднак на тэрыторыі Беларусі ў снежні 1905 г. яно не адбылося. Гэта было абумоўлена адноснай нешматлікасцю пралетарыяту і моцным уплывам на рабочых прадстаўнікоў дробнабуржуазных партый.

Пасля снежня рэвалюцыя пайшла на спад. У гэтых умовах "левы блок" стаў распадацца. Ужо са снежня Бунд пачаў ухіляцца ад актыўнай рэвалюцыйнай барацьбы.

Апошняй сумеснай акцыяй "левага блоку" стаў байкот I Дзяржаўнай Думы вясной 1906 г. Прапанаваную бальшавікамі тактыку байкоту падтрымалі ў Беларусі эсэры, БСГ, а таксама Бунд і партыі пралетарскага сіянізму.

5. Прычыны паражэння рэвалюцыі.

Асноўныя падзеі рэвалюцыі 1905-1907 гг.

Студзень 1905 г. – выступленні салідарнасці ў сувязі з падзеямі "Крывавай нядзелі".

Вясна-лета 1905 г. – уздым сялянскага і рабочага руху, салдацкія хваляванні.

Кастрычнік 1905 г. – стварэнне кааліцыйных саветаў, удзел Усерасійскай палітычнай стачцы.

Снежань 1905 г. – рост рабочага і сялянскага руху, узмацненне салдацкага руху.

Красавік 1906 г. – пачатак дзейнасці I Дзяржаўнай думы.

Ліпень 1906 г. – пачатак дзейнасці II Дзяржаўнай думы.

3 чэрвеня 1907 г. – роспуск II Думы. Дзяржаўны пераварот.

Нягледзячы на велізарны размах стачачнай барацьбы рабочага класа ісялянскага руху, першая руская буржуазная рэвалюцыя пацярпела паражэнне. Адной з галоўных прычын яе паражэння было тое, што ў той час яшчэ не склаўся трывалы саюз рабочага класа з сялянствам. Хоць саюз пралетарыяту і сялянства ажыццяўляўся на ўсім працягу рэвалюцыі, але ён быў не афармлены, рэвалюцыйныя сілы былі недастаткова арганізаваны. Выступленні рабочых, сялян і салдат не зліўся ў адзіны рэвалюцыйны паток.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Нягледзячы на паражэнне, першая руская рэвалюцыя нанесла ўдар па царызму. Рабочы клас і сялянства прымусілі царызм, памешчыкаў і буржуазію пайсці на ўступкі. У асобных галінах прамысловасці была павышана зарплата, скарочаны рабочы дзень, зніжаны штрафы. Былі легалізаваны прафсаюзы. Царызм быў вымушаны адмяніць выкупныя плацяжы, а памешчыкі – знізіць арэндныя і прадажныя цэны на зямлю. Былі адменены некаторыя саслоўныя абмежаванні для сялянства. Рэвалюцыя прымусіла стварыць прадстаўнічую установу – Дзяржаўную думу. Але галоўная мэта рэвалюцыі – звяржэнне царызму – не была дасягнута.

Першая руская рэвалюцыя абыграла значную ролю ў жыцці беларускага народа. Яна ўзняла шырокія масы беларусаў да актыўнай барацьбы за сваё нацыянальнае і сацыяльнае разняволенне. Барацьба супраць сацыяльнага прыгнёту суправаджалася ростам нацыянальнай самасвядомасці. Гэта выклікала ўздым творчых сіл народа, шпаркае развіццё яго літаратуры, мовы, тэатра, народнай палітычнай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лекцыя 4: ***Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі*****..**

1. Дзяржаўная дума першага склікання.
2. Дзяржаўная дума другога склікання

1. І Дзяржаўная дума (27.4 (10.5) – 8(21).7.1906; адна сесія).

Дзяржаўная дума ў Расіі – прадстаўнічая заканадаўчая ўстанова ў Расійскай імперыі. Створана царызмам ва ўмовах рэвалюцыі 1905-1907 гг. з мэтай папярэдзіць новы рэвалюцыйны выбух і вырашыць галоўныя пытанні грамадска-палітычнага жыцця краіны: аграрнае, нацыянальнае, рабочае і інш., захоўваючы непахіснымі асновы самадзяржаўнага ладу. Першая спроба склікаць Дзяржаўную думу была зроблена царскім ўрадам у жніўні 1906 г., але ва ўмовах уздыму рэвалюцыі яна не мела поспеху.

11 снежня 1905 г., пасля разгрому маскоўскага ўзброенага паўстання, урад выдаў указ “Аб змяненні палажэння пра выбары ў Дзяржаўную думу”, якім значна пашыралася кола выбаршчыкаў у параўнанні з палажэннем ад 6 жніўня. Да трох выбарчых курый – землеўладальніцкай, гарадской і сялянскай – далучылася чацвертая – рабочая. Права ўдзельнічаць у выбарах дазвалялася толькі рабочым прадпрыемстваў фабрычна-завадской, горнай, горназавадскай прамысловасці, а таксама чыгуначных майстэрань з агульнай колькасцю рабочых-мужчын не меньш за 50 чалавек. Ад удзелу ў выбарах

фактычна былі адхілены ¾ усяго складу рабочых (на Беларусі працэнт рабочых, карыстаўшыхся выбарчым правам, быў яшчэ ніжэйшы), а таксама асабы іншых катэгорый наёмнай працы: гандлёвыя служачыя, батракі, прыказчыкі, прадаўцы. Не мелі выбарчых правоў жанчыны-работніцы, чыгуначныя рабочыя (акрамя майстэрань), трамвайныя, чорнарабочыя. Выбары для працоўных былі шматступенныя.

Поўная перавага на выбарах была забяспечана памешчыкам і буйной буржуазіі. Адзін голас памешчыка адпавядаў 3,5 галасы гарадской буржуазіі, 15 галасам сялян і 45 галасам рабочых. Выбары ў I Дзяржаўную думу выклікалі шырокі грамадскі рух. Разгарнулася вострая барацьба розных сацыяльных і палітычных сіл па пытанню аб адносінах да яе. Гэта было першае адкрытае выступленне на палітычнай арэне створаных у ходзе рэвалюцыі партый і груп. На Беларусі гэтая барацьба мела свае спецыфічныя асаблівасці.

Актыўную дзейнасць разгарнулі прадстаўнікі мясцовай буржуазіі і памешчыкаў, якія раздзяліліся па нацыянальнай прыналежнасці. Рускія памешчыкі аб'ядналіся ў партыю "Саюз 17 кастрычніка". Да іх далучылася праваслаўнае духавенства і рускія чыноўнікі. Яны выступалі абаронцамі інтарэсаў самадзяржаўя на ўскраінах, лозунга "адзінай і непадзельнай Расіі". Блізкая да іх была партыя прававога парадку. Акцябрысты і правапарадцы выступалі разам з чарнасоценцамі, прапагандавалі вялікадзяржаўны шавінізм, распальвалі нацыянальную і рэлігійную варожасць сярод насельніцтва. На выбарах яны пацярпелі паражэнне. Польскія памешчыкі выступалі за далучэнне Беларусі і Літвы да Польшчы (Прывіслінскага краю), патрабуючы пры гэтым аўтаноміі. Яны лічылі, што самакіраванне створыць нацыянальнай буржуазіі ўмовы для "замірэння" Польшчы. Буйныя польскія памешчыкі, у асаблівасці Мінскай губерні, абвясцілі сябе прыхільнікамі партыі кадэтаў, разыходжячыся з імі толькі па аграрным пытанні. Яны абаранялі прынцып недатыкальнасці прыватнай уласнасці на зямлю і не згаджаліся нават з частковым адчужэннем зямлі па "справядлівай ацэнцы".

Вялікі ўплыў на каталіцкае насельніцтва, асабліва ў Віленскай і Гродненскай губернях, мела канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі. Яе арганізатарам і кіраўніком быў віленскі каталіцкі барон Э.Роп. Мэтай гэтай партыі было аб'яднанне на выбарах усяго насельніцтва края на аснове каталіцызма. Партыя мела значны ўплыў на выбарах, асабліва сярод беларускіх сялян-католікаў.

На Беларусі апору галоўнай ліберальнай партыі – кадэтаў, складала пераважна яўрэская буржуазія і інтэлігенцыя. Кадэты выступалі ў саюзе з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Саюзам дасягнення раўнапраўнасці яўрэяў у Расіі”. Як правіла, кадэты як самастойная партыя не агітавалі, а пераносілі сваб дзейнасць у нацыянальныя групы польскіх, яўрэйскіх і літоўскіх арганізацый. Поўны поспех на выбарах яны мелі ў гарадской курыі.

Шэраг партый байкатавалі выбары. Тактыку байкоту Думы праводзілі бальшавікі. Яна была накіравана на працяг рэвалюцыйнай барацьбы. Гэтая таксама мела поспех сярод рабочых. Сялянне ў асноўнай масе ўдзельнічалі ў выбарах. Ухіліліся ад ўдзелу ў выбарах і ад перадвыбарчай агітацыі народніцкія партыі – эсэры і БСГ. Байкатаваў выбары Бунд. Але ва ўмовах адступлення рэвалюцыі байкот не ўдаўся, выбары адбыліся. Яны праходзілі ў той час, калі 70 % губерній краіны знаходзіліся на ваенным ці надзвычайным становішчы, выкліканымі падзеямі 1905 г. Гэта стварала добрыя ўмовы для паліцэйскага і адміністрацыйнага самавольства. Канчатковы вынік выбараў вызначыўся не толькі ходам усёй выбарчай кампаніі, але і палітычнымі камбінацыямі на губернскіх выбарчых сходах.

Ад беларускіх губерній у I Думу былі абраны: ад Мінскай губерні селянін з Навагрудскага павета – С.І. Гатоўчыц, памешчыкі – князь І.Э. Друцкі-Любецкі, Р.А. Скірмунт, Я.І. Любанскі, І.І. Вішнеўскі, прысяжныя павераныя – В.А. Янчэўскі, А.Р. Лядніцкі, доктар філасофіі П.П. Масоніўс і адзін з лідэраў сіяністаў, юрыст Я.Я. Розенбаўм; ад Віцебскай губерні памешчыкі – Б.Б. Шахно, П.І. Перасвет-Солтан, А.О. Валковіч – гласны Віцебскай гарадской думы, былы гарадскі галава, Г.Я. Брук – урач, рэдактар пракадэцкай газеты “Віцебская жызнь”; член партыі кадэтаў, ксёндз Ф.С. Трасун, сялянін з в. Азерцы Вазнянскай воласці Полацкага павета Р.П. Філіпаў.

Моцны ўплыў на сялян Віленскай губерні аказала каталіцкае духавенства. Яно імкнулася згладзіць класавыя супярэчнасці і павесці за сабой на выбарах сялян. Віленскі епіскап барон Э.Роп дабіўся таго, што частка сялян, делегаваных на губернскі выбарчы сход ад імя ўсіх сялянскіх выбаршчыкаў падпісала пагадненне з памешчыкамі, па якому тры дэпутацкія месцы аддаваліся сялянам (адно з іх было забяспечана выбарчым законам) і тры месцы памешчыкам. У выніку ў Думу былі абраны сяляне: К.А. Александровіч – літовец, католік, у Думу ўвайшоў у склад трудавой групы; М.М. Грынцэвіч – беларус-католік, епіскап Э.Роп, памешчыкі Ч.К. Янкоўскі і член праўлення “Руска-бяльгійскага металургічнага таварыства” Б.Я. Ялавецкі. Ад надзельных сялян дэпутатам быў абраны сялянін М.С. Гатавецкі – літовец-католік. У Думе ён далучыўся да

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

трудавікоў. Сёмым дэпутатам быў Ш.Х. Левін – сіяніст, член “Саюза для дасягнення раўнапраўя ў Расіі”, кадэт.

У Гродзенскай губерні на выбарах у Думу польскія памешчыкі пацярпелі поўнае паражэнне. Сяляне ўвайшлі ў дамоўленнасць з гарадскімі выбаршчыкамі і забалацірывалі ўсіх памешчыцкіх кандэдатаў. Дэпутатамі ў Думу былі абраны сяляне М.М. Жукоўскі, С.П. Кандрашук, А.В. Курапацкі і беластоцкі павятовы прадвадзіцель дваранства М.М. Ярогін. Ад гарадской курыі былі выбраны прысяжны павераны В.Я. Якубсон і юрыст М.Я. Астрагорскі – абодвы кандыдыты права Пецярбургскага ўніверсітэта. Першы стаў у Думе актыўным дзеячам трудавой групы, другі – па сваіх палітычных поглядах далучыўся да кадэтаў.

У Магілёўскай губерні з сямі дэпутацкіх месц 5 занялі сяляне. Дэпутатамі ў Думу былі выбраны В.А. Каранькоў, М.І. Аўсяннікаў, М.Е. Сямёнаў, А.І. Сакалоўскі, Ф.Я. Буслаў. У Думе М.Е. Сямёнаў далучыўся да кадэтаў, А.І. Сакалоўскі і Ф.Я. Буслаў – да трудавой групы, прычым апошні быў адным з найбольш актыўных яе арганізатараў. Ад гарадскіх выбаршчыкаў былі выбраны дваранін, калежскі асэсар у адстаўцы Г.Н. Цвёрды – кадэт, адзін з кіраўнікоў газеты “Магілёўскі голас”, ад землеўладальнікаў –дваранін калежскі саветнік А.Я. Хамятоўскі.

Выбары паказалі, што сяляне прынялі ў іх дастаткова шырокі ўдзел, разлічваючы, што Дума зможа вырашыць аграрнае пытанне, адмяніць непасільныя падаткі. Распаўсюджванню канстытуцыйных ілюзій у вёсцы ў значнай ступені садзейнічалі кадэты. Яны запэўнівалі сялян на прадвыбарных сходах, што Дума будзе дзейсным органам улады, здольным уціхамірыць”произвол”, даць сялянам зямлю. Кадэты былі адзінай легальнай партыяй, якая выступала на выбарах з апазіцыйнымі заявамі ў адносінах да ўрада і так як левыя партыі ў гэты час знаходзіліся ў падполлі, то ўсе незадаволеныя царызмам галасавалі за кадэтаў, супраць правых. У выніку, з 36 дэпутатаў ад 5 заходніх губерняў 29 прайшлі ў Думу па кадэцкім сцыгам пры падтрымцы Канстытуцыйна-каталіцай партыі, сіяністаў і “Саюза дасягнення раўнапраўя яўрэяў у Расіі”. 5 (усе сяляне) адносілі сябе да беспартыйных, 1 – да сацыял-дэмакратаў і 1 – да правых (сялянін). З агульнага ліку дэпутатаў памешчыкаў было 10 (28 %), ксянзоў – 2 (5,4 %), інтэлігентаў – 11 (30,5 %), сялян – 13 (36,1 %). Кадэты атрымалі перавагу не толькі ў заходніх губернях, але і па ўсёй краіне. З 478 дэпутатаў у I Думе кадэтаў было 179, аўтанамістаў – 63, акцябрыстаў – 16, беспартыйных – 105, трудавікоў – 97, сацыял-дэмакратаў – 18.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дзяржаўная Дума пачала сваю работу 27 красавіка 1906 г. адкрыццё Думы адбылося ў Таўрыцкім палацы. Цэнтральным пытаннем у Думе было аграрнае. Кадэты вынеслі свой аграрны законапраект за подпісам 42 дэпутатаў. Ён прыдугледжваў павелічэнне сялянскага землекарыстання за лік казённых і царкоўных зямель, частковага адчужэння памешчыцкіх зямель з узнагароджаннем уладальнікаў “па справядлівай ацэнцы”. Мелася на ўвазе адчужэнне тых зямель, якія здаваліся ў арэнду да 1 студзеня 1906 г., ці не апрацоўваліся зусім, хоць і былі прыгодныя для гэтага. Гэтыя землі павінны былі скласці дзяржаўны зямельны фонд і перадавацца сялянам у доўгатэрміновую арэнду па спажывецкай норме, якая забяспечвала пражытачны мінімум сялянскай сям’і. Землі, не адчужаныя ў памешчыкаў, а таксама надзельныя сялянскія, заставаліся ў асабістай уласнасці. Гэта патрабаванне па сутнасці не супярэчыла інтарэсам памешчыкаў. Яны атрымалі магчымасць выгадна для сябе прадаць сялянам тыя землі, якія імі здаваліся ў арэнду, ці зусім не апрацоўваліся. Большасць сялянскіх дэпутатаў у Думе не пайшлі за кадэтамі і стварылі самастойную фракцыю – трудавую групу. Ад заходніх губерній у яе ўваходзілі 6 чалавек: К.А. Александровіч, М.С. Гатавецкі, М.М. Жукоўскі, С.П. Кандрашук, Ф.Е. Буслаў, Г.В. Філіпаў. Да іх далучыўся селянін А.І. Сакалоўскі. Такім чынам, 7 сялян з 13-ці выбраных ў Думу ад заходніх губерній, перайшлі на бок трудавікоў.

Трудавікі ўнеслі на разгляд Думы свой зямельны праект 104-х. Ён прадугледжваў прымусовае адчужэнне памешчыцкіх зямель і стварэнне агульнанароднага зямельнага фонду, у які б былі ўключаны ўсе казённыя, кабінецкія, царкоўныя, а таксама прымусова адчужаныя прыватнаўласніцкія землі, перавышаючыя працоўную норму. Падрыхтоўку і правядзенне рэформы трудавікі прадугледжвалі перадаць у рукі мясцовых зямельных камітэіаў, выбраных на аснове ўсеагульнага выбарчага права пры тайным галасаванні, у рукі саміх сялян. Ад Беларусі зямельны праект 104-х падпісалі Ф.Е. Буслаў, А.І. Сакалоўскі, М.С. Гатавецкі і К.А. Александровіч.

Эсэры не пагадзіліся з трудавікамі наконт прыватнай ўласнасці і ў праекце “33-х” абвясцілі ў якасці першачарговай задачы адмену прыватнай уласнасці на зямлю, аб’яўленне яе агульнанароднай уласнасцю і перадачу ў распараджэнне мясцовых і цэнтральных органаў самакіравання.

Прыкметную актыўнасць пры абмеркаванні аграрнага пытання праявілі дэпутаты-памешчыкі Беларусі. Яны абаранялі прынцып недатыкальнасці асабістай ўласнасці і рашэнне аграрнага пытання аўтаномна, ізалявана ад другіх раёнаў імперыі. Найбольш поўна пазіцыю памешчыкаў Беларусі выклаў у сваёй прамове Р.А. Скірмунт. Ён выказаўся супраць адчужэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

памешчыцкіх зямель, спасылаючыся на тое, што гэта выклікае вялікія выдаткі і неспрыяльна адаб'ецца на становішчы дзяржавы. На яго думку, парушэнне ці адмена прынцыпа прыватнай уласнасці на зямлю прынясе незлічоныя беды насельніцтву і дзяржаве, бо прывядзе да засілля бюракратыі, вялікае незадавальненне сялянства, пазбавіць іх заробку, прывядзе да падрыву прамысловасці, культуры і банкрутства дзяржавы. Р.А. Скірмунта падтрымаў Б.А. Ялавецкі. Ён паставіў вырашэнне аграрнага пытання ў залежнасць ад рашэння пытання аб аўтаноміі. З аналагічнай заявай выступіў барон Э.Роп. Ён лічыў, што рашэнне аграрнага пытання не можа быць без аўтаномнага кіравання.

5 чэрвіня Дума скончыла абмеркаванне аграрнага пытання. Складанне законапраекта аграрнай рэформы было даручана выбранай камісіі, якая да роспуску Думы, так і не паспела яго выпрацаваць. Ва ўмовах абастрэння пазадумскай барацьбы класаў, царскі ўрад палічыў неабходным распусціць Думу, лічачы, што думскія дэбаты, асабліва па аграрнаму пытанню, аказваюць рэвалюцыйнае ўздзеянне, у першую чаргу, на сялян. Указам ад 8 ліпеня 1906 г. урад выступіў з заявай, у якой выказаўся за недатыкальнасць памешчыцкай уласнасці на зямлю. І Дзяржаўная дума была распушчана, а тэрмін склікання ІІ Думы прызначаны на 20 лютага 1907 г.

Аднак гэта не затрымала часткі дэпутатаў, 9 ліпеня, яны (прыблізна 230 членаў) выехалі ў Выбарг і там працягвалі паседжанне Думы, на якім і распрацавалі зварот да рускага народа. У звароце думцы заклікалі не плаціць падаткаў і не пасылаць рэкрутаў. Пад зваротам падпісаліся 180 дэпутатаў.

Але гісторыя Дзяржаўнай думы першага склікання, якая працавала 72 дні, яшчэ не скончылася. У далейшым членам Думы, падпісаўшым "Выбаргскую адозву", было прад'яўлена абвінавачванне ў настройванні да непадпарадкавання і супрацьдзеяння дзяржаўным законам. Справа 167 членаў Думы разглядалася ў Асобай установе Пецярбургскай судовай палаты ў 1907 г. Суд прызначыў няжорсткі прыгавор – турэмнае заключэнне тэрмінам на 3 месяцы, якое многія ўжо адбылі, чакаючы судовага пасяджэння.

2. ІІ Дзяржаўная дума (20 лютага – 2 чэрвеня; адна сесія).

Указам ад 8 ліпеня 1906 г. адначасова з роспускам першай Дзяржаўнай думы быў вызначаны тэрмін склікання другой Думы – 20 лютага 1907 г. Новыя выбары, як і ў першую Думу, павінны былі праводзіцца на аснове закона ад 11 снежня 1905 г., пазбаўляўшага выбарчых правоў больш паловы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

насельніцтва краіны. Выбары былі цэнзавымі, шматступенчатымі. У памешчыцкай курыі адзін землеўладальнік быў прадстаўлены 2 тыс. чалавек, у гарадской – 4 тыс. чалавек, у сялянскай – 30 тыс., рабочай – 90 тыс. даволі шырокае прадстаўніцтва сялян было звязана з тым, што царскі ўрад разлічваў на манархізм гэтай часткі насельніцтва. Аднак вопыт першай Думы, і менавіта патрабаванні сялянскіх дэпутатаў па аграрным пытанні, адверглі гэтыя разлікі, і ва ўмовах рэвалюцыі змяняць выбарчы закон царскі ўрад не адважыўся.

На Беларусі значна актывізавалася дзейнасць акцябрыстаў у параўнанні з выбарчай кампаніяй у першую Думу. Больш цесным стала іх супрацоўніцтва з чарнасоценцамі. Рускія акцябрысцка-чарнасоценныя перадвыбарныя камітэты заклікалі да яднання і сумесных дзеянняў усё рускае насельніцтва краю. Змагаючыся з рэвалюцыяй, яны разам з тым імкнуліся ліквідаваць эканамічнае панаванне і палітычны ўплыў у краі польскіх землеўладальнікаў і яўрэйскай буржуазіі.

Польскія памешчыкі сумесна з ксяндзамі мелі не мэце аб’яднаць пад сваім уплывам усё каталіцкае насельніцтва заходніх губерняў, заклікаючы да адзінства на нацыянальнай і рэлігійнай аснове. Зноў актыўную дзейнасць у гэтым накірунку праводзіў, як і пры выбарах у першую Думу, лідэр польска-літоўскіх клерыкалаў віленскі епіскап барон Э.Ю. Роп.

Вялікім поспехам сярод гарадской яўрэйскай буржуазіі і буржуазнай інтэлігенцыі карыстадіся кадэты і пра кадэцкі “Саюз дасягнення праўнапраўя яўрэяў у Расіі”. Як і ў першую выбарчую кампанію, у гарадах яўрэі і “дасягненцы” атрымалі поўную перамогу. Актыўную дзейнасць сярод працоўных разгарнулі таксама сацыял-дэмакраты і партыі народніцкага тыпу: эсеры, энэсы, БСГ і інш. Яны мелі поспех сярод сялян. Нягледзячы на націск з боку адміністрацыі і паліцыі, ад сялян у выбаршчыкі часта праходзілі трудавікі, сацыял-дэмакраты, эсэры, члены БСГ. Аднак у выніку актыўнай дапамогі паліцыі і царквы перавагу ў выбарчай кампаніі мелі крайне правыя і акцябрысты.

Па выніках выбараў Дума стала больш радыкальнай у параўнанні з першай: з 518 членаў другой Думы фракцыю правых складалі ўсяго 54 чалавекі. Кадэты страцілі амаль палову месцаў (са 179 мелі 98), затое значна ўзмацніліся левыя фракцыі: трудавікі мелі 104 месцы. Ва ўмовах спаду рэвалюцыі бальшавікі прынялі ўдзел у выбарах і працы Дзяржаўнай думы другога склікання. Сацыял-дэмакратычную фракцыю складалі 66 членаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дэпутатамі ў II Дзяржаўную думу ад Мінскай губерні былі абраны два памешчыкі Г. Лашкароў і І. Івашчанка (абодва акцябрысты), 6 сялян, прымыкаўшых да правых і акцябрыстаў (Гаўрыльчыц, Грудзінскі, Раменчык, Красоўскі, Мельнік, Шаманскі) і святар Якубовіч. Віцебскі "рускі выбарчы камітэт" увайшоў у пагадненне з "польскім камітэтам" і правёў двух правых сялян – Петрачэнку і Быкава, - і правага памешчыка беларуса Бурмейстара. "Польскі камітэт" абраў дэпутатамі пальскіх памешчыкаў Беніслаўскага і Дымшу, а таксама інжэнера латыша Казарыча (прагрэсіст). Такім чынам перамога дасталася блоку памешчыкаў. У Гродзенскай губерні выбаршчыкі былі сабраны ў доме епіскапа гродзенскага і брэсцкага Міхаіла. Ён заклікаў сялянскіх прадстаўнікоў падтрымліваць на выбарах памешчыкаў і не ўступаць у блокі з выбаршчыкамі ад гарадской курыі. Дэпутатамі былі абраны правыя і беспартыйныя сяляне (Дзямідзюк, Ляпёшка, Макарэвіч, Сядляр), паштовы служачы з сялян Сацэвіч і адвакат Ячыноўскі. У Магілёўскай губерні дэпутатамі былі абраны правыя памешчыкі граф Л. Лубенскі, Сазановіч, Шыдлоўскі, святар Гашэвіч, беспартыйныя сяляне Емельянаў, Шчарбенок і правы Казакоў. На віленскім губернскім выбарчым сходзе перамогу атрымала польская буржуазна-нацыянальная партыя "народных дэмакратаў". Дэпутатамі ў Думу прайшлі: граф Путкамер, Ваньковіч, Хялкоўскі, Хамінскі і ксёндз Радзелевіч. Ад жыхароў вільні быў абраны юрыст Вянслаўскі (акцябрыст). Сяляне мелі 44 % галасоў на сходзе, але змаглі правесці ў Думу толькі аднаго сваўго прадстаўніка – Пілейку.

Усяго ў II Думе ад 5 заходніх губерній былі абраны 13 памешчыкаў, 3 прадстаўніка духавенства, 4 інтэлігенты і 16 сялян. Памешчыкі і буржуазія атрымалі 56 % дэпутацкіх месц, сяляне – 44 %. У параўнанні з I Думай павялічылася колькасць сялянскіх і памешчыцкіх дэпутатаў за кошт скарачэння дэпутатаў ад буржуазных пластоў. Партыйны склад дэпутатаў значна паправеў. Усе яны, у тым ліку і сялянскія, належылі да правых партый, ці падтрымлівалі іх.

У II Думе сацыял-дэмакратаў было – 66, эсэраў – 37, народных сацыялістаў – 16, трудавікоў – 104, кадэтаў – 98, правых і акцябрыстаў – 54, аўтанамістаў – 76, беспартыйных – 50, казацкая група – 17, прадстаўнікоў партыі дэмакратычных рэформ – 1.

II Дума пачала работу 20 лютага 1907 г. Як і I-й, галоўным пытаннем у II-й Думе было аграрнае пытанне. Гэтае пытанне адразу стала галоўнай тэмай спрэчак дэпутатаў. Беларускія дэпутаты ў абмеркаванні зямельнай рэформы прынялі самы актыўны ўдзел. Неабходна адзначыць, што дэпутаты ад 5 губерняў Паўночна-Заходняга края: Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Магілёўскай і Мінскай – яшчэ раней, да абмеркавання аграрнага пытання, актыўна ўключыліся ў работу Думы. Яны ўвайшлі ў склад 13 з 23 думскіх камісій.

У аграрнай камісіі працавала 6 дэпутатаў ад беларускіх губерній. У спрэчках па пытанні выступалі ў асноўным дэпутаты ад сялян. Дэпутаты-памешчыкі каталіцкага веравызнання,аб'яднаныя ў так званае "кола польскіх дэпутатаў Літвы і Русі", не змянілі сваіх пазіцый з часоў работы першай Думы. Яны наважыліся прытрымлівацца і адстойваць права прыватнай уласнасці на зямлю, але ў выпадку дзяржаўнай неабходнасці пагаджаліся на адчужэнне за выкуп нават часткі прыватных зямель, аднак з вырашэннем гэтага пытання ў краі.

Добра разумеючы, што такія меркаванні не пройдуць у Думе, яны ў асноўным і не выступалі, у адрозненні ад дэпутатаў-сялян. Фактарам раздражэння для сялян з беларускіх губерняў стала выступленне дэпутата Варшавскай губерні Р.В. Дмоўскага, які зазначыў, што, праводзячы рэформу, трэба ўлічваць асаблівасці кожнага рэгіёна Расіі, каб вырашэнне аграрнага пытання было ўдзелам мясцовых органаў самакіравання.

Сяляне фактычна абаранялі нацыяналізацыю зямлі. У сваіх палымяных прамовах яны заяўлялі аб адданасці "цару-бацюшку", але калі паўстала пытанне аб зямлі, патрабавалі адчужэння яе ў памешчыкаў і перадачы ў рукі сялян.

Урад і памешчыкі абаранялі ўказ 9 лістапада 1906 г. (уведзены ў перыяд паміж I і II Думаі па 87 артыкуле "Асноўных законаў"). Дэпутаты Сазановіч, Лашкароў абвясцілі ўсе левыя партыі і левых дэпутатаў ворагамі "рускай дзяржаўнасці". Яны адзначылі, што падтрымліваюць планы ўрада і што рашэнне зямельнага пытання трэба шукаць "ні ў дабаўцы колькасці зямлі, а ў паляпшэнні яе якасці і ў лепшай апрацоўцы". Кадэты павярнулі ў права, імкнучыся далучыць да свайго боку сялян, у I Думе яны заяўлялі аб магчымасці павялічэння сялянскага землекарыстання за кошт частковага адчужэння памешчыцкіх зямель "па справядлівай ацэнцы" і стварэння з гэтых зямель "грамадскага запаснага фанда". Кадэты значна пашырылі пералік катэгорый зямель, якія не падлягалі прымусоваму адчужэнню. Трудавікі па гэтаму пытанню займалі тую ж пазіцыю, што і ў I Думе.

Дэпутаты-эсэры прапанавалі праграму , у аснову якой быў пакладзены праект, што ўносіўся ў I Думу. У праграме прадугледжвалася "адмена ўсякай прыватнай уласнасці на зямлю, незалежна ад таго, каму зямля належыць –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прыватным асобам, абшчыне ці дзяржаве. Зямля павінна быць даступнай для свабоднага карыстання ўсіх грамадзян”.

10 мая з выкладаннем урадавай канцэпцыі вырашэнне аграрнага пытання выступіў старшыня Савета міністраў П.А. Сталыпін. Ён адхіліў праекты левых партый, а таксама кадэцкую прапанову аб прымусовым адчужэнні часткі памешчыцкіх зямель. Указ ад 9 лістапада 1906 г. трактаваўся Сталыпіным як выбар шляху на карысць селяніна-гаспадара.

Для значнасці вялікага значэння выбранага курса і цвёрдай рашучасці давесці яго да канца П.А. Сталыпін заключыў: “Тым, хто супраць дзяржаўнасці, хацелась бы выбраць шлях радыкалізма, шлях вызвалення ад гістарычнага мінулага Расіі, вызвалення ад культурных традыцый. Ім патрэбны вялікія ўзрушэнні, нам патрэбна вялікая Расія!”.

II Дума была асуджана. Патрэбна была падстава для яе разгону. З дапамогай двух агентаў ахранкі Броцкага і Шорнікавай было сфабрыкавана абвінавачванне сацыял-дэмакратычнай фракцыі ў падрыхтоўцы да ваеннай змовы. У ноч на 3 чэрвеня сацыя-дэмакратычная фракцыя была арыштавана, а затым аддана пад суд. 3 чэрвеня 1907 г. II Дзяржаўная дума была распушчана і апублікаваны новы выбарчы закон. Другая Дзяржаўная дума праіснавала 103 дні.

Лекцыя 5: ***Сталыпінская аграрная рэформа.***

1. Неабходнасць правядзення рэформы.
2. Ход рэформы.
3. Перасяленчая палітыка.
4. Прамысловае развіццё Беларусі ў 1908 – 1913 гг.
5. Вынікі і значэнне рэформы.

1. Неабходнасць правядзення рэформы.

Рэвалюцыя 1905-1907 гг. пахіснула самадзяржаўе ў Расіі, разладзіла эканамічныя і палітычныя асновы царызму, нанесла ўдар паўпрыгонніцкай сістэме гаспадаркі. У час рэвалюцыі былі зроблены некаторыя ўступкі, напрыклад, былі адменены выкупныя плацяжы за зямлю. Аднак першая руская рэвалюцыя не вырашыла аграрнага пытання. Тым самым захаваўся грунт для новай рэвалюцыі. Правячым класам неабходна было пашырыць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сваю сацыяльную базу, знайсці новую апору, паколькі старая апора – памешчыкі і ваенная сіла – з'яўлялася недастатковай. Такой апорай для царызму, на думку правячых колаў, павінна была стаць буйная буржуазія ў гарадах і сельская буржуазія, кулацтва – у вёсцы.

Паскарэнню развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы і сацыяльнаму расслаенню вёскі садзейнічала Сталыпінская рэформа.

Аграрная рэформа мела дваякую мэту – (палітычную) ўзмацненне сацыяльнай апоры самадзяржаўнага ладу шляхам рассколу сялянства і насаджэння кулацтва і (эканамічную) стварэння ўмоў дзеля фарміравання аграрнага капіталізму. Новая аграрная палітыка ставіла перад сабой тры галоўныя задачы:

па-першае, разбурэнне сялянскай абшчыны;

па-другое, насалжэнне хутароў і адрубоў;

па-трэцяе, перасяленне найбольш незадаволенных сялян на свабодныя землі ўсходу краіны.

2. **Ход рэформы.**

Сталыпінская аграрная рэформа была арганічна звязана з рэформай 1861 г. і з'яўлялася яе працягам. Пачатак аграрнай рэформы быў пакладзены ўказам ад 9 лістапада 1906 г., згодна з якім кожны гаспадар дома, які валодаў надзельнай зямлёй паводле абшчыннага права, мог патрабаваць у любы час замацавання яе ў асабістую ўласнасць. У тых абшчынах, дзе на працягу апошніх 24 гадоў перадзелы не праводзіліся, кожны гаспадар дома, які пажадаў перайсці ад абшчыннага да асабістага землеўладання, атрымлівалі ўсю зямлю, за выключэннем арандаванай. У тых жа абшчынах, дзе праводзіліся перадзелы, кожны, хто выходзіў з абшчыны, павінен быў заплаціць грамадзе за лішак, які перавышаў падушную норму па ацэнцы 1861 г.

Сяляне, якія замацавалі зямлю ў асабістую ўласнасць, мелі права карыстацца абшчыннымі ўчасткамі – ляснымі ўгоддзямі, выгынамі, пашай і т. п. Па іх патрабаванню грамада абавязана была на працягу месяца з дня падачы заявы вынесці пастанову большасцю галасоў і ўказаць ім зямельныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

участкі. Калі ж грамада не ппрымала такой пастановы, тады выдзел праводзіўся ўладай земскага начальніка.

Гаспадар дома, за якім замацоўвалася надзельная зямля, меў права патрабаваць, каб грамада адвяла яму замест палосак адпаведны ўчастак у адным месцы – **хутар** або **адруб.** *Хутар* – гэта *Адруб*

На Беларусі рэформа мела шэраг асаблівасцей. У заходніх раёнах Беларусі (Гродзенскай, Мінскай, Віленскай (0,5%) губернях) сялянская абшчына была ліквідавана ўжо даўно. Тут сяляне валодалі зямлёй падворна, прытым участкі зямлі наразаліся па так званай “шнуравой” сістэме, калі кожны домаўладальнік меў столькі палос зямлі, колькі мелася ў сялянскім надзеле розных па якасці ворыва і сенажацей. З прычыны гэтага падворны ўчастак складаўся са шматлікіх вузкіх палос, раскіданых уперамежку з палосамі іншых гаспадароў. Падворна-наследнае сялянскае землеўладанне, якое тут было пераважным, у значнай ступені палегчыла рэформу, спрыяла замацаванню зямлі ў асабістую ўласнасць.

На Беларусі ўзмоцненнае разбурэнне абшчыны ажыццяўлялася ў Магілёўскай (79,2 %) і Віцебскай (44,6 %) губернях, дзе было распаўсюджана абшчыннае землеўладанне. Тут супярэчнасці паміж патрэбнасцямі капіталістычнага развіцця і ўстарэлай абшчыннай формай землеўладання былі такімі вялікімі, што патрэбен быў штуршок, каб пачалі разбурацца аджыўшыя зямельныя адносіны ў вёсцы. Сталыпінская рэформа і з’явілася гэтым штуршком. Прычым сяляне ў асноўным ахвотна выходзілі з абшчыны (імкнуліся вызваліцца ад поўнай залежнасці ад “міру”, а малазямельныя сяляне разлічвалі прадаць свае заняпалыя ўчасткі). У сувязі з гэтым Беларусь па колькасці двароў, якія выйшлі з абшчыны і замацавалі зямлю ў асабістую уласнасць, займала першае месца сярод многіх раёнаў Расіі.

Разбурэнне абшчыны адбывалася найбольш энтэнсіўна ў 1908 – 1909 гг., прычым найбольш актыўна гэты працэс ішоў у Магілёўскай губерні, якая займала другое месца ў Расіі па колькасці дамаўладальнікаў, замацаваўшых зямлю ў асабістую ўласнасць, і ўступала толькі Саратаўскай губерні. К 1915 г. у Магілёўскай губерні было замацавана ў асабістую маёмасць 702409 дзесяцін зямлі (54,8 % абшчыннага землеўладання), у Віцебскай губерні – 154824 дзесяцін (21,8 %). Выдзяленне сялянскіх гаспадарак на хутары на Беларусі праводзіліся задоўга да рэформы. Гэты працэс разгортваўся пад уплывам перасяленцаў з Прыбалтыкі. У канцы XIX – пачатку XX ст хутарскія гаспадаркі ствараліся на купчай зямлі заможнімі сялянамі. Асноўнымі прычынамі росту хутарызацыі было развіццё капіталізму, разлажэнне старых абшчынна-патрыярхальных зносін на вёсцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Хутары ўяўлялі сабой найбольш прыстасаваную да капіталістычнай вытворчасці форму гаспадаркі. У 1907 – 1916 гг. у пяці заходніх губернях было створана 128187 хутарскіх і адрубных гаспадарак. Гэта склала каля 12 % усіх сялянскіх двароў. Агульная колькасць адрубоў і хутароў склала ў Віцебскай губерні 25,1 %, Магілёўскай – 13,1 %, Віленскай – 8,1 %, Гродзенскай – 7,1 %, Мінскай – 5,8 %. Найменшы паспех хутарызацыя мела ў Мінскай і Гродзенскай губернях. На гэта ўплывала малазямельнасць сялян, вялікая канцэнтрацыя зямельнага багацця ў руках вялізарных латыфундый. У гэтыж час падворна-спадчынае землеўладанне і адсутнасць абўчыны на захадзе і ў цэнтры Беларусі стварылі ўмовы для развіцця капіталізму, пазбаўлялі стымулаў, якія б заахвочвалі сялян на перасяленне на хутары і адрубы.

Замацаванне зямлі ў асабістую ўласнасць фактычна азначала “вызваленне” ад зямлі значнай часткі сялян, у першую чаргу збяднелых яе пластоў. Малазямельныя сяляне прадавалі замацаваную зямлю, а заможныя – куплялі яе. Наогул, за перыяд 1907 - 1914 гг. па пяці заходніх губернях прадалі зямлю 40820 домаўладальнікаў, альбо 35,8 % усіх хутарскіх і адрубных двароў, што склала 187816 дзесяцін зямлі.

Выжным сродкам ажыццяўлення новай аграрнай палітыкі стаў Сялянскі пазямельны банк, на які была ўскладзена задача продажу сялянам дваранскіх зямель, нарэзаных хутарамі, на выгадных для іх уладальнікаў умовах. На працягу 1906 – 1907 гг. сялянскі банк выплаціў памешчыкам Беларусі за купленую ў іх зямлю каля 28,8 млн. руб. У выніку дзейнасці Сялянскага пазямельнага банка, з аднаго боку, узрастала зямельная ўласнасць, умацоўвалася хутарская гаспадарка заможных вярхоў сялянства, з другога боку – узмацнялася згаленне большасці сялян, кабала і ляхвярства ў вёсцы.

Насаджэнне хутарызацыі ішло не толькі прымусова, але і шляхам ідэалагічнага ўздзеяння на насельніцтва. Урад шырока рэкламаваў новае землеўпарадкаванне. Рэакцыйны друк актыўна расхвальваў аграрную рэформу і прарочыў хутаранам добрае жыццё. Царскія ўлады стваралі “паказальныя” гаспадаркі і арганізоўвалі туды экскурсіі сялян. Толькі ў Мінскай губерні на базе кулацкіх гаспадарак было створана 65 паказальных хутароў і 1604 паказальныя ўчасткі.

3. Перасяленчая палітыка.

Састаўной часткай новых аграрных мерапрыемстваў з’явілася перасяленчая палітыка. Пры дапамозе яе ўрад спадзяваўся, з аднаго боку, адправіць на ўскраіны краіны значную частку сялянскай беднаты і тым

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

самым вызваліцца ад рэвалюцыйна настроенай сялянскай масы, а з другога, абараніць панскае землеўладанне і ўмацаваць пазіцыі сялянскай буржуазіі. 10 сакавіка 1906 г. Мікалай II паставіў подпісаў палажэнне Савета Міністраў аб парадку прымянення закона ад 6 чэрвеня 1904 г. аб міграцыях сялянства на казённыя землі за Уралам. Згодна з гэтымі правіламі, знімаліся ўсе абмежаванні на перасялленні. З сялян, што пажадалі пасяліцца ва ўсходніх рэгіёнах краіны, спісваліся нядоімкі. Яны на 5 гадоў вызваляліся ад выплаты казённых і земскіх падаткаў. Перасяленцам давалася пазыка на праезд і абзавядзенне гаспадаркай. Для арганізацыі перасялення і працягу работ па адшуканні зямельных участкаў было створана Перасяленчае ўпраўленне.

Урад разгарнуў рэкламную кампанію вакол перасялення. З гэтай мэтай выдаваліся і распаўсюджваліся сярод сяльскага насельніцтва брашуры, лістоўкі. У якіх прапагандаваліся і ўсхваляліся міграцыі. Ураду ўдалося арганізаваць значны перасянчы рух у многіх губернях Расіі.

Аднак ставячы мэту перасяліць як мага больш малазямельных сялян з цэнтральных і заходніх рэгіёнаў на ўсходнія ўскраіны імперыі, урад не прыняў належных мер для правядзення планамернага і арганізаванага перрасялення. Гэта адбілася не толькі на яго арганізацыі, але і на адпушчаных крэдытах, а таксама выявіляся ў не дастатковай падрыхтоўцы зямельных участкаў для жадаючых выехаць на ўсход. Напрыклад, не адпавядалі патрэбам перасяленцаў і выдзеленыя для іх крэдыты. На пераезд і абзавядзенне гаспадаркай нават у бліжэйшых губернях Сібіры перасяленцу трэба было мець 450 руб. Між тым у 1911 – 1912 гг. з сялян, што перасяліліся ў Сібір, 61,5 % мелі мень за 100 руб. і толькі 22 % – больш за 200 руб. Пазыкі на абзавядзенне гаспадаркай практычна не дапамагалі, паколькі не перавышалі 100 руб. і выдаваліся часткамі. Як правіла, перасяленцы выкарыстоўвалі палову пазыкі на пракармленне, а не на гаспадарку і таму пазбаўляліся права на атрыманне другой паловы.

Урад не змог па-сапраўднаму арганізаваць перасяленні. Яны праходзілі ў антысанітарных умовах, сяляне ехалі ў непрыстасаваных для перавозкі людзей таварных вагонах, сярод іх лютавалі эпідэмічныя хваробы. І на новых месцах яны траплялі ў вельмі цяжкае становішча. Землеўпарадкавальныя камісіі спазняліся з падрыхтоўкай участкаў або накіроўвалі перасяленцаў на непрыдатныя для вядзення гаспадаркі мясцовасці. Паводле даных за 1908 г., на кожную тысячу перасяленцаў у Расіі прыпадала 118 загінуўшых ад цяжкіх умоў у час пераезду і на новых месцах.

Аб размаху перасяленчага руху з 5 заходніх губерній у Сібір і на Далёкі Усход у 1907 – 1914 гг. сведчаць наступныя даныя. За адзначаня 8 гадоў з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беларускіх губерняў перасялілася 335,4 тыс. чалавек, або 11,5 %. На долю Магілёўскай і Віцебскай губерняў прыпадала звыш 2/3 перасяленцаў. Гэта тлумачылася больш шырокім распаўсюджаннем рэшткаў прыгонніцтва на вёсцы, горшай забяспечанасцю сялян надзельнай зямлёй, перавагай змешанай адпрацовачна-капіталістычнай сістэмы панскай гаспадаркі. Акрамя таго, на ўсходзе Беларусі ў выніку сталыпінскай аграрнай рэформы параўнальна хутка ішоў працэс разбурэння сялянскага абшчыннга землеўладання, што давала магчымасць пазбавіцца ад надзела малазямельным сялянам.

Перасяленчая хваля асабліва высока паднялася ў 1907 – 1909 гг., на якія прыпадала 73,9 % перасяленцаў з 5 заходніх губерняў ва ўсходнія рэгіёны Расіі. Пэўны уплыў на ўзмацненне перасяленчага руху ў зазначаныя гады аказалі неўраджаі і дэпрэсія ў многіх галінах прамысловасці Беларусі.

Асноўную масу перасяленцаў складала па-ранейшаму сялянская беднота. З 2170 сем'яў, што выселіліся з Беларусі ў 1913 г., беззямельныя складалі 21,2 %, малазямельныя – 55,5 %. На сем'і, што мелі больш 10 дзесяцін прыпадала толькі 17,9 % тых, што перасяліліся за Урал.

Перасяленчы ўздым змяніўся хваляй зваротнага руху перасяленцаў. Вяртанне перасяленцаў з'явілася паказчыкам няўдачы перасяленчай палітыкі самадзяржаўя. На працягу васьмі гадоў (1907 -1914 гг.) у 5 заходніх губерняў вярнуліся 37366 чалавек, або 10,5 % перасяленцаў. Пік звароту прыпадае на канец 1909 – 1911 гг. За гэты час на радзіму вярнуліся звыш паловы зваротных перасяленцаў.

Перасяленцы, што вярталіся, у асноўнай масе складалі сялянскую беднату. Яны былі вымушаны ісці ў парабкі, жабраваць. Вяртанне перасяленцаў абвастрала сацыяльныя супярэчнасці на беларускай вёсцы.

Такім чынам, перасяленчая палітыка царызму не прывяла да колькі-небудзь значнага паслаблення зямельнага голаду. Самадзяржаўе не змагло, як спадзявалася, "разрэдзіць" атмасферу ў цэнтры краіны. Яно толькі дабілася новага абвастрэння і пагаршэння становішча сялян.

4. *Прамысловае развіццё Беларусі 1908 – 1913 гг.*

З 1908 г. назіраецца павелічэнне колькасці прамысловых прадпрыемстваў і рост прадукцыі, і аж да пачатку першай сусветнай вайны адбываецца інтэнсіўны рост прамысловасці. За тры перадваеныя гады было пабудавана каля 200 прамысловых прадпрыемстваў (столькі ж, колькі за

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1900-1908 гг.). прырост колькасці рабочых у 1913 -1915 гг. быў у двая большым, як у 1900 – 1908 гг., а прамысловай прадукцыі –ў 1,9 раза. Тэмпы росту валавой прадукцыі былі нават больш высокімі, як па ўсёй краіне ў цэлым. Аднак дробная вытворчасць захавалась тут у большых памерах (53,5 % валавой прадукцыі ў праўнанні з 31,4 % па краіне).

У цэлым жа ў 1900 - 1913 гг. прамысловае развіццё ў Бедарусі зрабіла значны крок наперад.

Так колькасць цэнзавых прадпрыемстваў (*пэўных памераў (цэнзу) і аб'ёму вытворчасці прадпрыемствы (фабрыкі і заводы) пры наяўнасці механічных рухавікоў)* у 1900 г. складала 799, а ў 1913 – 1282. колькасць дробных прадпрыемстваў ў 1900 г. складала 100, а ў 1913 – 129.

Да 1914 г. у асноўным захавалася галіновая структура прамысловасці, якая склалася на пачатку XX ст. Дамінуючае становішча ў прамысловасці занялі галіны, якія базіраваліся на мясцовай сыравіне: дрэваапрацоўчая, харчовая, вытворчасць будаўнічых матэрыялаў. У 1911 – 1913 гг. на Беларусі ўзнікла 77 новых дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў. Аб'ём дрэваапрацоўкі ўзрос з параўнанні з 1900 г. у 3,8 раза, выраб фанеры павялічыўся ў 5 разоў. Беларусі належыла значная роля ў вытворчасці абліцовачных матэрыялаў, склаўшых ў 1912 г. 32,2 % выраблеых у Расіі пячных аднакаляровых кафляў і каля паловы карнізаў для ўпрыгожвання будынкаў і пакояў. Гэтыя вырабы вывозіліся на рынкі Расіі.

Хаця ў агульнарасійскай металаапрацоўчай прамысловасці беларускія прадпрыемствы давалі толькі 0,9 % прадукцыі, металаапрацоўчая галіна беларусі набыла пэўную спецыялізацыю. На долю Беларусі ў 1912 г. прыпадала 7 % выраблеых у Расіі лесапільных станкоў і 7,2 % вадзяных турбін.

У гэтыя гады ў Мінску ўзнікла фабрычная вытворчасць шпалераў. У 1912 г. выраблялася 14,5 % усёй вытворчасці шпалераў у Расіі.

К 1913 г. на Беларусі выраслі буйныя фабрычна-завадскія цэнтры – найбуйнейшы з іх быў Мінск, другім па значэнню – Віцебск, трэцім – Гродна, потым ішлі Пінск, Гомель, Магілёў, Бабруйск, Барысаў, Рэчыца.

5. *Вынікі і значэнне рэформы.*

Аграрная рэформа П.А. Сталыпіна аказала складанае і супярэчлівае ўздзеянне на сыцыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Расійскай імперыі, у тым ліку дарэвалюцыйнай Беларусі. Нягледзячы на цяжкасці правядзення рэформы і яе незавершанасць, з эканамічнага пункту гледжання

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яна мела станоўчае значэнне. Гэта праявілася перш за ўсё у паскарэнні тэмпаў развіцця сельскай гаспадаркі. У Беларусі з 1907 па 1913 гг. валавы збор сельскагаспадарчых культур павялічыўся на 22 %. У вёску пачалі пранікаць грашовыя адносіны, якія вымушалі сялян пашыраць вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі на рынак. Заможныя хутаранне заводзілі буйныя малочныя фермы. Адбывалася станаўленне сялянскага гандлёвага свінаводства, пчалаводства, садаводства, што сведчыла аб пашырэнні спецыялізацыі сялянскай гаспадаркі. Сталыпінская аграрная рэформа паскорыла развіццё капіталістычных адносін у вёсцы, у тым ліку паглыбіла працэс разлажэння сялянства на сялянскую буржуазію і сельскі пралетарыят. У выніку яе рэалізацыі ўдзельная вага сялянскай буржуазіі і пралетарызаванай вясковай беднаты ўзрасла. Рэформа Сталыпіна нароўні з Дзяржаўнай думай была другім крокам на шляху ператварэння расійскай феадальнай манархіі ў буржуазную.

Такім чынам, аграрная рэформа стварыла неабходныя перадумовы для капіталістычнай эвалюцыі сельскай гаспадаркі Беларусі. Рэформа адкрыла шлях да распаду сялянскай абшчыны, пераўтварэння сялян ва ўласнікаў зямлі, паляпшэння структуры сялянскай гаспадаркі і яе матэрыяльнага дабрабыту, пашырэння праслойкі заможных гаспадароў.

Але сталыпінскія перабудова ў сувязі з яе непрацягласцю і незавершанасцю не змагла карэнням чынам змяніць паўфеадальны характар вёскі і паставіць яе на заходнееўрапейскі ўзровень. Не была дасягнута асноўная мэта рэформы – расчысціць дарогу капіталізму ў вёсцы, зрабіць так, каб пабач са згалелым сялянствам засталіся памешчыкі, што абуржуазіліся, і сялянская буржуазія, якія поўнасцю самкнуліся б у сацыяльна-эканамічным і палітычным плане з царызмам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Беларусь у гады Першай сусветнай вайны.

1. Пачатак першай сусветнай вайны. Яе прычыны і характар.
2. Адносіны да вайны розных класаў і партый.
3. Беларусь у гады першай сусветнай вайны.
4. Беларускі нацыянальны рух.

1. Пачатак першай сусветнай вайны. Яе прычыны і характар.

Першая сусветная вайна пачалася 19 ліпеня (1 жніўня) 1914 г. галоўнай прычынай вайны з’явіліся супярэчнасці паміж буйнейшымі імперыялістычнымі краінамі. Галоўнай была супярэчнасць паміж старой каланіяльнай Англіяй і хутка набіраючай моц Германіяй. Супярэчнасці паміж Германіяй і Расіяй з-за ўплыў на Балканах, а таксама з-за таго, што Германія хацела адарваць ад Расіі і захапіць Польшчу, Фінляндыю, Беларусь і Ўкраіну. Сутыкаліся і інтарэсы і іншых краін:Францыі і Германіі, Італіі і Аўстрыі і г.д. У сувязі з гэтым утварыліся ў канцы XIX – пачатку XX ст.два саюзы імперыялістычных краін: Германія – Італія – Аўстра-Венгрыя і Англія – Францыя – Расія. Гэтыя саюзы пачалі ўзмоцненна рыхтавацца да вайны. Так, з 1908 г. па 1913 г. расходы на ваенныя мэты былі павялічаны: у Германіі ў 1,6 разы, у Англіі – 1,3, у Расіі – 3,7, у Францыі – у 4,2, у Аўстра-Венгрыі – у 13, у Італіі – 16 разоў. Панаванне ў гэтых краінах буйных манаполій і барацьба паміж імі прывялі да рэзкага ўзмацнення нераўнамернасці развіцця капіталістычных краін. У выніку на сусветнай арэне змяніліся суадносіны эканамічных і ваенных сіл. Краіны, абагнаўшыя сваіх канкурэнтаў, дабіваліся новых рынкаў збыту, новых сфераў выкарыстання капіталаў. Але ў сувязі з тым, што да пачатка XX ст. увесь свет быў падзелены паміж найбуйнейшымі буржуазнымі краінамі, новы перадзел свету мог скончацца толькі вайной. Такой вайной і з’явілася першая сусветная вайна 1914 – 1918 гг.

Акрамя эканамічных, сур’ёзнай палітычнай прычынай вайны было імкненне задушыць узросшы за апошняе дзесяцігоддзе рэвалюцыйны рух. Расійская рэвалюцыя 1905 -1907 гг. садзейнічала ўзмацненню барацьбы працоўных Еўропы і Амерыкі, абуджэнню нацыянальна-вызваленчага руху народаў Усходу.

Падставай да вайны з’явіліся супярэчнасці паміж Аўстра-Венгрыяй і Сербіяй, узнікшыя ў выніку забойства сербскімі нацыяналістамі нашчадка аўстра-венгерскага трона Франца-Фердынанда. Аўстра-Венгрыя аб’явіла вайну Сербіі. Расія пачала мабілізацыю войска. У сувязі з гэтым Германія аб’явіла вайну Расіі, а затым і Францыі, захапіла Бельгію і Люксембург. З другога боку, Англія, каб зберагчы свае каланіяльныя ўладанні, аб’явіла вайну Германіі.разам з Англіяй у вайну ўступілі яе дамініёны Аўстралія, Канада, Новая Зеландыя і калонія Індыя. На баку Антанты выступіла Японія, а ў падтрымку Германіі – Турцыя. Пачалася сусветная вайна, якая працягвалася 4 гады і 4 месяцы. У вайне ўдзельнічала 38 краін з насельніцтвам звыш 1,5 млрд. чалавек, г. зн. 75 % усяго насельніцтва зямнога шара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вайна, распачатая манапалістычнай буржуазіяй у карысць сваіх інтарэсаў, не вырашала задач нацыянальнага развіцця ніводнай дзяржавы, не адпавядала інтарэсам працоўных, была з усіх бакоў захопніцкай. Урады краін, удзельнікаў вайны, стараліся пераканаць свой народ у тым, што вайна вядзецца ў мэтах абароны радзімы

2. Адносіны да вайны розных класаў і партый.

Царскі ўрад рабіў усё для таго, каб пераканаць людзей у неабходнасці вайны супраць варвараў-немцаў у інтарэсах абароны братоў-славян. І трэба зазначыць, што гэтая ідэя знаходзіла разуменне ў значнай часткі насельніцтва краіны. Яркім прыкладам гэтага з'явілася адозва, надрукаваная ў газеце "Русское слово" 27 верасня 1914 г. у падтрымку вайны Расіі супраць Германіі. Яе падпісалі вядомыя мастакі А.Васняцоў, І.Каровін, спявак Ф.Шаляпін, пісьменнікі М.Горкі, А.Серафімовіч, рэдактары часопісаў П.Струве, М.Міхайлоўскі і іншыя.

Пануючыя класы і вярхі гандлёва-прамысловай буржуазіі Расіі падтрымалі ваяўнічую палітыку царызму, чакалі для сябе вялікіх выгод ад будучага падзелу турэцкай і аўстрыйскай маёмасці. Яны добра разумелі, што паспяховая вайна можа прадухіліць падзенне манархіі. Шырокія слаі гарадской "сярэдняй" буржуазіі, буржуазнай інтэлігенцыі, сялянства з дапамогай буржуазнага друку, духавенства таксама падтрымліва палітыку царызму. Адзіны клас, які не падтрымлівал вайны, быў рабочы клас. Пазіцыі класаў Расіі адбіваліся на дзейнасці палітычных партый. Ужо ў самым пачатку вайны партыі акцябрыстаў і кадэтаў заявілі аб сваёй поўнай падтрымцы знешняй палітыкі ўрада Расіі. Лідэр кадэтаў Мілюкоў выказаў думку аб далучэнні Галіцыі, Угорскай Русі, Букавіны да Расіі з той мэтай, каб дапамагчы нацыянальнаму уз'яднанню ўкраінскага народа. Вядома, гэтая думка часткова адпавядала нацыянальным інтарэсам Расіі. Але Мілюкоў прапанаваў далучыць да Расіі і землі, якія да славян ніякіх адносін не мелі: Басфор і Дарданелы, прыбярэжную тэрыторыю Турцыі з г.Стамбулам. справа тут не ў абароне славян, а зусім у іншым. Будаўніцтва германіяй Багдадскай чыгункі праз Балканы і Турцыю закранала эканамічныя інтарэсы Расіі, якая вывозіла праз пралівы Басфор і Дарданелы 37 % сваіх тавараў, у тым ліку 80 % экспарту хлеба. З будаўніцтвам чыгункі Германія ўстанавіла кантроль над пралівамі, стала галоўнай перашкодай пранікненню Расіі ў Турцыю. Пад германскі уплыў папала і Балгарыя, што таксама закранала інтарэся Расіі, якая лічыла сябе абаронцай усіх славянскіх народаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лекцыя : ***Культура Беларусі ў пачатку XX ст. (1901 – 1914 гг.)***

1. Асвета.
2. Навука.
3. Перыядычны друк.
4. Літаратура.
5. Мастацтва
6. Тэатр.
7. Архітэктура.

1. Асвета.

У сувязі з рэвалюцыяй і патрэбамі капіталістычнага развіцця ўзнікла неабходнасцьшырокай падрыхтоўкі пісьменых работнікаў і адукаваных спецыялістаў. Але сістэма народнай асветы, якая склалася ў Расійскай імперыі яшчэ ў сярэдзіне XIX ст., ужо неадпавядала патрабаванням часу т таму паўстала неабходнасць яе рэформы і дэмакратызацыі.

На рубяжы XIX – XX стст. Рэзка вырасла колькасць пачатковых школ. Пачатковую адукацыю давалі народныя і гарадскія вучылішчы, якія адносіліся да міністэрства народнай асветы, а таксама царкоўнапрыходскія школы і школы пісьменства, якія адносіліся да царкоўнага ведамства. Царкоўныя школы ў пачатку XX ст. сталі аб’ектам байкоту настаўнікаў і бацькоў. Сетка школцаркоўнага ведамства з 1906 г пачала скарачацца. Яна замянялася народнымі вучылішчамі двух тыпаў (з 3-х і 5-і, 6-і гадовым тэрмінам навучання). Гэтыя школы давалі больш грунтоўныя веды. У 1914 г. іх колькасць дасягнула 4784.

У 5 Заходніх губернях існавалі гарадскія вучылішча, якія выконвалі ролю павышанай пачатковай школы для сярэдніх слаёў насельніцтва – дробнай буржуазіі, рамеснікаў, служачых, гандляроў, дробнай шляхты. З-за іх доўгага 6-гадовага тэрміну навучання доспут да іх дзецям працоўных быў абмежаваны. Тым не менш, гэтыя тыпы навучальных устаноў карысталіся папулярнасцю і іх колькасць за 1905 – 1914 гг. узрасла з 39 да 82. Праўда, гарадскія вучылішча не давалі завершанай адукацыі. Толькі дзеці заможніх бацькоў пасля дадатковай аплаты за падрыхтоўку па шэрагу прадметаў магі паступіць у настаўніцкія інстытуту ці гімназіі.

Сярэднюю адукацыю давалі гімназіі, чый атэстат даваў магчамасць паступаць ва ўніверсітэты; рэальныя вучылішчы, выпускнікі якіх мелі права

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

пастутаць у тэхнічныя інстытуту; духоўныя і ваенныя сярэднія і вышэйшыя школы. У 1914 г. на Беларусі было 122 урадавыя і прыватныя сярэднія вучэбныя установы, у якіх наввучаліся 31 тыс. чалавек. Большасць вучняў былі дзецьмі шляхты, чыноўнікаў, духавенства, гарадской буржуазіі і заможніх сялян.

У сетцы сярэдніх спецыяльных вучэбных устаноў у пачатку XX ст. галоўнае месца па колькасці займалі настаўніцкія семінарыі, якія рыхталі настаўнікаў для пачатковых школ. У 1905 г. на Беларусі было 4 настаўніцкія семінарыі: у Маладзечне, Полацку, Нясвіжы, Свіслачы. У 1909 – 1916 гг. было адкрыта яшчэ 5: у Рагачове, Оршы, Барысаве, Гомелі і Бабруйску. Паляпшэнню падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў спрыяла адкрыццё ш 1910 – 1914 гг. настаўніцкіх інстытутаў у Віцебску, Магілёве і Мінску. Яны не з'яўляліся вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, аднак праграма навучання ў іх была шырэйшая, чым у семінарыях. Яны выпускалі настаўнікаў для пачатковых школ павышанага тыпу. Настаўнікаў для гарадскіх вучылішчаў і сярэдніх школ на Беларусі не рыхтавалі. Іх прысылалі з Масквы, Пецярбурга і Кіева.

У 1911 г. у школах навучалася 26 % хлопчыкаў, 10 % дзяўчат.

2. *НАВУКА.*

На развіццё навукі на Беларусі ў пачатку XX ст. адмоўна паўплывала адсутнасць уласных вышэйшых навучальных устаноў і даследчыцкіх цэнтраў. Так большасць таленавітых вучоных уражэнцаў Беларусі былі вымушаны жыць і працаваць па-за межамі Беларусі (палеантолаг Кавалеўскі, фізік і хімік Урублеўскі, філолаг Карскі, гісторык Доўнар-Запольскі і інш.) Так, высокаадукаваны вучоны Эпімах-Шыпіла, які ведаў 20 моў, тым ліку і санскрыт, працаваў у Санкт-Пецярбургу. Ён з'яўлялся адным з заснавальнікаў выдавецкай суполкі "Загляне сонца і ў наша аконца".

Беларуская нацыянальная навука ў перыяд капіталізму была пераважна гуманітарная, развівалася перш за ўсё этнаграфія, філалогія, фальклярыстыка. Вывучэннем мовы, фальклору, веравызнанняў, этнічных межаў, быту, народнага мастацтва, займаліся Раманаў, Нікіфароўскі, Сербаў, Карскі, Доўнар-Запольскі, Дабравольскі і інш. Імі былі сабраны і апублікаваны унікальныя матэрыялы пра мову і духоўную культуру нашых продкаў, якія даказвалі існавання самастойнаг беларускага этнасу.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Найбольшым уклаам у даследванне мовы беларусаў з’явіліся працы Карскага. Яго праца “Беларусы” (1903 - 1922) 3 тома, з’яўляецца сапраўднай энцыклапедыяй беларусазнаўства.

Важкі ўклад у развіццё беларускай гістарычнай навукі ў пачатку XX ст. зрабіў М. Доўнар-Запольскі – адзін з пачынальнікаў нацыянальнай гістарыяграфіі. За сваё жыццё ён апублікаваў больш за 150 навуковых прац па сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі і Літвы, беларускай этнаграфіі, фальклору і літаратуры. Актыўны дзеяч нацыянальнага адраджэння Ластоўскі стаў першым беларускім гісторыкам, які пісаў пра Беларусь і для беларусаў (на іх роднай мове). У 1910 г. ён выдаў “Каротні нарыс гісторыі Беларусі”. Археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Беларусі вялі Завітневіч, Шукевіч.

Вучоныя сілы беларусі групаваліся ў розныя навуковыя таварыства: навуковыя архіўныя камісіі ў Віцебску і Смаленску, царкоўна-гісторыка-археалагічны камітэт у Мінску, “таварыства вывучэння Беларускага краю” у Магілёве.

3. ПЕРЫЯДЫЧНЫ ДРУК.

Атрымлівае сваё развіццё і выдавецкая страва на Беларусі. Аднак яна была значна ў больш горшым стане, як у цэнтральных губернях Расіі. Адна з прычын таму – найстражайшы цэнзурны нагляд.

У мясцовых друкарнях выдавалася перш за ўсё рэлігійная літаратура, падручнікі, слоўнікі. Грамадска-палітычнай, навуковай, мастацкай літаратуры друкавалася вельмі мала.

Да 1905 г. у 5 Заходніх губернях выдавалася 15 газет. У 1906 г. у Беларусі выходзіла 60 газет і часопісаў, у 1914 г.- 109, з іх 74 выходзілі ў Вільні, 3 - на беларускай мове, 13 - на літоўскай, 12 - на яўрэскай, 28 - на польскай.

Палітычнае аблічча ўрадавых газет вызначаў вялікадзяржаўны шавінізм. Галоўным напрамкам іх дзейнасці была барацьба з “іншародцамі” і “іншаверцамі” – “Беларускі веснік”(1904-1905), “Мінская рэч” (1906), “Мінскае слова” (1906-1912), “Беларуская жызнь” (1911-1915), “Віленскі веснік” (1841-1915), “Віцебскі веснік” (1912-1916), “Мінскіе новасці” (1908-1909), “Магілёўскі веснік” (1906-1916). Гэтыя газеты адстойвалі інтарэсы рускіх памешчыкаў, чыноўнікаў, праваслоўных светароў, якія імкнуліся да палітычнага і эканамічнага панавання ў краі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ліберальную накіраванасць мелі газеты – “Окраіна” (1907-1908), “Северо-Западны голас” (1905-1915), “Голас правінцыі” (1906-1907), “Жызнь правінцыі” (1907). На іх старонках галоўным чынам змешчаліся патрабаванні кадэтаў і прагрэсістаў.

Дзейнасць польскіх перыядычных ізданняў была накіравана на ўзмацненне ўплыву польскіх паноў – “Кур’ер Віленскі”.

У 1905 – 1907 радыкальныя партыі і групоўкі выдавалі “Палескі лісток”, “Лісток Палескага камітэта РСДРП”, “Салдацкая жызнь”, “Салдацкая воля”, “Северо-Западный край”.

Рэвалюцыя 1905-1907 гг. зняла забарону на беларускую мову, беларускае друкаванае слова. Гэта мела вялікане гістарычнае значэнне для далейшага развіцця беларускай нацыянальнай культуры. З 1 верасня 1906 г. пачала выходзіць на беларускай мове газета “Наша доля”, што з’явілася пачаткам легальнага беларускага друку. Аднак пасля 6 нумара яна прыпыніла сваё існаванне. З кастрычніка 1906 г. у Вільні пачала выдавацца штотыднёвая грамадска-палітычная і літаратурная газета “Наша ніва”(1906-1916).

На беларускай мове выходзілі часопісы: “Лучына” для дзяцей, “ Саха” сельскагаспадарчы, “Крапіва” сатырычны.

Вялікае значэнне для развіцця друку, уздыму культуры беларускага народа мелі ўтвараныя ў пачатку XX ст. беларускія выдавецтвы, аб’яднанні, суполкі: “Загляне сонца і ў наша аконца”, “Наша ніва”, “Наша хата”, распачалі сваю дзейнасць выдавецтвы “Вясёлка”, “Палачанін”, “Мінчук”. Тут у першыню на беларускай мове выдаваліся падручнікі, календары, слоўнікі, альманахі, навуковая літаратура, творы беларускіх пісьменнікаў.

4. ЛІТАРАТУРА.

Рэвалюцыйныя падзеі XX ст. паклалі пачатак новаму этапу ў гісторыі беларускай літаратуры. Дзесяткі паэтаў, празаікаў і публіцыстаў пачалі далучыліся тады да творчай дзейнасці на роднай ніве. Менавіта ў гэты час раскрыліся таленты Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багданівіча, Цёткі, Каруся Каганца, Алеся Гаруна, Цішкі Гартнага, Змітрака Бядулі, Максіма Гарэцкага, Канстанцыі Буйло і іншых. Яны ўзнялі на новы ўзровень літаратуру ў моўна-мастацкіх, ідэйных і жанрава-стылявых адносінах.

У літаратуры з’явіўся новы герой – нястомны прадшукальнік, абаронца інтарэсаў народа, смелы і стойкі барацьбіт, прапагандыст рэвалюцыйных ідэй. Значна пашыралася тэматыка і праблематыка, літаратура ўзбагацілася

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

новымі ідэямі, вобразамі, сюжэтамі і канфліктамі. Народ і рэвалюцыя, “пан і мужык”, “зямля і воля”, праца і капітал, грамадства і асоба, народ і інтэлігенцыя, лёс нацыянальнай мовы, літаратуры, культуры былі асноўнымі пытаннямі, якія хвалявалі беларускіх пісьменнікаў і знайшлі адлюстраванне ў іх творах.

Асабліва плённа развівалася паэзія, якая доўгі час займала пануючае становішча ў беларускай літаратуре. І ў пачатку XX ст. яна ў многім вызначала змест літаратурнага працэса. У гэты час пачынае развівацца мастацкая проза, прыкметных поспехаў дасягнула драматургія.

У пачатку XX ст. раскрываюцца паэтычныя таленты заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы.

Я.Купала ўвайшоў у гісторыю беларускай літаратуры як паэт-патрыёт, наватар, пачынальнік нацыянальнай драматургіі, заснавальнік беларускай школы паэтычнага перакладу. Ён узначаліў рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамак у беларускай нацыянальнай літаратуры. Ужо першымі сваімі кнігамі “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця” ён прыкаўвае да сябе ўвагу чытачы. Вялікі інтарэс вызывалі яга камедыі “Паўлінка”, “Прымакі”, драма “Раскіданае гняздо” і інш.

Класікам беларускай літаратуры з’яўляецца Я.Колас. У 1912-1914 гг. выйшлі два яго зборнікі апавяданняў “Родныя з’явы”, “Апавяданні”, працаваў над паэмамі “Новая зямля”, “Сымон музыка”.

Цішка Гартны (Зміцер Жылуновіч) унёс у беларускую паэзію новую, пралетарскую тэму. Яго талент праявіўся ў апавенні нялёгкай долі, цяжкай працы, але высокай годнасці рабочага чалавека.

Галоўнымі матывамі лірыкі Канстанцыі Буйло (Кан. Калечыц) – чыстае і ўзнёслае каханне. Зборнік вершаў паэтэсы выйшаў пад назвай “Курганная кветка” у 1914 г.

Свой значны ўплыў у развіццё беларускай літаратуры унёс М.Багдановіч, таленавіты паэт-лірык, крытык, публіцыст. Ён пераклаў на беларускую мовы вершы рускіх, украінскі, сербскіх, французскіх, нямецкіх паэтаў. Яго адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў “Вянок” 1913 г., з’явіўся адной з вяршынь беларускай нацыянальнай лірыкі пачатку XX ст.

У прозе ў той час працавалі Ядзвігін Ш., Змятрок Бядуля, Палуян, Лёсік і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такім чынам, пісменікі, паэты і драматургі пачатку стагоддзя садзейнічалі развіццю самастоўнасці народа. Дзякуючы іх творчасці беларуская літаратура станавілася ў ровень з больш сталымі і развітымі літаратурамі славянскага свету, уключалася ў еўрапейскі літаратурны працэс.

5. МАСТАЦТВА.

Самым распаўсюджаным жанрам беларускага жывапісу ў пачатку XX ст. быў пейзаж. У гэтым жанры працавалі Фердынанд Рушчыц – яго творы “Зямля”, “Стары млын”, “У свет”; Вітольд Бялыніцкі-Біруля – яго палотны “Вечныя снягі”, “Веснавы снег”, “Восень”, “Зімовы пейзаж” і інш. У 1908 г. яму было прысвоена званне акадэміка жывапісу. У гэтым жанры працавалі таксама – Жукоўскі, Стаброўскі.

Буйнейшымі прадстаўнікамі тэматычнай карціны і партрэтнага жанру ў беларускім жывапісу пачатку XX ст. былі Юдаль Пэн, Якаў Кругер, Леў Альпяровіч і інш. У графіцы працавалі С. Богуш-Сестранцэвіч, К. Кастравіцкі, А Каменскі. У гістарычным жанры працаваў Язэп Драздовіч. Ён стварыў графічную серыю “Старажытная будоўля на Беларусі”, партрэты полацкіх князёў.

У Віцебску працаваў да 1917 г. Марк Шагал. Ён прысвяціў Радзіме шмат карцін “Я і вёска”, “Над Віцебскам”, “Імяніны”.

Такім чынам, у пачатку XX ст. ішло станаўленне і развіццё беларускага нацыянальнага выяўленчага мастацтва. было падрыхтавана і выхавана шмат таленавітых мастакоў разнастайнага жанру і напрамку. Іх творы і сёння складаюць аснову гістарычнай спадчыны беларускага мастацтва.

7. ТЭАТР.

Вялікую ролю ў развіцці беларускай культуры адыграў тэатр. У пачатку XX ст., асабліва ў час пасля рэвалюцыі 1905-1907 гг. пачаўся ўздым беларускага нацыянальнага мастацтва.

У Мінску, Віцебску, Магілёве, Пінску, Гродна і іншых гарадах пачалі ўтварацца тэатральныя таварыствы, прафесійныя трупы, аматарскія супалкі. У гады першай рэвалюцыі распаўсюджваліся “беларускія вечарынкі”, на якіх выступалі хоры, танцавальныя групы. Дэкламаваліся вершы, ставіліся п’есы на толькі рускіх, але і беларускіх аўтараў. З беларускіх вечарынак утварылася першая тэатральная трупа Ігната Буйніцкага ў 1907 г. У 1910 г. яна дала жыцце беларускаму прафесійнаму тэатру, які праіснаваў да 1913 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У значнай ступені пад уплывам трупы Буйніцкага набыў шырокі размах аматарскі тэатральны рух. З 1910 г. у Вільні дзейнічаў “Беларускі музычна-драматычны гурток”, якім кіраваў А. Бурбіс. Ён ажыццявіў першую пастаноўку “Паўлінкі” Я.Купалы. а створанае ў 1917 г. у Мінску Ф.Ждановічам пры ўдзеле І.Буйніцкага Першае беларускае таварыства драмы і камедыі ажыццявіла прэм’еру “Раскіданага гнязда”.

Разам з прафесійным тэатрам, аматарскімі гурткамі працягвала сваё існаванне “батлейка”.

У пачатку XX ст. значна пашырыліся культурныя сувязі. Гастралявалі рускія і ўкраінскія трупы.

Больш разнастайным было ў гэты час і мызычнае жыццё. Утвараліся новыя харавыя гурткі, аркестры, суполкі аматараў музыкі, адкраваліся новыя ўласныя музычныя школы, вучылішчы. У 1914 г. у Мінску існуе народны хор, які выступаў перад насельніцтвам горадоў, у шпіталях.

У пачатку XX ст. былі закладзены асновы беларускай прафесійнай музыкі. Кампазітары М.Чуркін, Л.Рагоўскі, А.Граневіч пісалі музыку на матывы беларускіх народных песень.

Аднак, нягледзячы на станоўчыя моманты ў развіцці тэатральна-музычнага мастацтва Беларусі, у пачатку XX ст. яно знаходзілася толькі на першапачатковым прафесійным узроўні. Не было сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў якія б вялі падрыхтоўку і выхаванне прафесійных нацыянальных кадраў – артыстаў, кампазітараў, музыкантаў.

7. АРХІТЭКТУРА.

На мяжы XIX – пачатку XX стст. Атрымлівае шырокае распаўсюджанне новы стыль – мадэрн. Будынкі гэтага часу адрозніваюцца строгасцю, простай дэкаратыўнай апрацоўкай фасадаў, правільнымі формамі. Характэрнымі становяцца жалезныя канструкцыі, перакрыцці, цэгла і іншыя, больш сучасныя будаўнічыя матэрыялы. Гэта дазваляла значна зменшыць таўшчыню сцен, пашырыць ваконцы, змяніць керамічнае пакрыццё дахаў металічным лістом і інш. Яго прапагандыстамі на Беларусі былі А.Краснапольскі і С. Шабунеўскі.

Па новай тэхналогіі ўводзіліся памяшканні чыгуначных вакзалаў, масты, карпусы фабрык і заводаў, банкі, храмы, музеі, школы і бібліятэкі. Сярод будынкаў пабудаваных у гэтым стыле, выдзеляліся жылыя дамы ў Гродне (дом купца Мураўёва), Магілёве, Гомелі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У пачатку XX ст. канчаткова склаўся неараманскі стыль. Характэрным помнікам гэтага дойлідства з’яўляецца Чырвоны касцёл у Мінску, царква – пахавальня князёў Мірскіх у Міры.

У пачатку XX ст. на Беларусі ажыццяўлялася будаўніцтва помнікаў і абеліскаў у гонар перамогі над шведамі і французамі. Памятныя збудаваннібылі ўзведзены у 1908 г. каля вёскі Лясной.

Развіццё культуры Беларусі пачатку XX ст. таксама непарушна звязана з агульным сацыяльна-эканамічным і палітычным становішчам Расіі, такімі падзеямі, як развіццё капіталізму, фарміраванне нацыі і інш.

Нягледзячы на рэакцыйную палітыку царызму развівалася свецкая школа, утваралася сістэма адукацыі, дазваляўшая прылучыць да ведаў моладзь горада і вёскі.

Адбывалася і станаўленне беларускай нацыянальнай літаратуры, друку, мастацтва; завершаецца выпрацоўка лексічных, граматычных і фанетычных нормаў беларускай мовы, што вельмі добра ўплывала на фарміраванне беларускай нацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

КАНТРОЛЬНЫ БЛОК

Тэст па тэме “Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў пачатку XX ст”.

1 Дайце азначэнне паняцяў:

Акцыянернае таварыства;

Сірвітут;

Сялянская абшчыны;

Мануфактура.

2 ***Пачатак чыгуначнай сеткі Беларусі паклала:***

a) Маскоўска-Брэсцкая чыгунка;
b) Лібава-Роменская чыгунка;
c) Пецярбургска-Варшаўская чыгунка,
d) Рыга-Арлоўская.

3 Выберыце з пераліку характэрныя рысы прамысловага развіцця Беларусі ў пачатку XX ст.:

a) наяўнасць буйных прамысловах цэнтраў;
b) пераважнае развіццё галін перапрацоўчай прамысловасці;
c) адсатнасць буйных прамысловых цетраў;
d) прамысловыя прадпрыемствы размешчаны пераважна ў горадзе;
e) прамысловыя прадпрыемствы размешчаны ў вёсках і мястэчках;
f) пераважалі буйныя прадпрыемствы;
g) пераважалі дробныя прадпрыемствы з невялікай колькасцю рабочых.

4 ***З пераліку формаў класавай барацьбы выберыце найбольш характэрныя для сялянскага руху:***

a) забастоўкі;
b) захоп памешчыцкіх ворных зямель, лугоў, пашы і г.д.;
c) перасяленні на свабодныя землі;
d) хваляванні і стачкі;
e) сутыкненні з уладамі.

5 З пераліку выберыце фактары, якія садзейнічалі росту беларускіх гарадоў у пачатку XX ст.

a) будаўніцтва чыгунак;
b) у гаражан меншыя павінасці і падаткі;
c) перасяленне сялян у горад пасля адмены прыгоннага права;
d) у горадзе лягчэй знайсці работу, лягчэй жыць;
e) рост колькасці фабрык і заводаў.

6 Вызначце правільную паслядоўнасць.

a) мануфактурная вытворчасць;
b) фабрычна-завадская вытворчасць;
c) дробная рамесная вытворчасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

7 Прамысловасць Беларусі ў пачатку XX ст. спецыялізавалася галоўным чынам на:

a) гарбарнай вытворчасці;
b) машынабудаванні і металаапрацоўцы;
c) пераапрацоўцы мясцовай сельскагаспадарчай і лясной сыравіны;
d) развіцці вытворчасці будаўнічых матэрыялаў.

8 Характэрныя асаблівасці структуры рабочага класа на Беларусі ў пачатку XX ст.

a) высокая ступень канцэнтрацыі;
b) распыленасць па дробных прадпрыемствах;
c) нязначная вага занятых на буйных фабрыках і заводах;
d) шырокая сувязь рабочых дробных прадпрыемстваў з сельскай гаспадаркай.

9 Прадпрыемствы цэнзавай прамысловасці – гэта

a) дробнакапіталістычныя прадпрыемствы з невялікай колькасцю працоўных і спецыялізацыяй на бытавым абслугованні насельніцтва;
b) прадпрыемствы буйной капіталістычнай прамысловасці;
c) выключна прадпрыемствы з удзелам замежнага капіталу;
d) выключна дзяржаўныя прадпрыемствы;
e) выключна акцыянерныя прадпрыемствы.

10 Суаднясіце элементы двух мностваў:

1) харчовая прамысловасць;
2) дрэваапрацоўчая прамысловасць;
3) вытворчасць запалак;
4) канцэнтрацыя вытворчасці.

a) кампактнае размяшчэнне прамысловых прадпрыемстваў побач з важнымі транспартнымі і гандлёвымі цэнтрамі;
b) вядучая галіна беларускай прамысловасці;
c) сфера прамысловасці, якая кантралявалася беларускімі вытворцамі (стварэнне агульнарасійскай манаполіі);
d) асноўная крыніца замежных, пераважна германскіх, капіталаўкладанняў.

Тэст па тэме: “Рэвалюцыя 1905-1907 гг. у Беларусі”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Суаднясіце праграмныя палажэнні і партыі:

1. БСГ	а) звяржэнне самадзяржаўя, устанаўленне дэмакратычнай рэспублікі, пазней дэктатуры пралетарыята шляхам сацыялістычнай рэвалюцыі.
2. ПСР	b) знішчэнне капіталістычнага ладу, звяржэнне самадзяржаўя, утварэнне на тэрыторыі Беларусі незалежнай дэмакратычнай рэспублікі;
3. РСДРП	с) знішчэнне капіталістычнага ладу, звяржэнне самадзяржаўя, утварэнне на тэрыторыі Беларусі незалежнай дэмакратычнай рэспублікі;

***2. Галоўная асаблівасць рэвалюцыіі 1905-1907 гг. для Беларусі*:**

a) асаблівая вастрыня нацыянальнага пытання;
b) буржуазна-дэмакратычны характар
c) моцныя сацыяльна-палітычныя пазіцыі нацыянальнай буржуазіі;
d) наяўнасць палітычных партый.

3. Характар рэвалюцыі 1905-1907 гг. па яе сацыяльна-эканамічным змесце:

a) антыфеадальны;
b) буржуазна-дэмакратычны;
c) пралетарскі;
d) сацыялістычны.

4. Да эканамічных патрабаванняў забастоўшчыкаў у красавіку – маі 1905 г. адносіліся:

a) скарачэнне рабочага дня
b) павелічэнне заработнай платы
c) увядзенне агульнанароднага прадстаўніцтва
d) паляпшэнне медыцынскага абслугоўвання
e) замена манархіі рэспублікай.

5. Што з пералічанага не адносіцца да палітычных правоў, дараваных Маніфестам 17 кастрычніка 1905 г.?

a) права шэсцяў, маніфестацый і мітынгаў
b) свабода слова і друку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

c) права на выражэнне недаверу ўраду
d) права на свабоду сумлення
e) усеагульнае выбарчае права
f) права на недатыкальнасць асобы.

6. Падзея, якая адбылася 18 кастрычніка 1905 г. у Мінску:

a) абвяшчэнне Маніфеста 17 кастрычніка;
b) дзяржаўны пераварот;
c) "Курлаўскі растрэл";
d) расстрэл дэманстрацыі рабочых.

1. Суаднясіце палітычныя партыі і сацыяльныя слаі, якія іх падтрымлівалі:

a. Эсеры	a) рабочыя, сяляне, салдаты, матросы, праваслаўнае насельніцтва;
b. БСГ	b) буйная буржуазія, памешчыкі, дробная буржуазія,інтэлігенцыя;
3) Бунд	c) дробная буржуазія, буйная буржуазія, каталіцкае насельніцтва Беларусі, інтэлігенцыя;
4) Акцябрысты	d) рабочыя, сяляне, студэнты, дробная буржуазія, інтэлігенцыя;
5) Кадэты	e) яўрэйскае насельніцтва;
6) РСДРП	f) рабочыя, сяляне, салдаты, матросы, дробная буржуазія, інтэдігенцыя.

2. Запоўніце прапушчаныя элементы лагічнага ланцужка:

Крывавая нядзеля ..... Байкот Булыгінскай думы ..... Маніфест 17 кастрычніка ..... Выбары ў I Дзяржаўную думу ..... Трэцячэрвеньскі пераварот.

Тэст па тэме: "Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Ад Беларусі ў I Дзяржаўную думу было выбрана:

a) 13 дэпутатаў;
b) 20 дэпутатаў;
c) 36 дэпутатаў.

2.. Вядучай партыяй у I Думе была:

a) партыя акцябрыстаў;
b) партыя кадэтаў;
c) сацыял-дэмакраты.

3. I Дзяржаўная дума была:

a) распушчана царом;
b) прыняла рашэнне аб самароспуску;
c) адпрацавала патрэбны тэрмін.

4. У II Дзяржаўнай думе Беларусь была прадстаўлена дэпутатамі ад:

a) левых партый;
b) цэнтрысцкіх партый;
c) манархічных партый.

5. Галоўнае пытанне у рабоце II Дзяржаўнай думы:

a) аграрнае;
b) абмежаванне самадзяржаўя;
c) адносіны рабочых і прадпрымальнікаў.

6. I *Дзяржаўная дума пачала работу:*

a) у лютым 1906 г.;
b) у красавіку 1906 г.;
c) у чэрвені 1906 г.

7. Чаму прадстаўніцтва левых (рэвалюцыйных) партый ад беларускіх губерній у I Дзяржаўнай думе было такім абмежаваным?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

a) гэта было выклікана байкотам выбараў у Думу з боку рэвалюцыйных партый

b) пераважная частка насельніцтва Беларусі не падтрымлівала праграмы і дзеянні рэвалюцыйных партый

c) насельніцтва Беларусі, перш за ўсе аграрнае, падтрымлівала памяркоўную праграму кадэтаў.

8. Галоўнае пытанне у рабоце I Дзяржаўнай думы:

a) аграрнае;
b) абмежаванне самадзяржаўя;
c) адносіны рабочых і прадпрымальнікаў.

9. Ад Беларусі ў II Дзяржаўную думу было выбрана:

a) 13 дэпутатаў;
b) 20 дэпутатаў;
c) 36 дэпутатаў.

10. II Дзяржаўная дума была распушчана царом таму,што:

a) Гэта патрабавалі правыя партыі;
b) Дума аказалася вельмі рэвалюцыйнай;
c) Дэпутаты Думы рыхтавалі дзяржаўны пераварот.

Тэма: "Сталыпінская аграрная рэформа ў Беларусі".

1. ***Напрамкі аграрнай рэформы П. Сталыпіна:***
   а) разбурэнне сялянскай абшчыны, перасяленне сялян на хутары і абруды, дапамога заможным сялянскім гаспадаркам, удасканаленне агратэхнікі, перасяленне сялян у іншыя рэгіёны імперыі;
   б) захаванне сялянскай абшчыны, дапамога ў развіцці бедных сялянскіх гаспадарак, удасканаленне агратэхнікі, перасяленне сялян у іншыя рэгіёны імперыі;
   в) разбурэнне сялянскай абшчыны, перасяленне сялян на хутары і адрубы, удасканаленне агратэхнікі, перасяленне сялян у іншыя рэгіёны імперыі, дапамога найбольш бедным сялянскім сем'ям.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. ***Выкупныя плацяжы з сялян, згодна з адпаведным маніфестам, былі адменены поўнасцю:***
   а) 3 лістапада 1905 г.;
   б) 1 студзеня 1906 г.;
   в) 1 студзеня 1907 г.;
   г) 3 чэрвеня 1907 г.

3. Сталыпінская аграрная рэформапачалася і праводзілася на падставе наступнага дакумента:
   а) “Аб дапаўненні некаторых пастаноў дзеючага закона, якія тычацца сялянскага землеўладання і землекарыстання”.
   б) “Палажэнне аб Асобным Камітэце па землеўпарадкавальных справах”.
   в) “Агульнае палажэнне аб зямельнай рэформе ў Расійскай імперыі”.
   г) “Мясцовае палажэнне для велікарускіх і беларускіх губерняў”.

4. Якія мэты ставіла аграрная рэформа:
   а) палітычную;
   б) эканамічную;
   в) палітычную і эканамічную.

5. Упішыце патрэбныя паняцці, тэрміны, назвы ці імёны:

- Зямельны надзел, які выдзеляўся з абшчынай зямлі ў асабістае валоданне селяніна – _____
- Індывідуальная гаспадарка сяляніна з домам і хоз. будынкамі – _____
- Выбарны орган местнага самакіравання. – _____

Тэма: “Першая Сусветная вайна на тэрыторыі Беларусі.”

1	У 1916 г. незадаволенасць салдат Заходняга фронту праяўлялася праз: А) дэзерцірства	1) АБВ 2) БВГ 3) ВГД 4) АБГ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	Б) непадпарадкаванне салдат афіцэрам В) стварэнне Саветаў салдацкіх дэпутатаў Г) паўстанні салдат Д) стварэнне салдацкіх рэвалюцыйных камітэтаў	
2	У гады першай сусветнай вайны саюзнікамі Германіі былі: А) Аўстра-Венгрыя Б) Турцыя В) Японія Г) Індыя Д) Балгарыя	1) АБГ 2) БВГ 3) АБД 4) БВД
3	У гады першай сусветнай вайны саюзнікамі Англіі былі: А) Расія Б) Францыя В) Новая Зеландыя Г) Турцыя Д) Балгарыя	1) БВГ 2) АБВ 3) АБД 4) ДБВ
4	У гады першай сусветнай вайны на баку Антанты выступілі: А) Японія Б) Канада В) Аўстра-Венгрыя	1) АБГ 2) АБД 3) БВД 4) АВГ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	Г) Швейцарыя Д) Аўстралія	
5	Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага расійскімі войскамі ў 1914–1915 гг. пачаргова знаходзілася ў:	1) Баранавічах 2) Мінску 3) Магілёве 4) Гомелі
6	У гады першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі ўзрасла вытворчасць наступных галін прамысловасці: А) піваваранай Б) абутковай В) швейнай Г) ювелірнай Д) металаапрацоўчай	1) АБВ 2) БВГ 3) БВД 4) АБД
7	У гады першай сусветнай вайны на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі адбылося скарачэнне:	1) пасяўных плошчаў 2) колькасці буйной рагатай жывёлы 3) галін прамысловасці, што выконвалі ваенныя заказы 4) колькасці салдат і афіцэраў
8	У гады першай сусветнай вайны для сялянскага руху былі характэрнымі наступныя формы барацьбы:	1) разгром харчовых магазінаў 2) захват надзельных зямель 3) разгром памешчыцкіх маёнткаў 4) захват прамысловых прадпрыемстваў па вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі
9	У 1916 г. з ініцыятывай аднаўлення ВКЛ выступілі: А) Я. Купала Б) І. Луцкевіч	1) АБД 2) БГД 3) БВГ 4) ВГД

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	В) А. Луцкевіч Г) В. Ластоўскі Д) А. Чарвякоў	
10	У 1916 г. арганізацыя “Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі” прапагандавала ідэю:	1) уключэння Беларусі ў склад “Польскай Кароны” 2) уключэнне Беларусі ў склад дэмакратычнай Расіі 3) утварэння незалежнай беларускай дзяржаўнасці 4) утварэння непадзельнай Беларусі ў яе этнаграфічных межах
11	У 1916 г. нямецкія акупацыйныя ўлады абвясцілі беларускую мову раўнапраўнай з мовамі: А) рускай Б) польскай В) яўрэйскай Г) украінскай Д) літоўскай	1) БВА 2) ВГД 3) АГД 4) БВД
12	У 1915–1916 гг. у Вільні былі створаны: А) Беларуская партыя народных сацыялістаў Б) Беларуская крысціянская дэмакратыя В) Беларускі клуб Г) Беларускі народны камітэт Д) Беларускі вучыцельскі	1) АБД 2) БВД 3) ВГД 4) ВГА

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	саюз	
13	У гады першай сусветнай вайны быў налажаны выпуск беларускамоўных газет: А) “Гоман” Б) “Загляне сонца і ў наша ваконца” В) “Мінскі лісток” Г) “Дзянніца” Д) “Светач”	1) АБД 2) АГД 3) ВГД 4) БВГ

Да усяго пройдзенага матэрыяла.

Дайце правільнае азначэнне.

1	Стваральнікам і першым кіраўніком баявой арганізацыі партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў з’яўляўся ...
2	Газета, якая пачала выходзіць у Вільні 10 лістапада 1906 г. – гэта ...
3	Гродзенскім губернатарам ў 1902–1905 гг. з’яўляўся ...
4	Акрамя Віцебскай і Мінскай губерняў, земская рэформа ў 1911 г. была праведзена і ў … губерні:
5	Кіраўніком “Беларускага музычна-драматычнага гуртка”, які дзейнічаў у Вільні з 1911 г., з’яўляўся ...
6	У Беларусі была ўведзена “мяжа яўрэйскай аселасці” у ... годзе
7	Другая стадыя развіцця капіталістычнай прамысловасці ў Беларусі ...
8	Кіраўніком першага прафесійнага беларускага тэатра, які дзейнічаў у 1910–1913 гг., з’яўляўся ...
9	Назва літаратурна-палітычнай газеты, якая пачала выходзіць у 1886 г. ...
10	Аўтарам выдадзенага ў 1913 г. зборніка “Вянок” з’яўляўся ...

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

11	Сталыпінская аграрная рэформа пачалася з выдання ўказа ад ... года
12	У 1903–1916 гг. Я. Карскі выдаў 5 кніг па лінгвістыцы, этнаграфіі і фальклярыстыкі беларускага народа пад агульнай назвай ...
13	Аўтарам “Гісторыі літоўскага народа” у 9 тамах з’яўляецца ...
14	Заснавальнікам рэалізму ў пейзажным жывапісе Беларусі, аўтарам карцін “Возера Свіцязь”, “Дом Міцкевіча ў Навагрудку” з’яўляецца ...
15	Увядзенне Александрам III “Палажэння аб мерах для аховы дзяржаўнай бяспекі і грамадскага спакою” адбылося ў ...годзе
16	Публічны продаж якой-небудзь маёмасці ў форме спаборніцтва пакупнікоў: хто заплаціць больш за ўстаноўленую першапатковую цану – гэта ...
17	Калектыўная адказнасць, калі за селяніна, які не заплаціў падатак, адказвала ўся вёска – гэта ...
18	Знішчэнне нацыянальных асаблівасцей і свядомасці народа, зліццё яго з іншым народам, якое суправаджаецца засваеннем чужой мовы, культуры і звычаяў – гэта ...
19	Вучэнне, якое звязвала вызваленне яўрэяў ад дыскрымінацыі ў розных краінах, дзе яны пражывалі, з перасяленнем іх у Палесціну і стварэннем там яўрэйскай дзяржавы, называецца ...
20	Аб’яднанне, саюз розных партый, рухаў ці дзяржаў для дасягнення пэўных мэтаў – гэта …
21	Дэпутаты I Расійскай Дзяржаўнай думы з украінскіх, польскіх, прыбалтыйскіх губерняў, якія дамагаліся шырокага самакіравання для сваіх краёў – гэта ...
22	Стыль, у якім ў пачатку XX ст. быў пабудаваны касцёл святых Сымона і Алены ў Мінску, носіць назву ...
23	Выбарныя органы для кіравання ў губернях і паветах мясцовай гаспадаркай, адукацыяй, аховай здароўя – гэта ...
24	Галоўным пытаннем ў I Расійскай Дзяржаўнай думе з’яўлялася ...

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

25	Масавае звальненне рабочых і закрыццё прадпрыемстваў іх уласнікамі з мэтай перагляду на сваю карысць умоў найму – гэта ...
26	Першы расійскі “парламент” у пачатку XX ст. – гэта ...
27	Мера плошчы, роўная 2400 кв. сажаням – гэта ...
28	Форма аб’яднання прадпрымальнікаў, калі яны дамаўляюцца аб устанаўленні пэўных аб’ёмаў вытворчасці і адзінай цаны на сваю прадукцыю – гэта ...
29	Выдзелены ў адным месцы ўчастак зямлі ўзамен палосак («шнуроў») у некалькіх месцах – гэта …
30	Права сялян карыстацца фальваркавай зямлёй і лесам памешчыка ў пэўных межах – гэта ...
31	Рэформа, якая з 1911 г. праводзілася ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях – гэта ...
32	Плынь сярод расійскіх сацыял-дэмакратаў у пачатку XX ст., якая абмяжоўвала задачы рабочага руху эканамічнай барацьбой ...
33	Палітычны лагер у пачатку XX ст., які прадстаўлялі кадэты, акцябрысты, мірнаабнаўленцы і інш. – гэта ...
34	Царская “канстытуцыя” ад 17 кастрычніка 1905 г. – гэта ...
35	Канцэпцыя адмаўлення гістарычнасці беларусаў як самастойнай адзінкі, атаясамлівання іх з вялікарускім народам – гэта ...
36	Карэнныя змяненні, пераварот у грамадска-палітычным ладзе, які азначае звяржэнне старога і ўстанаўленне новага дзяржаўнага ладу – гэта ...
37	Самастойнае ажыццяўленне дзяржаўнай улады альбо шырокае ўнутранае самакіраванне, якое прадастаўляецца асобнай нацыянальнасці, што кампактна пражывае ў межах адзінай дзяржавы, – гэта ...
38	Ператварэнне, змяненне, перабудова якога-небудзь боку грамадскага жыцця пры захаванні асноў існуючага ладу – гэта ...
39	Далучэнне з дапамогай сілы адной дзяржавай тэрыторыі другой дзяржавы альбо яе часткі – гэта ...

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

40	Грошы альбо матэрыяльныя каштоўнасці, якія дзяржава-пераможца збірае з дзяржавы, якая пацярпела паражэнне ў вайне – гэта ...
41	Палітычная дзейнасць, якая не ўлічвае рэальных абставін і грамадскіх законаў і вядзе, як правіла, да паражэння – гэта ...
42	Неабмежаваная, гвалтоўная, парушаючая законы ўлада адной асобы або партыі – гэта ...
43	Форма дзяржаўнага ўтварэння, пры якой некалькі дзяржаў аб'ядноўваюцца і ствараюць адну саюзную дзяржаву – гэта ...
44	Прымусовае адчужэнне ўласнай маёмасці ў спажыванне іншых асоб – гэта ...
45	Гвалтоўнае ваеннае ўмяшальніцтва адной ці некалькіх дзяржаў ва ўнутраныя справы іншай краіны – гэта ...
46	Дзяржава, тэрыторыя якой выкарыстоўваецца ў якасці пагранічнай зоны паміж супрацьлеглымі адна адной краінамі ў мэтах недапушчэння вырашэння іх канфлікту ўзброеным шляхам – гэта ... дзяржава
47	Палітычная незалежнасць і самастойнасць дзяржаўнай улады ва ўнутранай і знешняй палітыцы, якая не дапускае замежнага ўмяшання – гэта ...
48	Форма арганізацыі працы, пры якой адбываецца добраахвотнае аб'яднанне людзей для сумеснай арганізацыі працы, гандлю і г.д., – гэта ...
49	Пераход ад ручной працы да машыннай тэхнікі, развіццё ў першую чаргу прамысловасці як галіны гаспадаркі, якая вызначае эканамічны патэнцыял краіны – гэта ...

Праца з картай.

1. **Абазначце на карта-схеме населеныя пункты, дзе ў пачатка XX ст. працавалі найбуйнейшыя ў Беларусі прамысловыя прадпрыемствы; падпішыце назвы гэтых прадпрыемстваў**.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



2. **Абазначце на карце чыгуначныя дарогі.**



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

СУПРАВАДЖАЮЧЫ БЛОК

ГЛАСАРЫЙ

Цензавая прамысловасць – буйная прамысловасць, на прадпрыемствах якой павінна было быць не менш за 16 рабочых.

Канцэнтрацыя прамысловасці – сканцэнтраванне прамысловасці на адным прадпрыемстве, у адной мясцовасці, у адным рэгіёне.

Акцыянернае таварыства - прадпрыемства, капітал якога ўтвараецца з грашовых укладаў шэрага прадпрымальнікаў і існуе ў форме акцый, якія свабодна прадаюцца і купляюцца. Акцыя - каштоўная папера, якая сведчыць аб удзеле ў акцыянерным таварыстве і дае права яе ўладальнікам на атрыманне сваёй долі ад агульнай сумы прыбытку.

Манапалістычнае аб’яднанне - буйное капіталістычнае аб'яднанне, якое ўзнікла на падставе канцэнтрацыі вытворчасці і капіталу з мэтай панавання ў пэўнай галіне гаспадаркі і атрымання найбольшага прыбытку.

Сіндыкат - форма аб'яднання прадпрымальнікаў, калі яны дамаўляюцца аб устанаўленні пэўных аб'ёмаў вытворчасці і адзінай цаны на сваю прадукцыю.

Сірветуты - право абмежаванага выкарыстоўвання чужым зямельным участкам.

Латыфундыяльнае землеўладанне – буйное феадальнае памесце.

Рэвалюцыя – спосаб пераходу ад гістарычна зжыўшай сябе грамадска-эканамічнай фармацыі да болей прагрэсіўнай.

Эканамізм – плынь у расійскай сацыял-дэмакратыі ў канцы 19 – пач. 20ст.

Сіянізм – палітычная плынь, якая ўзнікла ў канцы 19 ст. вырашэнне яўрэскага пытання праз стварэнне яўрэскай дзяржавы.

Шавінізм – пропаведзь нацыянальнай выключнасці.

Зубатаўшчына – стварэнне рабочых суполак пад кантролем паліцыі, дзе панавалі ідэі эканамізму.

БСГ – Беларуская сацыялістычная грамада.

РСДРП – расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ПСР – партыя сацыялістаў рэвалюцыянераў.

“**Наша ніва**” – легальная штотыдневая грамадска-палітычная і літаратурна-мастацкая газета, якая выдавалася на беларускай мове.

Акупацыя – сістэма ваенных і палітычна-эканамічных мерапрыемствая, якія праводдзяцца на акупіраваных тэрыторыях.

Суправаджальны блок

Гласарый

Аграрнае пытанне – пытанне пра ўласнасць на зямлю і яе размеркаванне, пра забеспячжнне ўмоў для пяспаховага развіцця сельскай гаспадаркі і задавальнення патрабаванняў сялянства.

Адпрацоўкі – пасля адмены прыгоннага права праца сялян у панскай гаспадарцы за арэнду памешчыцкіх палёў, пашы, сенажацей ці за натуральныя або грашовыя пазыкі.

Адрэзкі – землі, адабраныя памешчыкамі ў сялян падчас рэформы 1861 г.

“Амерыканскі” шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы – шлях, пры якім сялянам дазвалялася замацаваць свае зямельныя надзелы ва ўласнасць пры адначасовым разбурэнні сельскай абшчыны ў час правядзення сталыпінскай аграрнай рэформы.

Асіміляцыя – этнічны працэс яднанння двух этнасаў, калі адзін з іх поўнасцю ўспрымае мову і культуру другога этнасу і “растваряецца” ў ім.

Банк – установа, якая ажыццяўляе пасрэдніцтва ў крэдыце і платяжах, канцэнтруе грашовыя сродкі.

Беларусазнаўства – навука, якая вывучае адметнасць і агульнасць беларусаў, іх уземаадносіны з суседзямі і ролю ў супольнасці народаў.

Выкупная аперацыя - дзяржаўная крэдытная аперацыя па выкупе сялянамі зямлі, састаўная частка сялянскай рэформы 1861 г.

Гаспадарчая спецыялізацыя – засяроджванне дзейнасці на вытворчасці пэўнага віду прадукцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Заходнерусізм – сістэма поглядаў, прыхільнікі якой адмаўлялі гістарычнасць беларусаў як самастойнага і самабытнага народа і атаясамлівалі іх з велікарускім этнасам.

Кансалідацыя – згуртаванне, зліцё ў адзінае цэлае блізкіх па паходжанні і культуры этнасаў.

Капіталізм – грамадскі лад, длч якога характэрны прыватная ўласнасць на сродкі вытворчасці, выкарыстанне вольнанаёмнай рабочай сілы, таварна-грашовыя адносіны.

Конка – гарадская наземная чыгунка, вагон, які рухаецца пазапраганымі коньмі (10 мая 1890 г. у Мінску).

Лібералізм – ідэйна-палітычная плынь, прадстаўнікі якой выступалі за абмежаванне манрхіі і ўстанаўленне парламенцкага ладу, роўнасць людзе перад законам, свабоду прыватнай уласнасці і прадпрымальніцтва, сваблду слова, сумлення, сходаў.

Манархія – форма кіравання, пры якой вярхоўная ўлада цалкам або часткова належыць аднаасобнаму кіраўніку і перадаецца ў спадчыну.

Марксізм – філасофскае, эканамічнае і палітычнае вучэнне, створанае ў першай палове XIX ст. К. Марксам і Ф. Энгельсам; згодна з ім паступальны гістарычны ход грамадскага развіцця вызначаўся зменай грамадска-эканамічных фармацый, а класавая барацьба паміж пануючым і прыгнечаным класамі разглядалася ў якасці рухаючай сілы гісторыі; найвышэйшым праяўленнем класавай барацьбы лічылася сацыяльная (пралетарская, сацыялістычная) рэвалюцыя, якая прывядзе да ўсталявання дыктатуры пралетарыяту.

Менталітэт – “склад душы”, “лад мыслення”.

Міравыя пасрэднікі – службовыя асобы, якія прызначаліся для разгляду спрэчак і скаргаў паміж сялянамі і памешчыкамі.

Народніцтва – кірунак у рэвалюцыйным руху, прыхільнікі якога выступалі супраць прыгонніцтва, самадзяржаўя і паддзялялі ідэю аб тым, што Расія можа, прамінуўшы капіталістычную стадыю развіцця, адразу перайсці праз сялянскую абшчыну да сацыялізму.

Нацыя – гістарычная супольнасць людзей, для якіх характэрна пражыванне на адной тэрыторыі, адзіная эканоміка, адна літаратурная мова, агулдьныя рысы культуры і псіхалогіі, нацыянальная самасвядомасць.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Нацыянальнае пытанне – пытанне аб рэалізацыі права народа на свабоднае, этнічнае, дзяржаўнае, культурнае самавызначэнне.

Нацыянальная ідэя – уяўленні, у якіх народ выражае сваё разуменне сябе як супольнасці людзей (нацыі) і сэнс свайго гістарычнага існавання.

Нацыянальная самасвядомасць – сукупнасць ідэй, уяўленняў, перакананняў, вераванняў, у якіх народ асэнсоўвае сябе яе супольнасць.

Паншчына – від сялянскай павіннасці, які ўяўляў сабой дармавую, прымусовую адпрацоўку залежнымі сялянамі з выкарыстаннем уласных прылад працы пэўнай колькасці дзён у гаспадарцы памешчыка.

Пралетарыят – клас (грамадская група людзей) вольнанаёмных рабочых, якія пазбаўлены ўласнасці на сродкі вытворчасці; адзінай крыніцай існавання рабочых з'яўляецца продаж іх рабочай сілы ўладальніку прадпрыемства за вызначаную плату.

Прамысловы пераварот – пераход ад мануфактурнай да фабрычна-заводскай вытворчасці, ад ручной да машыннай працы, звязаны з фармірваннем прамысловай буржуазіі і вольнанаёмнага рабочага класа.

"Прускі" шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы – шлях, пры якім пасля адмены прыгоннага права захоўвалася памешчыцкая ўласнасць на зямлю.

Сацыял-дэмакратыя – палітычны рух, прыхільнікі якога абвясцілі сваёй мэтай барацьбу за пабудову сацыяльна справядлівага грамадства; падзяляўся на два асноўныя кірункі: рэвалюцыйны і рэфармісцкі; рэвалюцыянеры прытрымліваліся ўзброеных метадаў барацьбы, а рэфарміcты выступалі за мірныя пераўтварэнні.

Сацыялізм – вучэнне, якое мела мэтай ажыццяўленне ў грамадскім жыцці прынцыпаў свабоды, роўнасці, спавядлівасці.

Стачка – калектыўнае спыненне працы рабочымі з мэтай задавальнення сваіх эканамічных ці палітычных патрабаванняў.

Сервітуты – абмежаванае права карыстання чужой уласнасцю (права праезду, выпасу жывёлы, рыбнай лоўлі, карыстанне сенажацямі, ляснымі ўгоддзямі і інш.).

Сядзіба – паселішча, комплекс жылых і гаспадарчых пабудоў разам з дваром, агародам і садам, якія складаюць гаспадарку сельскіх жыхароў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Тутэйшыя” – саманазва часткі жыхароў Беларусі ў XIX с.

Тэрор палітычны – форма ўзброенага прымусу ў палітычных мэтах.

Устаўныя граматы – акты, якія рэгулявалі пазямельныя адносіны часоваабавязаных сялян з памешчыкамі паводле сялянскай рэформы 1861 г.

Фабрыка – прамысловае прадпрыемства, заснаванае на падзеле працы і выкарыстанні машын.

“Хаджэнне ў народ” – рух перадавой разначыннай інтэлігенцыі, звязаны з прапагандай сацыялістычных ідэй сярод сялянства.

Цераспалосіца – раз’яднанасць і раздробленнасць зямельнага надзелу на некалькі адасобленых частак.

Часоваабавязаныя сяляне – былыя пемешчыцкія сяляне, вызваленыя ад прыгоннай залежнасці па ўмовах рэформы 1861 г., але абавязаныя адпрацоўваць ранейшыя павіннасці да поўнага выкупу зямлі.

Эканамізм – плынь у расійскай сацыяльнай дэмакратыі (кан. XIX ст. – пач. XX ст.), прыхільнікі якой намагаліся абмежаваць рабочы рух эканамічнай барацьбой.

Этнас (народ) – гістарычна сфарміраваная супольнасць людзей з агульнай культурай, мовай і самасвядомасцю.

Этнічная самасвядомасць – усведамленне свайго адрознення ад прадстаўнікоў іншых народаў і прыналежнасці да таго народа, які па многіх прыкметах прызнаецца “сваім”, “родным”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«Гісторыя Беларусі. 1917 – 1939 гг.»

Канспект лекцый

Тема 10.1. ***Беларусь пасля падзення самадзяржаўя. Беларускі нацыянальны рух.***

Ключавыя словы і паняцці: рэвалюцыя, Часовы Урад, Саветы, беларускі нацыянальны рух, беларускія нацыянальныі партыі і арганізацыі, Усебеларускі з’езд.

План:

1.Лютаўская рэвалюцыя на тэрыторыі Беларусі.

2. Стварэнне органаў Часовага урада і Саветаў.
3.Паглыбленне сацыяльна-эканамічнага крызісу.
4. Пашырэнне беларускага нацыянальнага руху.
5. З’езд прадстаўнікоў беларускіх партый і арганізацый ў сакавіку 1917 г.
6. Усебеларускі з’езд у снежні 1917 г.

Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя 1917 г. прывяла да падзення самадзяржаўя ў Расіі. Аднак буржуазным Часовым урадам не былі вырашаны галоўныя, злабадзённыя сацыяльныя пытанні — аграрнае, нацыянальнае, аб спыненні ўдзелу Расіі ў Першай сусветнай вайне і заключэнні міру. Асабліва набалелым для Беларусі было пытанне аб міры. Насельніцтва краю пакутавала ад баявых дзеянняў і цяжару ўтрымання больш за паўтарамільённай арміі Заходняга фронту.

Лютаўская рэвалюцыя дазволіла розным палітычным партыям і грамадскім арганізацыям легальна ажыццяўляць сваю дзейнасць. Мінск ператварыўся ў вядучы палітычны цэнтр Беларусі. У ноч з 3 на 4 сакавіка ў горадзе на сходзе дэмакратычнай грамадскасці быў створаны Камітэт грамадзянскай бяспекі на чале з Барысам Самойленкам і Станіславам Хржанстоўскім. Часовы орган ўлады дзейнічаў да моманту дэмакратычнага перавыбрання гарадской думы (30 ліпеня). Заснаваны 4—8 сакавіка гарадскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў на чале з Б.Позернам абараняў інтарэсы працоўных і вайскоўцаў, аднак ніякіх прэтэнзій на ўладу ў Мінску не выстаўляў. Істотнай асаблівасцю паслярэвалюцыйнага развіцця не толькі Мінска, але і Беларусі было адсутнасць двоеўладдзя, супрацоўніцтва большасці палітычных сіл у справе падтрымкі Часовага ўрада.

Ствараліся ўмовы для вырашэння нацыянальнага пытання. Важнае значэнне ў гэтым працэсе мела «Дэкларацыя правоў народаў Расі***і»,*** якая была зацверджана СНК 2 (15) лістапада 1917 г. У ёй абвяшчалася роўнасць усіх народаў і права кожнага з іх на самавызначэнне і ўтварэнне самастойнай дзяржавы.

Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. з'яўлялася сацыяльнай па сваім характары. У выніку рэвалюцыі ўлада перайшла да Саветаў рабочых, салдацкіх, сялянскіх дэпутатаў. Згодна з Дэкрэтам аб міры Савецкі ўрад прапанаваў ваюючым бакам прыпыніць баявыя дзеянні і распачаць

Найбольш уплывовымі нацыянальным партыямі і арганізацыямі былі Вялікая Беларуская Рада (ВБР), Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ), Беларуская народная грамада (БНГ), Беларуская партыя народных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сацыялістаў (БПНС), Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД) і інш. Кіраўніцтва гэтых партый не падтрымала Кастрычніцкую рэвалюцыю.

Абвешчанае «Дэкларацыяй правоў народаў Расіі» права народаў на свабоднае самавызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў адкрывала магчымасць для практычнага вырашэння пытання аб дзяржаўным уладкаванні Беларусі. Пасля кастрычніцкіх падзей 1917 г. Цэнтральная рада, утвораная ў ліпені 1917 г. на з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый, была перайменавана ў Вялікую беларускую раду (ВБР). Яна абвясціла ўласную палітычную праграму, у якой прадугледжвалася дасягненне аўтаноміі ў межах Расійскай федэратыўнай рэспублікі.

Дзеячы ВБР, прызнаўшы ленінскі ўрад у Петраградзе, адмовіліся прызнаць уладу Аблвыкамзаха ў Беларусі, бо лічылі, што ён прадстаўляе не беларускі народ, а салдат Заходняга фронту.

Вялікая беларуская рада выступіла з ініцыятывай склікання ў Мінску Усебеларускага з'езда. Ён павінен быў вырашыць пытанне аб беларускай дзяржаўнасці. Гэту ініцыятыву падтрымаў Беларускі абласны камітэт (БАК), створаны з дэлегатаў ад беларускіх губерняў на Усерасійскі з'езд сялянскіх дэпутатаў.

Усебеларускі з'езд адбыўся 5—18 (18—31) снежня 1917 г. у Мінску. Арганізатары з'езда — прадстаўнікі розных палітычных партый — узялі на сябе вырашэнне пытання аб стварэнні краёвай улады.Прыхільнікі ВБР дабіваліся абвяшчэння самастойнай Беларускай Народнай Рэспублікі. Дэлегаты ад БАК прапанавалі абласную аўтаномію Беларусі ў складзе Расіі.

Пасля гарачых дыскусій з'езд прыняў рэзалюцыю, якая абвяшчала рэспубліканскі лад на беларускіх землях на чале з Усебеларускім Саветам сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, да якога часова пераходзіць уся ўлада ў краі і які павінен устанавіць адносіны з цэнтральнай уладай у петраградзе.

Было вырашана з ліку дэлегатаў стварыць часовы орган краёвай улады — Усебеларускі Савет сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў. Яму даручалася ў бліжэйшы час склікаць Усебеларускі Устаноўчы сход, на якім належала вырашыць пытанне аб беларускай дзяржаўнасці. Пасля таго як дэлегаты прыступілі да разгледжання першага пункта рэзалюцыі з'езда аб стварэнні часовага органа краёвай улады па загадзе СНК Заходняй вобласці і фронту з'езд быў распушчаны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тема 10.2 Усталяванне Савецкай улады ў Беларусі

Ключавыя словы і паняцці: Саветы, Аблвыкамзах, СНК, ВРК, мяцеж, акупацыя, Брэсцкі мір

План

1.Падзеі кастрычніцкай рэвалюцыі на Беларусі
2. Адносіны насельніцтва да савецкай ўлады.
3. Вынікі выбараў ва Ўсерасійскі ўстаноўчы сход на Беларусі і Заходнім фронце.
4. Мяцеж польскага корпуса Доўбар-Мусніцкага.
5. Барацьба савецкай ўлады супраць мяцяжу.
6. Новае нямецкае наступленне ў лютым 1918 года. Скасаванне савецкай ўлады на захопленаў тэрыторыі.

Вясной — летам 1917 г. у Расіі ва ўмовах няздольнасці Часовага ўрада вырашыць пытанні аб зямлі, вайне і міры нарастаў палітычны і эканамічны крызіс.Партыя бальшавікоў гатова была пераадолець яго, але для гэтага трэба было ўзяць уладу ў свае рукі. Па ініцыятыве У. І. Леніна да восені 1917 г. быў распрацаваны курс на заваёву ўлады праз узброенае паўстанне.

У час барацьбы з карнілаўшчынай бальшавікі актыўна праводзілі прадстаўнікоў у Саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г. рабочыя Петраграда і рэвалюцыйна настроеныя салдаты зверглі ўладу буржуазнага Часовага ўрада. А *26* кастрычніка (8 лістапада) II Усерасійскі з'езд Саветаў абвясціў савецкую ўладу ў цэнтры і на месцах. Былі прыняты гістарычныя Дэкрэты аб міры і зямлі. Прапаноўвалася неадкладна пачаць перагаворы аб справядлівым і дэмакратычным міры. Скасоўвалася памешчыцкая ўласнасць на зямлю без усялякага выкупу. З'езд утварыў Часовы рабоча-сялянскі ўрад - Савет Народных Камісараў — на чале з У. І. Леніным.

Апоўдні 25 кастрычніка (7 лістапада) бальшавікі Мінска па вайсковым радыё атрымалі паведамленне аб перамозе ўзброенага паўстання ў Петраградзе. Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, у якім пераважалі бальшавікі, абвясціў сябе ўладай у горадзе. Аб гэтым было заяўлена ў загадзе №1 Выканаўчага камітэта Савета. Па яго указанні з турмы былі вызвалены салдаты, арыштаваныя за антыўрадавыя выступленні. З іх быў арганізаваны Першы рэвалюцыйны полк імя Мінскага Савета.

Непасрэднае кіраўніцтва пераходам улады да Саветаў ажыццяўлялі створаныя бальшавікамі ваенна – рэвалюцыйныя камітэты (ВРК), якія абапіраліся на салдацкія масы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Процідзеянне бальшавікам у Мінску аказаў Камітэт выратавання рэвалюцыі на чале з меншавіком Калатухіным. Ён быў створаны 27 кастрычніка (9 лістапада) у складзе меншавікоў, эсэраў, бундаўцаў і прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацый. Камітэт патрабаваў прыняў рашэнне аб увядзенні ў Мінск Каўказскай дывізіі. Перавага сіл у гэты момант аказалася на баку Камітэта перадачы яму ўлады ў горадзе і. Мінскі Савет рабочых дэпутатаў пайшоў на перагаворы з Камітэтам. Але, калі ў Мінск прыбылі па-бальшавіцку настроеныя войскі 2-й арміі і браніраваны поезд на чале з бальшавіком У.Пралыгіным з Заходняга фронту, суадносіны сіл змяніліся на карысць бальшавікоў. 2 (15) лістапада 1917 г. уладу ў Мінску канчаткова ўзяў у свае рукі Ваенна-рэвалюцыйны камітэт (ВРК) Заходняй вобласці і Фронту, улада якога пашыралася на Мінскую губерню. Яго ўзначальвалі вядомыя бальшавікі К.І.Ландэр (старшыня), В.Г.Кнорын, А.Ф.Мяснікоў.Камітэт выратавання рэвалюцыі быў распушчаны. Яго старшыня Т.Калатухін і камісар Заходняга фронту У.Жданаў арыштаваны. З пасады галоўнакамандуючага Заходнім фронтам быў змешчаны генерал П.Балуеў.

У канцы кастрычніка — пачатку лістапада 1917 г. улада перайшла ў рукі Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў у Віцебску, Гомелі, Магілёве і ў іншых гарадах Беларусі. Непасрэднае кіраўніцтва пераходам улады да Саветаў ажыццяўлялі створаныя бальшавікамі ВРК, якія абапіраліся на салдат і рабочых.

Пасля звяржэння Часовага ўрада барацьбу з бальшавікамі ўзначаліла Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага рускай арміяй, якая размяшчалася ў Магілёве. Эсэра – меншавіцкае кіраўніцтва Магілёўскага Савета патрабавала ад бальшавікоў стварэння аднароднага сацыялістычнага ўрада, што магло б прывесці да супрацоўніцтва ўсіх дэмакратычны сіл як гарантыі супраць узнікнення грамадзянскай вайны. Бальшавікі ігнаравалі гэта патрабаванне. Прадстаўнікі кадэтаў, правых эсэраў, меншавікоў зрабілі спробу стварыць пры Стаўцы агульнарасійскі ўрад на чале з лідэрам эсэраў В.Чарновым. Стаўка прыняла рашэнне накіраваць войскі ў Петраград і Маскву на дапамогу керанска – красноўскаму мяцяжу.

Савецкі ўрад аб'явіў генерала М. М. Духоніна звергнутым з пасады выконваючага абавязкі

Вярхоўнага галоўнакамандуючага рускай арміяй. У Магілёў былі накіраваны бальшавіцкія ўзброеныя сілы. 19-20 лістапада (2-3 снежня) 1917 г. Стаўка была ліквідавана, а ўлада перайшла ў рукі ВРК. Вярхоўным галоўнакамандуючым быў прызначаны прапаршчык М. В. Крыленка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Хутка і бяскроўна на працягу 25 кастрычніка — 20 лістапада (7 лістапада — 3 снежня) 1917 г. адбыўся пераход улады да Саветаў на тэрыторыі Беларусі ў арміях Заходняга фронту. Многія салдаты, а гэта былі галоўным чынам сяляне, прызваныя ў армію, са спачуваннем сустрэлі першыя дэкрэты Савецкай улады аб міры і зямлі. Асноўная частка сялян падтрымала бальшавікоў у час кастрычніцкіх падзей таму, што разлічвала на атрыманне зямлі памешчыкаў без выкупу ў выніку ліквідацыі памешчыцкага землеўладання. Значная частка працоўных Беларусі і салдат Заходняга фронту спадзяваліся на тое, што бальшавікі створаць аднародны сацыялістычны ўрад з прадстаўнікоў усіх сацыялістычных партый (бальшавікоў, меншавікоў, эсэраў), які забяспечыць скліканне Устаноўчага сходу — парламента Расіі.

Пасля кастрычніцкіх падзей пачалося фарміраванне адзінай структуры органаў улады і кіравання. Яшчэ ў чэрвені 1917 г. была ўтворана Заходняя вобласць. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі яна стала адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай у складзе Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў. У красавіку 1918 г. у Заходнюю вобласць увайшла Смаленская губерня.

З 26 лістапада (9 снежня) 1917 г. і да 2 студзеня 1919 г. на тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, не акупіраванай германскімі войскамі часткі Віленскай, Смаленскай (з красавіка 1918 г.) губерняў дзейнічаў першы вышэйшы заканадаўчы орган Савецкай улады - Абласны выканаўчы камітэт рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (скарочана Аблвыкамзах). Адным з яго кіраўнікоў быў А. Ф. Мяснікоў (старшынёй быў бальшавік М.Рагазінскі). На практыцы Аблвыканкамзаху падпарадкоўваліся толькі органы Заходняга фронту і некаторыя Саветы Віленскай і Мінскай губерняў.

Аляксандр Фёдаравіч Мяснікоў (Мяснікян) (1886 — 1925) — актыўны ўдзельнік усталявання Савецкай улады ў Беларусі. 3 верасня 1917 г. старшыня Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б). Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі выбраны членам ВРК Заходняга фронту. Галоўнакамандуючы Заходнім фронтам у лістападзе 1917 г. Са студзеня і да канца 1918 г. — старшыня Аблвыкамзаха. Першы рэдактар газеты “Звязда”. У далейшым – старшыня ўрада БССР.

Для вырашэння найбольш важных пытанняў быў створаны Савет Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту.

СНК з'яўляўся выканаўчым органам Савецкай улады ў Беларусі. Першым яго кіраўніком быў К. І. Ландар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Карл Іванавіч Ландар (1883—1937) — удзельнік барацьбы за ўсталяванне Савецкай улады ў Беларусі. За рэвалюцыйную дзейнасць 8 разоў арыштоўваўся. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі член Мінскага і Паўночна-Заходняга камітэтаў РСДРП(б). Член ВРК Заходняга фронту па барацьбе з карнілаўшчынай. 3 верасня 1917 г. — старшыня Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У лістападзе 1917 — студзені 1918 г. — старшыня СНК Заходняй вобласці і фронту.

У склад Аблвыкамзаха ўваходзілі ў асноўным прадстаўнікі партыі бальшавікоў. Сярод кіраўніцтва Аблвыкамзаха і СНК Заходняй вобласці і фронту не было прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху.

Адным з першых мерапрыемстваў Савецкай улады стала правядзенне нацыяналізацыі прамысловасці. Уводзіўся 8-гадзінны рабочы дзень. Фабрычна-заводскія камітэты і прафсаюзы наладжвалі рабочы кантроль над вытворчасцю.

Савецкі ўрад вырашыў пачаць сепаратыўныя перамовы з Германіяй і Аўстра – Венгрыяй. 2 снежня 1917 г. было падпісана пагадненне аб перамір'і, а 9 снежня ў Брэст – Літоўску пачаліся мірныя перагаворы. Германская дэлегацыя адмовілася заключыць дэмакратычны мір і 10 лютага 1918 г. выставіла ўльтыматыўныя патрабаванні, згодна з якімі анексіравалася значная частка тэрыторыі Савецкай Расіі, у тым ліку большая частка Беларусі. Выкарыстаўшы адмову кіраўніка савецкай дэлегацыі Л.троцкага падпісаць мірны дагавор, германскае камандаванне 18 лютага 1918 г. пачало наступленне на Заходнім фронце. Германскія войскі захапілі больш за 2/3 тэрыторыі Беларусі. Фронт устанавіўся па лініі Полацк – Орша – Магілёў – Гомель.

3 сакавіка 1918 г. быў падпісаны мірны дагавор з Германіяй у Брэст – Літоўску (Брэсцкі мір)

Адбылася акупацыя гэтай тэрыторыі германскімі войскамі. Тут была ўстаноўлена ўлада германскай ваеннай адміністрацыі. Яна скасавала дэкрэты Савецкай улады, дазволіла дзейнасць нацыянальна-дэмакратычных партый. Былі адноўлены органы мясцовага самакіравання – гарадскія думы і земствы.

Акупанты перадалі фабрыкі і заводы іх былым уладальнікам. У выніку ўзрасла працягласць рабочага дня і зменшылася заработная плата. У вёсцы была адноўлена прыватная ўласнасць на зямлю. Памешчыкам вярталіся іх былыя зямельныя ўладанні. Некаторыя з памешчыкаў, вярнуўшыся ў свае маёнткі, пачалі спаганяць з сялян выплату за сабранае да акупацыі сена, высечаны лес. У практыку ўвайшлі рэквізіцыі — прымусовае адчужэнне маёмасці, прадуктаў харчавання, кармоў на патрэбы нямецкай арміі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Палітыка акупантаў адразу ж сутыкнулася з супраціўленнем насельніцтва. Найбольшую актыўнасць праяўлялі сяляне. Барацьбой супраць акупантаў кіравалі бальшавікі. У гэтую барацьбу ўключыліся беларускія эсэры і іншыя партыі. Бальшавікі дзейнічалі галоўным чынам ва_ўсходніх раёнах Беларусі. Яны выконвалі загад галоўнакамандуючага Заходнім фронтам А.Ф.Мяснікова аб стварэнні партызанскіх атрадаў у прыфрантавой паласе з мэтай аблегчыць становішча чырвоных войскаў. Беларускія эсэры таксама сталі на шлях арганізацыі сялянскіх дружын і партызанскіх атрадаў, асабліва ў Гродзенскай і Мінскай губернях.

Тэма 10.3 Барацьба за стварэнне беларускай дзяржаўнасці.

Ключавыя словы і паняцці: БНР, Устаўныя Граматы,БССР, Белнацкам,беларускі савецкі Урад,

План:

1. Змены ў палітычнай сітуацыі на Беларусі ў выніку новага нямецкага наступлення.
2. Абвяшчэнне БНР і яе Ўстаўныя граматы.
3. Раскол у беларускім нацыянальным руху.
4. Беларускае нацыянальнае пытанне ў дзейнасці бальшавіцкай партыі.
5. Ініцыятывы беларускіх савецкіх дзеячоў па стварэнню беларускай дзяржаўнасці.
6. Утварэнне БССР
7. Першы савецкі Урад і яго дзейнасць.

Ва ўмовах наступлення германскіх войскаў кіраўнікі Аблвыкамзаха ў ноч на 19 лютага 1918 г. пакінулі Мінск.

Уладу ўзяў у свае рукі Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда. 21 лютага 1918 г**.** ён звярнуўся да народа Беларусі з Першай Устаўной граматай, у якой абвясціў сябе *часовай уладай на тэрыторыі Беларусі і абавязваўся склікаць Усебеларускі Устаноўчы з'езд*. Да адкрыцця з'езду выканаўчыя функцыі новай улады ўскладваліся на Народны сакратарыят (урад). У грамаце абвяшчалася права беларускага народа, як і іншых народаў, на самавызначэнне.

У той жа дзень, 21 лютага 1918 г., у Мінск увайшлі германскія войскі. Нямецкія салдаты занялі будынак, дзе размяшчаўся Народны Сакратарыят (урад), створаны Выканкомам Рады Усебеларускага з'езда.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У пачатку сакавіка 1918 г**.** войскі Чырвонай Арміі спынілі наступленне германскіх войскаў, якія акупіравалі больш за 2/3 тэрыторыі Беларусі.

3 сакавіка 1918 г**.** у выніку мірных перагавораў у Брэст-Літоўску (цяперашні Брэст) паміж Савецкай Расіяй, з аднаго боку, і Германіяй, Аўстра-Венгрыяй, Балгарыяй, Турцыяй — з другога быў заключаны мірны дагавор.

Тэрыторыя Беларусі была падзелена па лініі Дзвінск — Свянцяны — Ліда — Пружаны — Брэст. Паводле ўмоў дагавора заходняя частка Беларусі (Гродзенская і частка Віленскай губерні) далучалася да этнічнай Літвы. Цэнтральная частка (Мінская і часткі Віцебскай і Магілёўскай губерняў) абвяшчалася акупіраванай тэрыторыяй. Усходнія раёны Беларусі заставаліся ў складзе Савецкай Расіі.

Брэсцкі мірны дагавор фармальна завяршыў удзел Расіі ў Першай сусветнай вайне. Савецкая ўлада атрымала перадышку, неабходную для свайго замацавання. У лістападзе 1918 г., пасля паражэння аўстра-германскага блока ў Першай сусветнай вайне і перамогі лістападаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў Германіі, Савецкі ўрад скасаваў Брэсцкі мір. 10 снежня Чырвоная Армія заняла Мінск. Да сярэдзіны лютага 1919 г. Савецкая ўлада зноў усталявалася амаль на ўсей тэрыторыі Беларусі.

9 сакавіка 1918 г. Выканком Рады Усебеларускага з'езда прыняў Другую Устаўную грамату, у якой абвяшчаліся стварэнне на этнічнай тэрыторыі Беларусі Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), дэмакратычныя свабоды, роўнасць моў народаў Беларусі, скасаванне прыватнай уласнасці на зямлю і перадача яе без выкупу сялянам, 8-гадзінны рабочы дзень.

Рада Усебеларускага з'езда, пераўтвораная ў Раду БНР, Прэзідыум Рады ўзначаліў І.Серада. 19 сакавіка Рада БНР прыняла закон “Аб вярхоўнай уладзе Беларускай Народнай Рэспублікі”, які замацоўваў за ёй функцыі заканадаўчага органа.

у Трэцяй Устаўной грамаце 25 сакавіка 1918 г. *абвясціла незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі*. *11 кастрычніка 1918 г*. Рада зацвердзіла *часовую канстытуцыю рэспублікі,* якой узаконіла наступныя сімвалы БНР: герб «Пагоня» і бела-чырвона-белы сцяг.

Сярод ініцыятараў абвяшчэння БНР былі А. І. Луцкевіч і А. А. Смоліч.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі прэтэндавала быць заканадаўчым органам (да склікання Устаноўчага з’езда). Выканаўчым органам улады павінен быў стаць Народны сакратарыят (урад).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Антон Іванавіч Луцкевіч (1884—1946) — палітычны і грамадскі дзеяч. Разам з братам Іванам быў сярод заснавальнікаў БСГ. З'яўляўся ініцыятарам стварэння газеты «Наша Ніва» і першага нацыянальнага музея ў Вільні. Па яго прапанове 25 сакавіка 1918 г. была абвешчана незалежнасць БНР. У 1918 – 1920 гг. з'яўляўся Старшынёй Рады Міністраў і Міністрам замежных спраў БНР. Пасля далучэння Заходняй Беларусі да Польшчы жыў у Вільні, дзе выкладаў беларуску літаратуру ў беларускай гімназіі. Двойчы арыштоўваўся польскімі ўладамі. Пасля аднаго з такіх арыштаў яго жонка застрэлілася не дачакаўшыся мужа. У 1939 г. пасля далучэння да БССР зямель Заходняй Беларусі быў арыштаваны савецкімі ўладамі. Загінуў у лагерах.

Аркадзь Антонавіч Смоліч (1891 — 1938) — удзельнік Усебеларускага з'езда. Паводле яго даклада была прынята Трэцяя Устаўная грамата. Аўтар першага падручніка «Геаграфія Беларусі», выдадзенага ў 1919 г. Першы беларускі прафесар геаграфіі. У 1921 г. стаў адным з заснавальнікаў Таварыства беларускай школы. У 1930 г. арыштаваны арганамі НКУС. У 1938 г. – расстраляны.

Абвяшчэнне БНР адбылося ва ўмовах германскай акупацыі. Германская ваенная адміністрацыя не перашкаджала Радзе БНР займацца культурна-асветніцкай і эканамічнай дзейнасцю. Выдаваліся падручнікі, адчыняліся беларускія школы. Быў створаны педагагічны інстытут, арганізавана Беларуская гандлёвая палата.

Частка дзеячаў БНР разлічвала на афіцыйнае прызнанне Германіяй незалежнасці рэспублікі. Яны накіравалі на імя германскага кайзера Вільгельма тэлеграму, спадзеючыся на яго дапамогу, аднак гэтага не адбылося. Такі крок не мог знайсці падтрымкі ў беларускага народа, які лічыў германскі акупацыйны рэжым варожым. Не падтрымалі тэлеграму і некаторыя дзеячы ўрада БНР, ён стаў распадацца.

Тэлеграма на імя германскага кайзера з надзеяй на афіцыйнае прызнанне Германіяй БНР выклікала раскол БСГ. У выніку расколу ўтварыліся партыі, сярод якіх — Беларуская партыя сацыялістаў - рэвалюцыянераў (беларускія эсэры), Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя і інш.

На пасланыя ў Берлін тры граматы БНР з просьбай прызнаць яе, рэйхсканцлер адказаў, што Берлін разглядае Беларусь як частку Расіі, што, згодна Брэсцкаму дагавору, Германія не можа без урада Леніна прызнаць беларускую дзяржаву.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Савецкі ўрад заняў выключна адмоўную пазіцыю да БНР. У Дэкларацыі “Да беларускіх рабочых і сялян”, прынятай 14 красавіка 1918 г. на II з’ездзе Саветаў Заходняй вобласці, Рада вызначалася як контррэвалюцыйная, а яе кіраўнікі – як ворагі савецкай сацыялістычнай улады.

Абвяшчэнне незалежнасці БНР было заканамерным вынікам дзейнасці лідэраў беларускіх палітычных партый. БНР з'явілася толькі зародкам дзяржаўнага ўтварэння і не была падтрымана большасцю насельніцтва Беларусі. Ідэя стварэння беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах германскай акупацыі засталася фактычна няздзейсненай.

У кіраўніцтве Расійскай Камуністычнай партыі (бальшавікоў) панавала думка, што чалавецтва знаходзіцца напярэдадні сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Таму самавызначэнне нацый і стварэнне самастойных рэспублік разглядаліся як непатрэбныя. Аднак надзеі на пралетарскія рэвалюцыі ў Польшчы і ў Германіі не спраўдзіліся. У Беларусі актывізаваўся рух за самавызначэнне, які ўвасобіўся ў абвяшчэнні БНР. Гэтыя фактары прымусілі бальшавіцкае кіраўніцтва прыняць рашэнне аб стварэнні беларускай дзяржавы на савецкай аснове.

24 снежня 1918 г. ЦК РКП(б) пад уплывам У.І.Леніна, які прызнаваў за беларускім народам права на нацыянальнае самавызначэнне і самастойнае дзяржаўнае існаванне, выказаўся за неабходнасць стварэння Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі. На наступны дзень у мэтах правядзення ў жыццё дадзенай пастановы адбылася нарада ў І.В.Сталіна, які ў той час займаў пасаду Народнага камісара па справах нацыянальнасцей.

У пратаколе нарады адзначалася, што з прычыны «існуючых сучасных міжнародных адносінаў у мэтах умацавання і пашырэння заваёў сацыялістычнай рэвалюцыі ў сусветным маштабе ў сучасны момант цалкам наспела неабходнасць абвяшчэння Беларусі як самастойнай ва ўсіх адносінах нацыі незалежнай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі».

На нарадзе прысутнічалі прадстаўнікі Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкома), створанага ў пачатку 1918 г. (на чале яго да мая 1918 г. быў А. Р. Чарвякоў). Былі запрошаны таксама беларусы-камуністы, якія ў 1918—1919 гг. аб'ядналіся ў беларускія секцыі РКП(б). У іх кіраўніцтва ўваходзіў З.Х.Жылуновіч (Ц. Гартны).

Белнацком выступіў за пераўтварэнне Заходняй вобласці, якая ўзнікла ў ходзе кастрычніцкіх падзей, у аўтаномную рэспубліку ў складзе РСФСР.

Прапанову Белнацкому падтрымалі секцыі РКП (б), якія аб’ядноўвалі беларусаў – камуністаў на чале з З.Жылуновічам. Аднак Аблвыканкомзах адхілілі яе, даўшы вобласці назву “Заходняя камуна”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

30 снежня 1918 г**.** у Смаленску, які ў сувязі з германскай акупацыяй стаў цэнтрам Заходняй вобласці, была склікана VI Паўночна - Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б). Прыняла рэзалюцыю “Аб абвяшчэнні Заходняй Камуны Беларускай Савецкай Рэспублікай”. Канферэнцыя прыняла рашэнне аб перайменаванні яе ў I з'езд Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі — КП(б)Б. Быў сфарміраваны Часовы рабоча-сялянскі савецкі ўрад Беларусі на чале з Жылуновічам.

1 студзеня 1919 г. быў абнародаваны Маніфест гэтага ўрада, якім абвяшчалася ўтварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ).

Напярэдадні склікання канферэнцыі І. В. Сталін у тэлеграме на імя старшыні Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б) А. Ф. Мяснікова папярэджваў: «Сёння выязджаюць у Смаленск беларусы: вязуць з сабою маніфест. Просьба ЦК партыі і Леніна прыняць іх, як малодшых братоў, можа быць яшчэ нявопытных, але гатовых аддаць сваё жыццё партыйнай, савецкай рабоце».

Першым старшынёй урада ССРБ стаў аўтар Маніфеста З. Х. Жылуновіч, а ў склад урада ССРБ увайшоў А. Р. Чарвякоў.

Зміцер Хведаравіч Жылуновіч (Ц. Гартны; 1887—1937) -- ініцыятар стварэння ССРБ, аўтар Маніфеста Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі, першы старшыня ўрада ССРБ. Пазней рэдактар часопіса «Полымя», дырэктар Дзяржаўнага выдавецтва БССР, акадэмік. Аўтар першага беларускага сацыяльнага рамана «Сокі цаліны». У 1937 г. быў арыштаваны, памёр у псіхіатрычнай лячэбніцы, не вытрымаўшы здзекаў.

Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў (1892—1937) пасля заканчэння Віленскага настаўніцкага інстытута працаваў народным настаўнікам. Менавіта ў гэты час вызначыў мэту свайго жыцця: «Трэба аддаць усе сілы служэнню беднаму народу». Удзельнік Усебеларускага з'езда. Камісар Белнацкома. Удзельнік I з'езда Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Яго подпіс стаіць пад Маніфестам аб стварэнні ССРБ. У 1922 г. удзельнічаў у рабоце па ўтварэнні СССР. Народны камісар асветы ва ўрадзе ССРБ, старшыня Савета Народных Камісараў ССРБ, старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР. У далейшым — актыўны прыхільнік палітыкі беларусізацыі. У 1937 г. не вытрымаўшы ілжывых абвінавачванняў, пакончыў жыццё самагубствам.

У Маніфесце Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі абвяшчалася ўключэнне ў склад ССРБ тэрыторый Мінскай, Гродзенскай,

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Віцебскай, Магілёўскай (куды ўваходзіў тады Гомель), а таксама часткі Смаленскай, Віленскай, Ковенскай і Чарнігаўскай губерняў. Уся ўлада ў Беларусі аб'яўлялася толькі за Саветамі рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, адсюль і вызначэнне асновы беларускай дзяржавы як савецкай.

5 студзеня 1919 г. Часовы ўрад ССРБ са Смаленска пераехаў у вызвалены ад немцаў Мінск, які стаў сталіцай ССРБ.

16 студзеня 1919 г. бальшавіцкае кіраўніцтва ў Маскве прыняло *рашэнне аб далучэнні да РСФСР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў ССРБ і аб'яднанні Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік Літвы і Беларусі***.** Тым самым прадугледжвалася стварыць Літоўска - Беларускую ССР.

2—3 лютага 1919 г. у Мінску адбыўся I Усебеларускі з'езд Саветаў, на якім была прынята першая Канстытуцыя ССРБ. Старшыня Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Я. М. Свярдлоў абвясціў пастанову «Аб прызнанні незалежнасці Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі». Быў зацверджаны герб і сцяг. Тады ж было вырашана пытанне аб стварэнні Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі (скарочана Літбел). Яе тэрыторыя служыла пагранічнай зонай паміж Польшчай і Савецкай Расіяй. Аб'яднаную рэспубліку бальшавікі імкнуліся выкарыстаць для адмежавання РСФСР ад Польшчы з мэтай прадухілення адкрытай вайны з ёю.

27 лютага 1919 г. быў створаны ЦВК ЛітБел і яго Прэзідыум на чале з К.Цыхоўскім і ўрад аб’яднанай рэспублікі – Савет Народных Камісараў (СНК) на чале з В.Міцкявічусам – Капсукасам. У склад ЛітБел увайшла тэрыторыя Мінскай, Гродзенскай, Віленскай, ковенскай і частка Сувалкаўскай губерняў. Сталіца – г. Вільня.

Так ССРБ праз месяц пасля свайго ўтварэння стала часткай аб'яднанай дзяржавы. А Літбел фактычна спыніла сваё існаванне ў пачатку верасня 1919 г. у сувязі з захопам яе тэрыторыі польскімі войскамі.Ва ўрад ЛітБел беларусы не ўвайшлі. На яе тэрыторыі не было самастойных беларускіх устаноў. Ужо праз паўгода гэта дзяржава перастала існаваць.

Такім чынам, вынікам фарміравання беларускай дзяржаўнасці сталі стварэнне ССРБ і Літоўска-Беларускай ССР.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма 11.1 Савецкая Беларусь у 1921 – 1939 гг.

Ключавыя словы і паняцці: ваенны камунізм, новая эканамічная палітыка (НЭП), індустрыялізацыя, калектывізацыя, беларусізацыя, рэпрэсіі, эміграцыя.

План

1. Мэты польска-савецкай вайны 1919 – 1920 гг.
2. Ваенныя падзеі на тэрыторыі Беларусі.
3. Другое абвяшчэнне БССР.
4. Рыжскі мір і яго вынікі для Беларусі.
5. Неабходнасць пераходa да новай эканамічнай палітыкі, яе сутнасць і змест.
6. Асаблівасці становішча Беларусі у пачатку 1920-х гадоў.
7. Узбуйненне тэрыторыі БССР
8. Асноўныя мерапрыемствы НЭПа ў прамысловасці і іх вынікі.
9. Развіццё прамысловасці БССР у гады першых пяцігодак: асаблівасці і вынікі.
10. Стан сельскай гаспадаркі Беларусі ў пачатку 20-х гадоў.
11.Мерапрыемствы НЭПа па аднаўленню сельскай гаспадаркі.
12. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі Беларусі. 1
13. Асноўныя тэндэнцыі і праявы грамадска-палітычнага жыцця Беларуі у перыяд НЭПа.
14. Змены ў грамадска-палітычным жыцці савецкай Беларусі ў канцы 1920 – пачатку 1930-х гадоў.
15. Рэпрэсіі 20 – 30-х гг. на Беларусі.
16. Развіццё асветы і адукацыі.
17. Мерапрыемствы па развіццю навукі.
18. Стан культуры і ўмовы яе развіцця ў Савецкай Беларусі
19. Беларускае замежжа ў міжваенны перыяд.
20. Адносіны паміж беларускім замежжам і Савецкай Беларуссю.
21. Палітычнае і культурнае жыццё беларускай эміграцыі.

14 лютага 1919 г. адбылася першыя польска-савецкія сутычка ля Бярозы Картузкай, якая і паклала пачатак вайне. Знясіленая грамадзянскай вайной Чырвоная Армія не магла аказаць добра ўзброенаму польскаму войску сур’ёзнага супраціўлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Таму наступленне палякаў на Беларусі ажыццяўлялася паспяхова. 19 красавіка 1919 г. польскія войсковыя злучэнні, у складзе якіх былі дзве беларуска-польскія дывізіі, захапілі Вільню. Урад Літ-Бела пераехаў у Мінск. Амаль адначасова (28 красавіка) палякі ўвайшлі ў Гродна і ліквідавалі там уладу ўрада БНР. Збіраючыся ў паход на Міншчыну, Віцебшчыну і Магілёўшчыну, Юзаф Пілсудскі шырока абвясціў жыхарам былога Вялікага Княства Літоўскага, што польскі меч нясе ім волю і дабрабыт. Гэта падрыхтавала прыхільную сустрэчу польскіх войск на беларускіх тэрыторыях.

8 жніўня Мінск ужо знаходзіўся ў руках польскага генерала Станіслава Шаптыцкага. Польскае войска прасунулася да р.Бярэзіны (на лінію Любань—Барысаў—Полацк—Дзвінск) і тут фронт стабілізаваўся да вясны 1920 г. Большасць беларускіх земляў трапіла пад польскую акупацыю. Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялітычная Рэспубліка перастала існаваць. Афіцыйнага акту яе самаліквідацыі не было. Кіраўніцтва Літ-Бел перабралася ў Смаленск, дзе нейкі час знаходзілася пры штабе Заходняга фронту разам з ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі. Ленінскі ўрад разглядаў былую Літ-Бел, занятую польскімі войскамі, як тэрыторыю Савецкай Расіі. БССР і Літ-Бел узору 1919 г. стаялі ўбаку ад магістральнай лініі нацыянальнага развіцця Беларусі, а таму бясслаўна і зніклі. У сакавіку 1920 г. наступленне палякаў узнавілася, і яны пры падтрымцы ўкраінцаў дайшлі да Дняпра. З поўдня націскаў Антон Дзянікін. Узнікла пагроза Маскве.

14 мая 1920 г. Чырвоная Армія перайшла ў наступленне, якое аднак хутка захлібнулася. Затое ў ліпені поспех спадарожнічаў чырвонаармейцам. Праводзілася шырокая мабілізацыя, ствараліся загараджальныя атрады для расстрэлу дызерціраў. Бальшавікі так і не адважыліся стварыць у Чырвонай Арміі беларускія вайсковыя фарміраванні. З 200 тыс. чалавек, мабілізаваных летам 1919 г. на беларускіх землях, на Заходні фронт было адпраўлена толькі 40 тыс. Затое масава прыцягваліся ў Беларусь вайсковыя злучэнні латышскіх чырвоных стралкоў. Малады камандуючы Заходнім фронтам Міхаіл Тухачэўскі, выхадзец з беларускай смаленскай шляхты, трымаў курс на Варшаву, каб распаўсюдзіць і на Еўропу ідэі сацыялізму. Адступленне польскага войска суправаджалася масавым марадзёрствам цывільнага насельніцтва. 11 ліпеня Чырвоная Армія захапіла Мінск, а да сярэдзіны жніўня падыйшла да подступаў Варшавы. 16 жніўня войска польскае змагло перайсці ў контрнаступленне.. У выніку контрнаступлення Мінск зноў на нейкі час (15-17 кастрычніка) перайшоў у рукі пальскіх улад. Дзесяткі тысяч

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

палонных чырвонаармейцаў, у тым ліку і беларусаў, гінулі ад голаду і хвароб.

31 ліпеня 1920 г., пасля вызвалення Мінска ад палякаў, была апублікавана Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (ССРБ). Яе тэрыторыя не мела пэўных межаў і складалася недзе з 18 паветаў пераважна Мінскай губерні. Функцыі савецкага часовага Урада выконваў Ваенна-рэвалюцыйны камітэт на чале з Аляксандрам Чарвяковым, створаны на аснове былога Мінскага ваеннага рэвалюцыйнага камітэта. У склад гэтай установы ўвайшлі лідэры беларускіх эсэраў і бундаўцаў. Беларускія эсэры патрабавалі стварэння ўрада з прадстаўнікоў усіх сацыялістычных партый, арганізацыі самастойнага Беларускага войска і абвяшчэння поўнай незалежнасці Беларусі. Але Дэкларацыя толькі паўтарала Маніфест ўрада Зміцера Жылуновіча ад 1 студзеня 1919 г. Таму эсэры яе і не падпісалі.

18 сакавіка 1921 г. у Рызе быў подпісаны мірный дагавор паміж РСФСР і УССР (БССР делегіравала свое правы дэлегацыі РСФСР), з аднаго боку, і Польшай. Савецка-польская мяжа праходзіла знача ўсходей “лініі Керзона”; да Польшчы адыходзілі заходнія землі Беларусі. Такое становішча падзяліла тэрыторыю Беларусі амаль на два дзесяцігоддзя.

Пасля заканчэння вайны пачаўся цяжкі пераход да мірнага жыцця.Разбурэнні, беспрацоўе, неабдуманае ўсеагульнае адзяржаўленне сродкаў вытворчасці, харчразвёрстка выклікалі незадаволенасць народа, асабліва сялянства.Прычынай цяжкага эканамічнага і палітычнага крызісу на рубяжы 1920–1921 гг. было разбалансаванне палітычных і эканамічных інтарэсаў. З’явілася новая эканамічная палітыка, распрацаваная У. Леніным і прынятая X з’ездам РКП(б) у сакавіку 1921 г.

Сутнасць нэпа зводзілася да максімальнага пад’ёму вытворчых сіл і паляпшэння становішча рабочых і сялян дзеля захавання савецкай улады. Галоўным сродкам нэпа стала замена харчразвёрсткі харчовым падаткам. Сялянам дазвалялася здаваць зямлю ў арэнду і выкарыстоўваць наёмную працу пры ўмове, што члены сям’і наймальніка таксама працуюць. У гады нэпа ажыццяўляліся тры віды гандлю: прыватны, кааператыўны і дзяржаўны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дзяржбанк ў канцы 1922 г. выпусціў новыя грашовыя знакі – чырвонцы.Былі адменены ўсе абмежаванні на сумы ўкладаў, якія маглі захоўваць грамадзяне і арганізацыі ў ашчадных банках. Дзяржава стала падтрымліваць дробныя і сярэднія прыватныя і кааператыўныя прадпрыемствы. Дазвалялася арэнда прамысловых прадпрыемстваў іншаземнымі фірмамі ў форме канцэсій. Радыкальныя змены адбыліся ў кіраванні дзяржаўнай прамысловасцю.Узнаўлялася грашовая аплата працы.Заняпаўшая ў гады вайны і рэвалюцыйных пераўтварэнняў эканоміка Беларусі з пераходам да нэпа пачала адраджацца. Аднак поспехі першых гадоў нэпа прынеслі і вялікія эканамічныя праблемы. Яны былі выкліканы крызісам збыту, які ўзнік у выніку няправільнай цэнавай палітыкі дзяржавы, вялікай розніцы паміж коштам прамысловых і сельскагаспадарчых тавараў. Разыходжанне ў цэнах прывяло да таго, што селянін за прададзеную прадукцыю мог набыць прамтавараў у параўнанні з даваенным часам у 7 разоў менш. Крызіс збыту абвастрыў фінансавую праблему.У ходзе пераадолення крызісу прымаліся меры па зніжэнні сабекошту прамысловай прадукцыі, цэн на тавары, скарачэнні накладных расходаў, удасканальвалася дзейнасць кіруючага апарату і інш. У выніку павысілася рэнтабельнасць прадпрыемстваў, узніклі ўмовы для зніжэння цэн на прамысловыя тавары. Хуткаму аднаўленню прамысловай вытворчасці садзейнічала не толькі новая эканамічная палітыка, але і творчая ініцыятыва рабочых, укараненне прагрэсіўных метадаў працы. Правядзенне ў жыццё новай эканамічнай палітыкі дазволіла ў кароткі тэрмін аднавіць прамысловасць, стабілізаваць эканоміку У 1927г. аб'ём валавай прадукцыі індустрыі БССР перавысіу даваенны уз-ровень. На долю дзяржаунай прамысловасці прыходзілася амаль 3/4 усёй прамысловай прадукцыі. Палепшыліся у параунанні з даваеннымі, умовы працы і быту, павысіуся жыццёвы узровень. Паднялася вытворчая і грамадска-палітычная актыўнасць рабочых.

За годы НЭПа белорусская деревня окрепла, число бедняков сократилось до 30%. Уже в 1926 году был превышен на 12% сбор зерновых

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

довоенного уровня. В середине 20-х годов в БССР имелось свыше 776 тыс. крестьянских хозяйств. Экономические связи между собой и предприятиями они в основном осуществляли через рынок. Вот почему в первую очередь возникла потребность в объединениях, обеспечивающих сбыт, закупку промышленных товаров, кредитование хозяйств - кооперация. В 1927 году в республике различными формами кооперацией было охвачено более 60% всех крестьянских хозяйств. Появилась и производственная кооперация - ТОЗы, колхозы. Однако эта форма кооперации в республике была незначительна (около 4% всех хозяйств) из-за нерентабельности (в основном бедняки) и отсутствия традиций .Чтобы найти средства для проведения «сверхиндустриализации», были снижены закупочные цены на сельхозпродукцию, что вызвало нежелание крестьян продавать хлеб по низкой цене. Возник так называемый «хлебный кризис» 1928 - 1929 гг. В нем обвинили зажиточных крестьян. Начались использоваться меры насильственного изъятия зерна. Колхозная система рассматривалась советским руководством как удобная форма контроля и выкачивания хлебных и сырьевых ресурсов из деревни, поэтому с 1929 года набирает силу процесс форсированной коллективизации. Все шире применялись силовые методы. В экономическом плане это «прогрессивный» налог на кулака и единоличника. А в административном плане - это арест, высылка. Наиболее эффективным из последних следует считать «раскулачивание» (любой крестьянин, не пожелавший вступить в колхоз, мог быть объявлен кулаком). Следует заметить, что к кулакам в БССР относили примерно 4,2% крестьянских хозяйств, а раскулаченных было до 15% по отдельным кругам. Это 75,5 тыс. всех крестьянских хозяйств.

К 1марта 1930 г. было коллективизировано 58 % всех хозяйств. Нарастание скрытного, а порой и явного сопротивления (только в 1930г.было 500 открытых выступлений) заставило советское руководство вернуться к принципу добровольности. Итог: в колхозах осталось только 11% всех хозяйств С осени 1930 г. путём усиления административного и налогового

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

давления (высокие налоги на единоличника, порой более дохода с индивидуального участка, аресты и угрозы, товарная блокада деревень, активная агитация) процесс коллективизации ускорялся. В 1934 г. в колхозах оказалось 75% всех крестьянских хозяйств. В БССР были репрессированы более 300 тыс.крестьян, выселено (переселено) 700 тысяч
За годы второй пятилетки коллективизация в основном была завершена. Перед Великой Отечественной войной социалистический сектор охватывал 99% крестьянских дворов. На один колхоз приходилось 75 дворов, 285 га. пашни, 75 голов КРС. Колхозы превратились в основного поставщика сельхозпродуктов и сырья. Несколько выросла урожайность зерновых- до 6,9 ц. с га,но не восстановлено довоенное поголовье скота. От проведения коллективизации выиграл город. С 1935 г. отменена карточная система. Ускоренными темпами осуществляется индустриализация.

В межвоенный период (20 - 30 гг) общественно-политическая жизнь в республики, как и во всей Советской стране в целом, была полна противоречий, тесно связанных с социально-экономическими процессами, которые происходили в те годы: трудовой энтузиазм сочетался с его страхом перед беззаконием; стремление сроить социализм и лишения; обращение к народу и рост бюрократизма. В условиях НЭПа (до конца 20-ых годов) в республике наблюдался общественно-политический подъём: 1) повсеместно отмечался яркий оптимизм в успехе социалистического строительства; 2) рассширилась компетенция Советов как органов власти, активно вовлекались трудящиеся в работу местных Советов; 3) проводилась административно-территориальная реформа; 4) в 1927 г. принята новая Конституция БССР, провозгласившая курс на демократизацию; 5) процесс образования СССР; 6) политическая амнистия 1923 года. В целом в середине 20-ых годов в общественно-политической жизни существовали и боролись две тенденции - курс на демократизацию в условиях НЭПа и продолжение курса политики военного коммунизма, тенденция монополизации КПБ всей политической жизни.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

С победой сталинской линии в ВКП(б) в общественно-политической жизни республики с конца 20-х годов произошли коренные изменения. Все шире применялись политические репрессии к тем, кто не был согласен с линией компартии. Грубые нарушения прав человека объяснялись сталинской теорией об обострении классовой борьбы по мере движения к социализму. Это положение вождя стало теоритической базой массовых необоснованных репрессий.

В Беларуси политические репрессии начались уже в конце 20-ых годов. По обвинению в так называемом национал-демократизме начинается процесс уничтожения национальной творческой интеллигенции. Потом очередь дошла до всех участников в белорусском национальном движении. В1930-31 гг - дело о "нацдемовской контрреволюционной организации". Потом процессы над участниками исторических "Объединённого антисоветского подполья", "Белорусской народной грамады". Шёл постоянный процесс поиска "врагов"и "вредителей". В БССР до войны было репрессировано примерно 250 тысяч человек.

Значнай з'явай грамадска-палітычнага і культурнага жыцця савецкай Беларусі ў 1920-я гадыў стала палітыка нацыянальна-культурнага адраджэння – палітыка “беларусізацыі”.

Разглядаючы перадумовы палітыкі беларусізацыі, неабходна мець на ўвазе асаблівасці нацыянальных адносін на Беларусі на пачатку 20-х гадоў. Па-першае, ішоў працэс тэрытарэяльнага самавызначэння беларускага народа, беларускай нацыі. (У 1924 г. адбылося вяртанне, перадача БССР 16 паветаў і ў 1926 г. - яшчэ 2-х паветаў).Па-дургое, паводле перапісу 1926 г. Сярод насельніцтва БССР беларусы складалі 80,6 %, яўрэі – 8,2 %, рускія – 7,7 %, палякі – 2 %, украінцы – 0,7 %, латышы – 0,3 %, літоўцы, немцы і татары – па 0,1 % . Па-трэцяе, палітыка беларускага адраджэння ва ўмовах савецкай улады пачала ўжыццяўляцца раней афіцыйна абвешчанай беларусізацыі перш за ўсе намаганнямі дзеячаў нацыянальна-дэмакратычнага руху. Намаганнямі вядомых дзеячаў беларускага нацыянальнага адраджэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

закладваліся асновы нацыянальнай палітыкі, якая пазней была аформлена як дзяржаўная палітыка беларусізацыі.

З сярэдзіны 1923 г. да сярэдзіны 1924 г. працыс беларусізацыі прайшоў першую фазу, на працягу якой вялася ў асноўным яе палітычная і ідэалагічная падрыхтоўка. Лета 1924 г. і прыкладна да 1928 г. – час актыўнай практычнай рэалізацыі вызначаных напрамкаў дзейнасці ў палітыкі беларусізацыі.

1) Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа праведзена ў 1926—1929 гг. пасля таго, як адбылося вяртанне БССР значнай часткі этніцна беларускіх зямель. У складзе БССР губерні, паветы, вобласці былі ліквідаваны і замест іх утвораны акругі, раены і сельсаветы. У аснову новаўтварэнняў пакладзены нацыянальны прынцып.

2) Адным за напрамкаў нацыянальнай палітыкі з`яўлялася беларусізацыя дзяржаўных устаноў, грамадскіх арганізацый, якая мела на мэце вывучэнне супрацоўнікамі беларускай мовы і перавод на яе справаводства.

3) У ходзе бларусізацыі вырашалася задача больш актыўнага вылучэння на кіруючыя пасады прадстаўнікоў карэннага (не толькі беларускага) насельніцтва.

4) Палітыка беларусізацыі закранула і войска. У 1923—1925 гг. праводзілася ваенная рэформа. 5) Важны напрамак беларусізацыі – нацыянальна-культурнае будаўніцтва.

Значныя змены адбыліся ў агульнаадукацыйнай школе: калі ў 1921 г. беларускія школы складалі 21,5 % ад агульнага ліку школ на беларусі, то ў 1931 г. – 83,5 %. У 1930 г. 76,6 % студэнтаў вышэйшай школы рэспублікі былі беларусамі, выкладанне больш за 80 % вучэбных дысцыплін вялося на беларускай мове. 6) У беларускай акадэміі навук працавалі нацыянальныя сектары – яўрэйскі, польскі, латышскі, а таксама камісія па вывучэнні Заходняй Беларусі, сектар масавай работы і краязнаўства. Сярод навуковых супрацоўнікаў акадэміі ў пачатку 30-х гадоў колькасць беларусаў складала 45 %. 7) У 1924 г. Было заснавана Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

8) Значных поспехаў у гады правядзення палітыкі беларусізацыі дасягнулі беларуская літаратура, нацыянальны беларускі тэатр, музыка, жывапіс.

У комплексе праблем культурнага будаўніцтва важнае месца займала ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва. Была створана Рэспубліканская надзвычайная камісія па ліквідацыі непісьменнасці. Але ў канцы 30-х гадоў частка дарослага насельніцтва рэспублікі, асабліва на вёсцы і сярод жанчын, яшчэ заставалася неахопленай навучаннем. Разам з ліквідацыяй непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва праводзілася вялікая работа па стварэнні сістэмы народнай адукацыі. Да сярэдзіны 20-х гадоў такая сістэма адукацыі была створана і складалася з наступных частак: 1) дашкольных устаноў; 2) масавых чатырохгадовых працоўных школ; 3) сямігадовых працоўных політэхнічных школ; 4) школ сялянскай моладзі; 5) рабфакаў; 6) тэхнікумаў; 7) вышэйшых навучальных устаноў. Асаблівая ўвага надавалася ўвядзенню ўсеагульнага абавязковага навучання дзяцей. Значнае развіццё атрымала сярэдняя спецыяльная адукацыя. Кадры кваліфікаваных рабочых рыхтаваліся ў прафесійных школах. 20-я гады сталі часам нараджэння беларускай савецкай навукі. Вучоныя займаліся даследаваннем рэсурсаў, праблемы прыкладнога характару. Праводзіліся даследаванні і ў галіне гуманітарных навук. Развіццё літаратуры і мастацтва адбывалася ў складаных умовах. Беларуская паэзія вітала рэвалюцыю. Для яе характэрны былі аптымізм, дух змагання за новае жыццё. Гэта быў час агульнага духоўнага ўздыму, час надзей, веры і мар. У другой палове 20-х гадоў развіццё беларускай савецкай літаратуры адбывалася ў вострай барацьбе ідэйна-эстэтычных тэндэнцый, розных літаратурных груповак. У 30-я гады завяршыўся працэс стварэння адзінай пісьменніцкай арганізацыі Беларусі. У вострай барацьбе розных мастацкіх школ і плыняў стваралася беларускае савецкае тэатральнае, музычнае і выяўленчае мастацтва. У сярэдзіне 20-х гадоў першыя поспехі былі дасягнуты ў развіцці беларускага музычнага

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

мастацтва, у якім усё яшчэ пераважала самадзейная творчасць музычных, харавых і танцавальных калектываў. Значны крок наперад зрабіла музычнае мастацтва ў 30-я гады. Паспяхова развівалася кінамастацтва. Ствараліся дакументальныя і мастацкія фільмы, кінахроніка. Дасягненні ў сферы культурнай дзейнасці сведчаць аб сапраўдным ажыццяўленні культурнай рэвалюцыі ў рэспубліцы. У 20–30-я гады паспяхова развіваліся жывапіс, скульптура, архітэктура. 20-я гады ў гісторыі беларускага жывапісу былі часам збірання творчых сіл, першых спроб засваення новай тэматыкі, актыўнага ўкаранення мастацтва ў жыццё шырокіх пластоў народа.У 30-я гады мастацтва Беларусі ўзбагачалася новымі тэмамі і вобразамі. Буйной падзеяй у культурным жыцці стаў Першы з'езд мастакоў Беларусі, які адбыўся 6 снежня 1938 г. у Мінску. Багатыя і цікавыя традыцыі мае беларуская графіка.У 20–30-я гады шэраг манументальных помнікаў стварылі беларускія скульптары. У цэлым для прамысловай архітэктуры 20-х гадоў характэрна выкарыстанне жалезабетонных і металічных канструкцый. У канцы 20-х гадоў рабіліся спробы распрацаваць тып дома з агульнымі бытавымі элементамі. Галоўнымі задачамі архітэктуры Беларусі ў перадваенныя пяцігодкі (1933–1941) сталі рэканструкцыя і развіццё гарадоў.Кожны твор архітэктуры ўяўляе сабой спалучэнне трох прынцыпаў: функцыянальнасці, трываласці і прыгажосці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма 11.2 Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы.

Ключавыя словы і паняцці: заходнебеларускія землі, рэжым санацыі, камасацыя, парцэляцыя, асадніцтва, беларускі нацыянальна-вызваленчы рух, ТБШ, Пасольскі клуб.

План:

1.Заходнебеларускія землі ў складзе польскай дзяржавы.
2. Сацыяльна-эканамічнае і культурнае жыццё на Заходняй Беларусі.
3. Барацьба працоўных Заходняй Беларусі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

У выніку савецка-польскай вайны 1919–1920 гг., паводле Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г., вялікая частка тэрыторыі Беларусі

(каля 103 тыс. км. кв., прыблізна 40%) з насельніцтвам каля 5 млн. чалавек перайшло ва ўладанне польскай дзяржавы.Заходняя Беларусь і яе насельніцтва апынуліся ў вельмі цяжкім становішчы. На заводах і фабрыках працоўны дзень працягваўся 10–11 гадзін. У сярэднім на аднаго працуючага прыходзілася два беспрацоўныя. Людзі згаджаліся на любую работу і любую аплату. Вельмі цяжка жылося ў вёсцы. Аграрныя пераўтварэнні вялі да ўзрастання дыферэнцыяцыі сялян, колькасць бедных жыхароў вёскі пачала няўхільна павялічвацца. Сяляне павінны былі пастаянна выконваць павіннасці.У пошуках заробкаў, даведзеныя голадам і ўціскам да адчаю, сяляне шукалі выйсця ў эміграцыі. Вядучую ролю ў паланізацыі беларускага насельніцтва адыгрывала каталіцкая царква. У Заходняй Беларусі панаваў жорсткі палітычны рэжым і паліцэйскі тэрор.Такім чынам, сацыяльнае, нацыянальнае і палітычнае становішча працоўных мас на тэрыторыі Заходняй Беларусі штурхала іх на актыўныя антыўрадавыя дзеянні. У пачатку і сярэдзіне 20-х гадоў сацыяльная і нацыянальная барацьба характарызавалася не толькі эканамічнымі забастоўкамі і антыўрадавымі дэманстрацыямі, але і праявамі ўзброеных выступленняў у форме партызанскага руху. Ва ўзмацненні сацыяльнага і нацыянальна-вызваленчага руху значную ролю адыгралі партыі і арганізацыі камуністычнага і нацыянальна-дэмакратычнага напрамку. Выдаваліся газеты, якія па прычыне праследавання ўладамі часта закрываліся.У студзені 1927 г. улады пачалі ліквідацыю гурткоў і камітэтаў БСРГ. Па ўсім краі прайшлі масавыя арышты яе актывістаў. Польскія ўлады чынілі розныя перашкоды для стварэння сеткі гурткоў на месцах, а таксама ажыццяўлялі жорсткі ўціск на перыядычныя выданні. Важную ролю ў грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі адыграла культурна-асветная арганізацыя – Таварыства беларускай школы (ТБШ). За перыяд свайго існавання (да 1937 г.) ТБШ заваявала вялікую любоў насельніцтва Заходняй Беларусі. Заслуга ТБШ была не толькі ў асветніцкай ролі, але і ў тым, што яна падрыхтавала і выхавала ў вельмі цяжкіх умовах нацыянальнага прыгнёту значную колькасць беларускай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

творчай інтэлігенцыі. У канцы 20 – пачатку 30-х гадоў адбыліся значныя палітычныя і эканамічныя змены на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Эканамічны крызіс 1929–1933 гг. надзвычай абвастрыў міждзяржаўныя і ўнутрыкласавыя супярэчнасці ў большасці краін свету. Пасля заключэння ў студзені 1934 г. германска-польскага дагавора ў краіне хутчэй пайшла фашызацыя грамадскага жыцця. У красавіку 1935 г. былі прыняты новая канстытуцыя Польшчы і новы выбарчы закон. Рашаючую ролю ў перабудове ўсяго рэвалюцыйнага руху адыграў VII кангрэс Камінтэрна (1935), які распрацаваў тактыку барацьбы супраць фашызму і вайны. Працэс рэалізацыі задачы па стварэнні адзінага фронту барацьбы ўсіх дэмакратычных сіл супраць фашысцкага наступу праходзіў вельмі цяжка і з пераменным поспехам.Польская сацыялістычная партыя (ППС), створаная ў 1892 г., стаяла на антысавецкіх і антыкамуністычных пазіцыях. Значны ўплыў на працоўных гарадоў і мястэчак Заходняй Беларусі мелі яўрэйскія дэмакратычныя арганізацыі. Асобнае месца займалі беларускія нацыянальныя партыі. Ва ўмовах нарастання барацьбы працоўных і значных поспехаў па стварэнні адзінага народнага фронту ў Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне Кампартыя Польшчы і яе састаўныя часткі – КПЗБ і КПЗУ – у сакавіку 1938 г. былі распушчаны і перасталі існаваць.Нягледзячы на такі ўдар па сацыяльным і нацыянальна-вызваленчым руху ў Польшчы, барацьба працоўных, хоць і не так інтэнсіўна, як раней, усё ж працягвалася аж да 17 верасня 1939 г. У 1921–1939 гг. заходнебеларускія землі з’яўляліся прыдаткам Польшчы. Беларускі народ не мірыўся з прыгнечаным становішчам і змагаўся за сацыяльную і нацыянальную незалежнасць, за ўз’яднанне з БССР. У 1939 г. здзейснілася мара беларускага народа. Заходняя Беларусь уз’ядналася з БССР.

- ***Планы семінарскіх заняткаў***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У адпаведнасці з зацверджанымі кафедрай гісторыі Беларусі планамі семінарскіх заняткаў па прыяду 1917 – 1939 гадоў праводзяцца семінарскія заняткі па наступным тэмам:

Тэма 32. ***Беларусь пасля падзення самадзяржаўя (люты- кастрычнік 1917 г.)***

План семінара (2 гадз.)

1.Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага становішча Беларусі пасля лютаўскай рэвалюцыі.

2.Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі у сакавіку-кастрычніку 1917 г.

3.Беларускі нацыянальны рух у 1917 г.

Літаратура:

1. Бежанцы першай сусветнай вайны // Спадчынна. 1994. № 3.

2.Варонка Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 г. – Мінск, 1991.

3.Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. – Мінск, 1994.

4.Игнатенко И.М. Горячий февраль. Буржуазно-демократическая революция: сущность и итоги // Беларуская думка. 1994. № 2.

5.Ігнаценка І. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. у Расіі: мэты і здзяйсненні // Беларускі гістарычны часопіс. 1997. № 2.

6. Канчер Е.С. Из истории общественных, национальных и революционных движений белорусов.// Неман. 1993. №1.

7. Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. Ч.II У истоков политического противостояния. Материалы и документы по истории общественных движений и политических партий Республики Беларусь. – Гомель, 1993.

8.Палітычныя партыі Беларусі: Дапам. для вывучаючых гісторыюБеларусі. – Мінск, 1993.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

9. Пратакол з’езда беларускіх нацыянальных арганізацый у Менску 25 – 27 сакавіка 1917 года// Спадчына. 1990. № 4.

10. Сяменчык М.Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918гг.) – Мінск, 2001. Ч. 1 – 2.

11. Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. – Мінск, 1993.

12.Цвыроў Л. Вынікі выбараў ва Устаноўчы сход на Заходнім фронце.// Веснік БДУ. Сер.3. 1992. №2.

Тэма 33. ***Усталяванне Савецкай улады на Беларусі (1917 – 1920 гг.)***

План семінара (2 гадз.)

1. Кастрычніцкая рэвалюцыя (1917 г.) на Беларусі.

2.Стварэнне сістэмы Савецкай улады на Беларусі.

3. Першыя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні савецкай улады.

4. Мяцеж корпуса Доўбар-Мусніцкага.

5. Палітыка “ваеннага камунізму” на тэрыторыі Беларусі.

Літаратура:

1.Борьба за Саветскую власть в Белоруссии: Сб. докум. и материалов. В 2.ч. – Минск, 1968.

2.Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн.1. – Мінск, 2011.

3. Игнатенко И.М. Октябрь без краски // Беларуская думка. 1993. № 11

4. Ігнаценка І. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 1997. №4.

5. Калеснікаў В. Кіраванне прамысловасцю Беларусі ў 1918 – 1920 гг. // Беларускі гістарычны часопіс. 1998. №2.

Тэма 34***. Барацьба за стварэнне беларускай дзяржаўнасці.***

План семінара (4 гадз.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1.Усебеларускі з’езд (кангрэс) у снежні 1917 г.

2. Абвяшчэнне Беларускай Народнай рэспублікі.

3. Беларусь пад нямецкай акупацыяй у 1918 г.

4. Утварэнне ССРБ і ЛітБела.

5. Польская акупацыя Беларусі 1919 – 1920 гг.

6. Другое абвяшчэнне ССРБ. Рыжскі мір і Беларусь.

Літаратура:

1. Варонка Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 г. – Мінск, 1991.

2. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн.1. – Мінск, 2011.

3. Грыцкевіч А. Слуцкае паўстанне 1920 г. – збройны чын у барацьбе за незалежнасць Беларусі // Спадчына. 1993. №2.

4. Грыцкевіч А. Заканчэнне савецка-польскай вайны ў другой палове 1920 года і постаць генерала Булак-Балаховіча. // Спадчына. 1995. №5

5. Игнаценко И.М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии. – Минск. 1992.

6. Круталевич В. А. На путях нацуионального самоопределения: БНР – БССР – РБ. – Минск, 1995.

7. Круталевіч В.А. Рыжскі мірны дагавор. // Спадчына. 1990. №1.

8.Ладысеў У.Ф., Брыгадзін П.І. Паміж Усходам і Захадам. Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917 – 1939 гг.) – Мінск, 2003.

9 Луцкевіч А. Польская акупацыя ў Беларусі // Беларусь. 1990. №9.

10.Мирный Договор между Россией и Украиной, с одной стороны, и Польшей – с другой. // Спадчына. 1993. №4.

11. Паўлава Т.Я. Знешнепалітычная дзейнасць і дыпламатыя БНР у 1918 г. // Беларускі гістарычны часопіс. 2000. №1.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

12. Платонов Р., Сташкевич Н. Тернистый путь к свободе. К вопросу о становлении белорусской национальной государственности. //Неман. 1992. №№ 10-11.

13. Прокулевич В. Слуцкое восстание. //Неман. 1996. № 4.

14. Сяменчык М.Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918гг.) – Мінск, 2001. Ч. 1 – 2.

15. Усебеларускі з'езд 1917 года: сведчанне сучасніка. // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. №1-4.

Тэма 35.***Савецкая Беларусь у міжваенны перыяд (1921 – 1939 гг.)***

План семінара (6 гадз.)

1. Асаблівасці ўмоў пераходa да НЭПа на Беларусі.

2.Прамысловае развіццё ў Савецкай Беларусі ва умовах НЭПа. Ажыццяўленне палітыкі індустрыялізацы.

3. Сельская гаспадарка: тэндэнцыі развіцця ва умовахз НЭПа, калектывізацыя і яе вынікі.

4. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР: барацьба дэмакратычнай і таталітарнай тэндэнцый.

5.Беларусізацыя як частка дзчяржаўнай нацыянальнай палітыкі.

6 Стан і умовы развіцця адукацыі, навукі, літаратуры і мастацтва.

7. Беларускае замежжа.

Літаратура:

1. Адамушка Ул. Палітычныя рэпрэсіі 20 – 50-х гадоў на Беларусі. – Мінск, 1994.

2. Беларусізацыя. 1920-я гады: Дакументы і матэрыялы – Мінск, 2001.

3. Бяспалая М. Эканамічнае развіццёс беларускай вёскі (20-я гады XX ст.) // Беларускі гістарычны часопіс. 1997. №1.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4.Врублевский А., Протько Т. Из истории репрессий против белорусского крестьянства. 1928 – 1933 гг. – Минск, 1992.

5. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн.1. – Мінск, 2011.

6. Гудаў М. Узброеная барацьба на Беларусі ў 1921 г. // Беларускі гістарычны часопіс. 1997. №1.

7. Інстытут Беларускай культуры. 1922 – 1928: дакументы і матэрыялы – Мінск, 2011.

8. Калубовіч А. Восемь волн беларускай эміграцыі. // Неман, 1992. №2

9. Кароль А.ю Беларусізацыя – палітыка нацыянальнага адраджэння. / Крыжовы шлях. – Мінск, 1993.

10.Касцюк М., Міхнюк У. Рэпрэсіі – самае цяжкае злачынства таталітарнага рэжыму. / Крыжовы шлях. – Мінск, 1993.

11.Касцюк М.П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі (1917 – 1994 гг.). – Мінск, 2000.

12. Котаў А. Змешаная эканоміка ў Беларусі (у 20-я гады XX ст.) // Полымя, 1993. №9

13 Лыч Л. Беларусізацыя 20-х гадоў. // Маладосць. 1995, №№ 11 – 12.

14. Сарокін А. На ростанях айчыннай гісторыі. Беларуская вёска ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917 – 1990). Мінск, 1999.

15. Снапкоўскі Ул. Эміграцыя. .) // Полымя, 1995. №№ 11 – 12.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- ***Кіруемая самастойная работа студэнтаў*** у межах вывучаемага перыяда гісторыі Беларусі прадугледжана па тэме

ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ ПОЛЬСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ (1921 – 1939 гг.) (6 гадзін).

Лекцыя 1. Сацыяльна-эканамічнае становішча заходнебеларускіх зямель у складзе польскай дзяржавы.

План лекцыі.

1. Тэрыторыя і насельніцтва заходнебеларускіх зямель.
2. Стан прамысловасці і рабочага класа.
3. Становішча ў сельскай гаспадарцы, спробы аграрных рэформ і іх вынікі.

Змест: Вынікі савецка-польскай вайны і Рыжскага міра для Беларусі. Тэрыторыя Заходняй Беларусі, што згодна з Рыжскім мірам адыйшла ў склад польскай дзяржавы. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел заходнебеларускіх зямель. Палітыка польскіх улад адносна тэрыторыі Заходняй Беларусі, польскія органы кіравання на “усходніх крэсах”. Кольскасць насельніцтва, яго нацыянальны і рэлігійны склад. Фальсіфікацыя уладамі звестак аб нацыянальным складзе насельніцтва заходнебеларускіх зямель. Палітыка апалячвання мясцовага насельніцтва, формы і метады яе ажыццяўлення.

Прамысловыя цэнтры на тэрыторыі Заходняй Беларусі у пачатку 20-х гадоў. Вынікі першай сусветнай і савецка-польскай войн для прамысловасці рэгіёна. Эканамічная палітыка польскіх улад на тэрыторыі Заходняй Беларусі, яе месца у эканоміцы Польшчы. Асноўныя галіны заходнебеларускай прамысловасці, колькасць прадпрыемстваў і рабочых. Адметныя рысы і асаблівасці прамысловага развіцця. Праявы еўрапейскага эканамічнага крызіса 1929 – 1933 гг. у прамысловасці Заходняй Беларусі. Стан рабочага класа: рост беспрацоў’я, працягласць рабочага дня, заработная плата, умовы працы і жыцця.

Становішча ў сельскай гаспадарцы. Захаванне прыватнай уласнасці на зямлю і памешчыцкага землеўладання. Стан заможнасці гаспадарак беларускага сялянства. Аграрнае пытанне на Заходняй Беларусі. Палітыка ўлад па ўзмацненню польскага ўплыву на вёсцы. З’яўленне асадніцтва. Сацыяльны склад, маёмасны стан гаспадарак асаднікаў, іх роля і функцыі. Спробы аграрнай рэформы на Заходняй Беларусі. Камасацыя, парцэляцыя, ліквідацыя сервітутаў і іх уплыў на стан гаспадарак беларускага сялянства. Дзяржаўныя павіннасці сялянства. Маёмасная дыферцыяцыя сялянскіх гаспадарак на Заходняй Беларусі. Эканамічная эміграцыя з Заходняй Беларусі на працягу 20 – 30-х гадоў XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лекцыя 2. Грамадска-палітычнае жыццё на Заходняй Беларусі ў 1920 – 1930-я гады.

План лекцыі.

1. Асноўныя палітычныя плыні на заходнебеларускіх землях.
2. Беларускі нацыянальны рух і ўмовы яго існавання.
3. Грамадска-палітычныя падзеі

Змест. Разнастайнасць палітычнага жыцця на заходнебеларускіх землях. Асноўныя палітычныя партыі, якія дзейнічалі на заходнебеларускіх землях. Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ), яе пазіцыі і роля ў палітычным жыцці. Стварэнне КПЗБ, яе арганізатары і кіраўнікі, колькасны і сацыяльны склад. Асноўныя формы дзейнасці КПЗБ, друкаваныя органы, яе ўплыў на насельніцтва і грамадскія арганізацыі. Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ), яго кіраўнікі і склад. Тактыка камуністычнага руху на Заходняй Беларусі. Рэспрэсіі супраць яго удзельнікаў, роспуск КПЗБ і КСМЗБ. Польская сацыялістычная партыя (ППС) на Заходняй Беларусі, яе пазіцыі і дзейнасць. Яўрэйскія палітычныя арганізацыі – Бунд і Паалей-Цыён на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Беларускі нацыянальна-дэмакратычны рух на заходнебеларускіх землях. Партыі беларускіх эсэраў і сацыял-дэмакратаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Дзейнасць Беларускай хрыстыянскай дэмакратыі – Беларускага нацыянальнага аб’яднання (БХД – БНА), іх месца і пазіцыі ў палітычным жыцці. Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый (Цэнтрсаюз). Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры. Стварэнне і дзейнасць Беларускай сялянска-рабочай грамады (БСРГ) – масавай легальнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі на Заходняй Беларусі. Праграма БСРГ, яе колькасны і сацыяльны склад, формы дзейнасці, кіраўніцтва. Рэпрэсіі супраць Грамады. Роля ў грамадска-палітычным жыцці Таварыства беларускай школы (ТБШ). Яго мэты , накірункі дзейнасці і склад кіраўніцтва.

Умовы грамадска-палітычнага жыцця на заходнебеларускіх землях. Санацыйны рэжым Ю. Пілсудскага ў Польшчы. Спробы стварэння адзінага рабочага і антыфашысцкага народнага фронту. Праблемы міжпартыйных адносін. Удзел беларускіх нацыянальных партый ў выбарах ў Сейм ў 1922 годзе. Стварэнне і дзейнасць Беларускага пасольскага клуба, яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

склад і мэты. Выбары ў Сейм 1928 года у Заходняй Беларусі, стварэнне і дзейнасць арганізацыі і клуба “Змаганне”. Судовыя працэсы над рэвалюцыйнымі арганізацыямі ў Заходняй Беларусі. Уздым рабочага і сялянскага руху на пачатку 30-х гадоў. Узмацненне палітычнай рэакцыі польскіх улад. Роспуск КПЗБ, рэпрэсіі ў адносінах да яе кіраўнікоў.

Лекцыя 3. Барацьба працоўных Заходняй Беларусі за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне.

План лекцыі.

1. Нацыянальна-культурнае жыццё на заходнебеларускіх землях у 20 – 30-гады.
2. Рабочы і сялянскі рух на Заходняй Беларусі.

Змест. Нацыянальны прыгнёт беларускага насельніцтва на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Нацыянальная палітыка польскіх улад, формы яе ажыццяўлення. Закрыццё беларускіх школ, адсутнасць беларускай нацыянальнай сістэмы адукацыі. Скарачэнне ўмоў для выкарыстання беларускай мовы, магчымасцей беларускага насельніцтва атрымліваць адукацыю на роднай мове. Барацьба за захаванне беларускай школы, культурна-асветніцкая дзейнасць ТБШ. Беларуская літаратура на Заходняй Беларусі. Беларускія пісьменнікі і іх творчасць: М. Танк, П. Пестрак, М. Васілёк, В.Таўлай, Я. Брыль, Б. Тарашкевіч, І. Дварчанін і інш. Выяўленчае мастацтва і дойлідства. Творчасць П. Сергіевіча, М. Сеўрука, Я. Драздовіча. Тэатральнае і музычнае мастацтва. Мастацкая самадзейнасць і народная творчасць. Р. Шырма, А.Грыневіч. Драматычныя секцыі пры гуртках ТБШ. Творчасць К. Галкоўскага, М. Забеда-Суміцкага. Супрацьстаянне беларускай і польскай культур. Адукацыя і культура іншых этнічных супольнасцей еа заходнебеларускіх землях.

Рэлігійнае жыццё.Рымска-каталіцкая царква на Заходняй беларусі і яе роля ў акаталічванні насельніцтва. Умовы існавання і дзейнасць праваслаўнай царквы. Уніяцкае адраджэнне. Пашырэнне пратэстантызму. Іудаізм і іслам у заходнебеларускім рэгіёне

Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у пачатку 1920-х гг. Парламенцкія сродкі барацьбы. Узброеная партызанская барацьба, яе арганізатары, праявы і накірункі. Уздым нацыянальна-вызваленчага руху ў 1925 – 1929 гг. Абарона нацыянальных і сацыяльных інтарэсаў у сас сусветнага эканаімічнага крызісу 1929 – 1933 гг. Забастоўкі рабочых,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выступленні беспрацоўных. Сялянскім рух. Выступленні супраць падаткавага цяжару і бясчынства чыноўнікаў, забастоўкі сезонных і падзённых рабочых, барацьба за сервітуты. Арганізацыя супраціўлення чыноўнікам і паліцыі, узброенныя выступленні сялян. Развіццё рабочага сялянскага руху у другой палове 1930-х гг. Забастоўкі, дэманстрацыі і мітынгі. Выступленні нарачанскіх рыбакоў. Стан вызваленчай барацьбы працоўных Заходней Беларусі напярэдадні Другой сусветнай вайны.

Пытанні для самаконтроля

1. Якую тэрыторыю складалі заходнебеларускія землі у складзе польскай дзяржавы?
2. Колькі насельніцтва пражывала на гэтай тэрыторыі?
3. Якую палітыку праводзілі польскія ўлады адносна заходнебеларускіх зямель?
4. Якія галіны прамысловасці развіваліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі?
5. У якім стане знаходзілася сельская гаспадарка Заходняй Беларусі?
6. Якія спробы аграрнай рэформы ажыццяўлялі польскія улады7
7. Што такое “камасацыя” і “парцэляцыя”?
8. Хто такіе “асаднікі” і якую функцыіі яны выконвалі?
9. Якую колькасць склала эканамічная эміграцыя з тэрыторыі Заходняй Беларусі?
10. Якія беларускія нацыянальныя партыі дзейнічалі нва тэрыторыі Заходняй Беларусі?
11. Калі была утворана КПЗБ, хто яе кіраўнікі, да якога часу яна праіснавала?
12. Якая беларуская арганізацыя была найбольш шматлікай па колькасці членаў?
13. Што такое “пасольскі клуб” і арганізацыя “Змаганне”?
14. У якім стане знаходзілася беларускае школьніцтва на тэрыторыі Заходняй Беларусі?
15. Якую ролю ў культурным жыцці на заходнебеларускіх землях адыгрывала ТБШ?
16. Творчасць якіх беларускіх пісьменнікаў разгортвалася на заходняй Беларусі?

сённяшняга часу.

У мэтах паглыбленнага вывучэння гісторыі Беларусі перыяда 1917 – 1939 гг. прапануецца правядзенне спецсемінара па тэме

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вядомыя грамадска-палітычныя дзеячы Беларусі пачатку XX стагоддзя

Вывучэнне гісторыі Беларусі немагчыма без усведамлення ролі людзей, найбольш значных асоб з ліку грамадска-палітычных дзеячоў у развіцці грамадства. Асабліва значнай была роля чалавечага фактару ў пераломныя моманты гістарычнага развіцця. Перыяд пачатку XX стагоддзя быў шмат у чым вызначальным для далейшага лёса Беларусі. Менавіта ў той час ішлі імклівыя працэсы сацыяльна-эканамічнага развіцця, фарміравання беларускай нацыі. Рэвалюцыйныя падзеі 1905 і 1917 гадоў ўцягвалі ў палітычнае жыццё розныя плыні насельніцтва, вылучалі з іх ассяродзя палітычных лідэраў, грамадскіх дзеячоў. Гэта быў час фарміравання і разгортвання дзейнасці палітычных партый, грамадскіх, культурных і іншых арганізацый. Развіццё беларускага нацыянальнага руха паставіла пытанне аб дзяржаўнасці Беларусі, якое вырашалася рознымі формамі і метадамі.

Таму перыяд першых дзесяцігоддзяў XX стагоддзя быў адзначаны з"яўленнем дастаткова шырокага кола аўтарытэтных, вядомых ў беларускім грамадстве палітычных, культурных, нацыянальных дзеячоў. Яны адлюстроўвалі інтарэсы і погляды розных плыняў насельніцтва, прытрымліваліся разнастайных палітычных поглядаў, прымалі разнабаковы ўдзел у падзеях таго часу. Па рознаму склаўся іх лёсы, ў іх адлюстраваліся ўсе складанасці, супярэчнасці, асаблівасці жыцця беларускага грамадства таго часу.

Мэтай прапануемага спецсемінара з"яўляецца паглыбленне гістарычных ведаў аб падзеях пачатку XX стагоддзя на Беларусі, станаўленні беларускай дзяржаўнасці праз зварот да жыцця і дзейнасці шэрагу вядомых грамадска-палітычных дзеячоў. Аўтар спецсемінара не абмяжоўвае іх пералік нейкімі палітычнымі ці іншымі рысамі, ён імкнуўся адлюстраваць увесь спектр разнастайнага грамадскага жыцця таго часу.

Студэнтам прапануецца падрыхтоўка і абмеркаванне рэфератаў, прысвечаных наступным асобам:

1. ***Палута*** **Бадунова –** дзеяч беларускага нацыянальнага руху, адзін з кіраўнікоў БСГ, лідэр Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў.
2. ***Антон*** **Баліцкі** – наркам асветы БССР, адзін з творцаў і праваднікоў дзяржаўнай палітыкі беларусізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. ***Станіслаў*** **Булак-Балаховіч –** ваенны і палітычны дзеяч, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антысавецкай барацьбы на Беларусі ў 1920 – 1922 гг.
4. ***Язэп*** **Варонка** – беларускі палітычны дзеяч, адзін з кіраўнікоў БСГ, ініцыятараў абвяшчэння БНР, старшыня Народнага сакратарыята Беларусі.
5. ***Мікалай*** **Галадзед –** партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР, Старшыня СНК БССР у 1927 – 1937 гг.
6. ***Томаш*** **Грыб** – беларускі палітычны і культурны дзеяч, член Рады БНР, адзін з арганізатараў Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, дзеяч беларускай эміграцыі.
7. ***Вінцесь*** **Гадлеўскі –** дзеяч беларускага нацыянальнага руху, каталіцкі святар, занавальнік партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя.
8. ***Восіп*** **Дыло** – беларускі грамадскі дзеяч, пісьменнік, адзін з кіраўнікоў БСГ, член Часовага рабоча-сялянскага савцкага урада Беларусі.
9. ***Канстанцін*** **Езавітаў -** дзеяч беларускага нацыянальнага руху, вайсковец і культурны дзеяч.
10. ***Змітрок*** **Жылуновіч** – дзеяч беларускага нацыянальнага руху, савецкі дзяржаўны і грамадскі дзеяч, адзін з кіраўнікоў БСГ, Белнацкама, ініцыятар стварэння БССР, Старшыня часовага рабоча-сялянскага савецкага урада Беларусі, акадэмік.
11. ***Усевалад*** **Ігнатоўскі –** беларускі грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, адзін з кіраўнікоў БСГ, арганізатар Беларускай камуністычнай арганізацыі, наркам земляробства, асветы БССР, прэзідэнт Інбелкульта і АН Беларусі.
12. ***Яўсевій*** **Канчер –** беларускі палітычны дзеяч, гісторык, старшыня Беларускага абласнога камітэта, адзін з арганізатараў Усебеларускага з"езда ў снежні 1917 г.
13. ***Вільгельм*** **Кнорын –** савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч, гісторык, адзін з кіраўнікоў бальшавіцкай партыі на Беларусі.
14. ***Янка*** **Купала –** класік беларускай літаратуры, грамадскі дзеяч.
15. ***Вацлаў*** **Ластоўскі –** беларускі грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, філолаг, актыўны удзельнік беларускага нацыянальнага руху, акадэмік.
16. ***Язеп*** **Лёсік –** беларускі грамадска-падітычны дзеяч, філолаг, педагог, адзін з лідэраў БСГ, член БНК і ЦРБА, член Рады БНР, акадэмік.
17. ***Іван*** **Луцкевіч –** беларускі палітычны дзеяч, археолаг, адзін з стваральнікаў БСГ, газет "Наша доля" і "Наша ніва", брат А.Луцкевіча.
18. ***Антон*** **Луцкевіч –** беларускі грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, публіцыст, адзін з заснавальнікаў БСГ, ініцыятар абвяшчэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

незалежнасці БНР, лідар Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі, Старшыня Рады Міністраў БНР у 1918 – 1920 гг.

19. ***Аляксандр*** **Мяснікоў** – савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, адзін з кіраўнікоў усталявання савецкай ўлады на Беларусі, старшыня Паўночна-Заходняга камітэта РСДПР(б) і Аблвыкамзаха.
20. ***Сцяпан*** **Некрашэвіч –** беларускі грамадскі дзеяч і навуковец, адзін з кіраўнікоў Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, старшыня Інбелкульта, акадэмік.
21. ***Уладзімір*** **Пракулевіч –** беларускі палітычны дзеяч, Старшыня Рады случчаны ў 1920 г.
22. ***Дмітрый*** **Прышчэпаў –** савецкі дзяржаўны і грамадскі дзеяч, наркам земляробства БССР.
23. ***Сімон*** **Рак-Міхайлоўскі –** беларускі грамадска-палітычны дзеяч, педагог, член Рады БНР, актыўны удзельнік беларускага нацыянальнага руху на заходняй Беларусі, адзін з кіраўнікоў ТБШ.
24. ***Аркадзь*** **Смоліч –** дзеяч беларускага нацыянальнага руху, навуковец, педагог, адзін з ініцыятараў абвяшчэння БНР, акадэмік.
25. ***Браніслаў*** **Тарашкевіч –** беларускі грамадска-палітычны дзеяч, мовазнавец, адзін з лідэраў БСГ, беларускага нацыянальнага руху на заходняй Беларусі.
26. ***Аляксандр*** **Цвікевіч** – беларускі палітычны дзеяч, дзеяч беларускай эміграцыі, прэм”ер-міністр БНР з 1923 г.
27. ***Фабіян*** **Шантыр** – беларускі палітычны і ваенны дзеяч, член Часовага рабоча-сялянскага савецкага урада Беларусі.
28. ***Аляксандр*** **Чарвякоў** – савецкі дзяржаўны дзеяч, арганізатар Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, камісар Белнацкама, член Часовага рабоча-сялянскага савецкага урада Беларусі, Старшыня ЦВК і СНК БССР.
29. ***Усевалад*** **Фальскі –** беларускі грамадска-палітычны, дзяржаўны і культурны дзеяч, член Часовага рабоча-сялянскага савецкага урада Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У кожным паведамленні неабходна прывесці біяграфічныя звесткі аб асобе, раскрыць яе жыццёвы шлях, прасачыць фарміраванне палітычных поглядаў. Патрэбна звернуць увагу на ўдзел асабы ў грамадска-палітычных падзеях свайго часу на Беларусі, асабліва падчас рэвалюцый, змен, што адбываліся ў грамадстве. Карысна вызначыць стаўленне да барацьбы за стварэнне беларускай дзяржаўнасці, праблем нацыянальна-культурнага адраджэння. Пажадана выкарыстаць уласныя навуковыя і публіцыстычныя працы самой разглядаемай асобы. Неабходна даць кароткі агляд бібліяграфіі па тэме.

Літаратура

1. Адамушка У. Сацыял-дэмакрат Сымон Рак-Міхайлоўскі // Сыны і пасынкі Беларусі. Мн., 1996
2. Акшевский И. Судьба наркома [земледелия БССР Дмитрия Филимоновича Прищепова] // Беларуская думка. 1993. № 7
3. Апостол национального возрождения. Собственноручные показания А.И.Луцкевича 30 октября 1939 г. //Неман. 1995, № 1
4. Біч М. Ідэолаг і практык нацыянальнага адраджэння [аб А. Луцкевіче] // Крыніца. 1999. № 5
5. Брыгадзін П.І., Мацяс І.Д. Усевалад Ігнатоўскі: палітычны дзеяч, вучоны. Мн., 1998.
6. Гадлеўскі Вінцэсь. Публіцыстыка.// Спадчына. 1993, № 2
7. Герасімаў В. “Да праўды светлай, братка, ідзі!” [Лёс К. Б. Езавітава] // Полымя, 1994, № 8
8. Грамовіч У. “У Бадуновай ёсць шмат заслуг перад рабочымі і сялянствам Беларусі” [Пра лёс дзеяча БНР Палуты Бадуновай] // Звязда. 1995, 19 красавіка.
9. Грыцкевіч А. Заканчэнне савецка-польскай вайны ў другой палове 1920 года і постаць генерала Булак-Балаховіча // Спадчына. 1995. № 5
10. Давідовіч А.В. Палітычная дзейнасць З.Х Жылуновіча (1917 – пач. 1918 г.) // Веснік БДУ Серыя 3. 1993. № 3
11. Давидович А. В. Общественно-политическая деятельность Д.Ф.Жилуновича (190 – 1937 гг.) Автореф. дис... канд. ист. наук. Мн., 1994
12. Драздовіч Язеп. Дзённік // Маладосць. 1991. № 12, 1992. № 1, 2
13. Езовитов К. Б. Воспоминания // Неман. 1993. № 3.
14. Жилунович Дмитрий Федорович // Страницы истории Компартии Белоруссии. Мн., 1990
15. Ігнатоўскі У. М.: старонкі жыцця і навуковай дзейнасці. Мн., 1991.
16. Ігнаценка І., Кароль А. Усевалад Ігнатоўскі і яго час. Мн., 1991
17. Іофе Э. Бацька беларусізацыі [аб А.В. Баліцкім] //Беларуская мінуўшчына. 1995, № 2
18. Калубовіч А. Айцы БССР і іхны лёс. // Крокі гісторыі. Мн., 1993.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

19. Канстанцін Езавітаў: матэрыялы да біяграфіі.// Маладосць. 1995. № 1

20. Канчер Е. С. Из истории общественных, национальных и революционных движений белоруссов. // Неман. 1993. № 1

21. Кнорин В.Г. Избраннывe статьи и речи. Мн., 1990.

22. Кнорин Вильгельм Георгиевич. // Страницы истории Компартии Белоруссии. Мн., 1990

23. Ліцвін А. Генерал Булак-Балаховіч (міфы, фальсіфікацыі, рэальнасць) // Сыны і пасынкі Беларусі. Мн., 1996

24. Луцкевіч А. За 25 гадоў (1906 – 1927): Успаміны аб працы першых палітычных арганізацый. Мн., 1991

25. Луцкевіч А. Дневнік (1918 – 1919 гг.) // Полымя. 1991. № 4

26. Мацяс І.Д. У.М.Ігнатоўскі: палітычны дзеяч, вучоны. Айтарэф. дыс... канд. гістар. навук. Мн., 1993.

27. Мяснікоў А. “Жывіце без мяне...” [Аб Язэпе Лёсіке] // Полымя. 1992, №1.

28. Мяснікоў А. Загадка А.Г. Чарвякова // Звязда, 1992, 13 чэрвеня

29. Мяснікоў А. Нацдэмы: Лёс і трагедыя Фабіяна Шантыра, Усевалада Ігнатоўскага і Язэпа Лёсіка. Мн., 1993.

30. Мяснікоў А. “Беларус – грамадзянін будучыны...” (Лёс і трагедыя Аркадзя Смоліча) // Маладосць. 1994, № 7

31. Мяснікоў А. Айчыны верныя сыны: гістарычныя нарысы. Мн., 1997.

32. Наумук С. М. Канстанцін Езавітаў: жыццёвы шлях і дзейнасць. Аўтарэф. дыс... канд. гіст. Навук Мн., 2003.

33. Пануцэвіч В. Кс. Вінцэсь Гадлеўскі: Дзяржаўны Муж і Правадыр народу // Спадчына. 1993. № 3

34. Платонаў Р. Тайна смерці Мікалая Галадзеда // Беларусь. 1993. № 10

35. Платонаў Р. Палітычная “чыстка” Зміцера Жылуновіча // Беларусь, 1994, № 7

36. Платонаў Р.П. Палітыкі. Ідэі. Лёсы: Грамадзянскія пазіцыі ва ўмовах нарастання ідэолага-палітычнага дыктату ў Беларусі 20 – 30-х гг. Мн., 1996.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГТУ

37.Почанин С.З. «Мне нечего скрывать...» [о смерти А.Г. Червякова] // Страницы истории Компартии Белоруссии. Мн, 1990

38.Процька Т. “Я з”яўляюся ...” [пра лёс настаўніцы, сакратара ЦК Бел. сац.грам., сакрат.апекі БНР Палуты Бадуновай (1885 – 1938)] // Настаўніцкая газета. 1994, 23 сакавіка.

39.Раўнейка С. Канстанцін Езавітаў: педагог, публіцыст і асветнік // Гісторыя: праблемы выкладання. 2002. № 3

40.Рудович С. Глашатай белорусской идеи (Наследие Язепа Лёсика глазами историка) // Неман. 1995, № 10 – 11

41.Селиванов П. А. А.Ф.Мясников. Страницы биографии. Мн., 1986

42.Сидоревич А. Антон Луцкевич. // Неман. 1990. № 7.

43.Хацкевіч А. Генерал Езавітаў: здраднік ці агент КДБ // Звязда. 1992.

44.Хацкевіч А. Булак-Балаховіч: бандыт ці герой // Спадчына. 1992. № 6

45.Хомчанка В. Яшчэ пра аднаго... [Аб А.І. Цвікевічы] // Спадчына. 1990, № 2.

46.Чобат А. Станіслаў Булак-Балаховіч. // Спадчына. 1995. № 3

47.Якутов В.Д. А.Г. Червяков. Мн., 1978.

49.Марціновіч А.А. **Хто мы, адкуль мы…** гіст.,эсэ,нарысы. У 3 кн. Кн. 3. Мінск**:** Беларусь,2008. -447с. Змешчаны матэрыялы пра славутых дзеячоў XIX – XX стст., сярод якіх М.В. ***Доўнар-Запольскі, Ф. Шантыр, А. Луцкевіч, А. Бурбіс, П. Бадунова, Я. Лёсік, В. Ластоўскі, А. Смоліч, А. Станкевіч, Б. Тарашкевіч, Ц. Гартны і інш.***

50. Мяснікоў А.Ф. **Сто асоб беларускай гісторыі** : гістар. партрэты. – Мінск.2009. – 343 с. (сабраны біяграфічныя партрэты найбольш вядомых людзей ад старажытнасці да сучаснасці, сярод якіх У. ***Ігнатоўскі, Я. Купала, Я. Лёсік, В. Ластоўскі, С. Некрашэвіч. А. Луцкевіч, В. Кнорыньш, А. Смоліч, Б. Тарашкевіч, А. Чарвякошў, Дз. Прышчэпаў і*** інш.

48.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэмы рэфератаў і курсаваых работ

1. Стан Заходняй Беларусі ў складзе польскай дзяржавы.
2. Прамысловасць Заходняй Беларусі ў 1920 – 1930-я гады
3. Сельская гаспадарка на заходнебеларускіх землях ў 20 – 30-я гг.
4. Нацыянальная палітыка польскіх улад у адносінах да беларускага насельніцтва на Заходняй Беларусі.
5. Беларускія нацыянальныя партыі на заходнебеларускіх землях ў 1920 – 1930-я гг.
6. Беларускі пасольскі клуб: яго склад і дзейнасць.
7. Таварыства беларускай школы і яго роля ў захаванні і развіцці нацыянальнай культуры беларусаў.
8. Барацьба працоўных Заходняй Беларусі за сацыяльныя і нацыянальныя правы.

Літаратура асноўная:

1. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы: В 2 т. Т. 1. 1921 – 1929 гг. Мн., 1962; Т. 2. 1929 – 1939 гг. Мн., 1972.
2. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 2.: Вучэб. Дапам./ Пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. Мн., 2005.
3. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917 – 1945 гг./ Пад рэд. М.П. Касцюка. Мн., 2006.
4. Кухарев Б.Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919 – 1939 гг.). Мн., 1975.
5. Полуян И.В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929 – 1933 гг. Мн., 1991.
6. Сорокин А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии. 1920 – 1939 гг. Мн., 1968.
7. Революционный путь Компартии Западной Белоруссии. Мн., 1966
8. Эканамічная гісторыя Беларусі / Пад рэд . В.І. Галубовіча. Мн., 1995, 2005.

Літаратура дадатковая:

1. Броўкін Я. Эканоміка Польшчы ў 1921 – 1929 гг. // Бел. гістарычны часопіс. 1997. № 3.
2. Вабішчэвіч А. Нацыянальная школа ўЗаходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.) // Бел. гістарычны часопіс. 1994. № 2.
3. Вабішчэвіч А Таварыства беларускай школы (1921 – 1936 гг.). // Бел. гістарычны часопіс. 1997. № 1.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Вабішчэвіч А Асвета ў Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.). Брэст. 2004.
5. Грэсь С.М. Аграрныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гг. Аўтарэф. дыс. канд. гіст. н. Мн. 2007.
6. Даніловіч В. Дзейнасць пасольскага клуба “Змаганне” ў польскім сейме // Назаўсёды разам. Мн., 1999.
7. Даніловіч В.В. Дзейнасць арганізацыі “Змаганне” ў Заходняй Беларусі (1927 – 1930 гг.) Аўтарэф. дыс канд.гіст.н. Мн., 2000.
8. Зелинский П.И. Политическая работа КПЗБ в массах. 1923 – 1938. Мн., 1986.
9. Калеснік У. З хронікі заходнебеларускага супраціўлення // Полымя. 1995. № 3.
10. Ладысеў У. Цяжкі шлях выпрабаванняў // Бел. гістарычны часопіс. 1994. № 1.
11. Ладысев В.Ф. В борьбе за демократические права и свободы (из исторического опыта Компартии Западной Белоруссии) (1926 – 1938 гг.) Мн., 1988.
12. Мараш Я.Н. Политика Ватикана и католической церкви в Западной Белоруссии (1918 – 1939) Мн., 1983.
13. Мілеўскі Ян. Заходняя Беларусь: да пытання тэрыторыі і насельніцтва // Бел. гістарычны часопіс. 1998. № 3.
14. Мацко А.Н. Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков. 1918 – 1939 гг. Мн., 1972.
15. Палуян У.А. Беларуская сялянска-рабочая грамада. Мн., 1967.
16. Пашкевіч А.В. Парламенцкія формы змагання за нацыянальныя і сацыяльныя правы беларускага народа ў міжваеннай Польшчы (1921 – 1930 гг.) Аўтарэф.дыс.кан.ніст.н. Мн., 2006.
17. Полуян В.А., Полуян И.В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920 – 1939 гг. Мн., 1962.
18. Станкевіч А. Беларусы як нацыянальная меншаць у Польшчы // Бел. гістарычны часопіс. 1995. № 2.
19. Царук Н. Тэатральная дзейнасць у Заходняй Беларусі // Бел. гістарычны часопіс. 2002. № 5.

Наглягныя матэрыялы

Карта “Заходняя Беларусь” // Атлас гісторыі Беларусі ад старажытнасці да нашых дзён. Мн., 2006. С. 106.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэсты для кантроля

Варыянт 1.

1. Рыжскі мір, згодна якому тэрыторыя Заходняй Беларусі апынулася ў складзе Польшчы, быў падпісаны:

а) 3 сакавіка 1918 г.
в) 18 сакавіка 1920 г.
б) 11 лістапада 1920 г.
г) ***18 сакавіка 1921 г.***

2. Тэрыторыя Заходняй Беларусі ў час яе знаходжання ў складзе Польскай дзяржавы падзелялася на ваяводствы:

а) ***Беластоцкае***
в) ***Віленскае***
е) ***Навагрудскае***
б) Берасцейскае
г) Гродзенскае
ж) ***Палескае***
д) Мінскае

3. Польскі ўрад у адносінах да насельніцтва Заходняй Беларусі павінен быў гарантаваць:

а) выкананне рэпарацыйных выплат
г) ***свабоднае выканан***не ***рэлігійных абрадаў***
б) ***свабоднае развіццё культуры***
д) свабоду нацыянальнага руху
г) ***свабоднае развіццё нацыянальнай мовы***

4. Заходнебеларускія землі ў складзе польскай дзяржавы вызначаліся польскімі ўладамі як:

а) Заходняя Беларусь
в) ***крэсы усходнія***
б) беларускія вобласці
г) частка беларускай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзяржавы

5. Тэрыторыя Заходняй Беларусі ў складзе польскай дзяржавы па сваяму эканамічнаму стану была:

а) ***аграрным прыдаткам***

б) ***крыніцай таннай сыравіны і рабочай сілы***

в) ***рынкам збыту***

г) развітым прамысловым рэгіёнам

6. Аграрная рэформа, якая праводзілася на заходнебеларускіх землях польскімі ўладамі, ўключала:

а) падзел памешчыцкіх зямель

б) санацыю

в***) парцэляцыю***

г) ***камасацыю***

д) асадніцтва

е) ліквідацыю сервітутаў

7. Нацыянальная палітыка польскіх улад у адносінах да насельніцтва Заходняй Беларусі была накіравана:

а) стварэнне ўмоў для адраджэння беларускай нацыі

б) ажыццяўленне беларусізацыі

в) ***паланізацыю беларускага насельніцтва***

г) стварэнне роўных умоў для ўсіх нацый.

8. Вызначце накірункі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

а) дваранскі

б) ***нацыянальна-дэмакратычны***

в) шляхецкі

г) ***рэвалюцыйна-вызваленчы***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

9. На тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічалі беларускія партыі і арганізацыі:

а) БСДП

б) БСГ

в) ***БСРГ***

г) ***БРА***

д) БХД

е) ***КПЗБ***

ж) ***КСМЗБ***

з) БПНС

10. Суаднясіце элементы дзвух мностваў (арганізацыі і іх дзеячы).

1) КПЗБ
2) БСРГ
3) БХД
4) КСМЗБ

а) В.Харужая
б) І. Лагіновіч
в) Б. Тарашкевіч
г) А. Станкевіч
д) К. Арлоўскі

(1-б, 2-в, 3-г,4-а)

11. Вызначце культурна-асветныя арганізацыі, утвораныя у Заходняй Беларусі, што спрыялі беларускаму нацыянальнаму адраджэнню і развіццю культуры.

а) ***Таварыства беларускай школы (ТБШ)***

б) Таварыства беларускай мовы (ТБМ)

в) ***Таварыства беларускай асветы (ТБА)***

г) ***Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры***

д) Таварыства філамантаў і філарэтаў

12. Дзеячы беларускай літаратуры ў Заходняй Беларусі:

а) Алаіза Пашкевіч

б) ***Максім Танк***

г) ***Яўген Скурко***

д) ***Піліп Пестрак***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

в) Сяргей Грахоўскі е) Янка Купала

13. Дзеячамі беларускага мастацтва ў Заходняй Беларусі з’яўляліся:

а) ***Я.Драздовіч*** в) ***П. Сергіевіч***

б) ***Я. Горыц*** г) В.Волкаў

14. Збіральнік фальклору і песень у Заходняй Беларусі, музыкант і . кіраўнік народнага хору. Гэта –

а) Адам Міцкевіч в) ***Рыгор Шырма***

б) Міхась Васілёк г) Алесь Салагуб

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

МЕТАДЫЧНЫ БЛОК

Па гісторыі Беларусі перыяду 1917 – 1939 гг. прапануюцца наступныя

Тэмы рэфератаў

1.Становішча на акупаванай Беларусі ў 1917г.
2.Органы Часовага урада і Саветы на Беларусі ў 1917 г.
3.З”езд бел.нац.арганізацый ў сакавіку 1917 г.
4.З”езд бел. нац. арганізацый ў ліпені 1917 г.
5. БСГ ў 1917 годзе.
6.Вынікі выбараў ва Ўстаноўчы сход на Беларусі.
7.Шляхі і формы ўсталявання савецкай ўлады на Беларусі.
8.Палітыка “ваеннага камунізма” на Беларусі.
9.Мяцеж корпуса Доўбар-Мусніцкага.
10.Усебеларускі з”езд у снежні 1917 г.
11.Абвяшчэнне БНР, яе устаўныя Граматы.
12.Культурна-асветніцкая дзейнасць БНР.
13.*Тэсты па гісторыі Беларусі перыяду 1917 – 1918 гг.*
14.Барацьба за стварэнне ССРБ.
15.Абвяшчэнне ССРБ і яе лёс ў 1919 годзе.
16.А.Луцкевіч аб польскай акупацыі Беларусі.
17.Слуцкае паўстанне.

18. Рыжскі мір і яго вынікі для Беларуси
19. *Тэсты па перыяду 1919 – 1920 гг.*
20.Умовы пераходу да НЭПа на Беларусі
21.Прамысловасць Беларусі у перыяд нэпа
22.Прамысловасць БССРу гады першых пяцігодак.
23.Сельская гаспадарка БССР ва ўмовах нэпа.
24.Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў БССР.
25.Грамадска-палітычнае жыццё у БССР у 20-30-я гг.XX ст.
26.Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў БССР.
27.Кампартыя Беларусі ў 20-30-я гады
28.Палітыка беларусізацыі
29.Культура Сав.Беларусі перыяда 20-30-х гг. XX ст.
30.Адукацыя і навука у БССР у 1920 – 1930-я гг.
31.Беларускае замежжа
32.Рэпрэсіі на Беларусі у 20 – 30-я гады XX ст.
33. *Тэсты па перыяду 1921 – 1939гг.*
34.Стан Заходняй Беларусі у 20-30-я гг. XX ст.
35.Сацыяльна-экан. становішча заходнебеларускіх зямель.
36.Грамадска-палітычнае жыццё на Заходняй Белеларусі.
37.Культура і адукацыя на Зах.Беларусі 1920-1930-х гг.
38.Барацьба працоўных Заходняй Беларусі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.
39.*Тэсты па Зах. Бел. перыяда 1921-1939гг.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэмы курсавых работ

Тэма 1. Першая сусветная вайна на тэрыторыі Беларусі

Уводзіны
1.Пачатак вайны.Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі у 1915-1916гг.
2.Становішча на беларускіх землях падчас вайны. Бежанцтва.
3.Нямецкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі.
4.Наступленне нямецкіх войскаў у пачатку 1918г.Брэсцкі мір.
5.Партызанская і падпольная барацьба супраць нямецкіх акупантаў.
6.Заканчэнне першай сусветнай вайны.
Заключэнне.
Крыніцы і літаратура: 4, 9, 12, 13, 14, 43, 50, 56, 60, 62, 66.

Тэма 2. Беларускі нацыянальны рух у 1917 годзе.

Уводзіны.

1.Умовы і асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця пасля Лютаўскай рэвалюцыі.

2.З’езд прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску ў сакавіку 1917 года. БНК і яго дзейнасць.

3.З’езд беларускіх нацыянальных арганізацый у ліпені 1917 г. Дзейнасць ЦРБА.

4.Беларуская сацыялістычная Грамада ў 1917 годзе.

Заключэнне.

Крыніцы і літаратура: 7, 11, 12, 13, 14, 18, 19, 21, 27, 43, 44, 45, 51, 58, 66.

Тэма 3. Савецкая улада ў Беларусі ў 1917 – 1919 гг.

Уводзіны.

1.Шляхі і формы ўсталявання Савецкай улады ў Беларусі і на Заходнім фронце. Вынікі выбараў ва Устаноўчы сход.

2.Першыя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя мерапрыемствы Савецкай улады. Палітыка “ваеннага камунізма”.

3.Мяцеж карпуса Доўбар-Мусніцкага.

4.Адносіны насельніцтва Беларусі да Савецкай улады.

Заключэнне.

Крыніцы і літаратура: 5, 8, 11, 12, 13, 19, 20, 24, 43, 58, 59, 64, 66.

Тэма 4. Усебеларускі з’езд (кангрэс) у снежні 1917 года.

Уводзіны.

1. Падрыхтоўка да склікання з’езда. Роля і пазіцыі ВБР , БАКа і Савецкай улады.

2.Адкрыццё ўсебеларускага з’езда (кангрэса), склад ўдзельнікаў і іх погляды на лёс Беларусі.

3.Рашэнні з’езда, адносіны да Савецкай улады.

4.Разгон (закрыццё) з’езда і водгукі на яго.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5.Гістарычнае месца ўсебеларускага з’езда (кангрэса) у барацьбе за беларускаю дзяржаўасць.

Заключэнне.

Крыніцы і літаратура: 3, 12, 13, 14, 16, 18, 19, 27, 43, 61, 66.

Тэма 5. Беларуская Народная Рэспубліка – першая спроба стварэння Беларускай дзяржаўнасці.

Уводзіны.

1.Гістарычны шлях да стварэння БНР. Геапалітычнае становішча Беларусі у 1918 годзе.

2.Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Устаўныя Граматы.

3.Культурна-асветніцкая і дыпламатычная дзейнасць БНР.

4.Беларускі нацыянальны рух. Раскол БСГ.

5. Гістарыяграфія і сучасныя ацэнкі БНР.

Заключэнне.

Крыніцы і літаратура: 2, 7, 12, 13, 19, 26, 30, 33, 37, 39, 43, 46, 48, 53, 63, 66.

Тэма 6. Утварэнне БССР.

Уводзіны.

1.Барацьба за стварэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці.

2.Абвяшчэнне ССРБ.

3. Першы савецкі урад і першы з’езд Саветаў Беларусі.

4. Стварэнне ЛітБела.

Заключэнне.

Крыніцы і літаратура: 5, 12, 13, 24, 25, 28, 30, 32, 33, 35, 37, 43, 48, 52, 54, 57, 65, 66.

Тэма 7. Савецка-польская вайна на тэрыторыі Беларусі.

Уводзіны.

1.Мэты польскай агрэсіі супраць Беларусі. Ваенныя дзеянні у 1919 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2.Польскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі.

3.Беларускі нацыянальны рух. Барацьба насельніцтва супраць акупантаў.

4.Ваенныя дзеянні у 1920 годзе. Заканчэнне вайны.

5. Рыжскі мір і яго вынікі для Беларусі.

Заключэнне.

Крыніцы і літаратура: 1, 6, 10, 12, 13, 15, 23, 31, 34, 38, 40, 41, 42, 43, 49, 55, 66.

Крыніцы і літаратура.

1. Астрога В. Пад крыламі белага арла.// Полымя. 2001. № 8

2. Багдановіч А.Г. Незалежнасць, адарваная ад народа, застаецца ілюзіяй.// Беларуская думка. 1996. № 7.

3.Багдановіч А.Г. Праблема нацыянальнай дзяржаўнасці на I усебеларускім з'ездe. // Гуманітарна-эканамічны веснік. 1997. № 3.

4.Бежанцы першай сусветнай вайны. //Спадчына. 1994. № 3.

5.Борьба за Советскую власть в Белоруссии: Сб. документов и материалов. В 2 ч. Мн., 1968.

6.В Риге 70 лет тому назад: Письма А.Червякова о советско-польских переговорах. // Коммунист Белоруссии.1991. № 9.

7. Варонка Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 . Мн.,1991.

8.Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Мн., 1957.

9. Вержиховский Д.В., Ляхов В.Ф. Первая мировая война 1914—1918 гг. Военно-исторический очерк. М., 1964.

10. Волаціч Н. Лінія Керзона на фоне падзей і тэрытарыяльных зменаў ў ўсходняй Эўропе. // Спадчына.1993. № 5.

11. Гігін В. Узаемаадносіны бальшавікоў і левых эсэраў у Заходняй вобласці (лістапад 1917-чэрвень 1918). // Беларускі гістарычны часопіс.2001. № 5.

12. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. Мн., 1972-1978.

13. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / Пад рэд. Я.К.Новіка, Г.С.Марцуля. Мн., 1998.

14. Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994.

15. Дуж-Душэўскі К. Беларусь і рыжскі мір. // Спадчына. 1995. № 6.

16. Езовитов К. Воспоминания // Неман. 1993. № 3.

17. Езавітаў К. Першы ўсебеларускі кангрэс // Беларуская мінуўшчына. 1993. № 1.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

18. Захарка В. Галоўныя моманты беларускага руху. // Спадчына. 1997. № 5.

19. Игнатенко И.М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии. Мн., 1992.

20. Игнатенко И. Октябрь без краски . // Беларуская думка. 1993. № 11.

21. Ігнаценка І. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. у Расіі: мэты і здзяйсненні.// Беларускі гістарычны часопіс. 1997. № 2.

22. Ігнаценка І. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 1997. № 4.

23. Иностранная военная интервенция в Белоруссии. 1917-1920 гг. Мн., 1990.

24. Калеснікаў В. Кіраванне прамысловасцю Беларусі ў 1918-1920 гг.// Беларускі гістарычны часопіс. 1998. № 2.

25. Калубовіч А. Айцы БССР і іхны лёс.// Спадчына. 1990. № 3-4; Крокі гісторыі. Мн., 1993.

26. Калубовіч А. Акт 25 сакавіка і адраджэнне нацыянальнай беларускай культуры.// Спадчына. 1992. № 1; Крокі гісторыі. Мн., 1993.

27. Каменская Н.В., Селиванов П.А. Великий Октябрь в Белоруссии. Мн., 1977.

28. Канчер Е.С. Из истории общественных, национальных и революционных движений белорусов. // Неман. 1993. № 1.

29. Кнорын В. Восемь масяцаў Савецкай Беларусі.// Избранные речи и статьи. Мн., 1990.

30. Круталевіч В.А. Станаўленне дзяржаўнасці. Мн., 1989.

31. Круталевіч В.А. Рыжскі мірны дагавор.// Спадчына. 1990. № 1.

32. Круталевич В.А. Рождение Белорусской советской республики. Мн., 1995.

33. Круталевич В.А. На путях нацирнального самоопределения.БНР-БССР-РБ. Мн., 1995.

34. Ладысеў У. Рыжскі мірны дагавор: перамога савецкай дыпламатыі ці паражэнне? // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. №. 3.

35. Лебедзева В. Стракапытаўскі мяцеж.// Беларуская мінуўшчына. 1995. №. 4.

36. Лёсік Я. Аўтаномія Беларусі // Спадчына. 1990. № 3.

37. Лойка Л. БНР-БССР: звёны аднаго працэсу. // Звязда. 1990. 23 сакавіка.

38. Луцкевіч А. Польская акупацыя ў Беларусі // Беларусь. 1990. № 9.

39. Мазец В. Межы БНР // Спадчына. 1998. № 2.

40. Мезга М. Мяжа канфрантацыі // Беларуская мінуўшчына. 1996. № 2.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

41. Мілеўскі Я. Адносіны польскіх войскаў да насельніцтва Беларусі (1919-1920) // Беларускі гістарычны часопіс. 1996. № 4.

42. Мирный Договор между Россией и Украиной, с одной стороны., и Польшей – с другой. // Спадчына. 1993. № 4.

43. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Мн.,1994,1995.

44. Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. Гомель.1993.Ч.2.

45. Палітычныя партыі Беларусі: Дапам. Для вывучаючых гісторыю Беларусі. Мн., 1993.

46. Паўлава Т.Я. Знешнепалітычная дзейнасць і дыпламатыя БНР у 1918 г. // Беларускі гістарычны часопіс. 2000. № 1.

47. Платонаў Р., Шумейка М. Невядомая вайна? Дакументальна-архіўныя сведчанні пра перыяд акупацыі беларускіх зямель у 1919-1920 гг // Звязда. 1991. 15,16 красавіка.

48. Платонов Р., Сташкевич Н. Тернистый путь к свободе. К вопросу о становлении белорусской национальной государственности. // Неман. 1992. № 10-11.

49.Платонов Р. В объятиях «начальника державы Польскай» // Беларуская Думка. 1999. № 4.

50. Платонаў Р. Пад пятой германскага кайзера. // Беларускі гістарычны часрпіс. 2001. № 2, 5.

51. Пратакол з’езда беларускіх нацыянальных арганізацый у Менску 25-27 сакавіка 1917 года // Спадчына. 1990. № 4.

52. Ракашэвіч У. Дзеля чаго і кім была створана Літоўска-Беларуская рэспубліка. // Звязда. 1994. 25 лютага.

53. Рудовіч С. Пошукі шляхоў да беларускай дзяржаўнасці // Бнларускі гістарычны часопіс. 1995. № 4.

54. Сарокін А.М. На ростанях айчыннай гісторыі: Беларуская вёска: ад Дэкрэта да Кодакса аб зямлі (1917-1990-я гады).Мн., 1999.

55. Сафонаў М. Польская інтэрвенцыя Беларусі у 1919 г. і яе сувязь з міжнародным імперыялізмам. // Весці АН БССР. Сер.грам. навук. 1990. № 4

56. Смалянінаў М. Трагедыя пачатку XX стагоддзя // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 4

57. Снапкоўскі У. Знешнепалітычная дзейнасць Беларускай ССР.(1919-1929гг) // Беларускі гістарычны часопіс.2001. № 3.

58. Сяменчык М. Лютаўская рэвалюцыя на Беларусі // Гуманитарно-экономический вестник. 1997. № 3.

59. Сяменчык М. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.): У 2 ч. Мн., 2001.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

60. Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Мн., 1993.

61. Усебеларускі з’езд 1917 г.: сведчанне сучасніка // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 1.

62.Шчаўлінскі М. Бежанцы і беларускі нацыянальны рух у гады першай сусветнай вайны // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 3.

63. Цвикевич А. Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики. Мн., 1990.

64. Цвыроў Л. Вынікі выбараў ва Устаноўчы сход на Заходнім фронце. //Веснік БДУ. Сер.3. 1992. № 2.

65. Эканамічная гісторыя Беларусі. Мн., 1995.

66. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн..1993-2001.

БЕЛАРУСЬ У МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1921-1939 гг)

Тэма 1. Новая эканамічнаяч палітыка у Беларусі

Уводзіны.

1. Умовы і асаблівасці пераходу да Новай эканамічнай палітыкі.
2. Прамысловае развіццё у БССР ва умовах НЭПа.
3. Сельская гаспадарка і беларуская вёска ва умовах НЭПа.
4. Сацыяльна - эканамічныя праблемы існавання беларускага грамадства ў 1920-я гады.

Заключэнне.

Крыніцы і літаратура: 14, 15, 16, 27, 29, 38, 54, 59.

Тэма 2. Эканоміка савецкай Беларусі ў гады першых пяцігодак (1928-1937гг)

Уводзіны

1. Адыход ад прынцыпаў НЭПа і фарміраванне камандна-адмінастратыўнай сістэмы
2. Прамысловае развіццё і ажыццяўленне палітыкі індустрыялізацыі
3. Калектывізацыя селькай гаспадаркі і яе вынікі.
4. Вынікі эканамічнага развіцця за гады першых пяцігодак.

Заключэнне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Крыніцы і літаратура: 2, 7, 8, 12, 13, 14, 15, 18, 27, 38, 46, 47, 48, 54, 55, 56, 57.

Тэма 3. Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1920-1930-я гады

Уводзіны

1.Грамадскія арганізацыі і партыі: склад, умовы існавання і дзейнасці.

2.Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі , яе месца і роля у жыцці савецкага грамадства.

3.Барацьба дэмакратычнай і таталітарнай тэндэнцый у грамадска-палітычным жыцці.

Заключэнне.

Крыніцы і літаратура: 11, 14, 15, 24, 25, 36, 38, 40, 43, 57.

Тэма 4. Рэпрэсіі 1920-1930-х гадоў у Беларусі.

Уводзіны

1. Палітычныя і ідэалагічныя вытокі рэпрэсій у савецкім грамадстве 1920-1930-х гадоў.

2. Палітычныя рэпрэсіі. Справа СВБ.

3. Рэпрэсіі супраць кіруючых кадраў, беларускай інтэлігенцыі, камуністычнай партыі.

4. Масавыя рэпрэсіі і іх вынікі.

Заключэнне.

Крыніцы і літаратура: 1, 11, 12, 14, 15, 23, 24, 25, 38, 40, 41, 42, 43, 44, 45, 57.

Тэма 5. Культурнае жыццё Савецкай Беларусі 1920-1930-х гадоў.

Уводзіны

1. Палітыка савецкай ўлады і камуністычнай партыі у духоўнай сферы.

2. Развіццё і стан адукацыі.

3. Развіццё навукі.

4. Літаратура і мастацтва Савецкай Беларусі.

Заключэнне.

Крыніцы і літаратура: 3, 14, 15, 30, 33, 38, 57.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма 6. Беларускае замежжа ў 1920-1930-я гады.

Уводзіны

1. Гісторыя беларускай эміграцыі.

2. Прычыны палітычнай эміграцыі у пачатку XX ст.

3. Склад беларускага замежжа і яго адносіны да Савецкай Беларусі.

4. Палітычнае і культурнае жыццё беларускай эміграцыі.

Заключэнне.

Крыніцы і літаратура: 14, 21, 32, 38, 45, 49, 50, 51, 53, 57.

Тэма 7. Палітыка беларусізацыі ў 1920-1930-я гады.

Уводзіны

1. Нацыянальная палітыка Савецкай ўлады і камуністычай партыі.

2. Перадумовы і вытокі палітыкі беларусізацыі.

3. Распрацоўка, прыняцце і змест дзяржаўнай палітыкі беларусізацыі.

4. Ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі, яе дасягненні і цяжкасці.

5. Згортванне палітыкі беларусізацыі у 1930-я гады.

Заключэнне.

Крыніцы і літаратура: 4, 14, 15, 19, 22, 33, 34, 38, 57.

Тэма 8. Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы

(1921-1939 гг.)

Уводзіны.

1. Палітыка польскіх улад у адносінах да насельніцтва Заходняй Беларусі.

2. Сацыяльна-эканамічнае становішча заходнебеларускіх земляў.

3. Грамадска-палітычнае жыццё на Заходняй Беларусі.

4. Асветніцтва і культура.

5. Барацьба працоўных Заходняй Беларусі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

Заключэнне.

Крыніцы і літаратура: 5, 6, 9, 10, 14, 15, 17, 20, 26, 28, 31, 35, 37, 38, 39, 52, 56, 57.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Крыніцы і літаратура.

1.Адамушка У. Палітычныя рэпрэсіі 20-50-х гадоў на Беларусі. Мн.,1994.

2.Асмалоўскі У. Калектывізацыя ў Беларускай ССР: вопыт і ўрокі. Мн., 1991.

3. Баталка Г. З гісторыі будаўніцтва нацыянальнай беларускай школы (1919-1922 гг.) // Веснік БДУ. 1992. Серыя 3. № 2

4. Беларусізацыя, 1920-я гады: Дакументы і матэрыялы. Мн., 2001.

5. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы. В 2 т. Мн., 1962,1972.

6. Броўкін Я. Эканоміка Польшчы ў 1921-1929 гг. // Беларускі гістарычны часопіс. 1997. № 3.

7. Бяспалая М.А. Эканамічнае развіццё беларускай вёскі (20-я гг. XX ст) // Беларускі гістарычны часопіс. 1997. № 1.

8. Бяспалая М. Стварэнне калектыўных гаспадарак на Беларусі ў першыя гады НЭПа. // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 2.

9.Вабішэвіч А. Нацыянальная школа ў Заходняй Беларусі (1921-1939 гг) // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 2.

10.Вабішэвіч А. Таварыства беларускай школы (1921-1936 гг) // Беларускі гістарычны часопіс. 1997. № 1.

11. Вакар Н. Ліквідацыя беларускага нацыяналізму. // Спадчына. 1992. №6.

12. Врублевский А., Протько Т. Из истории репрессий против белорусского крестьянства. 1928-1933. Мн., 1992.

13. Вышынскі У. Індустрыялізацыя БССР // Актуальныя пытанні гісторыі БССР. Мн., 1991.

14. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. / Пад рэд. Я.К Новіка, Г.С. Марцуля. Ч.2. Мн., 2000.

15. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Т. 3. Мн. 1976.

16. Гудаў М. Узброеная барацьба на Беларусі ў 1921 г. // Беларускі гістарычны часопіс. 1997. № 3.

17. Заходняя Беларусь: культурная спадчына забытага дваццагіоддзя. // Спадчына. 1994. № 6.

18. История рабочего класса Белорусской ССР.В 2 т. Мн., 1984-1987.

19. Калеснік У. Контрбеларусізацыя. // Спадчына. 1992. № 4.

20. Калеснік У. З хронікі заходнебеларускага супраціўлення // Полымя. 1995. № 3.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

21. Калубович А. Восемь волн белорусской эмиграции.//Неман.1992.№ 2.

22. Кароль А. Беларусізацыя – палітыка нацыянальнага адраджэння. // Крыжовы шлях. Мн., 1993.

23. Касцюк М., Міхнюк У. Рэпрэсіі – самае цяжкае злачынства таталітарнага рэжыму. // Крыжовы шлях. Мн., 1993.

24. Касцюк М. П. Сталіншчына і Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 1995. № 1, 2.

25. Касцюк М.П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі (1917-1994 гг). Мн., 2000.

26. Каўко А. Беларускі вызваленчы рух // Спадчына. 1991. № 5.

27. Котаў А. Змешаная эканоміка ў Беларусі (ў 20-я гады XX ст.) // Полымя. 1993. № 9.

28. Кухарев Б.Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919-1939 гг). Мн., 1975.

29. Кушнер В. Новая эканамічная палітыка (нэп) у Беларусі. // Матэрыялы па гісторыі Беларусі. Мн., 1997.

30. Красовский Н. Высшая школа Советской Белоруссии. Мн., 1972.

31. Ладысеў У. Цяжкі шлях выпрабаванняў // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 1. .

32. Ладысеў У., Брыгадзін П. Рада БНР пасля Рыжскага дагавора 1921 г., ці канец нацыянальнага рамантызму//Беларускі гістарычны часопіс.1997.№ 1.

33. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мн., 1996.

34. Лыч Л. Беларусізацыя 20-х гадоў. // Маладосць. 1995. № 11,12.

35. Мацко А.Н. Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков (1918-1939). Мн., 1972.

36. Медзянік У., Жайваронак А., Гайдукевіч Л. Маладзёжны рух у Беларусі (1918-1930 гг.) // Веснік БДУ. Сер.3. 1992. № 2.

37. Мілеўскі Я. Заходняя Беларусь: да пытання тэрыторыі і насельніцтва // Беларускі гістарычны часопіс. 1998. № 3.

38. Нарысы гісторіі Беларусі: У 2 ч. Ч.2. Мн., 1995.

39. Полуян В. Западная Беларусь в период экономического кризиса (1929-1938 гг.). Мн.. 1991.

40. Перед крутым поворотом: Тенденции в политической и духовной жизни Беларуси (1925-1928 гг.). Отражение времени в арх. документах. Мн., 2001.

41. Платонаў Р., Сташкевіч М. Дзве аперацыі супраць “ворагаў народа” // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 1.

42. Платонов Р. Эпидемия зла // Беларуская Думка. 1993. № 1.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

43. Платонаў Р.П. Беларусь у міжваенны перыяд. Старонкі палітычнай гісторыі ў святле архіўных крыніц. Мн., 2001.

44. Правда истории: память и боль. Мн., 1991.

45. Сакалоў М.К. Рэпрэсіі 20-30-х гадоў на Беларусі. Беларускае замежжа ў 20-30-я гады. // Матэрыялы па гісторыі Беларусі. Мн., 1997.

46. Сарокін А. Церні калектывізацыі // Полымя. 1990. № 2.

47. Сарокін А. М. На ростанях айчынай гісторыі. Беларуская вёска ад Дэкрэта да Кодакса аб зямлі (1917- 1990-я гады). Мн., 1999.

48. Сасноўскі П. Паўстагодзьдзя трагедыі нашага сялянства // Спадчына. 2000. № 5/6.

49. Сачанка Б. Беларуская эміграцыя: факты і меркаванні. // Сняцца сны аб Беларусі.... Мн., 1990.

50. Сачанка Б. Беларуская эміграцыя. Мн., 1991.

51. Снапкоўскі У. Эміграцыя. // Полымя. 1995. № 11,12.

52. Станкевіч А. Беларусы як нацыянальная меншасць у Польшчы // Беларускі гістарычны часопіс. 1995. № 2.

53. Сяргеева Г. Беларуская дыяспара // Крыжовы шлях. Мн., 1993.

54. Ходзін С. Хутары на Беларусі. // ЛіМ. 1992. № 40.

55. Шыбека З. Ці былі кулакі на Беларусі // ЛіМ. 1991. № 12.

56. Эканамічная гісторыя Беларусі. Мн.,1995.

57. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн. 1993-2001.

Метарычныя рэкамендацыі па падрыхтоўкі курсавых і дыпломных работ

Вучэбным планам гістарычнага факультэта прадуглежваецца абавязковае выкананне курсавой работы па гісторыі Беларусі. Па жаданню студэнтаў выпускных курсаў імі рыхтуюцца дыпломныя работы, у тым ліку і па праблемах гісторыі Беларусі. Курсавыя і дыпломныя работы маюць сваёй мэтай сістэматызацыю, замацаванне і пашырэнне тэарэтычных і практычных ведаў, паглыбленнае вывучэнне актуальных праблем гістарычнага мінулага Беларусі, авалоданне метадалогіяй навуковага даследвання, набыццё навыкаў працы з першакрыніцамі і літаратурай, афармлення навуковага апарату.

Для дапамогі і кантролю за выкананнем курсавой работы кафедра вылучае кожнаму студэнту навуковага кіраўніка са складу сваіх супрацоўнікаў. Для выканання дыпломнай працы яе аўтар па сваяму жаданню сам абірае навукова кіраўніка з прафесарска-выкладчыцкага складу

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

кафедры, які, пасля атрымання яго згоды, зацвярждаецца загадам дэкана факультэта

Выбар тэмы

Кафедра гісторыі Беларусі прапануе тэматыку ***курсавых*** і ***дыпломных*** работ, якая ахоплівае перыяд ад старажытных часоў да сённяшніх дзён, высвятляе разнастайныя праблемы гістарычнага мінулага беларускага народа. Кожны студэнт па сваяму уласнаму жаданню сумесна з навуковым кіраўніком вызначае тэму курсавога даследвання ці дыпломнай працы у адпаведнасці са сваімі інтарэсамі, сваёй зацікаўленасцю да вывучэння таго ці іншага перыяда, той ці іншай праблемы. Дапускаецца удакладненне, канкрэтызацыя названых кафедрай тэм курсавых і дыпломных прац, альбо прапанаванне іншых тэм з улікам іх актуальнасці. Пасля узгаднення з навуковым кіраўніком тэмы курсавой работы яна зацвярждоецца кафедрай, а тэма дыпломнай працы – загадам па факультэту. Змяненне тэмы пасля яе зацвярджэння дапускаецца толькі у выключных выпадках, на падставе абгрунтаванных прычын і пры згодзе навуковага кіраўніка. Пасля абрання тэмы ***дыпломнай*** работы і яе зацвярджэння, аўтар разам з навуковым кіраўніком складаюць план-заданне па яе выкананню, які зацвярджаецца кафедрай.

Выкананне курсавой і дыпломнай работы

Працу над работай мэтазгодна пачаць з агульнага знаёмства са зместам праблем, якія будуць даследвацца ў абранай тэме, акрэслены у прапанаванай кафедрай тэматыцы як план работы. Для гэтага варта звярнуцца да падручнікаў ці дапаможнікаў па гісторыі Беларусі для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, агульнавядомай літаратуры. Гэта дасць магчымасць уявіць асноўныя напрамкі вывучэння праблемы, яе змест, месца у гістарычным працэсе, асэнсавана падыйсці да складання плана.

План даследвання у выглядзе ***курсавой*** работы, як правіла, уключае “уводзіны”, прыкладна 3-4 асноўных раздзелаў, “заключэнне”, а таксама спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры. Калі ёсць неабходнасць, у канцы работы могуць быць змешчаны у якасці “дадаткаў” дыяграмы, табліцы, схемы, ілюстрацыі ці іншы дадатковы матэрыял. Дакладныя фармуліроўкі асноўных частак плана мэтазгодна ўзгадніць з навуковым кіраўніком. У ***дыпломнай*** працы, якая з’яўляецца больш змястоўнай у параўнанні з курсавой, колькасць асноўных частак плана можа быць павялічана, яны могуць быць у выглядзе глаў з наяўнасцю параграфаў у іх.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пасля гэтага пачынаецца праца па вывучэнню асноўных гістарычных першакрыніц, збору фактычнага матэрыяла, вывучэнню навуковых прац і публікацый па тэме даследвання. Асноўныя крыніцы і літаратура названыя у прапанавым выданні па стану на канец 2001 года, складаюць абавязковы мінімум адпаведна да кожнай тэмы курсавой работы. У дыпломнай рабоце неабходна пашырыць кола першакрыніц і літаратуры, асабліва за кошт вывучэння публікацый у навуковых часопісах, матэрыялах канферэнцый, дысертацыйных даследванняў. Для пошука такіх выданняў мэтазгодна выкарыстоўваць даведкава-бібліяграфічныя аддзелы бібліятэк, бібліяграфіцныя выданні і работы. Пры выкананні дыпломных работ асобную каштоўнасць уяўляюць архіўныя матэрыялы, матэрыялы музеяў па тэме даследвання.

Сабраны фактычны і навуковы матэрыял неабходна сістэматызаваць, асэнсаваць, пасля чаго можна пераходзіць да напісання непасрэдна тэкста асноўных раздзелаў у адпаведнасці з вызначаным планам. Па усіх пытаннях, якія узнікаюць на працягу працы над курсавой ці дыпломнай работы, студэнт мае права звяртацца за парадамі да навуковага кіраўніка.

Асноўныя патрабаванні да курсавой і дыпломнай работы

Курсавая работа па гісторыі Беларусі павінна быць смастойным і творчым даследваннем адной з праблем гістарычнага мінулага на падставе вывучэння гістарычных крыніц і навуковай літаратуры. ***Дыпломная*** работа у большай ступені павінна адлюстроўваць розныя падыходы да вывучэння і асэнсавання гістарычных фактаў і падзей, існуючыя у навуковай літаратуры. Яна павінна таксама адлюстроўваць асабістую пазіцыю аўтара работы у навуковых дыскусіях, абгрунтаванаю доказамі і разважаннямі.

Галоўнымі метадалагічнымі прынцыпамі навуковага даследвання павінны быць аб’ектыўнасць і гістарызм у высвятленні прычын і умоў з’яўлення канкрэтных падзей ці тэндэнцый развіцця, іх сутнасці і зместа, гістарычнага уплыву на стан беларускага грамадства і гістарычны лёс народа Беларусі. Неабходна крытычна ставіцца да існуючых пунктаў гледжання на тую ці іншую праблему, якія сустракаюцца у гістарычных выданнях ранейшых гадоў і сучасных публікацыях.

Ва “уводзінах***”*** ***курсавой*** работы павінна быць: - абгрунтаванне актуальнасці тэмы даследванне і вызначэнне яе храналагічных межаў; - бібліяграфічны агляд інуючых па тэме першакрыніц і літаратуры; - фармуліроўка мэты, якая ставіцца ў даследванні, і задач, які вырашаюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пры яго правядзенні. Ва “уводзінах” ***дыпломнай*** работы акрамя таго, неабходны: - крытычны аналіз поглядаў і ацэнак, якія існуюць па праблеме у розных выданнях і розных даследчыкаў; - вызначэнне уласнай пазіцыі аўтара работы ў дачыненні да спорных і дыскусійных праблем; - ацэнка сучаснага стану навуковай распрацоўкі і асвятлення ў айчыннай і замежнай літаратуры абранай праблемы; - высвятленне поглядаў і ацэнак, якія з’яуляюцца спрэчнымі і патрабуюць перагляду ці удакладненняў.

У асноўных частках (раздзелах, главах) даследвання, якія вызначаны планам, прыводзіцца дакладна-гістарычны матэрыял, які раскрывае абраную тэму. Неабходна звярнуць асобную увагу на паслядоўнасць і паўнату гістарычных звестак, іх храналагічную паслядоўнасць і лагічную сувязь. У канцы кожнага раздзела павінны быць абгрунтаваныя і аргументаваныя фактычным матэрыялам абагульненні і вывады, да якіх прыйшоў аўтар работы.

У “заключэнні” неабходна падвесці асноўныя вынікі праведзеннага даследвання, даць гістарычную ацэнку з’яў і фактаў, сучаснае навуковае бачанне праблемы.

Спіс выкарыстанах першакрыніц і літаратуры уключае ўсе выданні, якімі карыстаўся аўтар работы пры распрацоўкі тэмы, а таксама пералік архіўных фондаў і спраў, на якія ёсць спасылкі у дыпломнай рабоце.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГГУ

Афармленне работы

Тытульны ліст курсавой ці дыпломнай работы афармляецца у адпаведнасці з прыведзенымі узорамі

Узор тытульнага ліста курсавой

работы

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўы педагагічны універсітэт імя М.Танка”

Кафедра гісторыі Беларусі

КУРСАВАЯ РАБОТА

н а з в а

студэнта гістарычнага факультэта

_____ курса _____групы

прозвішча і ініцыялы

Навуковы кіраўнік

вучоная ступень, пасада

прозвішча і ініцыялы

Мінск, 20_

Узор тытульнага ліста дыпломнай работы

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя М.ТАНКА”

Гітарычны факультэт

Кафедра гісторыі Беларусі

ПРОЗВІШЧА, Імя, Імя па бацьку

Н А З В А

Дыпломная работа студэнта

дзённай (завочнай) формы навучання

Навуковы кіраўнік:

вучоная ступень, пасада

прозвішча, ініцыялы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск , 20__

На асобнай старонцы прыводзіцца план курсавой ці дыпломнай работы з указаннем нумароў лістоў, на працягу якіх змешчана кожная частка.

Назвы ўсіх раздзелаў у тэксце работы вылучаюцца паасобку.

Навуковы бібліяграфічны апарат (цытаты, спасылкі на крыніцы пры выкарыстоўванні фактыў, лічбаў, цытат і інш.) афармляецца па правілах, якія ужываюцца ў навуковых выданнях.

Спіс першакрыніц і літаратуры у канцы работы даецца ў алфавітнай паслядоўнасці з дакладным указаннем месца і года выдання.

Усе старонкі работы павінны быць пранумераваны. Яна павінна быць напісана разборліва і акуратна. На апошнім лісце работы аўтар ставіць свой асабісты подпіс.

Агульны памер курсавой работы прыкладна складае да 30 старонак, дыпломнай – да 50 старонак.

Абарона курсавой і дыпломнай работы

Пасля напісання работы аўтар прадстаўляе тэкст навуковаму кіраўніку для азнаямлення. Навуковы кіраўнік можа зрабіць заўвагі, выказаць пажаданні па яе зместу і афармленню. Пры неабходнасці, работа дапрацоўваецца, афармляецца адпаведным чынам.

Навуковы кіраўнік у залежнасці ад ступені гатоўнасці работы дае заключэнне аб магчымасці вынясення яе на абарону, прадстаўляе водзыў на яе.

Абарона ***курсавой работы*** адбываецца у тэрміны, вызначенные кафедрай. Кафедрай ствараецца камісія у складзе не менш 3-х чалавек з ліку супрацоўнікаў кафедры, на паседжанні якой адбываецца абарона курсавой работы. Аўтару работы прадстаўляецца слова для паведамлення аб змесце і вынікаў праведзеннага даследвання, яму могуць быць заданы пытанні па тэме. На падставе знаёмства са зместам курсавой работы і яе абароны аўтарам камісія дае адзнаку, якая ўносіцца ў заліковую кніжку і падпісваецца усімі членамі камісіі.

Дыпломная работа за месяц да вызначанага тэрміна абароны прадстаўляецца на кафедру з водгукам навуковага кіраўніка. На паседжанні кафедры адбываецца папярэдняя экспертыза дыпломнай работы, на падставе якой прымаецца рашэнне аб яе гатоўнасці і допуску да абароны. На падрыхтаваную дыпломную работу даецца таксама рэцэнзія аднаго з прафесароў ці дацэнтаў факультэта.

Абарона дыпломнай работы адбываецца на паседжанні Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі і афармляецца адпаведным яе пратаколам. Дыпломная работа з'яўляецца кваліфікацыйнай працай выпускніка. Па ўзроўню выканання дыпломнай работы і вынікам яе абароны Дзяржаўная экзаменацыйная камісія робіць заключэнне аб магчымасці прісуджэння выпускніку адпаведнай кваліфікацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

КАНТРОЛЬНЫ БЛОК

ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНА ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ 1917 – 1939 гг.

НА ІІІ КУРСЕ (VI семестр) ДЗЁННАГА АДДЗЯЛЕННЯ.

1. Становішча на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1917 годзе.
2. Нацыянальная палітыка нямецкіх акупацыйных улад на тэрыторыі Беларусі.
3. Лютаўская рэвалюцыя 1917 года на Беларусі.
4. Органы Часовага Урада на тэрыторыі Беларусі.
5. Саветы на тэрыторыі Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі.
6. Беларускі нацыянальны рух у сакавіку-кастрычніку 1917 года.
7. БСГ у 1917 годзе.
8. З’езд прадстаўнікоў беларускіх арганізацый у сакавіку 1917 г.
9. З’езд беларускіх нацыянальных арганізацый у ліпені 1917 года.
10. Вынікі выбараў ва Устаноўчы сход на Беларусі і Заходнім фронце.
11. Шляхі і асаблівасці ўсталявання савецкай ўлады на тэрыторыі Беларусі
12. Усталяванне Савецкай улады ў Мінску.
13. Усталяванне савецкай улады ў Магілёве і Віцебску.
14. Стварэнне органаў савецкай улады на тэрыторыі Беларусі.
15. Усебеларускі з”езд у снежні 1917 года.
16. Мяцеж корпуса Доўбар-Мусніцкага.
17. Першыя мерапрыемствы Савецкай улады (лістапад 1917 – люты 1918 г.)
18. Палітыка ваеннага камунізма на тэрыторыі Беларусі.
19. Новае нямецкае наступленне ў лютым 1918 года і яго уплыў на становішча на Беларусі.
20. Абвяшчэнне БНР.
21. Ўстаўныя граматы БНР.
22. Культурна-асветніцкая дзейнасць БНР.
23. Размежаванні ў беларускім нацыянальным руху ў вясну 1918 года. Распад БСГ.
24. Барацьба за стварэнне БССР.
25. Утварэнне БССР.
26. І з’езд Саветаў Беларусі. Утварэнне ЛітБела.
27. Савецка-польская вайна на тэрыторыі Беларусі
28. Становішча насельніцтва Беларусі ва ўмовах польскай акупацыяй 1919 – 1920 гг.
29. Другое абвяшчэнне ССРБ.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

30. Рыжскі мір і яго вынікі для Беларусі
31. Слуцкае паўстанне.
32. Неабходнасць пераходa да Новай эканамічнай палітыкі.
33. Умовы пераходa да НЭПа ў Беларусі.
34. Прамысловасць Беларусі ва ўмовах НЭПа.
35. Сельская гаспадарка Беларусі ва ўмовах НЭПа
36. Прамысловасць Беларусі ў гады першых пяцігодак.
37. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў БССР.
38. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у 1920 – 1930-я гады.
39. Узбуйненне тэрыторыі БССР ў 20-я гг. XX ст.
40. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў БССР у 1920 – 1930 гады
41. Палітыка беларусізацыі
42. Развіццё адукацыі ў БССР ў 20 – 30-я гады XX ст.
43. Навука ў БССР ў 20 – 30-я гады XX ст.
44. Культура Савецкай Беларусі 1920 – 1930-х гадоў.
45. Мастацтва Савецкай Беларусі 1920 – 1930-х гг.
46. Беларускае замежжа 20 – 30-х гадоў XX ст.
47. Рэпрэсіі 20 – 30-х гадоў ў Савецкай Беларусі
48. Заходняя Беларусь ў складзе польскай дзяржавы
49. Стан прамысловасці на Заходняй Беларусі ў 20 – 30-я гады XX ст.
50. Стан сельскай гаспадаркі на заходнебеларускіх землях у 20 – 30-я гг. XX ст.
51. Грамадска-палітычнае жыццё на Заходняй Беларусі ў 20 – 30-я гады
52. Адукацыя на Заходняй Беларусі ў 1920 – 1930-я гады.
53. Культура на Заходняй Беларусі ў 1920 – 1930-я гг.
54. Барацьба працоўных Заходняй Беларусі за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне.

Гісторыя Беларусі. 1939-2014 гг.

ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

Раздзел 1. Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны.

Тэма. 1.1. Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад БССР.

Сутнасць і змест савецка-германскага дагавора ад 23 жніўня 1939 г. і ад 28 верасня 1939 г. аб граніцы і сяброўстве паміж Германіяй і СССР. Напад Германіі на Польшчу. Пачатак Другой сусветнай вайны. Пазіцыя еўрапейскіх дзяржаў у дачыненні да Германіі. Разгром польскай дзяржавы. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Уступленне Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Вераснеўская кампанія Чырвонай арміі ў Заходняй Беларусі. Дэмаркацыя і дэлімітацыя новай савецка-германскай граніцы.

Усталяванне савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Стварэнне часовых органаў кіравання: часовыя ўпраўленні, сялянскія камітэты, рабочая гвардыя. Падрыхтоўка і правядзенне Народнага сходу Заходняй Беларусі і яго рашэнні. Выбары дэлегатаў на Народных сход – народны плебісцыт па ўключэнні Заходняй Беларусі ў склад БССР. Юрыдычнае афармленне ўключэнне Заходняй Беларусі ў склад БССР. Пазачарговыя сесіі ВС СССР (2 лістапада 1939 г.) і ВС БССР (12 лістапада 1939 г.).

Тэма 1.2 Сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя і культурныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі.

Усталяванне савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Стварэнне часовых органаў кіравання – часовых упраўленняў, сялянскіх камітэтаў, рабочай гвардыі і іх роля ў сацыялістычных пераўтварэннях у Заходняй Беларусі. Правядзенне і падрыхтоўка выбараў дэпутатаў у Народных сход Заходняй Беларусі і яго правядзенне 28-29 кастрычніка 1939 г. Рашэнні Народнага схоўу Заходняй Беларусі – аб уладзе, аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад БССР, аб канфіскацыі памешчыцкага землеўладання, аб нацыяналізацыі прамысловасці. Заканадаўчае афармленне ўключэння Заходняй Беларусі ў склад БССР і СССР. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі. Нацыяналізацыя прамысловасці. Падзел памешчыцкіх зямель. Пачатак стварэння калгасна-саўгаснай сістэмы.

Змены ў культурным жыцці. Развіццё адукацыі, мастацтва, літаратуры. Стварэнне сістэмы сярэдняй, вышэйшай адукацыі. Антысавецкая барацьба ў Заходняй Беларусі. Стварэнне польскіх падпольных фарміраваняў і барацьба польскага падполля супраць савецкай улады. Дэпартацыі польскага і беларускага насельніцтва. Сучасныя ацэнкі падзей восені 1939 года ў жыцці беларускага грамадства. Сучасная айчынная і замежная гістарыяграфія і прававая ацэнка савецка-германскіх дагавораў ад 23 жніўня і 28 верасня 1939 г.

Савецкая Беларусь напярэдадні нападу фашысцкай Германіі. Выкананне трэццяга пяцігадовага плана. Умацаванне абароназдольнасці. Удзел насельніцтва ў абарончых мерапрыемствах. Заходняя ваенная асабовая акруга напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма 1.3. Напад фашысцкай Германіі. Абарончыя баі ў БССР.

Нападзенне фашысцкай Германіі на СССР. Абарончыя баі летам 1941 года на тэрыторыі Беларусі. Прыгранічныя баі, абарона Брэсцкай крэпасці, Мінска, Магілёва, Гомеля. Эвакуацыя прамысловых прадпрыемстваў, дзяржаўнай і калгаснай маёмасці. Мабілізацыя насельніцтва ў Чырвоную Армію. Асаблівасці яе правядзення. Дапамога насельніцтва Чырвонай Арміі. Знішчальныя батальёны, народнае апалчэнне. Прычыны паражэнняў Чырвонай Арміі ў баях за Беларусь. Значэнне абарончых баёў у Беларусі па зрыву плана «Маланкавай вайны».

Тэма 1.5. Нямецка-фашысцкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі. Калабарацыянізм.

Акупацыя тэрыторыі Беларусі германскімі войскамі. Мэты акупацыйнай палітыкі. Устанаўленне акупацыйнага рэжыму. Тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел Беларусі. Сістэма акупацыйных органаў. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя мерапрыемствы акупацыйных улад. Рабаванне матэрыяльных каштоўнасцей. Масавае знішчэнне ваеннапалонных і мірнага насельніцтва. Вываз насельніцтва на работу ў Германію. Канцэнтрацыйныя лагеры і турмы, карныя аперацыі. Беларускі нацыянальны рух ва умовах нямецкай акупацыі. Беларускія калабарацыянісцкія арганізацыі і іх дзенасць: БНС, БКА, СБМ, БЦР.

Тэма 1.6. Антыфашысцкая барацьба супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Партызанскі і падпольны рух.

Стаўленне насельніцтва да нямецкага акупацыйнага рэжыму. Разгортванне партызанскага руху. Першыя партызанскія атрады. Асаблівасці і ўмовы развіцця партызанскага руху восенню – зімой 1941-1942 гг. Стварэнне і дзейнасць Цэнтральнага штаба партызанскага руху (ЦШПР) і Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР). Формы партызанскай барацьбы: дыверсійна-тэрарыстычная, арзведвальная, барацьба на камунікацыях, баявая. Рэйды партызанскіх фарміраванняў. Рэйкавая вайна і яе асноўныя этапы. Стварэнне сеткі падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый. Антыфашысцкія патрыятычныя арганізацыі. Армія Краёва на тэрыторыі Беларусі: стварэнне, мэты, задачы, дзейнасць. Перыядызацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзейнасці АК. Асабовы склад і сацыяльная апора польскіх падпольных фарміраванняў.

Тэма 1.7. Вызваленне Беларусі. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.

Вызваленне тэрыторыі Беларусі ад немецка-фашысцкіх захопнікаў. Сумесныя дзеянні партызан і Чырвонай Арміі. Беларуская наступальная аперацыя “Баграціен”. Вызваленне Мінска, усёй тэрыторыі рэспублікі. Удзел беларусаў у барацьбе з фашызмам на франтах Другой сусветнай вайны.

Раздзел 2. Беларусь ў пасляваенны перыяд. 1945-1985 гг.

Тэма 2.1. Аднаўленне народнай гаспадаркі Беларусі у першае пасляваенная дзесяцігоддзе.

